


Мае браты, мае суседзі

Творы пісьменнікаў блізкага замежжа

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2008

УДК 821(1-87)-93
ББК 84(0)
М94

Серыя заснавана ў 2005 годзе

Укладанне, уступныя артыкулы
Тацяны Кабржыцкай і Вячаслава Рагойшы

Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-02-1019-7

© Кабржыцкая Т. В., Рагойша В. П., укладанне, уступныя артыкулы, 2008
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2008

ЛІТАРАТУРА БРАТОЎ І СУСЕДЗЯЎ

«Мае браты, мае суседзі...» — так па-сяброўску шчыра і цёпла звярнуўся калісьці Якуб Колас да палякаў у эпілогу да паэмы «Рыбакова хата». Суседзямі, братамі называюць беларусы не толькі палякаў, але і рускіх, украінцаў, латышоў, літоўцаў — усіх, з кім наш народ непасрэдна мяжуе, з кім жыве ў добрых, суседскіх стасунках, каго найбольш паважае і любіць. Сапраўдныя братэрскія адносіны ў беларусаў здаўна, яшчэ з часу выдання ў Празе Бібліі Францішка Скарыны, усталяваліся з яшчэ адным славянскім народам — чэхамі. А якія павага і любоў могуць быць без ведання гісторыі, культуры, літаратуры братоў-суседзяў...

Менавіта таму ў школьным курсе родная беларуская літаратура, прынамсі апошняе дзесяцігоддзе, і разглядаецца ў кантэксце іншанацыянальных літаратур. Найперш і найраней — літаратур суседніх. У гэтым сэнсе найбольш пашанцавала (і гэта зусім зразумела) літаратуры рускай, якая ў Беларусі заўсёды вывучалася і вывучаецца як асобны прадмет ва ўсіх класах сярэдняй школы. З іншымі літаратурамі, найперш еўрапейскімі, вучні знаёмяцца на ўроках рускай (у школах з рускай мовай навучання) і беларускай (у школах з беларускай мовай навучання) літаратур. Аднак да апошняга часу назіралася значнае дубліраванне, калі адны і тыя ж аўтары ці творы прапаноўваліся для вывучэння як у курсе роднай, так і ў курсе рускай літаратур. І толькі ў выніку цяперашняй рэформы школы, стварэння новых вучэбных праграм, здаецца, удалося пазбегнуць гэтага дубліравання. Цяпер у абодвух тыпах школ (і рускамоўных, і беларускамоўных) праграмы па беларускай і рускай літаратурах, імкнучыся не дубліраваць адна другую, прадугледжваюць знаёмства вучняў з буйнейшымі прадстаўнікамі сусветнага мастацкага слова. Прычым літаратура суседзяў — у значна пашыраным выглядзе — заканамерна ўвайшла ў курс менавіта беларускай літаратуры, паколькі яна мае самыя цесныя дачыненні да гісторыі, культуры і літаратуры беларускага народа.

Аб тым, што апошняе выказванне мае пад сабою падставу, сведчыць і гэтае выданне. Сапраўды, вершы, паэмы, аповесці і апавяданні

многіх пісьменнікаў, якія складаюць гонар літаратур нашых суседзяў, славянскіх братоў, народжаны калі не на нашай зямлі, то пад значным уплывам яе культуры і асобных гістарычных падзей. Такія, напрыклад, многія творы нашых знакамітых землякоў — класікаў польскай літаратуры Адама Міцкевіча, Юзафа Крашэўскага, Элізы Ажэшкі. Пад непасрэдным уздзеяннем нашай міфалогіі і фальклору ўзніклі шырокавядомыя балады Міцкевіча «Свіцязь», «Свіцязянка», «Рыбка» і інш. У аснову яго славутай паэмы «Пан Тадэвуш»ляглі падзеі пярэдадня і часу руска-французскай вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі. У гэтым творы, апрача ўсяго, выведзены каларытныя тыпы ліцвінаў — тагачасных насельнікаў нашага краю рознага саслоўнага стану і розных прафесій, створаны адмысловыя пейзажныя малюнкі Літвы (так у сярэдзіне XIX ст. традыцыйна называлі цэнтральную і заходнюю часткі Беларусі). Гісторыі Літвы і ліцвінаў прысвечана і аповесць Крашэўскага «Паперы Глінкі». Дзеянне твора адбываецца ў XVIII ст. у нашым Нясвіжы, у замку князя Караля Радзівіла (Пане Каханку). Што да творчасці Ажэшкі, то большасць яе раманаў, аповесцей і апавяданняў, у тым ліку «Хам», «Раманіха» і «Зімовым вечарам», не толькі напісаны ў Беларусі, дзе пісьменніца пастаянна жыла (Гродна, Гродзеншчына), але і распавядаюць пра беларусаў, дакладней — пра рознанацыянальных жыхароў Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX ст.

Блізкае суседства прадвызначае багацце непасрэдных жыццёвых і культурных міжнацыянальных кантактаў, што, у сваю чаргу, абумоўлівае наяўнасць у творах пісьменнікаў суседніх літаратур знаёмых вобразаў, матываў, тэм, праблем. Скажам, хіба не магло не праявіцца ў творчасці Тараса Шаўчэнкі знаёмства як з Беларуссю, праз якую ён некалькі разоў праязджаў і праходзіў з усходу на захад, з поўдня на поўнач, так і з беларусамі, з якімі пазнаёміўся ў Пецярбургу і ў казахстанскай ссылцы?! Хіба не выявілася ў вершах і паэмах Лесі Украінкі яе шчырая дружба з мінчуком Сяргеем Мяржынскім, да якога як да самага блізкага чалавека яна прыязджала чатыры разы і была з ім да самай ягонай смерці?! А няўжо само месца нараджэння Яніса Райніса ў Латгаліі, дзе здаўна жылі і жывуць не толькі латышы, але і беларусы, не паўплывала на тэматыку і матывы яго паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі?! Зразумела, у кнігу «Мае браты, мае суседзі» не маглі не ўвайсці хаця б некаторыя творы, выкліканыя гэтай блізкасцю і знаёмствам, накшталт вершаў Лесі Украінкі «Гавораць вусны: «Ён навек загінуў!»...» або Максіма Рыльскага «Янка Купала».

Вывучэнне літаратуры суседзяў у курсе роднай літаратуры надзвычай карыснае і з іншага боку. У ёй нярэдка ўзнікалі асобныя мастацкія з'явы раней, чым у беларускім прыгожым пісьменстве (класіцызм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм). І тут мы можам гаварыць пра непасрэдныя ці апасродкаваныя ўплывы суседняй літаратуры ў цэлым на ўласна нашую. Разам з тым гаворка можа весціся і пра ўплывы (запазычанні, наследаванні і г. д.) канкрэтных аўтараў і твораў. Так, вядома, што «Энеіда» ўкраінца Івана Катлярэўскага дабратворна паўплывала на з'яўленне «Энеіды навыварат», а тым самым і

на нараджэнне новай беларускай літаратуры ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. Але ж, на жаль, захавалася толькі частка паэмы Вікенція Равінскага — яе першы раздзел. Тым не менш мы, знаёмячыся з украінскай «Энеідай», можам не толькі ўбачыць своеасаблівасць беларускага твора, але і дамысліць, што ж, па ўсёй верагоднасці, было (магло быць) у яго астатніх раздзелах. Другі прыклад. Пры вывучэнні навел Васіля Стафаніка, надзвычай лаканічных, псіхалагічна-аналітычных, прасякнутых болем за гаротніка селяніна, мы, несумненна, выразней — на фоне стафанікаўскай творчасці — адчуем мастацкую адметнасць ранніх апавяданняў нашых Змітрака Бядулі і Кузьмы Чорнага, на якіх украінскі пісьменнік таксама аказаў свой уплыў.

Ды не толькі (нават не столькі) пра непасрэдныя або апасродкаваныя ўплывы можа ісці гаворка пры вывучэнні творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа. Нашмат важней даследаваць тыпалагічнае падабенства літаратур у цэлым і іх паасобных твораў — у прыватнасці. Асабліва гэта прадуктыўна ў дачыненні да ўкраінскай літаратуры, гісторыя станаўлення якой так блізкая да працэсу ўзнікнення і развіцця літаратуры беларускай. Тарас Шаўчэнка і Янка Купала, Іван Франко і Якуб Колас, Леся Украінка і Максім Багдановіч — гэты тыпалагічны рад можна доўжыць і доўжыць, выяўляючы як агульнасць, універсальнасць творчасці гэтых (і іншых) пісьменнікаў, так і іх нацыянальную своеадметнасць, індывідуальную непаўторнасць, што пры тыпалагічным супастаўленні відаць асабліва выразна. Скажам, міфапаэтыка Багдановіча, выяўленая, у прыватнасці, у яго вершаваным цыкле «У зачарованым царстве», стане больш зразумелая, калі пазнаёміцца з «Лясной песняй» Лесі Украінкі, цалкам пабудаванай на палескай міфалогіі і фальклоры. А паэтыка купалаўскага сімвалізму, на якім «трымаюцца» «Адвечная песня» і «Сон на кургане», у дастатковай ступені раскрые свае таямніцы, варта толькі паставіць названыя творы ў тыпалагічны рад побач з драмай Яніса Райніса «Агонь і ноч». І такіх прыкладаў нямала. Школьная праграма па літаратуры дазваляе так ці інакш «падсвятляць» творы і творчасць айчынных аўтараў мастацкім вопытам літаратур суседніх народаў. Пры гэтым і наша беларуская літаратура на фоне іншых літаратур бачыцца як роўнавартасная, эстэтычна дасканалая.

Школьны курс літаратуры строга абмежаваны колькасцю вучэбных гадзін. Дадамо яшчэ, што ў гэтым курсе асноўная ўвага заканамерна звяртаецца на роднае пісьменства. У выніку ўсяго гэтага нельга бясконца пашыраць круг замежных пісьменнікаў, як бы гэтага падчас ні хацелася. Таму даводзіцца з іншанацыянальных літаратур, у тым ліку і блізкага замежжа, выбіраць лепшае з лепшага. Але не толькі. Выбіраць найперш тое, што мае пэўныя ідэйна-мастацкія повязі (непасрэдныя кантакты, тыпалагічныя сыходжанні і г. д.) з літаратурай беларускай. Таму з літоўскай літаратуры абраны Крысціёнас Данелайціс з яго класічнай паэмай «Чатыры пары года», з латышскай — Яніс Райніс з некалькімі вершамі, паэмай «Ave sol!» і драмай «Агонь і ноч», з польскай — Адам Міцкевіч, Юзаф Крашэўскі, Юльюш Славацкі і Эліза Ажэшка з іх праграмнымі творамі. Украінская літаратура прадстаўлена такімі пісьменнікамі, як Тарас

Шаўчэнка, Іван Катлярэўскі, Іван Франко, Міхайла Кацюбінскі, Леся Украінка, Васіль Стафанік, Паўло Тычына і Максім Рыльскі. Чэшскую літаратуру мае гонар прадставіць Бажэна Немцава сваёй знакамітай аповесцю «Бабуля».

Укладальнікі кнігі «Мае браты, мае суседзі», зввраючыся са школьнай праграмай, улічвалі таксама наяўнасць і якасць мастацкіх перакладаў твораў іншанацыянальных аўтараў. На шчасце, беларускі мастацкі пераклад можа пахваліцца сваімі здабыткамі. Таму выбіраць, за невялікім выключэннем, было з чаго. Больш таго, у трох выпадках укладальнікі палічылі патрэбным уключыць, побач з арыгіналам, па некалькі перакладаў адных і тых жа твораў: зачын паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» і яго санет «Да Нёмана», а таксама славуты «Запавет» Тараса Шаўчэнкі. Гэта дазволіць пры неабходнасці (на факультатывах па мастацкім перакладзе) правесці параўнальны аналіз перакладаў, паказаць спецыфіку і складанасць узнаўлення твораў сродкамі іншай мовы.

Абмежаваны аб'ём выдання прадвызначыў характар публікацыі тэкстаў. У пераважнай большасці выпадкаў творы (вершы, невялікія паэмы, апавяданні) падаюцца цалкам. Аднак часам іх даводзілася і скарачаць («Чатыры пары года» К. Данелайціса, «Паперы Глінкі» Ю. Крашэўскага, «Бабуля» Б. Немцавай, «Гражына» А. Міцкевіча, «Цені забытых продкаў» М. Кацюбінскага, «Лясная песня» Лесі Украінкі, творы Э. Ажэшкі). У двух выпадках (драма «Агонь і ноч» Я. Райніса, паэма «Энеіда» І. Катлярэўскага) давялося звярнуцца да адаптацыі, пераказаць змест асобных раздзелаў. З «Пана Тадэвуша» ўзяты толькі невялічкі зачын у розных беларускіх перакладах. Уся паэма ў перакладзе Язэпа Семяжона не так даўно з'явілася асобным выданнем у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Застаецца дадаць, што ў кнігу ўвайшлі выключна тыя творы, якія вывучаюцца ў сярэдняй школе ў адпаведнасці з зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь сучаснай праграмай па беларускай літаратуры (Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2007). Асобныя з іх становяцца даступнымі для школьнікаў менавіта дзякуючы гэтаму выданню.

Таццяна Кабржыцкая,
Вячаслаў Рагойша

УКРАІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Беларуска-ўкраінскія культурныя сувязі, як ніякія іншыя, маюць даўнія і трывалыя традыцыі. Падмурак іх — не толькі ў этнічнай блізкасці беларусаў і ўкраінцаў, але і ў працяглым жыцці нашых продкаў у адных і тых жа дзяржаўных утварэннях: Кіеўскай Русі, Вялікім княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР. З пачатку 1990-х гг. Украіна і Рэспубліка Беларусь на палітычнай карце свету вызначыліся як незалежныя дзяржавы. Тым не менш этнічна-моўна-культурная блізкасць, агульнасць гістарычнага лёсу і цяпер прадвызначаюць асаблівую духоўную роднасць, а ў выніку — плённасць літаратурных сувязей беларускага і ўкраінскага народаў.

Распачаліся яны ў эпоху Кіеўскай Русі. Новыя павевы хрысціянства, якое ішло з Кіева, наслойваліся на спрадвечныя міфалагічныя ўяўленні і фальклорныя перагукі двух народаў. Узаемасувязі старажытных беларускай і ўкраінскай літаратур назіраюцца ў летапісанні, розных жанрах царкоўнай і свецкай пісьменнасці. Яшчэ больш яны ўзмацніліся ў сярэднія вякі, калі завязаліся цесныя кантакты паміж украінскімі (Кіеў, Астрог, Львоў) і беларускімі (Полацк, Вільня, Брэст) культурнымі цэнтрамі, праваслаўнымі брацтвамі (магілёўскім і львоўскім, мінскім і кіеўскім і інш.). Дабратворны ўплыў на ўкраінскае кнігадрукаванне і літаратуру зрабілі Францішак Скарына, Сымон Будны, Сільвестр Косаў, Васіль Цяпінскі. Асобныя літаратары-ўкраінцы (Мялецій Сматрыцкі, Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі і інш.) жылі, выдавалі кнігі і вялі асветніцкую працу на Беларусі, а беларускія (Андрэй Рымша, Сімяон Полацкі) вучыліся ва Украіне (у прыватнасці, у Кіева-Магілянскай акадэміі). У XVII ст. украінскае вершаванне, прапаведніцкая літаратура адчулі пэўны ўплыў Сімяона Полацкага. У сваю чаргу Іван Вішанскі, Захарый Капысценскі ўплывалі

на развіццё беларускай палемічнай літаратуры, на творчасць Лявонція Карповіча, Афанасія Філіповіча і інш. У 2-й палове XVII—XVIII ст. сувязі пераважалі ў фальклоры, школьнай драматургіі (вершапісанне, арацыі, інтэрмедыі).

Новы этап беларуска-ўкраінскіх культурных узаемасувязей наступіў з канца XVIII ст., калі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) беларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі (левабярэжная Украіна знаходзілася ў складзе Расіі яшчэ з сярэдзіны XVII ст.). Некаторыя ўкраінскія пісьменнікі (Якаў Галавацкі, Аляксандр Старажэнка, Іван Катлярэўскі) пэўны час жылі і працавалі на Беларусі, беларускія (Ян Баршчэўскі, Франц Савіч, Францішак Багушэвіч) — ва Украіне. Тройчы праз Беларусь праязджаў Тарас Шаўчэнка, што затым адлюстравалася ў некаторых яго творах, абумовіла шчырасць кантактаў з беларускімі літаратарамі. Беларусы Еўдакім Раманаў, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Яўхім Карскі даследавалі помнікі ўкраінскай мовы і літаратуры, украінцы Міхайла Драгаманаў, Аляксандр Патабня, Уладзімір Гнацюк — беларускай. Пад уздзеяннем «Энеіды» Катлярэўскага ўзнікла беларуская «Энеіда навыварат». Паэзія і асоба Шаўчэнкі паўплывалі на творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча і іншых беларускіх пісьменнікаў. Кантакты спрыялі фарміраванню беларускай і ўкраінскай рэвалюцыйнай публіцыстыкі. Іван Франко і Міхайла Паўлык склалі праект «Украінска-польска-літоўска-беларускага брацтва» і «Выдавецкай суполкі». З украінскімі рэвалюцыянерамі трымаў сувязь пецярбургскі «Гурток моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай». Кіраўнік гэтага гуртка Адам Гурыновіч пераклаў на беларускую мову «Гімн» Франко. На светапогляд і творчасць Лесі Украінкі паўплываў мінскі сацыял-дэмакрат Сяргей Мяржынскі.

З часу рэвалюцыі 1905—1907 гг. пачынаецца новы этап беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемаадносін. Гэтаму паспрыяла найперш адмена забароны друку на беларускай і ўкраінскай мовах на тэрыторыі Расійскай імперыі. Дзякуючы ў першую чаргу беларускай газеце «Наша Ніва» (1906—1915), іншым выданням гэтыя ўзаемаадносіны набылі пастаянны і сістэмны характар. «Наша Ніва» апублікавала

шэраг перакладаў на беларускую мову твораў Шаўчэнкі, Васіля Стафаніка, Сцяпана Руданскага і іншых, матэрыялы пра гэтых і многіх іншых украінскіх пісьменнікаў (Катлярэўскага, Марка Крапіўніцкага, Франко, Лесю Украінку, Барыса Грынчэнку і інш.), рэцэнзіі на спектаклі ўкраінскіх тэатральных труп і г. д. Газета наладзіла сувязі з асобнымі ўкраінскімі перыядычнымі выданнямі («Рада», «Українська хата» і інш.), таварыствам «Просвіта» і інш. Усё гэта дае падставы гаварыць пра своеасаблівы нашаніўскі перыяд у беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязях. Асаблівую ролю ў развіцці гэтых сувязей адыграў Максім Багдановіч, які даследаваў творчасць некаторых украінскіх пісьменнікаў (Шаўчэнкі, Франко, Грыцько Чупрынкі, Уладзіміра Самійленкі і інш.), пісаў украіназнаўчыя артыкулы, выступаў з гэтымі артыкуламі ў рускім і беларускім друку. У гэты час пашырыліся асабістыя сувязі літаратараў. У асобе львоўскага вучонага Іларыёна Свянціцкага Цётка, якая ў тагачаснай Аўстра-Венгрыі вымушана была хавацца ад праследавання за рэвалюцыйную дзейнасць, знайшла свайго дарадца і апекуна. З яго дапамогай яна выдала ў Жоўкве (каля Львова) кнігі «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская». Брашура самога Свянціцкага «Адраджэнне беларускага пісьменства» (Львоў, 1908) стала першым на Украіне і Беларусі сістэматызаваным нарысам гісторыі беларускай літаратуры. На Украіне, у Кіеве, жыў і працаваў малады беларускі публіцыст Сяргей Палуян, які з'явіўся яшчэ адным спалучальным звяном паміж тагачаснымі літаратурамі двух народаў. Бурнае развіццё маладой беларускай літаратуры і пашырэнне ўкраінскага друку далі падставы для азнаямлення ўкраінцаў з асобнымі яе дасягненнямі (пераклады твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Багдановіча, Ядвігіна Ш. і інш.).

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г., уздым нацыянальнай свядомасці і агульнай культуры, дзяржаватворчыя працэсы ў асяроддзі двух народаў, што прадвызначылі ўтварэнне УССР і БССР, прывялі да небывалага дагэтуль развіцця беларускай і ўкраінскай літаратур, а разам з гэтым — і беларуска-ўкраінскіх літаратурных кантактаў. Развіццю гэтых літаратур і літаратурных кантактаў, несумненна, нанеслі

значную шкоду асобныя катаклізмы XX ст. (сталінскія рэпрэсіі, галадамор на Украіне 1932—1933 гг., падзеі Вялікай Айчыннай вайны), але спыніць іх ужо нішто не змагло. Міжлітаратурныя сувязі ўзняліся на дзяржаўны ўзровень. З сярэдзіны 1920-х гг. усталёўваюцца кантакты не толькі паміж асобнымі беларускімі і ўкраінскімі пісьменнікамі, але і паміж цэлымі пісьменніцкімі арганізацыямі (беларускія «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», украінскія «Гарт», «Плуг», «Молодняк»). Умацаванню міжлітаратурных сувязей паспрыяла і ўтварэнне адзінага Саюза пісьменнікаў СССР (1934). Наладжваюцца абмен пісьменніцкімі дэлегацыямі, правядзенне тыдняў і дэкад суседніх літаратур, абмен спецыяльнымі выпускамі часопісаў і газет, планавае выданне твораў братніх літаратур у перакладзе на родныя мовы (у тым ліку да юбілейных дат і розных мерапрыемстваў). У 1929 г. у Харкаве выйшла першая анталогія беларускай літаратуры «Нова Білорусь». Затым на ўкраінскай мове ў розны час былі выдадзены анталагічныя зборнікі, выбраныя творы Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Янкі Брыля, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага і інш. У перакладзе на беларускую мову неаднаразова выдаваліся творы Шаўчэнкі, Франко, Лесі Украінкі, выходзілі творы Катлярэўскага, Міхайлы Кацюбінскага, Паўло Тычыны, Максіма Рыльскага, Міколы Бажана, Астапа Вішні, Андрэя Малышкі, Уладзіміра Сасюры, Алеся Ганчара, Міколы Нагнібеды, Міколы Вінграноўскага, Дмытра Паўлычкі, Івана Драча, Ліны Кастэнка, Уладзіміра Яварыўскага, Рамана Лубкіўскага, Тамары Каламіец і інш. На працягу 1917—1986 гг. на ўкраінскай мове выйшлі 222 кнігі беларускай літаратуры агульным тыражом 12 мільёнаў 380 тысяч паасобнікаў. За гэты ж час на беларускай мове свет пабачылі 166 кніг украінскай літаратуры тыражом 1 мільён 511 тысяч паасобнікаў. Заслуга ў гэтым многіх таленавітых перакладчыкаў як з украінскага боку (Міхайла Драй-Хмара, Сяргей Піліпенка, Рыльскі, Тычына, Сасюра, Малышка, Грыгорый Кочур, Дмытро

Паламарчук, Уладзімір Лучук, Драч, Паўлычка, Лубкіўскі і інш.), так і з беларускага (Янка Купала, Якуб Колас, Куляшоў, Анатоль Вялюгін, Васіль Вітка, Язэп Семяжон, Максім Танк, Сяргей Грахоўскі, Хведар Жычка, Барадулін, Гілевіч і інш.). Працэс беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей стаў прадметам зацікаўлення шэрагу беларускіх (Т. Кабржыцкая, Э. Мартынава, В. Рагойша, М. Тычына і інш.) і ўкраінскіх (П. Ахрыменка, І. Астапік, Л. Бондар, Б. Чайкоўскі, Я. Шабліоўскі і інш.) літаратуразнаўцаў. Яны сталі вызначаць тэматыку спецыяльных канферэнцый (Гомель, 1969; Львоў, 1972; Мінск, 1973; Сумы, 1976, 1981, 1982), навуковых выданняў, дысертацыйных даследаванняў...

Новы, апошні па часе, этап беларуска-ўкраінскіх узаемаадносін пачынаецца з пачатку 1990-х гадоў. Абумоўлены ён эпахальнымі падзеямі: распадам СССР і сацыялістычнага лагера, утварэннем многіх незалежных дзяржаў, у тым ліку — Украіны і Рэспублікі Беларусь. Падзеі гэтыя пазначыліся як на кантактах асобных пісьменнікаў, так і літаратур у цэлым. Відавочна зменшылася колькасць узаемаперакладаў, зніклі некаторыя ранейшыя формы ўзаемасувязей (літаратурныя тыдні і дэкады, выданні сумесных нумароў часопісаў і газет і інш.). Прычыну такога становішча, напэўна, трэба шукаць як у эканамічных, так і ў грамадска-палітычных варунках постсавецкага часу. Гэта (асабліва ў першае постсавецкае дзесяцігоддзе) — развал эканомікі, так званы «дзікі» рынак, што не садзейнічае распаўсюджванню сур'ёзнай, у тым ліку перакладной, літаратуры, адыход даволі значнай групы вядомых пісьменнікаў ад літаратуры ў сувязі з іх палітычным заангажаваннем, жаданне прапагандаваць найперш сваю нацыянальную літаратуру, многае з якой нядаўна было забаронена, недаступнасць сродкаў масавай інфармацыі суседняй рэспублікі... Адмоўна паўплывалі на літаратурныя сувязі і пазбаўленне многіх ранейшых дзяржаўных выдавецтваў і органаў друку матэрыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы, закрыццё асобных з іх, ліквідацыя штогодніх спецыялізаваных перакладных альманахаў (тыпу беларускіх «Даляглядаў», «Братэрства»), адсутнасць беларускамоўнага перыядычнага

органа, прысвечанага мастацкаму перакладу (накшталт украінскага «Всесвіту»)... У той жа час у канцы XX — пачатку XXI ст. для развіцця беларуска-ўкраінскіх культурных узаемаадносін стварыліся пэўныя магчымасці, якіх раней проста не магло быць. У Мінску адкрылася Пасольства Украіны, у Кіеве — Пасольства Беларусі. Абодва пасольствы, апрача іншага, многае робяць і для прапаганды на тэрыторыі суседняй дзяржавы сваёй нацыянальнай культуры. З пачатку 90-х гг. XX ст. стала магчымым прапагандаваць украінскую культуру ў Беларусі з дапамогай новастворaных украінскіх грамадска-культурных арганізацый («Січ», «Заповіт», «Ватра» і інш.). З другога боку, беларускія грамадска-культурныя суполкі ва Украіне (Кіеў, Харкаў, Львоў і інш.) таксама праводзяць пэўную працу па прапагандзе культурных дасягненняў беларускага народа — і не толькі сярод беларускай дыяспары, але і ўкраінскага насельніцтва. Адмена савецкай цэнзуры прывяла да ўзнікнення шматлікіх прыватных выдавецтваў, што значна павялічыла магчымасці выдання кніг, у тым ліку перакладных. Пачалі наладжвацца літаратурныя кантакты, не абцяжараныя абавязковымі дзяржаўнымі заданнямі і планамі. Вось некалькі прыкладаў самых значных з'яў сучаснага беларуска-ўкраінскага пабрацімства.

Пяты нумар незалежнага беларускага часопіса «Arche» («Пачатак») за 2001 г. быў цалкам (а гэта звыш 500 старонак!) прысвечаны Украіне, яе культуры, літаратуры, яе грамадска-палітычнай і філасофскай думцы. Перад намі — тое цікавае, актуальнае, самабытнае, што да гэтага часу на беларускай мове не з'яўлялася. У 2002 г. вядомы беларускі перакладчык Алесь Траяноўскі выдаў арыгінальную кнігу сваіх перакладаў з украінскай паэзіі «Імем няўмольным свабоды». Кніга адметная найперш тым, што ў яе ўвайшлі творы 21 паэта, якія былі рэпрэсіраваны ў гады культу асобы Сталіна ці загінулі ад рук нямецкіх фашыстаў. Большасць з паэтаў дагэтуль зусім ці амаль не перакладаліся на беларускую мову і ў Беларусі наогул малавядомыя. Своеасаблівым адкрыццём стала і кніга І. Франко «Народзе мой...: Творы» (2006), выдадзеная да 150-годдзя пісьменніка. У адносна невялікую кніжку ўвайшлі творы некалькіх

жанраў, якія дасюль па розных прычынах па-беларуску не з'яўляліся. У 2007 г. у адным з мінскіх прыватных выдавецтваў выйшла цікавая кніга вядомага сучаснага ўкраінскага пісьменніка Аляксандра Ірванца «Роўна / Ровно: Выбраныя творы». Выхад кнігі — вынік асабістых творчых кантактаў яе аўтара і перакладчыка, вядомага беларускага пісьменніка У. Арлова. Знакавай з'явай навейшых беларуска-ўкраінскіх навуковых і культурных кантактаў стала праведзеная ў 2003 г. у Мінску Міжнародная навуковая канферэнцыя «Украіна — Беларусь: гістарычны вопыт узаемаадносін». Канферэнцыю сумесна арганізавалі і правялі Інстытуты гісторыі Нацыянальных акадэмій навук Украіны і Беларусі пры падтрымцы Пасольства Украіны ў Беларусі. Добрым тэарэтычным падмуркам для канферэнцыйных навуковых дакладаў з'явіліся створаныя ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі і надрукаваныя ў 2002 г. (пад рэдакцыяй М. Тычыны і У. Мархеля) «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей» (праз год кніга была перакладзена на ўкраінскую мову і выдадзена ў Кіеве). На ніве беларуска-ўкраінскага ўзаемаперакладу шчыруе і мінчанін Валерый Стралко, які перакладае вершы як з украінскай мовы на беларускую, так і з беларускай — на ўкраінскую. У яго перакладах у Мінску выйшлі кнігі «Непагасны агонь / Непогасний вогонь» (2003; у зборнік увайшлі некаторыя творы Шаўчэнкі, Лесі Украінкі і Франко ў беларускамоўных узнаўленнях і Янкі Купалы, Якуба Коласа і Багдановіча — ва ўкраінамоўных), зборнік вершаў Алеся Пісарыка «На кляновых лістах» (2000) і невялікая двухмоўная (творы друкуюцца ў арыгінале і ў перакладзе на ўкраінскую мову) кніжка дачасна памерлага беларускага паэта Алеся Пісьмянкова «Любіць бы вечна...» (2007). Пераклаў ён на ўкраінскую мову і класічную беларускую паэму XIX ст. «Тарас на Парнасе» для яе шматмоўнага выдання (Мінск, 2003; 2007). Аднак, несумненна, самым вялікім дасягненнем Стралко-перакладчыка стала ўкраінамоўнае ўзнаўленне «цар-звона беларускай літаратуры» (Алесь Адамовіч) — паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», якая пабачыла свет у кіеўскім выдавецтве «Український письменник» у самым канцы 2006 г. Гэта трэці (пасля

рускага і польскага) поўны пераклад класічнага коласаўскага твора на замежныя мовы.

Пачатак XXI ст. у адносінах да беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей азнаменаваўся знакавымі з'явамі і з украінскага боку. Знакаміты ўкраінскі паэт, майстар мастацкага перакладу Дмытро Паўлычка выдатна ўзнавіў на ўкраінскай мове цыкл купалаўскіх санетаў з 22 гэтых арыгінальных твораў — для кнігі Янкі Купалы «Санеты», што выйшла ў 2002 г. у Мінску на васьмі мовах (беларускай, англійскай, іспанскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай і французскай). Сапраўднай падзеяй і ўкраінскай культуры, і ўкраінска-беларускіх літаратурных сувязей стаў выхад у львоўскім выдавецтве «Світ» па сутнасці Поўнага збору твораў Максіма Багдановіча «Стратим-лебідь» (2002). У кнігу ўвайшлі літаральна ўсе паэтычныя, празаічныя, публіцыстычныя, літаратурна-крытычныя творы аўтара «Вянка» і яго эпісталярый у лепшых украінскіх перакладах (Драй-Хмары, Кочура, Паўлычкі, Лубкіўскага і інш.). Кнігу ўклаў, напісаў да яе прадмову і каментар, пераклаў большасць твораў лаўрэат Нацыянальнай прэміі Украіны імя Т. Шаўчэнкі, даўні сябар беларускай літаратуры Раман Лубкіўскі. 2002 год у Беларусі па ініцыятыве мясцовых украінскіх суполак і пры падтрымцы беларускага ўрада і Пасольства Украіны быў аб'яўлены Годам Шаўчэнкі. Своеасаблівым падрахункам Года Шаўчэнкі з'явілася створаная тым жа Лубкіўскім (ён — ініцыятар выдання, укладальнік кнігі, аўтар і перакладчык многіх матэрыялаў) кніга «Шевченкова дорога в Білорусь» (2004). У кнігу ўвайшлі, апрача публікацый пра святкаванне Года Шаўчэнкі, шматлікія творы беларускіх пісьменнікаў пра Кабзара, артыкулы пра сувязі ўкраінскага генія з Беларуссю, багаты ілюстрацыйны матэрыял, што ўключае фотакопіі арыгінальных матэрыялаў (малюнкі, кніжныя і часопісныя публікацыі, партрэты пісьменнікаў і інш.), ажно да здымкаў 2002 г., на якіх засведчаны моманты актыўных сучасных украінска-беларускіх кантактаў на розных узроўнях — ад культурных да палітычных. У апошні час (і гэта вельмі прыемна) да развіцця беларуска-ўкраінскіх літаратурных кантактаў пачалі актыўней далучацца пісьменнікі сярэдняга і малодшага

пакаленняў. Яскравы прыклад — выданне ў Кіеве арыгінальнай сумеснай анталогіі сучаснай беларускай і ўкраінскай паэзіі «Сувязьразрыў / Зв'язокрозрив» (2006). У анталогію з кожнага боку ўвайшлі творы дванаццаці паэтаў, якія сцвердзілі сябе як творцы ў перыяд дзяржаўнай незалежнасці Украіны. Гаворачы пра ўкраінскія пераклады беларускай літаратуры, з задавальненнем трэба адзначыць выхад у Кіеве (2006) вялікага, прафесійна ўкладзенага Р. Піўтараком і А. Скапненкам «Беларуска-ўкраінскага слоўніка». Гэта першая ў гісторыі культурных узаемаадносін двух братніх народаў такая лексікаграфічная праца. Аналагічны «Украінска-беларускі слоўнік» В. Лемцюговай выйшаў у Мінску яшчэ ў 1980 г. і дагэтуль адыгрывае сваю актыўную ролю пры перакладзе ўкраінскіх аўтараў на беларускую мову.

На пачатку XXI ст. ажывіліся асабістыя сувязі пісьменнікаў дзвюх братніх краін. У апошнія гады ў Беларусі пабывалі ўкраінскія майстры мастацкага слова. У сваю чаргу асобныя беларускія пісьменнікі наведалі незалежную Украіну. У Мінску і некаторых іншых беларускіх гарадах устаноўлены помнікі Шаўчэнку. Робяцца захады для адкрыцця помніка Янку Купалу ў Кіеве. Нараджаюцца новыя формы кантактаў. Галоўнае — не толькі ва ўкраінскіх і беларускіх літаратараў, але ў саміх беларусаў і ўкраінцаў не страчана адчуванне неабходнасці культурнага ўзаемаазнаямлення і ўзаемаўзбагачэння. А гэта — запарука таго, што плён беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей не толькі замацуецца, а стане значна багацейшым.

ТАРАС ШАЎЧЭНКА
(1814—1861)

Паэт, празаік, драматург, мастак, грамадскі дзеяч, Тарас Шаўчэнка ўвайшоў у свядомасць многіх пакаленняў як бацька ўкраінскай нацыі, заснавальнік новай украінскай літаратуры і ўкраінскай літаратурнай мовы. І невыпадкова за ім замацавалася вымоўнае прозвішча Кабзар. Кабзар — гэта вандроўны мудрэц, філосаф, педагог, кампазітар і музыка, паэт-песеннік у адной асобе. Пад уласны акампанемент на музычным інструменце — кобзе — кабзар вёў гутарку з народам, спяваў пра слаўнае казацкае мінулае, услаўляў подзвігі легендарных герояў, выхоўваў патрыятызм і пачуццё чалавечай годнасці, спрыяў выспяванню пратэсту супраць несправядлівасці і прыгнёту.

Сапраўдны народны паэт, Тарас Рыгоравіч Шаўчэнка выйшаў з народных нізоў. Нарадзіўшыся ў сям'і прыгоннага селяніна (у вёсцы Марынцы на Чаркашчыне), ён не раскрыўся б ва ўсёй сваёй велічы, калі б, прыехаўшы са сваім панам у Пецярбург, не сустрэўся там з высакароднымі і таленавітымі людзьмі. Сярод іх — украінскія і рускія мастакі І. Сашэнка, К. Брулоў, А. Венецыянаў, паэт В. Жукоўскі і інш. Яны зрабілі ўсё, каб Шаўчэнка атрымаў вольную. У 1838 г. яго выкупілі з прыгону. Атрымаўшы жаданую свабоду, у шчаслівым натхненні Шаўчэнка стварае свае першыя зборнікі вершаў «Кабзар» (1840) і «Чыгірынскі Кабзар» (1844), вучыцца ў Акадэміі мастацтваў ды малюе так паспяхова, што з часам за творы ў жанры гравюры атрымлівае ганаровае званне акадэміка жывапісу. Расійская сталіца, якая ў першай палове XIX ст. была моцна ўлюбёна ва «ўкраінскасць», прымае Шаўчэнку ў свае абдымкі. Яго запрашаюць у арыстакратычныя салоны. Ён малады, прыгожы, у яго мяккая ўкраінская гаворка, ён прачула чытае ўласныя вершы, цудоўна спявае... Аднак больш, чым выгоды сталічнага жыцця, ён любіць свой занядбаны край, сваю родную зямлю і яе народ. Шаўчэнка рвецца на Украіну. Здараецца нагода, і ён тут жа пакідае Пецярбург, каб стаць супрацоўнікам Кіеўскай археаграфічнай камісіі (1845—1847).

Шаўчэнка вольны, аднак большасць яго родных засталіся прыгоннымі. Ён піша пра гаротнае жыццё сялян, пра іх пакуты пад панскім прыгнётам. Ён высока цэніць народныя пераказы,

легенды, песні, у якіх услаўляецца колішняя слава ўкраінскіх казакоў, іхні гераізм, які яны праяўлялі ў барацьбе з прыгнятальнікамі. Дзякуючы Шаўчэнку ўвесь цывілізаваны свет атрымаў — у форме паэтычнага слова — усёахопную праўду пра гістарычнае прызначэнне ўкраінцаў. Першыя творы паэта выраслі пераважна з уласна ўкраінскай гісторыі і тагачаснай рэчаіснасці (вершы, балады, паэмы «Кацярына», «Гайдамакі», драма «Назар Стадоля» і інш.). Аднак паэт веліччу свайго сэрца імкнуўся сагрэць усё славянства. З-пад яго пяра выходзяць творы, прысвечаныя рускім, палякам, чэхам. Падзеі з чэшскай гісторыі ўвасоблены, у прыватнасці, у паэме «Ерэтык» — пра Яна Гуса. У творчасці паэта з'яўляюцца каўказскія матывы (паэма «Каўказ»). І ўсюды Шаўчэнка застаецца верны сваёй галоўнай ідэі — заклікаць народы да самапазнання, захавання ўласных культурных традыцый, беражлівага стаўлення да слова і веры продкаў. Так, пазнаёміўшыся ў Пецярбургу з беларусамі (літаратары Ян Баршчэўскі, Рамуальд Падбярэскі, мастак Міхаіл Мікешын, брат Кастуся Каліноўскага Віктар і інш.), паэт наказваў ім, «каб не пакідалі сваёй працы для народа, бо гэта іх павіннасць, а праца іх, нягледзячы на цяжкія варункі, не прападзе дарэмна, і сляды гэтай працы застануцца» (Р. Зямкевіч).

Не толькі творчасцю, але і сваім трагічным і адначасна гераічным лёсам Шаўчэнка паказаў прыклад такога самаадданага служэння роднаму народу і яго культуры. Украінскі паэт разам з прагрэсіўнымі прадстаўнікамі расійскага грамадства выступаў супроць царскага самадзяржаўя і дэспатызму. За ўдзел у нелегальным кіеўскім Кірыла-Мяфодзіеўскім таварыстве, якое заклікала ўсіх славян да стварэння новай дзяржавы — федэрацыі вольных славянскіх народаў, Шаўчэнку арыштавалі. Яго не зламалі ні турма, ні дзесяцігадовая ссылка (1847—1857) радавым салдатам у казахскія стэпы са строгай царскай забаронай пісаць і маляваць, ні паклёпы, абразы некаторых былых таварышаў, ні складанасць асабістага лёсу. Ён мужна, стойка перанёс усе нягоды, якія, аднак, падарвалі яго здароўе, не даўшы дажыць і да пяцідзесяцігадовага ўзросту.

Палымяная мара Шаўчэнкі — «каб усе славяне сталі добрымі братамі і сынамі сонца праўды» — актуальна і ў наш час. Зрэшты, Шаўчэнка з'яўляецца сучаснікам на вякі. Само жыццё паэта — узор хрысціянскага пакутніцтва за ідэю, за чалавецтва. Ён адкрыта і з'едліва выступаў супраць тыраніі і таталітарнага рэжыму («Сон»), асуджаў адступніцтва, здраду, хцівасць, гвалт (пасланне «І мёртвым, і жывым...»). Ён «мучыўся, але не каяўся» і няўхільна сцвярджаў сваю любоў да слабых і пакрыўджаных. Паэт часта ў сваіх творах абапіраўся на Біблію, трактуючы яе як цэласную маральна-этычную сістэму. Творчасць Шаўчэнкі ўспрымаецца як своеасаблівы подзвіг Праметэя, які насуперак волі багоў даў людзям агонь.

Для Шаўчэнкі беларуская зямля і яе насельнікі не былі чужымі і незнаёмымі. Праз Беларусь паэт праходзіў і праязджаў некалькі разоў. Так, яшчэ ў пятнаццацігадовым узросце ён, ідучы як служка ўслед за абозам свайго пана, які накіроўваўся з Кіева ў Вільню, прайшоў праз Беларусь з яе паўднёвага ўсходу на паўночны захад. Праз Беларусь пралягалі яго шляхі, калі ён дабіраўся з Вільні ў Пецярбург, з Пецярбурга ў Кіеў і назад, з Кіева ў Пецярбург. Дарожныя назіранні затым адлюстраваліся ў аповесці «Музыка», у ягоным «Дзённіку». З беларусамі Шаўчэнка сустракаўся не толькі ў Пецярбургу, але і ў казахскіх стэпах, дзе адбывалі ссылку ўдзельнікі паўстання 1830—1831 гг. У прыватнасці, у ссылцы паэт пазнаёміўся і пасябраваў з мастаком Б. Залескім, родам са Случчыны, прысвяціў яму верш («Як мы былі йшчэ казакамі»), а калі Залескі вярнуўся на радзіму — перапісваўся з ім, пасылаў яму свае карціны.

Імя Шаўчэнкі вядомае, без перабольшання, на ўсіх кантынентах. Творы яго перакладзены на дзесяткі моў. У многіх гарадах не толькі Украіны, але і свету (Нью-Йорк, Ванкувер, Вініпег, Буэнас-Айрэс і інш.) узведзены помнікі паэту. Шануюць Шаўчэнку і беларусы, бо і іх ён навучыў любіць «свабоду, родны край і мову», і для іх ён даўно стаў «бацькам мілым» (Янка Купала). Беларускія пісьменнікі лічаць Шаўчэнку сваім настаўнікам. Янка Купала, Максім Багдановіч, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Янка Брыль, Ніл Гілевіч і многія іншыя прадстаўнікі беларускага мастацтва слова засведчылі сваю пашану Кабзару ўласнымі арыгінальнымі творамі і літаратурна-крытычнымі артыкуламі. Адзін з цэнтральных бульвараў сталіцы Беларусі названы імем Шаўчэнкі. У Мінску, Брэсце, Гомелі, Магілёве ўзвышаюцца велічныя помнікі Кабзару.

Творы ўкраінскага паэта неаднойчы, пачынаючы яшчэ з дарэвалюцыйнага часу, перакладаліся на беларускую мову. Сярод актыўных перакладчыкаў Кабзара — Янка Купала, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Рыгор Барадулін і інш.

Для дадзенага выдання пераклады ўзяты з публікацый:

Шаўчэнка Тарас. Вершы. Паэмы. Мінск: Маст. літ., 1989 (творы пераклалі: «Сон», «Каўказ», «Думка» — Янка Купала, «Ерэтык» — Якуб Колас, «І мёртвым, і жывым...» — Кандрат Крапіва, «Садок вішнёвы каля хаты...» — Ніл Гілевіч, «І на чужыне я узрос...» — Аркадзь Куляшоў, «Не грэе сонца на чужыне...» — Рыгор Барадулін).

Часопіс «Роднае слова», 2001. № 10 («Ад «Запаведзі» да «Запавету»: Перастварэнні верша Тараса Шаўчэнкі «Запавет». Падрыхтаваў У. Мархель).

Верш «Цары» (раздзелы IV і V) друкуецца ў новым перакладзе Вячаслава Рагойшы.

Думка

Цяжка-цяжка жыць на свеце
Сіраце без роду:
Няма куды прыхіліцца —
Хоць з гары ды ў воду!
Утапіўся б маладзенькі
У той быстрай рэчцы;
Утапіўся б — цяжка жыці
І няма дзе дзецца.
Ходзіць доля ў каго полем,
Каласкі збірае,
А мая дзесь, нягодніца,
За морам блукае.
Добра таму багатаму:
Яго людзі знаюць;
А са мною сустрэнуцца —
Вокам абмінаюць.
Багатага, губатага
Дзяўчына шануе;
З мяне, сіраты гаротнай,
Смяецца, жартуе.
«Ці я ж табе не прыгожы,
Ці не ў цябе ўдаўся,
Ці не люблю цябе шчыра,
Ці з цябе смяяўся?
Любі ж сабе, маё сэрца,
Любі, каго знаеш,
Але з мяне ты не смейся,
Калі ўспамінаеш.
А я пайду на край свету...
На чужой старонцы

Знайду лепшую ці згіну,
Як той ліст на сонцы».
Пайшоў казак, сумуючы,—
Нікога не кінуў;
Шукаў долі ў чужым полі
Ды там і загінуў.
Уміраючы, ўглядаўся,
Дзе сонейка ззяе...
Цяжка-цяжка уміраці,
Цяжка ў чужым краі!

Гатчына, 1838

* * *

Садок вішнёвы каля хаты,
Хрушчы над вішнямі гудуць,
Ратаі з ворыва ідуць,
У вёску спеў нясуць дзяўчаты —
І рады маткі іх пачуць.

Сям'я сабралася ля хаты,
Зара вячэрняя ўстае.
Дачка вячэрацць падае,
Ёй маці хоча даць парады,
Дык салавейка не дае.

Паклала маці каля хаты
Маленькіх дзетачак сваіх,
Сама заснула каля іх,
Заціхла ўсё... адно дзяўчаты
Ды салавейка не заціх.

У казематце, 1847

* * *

Не грэе сонца на чужыне,
А дома надта аж пякло.
І мне не весела было
На нашай слаўнай Украіне.
Ніхто не лашчыў, не вітаў,
Я не хіліўся ні да кога,
Блукаў сабе, маліўся Богу
Ды люта панства праклінаў,
І згадваў я гады ліхія,
Паганай даўнасці гады:
Хрыста павесілі тады —
Не ўцёк бы й зараз сын Марыі!
І мне не весела нідзе,
Ды, мабыць, весела не будзе,
І на Ўкраіне любай, людзі,
І на чужыне я ў бядзе.
Хацелася б... дый то для тога,
Каб не рабілі маскалі
Дамоўку з дрэва мне чужога
Або хоць крышачку зямлі
Той, з-за Дняпра майго святога,
Вятры святыя прынясліі.
Дый больш нічога. Так вось, людзі,
Хацелася б... Ды што ж гадаць...
Нашто ўжо Бога турбаваць,
Калі па-нашаму не будзе.

Орская крэпасць, 1847

* * *

І на чужыне я узрос,
І на чужыне я сівею,—
І даў мне ў адзіноце лёс,
Здаецца, лепшую надзею —

Дняпро, што лашчыць сэрца нам,
Ды нашу слаўную краіну.
Аж бачу — добра толькі там,
Дзе нас няма. Ліхой гадзінай
Мяне дадому пацягло,
І я наведаў Украіну
І тое светлае сяло,
Дзе колісь маці спавівала
Мяне малога і ўначы
На свечку Богу зарабляла;
Паклоны цяжкія б'ючы,
Прачыстай ставіла, маліла,
Каб доля добрая любіла
Яе дзіця... О маці, маці,
Чаму ты рана спаць лягла!
А то б ты Бога пракляла
За сынаў лёс.
Адны няшчасці
У тым сяле, што я люблю:
Чарней за чорную зямлю
Блукаюць людзі; паўсыхалі
Сады, і хаткі пагнілі,
Старыя да зямлі прыпалі;
Ставы бур'янам параслі,
Сяло нібыта пагарэла,
Нібыта людзі падурэлі,
На паншчыну нямыя йдуць
І дзетачак сваіх вядуць.

. . . .

І я, заплакаўшы, назад
Ізноў паехаў на чужыну.

І не ў адным сяле такім,
А скрозь па слаўнай Украіне
Паны ярмо надзелі ўсім
Працоўным людзям. Гінуць, гінуць
Ў ярме тым рыцараў сыны,
А чорным гандлярам паны,

Братам сваім, прадаць спяшаюць
Ужо апошнія штаны...
. . . .
Нядобра дужа, страх, нядобра
Тут у пустыні прападаць.
А горш яшчэ на Украіне
Глядзець, і плакаць, і маўчаць.

А як не бачыш тога ліха,
То скрозь, здаецца, люба, ціха;
І на Ўкраіне дабро скрозь;
Між белых гор стары Дняпро,
Нібыта ў малаку хлапчына,
Красуецца, любуецца
На ўсю Украіну,
А па-над ім зеленеюць
Шырокія сёлы;
А ў тых сёлах у вясёлых
І народ вясёлы.
Яно б, можа, так збылося,
Каб не засталося
Слядоў панскіх на Ўкраіне!..

Кос-Арал, 1848

Цары

(Скарочана)

IV

Дзядзінцам ціха пахаджае
Стары вясёлы Рагвалод.
Дружына, отракі, народ
У золаце і срэбры ззяюць.
У князя свята: прыязджае
З Літвы суседняй юны князь
За рушнікамі да Рагнеды.

Перад багамі Лель і Лада
Агмень Рагнеда развяла,
Ялей у вогнішча ўліла,
А потым сыпанула ладан.
Нібы валькірыі, навокал
Танцуюць, цешацца дзяўчаты
І напяваюць:
— Гой, гоя, гоя!
Новыя пакоі
Будзем прыбіраці,
Сватоў сустракаці.

За Полацкам, нібыта хмара,
Пылюка — сонца не відаць.
Пабеглі отракі, баяры
Ліцвіна-князя сустракаць.
Сама Рагнеда з Рагвалодам
Пайшла — ■ дзяўчатамі, з народам.

Не з Літвы едзе князь нязнаемы,
Ды чаканы такі і жадаемы —
Гэта з Кіева турам-буйвалам
Прэцца велрышчам па Рагнедачку
Уладзімер-князь з кіяўлянамі.

Прыйшлі і места аблажылі,
Пасад, прадмесце падпалілі.
Князь Уладзімер прад народам
Забіў старога Рагвалода.
Баяр, паспольства перабіўшы,
Княжну з сабою захапіўшы,
Дамоў падаўся. І злачынна
Рагнеду гвалціць. Беспрычынна
Ён гоніць прэч яе. Княжна
Блукае па зямлі адна,
Трывае боль за кнескі ўчынак.
Такія, браце мой,
«Святыя»
Цары ўсе тыя!

Каб даў Бог, іх параспіналі,
Цароў тых, катаў тых людскіх!
Марока з імі, каб вы знали,
Як дурань ходзіш каля іх,
Не знаеш, дзе і як ступіць.
Дык што ж параіш мне зрабіць
Цяпер з паганцамі? Скажы,
Сястра старая Апалона,
Намоў, галубка, памажы
Палазіць трохі каля трона;
Я ж пацеркі, як зараблю,
Табе к Вялікадню куплю.
Што, падамося у лакеі,
Каб у навюсенькай ліўрэі
Цароў ахоўваць і любіць?
Шкада аловак мне тупіць!
Бо дзе няма святое волі,
Не будзе там дабра ніколі.
Нашто тады сябе дурыць?
Хадзем у селішчы, дзе людзі,
А там, дзе людзі, добра будзе,
Там будзем жыць, людзей любіць,
Святога Госпада хваліць.

Кос-Арал, 1848

І мёртвым, і жывым, і ненароджаным землякам маім на Украіне і не на Украіне маё сяброўскае пасланне

Аще кто речет, яко люблю Бога,
а брата своего ненавидит, ложь есть.

Соборно[е] послание Иоанна. Гл. 4, ст. 20

І змяркае, і світае,
Дзень божы мінае,
Зноў і стомленыя людзі,
І ўсё спачывае.
Толькі я, нібы пракляты,
І дзень, і ноч плачу
На шматлюдных раздарожжах,
І ніхто не бачыць.
І не бачыць, і не знае —
Аглухлі, не чуюць,
Кайданамі мяняюцца,
Праўдаю гандлююць
І Госпада зневажаюць —
Людзей запрагаюць
У ярмо, аруць жа ліха,
Ліхам засяваюць,
А што ўродзіць? Пабачыце,
Што за жніва будзе.
Схамяніцеся ж нарэшце,
Вырадкі — не людзі!
Паглядзіце на рай ціхі,
На сваю краіну,
Палюбіце вялікую
Гэтую руіну!
Раскуйцеся, братайцеся
І ў чужой краіне
Не шукайце, не пытайце,
Чаго няма ў свеце,—
Не знайсці таго ніколі
На чужыне ў полі.

Свая ж хата — свая праўда,
Свая сіла й воля.

Няма на свеце Украіны,
Другога не знайсці Дняпра,
А вы працеся на чужыну
Шукаць там добрага дабра,
Дабра святога. Волі! Волі!
Братэрства братняга. Знайшлі,
Прынеслі к нам з чужога поля:
На Ўкраіну з чужой зямлі
Вялікіх слоў прынеслі многа,
Нічога больш. А крычыце́,
Што не затым вы жывяце́,
Каб кланяцца няпраўдзе ў ногі,
І хіліцеся горш былога!
І зноў вы скуры дзераце
З братоў няшчасных, грэчкасеяў,
І сонца праўды сузіраць
Туды, да немцаў-дабрадзеяў,
Працеся зноў вы. Каб забраць
Маглі нікчэмнае з сабою
І крадзенае ўсё дабро,
Тады б астаўся сіратою
З святымі горамі Дняпро!

Каб вам не вярнуцца, каб так яно стала!
Каб там і здыхалі, дзе вы параслі,
Не плакалі б дзеці, маці не рыдала
І словы б знявагі не чутны былі.
І сонца б не грэла смярдзючага гною
На чыстай, шырокай, на вольнай зямлі.
Не ведалі б людзі, што вы за арлы,
І не паківалі б на вас галавою.

Майце розум, будзьце людзі,
Бо ліха вам будзе!
Раскуюцца неўзабаве
Скованыя людзі.

Суд настане, загавораць
І Дняпро, і горы!
Кроў пацячэ дзяцей вашых
У сіняе мора
Сторэкамі... І не будзе
Каму памагаці:
Адцураюцца брат брата
І дзіцяці маці,
І дым хмараю заслоніць
Сонца перад вамі,
Будзеце навек пракляты
Сваімі сынамі!
Умыйцеся! Вобраз Божы
Не паганьце самі!
Не дурыце дзяцей вашых,
Што яны панамі
Быць над іншымі павінны,
Бо простае вока
Гляне ў самую душу ім
Глыбока! Глыбока!
Дазнаюцца небаракі,
Чыя на вас скура,
І асудзяць... І прамудрых
Простыя абдурацы.

Каб вы вучыліся як трэба,
То й мудрасць бы была свая,
А то залезеце на неба:
І мы — не мы, і я — не я!
І я ўсё бачыў і ўсё знаю:
Няма ні пекла, ані раю,
Няма і Бога, толькі я!
Яшчэ куртаты, хітры немец,
А больш нікога!
Як жа скеміць,
Што ты такое?
Я не знаю —
Няхай скажа немец!
Так праходзіце навуку

У чужым вы краю!
Немец скажа: «Вы манголы!»
«Манголы! манголы!»
Залатога Тамерлана
Я патомак голы!
Немец скажа: «Вы славяне!»
«Славяне! славяне!»
Слаўных прадзедаў вялікіх
Праўнук я паганы!
І Колара чытаеце
Вы з усяе сілы,
І Шафарыка, і Ганку,
І ў славянафілы
Вы працеся, і ўсе мовы
Славянскіх народаў
Вы знаеце, а сваю як?
Дасць Бог, год ад году
І па-свойму загаворым,
Як немец пакажа —
І тым часам гісторыю
Нашу нам раскажа.
Вось тады мы завінемся!
Завіхацца сталі:
Па нямецкаму загаду
Так забалбаталі,
Што аж сам не ўцяміць немец —
Вучыцель вялікі,
А ўжо дзе там простым людзям!
А гвалту, а крыку!
«І гармонія, і сіла,
Музыка, дый годзе!
А гісторыя? — Паэма
Аб вольным народзе!
Што рымляне побач з намі!
Бруты-недарэкі!
У нас Бруты і Коклесы
Слаўныя навекі!
Воля ў нас расла і твар свой
Дняпром умывала,

Пад галовы горы слала,
Стэп — ёй пакрывала».
Кроўю твар яна ўмывала,
А спала на купах,
На казацкіх вольных трупах,
Абкрадзеных трупах!
Прачытайце толькі добра,
Разбярыце зноў вы
Тую славу. Ды чытайце
Ад слова да слова:
Ані цітла, ані коскі
Нідзе не мінайце,
А тады — хто мы такія? —
Пра сябе спытайце.
Чые сыны? Якіх бацькоў?
Кім, за што закуты?
Дык пабачыце, што вось хто
Вашы тыя Бруты.

Рабы, падлізы, гразь Масквы,
І гетман ваш яснавяльможны —
Варшавы панскай бруд падножны.
Чаго ж вы хваліцеся — вы,
Сыны Украіны гаротнай?
Што добра ходзіце ў ярме,
Лепш нават, як бацькі хадзілі?
Дарэмна: з вас дзяруць рамень.
А з іх, бывала, лой тапілі.
Можа, гонар ваш, што брацтва
Веру бараніла,
Што Сінопам, Трапезонтам
Галушківарыла?
Праўда, праўда, яны елі,
А вам цяпер шкодзіць,
І на Сечы мудры немец
Бульбу ўжо разводзіць,
А вы яе купляеце,
Ясцё на здароўе
Ды славіце Запарожжа.

А чыёю ж кроўю
Зямля гэта напоена,
Што так бульбу родзіць?
Усё роўна вам, каб толькі
Радзіла ў гародзе.
Хваліцеся, што мы Польшчу
Некалі звалілі!..
Польшча ўпала, ды абломкі
Вас жа раздушылі!

Дык вось як кроў бацькі лілі
І за Маскву, і за Варшаву!
І вам, сынам, перадалі
І кайданы свае, і славу!

Дазмагалася Ўкраіна
Да самага краю.
Горш за ляха свае дзеці
Яе распінаюць.
Замест піва кроў з рабрынаў
Праліваць ахвочы.
І сучаснымі агнямі
Мацерыны вочы
Прасвятляюць: хай за векам
Крочыць недарэка,
Хай за немцам патрапляе
Сляпая калека!
Што ж, вядзіце, паказвайце,
Хай старая маці
Навучаецца дзяцей тых
Новых дагледзяці.
Паказвайце! За навуку
Маці добра вельмі
Вам заплаціць калі-небудзь:
Распадуцца бельмы
На вачах паганых вашых
І жывую сілу
Дзядоў сваіх пабачыце,
Бацькоў хітрых справу.

Не дурыце самі сябе!
Думайце, чытайце,
Пераймаючы чужое,
Свайго не кідайце.
Бо хто маці забывае,
Таго Бог карае,
Таго дзеці цураюцца,
У хату не пускаюць.
Чужаніцы праганяюць,
І няма ліхому
На зямлі на ўсёй бяскрайняй
Вясёлага дому.
Я рыдаю, як згадаю
Ці як мне прысніцца
Мінулае Украіны.
Каб яго забыцца,
Я аддаў бы вясёлага
Веку палавіну.
Вось якая наша слава,
Слава Украіны!..
Вось так і вы прачытайце,
Каб наяве снілі
Усе крыўды. Каб усталі
Тыя, што ў магіле,
Перад вашымі вачамі,
Каб вы распыталі
Пакутнікаў: каго, калі,
За што распіналі!
Абніміце ж, браты мае,
Найменшага брата —
Няхай маці слёзы вытра,
Бо ліла багата.
Хай сыноў благаслаўляе
Цвёрдымі рукамі
І дзетачак пацалуе
Вольнымі губамі.
І забудземся пра сорам
Даўняе гадзіны,
І паўстане наша слава,



Слава Украіны.
Промень ясны, невячэрні
Ціха нам засвеціць.
Абніміцеся ж, малю вас,
Адной маткі дзеці!

Уюнішча, 1845

Сон

Камедыя

> Дух истины, его же мир
> не может прияти, яко
> не видит его, ниже знает его.
>
> *Іоанна, гл. 14, ст. 17*

У кожнага свая доля
І свой шлях шырокі:
Той муруе, той руйнуе,
Той нясытым вокам
За край свету зазірае,
Ці няма краіны,
Каб заграбаць ды з сабою
Ўзяць у дамавіну.
Той тузамі абірае
Ў сватняй хаце свата,
А той, спадцішка ў куточку
Точыць нож на брата.
А той, ціхі ды цвярозы,
Богабаязлівы,
Нібы кот той падкрадзецца,
Выжджа нешчаслівы
У цябе час дый запусціць
Пазуры ў пячонку,—
І не прасі: не вымаляць
Ні дзеці, ні жонка.
А той, шчодры ды багаты,
Цэрквы ўсё муруе;

Ды так бацькаўшчыну любіць,
Так па ёй гаруе,
Ажно з яе, небарачкі,
Як ваду, кроў точыць!..
А ўся брацця маўчыць сабе,
Вытрашчыўшы вочы!
Як ягняты: «Няхай,— кажа,—
Можа, так і трэба».
Так і трэба! Няма Бога
На зямлі, на небе!
А вы ў ярме падаеце
Ды нейкага раю
На тым свеце шукаеце?
Няма раю — знаю!
Шкода й працы! Падумайце:
Ўсе на гэтым свеце —
Жабраняты, цараняты —
Адамавы дзеці,
І той... і той... Ну, а я што?
Вось што, мае людзі:
Я гуляю, банкетую
Ў нядзелю і ў будзень.
А вам нудна! А вам шкода!
Яй-богу, не чую.
Не крычыце! Я сваю п'ю,
А не кроў людскую!

Вось, ідучы так каля тыну
З банкету п'яны уначы,
Я меркаваў сабе, йдучы,
Пакуль даплёўся да хаціны.
А ў мяне дзеці не крычаць
І жонка не лае —
Ціха, як у раі.
Усюды Божжа благадаць:
І ў сэрцы, і ў хаце.
Вось жа лёг я спаці.
А падпілы ўжо як засне,
Дык хоць з гармат страляць —
І вусам не маргне.

Дый сон жа, сон, надзіва дзіўны,
Сон мне прысніўся:
Найцверазейшы бы упіўся,
Скупы скарэда даў бы грыўню,
Каб паглядзець на тое дзіва.
Ды чорта з два!
Гляджу: так быццам бы сава
Ляціць лугамі, берагамі, ды нетрамі,
Ды глыбокімі ярамі,
Ды шырокімі стэпамі,
Ды байракамі.
А я за ёю ды за ёю
Ляту й прашчаюся з зямлёю.
«Бывай, свет! Бывай, зямліца,
Непрыязны краю!
Мае жудасныя мукі
Ў хмарах пахаваю.
А ты, мая Украіна,
Гаротная ўдоўка!
Я ляцець да цябе буду
З хмары на гамонку.
На гамонку ціха-сумну,
На раду з табою;
Апоўначы падаць буду
Густою расою.
Параімся, пасумуем,
Пакуль сонца ўстане,
Пакуль твае краскі-дзеці
На ворага стануць.
Бывай, родная мая ты,
Удава-нябога!
Гадуй дзетак; жыве праўда
У Госпада Бога!»

Ляцім... гляну — ўжо світае,
Край неба палае;
Салавейка ў цёмным гаі
Сонца сустракае,
Ціхусенька вецер вее,

Стэпы, нівы дрэмлюць,
Між ярамі над стэпамі
Вербы зеляненюць.
Пахіліліся сады ў дол;
Таполі паволі
Стаяць сабе, нібы варта,
Ды гамоняць з полем.
І ўсё гэта, ўся краіна,
Спавіта красою,
Зелянее, ўмываецца
Дробнаю расою.
Спакон веку ўмываецца,
Сонца сустракае...
І няма таму пачатку,
Няма яму краю!
Ніхто яго не дагледзіць
І не разруйнуе...
І ўсё так... Душа мая ты!
Чаго ты сумуеш?
Душа мая убогая!
Чаго марна плачаш?

Чаго табе шкода? Хіба ты не бачыш,
Як людзей катуюць, крыўдзяць сірату?
Дык глянь, падзівіся! А я паляту
Высока, высока за сінія хмары;
Няма там улады, няма там і кары,
Там смеху людскога і плачу не чуць.
Вунь глянь — у тым раі, што ты пакідаеш,
Латаную світку з калекі знімаюць,
Са скурай знімаюць,— бо нечым абуць
Княжат недарослых. А вунь распінаюць
За падаткі ўдоўку, а сына куюць,
Удоўкі няшчаснай ядынага сына —
Ядыну надзею! — ў войска аддаюць!
Бо войска, бач, мала! А вунь дзе пад тынам
Апухлае дзіце галоднае мрэ,
А маці пшаніцу на паншчыне жне.

А вунь — бачыш? Вочы! вочы!
На што вы здаліся?
Чаму змалку не высахлі,
Слязьмі не зліліся?
Гэта ля тыноў пакрытка
З байструком вандруе —
Бацька й маці адракліся,
Чужыя ганьбуюць!..
Старцы нават цураюцца!..
А паніч не знае:
З дваццатаю, недалетак,
Душы прапівае!

Ці Бог бачыць па-за хмараў
Нашы слёзы, гора?
Можа, й бачыць, ды падмогі —
Як і з гэтых гораў
Векавечных, што паліты
Крывёю людскою!..
Душа мая убогая,
Горанька з табою!
Уп'ямося атрутаю,
Ў лёдзе ляжам спаці,
Пашлём думку аж да Бога
Яго распытаці:
Доўга йшчэ на гэтым свеце
Катам панаваці??
Ляці ж, мая дума, крывавая мука!
Забяры з сабою ліхі ўсе датла —
Сваё таварыства! Ты з імі расла,
Кахалася з імі; іх цяжкія рукі
Цябе спавівалі. Бяры ж іх, ляці
Ды па ўсім па небе орду распусці!
Хай чарнее, чырванее,
Полымем павее,
Няхай рыгаюць зноў змеі,
Трупам зямлю грэе.
А без цябе я дзе-небудзь
Сэрца пахаваю

Ды тым часам пашукаю
На край свету раю.

Ізноў ляту па-над зямлёю,
Ізноў пращчаюся я з ёю,
Цяжка маці пакідаці
Ў непакрытай хаце,
А йшчэ горш на слёзы, латы
Яе зазіраці.

Ляту, ляту, а вецер вее,
Перада мною снег бялее;
Бары, балоты, дзе ні глянь,
І ўсюды пустата, туман.
Людзей не чуць — не знаць і следу
Людское страшнае нагі.
І вораг мой, і друг блізкі,
Бывайце! Ў госці не прыеду!
Упівайцеся, балюйце!
Я ўжо не пачую —
Адзін сабе на век векі
Ў снезе заначую.
І пакуль вы дазнаеце,
Што йшчэ ёсць краіна,
Крывёй, слязьмі не паліта,
То я адпачыну...
Адпачыну...
Ажно чую —
Загулі кайданы
Пад зямлёю... Пагляджу я...
О народ паганы!
Скуль ты ўзяўся? Што ты робіш?
Чаго ты шукаеш?
Пад зямлёю? Не! Ужо, мабыць,
Сябе не схаваю
І на небе!.. За што ж кара?
І за што мне мукі?
Каму што зрабіў калі я?

— Чые злыя рукі
Душу ў целе закавалі,
Сэрца запалілі
І сілаю груганавай
Думы распусцілі??
За што пакутую — не знаю,
Сябе сам караю!
Калі кончыцца пакута?
Канца дачакаю? —
Не бачу й не знаю!!

Заварушылася пустыня...
Як бы там з цеснай дамавіны
На той астатні страшны суд
За праўдай мерцвякі ўстаюць.
То не трупы, то не суду
Прасіць ад пакуты!
Не, жывыя гэта людзі,
Ў кайданы закуты,
З нораў золата выносяць,
Каб горла, як скрутам,
Ненасытнаму заткнуці!..
Катаржане гэта!..
А завошта? Хіба знае
Ўсёмагутны... Дзе там!

Вунь дзе злодзей штампаваны
Кайданы валоча;
Ён, разбойнік катаваны,
Зубамі скрыгоча —
Таварыша, недабітку
Зарэзаці хоча!
Паміж імі, зацятымі,
Ў кайданы убраны,
Цар сусветны. Цар волі, цар,
Штампам увянчаны!
Ў муцы, ў катарзе — не просіць,
Не стогне, не плача!

Раз дабром нагрэта сэрца —
Будзе век гарачым!
А дзе ж твае думы, ружовыя кветкі?
Гэтак дагляданы, выкаханы дзеткі?
Каму ты іх, дружа, каму перадаў?
Ці, можа, навекі ў сэрцы пахаваў?
О, не хавай, браце! Рассып іх, раскідай!
Ўзыдуць, расці будуць і у людзі выйдуць!

Ці йшчэ пакута, ці ўжо будзе?
Будзе, будзе, бо холадна,—
Мароз розум будзіць.

Ізноў ляту. Зямля чарнее.
І дрэмле розум, сэрца млее.
Гляджу я: хаты над шляхамі,
То гарады са ста царквамі;
А ў гарадах, бы жураўлі,
Замуштравалі маскалі:
І адзеты, і абуты,
І кайданамі акуты
Муштруюцца... Далей гляну:
У даліне, як бы ў яме,
На багне горад віднее;
Над ім хмараю чарнее
Туман цяжкі... Далятаю —
То горад без краю.
Ці то турэцкі,
Ці то нямецкі?
А можа, гэта і маскоўскі!
Цэрквы ды палаты
Ды паны пузаты
І не аднюсенькае хаты!

Змяркалася... Агонь — агні
Кругом запалалі —
Аж спужаўся... «Ура! Ура!
Ура!» — закрычалі.
«Цю-цю, дурні! Агледзьцеся!

Чаго вы так рады?
Што, гарыце?» — «Экой хохол!
Не знает параду!
У нас парад! Сам изволит
Сегодни гуляти!» —
«Ды дзе ж яна, тая цаца?»
«Вон видишь — палаты».
Пхнуся я, аж землячок, бач,
Дзякую, прызнаўся,
З бляшанымі гузікамі:
«Дзе ты здзесь узялся?» —
«З Украіны».— «Так як жа ты
Й говорить не ўмееш
По-здешнему?» — «Ну не, кажу,
Гаварыць умею,
Ды не хочу».— «Экой чудак!
Я все входы знаю,
Я служу тут... Калі хочаш,
В дворец попытаюсь
Цябе ўвесці. Толькі, знаешь,
Мы, брат, просвешчэнны,—
Не поскупись полтинкою...» —
«Цур табе, нікчэмны
Каламару!..» Невідомым
Стаў ізноў, як быў я,
Дый прапхнуўся у палацы.
Божа мой! Святыя!!
Дык во рай дзе! А як густа
Золатам абліты
Блюдалізы! Аж і сам вось:
Высокі, сярдзіты,
Выступае. А з ім побач
Царыца-нябога,
Бы засушаны апенек,
Тонка, даўганога,
Ды наліха йшчэ ківае
Тупа галавою.
Дык вось жа тая багіня?!
Ліханька з табою!

А я, дурны, не бачыўшы
Цябе, ляля, й разу,
Ды паверыў тупарылым
Тваім вершамазам.
Вось жа дурны! А йшчэ й біты!
На квіток паверыў
Маскалю. Ну, і чытай тут,
І дай ты ім веры!

За багамі — панства ў срэбры,
У золаце без меры!
Як раскормленыя свінні —
Мардатыя, пузатыя!..
Аж пацеюць, а тоўпяцца,
Каб то бліжай стаці
Каля самых: можа, ўдарыць
Або хвігу даці
Благаволяць, хоць маленьку,
Хоць паўхвігі, абы толькі
Пад самыя пыскі.
І у рад усе пасталі,
Нібы без'языкі —
Ані бзынкнуць!.. Цар балбоча;
А дзіва-царыца,
Быццам чапля паміж птушак,
Скача, бадзярыцца.
Доўга ўдваіх пахаджалі,
Як сычы надуты,
Ды цішком штось размаўлялі —
Здалёку нячутна —
Аб ацечастве, здаецца,
Ды новых пятліцах,
Ды аб муштрах шчэ навейшых...
А потым царыца
Села, моўчачы, на зэдлік.
Бачу: цар падходзіць
Да найстаршага... ды ў морду
Яму як закоціць!..
Аблізаўся небарака

Ды меншага ў пуза —
Загуло аж!.. А той сабе
Йшчэ меншага туза —
Паміж плечаў; той — меншага,
А меншы — малога,
А той — дробных, а драбнота
Ужо за парогам
Як кінецца па вуліцах
Дый давай мясіці
Недабіткаў праваслаўных,
Тыя ж — галасіці
Ды прагчыся... Ды як раўнуць:
«Цар наш бацюшка гуляе,
Ура!.. Ура!.. У-р-а-а-а!»

Зарагатаўся я, дый годзе;
А й мяне даўнулі-
Такі добра. На світанні
Сцішыліся гулі;
Толькі там-сям хрысціяны
Па вуглах стагналі
Ды, стогнучы, за бацюшку
Госпада благалі.
Смех і слёзы! Вось пайшоў я
Горад азіраці.
Ноч як дзень там. Пaглядаю:
Палацы, палацы
Па-над ціхаю ракою;
А бераг абшыты
Ўвесь каменнем. Дзівуюся,
Быццам з тропу збіты!
Як зрабілася яно во
З лужыны такое
Гэта дзіва!.. Бо крыві тут
Выліта людское —
Без нажа нат. А па той бок
Цвярдыня й званіца,
Як завостраная швайка,—
Аж не надзівіцца.

І дзілінгае гадзіннік.
Далей пазіраю —
Аж ляціць конь, капытамі
Скалу разбівае!
На кані сядзіць ахлапам
Ў свіце — ці без світы
І без шапкі. Нейкім лістам
Галава павіта.
Конь на дыбах — вось-вось рэчку
Вось-вось пераскоча.
А ён руку прасцірае,
Бы свет увесь хоча
Заграбці. Хто ж такі гэта?
Вось сабе й чытаю,
Што на скале накавана:
«Первому вторая»
Гэта выставіла дзіва.
Цяпер жа я знаю:
Во той *первый*, распінаў што
Нашу Украіну.
А *вторая* даканала
Ўдаву-сіраціну.
Каты! Каты! Людаеды!
Наеліся абое,
Накраліся. А што ўзялі
На той свет з сабою?
Цяжка, цяжанька мне стала.
Так, нібы чытаю
Гісторыю Украіны!
Стаю, заміраю...
А тым часам — ціха, ціха
Ды сумна спявае
Штось нябачана такое:
«А з горада, а з Глухова
Палкі выступалі
З рыдлёўкамі на лінію.
А мяне паслалі
На сталіцу з казакамі
Наказным гетманам!

О Божа наш міласэрны!
О цару паганы!
Цар пракляты, подла-хітры,
Аспід прагавіты!
Што зрабіў ты з казакамі?
Балота засыпаў
Благароднымі касцямі,
Паставіў сталіцу
На іх трупах катаваных!
І ў цёмнай цямніцы
Мяне, вольнага гетмана,
Голадам замучыў
У кайданах... Цару! Цару!
І Бог не разлуча
Нас з табою. Кайданамі
Скаваны са мною
На век векі. Не лёгка мне
Лунаць над Нявою!
Можа, Украіны далёкай
Ўжо няма — не знаю...
Паляцеў бы, паглядзеў бы,
Дык Бог не пускае.
Масква выпаліла, можа,
І Дняпро спусціла
Ў сіне мора? Раскапала
Курганы-магілы —
Нашу славу. Божа мілы!
Зжалься, Божа мілы!»

Дый замоўкла. Пазіраю:
Бела хмара крые
Неба шэрае, а ў хмары —
Бы ў гаі звер вые.
То не хмара — бела птушка
Хмараю зляцела
Над царом тым масянжовым,
Галасіла, пела:
«І мы скованы з табою,
Людаед з бярлогі!

На судзілішчы на страшным
Мы закрыем Бога
Ад вачэй тваіх пражорных.
Ты нас з Украіны
Загнаў голых і галодных
У снег на чужыну
Дый парэзаў, а з скур нашых
Сабе баграніцу
Пашыў жыламі тугімі
І заклаў сталіцу
Ў новай рызе. Падзівіся:
Цэрквы ды палацы!
Весяліся, кат пракляты,
З крывавае працы!»

Разляцеліся і зніклі.
Сонейка ўставала;
А я стаяў, дзіваваўся,
Ды аж страшна стала.
Бедакі ўжо паўставалі,
На працу спяшылі,
Маскалі ўжо на распуццях
Муштроўку рабілі.
Краем вуліц пасляшалі
Сонныя дзяўчаты,
Ды не з дому, а дадому!..
Пасылала маці
На ўсю ночку працаваці,
На хлеб зарабляці.
А я стаю, пахіліўся,
У думках разважаю:
Як то цяжка хлеб штодзённы
Людзі зарабляюць!

Вот і брація сыпнула
У сенат пісаці
Ды падпісываць, ды з родных,
З бацькі, з брата драці.

А між імі й землячкі тут
Сям-там праглядаюць,
Па-маскоўску так і рэжуць,
Смяюцца ды лаюць
Бацькоў сваіх, што іх змалку
Дзэкаць не наўчылі
Па-нямецку — а цяпер тут
Кісні во ў чарніле!
П'яўкі, п'яўкі! Можа, бацька
Астатню карову
Прадаў жыдам, пакуль выўчыў
Маскоўскае мовы.
Украіна! Украіна!
Вось жа твае дзеткі.
Твае злітыя чарнілам
Маладыя кветкі.
Маскоўскаю балбатнёю
Ў нямецкіх цяпліцах
Заглушаны!.. Плач, Украйна,
Бяздзетна ўдавіца!

Пайсці хіба паглядзеці
Да цара ў палацы,
Што там робіцца? Прыходжу —
Дворня (стаў ўзірацца)
Стаіць радам, сапе, храпе,
Насы панадзьмула,
Як індыкі, і на дзверы
Коса паглядала.
Адчыніліся во й дзверы —
І як бы з бярлогі
Мядзведзь вылез. Ледзьве-ледзьве
Пераносіць ногі,
Ды адуты, пасінеў аж:
Пахмелле праклята
Яго мучыла. Як крыкне
На самых пузатых,—
І пузатая ўся хеўра
Ў зямлю паляцела!

З ілба вылупіў ён банькі —
І ўсё задрыжэла,
Што было там! Як шалёны,
На меншых гукае —
Ў зямлю й тыя. Ён да дробных —
Тыя прападаюць!
Ён да чэлядзі — і чэлядзь,
І чэлядзь прапала.
Да маскаляў — маскалікі,
Толькі застагнала,
Пайшлі ў зямлю. А на свеце
Ўсё бы ў нейкім цудзе!
Я гляджу, што будзе далей,
Што рабіці будзе
Мой мядзведзік! Стаіць сабе,
Галаву панурыў,
Небарака. Дзе ж прапала
Мядзведжа натура?
Як той коцік — такі смешны!..
Я аж засмяяўся!
Аж пачуў ён ды як зыкне,—
Я перапужаўся
І збудзіўся...
Вось якое
Ў сне пабачыў я там
Дзіва дзіваў! Гэта ж толькі
Сніцца дурнаватым
Ды п'яніцам. Не крыўдуйце,
Браткі дарагія,
Што не сваё расказаў вам,
А то, што сасніў я.

С.-Пецярбург, 1844

Ерэтык

Паэма

Шафарыку

Падпалілі ў суседа
Новую хаціну
Злыя людзі, нагрэліся,
Пайшлі на спачынак,
Ды забылі шэры попел
Па ветры развеяць.
Ляжыць попел на ростані,
А ў попеле тлее
Іскра агню вялікага.
Тлее, не згасае,
Жджэ падпалу, як той помснік,
Часу дажыдае,
Злога часу. Тлела іскра,
Тлела, ўсё чакала
На ростані на шырокай
Ды ўжо гаснуць стала.

Вось так нямчура запаліла
Вялікі дом наш. І сям'ю,
Сям'ю славянаў падзяліла
І ціха-ціхенька ўпусціла
Нязгоды лютую змяю.

Паліліся крыві рэкі,
Пажар загасілі.
А нямчуры пажарышча
Й сірат падзялілі.
Выраслі ды ў кайданах
Славянскія дзеці
І забыліся ў няволі,
Што яны на свеце!
А на даўнім пажарышчы

Іскра брацтва тлела —
Датлявала і чакала
Цвёрдых рук ды смелых.
І прыждала... Стала бачыць
У тым тле глыбока
Агонь добры смелым сэрцам,
Смелым орлім вокам!
І засвяціў любамудры,
Светач праўды, волі...
І славянскія народы
У цьме і няволі
Пералічыў да аднаго,
Пералічыў трупы,
А не славян. І ты стаўся
На вялікіх купах —
На ростані усясветнай —
Іезекіілем.
І — о дзіва! Трупы ўсталі
І вочы раскрылі,
І брат з братам абняліся
І прагаварылі
Слова ціхае любові
Навекі і векі!
І паплылі ў адно мора
Славянскія рэкі!

Слава табе, любамудры,
Чэху-славяніне,
Што не даў ты патануці
У нямецкай плыні
Нашай праўдзе! Тваё мора
Стане морам новым!
Будзе скора яно поўным,
І паплыве човен
З шырокімі ветразямі,
Са стырном удалым,
Паплыве па вольным моры,
На шырокіх хвалях.

Слава табе, Шафарыку,
Вавекі і векі,
Што сабраў ты ў адно мора
Славянскія рэкі!

Прывітай жа ў сваёй славе
І маю нябогу,
Лепту-думку нямудрую
Пра чэха святога,
Вялікага мучальніка,
Пра слаўнага Гуса!
Прымі, ойча. А я ціха
Богу памалюся,
Каб усе славяне сталі
Добрымі братамі,
І сынамі сонца праўды,
І ерэтыкамі,
Вось такімі, як канстанцкі
Ерэтык вялікі!
І мір свету падаруюць,
І славу вавекі!

У Пераяславе, 1845

Камень, его же небрегоша зиждущий,
сей бысть в[о] главу угла: от Господа
бысть сей, и есть дивен во очесех наших.

Псалом 117, ст. 22

«Кругом няпраўда і няволя,
Народ замучаны маўчыць.
І на апостальскім прастоле
Чарнец адкормлены сядзіць.
Крывёй гандлюе пад'ярэмных
І рай у наймы аддае!
Цару нябесны! Надарэмны
Твой суд і царствіе твае.

Разбойнікі, людаеды
Праўду пабаролі,
Асмяялі тваю славу,
І сілу, і волю.
У кайданах зямля плача,
Як па дзецях маці.
Няма каму раскаваці,
Аднадушна стаці
За Евангелле той праўды,
Якой прагнуць людзі!
Няма каму! Божа! Божа!
Ці ж то так і будзе?
Не! Настане час вялікі
Нябеснае кары!
Ці разломім тры кароны
На гордай ціары!
Так, разломім! Благаславі
На помсту, на мукі,
Благаславі мае, Божа,
Няцвёрдыя рукі!»

Вось так у келлейцы праўдзіва
Іван Гус думаў разарваць
Аковы пеклавы!.. І дзіва,
Святое дзіва паказаць
Вачам нязрачым.
«Пабарусь!..
За мяне Бог!.. Хай споўніцца!»
І ў віфліемскую капліцу
Пайшоў маліцца добры Гус.

«У імя Госпада Хрыста,
За нас распятага на дрэве,
І ўсіх апосталаў святых,
Пятра і Паўла асабліва,
Мы адпускаема грахі
Вось гэтай булаю святою
Рабыні божай...»

«Вось той самай,
Што вадзілі па вуліцах
Пазаўчора ў Празе.
Вось той самай, што сланялась
Па шынках, па стайнях,
Па пярэсмыках манашых
І па келлях п'янай!
Вось яна і зарабіла
Ды булу купіла:
Святой стала!.. Божа! Божа!
Вялікая сіла!
Вялікая слава! Зірні на людзей!
Адпачыць ад кары у прасветлым раі!
За што прападаюць? За што ты караеш
Сваіх і пакорных, і добрых дзяцей?

За што закрыў іх, Божа, вочы
І вольны розум акаваў
Кайданамі ліхое ночы?
Празрыце, людзі,— дзень настаў!
Распраўце рукі, мрок аблуды
Развейце, чэхі, будзьце людзі,
А не пасмешышча папам!
Ка́ты, разбойнікі ў ціарах
Ўсё патапілі, ўсё ўзялі,
Як у Маскоўшчыне татары,
І нам, сляпым, перадалі
Свае дагматы!.. Кроў, пажары,
Ўсё зло на свеце, як біч кары,
Пякельных мук бясконцы рад...
І поўны Рым байстрат!
Вось догматы іх і іх слава!
То слава ў яве!.. А цяпер
Вось тым паложана канклавам:
Хто без святой булы памёр,—
У пекла пойдзе! Будзе ж плата
За булу ўдвойчы — рэж хоць брата,
Апроч пап і чарняца,
І ў рай ідзі! Канец канцам!

І злодзея ж зладзей акрадзе,
Ды яшчэ ў цэркві. Гады! Гады!
Ці напіліся вы, ці не
Людской крыві?.. І хіба мне,
Вялікі Госпадзі, маломў,
Судзіці дзеянні тваё
Волі святой? Кары свае
Ты без віны не шлеш нікому.

Малюся, Госпадзі, памілуй,
Выбаў ты нас, святая сіла!
Парань язык мой за хулы
Ды ранай выбаў з боляў злых.
Не дай жа здзеквацца лукавым
І над тваёю вечнай славай,
Й над намі, простымі людзьмі!..»

І плакаў Гус у тым маленні,
І цяжка плакаў... Люд маўчаў
І моўчкі думаў у здзіўленні:
Супроць каго руку падняў?

«Глядзіце, людзі! Вось дзе була,
Што я чытаў!» — і паказаў
Народу. Боязь агарнула:
Іван Гус булу разарваў!!
І з віфліемскае капліцы
Аж да сусветнае сталіцы
Пагудка шумная пайшла.
Манахі ў страху... Нібы кара,
Канклаў пагудка затрасла,—
І пахілілася тыяра!
Зашыпела, як гадзюка,
Погань з Ватыкана.
Шапочацца Авіньёна
З рымскімі папамі;
Шапочуцца антыпапы,

Аж сцены трасуцца
Ад шопату. Кардыналы,
Як гадзюкі, ўюцца
Ля тыяры. Ды ціхачом,
Як каты, дзяруцца
За мышанё... Ды як зноў жа?
Аднае той скуры
Гэтка сіла!.. А мясішча!!!
Аж дрогнулі муры,
Як успомнілі, што ў Празе
Гегекнулі гусі
Ды з арламі ляцяць біцца...
Канклаў схамянуўся,
Сабраў раду. Ухвалілі:
Усім разам стаці
Супроць Гуса, і ў Канстанцы
Варанне склікаці,
І сцерагчы, колькі сілы,
І згары і здолу,
Каб не села тая птаха
На славянскім полі.
І варанне поле ўкрыла —
Папы павалілі
Да Канстанцы, шляхі, стэпы
Саранчой забілі
Бароны, герцагі і д'юкі,
Псары, герольды, шынкары,
І трубадуры (кабзары),
І шляхам войска, як гадзюкі.
І герцагіні з немчурою.
Хто з сакаламі на руках,
Хто пешкі, верхам на аслах,—
Бы на аблаву ўсе гурмою,
Як гады, ў вырай, аж кішаць!

О чэху! Дзе твая душа??
Глядзі, што сілы паваліла,
Як сарацына ваяваць
Або вялікага Атылу!

У Празе глуха гаманяць,
І цэсара, і Вячаслава,
І той сабор тысячаглавы
Уголас лаюць і пускаць
На сход не хочуць яны Гуса...
«Жыў Бог! Жыва душа мая!
Браты, я смерці не баюся!
Я давяду ўсім тым вужам!
І ненасытнае іх вырву джала!..»
І чэхі Гуса праважалі,
Як дзеці бацьку.

Зазванілі у Канстанцы
Рана ва ўсе звоны.
Тлум сабраўся кардыналаў,
Гладкіх і чырвоных,
Як бугаёў на выпасе,
І натоўп прэлатаў,
І тры папы, і баронства,
І князёў багата.
Сабраліся, як Іуды
На суд няпраўдзівы
Супроць Хрыста. Сваркі, гоман —
То раве, то вые,
Нібы нейкі дзікі табар
Ці кагал у школе...
І — ўсім разам як зарвала!..

Як кедр сярод поля
Ліванскага,— у кайданах
Стаў Гус перад імі.
І акінуў нечасцівых
Орлімі вачымі.
Затрасліся, пабялелі,
Моўчкі азіралі
Мучальніка. «Што ж вы мяне —
На дыспут пазвалі?
Ці каб глядзець на кайданы?»

«Маўчы, чэх бязверы...» —
Гадзюкаю зашыпелі,
Зараўлі, як зверы.
«Ты ерэтык! Ты ерэтык!
Ты сееш расколы!
І нязгоды развіваеш,
Свяцейшае волі
Не прымаеш!.. Адно слова! —
Ты Богам праклятты!
Ты ерэтык! Ты ерэтык!..» —
Раўлі ўсе прэлаты.
«Ты усобнік!.. Адно слова —
Ты ўсімі праклятты!..»
Паглядзеў Гус на прэлатаў
Дый пайшоў з палаца.
«Пабаролі! Пабаролі!..» —
Нібы звар'яцелі.
«Аўтадафэ! Аўтадафэ!..» —
Гуртам заравелі.

І ўсю ноч банкетавалі
Папы, бароны... Ўсе пілі
І сп'яна Гуса праклінапі,
Аж покі звоны загулі.
І дзень настаў... Ідуць маліцца
Ксяндзы за Гуса. З-за гары
Выходзіць сонца, аж гарыць.
І сонца хоча падзівіцца,
Што будуць з праведным тварыць?!

Зазванілі ва ўсе звоны.
І павялі Гуса
На Галгофу у кайданах...
І не пахіснуўся
Перад агнём. На агні стаў
І моліцца Богу:
«О Госпадзі міласэрны!
Што зрабіў я злога
Гэтым людзям, тваім людзям?

За што мяне судзяць?
За што мяне распінаюць?
О людзі вы, людзі!
Маліцеся! Вы — нявінны!
І з вамі так будзе!
Маліцеся! Прыйшлі зверы злыя
У авечых шкурах,
Кіпці распусцілі...
Ні горы, ні муры
Не схаваюць. Разальецца
Чырвонае мора
Крыві. Крыві з дзяцей вашых...
О гора! О гора!
Унь яны! Ў адзежах ясных.
Іх лютыя вочы...
Ужо ў крыві...» —
«Палі! Палі!» —
«Крыві! Крыві хочуць!
Крыві вашае!..» І дымам
Праведнага ўкрыла.
«Маліцеся! маліцеся!
Госпадзі, памілуй,
Даруй ты ім — не ведаюць!..»
Ды не чутна стала!
Вакол агню, як сабакі,
Укруг манахі сталі.
Баяліся, каб не вылез
Гадзюкаю з жару
Ды не павіс на кароне
Або на тыяры.

Пагас агонь, дзьмухнуў вецер
І попел развеяў.
І бачылі на тыяры
Чырвонага змея
Людзі простыя. Манахі
Te deum спявалі.
Разышліся па хаўтурах
І хаўтуравалі

І дзень і ноч, аж папухлі.
Малою сям'ёю
Прыйшлі чэхі, зямлі ўзялі
З таго кастра, з ёю
Пайшлі ў Прагу. Гэтак Гуса
Ксяндзы асудзілі,
Запалілі... Ды Божага
Слова не спалілі,
Не згадалі, што вылецiць
Арол з па-над хмары —
Замест гуся — і расклюе
Папскую тыяру.
Дык няхай ім! Разбрыліся,
Як тыя вароны,
З крывавага таго свята
Манахі, бароны,
Парасселіся ў будынках,
Клопату не маюць,
Банкетуюць, час ад часу
Te deum спяваюць.
Ўсё зрабілі... Ды чакайце!
Унь над галавою
Стары Жыжка з Табарова
Махнуў булавою.

с. Мар'інскае, 1845

Каўказ

Паэма

Шчыраму майму Якаву дэ Бальмэну

Кто даст главе моей воду,
и очесем моим источник слез,
и плачуся и день и нощь
о погибиенных...

Иеремии, гл. 9, ст. 1

За гарамі горы, хмараю спавіты,
Засеяны горам, крывёю паліты!
Спакон веку Праметэя
Там арол карае,
Штодзень божы яму рэбры
Й сэрца разбівае,
Разбівае, ды не вып'е
Крыві жывой з сэрца —
Ізноў яно ажывае
Ды ізноў смяецца.
Не ўмірае душа наша,
Не ўмірае воля,
І пражора не выара
На дне мора поле,
Не скуе душы жывое
І слова жывога,
Не паганьбіць славы Бога,
Вялікага Бога.

Не нам у спрэчку з табой стаці!
Не справы нам твае судзіць!
Нам толькі плакаць, плакаць, плакаць
І хлеб штодзённы замясіць
Крывавым потам і слязамі.
І каты бэсцяцца над намі,
А праўда наша п'яна спіць.
Калі яна пратрэ вочы?

Калі адпачыці
Ляжаш, стомлены, ты, Божа,
І нам дасі жыці?
А мы верым тваёй сіле
І духу жывому,
І табе аднаму
Памоляцца ўсе языкі
Вавекі і векі.
А пакуль што цякуць рэкі,
Крывавыя рэкі!..

За гарамі горы, хмарамі спавіты,
Засеяны горам, крывёю паліты!
Вось тамка міласцівы мы...
Бы тую лань у чыстым полі,
Злавілі залатую волю
Дый цкуямо... Лягло касцьмі
Людзей муштраваных нямала.
А слёз? Крыві? Ўсіх напаіць
Тут імператараў бы стала
З дзяцьмі і ўнукамі, ўтапіць
У ўдовіх слёзах... А дзявочых,
Пралітых скрытна сярод ночы?
А матчыных гарачых слёз,
А бацькавых, старых, крывавых?
Не рэкі — мора... Льецца скрозь
Крывёю мора! Слава! Слава!
Хартам, і гончым, і псарам,
І нашым бацюшкам-царам
Слава!
І вам слава, скалы, горы,
Снягамі спавітым,
І вам, рыцарам вялікім,
Богам не забытым!
Змагайцеся, а зможаце:
Вам Бог памагае!
За вас праўда, за вас слава
І воля святая!

Чурэк і сакля — ўсё тваё:
Яно не прошана, не дана,
Ніхто й не возьме за сваё,
Не павядзе цябе ў кайданах.
А ў нас!.. На то ж пісьменны мы,
Чытаем Божыя глаголы!
І ад глыбокае турмы
Ды да высокага прастола —
Усе мы ў золаце і голы.
Да нас вучыцца! Наўчым мы,
Пачым і хлеб, і соль пачым!..
Мы хрысціяне: цэркваў ў волю,
Усё дабро, сам Бог у нас!
Нам толькі сакля вочы коле:
Чаго яна стаіць у вас,
Не намі дана? Чаму вам
Чурэк жа ваш ды вам не кінем,
Як таму псу! Чаму вы нам
Плаціць за сонца не павінны,—
Ці ж гэта ўсё!.. Мы не паганы,
Сапраўдныя мы хрысціяне —
Крыхой мы сыты! А зато,
Як бы вы з намі падружылі,
Мы шмат чаму б вас навучылі!
У нас жа й свету... Як на то —
Адна Сібір неісхадзіма!
А турм? А люду? Што й лічыць?
Ад малдаваніна да фіна
На мовах ўсіх усё маўчыць...
Бо благадзенствуе... У нас
Святую Біблію чытае
Святы чарнец і навучае,
Што цар якісь-та свінні пас
Ды, ўзяўшы сабе жонку ў друга,
Забіў ён друга й валацуга.
На небе сеў, так як і ў нас
Сядзяць на небе! Вы йшчэ цёмны,
Святым крыжом не прасвяшчоны.
Навучым мы! У нас дзяры,

Дзяры ды дай —
І проста ў рай,
Хоць і радню ўсю забяры!
У нас! Чаго толькі не ўмеем?
І зоры лічым, грэчку сеем,
Французаў лаем. Прадаем
Або і ў карты прайграем
Людзей... не неграў... а такіх,
Хрышчоных жа... але п р а с т ы х.
Мы не гішпаны! Крый нас божа
Крадзенае перакупляць,
Як гандляры: мы па закону!..

Па закону апостала
Вы любіце брата?
Суесловы, ліцамеры,
Госпадам пракляты!
Вы бо любіце на браце
Скуру, а не душу!
Дый лупіце па закону:
Дочцы на кажушак,
На пасаг байстручаняці,
Жонцы на гарсэцік,
Для сябе ж — аб чым не знаюць
Ні жонка, ні дзеці!

За каго ж ты распінаўся,
Хрысце, сыне Божы?
За нас, добрых, ці за слова
Ісціны? Ці, можа,
Каб мы цябе асмяялі?
Яно ж так і стала!

Капліцы, храмы і іконы,
І свечкі, і кадзіла дым,
І перад вобразам тваім
Бесперапынныя паклоны —
За крадзеж, за вайну, за кроў,—
Каб братнюю праліць кроў, просяць
І после ў дар табе прыносяць
З пажару ўкрадзены пакроў!!

Прасвяціліся!.. Ды хочам
Для другіх прасветы,
Сонца праўды паказаці
Сляпым, бачыш, дзеткам...
Ўсё пакажам! Толькі дайце
Сябе ў рукі ўзяці.
Як і турмы мураваці,
Кайданы каваці
І насіць як... І як плесці
Бізун з вузлаваццем,—
Ўсяго наўчым! Толькі дайце
Свае скалы, горы
Астатнія... бо ўжо ўзялі
І поле і мора!

І цябе загналі, мой друже ядыны,
Якаве мой добры! Не за Украіну,
А за яе ката прыйшлося праліць
Светлую сваю кроў,— атрутай запіць —
З маскоўскае чашы атрутны напітак!
О мой друже добры! Друже незабыты!
Жывою душою на Ўкрайне вітай;
Лётай з казакамі па-над берагамі,
Разрыты магілы ў стэпе назірай,
Заплач з казакамі дробнымі слязамі
І мяне з няволі ў стэпе выглядай!
А пакуль што — мае думы,
Маё злое гора,
Зіяць будуць і растуць хай
Ды з ветрам гавораць...
Вецер ціхі з Украіны
Панясе з расою
Мае думы да цябе аж!..
Братняю слязою
Ты іх, друже, прывітаеш,
Веру, не прагоніш...
І магілы, стэпы, мора
І мяне ты ўспомніш.

У Пераяслаўе, 1845

Заповіт

Як умру, то поховайте
Мене на могилі
Серед степу широкого
На Вкраїні милій,
Щоб лани широкополі,
І Дніпро, і кручі
Було видно, було чути,
Як реве ревучий.
Як понесе з України
У синєє море
Кров ворожу... отойді я
І лани і гори —
Все покину і полину
До самого Бога
Молитися... а до того
Я не знаю Бога.
Поховайте та вставайте,
Кайдани порвіте
І вражою злою кров'ю
Волю окропіте.
І мене в сем'ї великій,
В сем'ї вольній, новій,
Не забудьте пом'янути
Незлим тихим словом.

У Пераяславе, 1845

Запаведзь

Як памру, дык пахавайце
Мяне на магілі[1]
Сярод стэпу шырокага
На Ўкраіне мілай.

[1] Верш друкуецца з захаваннем арфаграфіі арыгінала. *(Заўвага ўкладальнікаў.)*

Каб шырокія палеткі,
І Дняпро, і кручы
Было б відна,— было чуці,
Як раве равучы!

Як пацягне з Украіны
Ды ў сіняе мора
Кроў варожу,— вось тады я
І палеткі й горы

Усе пакіну й панясуся
Да самога Бога
Маліціся. А да тога
Я ні знаю Бога!

Пахавайце ды ўставайце,
Кайданы парвеце
І варожай злой крывёю
Волю акрапеце!

І мяне ў сям'і вялікай,
У сям'і вольнай, новай,
Не забудзьце памянуці
Ні злым, ціхім словам.

Пераклад Макара Краўцова

Запаведзь

Як памру я, пахавайце
На Ўкраіне мілай,
Сярод стэпу на кургане,
Дзе продкаў магіла:
Каб нязмеранае поле,
Дняпро і абрывы
Было відна, было чутна,
Як раве бурлівы!

Як пагоніць з Украіны
У сіняе мора
Кроў варожу... Во тады я
І нівы, і горы —
Ўсё пакіну й да самога
Бога палунаю
Маліціся... А да тых пор
Бога я не знаю!
Пахавайце ды ўставайце,
Кайданы парвіце
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце!
І мяне ў сям'і вялікай,
Ў сям'і вольнай, новай,
Не забудзьце памянуці
Добрым ціхім словам.

Пераклад Янкі Купалы

Запавет

Як памру, дык пахавайце
Мяне на кургане,
Сярод стэпу шырокага
На Ўкраіне слаўнай,
Каб бяскрайнія разлогі,
І Дняпро, і кручы
Было відна, было чутна,
Як грыміць грымучы.

Як ён змые з Украіны
У сіняе мора
Кроў ворагаў... Вось тады я
І поле і горы —
Ўсё пакіну, паляту я
Да самога Бога
Памаліцца... Да таго ж я —
Не ведаю Бога.

Пахавайце ды ўставайце,
Ланцугі парвіце
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
Сям'і вольнай, новай,
Памянуць вы не забудзьце
Добрым ціхім словам.

Пераклад Змітрака Бядулі

Запавет

Як памру, то пахавайце
Мяне на магіле
Сярод шырокага стэпу
На Ўкраіне мілай,
Каб прасторы, і абрывы,
І Дняпро сівога
Можна бачыць было, чуць, як
Пеніцца ў парогах!

Як пагоніць з Украіны
У сіняе мора
Кроў варожую — тады я
У жалі і горы —
Ўсё пакіну, падымуся
Да Бога самога
Памаліцца. Да таго — я
Не ведаю Бога!

Пахавайце і ўставайце,
Кайданы парвіце,
Злой варожаю крывёю
Волю акрапіце!
І мяне ў сям'і вялікай,
Ў сям'і новай, вольнай,
Не забудзьце тады словам
Ціхім, добрым ўспомніць.

Пераклад Максіма Танка

Запавет

Як памру, дык пахавайце,
Дзе курган палынны,
Сярод стэпу шырокага
Мілай Украіны.
Каб шыракапола долы,
І Дняпро, і кручы
Мне відаць былі, каб чуў я,
Як раве равучы.

Як пагоніць з Украіны
У сіняе мора
Кроў варожую… тады я
І долы і горы —
Ўсё пакіну і падамся
Да самога Бога
Памаліцца… А да тога —
Я не знаю Бога.

Пахавайце ды ўставайце,
Кайданы парвіце
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
Ў сям'і вольнай, новай,
Не забудзьце — памяніце
Нязлым ціхім словам.

Пераклад Рыгора Барадуліна

Запавет

Як памру я, пахавайце
Не ў зямлі панылай —
У шырокім родным стэпе,
На Ўкраіне мілай,

Каб раздольныя разлогі,
І Дняпро, і кручы
Былі побач, было чутна,
Як раве равучы.
Панясе ён з Украіны
У сіняе мора
Кроў варожую... — тады я
І даліны й горы —
Ўсё пакіну і памкнуся
Да самога Бога,
Каб маліцца... а да тога
Я не знаю Бога.
Пахавайце ды ўставайце,
Кайданы парвіце
І варожай злою кроўю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
Сям'і вольнай, новай,
Памянуць вы не забудзьце
Нязлым ціхім словам.

Пераклад Васіля Жуковіча

Запавет

Як памру — на Украіне
Мяне пахавайце,
Сярод стэпу на кургане
Дол мне пракапайце,
Каб разлеглыя палеткі,
І Дняпро, і кручы
Мог пабачыць і пачуць мог,
Як раве равучы.
Як пагоніць з Украіны
У сіняе мора
Кроў варожую... тады я
І палі, і горы —

Ўсё пакіну і ўзнясуся
Да самога Бога —
Памаліцца... а да тога
Мне не трэба Бога.
Пахавайце ды ўставайце,
Кайданы парвіце
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
У свабоднай, новай,
Хаця б зрэдку памяніце
Добрым ціхім словам.

Пераклад Вячаслава Рагойшы

Запавет

Як памру, дык пахавайце
Вы мяне ў магіле
У шырокім вольным стэпе
На Украйне мілай,
Каб відаць былі і поле,
І Дняпро, і кручы,
Каб я чуў адтуль міжволі,
Як раве равучы.
А як хлыне з Украіны
Ды пальецца ў моры
Кроў варожая — пакіну
І палі, і горы
І пайду тады адгэтуль
Да самога Бога,
Каб маліцца, а пакуль што
Я не знаю Бога.
Пахавайце ды ўставайце —
Кайданы парвіце
І варожаю крывёю
Волю акрапіце!

І мяне ў сям'і вялікай,
Ужо вольнай, новай,
Не забудзьце — памяніце
Добрым ціхім словам.

Пераклад Яўгена Міклашэўскага

Запавет

Як памру, то пахавайце
На Ўкраіне мілай,
Сярод стэпу на кургане
Будзе хай магіла,
Каб палёў абсяг шырокі,
І Дняпро, і кручы
Было бачна, было чутна,
Як раве равучы.
Як з Украйны панясе ён
У сіняе мора
Кроў варожую... тады я
І палі, і горы —
Кіну ўсё і ў неба рыну,
Да самога Бога,
Каб маліцца... а датуль я
Не ведаю Бога.
Пахавайце ды ўставайце —
Кайданы парвіце
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце.
І мяне ў сям'і вялікай,
Сям'і вольнай, новай,
Не забудзьце, памяніце
Нязлым ціхім словам.

Пераклад Валерыя Стралко

ІВАН КАТЛЯРЭЎСКІ
(1769—1838)

Іван Пятровіч Катлярэўскі нарадзіўся ў Палтаве ў сям'і канцылярыста з магістрата. Вучыўся ў Палтаўскай семінарыі. Спачатку, як і бацька, быў супрацоўнікам канцылярыі, потым — хатнім настаўнікам. Ажно 12 гадоў (1796—1808) знаходзіўся на службе ў царскай арміі, з іх частку тэрміну праслужыў у беларускім горадзе Ліда. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў выхавацелем у дзіцячым доме, дырэктарам Палтаўскага тэатра.

Катлярэўскі ўвайшоў у гісторыю як заснавальнік новай украінскай літаратуры. У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, прадстаўнікоў старажытнага перыяду развіцця літаратуры, якія ў сваёй творчасці — адпаведна да ўмоў і запатрабаванняў часу — карысталіся царкоўнаславянскай ці лацінскай мовамі з пэўным дамешкам народнай лексікі, Катлярэўскі ўвёў у літаратурны ўжытак украінскую мову як паўнамоцную гаспадыню.

У гэтым плане вельмі паказальнымі з'яўляюцца абодва яго галоўныя творы — і паэма «Энеіда» (друкавалася па частках з 1798-га па 1842 г.), і п'еса-драма-опера «Наталка Палтаўка» (1819).

У развіцці культуры розных народаў велізарны ўклад уносіць тэатральнае мастацтва. Роля тэатра ў жыцці грамадства ў час станаўлення яго нацыянальнага самаўсведамлення асабліва важкая. Іван Катлярэўскі ўпісаў залатую старонку ў развіццё ўкраінскай нацыянальнай культуры. Ён як фундатар, мастацкі кіраўнік, аўтар рэпертуару, зрэшты, як акцёр спрычыніўся да стварэння Палтаўскага драматычнага тэатра, які фактычна з'явіўся першым прафесійным украінскім тэатрам. П'еса «Наталка Палтаўка» паклала шчаслівы пачатак багатай і разнастайнай жыццесцвярджальнай украінскай драматургіі.

«Энеіда», якая непасрэдна паўплывала на з'яўленне беларускай «Энеіды навыварат»,— тыповы ўзор героіка-камічнай травесційнай паэмы. Тут яе жанравыя адзнакі супадаюць з творамі аналагічнай тэматыкі з раманскіх, нямецкай і рускай літаратур. Арыгінальнасць пісьменніка ў тым, што даўніх герояў, пра якіх пісаў яшчэ славуты Вергілій, Катлярэўскі перайначыў ва ўкраінскіх

казакоў. Гэта дало магчымасць Катлярэўскаму раскрыць перад чытачамі багаты ўкраінскі фальклорна-этнаграфічны матэрыял. Зрэшты, украінскасць твора яшчэ ў большай ступені абапіраецца на ўласную нацыянальную гісторыю, на сутнасць народнага характару, якія праяўляюцца і ў буднях, і ў баі, і не ў апошнюю чаргу — на гарэзны гумар і самаіронію. Паэма Катлярэўскага вызначаецца кампактнасцю сюжэтных ліній, цэласнасцю кампазіцыі.

Цалкам пераклаў паэму «Энеіда» на беларускую мову народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў.

Урыўкі з паэмы і пераказ асобных яе раздзелаў даюцца паводле выдання:

Катлярэўскі Іван. Энеіда. Мінск: Беларусь, 1969.

Энеіда

Паэма

(Адаптацыя)

Эней быў маладзец рухавы,
Казак што трэба, хлопец-зух,
Прыдатны да ўсялякай справы
І валацуга з валацуг.
Ён, як спалілі Грэкі Трою[1],
З яе зрабіўшы сціртu гною,
Даў драла з торбаю пустой;
Вайной абсмаленых Траянцаў,
Брытагаловых галадранцаў,
Забраў, як уцякаў, з сабой.

Ён, хутка парабіўшы чоўны,
На хвалі мора іх спусціў,
Траянцаў насадзіўшы поўна,
Куды глядзелі вочы, плыў.
Але Юнона, злыбядуха[2],
Расквохталася, як квахтуха,—
Энея не любіла — страх;
Ужо даўно яна хацела,
Каб вытрас дух ягоны з цела
Сам д'ябал і развеяў прах.

Эней не даспадобы сэрцу
Юноны — ён яе ўгнявіў:
Ён быў гарчэйшы ёй ад перцу,
Яе спагады не прасіў;

Ды горай быў нялюб за тое,
Што, бачыш, нарадзіўся ў Троі
І маткаю Венеру зваў[3];
Што дзядзькам быў яго таксама
Парыс, памёршы сын Прыяма,
Які Венеры яблык даў.

Пабачыла Юнона з неба,
Што пан Эней пусціўся ў шлях;
Пра тое ёй шапнула Геба...[4]
Юнонай авалодаў жах!
У санкі паву запрагала,
Пад хустку каснікі схавала,
Каб не свяцілася каса;
Карсет як след зашнуравала
І з хлебам-соллю паімчала
У дом Эола, як аса[5].

«Здароў, Эол, пан браце-сваце,
Як маешся, мой дабрадзей? —
Гаспадара спытала ў хаце
Юнона.— Ці чакаў гасцей?»
Паставіла талерку з хлебам
Перад старым Эолам-дзедам,
Сама садзілася на ўслон.
«Зрабі мне ласку, дабрадзею!
Не дай пазбыць бяду Энею.
Цяпер плыве па моры ён.

Ты знаеш, што ў яго на мэце,
Ён рабаўнік і гарлахват,
Як будзе вандраваць па свеце,
Нямала свет зазнае страт.
Накліч бяду на ліхадзея,
Каб людзі верныя Энея
Пагінулі і каб ён сам...
За гэта дзеўку-чарнаброўку,
Красуню, ягадку, сяброўку,
Табе я, Бог за сведку, дам».

«Гэй, гэй! Ой ліха, ліха кату! —
Насупіўся Эол стары.—
Я ўсё б за гэтакую плату
Зрабіў, ды распусціў вятры:
Барэй яшчэ ляжыць з пахмелля[6],
А Нот паехаў на вяселле,
Зефір, нягоднік, баламут,
З дзяўчатамі зажаніхаўся,
Эўр у падзёншчыкі наняўся,
Вось і рабі што хочаш тут!

Ды аплявухай участую
Я гада — не ўцячэ Эней;
У міг адзін яго магу я
Загнаць у багну да чарцей.
Ну, а цяпер бывай здарова!
Аднак свайго трымайся слова,
Аб змове нашай ні гугу!
Як ашукаеш, не вітайся,
На ласку больш не спадзявайся,
Табе я не дапамагу».

І тут пачаў Эол на ўзмор'е
Склікаць усе свае вятры
З загадам сапсаваць надвор'е...
Пайшлі па моры пухіры!
На хвалях зашумела пена,
Вада крыніцай закіпела,
Эней аж крыкнуў — проста жах;
Заплакаў, зарыдаў ад гора,
Яго шпурляла ў чоўне мора —
У ранах цела і ў струпах.

Вятры праклятыя ўзняліся,
А мора грознае раве;
Слязьмі Траянцы абліліся,
Энея за жывот бярэ;
Усе чаўны параскідала,
Людзей пагінула нямала;
Хапіла злой бяды на ўсіх!

Эней крычыць, што «я Нептуну
У лапу торбу грошай суну,
Абы на моры шторм заціх».

Пачуў пра грошы абдзірала
Нептун, пакінуў з крэктам печ;
Яго такое ўсхвалявала —
Бо грошы неблагая рэч!
І ўмомант асядлаўшы рака,
Імчаў, як на кані ваяка;
Да берага пад'ехаў сам;
Ліхім вятрам загадваў грозна:
«Чаго гудзіце вы так розна,
Няма на мора ходу вам!»

Тут схамянуліся, як птахі,
Вятры і драла, хто куды,
Ды гэтак, як да лесу Ляхі[7]
Альбо ад вожыка харты.
Нептун жа ўзяў мятлу-мятліцу
І вымеў мора, як святліцу,
І сонца глянула на свет.
Нібы нанова нарадзіўся
Эней тады, перахрысціўся
Ды загадаў варыць абед. [...]

Венера, жвавая, ўвішная,
Пачуўшы, што Эол сівы
На сына жаху наганяе,
Што той, няшчасны, ледзь жывы,
Прыбралася ва ўбор багаты,
Нібы спяшалася на свята
Альбо на танцы да сяла! —
На галаве каўпак парчовы[8],
З вусамі кунтуш галуновы,
Зевесу скардзіцца пайшла.

Зевес тым часам піў сівуху[9]
І еў са смакам селядца;

Канчаў ён сёмую васьмуху,
Асушваў кварту да канца.
Тут ён, усю ў слязах, Венеру
Убачыў, шчырага намеру
Яна не ўтойвала зусім:
«Майму Энею, татка любы,
Загубцы зноў жадаюць згубы
І чыняць новы гвалт над ім.

Ды не! не быць Энею ў Рыме!
Хутчэй чорт здохне пад сасной!
Ці зноў засядзе Хан у Крыме[10],
Ці сыч ажэніцца з савой.
Ды хто не ведае Юнону?
Без нагавору, без праклёну
Не можа жыць яна між нас!
Каб больш Юнона не шалела,
Замоўкла і не вар'яцела,
Ты даць павінен свой наказ».

Зевес, усё дапіўшы з кружкі,
Сваёй рукой пагладзіў чуб:
«У праўдзе я, мая дачушка,
Заўсёды цвёрды быў, як дуб.
Эней сваё здабудзе царства,
Мець будзе моцнае ўладарства
І стане немалым панком.
На паншчыну ўвесь свет пагоніць,
Нямала дзецюкоў наплодзіць
І ўсім ім будзе важаком...»

[Як бачым, у пачатку І часткі твора адразу ж даецца завязка дзеяння. Тут жа здзяйсняецца першы падыход да раскрыцця прыхаванай за вонкавай падзейнасцю галоўнай ідэі твора. Аўтар падводзіць чытачоў да думкі пра богаабранасць народа, якім кіруе Эней. Самому Энею, у радаводзе якога і чалавечая, і боская кроў, наканавана лёсам са зруйнаваных, спаленых у войнах родных мясцін вывесці народ у шчаслівую зямлю і заснаваць там моцную самастойную

дзяржаву. Звернем увагу, што не хто іншы, а менавіта галоўны бог Зеўс выказвае думку пра высокае прызначэнне Энея. Паколькі кіраўнік траянскага войска быў сынам Венеры і Анхіза, Юнона, заўсёдная саперніца Венеры, на працягу ўсяго твора ўсяляк яму перашкаджае. Таму Эней, знаходзячыся ў залежнасці ад настрою нябесных багоў, якія самі праводзяць час у банкетах, сварках і зайздрасці, пад уплывам абставін на нейкі час забываецца пра тое заданне, якое атрымаў ад багоў,— знайсці Італію і пабудаваць свой Рым. Вырушыўшы са сваім войскам на пошукі новай зямлі абяцанай, ён трапляе ў розныя прыгоды. Далей распавядаецца пра бесклапотныя любоўныя гульні Энея з Дзідонай на востраве Карфаген[11]. Зеўс, выпадкам даведаўшыся пра легкаважныя забавы Энея, моцна разгневаўся і даў наказ Меркурыю прагнаць Энея з Карфагена.

У II частцы ідзе гаворка пра новыя прыгоды траянцаў: вандруючы па моры, яны на гэты раз трапляюць у Сіцылію, дзе ізноў бязмэтна бавяць час у кулачных бойках, гулянках і танцах, апісанне якіх адпавядае традыцыі ўкраінскага этнасу. Урэшце раўнівыя і помслівыя жанчыны, з намовы багінь, ледзь не спалілі іхнія караблі.

Наступныя часткі паэмы паказваюць станаўленне характараў траянцаў і іхняга кіраўніка. Так, ужо ў пачатку III часткі аўтар карыстаецца новымі прыёмамі для характарыстыкі войска Энея. Казакі прыгадваюць сваю колішнюю славу. Пра гэта сведчыць і тое, што яны спяваюць украінскія гістарычныя песні, і ўпамінанне імён легендарных герояў, і г. д.]

Вятры трубілі за спіною,
Паласавалі чоўны даль,
Нібы страла ўслед за стралою,
Ляцелі сярод пенных хваль.
Грабцы і вёслы палажылі
Ды люлькі, седзячы, курылі,
Спявалі песні — сярод іх
Было нямала Запарожскіх,
Рэкруцкіх песень і Маскоўскіх,
Паходных, родных, баявых.

Пра *Сагайдачнага* спявалі[12],
Пра *Сеч* і пра яе ваяк,
Як пікінераў набіралі,
Як вандраваў праз ноч казак;
Пра слаўны бой Палтаўскай рацi,
Як сына выпраўляла маці
З двара свайго ў цяжкі паход;
Як пад Бендэрамі стаялі,
Як без галушак паміралі,
Калі там быў галодны год.

[Фарміраванню лепшых якасцей у характары Энея як будучага кіраўніка дзяржавы, па задуме аўтара, павінна спрыяць сустрэча Энея з Анхізам. Каб атрымаць благаславенне бацькі-нябожчыка, Эней, пераадольваючы страх, накіроўваецца на той свет. Дыдактычная скіраванасць апісання пекла і раю, якія пададзены ў паэме, відавочная. Катлярэўскі выкарыстаў нагоду, каб выказаць свае глыбока дэмакратычныя грамадзянскія перакананні. У дадатак да гэтага ён як педагог, зыходзячы з народных уяўленняў пра шчасце і няшчасце, своеасаблівым чынам праводзіць праз «школу дабра і зла» і чытачоў, і свайго галоўнага героя. Учытаемся ў апісанне пекла і раю і пераканаемся ў тым, што народнасць твора, якая праяўляецца не толькі праз побытавы каларыт (звычаі, вечарынкі, гульні, песні, вопратка, ежа і г. д.), але і праз сатырычна вострую крытыку маралі бюракратычнага апарата, робіць гэты твор пасапраўднаму сучасным.

Карціна пекла.]

Смала ў тым пекле булькацела,
Падагравалася ў катлах,
А сера з нафтаю кіпела;
Палаў агонь, аж глянуць жах!
І грэшнікі ў смале сядзелі. [...]

Паноў за тое катавалі
І смажылі з бакоў усіх,

Што людзям долі не давалі,
Лічылі за жывёлу іх.
За гэтае паны вазілі
І дровы з лесу і касілі
Чарот, каб на агні палаў.
За імі чэрці назіралі,
Прутом жалезным падганялі,
Калі хто-небудзь прыставаў. [...]

У пекле тым не да гумору
Было падпанкам і панам,
Ім па заслугах, без разбору,
Давалі чосу, як катам.
Смылелі розныя цэхмістры[13],
І ратманы, і бургамістры,
Падсудкі, суддзі, пісары,
Што не па праўдзе люд судзілі,
А толькі грошыкі лупілі,
Здзіралі хабар ліхвяры.

А ўсе разумнікі былыя,
Што мелі ласку мудраваць,
Папы, епіскапы, якія
Любілі паству навучаць,
Каб грошы неграблі лапатай,
Займаліся не ўласнай хатай,
Царквой святою — дзень пры дні,
Ксяндзы, каб баб не спакушалі,—
За ўсе грахі адказ трымалі —
Былі на самым дне ў агні. [...]

Бацькі, што хлопцаў не вучылі,
Трымаць не думалі ў руках,
А толькі, знай адно, хвалілі,—
Кіпелі ў нафтавых катлах;
Яны зрабілі гультаямі
Сыноў уласнымі рукамі,
А ім сыны жадалі, каб
Хутчэй старыя паміралі,

Сваім нашчадкам пакідалі
За ўсё жыццё набыты скарб. [...]

Свавольнікі і валацугі,
Усе хлусы і ўсе рвачы,
І зводнікі, і ўсе п'янчугі,
І ліхвяры, і мантачы,
Варажбіты, і чарадзеі,
І злодзеі, і ліхадзеі. [...]

Была і шляхта і мяшчане,
Былі паны і мужыкі,
Няверныя і хрысціяне,
Старэнькія і юнакі,
Багаты люд і люд убогі,
Народ бязногі, крываногі,
Народ відушчы і сляпы,
Чын і цывільны і вайсковы,
Пан і прыватны і службовы,
Былі міране і папы.

Гэй! Гэй! ды праўду дзенеш дзе ты,
Няпраўда ж зводзіць свет стары;
Сядзелі на агні паэты,
Нікчэмных вершыкаў майстры,
Іх рукі звязаны, на твары
Адчай, нібыта іх Татары
У жорсткі аддалі палон.
Вось так і наш брат пападзецца,
Што піша — не засцеражэцца,
Каму ж яшчэ патрэбны ён!

І распіналі мацапуру[14]
На дыбе не да смерці ледзь;
Таму нягодніку за скуру
Лілі расплаўленую медзь.
Душой крывіў ён для прыбытку
І дзеля ўласнага нажытку
У друк чужое аддаваў —

Аб восьмай запаведзі Бога
Забыўшы, абкрадаў чужога,
Ягонай працай гандляваў. [...]

Эней на першых наглядзеўся,
Калі з іх мукамі сустрэўся,
Пасля падаўся да другіх...

[Карціна раю.]

Далей убачылі будынкі
Таго падземнага цара,
Скрозь ні пушынкі, ні пылінкі,
Усё зіхцела, як зара;
Як след абтынкаваны сцены,
І вокны ўсе з марское пены;
У вочы кідаўся — куды
Ні глянь — бляск медзі, бронзы, сталі,
Прыбраныя святліцы ззялі;
Палац быў панскі сапраўды. [...]

Яны сядзелі склаўшы рукі,
Курылі люлькі пры агні,
Нуды не зналі і дакукі
І частаваліся ўсе дні. [...]

Так ад нядзелі да нядзелі
Ласункі розныя яны,
Варэнікі, пампушкі елі
І пульхныя з ікрой бліны;
Часнок, спаржа, кмен, медуніцы,
Масліны, спелыя суніцы,
Халаднічок з крутым яйцом,
Яешню — пачастунак пана,
Што па-нямецку гатавана,
А запівалі ўсё піўцом.

Была шчаслівая тут доля
Таму, хто праведна жыве,
Так, як пякельная няволя
Таму, хто грэшнікам слыве. [...]

«То людзі бедныя, якія
Хадзілі ў дурнях цэлы век,
Старцы храмыя і сляпыя,
Што доляй кінуты на здзек;
Што гаравалі год за годам,
Жылі галодныя пад плотам,
З кійком ды з торбай на плячах;
Якія вечна жабравалі,
Якіх у карак людзі гналі
З двароў на непрытульны шлях.

То ўдовы, што бязгрэшнай доляй
Не абняславілі сяло,
Дзяўчаты, у чыім падоле
Дзяцей бясшлюбных не было;
Сіроты, што сабе ратунку
Шукалі па дамах прытулку,
Пасля плацілі за дагляд;
І тыя, што народ любілі,
З яго працэнтаў не лупілі,—
Хто чым багат, той тым і рад.

Тут ёсць і старшына праўдзівы —
Бываюць розныя паны;
Хоць рэдка ў нас такія дзівы,
Не дружаць з праўдаю яны!
Тут ёсць ваенныя, якія
Чыны займелі немалыя,
Аднак праўдзівымі былі;
Тут людзі розныя, нямала
На свеце іх перабывала,
Такіх, што праведна жылі».

[Далей адбываецца вырашальная сустрэча Энея і Анхіза. Сівіла, якая ў міфах Старажытнай Грэцыі з'яўлялася прарочыцай, а ў Катлярэўскага падаецца як тыповая вясковая варажбітка і шаптуха, раскруціўшы сваё дзівоснае майстэрства, услед за Зеўсам адкрывае завесу над вялікай будучыняй героя.]

Анхіза павяла шаптуха
І прымасціла ля стала
І словы гэткія на вуха
Шаптаць старому пачала:
«Я на Энея загадаю,
Паваражу і папытаю,
Яму ўсю долю раскажу;
Я гэткія замовы знаю,
Хоць што на свеце адгадаю,
Папраўдзе ўсё паваражу».

І зараз жа ў гаршчок паклала
Яна вядзьмарскае травы,
Той, што на Сёмуху збірала,
Калі хадзіла ў паплавы:
Цукора, васілька пялёсткі,
Чабор і ландыш, бэз і слёзкі,
Каліны горкай пяць лістоў,
І заліла ўсё зелле тое
Крынічнай чыстаю вадою
Яна, шапнуўшы колькі слоў.

Гаршчок той чарапком накрыла,
Паставіла на вугалёк,
Энея побач пасадзіла,
Каб раздзімаў ён aганёк;
А калі зелле закіпала,
Забулькала, заклекатала,
Варочалася зверху ўніз;
Эней наш, навастрыўшы вуха,
Як быццам нечы голас слухаў,
Чуў голас гэты і Анхіз.

А развялі агонь мацнейшы,
Гаршчок гучней забулькатаў,
Пачуўся голас выразнейшы,
Які Энею так сказаў:
«Энею годзе ўжо нудзіцца,
Бо будзе ад яго пладзіцца
Вялікі і заўзяты род;
Ён будзе кіраваць зямлёю,
Вайной і ўладаю сваёю
Паверне ўсіх сабе пад спод.

І Рымскія збудуе сцены,
Як у раі, ў іх будзе жыць;
Не толькі там, а ўсюды змены
Яму вялікія чыніць:
Магутным будзе панаванне,
Аж покуль цалаваць не стане
Пантофель з нечае нагі...» [15]

[У IV частцы сюжэт разгортваецца наступным чынам. Пакінуўшы Сіцылію, Эней ледзь не трапіў на востраў злоснай Цырцэі, якая з людзей рабіла звяроў. Бог ветру Эол павярнуў караблі траянцаў у патрэбным кірунку, і ўрэшце яны прыстаюць да берагоў Тыбра, ступаюць на лацінскую зямлю. Мясцовы цар годна сустракае гасцей. Пры знаёмстве са сцэнай прыёму міжволі ўзнікае ўражанне, што Катлярэўскі наўмысна насычае яе шматлікімі ўкраінскімі рэаліямі. Відавочнай становіцца думка пра тое, што траянцы вяртаюцца ў свой родны край, за які ім, аднак, яшчэ давядзецца пазмагацца.]

Вінам заморскім за абедам
Цар загадаў пачаставаць
Сваіх гасцей, але аб гэтым
Нялёгка вершам расказаць:
Пілі пярцоўку, палыноўку,
Зуброўку, крымскую айвоўку;
Быў баль, і не абы-які.

Там *на віват* — з марцір стралялі,
Туш — гучна трубачы ігралі,
А *многа лет* — раўлі дзякі.

Энея ласка не забыта.
Лацін Энею — нашых знай! —
Даў *Апішнянскіх* сліў карыта[16],
Яшчэ *Лубенскі* каравай,
Палтаўскіх коржыкаў-ласунак,
А *з Кіева* на пачастунак
Тры торбы спелых арахоў.
З Будзянкі сотняў пяць яечак,
Сто *Рашацілаўскіх* авечак,
Ліпянскіх племянных быкоў.

Хоць цар стары, а пабратаўся
З Энеем нашым малайцом,
Ужо Эней і зяцем зваўся,—
Ды справа славіцца канцом!
Эней, які без перашкоды
Улёг у жарты і прыгоды,
Юноны хітрыкі забыў;
Але Энея не забыла
Юнона, скрозь за ім сачыла,
Дзе гасцяваў, з кім еў і піў.

Ірыся не спускае вока
З людзей і грэшных спраў людскіх,
Навіны носіць, як сарока,
На неба да багоў сваіх;
Яна Юноне расказала
Аб тым, што пра Энея знала,
Як быў Лацін Энею рад,
Які за цесця меў Лаціна,
А той Энея меў за сына
І што ў дачкі з Энеем лад.

«Эгэ! — Юнона закрычала.—
На волю вылецеў сакол!

Я многае яму спускала,
А ён і ногі ўжо на стол!
Ого! Я правучу чарцяку
І перцу дам яму і маку,
Я кроў Траянскую пралью.
Абвесціць Турн вайну Лаціну,
Ім трэсак я ў агонь падкіну,
Я навару ім кісялю».

[Інтрыгі Юноны перарываюць прыязныя адносіны паміж Лацінам і Энеем: супраць Энея настройваюцца жонка Лаціна Амата і яго пляменнік Турн. Побытавае здарэнне — харты траянцаў раздзерлі пакаёвага сабачку нянькі Аматы — спрычыняецца да сапраўднай вайны (трагікамічная трактоўка прычын варажнечы!).

Вайна траянцаў і Энея, з аднаго боку, лацінцаў і Турна, з другога,— асноўная тэма V і VI частак паэмы. Тут ізноў у сутыкненні паміж людзьмі ўкліньваюцца ўчынкі багоў. Аркадскі цар Эвандр у выніку пэўных дыпламатычных перамоў з ім Энея высылае ў яго падтрымку свае войска.

Праслаўляючы высокія маральныя якасці воінаў, Катлярэўскі стварае запамінальныя вобразы Ніза і Эўрыала. Праз іх характарыстыку пісьменнік засяроджвае ўвагу на спалучэнне такіх якасцей, як мужнасць і чалавечнасць, чуйнасць, сяброўства, абавязак перад Радзімай. Менавіта гэтага месца паэмы пайшлі ў свет радкі, якія сталі крылатымі. На ўкраінскай мове яны сапраўды гучаць афарыстычна, некаторая архаічнасць стылю ўзмацняе ўрачыстасць іхняй танальнасці: «Любов к отчизні де героїть, / Там сила вража не устоїть, / Там грудь сильніша од гармат», «Де общее добро в упадку, / Забудь отця, забудь і матку, / Лети повинность ісправлять».

Звернемся зноў да тэксту, узноўленага А. Куляшовым. Перад намі дыялог, у якім узняты азначаныя пытанні. Адзін з сяброў засцерагае другога ад удзелу ў рызыкоўнай, небяспечнай ваеннай аперацыі.]

«А я, выходзіць, застануся? —
Дружбак пытае ў дружбака.—

Не! Лепей, браце, задаўлюся
Я, чым пакіну земляка.
Мне смерць не страшна, я з табою
Гатоў тапіцца пад вадою,
Гатоў і ў полымя з табой.
Мой бацька воін быў сардэчны,
Казаў (спакой старому вечны!):
"Памры на полі, як герой"».

«Чакай, за мною не ганіся,—
Ніз Эўрыалу гаварыў,—
Не суньса ўперад, азірніся —
Ты глузд ад рыцарства згубіў.
Бо маці маеш ты старую,
Без сіл і ў беднасці, слабую,
Жыць для яе павінен ты.
Ёй без цябе жыцця не будзе,
Чужыя не прытуляць людзі,
І не сагрэе свет пусты!

А я, ты знаеш, сірацiна,
Расту, як пры шляху гарох;
Без блізкіх, без бацькоў — хлапчына,
Эней — мой бацька, маці — Бог.
Бацькі не ўспомняць, як загіну
Я за чужую мне айчыну,
Людская памяць — помнік мой.
Табе ж матуля рукі вяжа,
Заб'юць — яна ў магілу ляжа,
Жыві і будзь апорай ёй».

«Разумна, Ніз, ты развважаеш,
А аб павіннасці маўчыш,
Якую сам выконваць маеш,
Вайна для нас — агульны крыж;
Калі народ у заняпадзе,
Забудзь пра бацьку і пра маці,
Ідзі ў смяротны бой хутчэй;
Энею мы, як прысягалі,

Жыццё сваё ахвяравалі —
Нам абавязак даражэй».

[У VI частцы даюцца і кульмінацыя, і развязка сюжэта. Разгневаны Зеўс катэгарычна забараняе багам умешвацца без разбору ў зямныя справы.]

Зевес маргнуў, як трус вусамі,
Закалаціўся ад грымот
Алімп, як лісцік пад вятрамі,
І нарабіў багам турбот.
Яны спяшаліся — хто босы,
Хто голы, хто праставалосы —
У Алімпійскі карвасар[17],
На іх Юпітэр раззлаваны
Крычаў, нібыта апантаны,
Як на хартоў панурых псяр:

«Ці не даволі ў сценах родных
Сарамаціць Алімп багам?
Цкаваць смяротнымі смяротных
І між сабой сварыцца вам?
Бо не́лад ваш багоў не варты;
З вас кожны як суцяга ўпарты,
Вы рады мардаваць людзей;
Я ўсіх вас з неба паспіхаю
І гэткай карай пакараю,
Што пасвіць будзеце свіней.

А вам, багіні-шалахвосткі,
Бярозавае кашы дам,
Так супакою нораў порсткі,
Што доўга будзе вам няўцям.
Вы на смяротных вельмі ласы,
Як грэк на простыя кілбасы,
Людское ліха ўсё праз вас.
Ад вашых зводняў, ад кахання
Няма Зевесу ўшанавання;
Я кіну вас, як муху ў квас,

Альбо аддам вас на работу,
Альбо замкну ў вар'яцкі дом,
Там хутка выб'юць з вас ахвоту
Сярод людзей рабіць садом. [...]

Не вы маіх людзей стварылі,
Бо не стварыць вам і чарвей;
Навошта ж вы іх пасварылі?
Навошта вам чапаць людзей?..
Бажуся галавой сівою
І Гебінай спадніцай тою:
Чыноў пазбаўлю я багоў,
Што ў гэтую вайну ўплятуцца,
Няхай Эней і Турн скубуцца,
З вас хопіць і сваіх чубоў».

[Катлярэўскі падводзіць чытачоў да думкі пра самавартаснасць траянцаў, і ў вобразе Энея, чым далей у творы, тым усё болей, раскрываюцца яго станоўчыя якасці кіраўніка і змагара.]

Эней адзін за ўсіх не спаў;
Хадзіў ён, з думкамі збіраўся
(Бо сам за ўсік адказ трымаў),
Ён думаў, як свой край пашырыць,
Цара Лаціна ўціхамірыць,
Як знішчыць люты Турнаў зброд.

[Аповед у паэме на працягу ўсяго твора вытрыманы ў жартоўна-разважальнай манеры. Але пры гэтым сур'ёзнасць і важкасць галоўнай думкі застаюцца для аўтара прыярытэтнымі. Таму адна з апошніх падагульняючых характарыстык Энея гучыць не без пэўнага пафасу.]

Нібы сасна лясная, статны,
Бывалы, цёрты, жвавы, знатны,
Эней, як князь *Нячэса*, быў[18].
Такі быў, як героі ў творах,
На дзіва ўсім, што нават вораг
Яго хваліў, а свой — любіў.

[Сюжэтныя лініі завяршаюцца канчатковым трыумфам Энея. І асабістая перамога героя ў бітве з Турнам, і прызнанне Юнонай сваіх памылак у дачыненні да Энея пераконваюць у тым, што «Эней сапхне Лаціна з трона», узмоцніць сваю дзяржаву. І, як і наканавана самімі багамі, народ, пачынаючы новы летапіс, захавае свой «выгляд, мову, веру».]

Тлумачальныя заўвагі

[1] *Ён, як спалілі Грэкі Трою.* Вядома, што эпас Вергілія створаны на аснове легенды аб траянцах, якія пасля зруйнавання Троі нібыта пасяліліся ў Італіі і паклалі пачатак Рымскай дзяржаве.

[2] *Але Юнона, злыбядуха.* Юнона ў рымскай міфалогіі — жонка Юпітэра (Зевеса) і багіня шлюбу. Згодна міфу, падтрымлівала грэкаў у часе грэка-траянскай вайны. Адгэтуль яе нянавісць да Энея.

[3] *І маткаю Венеру зваў.* Венера (у грэкаў Афрадыта) — багіня красы і кахання, спрыяла траянцам. Яе сын Эней народжаны ад траянца Анхіза. Згодна легендзе, Парыс — сын траянскага цара Прыяма; учынкі Парыса прывялі да вайны паміж грэкамі і траянцамі. Ён пасварыў паміж сабой багінь Геру, Афіну і Афрадыту (у рымлян — Юнону, Мінерву і Венеру), аддаўшы апошняй яблык у знак яе перавагі над саперніцамі.

[4] *Пра тое ёй шапнула Геба.* Геба — дачка Юпітэра (Зевеса) і Юноны, прыслужніца багоў у часе іх банкетаў. Акрамя таго, багіня маладосці.

[5] *У дом Эола, як аса.* Эол, згодна міфалогіі,— бог, распарадчык вятроў.

[6] *Барэй яшчэ ляжыць з пахмелля.* Барэй, Нот, Зефір, Эўр — вятры.

[7] *Ды гэтак, як да лесу Ляхі.* Можна думаць, што ў гэтым выпадку — намёк на паўстанне Касцюшкі 1794 г. Катлярэўскі адгукнуўся на палітычныя падзеі свайго часу, бо першая частка «Энеіды» пісалася ў 1794 г.

[8] *На галаве каўпак парчовы.* У гэтай страфе сустракаюцца словы: Кунтуш з вусамі. Кунтуш — кафтан, як мужчынскі, так і жаночы.

[9] *Зевес тым часам піў сівуху.* Зевес — у грэчаскай, Юпітэр у рымскай міфалогіі — гаспадар зямлі і неба, уладар багоў і людзей.

[10] *Ці зноў засядзе Хан у Крыме.* Намёк на далучэнне Крымскага ханства да Расіі ў 1783 г.

[11] *Карфаген* — горад, сталіца гандлёва-рабаўласніцкай рэспублікі ў Паўночнай Афрыцы.

[12] *Пра Сагайдачнага спявалі.* Пералічваюцца народныя песні, звязаныя з пэўнымі гістарычнымі абставінамі. Пікінерамі называліся радавыя пяхоты ці кавалерыі, узброеныя пікамі.

[13] *Смылелі розныя цэхмістры.* Цэхмістры, ратманы, бургамістры — прадстаўнікі гарадскога магістрата ў феадальныя часы.

[14] *І распіналі мацапуру.* Першыя біёграфы Катлярэўскага сцвярджаюць, што ў гэтай страфе след бачыць выпад аўтара супроць Парпуры — першага выдаўца «Энеіды». Імя Мацапура, ужытае Катлярэўскім, адпавядала словам «пачвара», «страхоцце» і пайшло ад ката Паўла Мацапуры, што, як сведчыць указ Нежынскай палкавой канцылярыі 1740 г., вызначаўся страшнымі злачынствамі.

[15] *Пантофель з нечае нагі.* Сцвярджаецца, што рымляне будуць панаваць да таго часу, пакуль не схіляцца пад уладай Папы, главы каталіцтва, і не будуць цалаваць яму пантофлю.

[16] *Даў Апішнянскіх сліў карыта.* Мястэчка Апішня на Палтаўшчыне славілася добрым гатункам сліў. Далей згадваюцца сёлы на Палтаўшчыне, вядомыя сваімі вырабамі ці жывёлай.

[17] *У Алімпійскі карвасар.* Карвасар — старажытны суд, які засядаў па гарадах і сёлах на кірмашовых плошчах.

[18] *Эней, як князь Нячэса, быў.* Нячэса — князь Пацёмкін, які з дыпламатычных меркаванняў урада Кацярыны II запісаўся ў Запарожскую Сеч пад імем Грыцько Нячэса.

ІВАН ФРАНКО
(1856—1916)

Іван Якаўлевіч Франко нарадзіўся ў вёсцы Нагуевічы (цяпер Івана Франко) Драгобыцкага раёна Львоўскай вобласці ў сям'і вясковага каваля. Выключныя здольнасці, апантаная працавітасць дапамаглі здзейсніць яго мару: юнак бліскуча скончыў гімназію і адразу ж паступіў на філасофскі факультэт Львоўскага універсітэта (1875). Аднак свой дыплом «небяспечны» ў палітычным сэнсе студэнт змог атрымаць толькі з цягам часу ў Букавінскім універсітэце (г. Чарнаўцы). У 1893 г. у Вене Франко абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філасофскіх навук. Са студэнцкіх гадоў і да апошніх дзён ён актыўна спалучаў літаратурную і грамадска-палітычную дзейнасць. Сёння толькі частка з напісанага ім апублікавана ў 50-томным выданні Збору ягоных твораў. Фактычна няма той галіны пісьменніцкай працы, у якой бы ні выявіўся геній Франко.

Першы зборнік вершаў «З вяршынь і нізін» (1887) і каля дзесятка наступных далі падставы лічыць Франко другой па значнасці асобай ва ўкраінскай літаратуры, пераемнікам традыцый Тараса Шаўчэнкі. Паэтычная спадчына пісьменніка ўражвае шырынёй і глыбінёй узнятых праблем, а таксама высокай мастацкай дасканаласцю. Тэматычна яна ахоплівае ўсе сферы жыцця чалавека. Франко выключна арыгінальны і як пясняр рэвалюцыйнага абнаўлення жыцця, і як тонкі псіхолаг, знаўца інтымных перажыванняў чалавека, і як майстар філасофскага асэнсавання вечных праблем грамадства: свабоды, роўнасці, патрыятызму. Усё гэта прадвызначыла вялікі жанравы дыяпазон паэта. Грамадска-палітычныя, філасофскія, інтымныя, пейзажныя творы прадстаўлены як вершамі, так і ліра-эпічнымі паэмамі. Асобна адзначым, што Франко распрацаваў ва ўкраінскай літаратуры такую форму верша, як санет. З традыцыйнай любоўнай тэматыкі паэт адважна вывеў яго ў свет палітычных змаганняў, стварыўшы так званыя «вольныя» і «турэмныя» санеты. Многія творы Франко вызначаюцца наватарствам вершавання (страфічная пабудова, рытмамелодыка і інш.).

У 80—90-х гг. XIX ст. Франко з вялікім поспехам заявіў пра сябе як празаік. Тэматычна яго аповесці цесна звязаны з рабочым вызваленчым рухам. Аўтар прасачыў у творах этапы выспявання народнага пратэсту: ад стыхійнай помсты і тэрору да арганізаваных грамадскіх форм барацьбы. Упершыню ва ўкраінскай і сусветнай літаратурах з'яўляецца герой — прамысловы рабочы. Працэс пралетарызацыі галіцкага сялянства творча асэнсаваны ў цэлым шэрагу апавяданняў і аповесцей, якія складаюць так званы «Барыслаўскі цыкл» (мястэчка Барыслаў — цэнтр новаўтвораных нафтараспрацовак, дзе панавалі гвалтоўная эксплуатацыя, цяжкія ўмовы працы і побыту, галодная смерць, самагубства). Стыль прозы пісьменніка вызначаецца дынамікай развіцця: ад рамантычных прыёмаў у падыходзе да гістарычнай тэмы Франко пераходзіць да рэалістычна-побытавай манеры пры адлюстраванні эпічных карцін сучаснага жыцця, уключаючы ў яе і мадэрнісцкую тэхніку (імпрэсіяністычная сімволіка і інш.).

Вялікім майстрам выявіў сябе Франко і як драматург. Сярод твораў, якія абяссмерцілі імя пісьменніка,— драма «Украдзенае шчасце» (1894). Яна засведчыла выразны пераход украінскай драматургіі ад ранейшага фальклорна-этнаграфічнага стылю да новага ўзроўню мастацтва. Індывідуалізаванасць характараў, майстэрства дыялогаў, заглыбленасць у псіхалогію герояў, кампазіцыйная прапарцыянальнасць сцэн даюць падставы разглядаць драму «Украдзенае шчасце» сярод вяршынь сусветнай драматургіі.

Жыццёвае крэда Франко яскрава ўвасабляе паэтычная формула: «Песня і праца — вялікія дзве сілы». На яго думку, мастацтва абавязана знаходзіцца ў непарыўнай еднасці са змаганнем. Вершы паэта «Каменяры» (1878) і «Гімн» (1882) у вялікай ступені вызначаюць праграму жыцця і творчасці пісьменніка. Асноўная тэма гэтых твораў — барацьба за прагрэс, праслаўленне змагароў, вера ў перамогу. У «Каменярах» паэт выразна малюе манументальныя вобразы барацьбітоў, якія з цяжкімі молатамі ў руках прабіваюць у звышцвёрдай скалістай пародзе (чытай — несправядлівым сацыяльным ладзе) дарогу для новых пакаленняў, шлях у светлае вольнае жыццё. Па аналогіі з назвай верша, яго ідэйнай сутнасцю пісьменнік атрымаў вымоўнае прозвішча Вялікі Камяняр. Словы «Гімна», пакладзеныя на музыку М. Лысенкам (1905), сталі рэвалюцыйнай песняй «Вечны рэвалюцыянер», у якой узвялічваецца несмяротны, свабодалюбны дух народа, пратэст супраць зняволення і прыгнёту. Вяршыня паэтычнай творчасці пісьменніка — паэма «Майсей» (1905). У пралогу да твора скандэнсавана галоўная думка аўтара. Як і біблейскі прарок Майсей, Франко ўсім сваім жыццём, словам і справай ахвяраваўся ў імя адзінай высокай мэты — служэнне Радзіме. Прароча гучаць радкі пралога паэмы, у якіх выказваецца вера ва ўваскрэсенне Украіны.

Нацыянальную ідэю Франко вылучаў у гісторыі культуры кожнага народа. Нямала месца ў яго даследаваннях прысвечана беларусам, у прыватнасці беларускаму фальклору, старажытнай беларускай літаратуры, дзейнасці Францішка Скарыны. Паказальна, што яго творчыя кантакты з польскай пісьменніцай Элізай Ажэшкай вызначыліся таксама праз тое, што яна спачувальна і праўдзіва адлюстроўвала ў сваіх творах жыццё беларускага народа.

З беларускага боку з Франко яшчэ ў канцы XIX ст. наладжваў сувязь Адам Гурыновіч. Ён першы пераклаў «Гімн» на беларускую мову. Найбольш актыўна творчасць Франко папулярызаваў сярод рускіх і беларускіх чытачоў Максім Багдановіч, выступаючы як крытык, літаратуразнавец і перакладчык. На беларускай мове выдадзены кнігі Каменяра: казка «Вароны і совы» (1927; пераклад А. Якімовіча), драма «Будка № 27» (1954; пераклад А. Астрэйкі), зборнік «Апавяданні» (1956; пераклады Я. Шараховскага), кніга для дзяцей «Калі звяры яшчэ ўмелі гаварыць» (1958; пераклады П. Пестрака), «Народзе мой...: Творы» (2006; пераклады В. Рагойшы). Некаторыя вершы і апавяданні І. Франко змяшчаліся ў беларускай перыёдыцы і асобных зборніках.

Творы пісьменніка друкуюцца паводле наступных выданняў: *Галасы маіх сяброў: Пераклады Уладзіміра Караткевіча. Мінск: Маст. літ., 1993* (верш «Каменяры»); *Ад круч дняпроўскіх. Мінск: Юнацтва, 1984* (пераклад «Гімна» выкананы Нілам Гілевічам); *Франко Іван. Народзе мой...: Творы. Мінск: Маст. літ., 2006* (пераклады Вячаслава Рагойшы драмы «Украдзенае шчасце» і пралога да паэмы «Майсей»).

Каменяры

Я дзіўны бачыў сон. Перада мной нібыта
Ў пустэльнай дзікасці бязмежнае плато
І я, сталёвым ланцугом абвіты,
Стаю пад скальнай стромаю з граніту,
А далей тысячы такіх, як я, братоў.

Чало ва ўсіх журбой жыцця ўзарана,
І ў кожнага ў вачах гарыць любові жар,
І на руках ва ўсіх гадзюкамі кайданы,
І плечы кожнага дадолу пазгінаны,
Бо нейкі страшны ўсіх гняце цяжар.

Ў руках у кожнага цяжкі жалезны молат,
І зверху — кліч да нас, пярунам над зямлёй:
«Дзяўбіце гэты ўцёс! Няхай спякота й холад
Не спыняць вас! Выносьце працу, смагу й голад,
Бо ВАМ прызначана скрышыць у друз скаллё».

І ўсе мы як адзін узнеслі ўгору рукі,
І безліч молатаў аб камень загуло,
І пырскалі ў бакі мільёны камянюкаў,
Бо з сілай роспачы і з сілай нашай мукі
Раз-пораз мы дзяўблі ў каменнае чало.

Як вадаспаду рык, як кроў і гром навалы,
Так молаты грымелі раз у раз.
Па пядзі пядзь абшар мы здабывалі,
Хоць не аднога з нас глыжы каменавалі,—
Мы йшлі далей. І што спыніла б нас?

І кожны ведаў з нас, што славы нам не будзе,
Ні памяці за кроў, як збурыцца гара,
Што аж тады дарогай гэтай пойдуць людзі,
Як мы праб'ём яе, сваім жыццём абудзім
І косткі нашы тут ператварацца ў прах.

Дый не прасілі мы ў людзей славутай долі,
Бо кроў герояў ў сэрцы нашым не гарыць.
Не, путы мы — сваёй абралі добрай воляй,
Нявольнікі, рабы адной-адзінай волі
І поступу людзей — хіба каменяры.

І ўсё ж мы верылі, што гэтымі рукамі
Раструшчым мы граніт адвечных мёртвых стром,
Што ўласнаю крывёй і ўласнымі касцямі
Ў граніце шлях змуруем і за намі
Ў свет прыйдзе новы дзень і новае дабро.

І ведалі, што там, у дальнім нейкім свеце,
Які мы кінулі для катаргі сваёй,
За намі слёзы льюць матулі, жонкі й дзеці,
Што ворагі й сябры клянуць па ўсім сусвеце
І нас, і наш намер, і наш няроўны бой.

Мы гэта ведалі. Душа не раз балела,
І сэрца рвалася, і грудзі жаль сціскаў.
Ды не спынілі нас ні жаль, ні мукі цела,
Ні брэх каменявержцаў ашалелых,
А молата ніхто з рукі не выпускаў.

Мы йдзем. Святая думка нас яднае
У грамаду адну, а молаты ў руках.
Хай праклінаюць нас, хай свет нас забывае!
Мы — камнябойцы. Праўдзе мы шляхі раўняем,
І прыйдзе шчасце ўсіх па нашых касцяках.

1978

Гімн

Вечны рэвалюц'янер —
Дух, што цела рве да бою,
Рве на ўздым, за шчасце-волю,
Ён жывы, як і раней:
Ні папоўскія атруты,
Ні шпікоў сілкі і путы,
Ні астрогаў царскіх краты,
Ні штыкі і ні гарматы,
Ні жандарскі пратакол —
Не змаглі пакласці ў дол.

Ён не згінуў, ён жыве!
Хоць вякі, як нарадзіўся,—
Толькі ўчора распавіўся
І ўжо волатам слыве.
Разгінаецца, мацнее,
Рвецца ўвесь туды, дзе днее,
І мільёны за сабою
Кліча словам, як трубою,
І мільёны ўслед ідуць —
Гэта ж голас веку чуць!

Голас веку чуцен скрозь:
У мужыцкіх курных хатах,
Па рамесніцкіх варштатах,
У прытулках гора й слёз.
І дзе толькі загаворыць —
Там знікае сум і горыч,
Сілы родзяцца — змагацца,
Не стагнаць, а дабівацца,
Хоць сынам, як не сабе,
Шчасця-долі ў барацьбе!

Вечны рэвалюц'янер —
Дух, навука, думка, воля
Цемнаце не ўступіць поля,
Путы ўздзець не дасць цяпер.

Зла разломлена руіна,
Пакацілася лавіна,
І дзе ў свеце тая сіла,
Каб яе разгон спыніла,
Каб вярнула ночы цень —
Пагасіць агністы дзень?

1882

Майсей

Паэма

Пралог

Народзе мой, адрынуты, разбіты,
Як паралітык на глухой дарозе,
Людской знявагай, што струп'ём, пакрыты!

Душа мая за лёс твой у трывозе.
Ад сораму, які ў вячыстай далі
Нашчадкаў спаліць, я заснуць не ў змозе.

Няўжо тваёй гісторыі скрыжалі
Цяглом быць для суседзяў і пагноем —
Такую долю нам наканавалі?

Няўжо павек — спадманлівым спакоем
Ахутваць злосць, гуляць у легкавернасць,
Лагодзіць тых, хто здрадай і разбоем

Цябе скаваў, запрысягнуў на вернасць?
Дзе веліч спраў тваіх рашучых, смелых,
Што выявілі б сіл тваіх бязмернасць?

Няўжо дарэмна столькі сэрц гарэла
Ахвярадайнай да цябе любоўю,
Табе аддаўшы і душу, і цела?

Ці ж марна ўвесь наш край паліты кроўю
Сыноў тваіх? Няўжо не захапляцца
Яму красою, воляй і здароўем?

Ці ж марна ў слове у тваім іскрацца
І моц, і мяккасць, досціп і развага —
Усё, чым можа ўгору дух узняцца?

Дарэмны ў песнях у тваіх адвага,
І звонкі смех, і жаль, і млосць кахання,
Надзей і ўцехі неспатольнай смага?

О не! Не толькі слёзы і ўздыханні
Нам суджаны! Я ў лёс твой веру новы,
У дзень твой запаветны ўваскрасання!

О, каб жа дзень той быў паслушны слову,
А слова — дню, што ў радасці святлістай
Агонь акрые, выснуе абнову!

О, каб успыхнуў песні знiч агністы,
Той, што вядзе мільёны за сабою
На новы шлях, пакінуўшы імглісты!

Ды не!.. Не нам, зняможаным журбою,
Знясіленым сумненнямі і горам,
Не нам свяшчэнна выгукнуць: «Да бою!»

Але надыдзе час: ты Чорным морам
Пакоціш, як цунамі, рокат волі —
Ўздрыгне Каўказ, Карпаты змыюць сорам.

Заззяеш у народаў вольным коле
І — гаспадар руплівы, дамавіты —
Агледзіш сваю хату, сваё поле.

Прымі ж мой гэты спеў, тугой спавіты,
Ды поўны веры ў шлях твой і кірунак,—
Як прышласці тваёй залог, слязьмі паліты,

Як генію твайму вясельны падарунак.

20 ліпеня 1905

Украдзенае шчасце

Драма з вясковага жыцця ў 5 дзеях

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Мікола Задарожны, мужчына, гадоў 45, невялікага росту, сутулы, рухі павольныя.

Ганна, яго жонка, маладзіца, гадоў 25.

Міхайла Гурман, жандар, высокі, здаровы мужчына, гадоў 30.

Алекса Бабіч, селянін, гадоў 40, сусед Міколы.

Насця, яго жонка, гадоў 35.

Войт, селянін, гадоў 50.

Шлёма, арандатар.

Сяляне, хлопцы і дзяўчаты, музыкі і г. д.

Дзеянне адбываецца каля 1870 года ў прыкарпацкай вёсцы Нязванічах.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Вясковая хата. Ноч. На двары чуваць шум ветру, снег б'ецца ў вокны. У печы гарыць агонь, пры ім гаршкі. Ганна і Насця завіхаюцца каля печы. На лаўках, на ляжанцы і на печы дзяўчаты і хлопцы, адны прадуць, другія матаюць ніткі на матавілы; пасярод хаты пры стале адзін хлопец вяжа рукавіцы, другі на калаўроце ўе шнур.

З'ява першая

Хлопцы, дзяўчаты, Ганна і Насця.

Хлопцы і дзяўчаты *(спяваюць)*

Ой там за горою та за кремінною
Не по правді жиє чоловік з жоною.
Вона йому стелить білу постеленьку,
А він їй готує дротяну нагайку.
Біла постеленька порохом припала,
Дротяна нагайка біле тіло рвала.

Біла постеленька порохом припала,
Дротяна нагайка кров'ю абкипала.

Насця *(перапыняе, махае выціральнікам)*. А каб вам добра было! Што гэта вы зацягнулі такую плаксівую! Нібыта па нябожчыку галосяць.

Першы хлопец *(рагоча)*. Ага, а ў вас мурашкі па спіне забегалі!

Насця. Цьфу на цябе, на тваю галаву! Ты думаеш, што я...

Першы хлопец. Гы-гы, мой тата-нябожчык усё гаварыў: «Калі муж жонку не б'е, то ў ейнай утробе гніе».

Другі хлопец. О, твой тата добры цырульнік быў! Ён і мужыкам умеў кроў пускаць.

Першы хлопец. І зусім задарма! Гэта таксама нешта варта!

Насця. Ды перастаньце ж хоць тут, у гэтай хаце, такое гаварыць ды спяваць. Хопіць зубаскаліць! Гэта ўсё роўна як, не тут кажучы, злога духа пры малым дзіцяці ўспамінаць. Тут анёлы божыя лётаюць, адна хата на цэлую вёску, дзе святы спакой, згода, і лад, і любоў,— а вы нешта такое завялі, што брыдка слухаць.

Першая дзяўчына. Ды не бойцеся, цётачка, мы святых анёлаў з хаты не павыганяем.

Насця. А ты адкуль знаеш? А можа, якраз павыганяеце? Ведаеш, як старыя людзі кажуць: на воўка памоўка, а ён і тут. А то бывае, што як у ліхую гадзіну скажаш каму кепскае слова, то яно зараз жа спраўдзіцца. Мая нябожчыца мама расказвала, што аднаго разу такі...

Першы хлопец. Ціпун вам на язык! Ідзіце да печы ды глядзіце, каб хутчэй тыя варэнікі зварыліся, бо зараз Мікола з горада прыедзе і нас дадому праторыць.

Насця. Глядзі, які скоры! Не бойся, варэнікі будуць. Толькі каб ты сваю рукавіцу давязаў. *(Ідзе да печы.)*

Другая дзяўчына. Ну, канчаем, дзяўчаткі, гэтую песню. Яна надта харошая. Але такая жалосная, ажно плакаць хочацца.

Ганна *(ад печы)*. Пачакайце, як замуж павыходзіце ды на сваіх спінах таго дабра пакаштуеце, то вам яшчэ і не так плакаць захочацца.

Дзяўчаты. Вось табе і на! А вы адкуль гэта знаеце? Хіба вы гэтага скаштавалі?

Ганна. Ну, я не пра сябе кажу. А зрэшты, што пакаштавала, то гэта мне ведаць ды Богу.

Дзяўчаты *(хвіліну маўчаць, потым пачынаюць спяваць)*

Ой мужу ж мій, мужу, не бий мене дуже,
В мене тіло біле, болить мене дуже.
Пусти ж мене, мужу, в вишневий садочок,
Най я собі урву рожевий квіточок,
Урву рожу-квітку та й пущу на воду:
Плини, плини, роже-квітко, аж до мого роду.
Плини, плини, квітко, плини по Дунаю,
Як побачиш мою неньку, приплини до краю.

Насця *(тым часам дастала варэнікі, адцадзіла іх, паліла алеем, пасаліла і ставіць на стол)*. Ну, годзе вам спяваць! Кідайце работу! Варэнікі на стале!

Хлопцы і дзяўчаты кідаюць работу і ■ вясёлай гаманою сядаюць за стол, ядуць. Насця ■ Ганнаю каля печы; яна сабе таксама адклала варэнікаў і сядае на ляжанку, спіною да стала.

Ну, кума, памагай і ты!

Ганна *(глядзіць на акно)*. Божа, якая віхура! Каб толькі нашы з дарогі не збіліся!

Насця. Не бойся, ім не ўпершыню.

Ганна. Не ведаю, але мне нешта так страшна, так боязна, быццам нейкае няшчасце нада мною навісла.

Насця. Я гэта, любачка, бачу. Цэлы дзень як сама не свая ходзіш. Ды ўжо сама сабе маракую, чаго б табе журыцца. Жывеш як у Бога за пазухай...

Ганна. Я?

Насця. Мужыка маеш добрага, ціхага, рабацяшчага, ледзьве не моліцца на цябе.

Ганна *(уздыхае)*. Ды што з таго!

Насця *(цішэй)*. Ага, ты пра тое, што дзяцей не маеш. Не бойся, Бог літасцівы, будуць яшчэ.

Ганна *(махае рукою)*. Ды я не пра тое!

Н а с ц я. А пра што ж? Чаго табе яшчэ трэба? Што браты цябе пасагам пакрыўдзілі? Цьфу! Начхай ты на іх пасаг! Ім твая крыўда бокам вылезе.

Г а н н а *(узвіваецца, быццам уджаленая)*. Вой, кума! Ды хіба я пра пасаг? І нашто вы мне ўспамінаеце маіх братоў? Вы ж ведаеце, што яны мне найбольшыя ворагі.

Н а с ц я. Ведаю, любка, ведаю! Наслухалася я пра тваё крывавае дзявоцтва.

Г а н н а *(з жывасцю)*. Што? Пра маё дзявоцтва? Што вы пра яго ведаеце?

Н а с ц я *(дабрадушна)*. Усё знаю, любка мая, усё ведаю. Як цябе браты білі, за батрачку мелі, да людзей не пускалі і ўрэшце за батрака замуж выпхнулі, яшчэ і пасагам пакрыўдзілі. Ой, ды ці толькі гэта?!

Г а н н а. Як? Вы нешта і болей ведаеце?

Н а с ц я *(смяецца)*. Ды ты, кума, мяне не бойся. Кажу табе, што ведаю ўсё, хоць гэта ад нас і не блізка, ажно ў другім павеце, а братоў тваіх я і ў вочы не бачыла.

Г а н н а. А адкуль жа вы гэта ўсё ведаеце?

Н а с ц я *(смяецца)*. Сарока на хвасце прынесла, любачка! Спаткалася ■ такімі людзьмі, што мне расказалі. Нават ніколі не ўгадаеш — хто.

Г а н н а. Напэўна, нейкую маю таварышку на кірмашы сустрэлі?

Н а с ц я. Ой, кумачка! Ці гэта я так часта на тых кірмашах бываю! Не, у маю хату сама навіна завітала, дый то не калі-небудзь, ■ ўчора.

Г а н н а. Ну, то я ўжо ніяк не даўмеюся, хто гэта мог быць.

Х л о п ц ы і д з я ў ч а т ы *(устаюць з-за стала)*. Дзякуем вам, Ганна, і вам, цётка Насця, за вячэру.

П е р ш ы х л о п е ц. Дзякуй, Ісусе, што добра напхнуўся!

Н а с ц я *(б'е яго выціральнікам)*. Ідзі, ідзі ты, абармоціна!

Д з я ў ч а т ы. Ну, пара нам дадому, а то пазамятае, што і вуліцаю не праграбёмся.

Д р у г і х л о п е ц. Не бойцеся, мае ластаўкі! Нас тут, хлопцаў, даволі, кожны па дзве вас на плечы ўскіне ды дадому занясе.

П е р ш а я д з я ў ч ы н а. Глянь, якія мне асілкі! Яшчэ перасіліцеся ды грыжы панарываеце.

Збіраюцца. Забіраюць кудзелю, прадзіва і выходзяць.

Д з я ў ч а т ы. Ну, добрай ночы вам!

Цалуюцца з Ганнай, яна свеціць ім лучынай у сенях.

Г а н н а. Дабранач, дзяўчаты, дабранач! Прыходзьце і заўтра, калі ласка! *(Зачыняе за імі дзверы.)*

З'ява другая

Г а н н а і Н а с ц я.

Н а с ц я. Трэба было і мне ісці.

Г а н н а *(прыбірае са стала).* Ды пасядзіце яшчэ трохі. У вас хата не пустая, а як ваш чалавек будзе ехаць міма нашай хаты, то пачуеце. А мне весялей будзе чакаць.

Н а с ц я *(памагае прыбіраць).* Так-то яно так. А ўсё-такі хата рук патрабуе. Ну, ды паслухаю цябе... *(Спыняецца сярод хаты перад Ганнаю, з міскаю ў руках.)* Ну, а ты не хочаш ведаць, ад каго я дазналася пра твае дзявоцтва?

Г а н н а. Ды што мне з таго?! Я не ўмею загадкі адгадваць.

Н а с ц я *(хітравата).* А тваё сэрца табе нічога не падказвае?

Г а н н а. Сэрца? А вам што да таго? Што яно павінна мне падказваць?

Н а с ц я. Ага, а з твару змянілася! Бляднееш і зноў чырванееш! Ну, ну, не пужайся! Я ведаю ўсё, ад яго самога.

Г а н н а. Пабойцеся Бога! Што вы гаворыце? Ад каго яго?

Н а с ц я. Ад Міхайла, ад каго ж яшчэ.

Г а н н а. Ад якога Міхайла?

Н а с ц я. Ай, кума, ды не прыкідвайся, што нічога не разумееш. Мы ж з табою не дзеці! Міхайла Гурмана ведаеш, га?

Г а н н а *(адступае на крок назад і хрысціцца).* Свят, свят, свят! Вы што гэта, кума, гаворыце? Міхайла Гурман — так,

і зналася з ім, але яго даўно на свеце няма. Ён у Босніі згінуў.

Насця. Хто гэта табе сказаў?

Ганна. Я гэта ведаю, браты казалі.

Насця. Эге, то-та і яно, што браты!

Ганна. Яго маці сама ліст мне паказвала, плакала.

Насця. Ну, той ліст, напэўна, быў недакладны, бо Міхайла жывы.

Ганна. Кума, пабойцеся Бога, не кажыце гэтага! Можа, вам прыснілася? Можа, дух яго вам аб'явіўся?

Насця. Не, кумачка, я табе кажу: ён жывусенькі! У жандарах служыць ужо тры гады. Недзе быў у іншым баку, а цяпер яго да нас перавялі. Учора ў нашу хату заходзіў, пра цябе распытваўся.

Ганна. Божухна, што гэта? Што са мною робіцца? Кумачка, галубачка! Скажыце, што гэта вам здалося, прыснілася. Бо гэта ж такое... такое, што звар'яцець можна. Бо я таму ж Міхайлу клялася, прысягала, што хутчэй у магілу лягу, чым з кім іншым да шлюбу стану. А цяпер!.. Ён, няйначай, па маю душу прыйшоў. Ды не, не, вы жартуеце, вы толькі так гаворыце!

Насця. Перахрысціся, кума. Чаго ты так спалохалася? Тут, вядомая рэч, браты ашукалі цябе. Значыць, на табе няма ніякай віны. Ён і сам гэта казаў. Ён зусім не вінаваціў цябе. О, калі б ты ведала, як ён добра і шчыра гаварыў пра цябе!

Ганна. Не, не, не! Не кажыце мне нічога! Не хачу чуць пра яго, не хачу бачыць яго. *(Ходзіць па хаце, заломваючы рукі.)* Ой, Госпадзі! Ой, Божа мой, ды няўжо гэта праўда? Няўжо і тут мяне абдурылі, ашукалі, нібы ката ў мяшку прадалі?

Насця. Ды супакойся, кума! Што ўпала, то прапала. Хай ім за тое Бог заплаціць!

Ганна *(усё яшчэ як сама не свая ходзіць па хаце)*. І за што? Нашто? А, ведаю, ведаю! Яны Міхайла баяліся, каб не адабраў ад іх спадчыну, маю долю. О, так, так! А гэты пакорлівы, батрак, яшчэ і рады, што нешта атрымаў. Божа, памажы мне! Не дай звар'яцець!

Насця *(бярэ яе за плячо)*. Ды апомніся ты, кума! Што ты плявузгаеш? Ці не грэх табе? Ты цяпер замужняя, трэба пра ўсё тое забыцца.

Ганна *(углядаючыся ў яе, праз хвіліну)*. Але, праўда ваша! Праўда ваша! Забыць трэба. Няхай сабе сэрца рвецца, а забыць трэба. Ой, Госпадзі! І як яно дагэтуль не пэкнула? Колькі я памучылася за гэтыя гады! А цяпер думала, што вось-вось даўнейшыя раны перастануць балець. А тут на́ табе! Вазьмі! Той, што дасюль быў для мяне мёртвы, з'яўляецца ізноў. Кумачка, даражэнькая! Парай мне, што я павінна рабіць? Дай мне якога-небудзь зелля, каб тут, вось тут перастала балець!

Насця. Дзе я табе, любачка, вазьму таго зелля? Не параю я табе нічога, хіба адно: маліся Богу, можа, ён адвядзе ад цябе гэтае ліха.

Ганна. Малілася, кума, малілася! Таўклася лбом у каменныя сходы пры царкве, слязьмі пліты ўмывала — нічога не памагае.

Насця *(прыслухоўваецца)*. Чуеш? Усё роўна як шаргуны звіняць. Пэўна, нашы едуць.

Ганна *(пры акне)*. Звіняць! Ледзьве чуваць за ветрам, а звіняць. Дзякаваць Богу, што едуць! Хадзем сустракаць!

Абедзве хутка апранаюцца і выходзяць.

З'ява трэцяя

Праз хвіліну ўваходзяць Ганна, Насця і Бабіч, увесь у снезе, з пугаю ў руках.

Бабіч. Добрага вечара вам!

Ганна. Добры вечар! Дык, кажаце, мой з вамі не ехаў?

Бабіч. Не, кума. Я яго на саляварні пакінуў. Ён яшчэ скідаў у сваю паленніцу дровы ды нешта там пачаў з войтам перагырквацца, але я не дачакаўся канца і паехаў за іншымі.

Ганна. Пабойцеся Бога! Як жа вы маглі яго аднаго пакінуць у такую страшэнную завіруху?

Бабіч. Э, не бойцеся, адзін ён не будзе. Напэўна, паехаў на Купінне з перадзяльчанамі. А нашы ўсе на Радлавічы гасцінцам ехалі. Ды ён скора прыедзе, не бойцеся. Коні ў яго добрыя.

Ганна. Ой, баюся я нешта! Кажуць, у лесе ваўкі завяліся. Не дай Божа якога няшчасця!

Бабіч. Ды супакойся, кумка! Яшчэ Бог літасцівы, адвядзе ад нас ліха. А Мікола не дзіця. Ён пра скаціну дбае. Ну, старая, пайшлі дадому, недзе ўжо коні намерзліся.

Насця. Ну, дабранач табе, кума! Маліся, любка, Богу, усё добра будзе!

Бабіч. Дабранач!

Ганна. Ідзіце з Богам!

Бабіч і Насця выходзяць.

З'ява чацвёртая

Ганна *(адна, у кажусе і хустцы, сядае каля акна і прыслухоўваецца).* Не чуваць! Толькі вецер свішча. *(Заломвае рукі.)* А ён жывы, жывы, жывы! Адурманілі мяне, атуманілі, зачаравалі, абвялі вакол пальца ва ўсім, ва ўсім! Не, не хачу пра гэта думаць. У мяне ёсць муж законны. Я яму прысягала і буду верная. *(Прыслухоўваецца.)* Ах! Вось ён ідзе! Ну, усё! Памажы мне, Божа! *(Выходзіць.)*

З'ява пятая

Мікола і Ганна.

За сцэнаю чуваць пазвоньванне шаргуноў. Праз хвіліну ўваходзіць Мікола, увесь заснежаны, у бравэрцы, накінутай паверх кажуха, у авечай кучомцы, у рукавіцах і з плёткаю. Ён становіцца пасярод хаты, дастае плётку з-пад дзягі і пачынае абіваць снег, тупочучы пры гэтым аб зямлю ботамі. Потым, вохкаючы, пачынае распранацца.

Мікола. Вось табе і заробкі! Вось тут і жыві! Божа, і як гэта я душу не згубіў у дарозе, і сам ужо не ведаю! Ох, дый натаміўся ж я! Прамёрз да самых касцей! *(Адсоўвае фіранку і крычыць праз акно.)* Ганна, коней трэба напаіць! Думаў напаіць у Купінні, ды не да таго было!

Ганна *(за сцэнаю).* Добра, добра! Я ўжо і ваду прыхтавала!

Мікола *(засланяе акно, здымае бравэрку, потым кажух і развешвае іх на жэрдцы).* Ну, заробкі, няма што й

казаць! За пяцьдзесят крэйцараў галавою налажы — гэта аплатна?! Цалюткі дзень рабі, выжыльвайся, скаціну ўгроблівай, мерзні і мокні, як сабака,— і за ўсё тое пяцьдзесят крэйцараў. А прыйдзецца плаціць, то і таго ім, людаедам, шкада. Так бы і зжэрлі! Як даюць чалавеку той запрацаваны крэйцар, то ажно рукі трасуцца. А бадай вас трасца, каб вам людская праца бокам павылазіла, нелюдзі праклятыя! *(Сядае з краю стала і пачынае сцягваць боты.)* Вось яшчэ бедачка мая! *(Крычыць.)* Жонка, эй, жонка! Ганна! Дзе ты падзелася?

Ганна *(уваходзіць)*. Ты мяне клікаў?

Мікола. Ды клікаў. Ну што, коні пілі?

Ганна. Яшчэ й як! Так, бедалагі, перамерзлі, так трэсліся. Бедная скацінка! Я ім крыху сыроваткі ў ваду ўліла, выпілі па два кадоўбчыкі.

Мікола. А есці маюць там што?

Ганна. Ну, ды я ўжо не чакала, пакуль ты ім дасі. Насыпала па гарнцу аўса дый сечкі нарэзала на сячкарні, ну, дый сена за драбіны напхала. Але ж чаму ты так запазніўся?

Мікола. Эт, лепей не пытайся! Вось хадзі ды памажы боты сцягнуць. Глянь, змерзліся на костку, баюся, каб ногі не паадмарожваў.

Ганна. Што ты гаворыш? Яшчэ гэтага нам не ставала! *(Бярэ за бот, цягне ды, глянуўшы Міколу ў твар, апускае нагу, адступае на крок назад і хрысціцца.)* Свят, свят, свят! Мікола! А што з табою такое? Ты ўвесь у крыві!

Мікола. Я?

Ганна. Пабойся Бога! А гэта што? Ці не бойка дзе была? Ці, можа, ты скалечыўся?

Мікола. Ды не, не, не бойся!

Ганна *(кідаецца да яго і расшпільвае гузік)*. Пастой жа! Божа, сарочку акрываві ў! Што з табою сталася, Мікола?

Мікола. Ды гэта наш паважаны пан войт.

Ганна. Што?! Біў цябе?

Мікола. Ды пэўна, што не гладзіў. *(Стукае кулаком па стале.)* Але гэтага я яму не дарую! Яму мая крыўда бокам вылезе!

Ганна. Божа, ды што паміж вамі выйшла? За што?

Мікола. Спытайся ў яго! За ніпто! Ні з таго ні з сяго да мяне прычапіўся, каб да цябе чэрці чапляліся!

Ганна *(усё яшчэ аглядае яго)*. Ды не кляні, Міколе, не гняві Бога! Божачка, ды з цябе кварта крыві сышла! Ой, яшчэ нядолечка мая! Давай я абмыю. Недзе тут яшчэ цёплая вада засталася. *(Ідзе да печы.)*

Мікола *(крычыць)*. Не, не трэба! Я на яго ў суд падам! Я заўтра, так як ёсць, да самога пана суддзі пайду. Няхай паны пабачаць! Не мый!

Ганна *(налівае ў міску вады і падыходзіць)*. Ідзі, ідзі, бедная ты галава! Не рабі з сябе пасмешышча. Войту нічога не зробіш, толькі сябе на смех падымеш.

Мікола. Як гэта нічога не зраблю? Няўжо царскае права дазваляе так з людзей збыткаваць? Калі ты ўжо войт і падрадчык давозу дроў на салярню, то можна з чалавека і дух выпусціць?

Ганна. Ты, напэўна, зноў дровы заганяў?

Мікола. Ну, пэўна, што мусіў крыху прадаць. Чалавек намучыўся ў лесе, намёрзся, як сабака, крэйцарыка за душою не мае, а трэба ж нечым душу да цела прывязаць.

Ганна. Эх, Мікола, Мікола! Колькі разоў я табе казала: лепш стрывай, а не рабі гэтага! А цяпер яшчэ ў суд хочаш ісці! Ды войт жа за такое цябе хутчэй у турму запраторыць, чым ты яго!

Мікола *(глядзіць на яе са страхам)*. Дальбог, жонка, ты праўду кажаш! А мне гэта і ў галаву не прыйшло! Ну, на, мый!

Ганна *(абмывае яго)*. Дальбог жа, ты не толькі дровы прадаў, а яшчэ і сам войту нейкае абразлівае слова сказаў, ну?

Мікола. Я? Ды пакарай мяне Божа, што не! Прычапіўся, што сані недагружаныя. Я, як звычайна, апошнім выгружаўся, а ён да мяне. Відаць, нехта ўжо данёс, што я пару тых паленаў прадаў.

Ганна. А можа, ён і сам тое бачыў?

Мікола. А ліха яго ведае, можа, і бачыў. Досыць, што ён да мяне. «Я табе, кажа, не заплачу, пакуль кубаметр не будзе цэлы». А я кажу: «Які быў у лесе, такі і тут». А ён мне кажа: «Брэшаш, ты пяць паленаў прадаў». А я яму кажу: «Калі прадаў, то не адзін прадаў. Усе прадаюць». А ён да мяне прыстаў: «Хто прадае?» Ды ўсё: «Хто, хто?»

Што я яму павінен быў казаць? Папраўдзе, чалавек нічога не бачыў, а так на першага-лепшага гаварыць сорамна. Вось я вазьмі дый скажы яму: «Ды і вы самі, пакуль не былі падрадчыкам, таксама прадавалі». Не паспеў я яму гэта сказаць, а ён як кінецца на мяне, як пачне аграваць мяне калом! Ды па галаве, ды куды папала! Я ўжо і не помню, калі, і хто, і як мяне адбараніў ды на сані пасадзіў.

Ганна *(хістае галавою).* Я так і думала, што ты нешта такое мусіў ляпнуць. Войт не такі чалавек, каб за абы-што прычапіцца.

Мікола *(з горыччу).* О, то пэўна! У цябе кожны чэсны, кожны разумны, толькі не твой муж.

Ганна. Я тваю чэсць не прыніжаю, толькі не трэба было дровы прадаваць.

Мікола. А мерзнуць ды галадаць трэба было?

Ганна. Узяў бы з дому пару крэйцараў на гарэлку, калі ўжо без яе не можаш абысціся. Мы ж не такія апошнія на вёсцы.

Мікола. Вось табе на! На заробак ехаць і яшчэ з дому грошы цягнуць!

Ганна. Ну, калі так, то атрымлівай плату, якую сам захацеў. *(Засцілае стол і пачынае падаваць вячэру.)* Але дзе ж ты так доўга забавіўся?

Мікола *(злосна).* А табе што да таго? Не тваё дзела! Калі я табе такі нямілы, то не пытайся ў мяне ні пра што!

Ганна *(ставіць міскі на стол).* Ну, калі так будзеш са мною гаварыць, то напэўна мілейшы не станеш.

Маўчанне. Мікола барабаніць пальцамі па шыбе. Ганна ставіць вячэру. Мікола паварочваецца і пачынае моўчкі есці. Потым чуваць стук у акно. Ганна ўздрыгвае, Мікола выпускае лыжку з рук.

Свят, свят, свят! А гэта што такое?

Мікола. Нехта ў акно стукае. У такую познюю гадзіну, у такую непагадзь — ой, можа, якое няшчасце!

Голас з-за акна. Гэй, людзі, адчыніце, не дайце жывой душы загінуць!

Ганна. Нехта, пэўна, з дарогі збіўся. Бягу адчыніць.

Мікола. Ганна, стой! Можа, якая злая душа?

Г а н н а. Ды што ты? Даць чалавеку загінуць? Дый што нам злая душа? Узяць у нас няма чаго, нікому мы нічога не вінныя, то чаго нам баяцца? *(Выходзіць.)*

Чуваць бразгат засаўкі.

З'ява шостая

М і к о л а, праз хвіліну ўваходзіць ж а н д а р з карабінам, увесь у снезе, за ім Г а н н а.

Ж а н д а р. Добры вечар у хату!

М і к о л а. Добры вечар!

Ж а н д а р. Прабачайце, што ў такі позні час няпрошаны ў вашу хату ўвальваюся. Але там такая страшэнная завіруха, мяцеліца, што не давядзі Госпадзі! Я з дарогі збіўся, думаў ужо, што або замерзну дзе ў гурбе, або ваўкам у зубы траплю.

Г а н н а *(хрысціцца)*. Божа мой!

Ж а н д а р *(азіраецца на яе, акругляе вочы, потым перамагае сябе)*. Дальбог! Недалёка ўжо было да таго. Там пад лесам чуваць, як яны выюць. У любую мінуту маглі нячысцікі са мною прывітацца.

М і к о л а. Ды распраніцеся, пане, прысядзьце! Бо цяпер жа, уначы, нікуды не пойдзеце.

Ж а н д а р. Ды куды ўжо! Ног сваіх не чую, так прамёрз ды змучыўся! Ой, дзякуй табе, Божа, што жывым з таго снежнага пекла вылузаўся! *(Абівае снег і пачынае распранацца. Мікола ўглядаецца ў яго.)*

М і к о л а. А вы адкуль будзеце, пане жандар?

Ж а н д а р. Ды проста пехам з горада.

М і к о л а. Так, пехатою. Але родам? Даруйце, мне здаецца, што я вас недзе некалі бачыў.

Ж а н д а р *(смяецца)*. Ну! Дзіва што, Мікола, стары пабраціме! Хіба ж ты не пазнаў мяне? *(Пляскае яго па плячы.)*

М і к о л а. Міхайла Гурман! Дык гэта ты! А мы думалі... Ганна, глянь, а хіба ты не пазнала Міхайла?

Ганна *(нерухома стаіць у канцы стала і не глядзіць на іх, шэпча малітву).* І аставі, і аслабі, і адпусці, Госпадзі...

Жандар *(рагоча).* Ганна! Гаспадыня! Што гэта вам маліцца захацелася? Няўжо не прывітаецеся са старым знаёмым?

Ганна *(падае яму руку).* Як маецеся, пане жандар?

Жандар *(хвіліну пільна ўзіраецца ў яе, потым адпускае руку, сціскае зубы і адварочваецца, гаворыць толькі з Міколам).* Ну, сённяшнюю ноч я не забуду, пакуль буду жыць. Ведаеце, як пачуў я скрозь вецер тыя воўчыя галасы, дый зусім недалёка,— ну, думаю, хана мне! Тут мне нібы хто жару за спіну сыпануў. Ды ў той самы момант я ўбачыў за спіною святло. Падумаў спярша, што воўк вачыма бліскае, аж потым бачу, што стаіць на месцы... І ўжо я нічога больш не думаў, не меркаваў, толькі як пушчуся бегчы напрасткі, праз нейкія канавы, гурбы і платы. І Бог яго ведае, адкуль у мяне столькі сілы ўзялося. Грымнуўся, можа, з дзесяць разоў, дальбог, але, дзякаваць Богу, хоць косці цэлыя!

Мікола. Ну, што ж, дзякаваць Богу! Але скажы ты мне, калі ласка, што гэта з табою? Адкуль ты ўзяўся? Казалі ж, што ты...

Жандар *(рагоча).* Ха, ха, ха! Што казалі?

Мікола. Ну, што ты загінуў, памёр...

Жандар *(смяецца яшчэ гучней і падыходзіць да яго. Мікола ўздрыгвае).* Ха, ха, ха! Дык гэта ж праўда! Я ж нябожчык. Не верыш, Мікола? Я мёртвы! Я з таго свету прыйшоў!

Мікола *(перапалоханы, хрысціцца).* Свят, свят, свят!.. *(Слаба ўсміхаецца.)* Ну, што ты вярзеш дурное, Міхайле? Не трэба з такімі рэчамі жартаваць.

Жандар *(грозна).* Ты думаеш, я жартую? Ану, на, дакраніся да мяне! *(Працягвае руку, Мікола адступае.)* Га, бачыш! Але ліха з ім! Ведаеш, Мікола, чаго я прыйшоў?

Мікола. Ты? Да мяне?

Жандар. Ага! Па тваю душу. *(Рагоча.)* Ха, ха, ха! От напалохаў! Ну, не бойся, бедалага! Твая душа не надта каштоўная, каб ажно мерцвякі з труны да яе прыходзілі. Не бойся, глянь, я жывы чалавек, такі, як ты! *(Пляскае яго*

па плячы.) А адкуль я тут узяўся, гэта я табе зараз скажу. Вярнуўшыся з войска, я прадаў зямлю і хату і пайшоў у жандары, вось ужо тры гады служу. Зразу на граніцы быў, кантрабандыстаў лавіў, а вось пару тыдняў ужо, як перавялі мяне сюды.

Мікола. І чаму ж гэта ты адразу не сказаў? А то на табе! Узяўся страшыць нябожчыкам. Эх, Міхайле, Міхайле! Ты, як бачу, усё яшчэ такі самы жартаўнік, якім раней быў. *(Хістае галавою.)* Ну, сядай вячэраць разам з намі.

Жандар. Вось гэта сапраўды разумнае слова. *(Бярэ лыжку і сядае за стол.)* Але вы чаму ж так позна вячэраеце? Ужо ж, напэўна, поўнач будзе.

Мікола. Бо я ж у такім самым пекле быў, што і ты. Толькі нядаўна з дарогі.

Жандар *(ядучы)*. З якой дарогі?

Мікола. Ды з горада. Метры вазіў на саляварню дый запазніўся. Насілу дадому дапхнуўся. *(Есць.)* А яшчэ мяне чорт падбіў ехаць на Купінне. Думаў, што бліжэй будзе, напраткі праз лес, а тым часам там так замяло, што я ледзь скаціну навек не загубіў.

Жандар *(кладзе лыжку і глядзіць на яго здзіўлена)*. Што? Ты сённяшняй ноччу на Купінне ехаў?

Мікола. Так, ехаў.

Жандар. Міма купінскай карчмы?

Мікола. А як ты яе аб'едзеш! Яшчэ спыніўся, хацеў коней напаіць, ды нейкі недавярак вядро адчапіў. Пачаў стукацца да жыдоў, але ніхто не выходзіў, я і падумаў сабе: «Ды ўжо і так дадому блізка!» Так і не дастукаўшыся, узяў і паехаў.

Жандар. А даўно гэта было?

Мікола. О, пэўна, ужо гадзіны са тры будзе. Хоць ад нас да купінскай карчмы ледзьве паўмілі набярэцца, але як пачаў я ехаць, як пачаў валачыся ды з дарогі збівацца, то здавалася, што, прынамсі, паўгода еду. А тут чалавек адзінадным у лесе.

Жандар. Дык ты адзін ехаў? І не бачыў, ехаў яшчэ хто за табою?

Мікола. Дзе там! Усе нашы перада мной выехалі, дый усе ехалі на Радлавічы, гасцінцам.

Ж а н д а р. Ну, а ў карчме святло было?

М і к о л а. Было, але вокны былі завешаны, а дзверы замкнуты. Відаць, жыды ўжо спалі, бо на мой стук ніхто не абазваўся.

Ж а н д а р *(мармыча).* Ну, пэўна!

Ядуць моўчкі. Ганна сядзіць на палацях, намагаецца есці, але не можа.

Ну, дзякую вам, пане гаспадару, за вячэру! *(Кладзе лыжку і ўстае.)*

М і к о л а. Няма за што! На здароўе! *(Устае таксама, абодва сядаюць на лаву.)*

Ганна моўчкі прыбірае са стала.

Ж а н д а р *(прыглядаецца да Міколы збоку).* Го, ды што гэта ў цябе, Мікола, твар такі абабіты? Я нешта не прыпамінаю, каб ты быў скоры да бойкі!

М і к о л а *(сумеўшыся).* Я? Ха, ха, ха! Ды куды мне! Я чалавек спакойны. А гэта тыя злашчасныя калодкі мяне так цюкнулі. Толькі пачаў браць з кучы, а зверху як пасунуцца на мяне! Яшчэ шчасце, што на месцы не прыбілі.

Ж а н д а р. О, гэта дрэнь дзела!

М і к о л а. Хай Бог бароніць ад такога заробку!

Ж а н д а р. А шмат зарабляеш за дзень?

М і к о л а. Э, як кот наплакаў! Паўсотні за дзень. А колькі чалавек навысільваецца, намерзнецца, намучыць сябе і скаціну, што адрокся б ад усяго.

Ж а н д а р *(зноў углядаецца ў ягоны твар).* Але табе, браце, тыя дровы добра-такі саданулі. Па правай шчацэ нібы граблямі працягнула.

М і к о л а. Ды кажу табе, што як на мяне з правага боку калодкі пакаціліся, то думаў, што ўжо мне галаву на блін сплешчуць.

Ж а н д а р *(устае, праходзіцца па хаце і сядае леваруч ад Міколы, а потым глядзіць на яго).* Го, ды цябе з левага боку яшчэ горш скалечыла.

М і к о л а *(сумеўшыся).* А гэта я тым бокам на зямлю ўпаў, на ламачча, ды так стукнуўся. Яшчэ добра, што вока на сук не высадзіў.

Ж а н д а р *(заглядае яму ў вочы).* Э, дык і спераду шрам на лбе, усё роўна як хто падзёр, яшчэ і сінякі пад вачыма. Гэй, Мікола, прызнавайся, гэта не ад дроў!

М і к о л а *(яшчэ больш сумеўшыся).* Што ты зноў за сваё! У чым я мушу прызнавацца? Далібог жа, ні з кім не біўся! Дый нашто мне табе лгаць?

Ж а н д а р *(смяецца і пляскае яго па плячы).* Ну, ну, Мікола, не бойся! Я сёння твой госць, то ні ў чым табе не трэба прызнавацца. Але адно скажу табе, нябога: ты круціць не здольны. Відаць адразу, калі хочаш салгаць, а яно табе ні на грош не ўдаецца!

М і к о л а *(запалоханы).* Але ж каб я з гэтага месца не сышоў!..

Г а н н а. Мікола, ды перастань ты бажыцца! Падумай лепей, дзе мы пану жандару пасцелем. Позняя гадзіна, а вы абодва намучыліся, пара спаць.

М і к о л а. Ай, ай, ай, твая праўда, жонка! А я, дурань, загаварыўся дый забыўся пра гэта! Я зараз, зараз! *(Кідаецца сюды-туды па хаце, ды ўсё не ў толк. Надзяе шапку і кажух.)*

Г а н н а. Ты куды?

М і к о л а. Я зараз! Знаеш, я так сабе думаю: акалот саломы прынясу, пасцелем Міхайлу вось тут на зямлі. Ты толькі транты якія знайдзі, падушку, а кажухом накрыецца.

Ж а н д а р. О, дзякуй вам. У мяне ёсць шынель.

Г а н н а. Ды я сама па салому схаджу.

М і к о л а. Ну! Куды табе! Я мігам прынясу. *(Бярэ шапку і выходзіць.)*

З'ява сёмая

Тыя самыя без Міколы.
Г а н н а завіхаецца каля ложка.
Ж а н д а р падыходзіць да яе і бярэ за плечы.

Ж а н д а р. Ганна!

Г а н н а *(ледзь чутна).* Чаго табе?

Ж а н д а р. Што, ты нават глянуць на мяне не хочаш?

Ганна паварочваецца да яго тварам, але тут жа апускае вочы долу і маўчыць. Жандар доўга глядзіць на яе.

Нелюдзі! Паганцы! Стрымалі-такі слова, закапалі цябе жыўцом у магілу! Хай ім Бог не даруе!

Ганна. Ты пра каго гэта?

Жандар. А пра каго ж, як не пра тваіх любых брацікаў? Ведаеш, як мяне забіралі ў войска, то адзін з іх у карчме сказаў мне: «Ты, Міхайла, ідзі з Богам, але пра Ганну і не думай. Не будзе яна тваёй, лепей мы яе жывою ў магілу закапаем». Я тады рассмяяўся яму ў твар, але бачу, што яны такі настаялі на сваім.

Ганна *(нясмела)*. То ты... не злуешся на мяне? Не праклінаеш мяне?

Жандар. На цябе, бедная сіраціна? Хіба ж я не ведаю, што ты тут нічым не вінная, што ты не па сваёй волі, што цябе ўгаварылі, абдурылі, прымусілі?

Ганна плача.

Ды не, прызнаюся табе: спачатку, дазнаўшыся, што ты выйшла замуж за гэтага цельпука, быў злы на цябе. Я задушыў бы цябе, калі б ты была недзе блізка. Я цэлымі днямі бегаў як звар'яцелы па полі і кляў цябе, прасіў на цябе ў Бога самай цяжкай кары, якая толькі ёсць на свеце.

Ганна *(перапалохана)*. Міхайле!

Жандар. Не бойся, Бог не дзіця, каб слухаць праклёны вар'ята.

Ганна *(скрозь слёзы)*. Ой, баюся, што ён такі пачуў цябе!

Жандар *(радасна)*. Што? Значыць, ты не забыла мяне? Любіш яшчэ мяне, Ганна?

Ганна *(перапалохана адпіхвае яго ад сябе)*. Маўчы, маўчы! Што ты гаворыш? Не смей мне так казаць! Я замужняя жанчына, я мужа маю.

Жандар. Гэ, што такое муж! Сёння ёсць, а заўтра можа не быць.

Ганна. Як гэта? Што гэта значыць? Што ты гаворыш?

Жандар. Нічога, так сабе. Але калі б яго не было, то ты...

Ганна. Маўчы, маўчы! Не гавары! І пра мужыка майго не смей думаць нічога кепскага!

Жандар. Эт, кажы сабе! Гэта мы самі паглядзім! Што я пра яго думаю, то маё дзела.

Ганна *(бярэ яго за локаць)*. Міхайле, што ты надумаў, прызнавайся?

Жандар. Ды супакойся! Заўтра ўбачыш!

Ганна. Заўтра? Значыць, ёсць нешта? Ты што задумаў? Нешта страшнае? О, так. Бачу гэта па тваіх вачах! Адчула гэта ў тваім голасе, калі ты распытваўся ў яго пра тыя шрамы. О, я знаю цябе — у цябе каменнае сэрца! Я не стану прасіць цябе, каб злітаваўся над намі, не пагубіў нас. Адно толькі табе скажу, што дваіх нявінных людзей возьмеш на душу!

Жандар. Я спадзяюся, што ніводнага не вазьму. Але адно табе скажу: твой чалавек добра б зрабіў, калі б сёння дома сядзеў і не ездзіў у заробкі.

Ганна. Звер ты, звер ты люты! Надумаўся пажэрці нас і цяпер лічыш, што знайшоў прычыну. Але Бог цябе пакарае, цяжка.

Жандар *(смяецца)*. Ха, ха, ха! От добра: сышліся два нябожчыкі, што пры жыцці любіліся і пасля смерці адно аб адным не забыліся, а сышоўшыся, не маюць чаго лепшага рабіць, як сварыцца. Ганна, сэрца маё! Няўжо я такі ненавісны табе?

Ганна. Што ты хочаш ад мяне? Чаго прыйшоў у нашу старану?

Жандар. Богам табе клянуся, што я не хацеў. Два месяцы я ўжо тут, а ведаеш сама, што я мінаў вашу хату. Ажно сёння — не ведаю, ці Бог, ці доля ліхая прывялі мяне да вас.

Ганна. Годзе! Муж ідзе! *(Сцеле ложак.)*

Жандар сядае ў канцы стала і нібыта дрэмле.

З'ява восьмая

Тыя самыя і Мікола з акалотам саломы.

Мікола *(кідае акалот сярод хаты)*. Ну, і завіруха ж там — не давядзі Госпадзі! Заўтра, відаць, нашу хату па страху замяце. Ледзьве я прагробся ад хаты да гумна. *(Распранаецца.)* А ты што, Міхайла, дрэмлеш? Я думаў, што ты са старою знаёмаю *(міргае ў бок Ганны)* захочаш пагутарыць. Вы ж некалі любіліся...

Жандар. Э, мала якая дурната чалавеку ў галаву лезла, пакуль малады быў! А цяпер, калі яго ў войску памуштравалі, ды па баснійскіх гарах папаганялі, ды на жандарскай службе загартавалі, то куды яму ўжо тыя даўнія любошчы ўспамінаць! Дый твая кабета, выбачай за слова, нейкая нібы пракіслая трохі. Відаць, моцна ты яе ў руках трымаеш, га?

Мікола. Я? Яе? Божа, ды яна мяне... Ды я табе... Але што аб гэтым гаварыць! Смешна мне, старому. А вось што сумуе ды тужыць яна каля мяне, гэта праўда.

Жандар. Ну, гэта ўжо ваша справа. Што мне ў тое ўмешвацца!

Мікола. Так, браце, твая праўда. Муж і жана — адна сатана; муж з жонкай біся, а чужы не мяшайся.

Ганна *(сцеле жандару на зямлі)*. Ты, Мікола, дзверы пазамыкаў?

Мікола. А як жа! *(Пазяхае.)* О, пара ў бярлог. *(Хрысціцца і шэптам моліцца на абразы.)*

Жандар. Ды хіба і мне ўжо раздзявацца. *(Раздзяецца, хрысціцца і кладзецца на саломе.)* А калі б я заўтра рана не прачнуўся, то, калі ласка, разбудзіце мяне, калі ўстанеце.

Ганна. Добра, добра. *(Кладзе яго карабін на лаву, заглядае ў печ і засоўвае засланку. Тым часам Мікола, скончыўшы малітву, распярэзваецца і кладзецца на ложку.)*

Мікола. Ты спіш ужо, Міхайле?

Жандар. Драмлю. А што такое?

Мікола. Ды нічога. Дабранач табе!

Жандар. Дабранач!

Ганна хрысціцца, потым становіцца на ляжанку і тушыць лямпу.

Заслона

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Тая самая дэкарацыя. Дзень. Гарыць у печы. Мікола парыць бярозавыя пруты і пляце гужы. Ганна то завіхаецца каля печы, то дапамагае яму.

З'ява першая

Мікола і Ганна.

Мікола. Ну, трымай моцна, не пускай! *(Пляце.)* Так. Цяпер давай сюды. Хай яго хвароба з тымі дрывамі! Плюнуў бы чалавек на тыя заробкі, ш тут не, едзь ізноў, каб тыя метры затарабаніць, хай яны яму калом стануць!

Ганна. Дык жа сёння лягчэй будзе ехаць, чым учора. Паглядзі, выпагадзілася!

Мікола. Ага, выпагадзілася! А ўчора дарогу замяло за лесам, што і следу не знайсці. Не, я сёння ўсё-такі не паеду. І сябе пашкадую, і скаціну. Няхай ён пропадам прападзе са сваімі дрывамі!

Ганна. Ды напэўна, што лепш не ехаць, чым па снезе з грузам валачыся. Дровы не ўцякуць, а работа і дома знойдзецца. Ой, калі б ты ўчора мяне паслухаў ды не паехаў!

Мікола. То што?

Ганна. Ды нічога. Але маё сэрца чуе нейкую бяду. Якая мне сёння погань снілася, то няхай Бог бароніць! Быццам я пацеркі сею па хаце, па аборы, па ўсёй вёсцы, ды такія буйныя і чырвоныя...

Мікола *(нібы сам сабе)*. Пацеркі — гэта слёзы.

Ганна. А потым нібы на нашу хату з усіх бакоў сабакі брэшуць, у дзверы лезуць, у вокны галовы прасоўваюць, ды такія злыя, лютыя...

Мікола. Злыя сабакі — гэта напасць нейкая.

Ганна. А пасля мяне не раўнуючы як да шлюбу адзяюць, ва ўсё белае: у белыя чаравікі, белую спадніцу, белую намітку.

Мікола. Свят, свят, свят! Што з табою, жонка? Хай Бог нас крые ад усялякага ліха! Што ты гаворыш?

Ганна. А што такое? Хіба гэта нешта значыць?

Мікола. Ды... лепей у ліхую гадзіну не ўспамінаць! Божа! Прывярзецца ж нешта!.. Але на ўсё Божая воля. Не трэба ніколі забягаць перад бацькам у пекла! *(Пляце зноў.)* Гм, і што рабіць з тымі метрамі, сам не ведаю.

Ганна. Можа б, пайсці спытацца ў Бабіча, ці ён едзе?

Мікола. Святая праўда. Калі ён едзе, то няёмка мне заставацца. Як толькі сані ўладжу, адразу пайду да яго. *(Кідае гатовыя гужы і садзіцца на лаву.)* Ой, у крыжы ломіць! Божа, палажыў чалавек сваю сілу на чужых людзей, а цяпер для сябе толькі астаткі засталіся. Ганна!

Ганна *(каля печы)*. Чаго табе?

Мікола. Што гэта жандар так рана ўскруціўся? Я і не бачыў, калі пайшоў.

Ганна. Казаў, што трэба, служба...

Мікола. А знаеш, я яго як убачыў, то адразу аслупянеў на месцы. У такі час, у такім мундзіры — падалося, што гэта мярцвяк з таго свету да нас заходзіць. А тым часам, бачу, ён жывы.

Ганна. А хіба ж ты не ведаў, што ён у нашай старане?

Мікола. Я? Ды адкуль мне ведаць? Я быў пэўны, што ён даўно ўжо згніў у той Босніі. Твой жа братан кляўся мне, што яго няма на свеце, нават пахавальную паказваў. Толькі шкада, што я непісьменны, не мог прачытаць.

Ганна. Значыць, і цябе таксама ашукалі, як і мяне.

Мікола. Не ведаю толькі, нашто ім закарцела выпхнуць цябе ў бліzкі свет.

Ганна. А я ведаю. Не хацелі мне нічога даць з маёй долі. Ну, а калі б я пайшла за Гурмана, то той бы ў іх з горла вырваў. Ты знаеш, які ён чалавек. Баяліся яго, то і пастараліся разам з войтам, каб яго, аднаго ў маці, выпхнуць на вайну, а пасля зрабілі ўсё, каб і мяне выслаць у чужую старану. Вось і ўся мудрасць.

Мікола. Божухна, а я і не здагадваўся, адкуль што! Мужык з багатырамі кампаніі не вадзіў, то і на штуковінах багацеяў не разумеецца.

Ганна праходзіць каля яго, ён ловіць яе, прытульвае і цалуе ў лоб.

Бедная ты мая, сірацінка! А ты дужа любіла свайго Міхайла?

Г а н н а *(успыхнуўшы).* Ну, што ўжо пра тое гаварыць? Любіла ці не любіла, цяпер няма чаго ўспамінаць. Вот лепей ідзі сані ладзь! Полудзень ужо гатовы. Покуль ты там управішся, то ўжо і астыне.

М і к о л а. Твая праўда, Ганна! *(Устае і бярэ гужы.)* Не час беднаму згадкамі бавіцца, трэба работу рабіць. Налівай, і я зараз прыйду! *(Выходзіць.)*

З'ява другая

Г а н н а і М і к о л а за сцэнаю.

Г а н н а *(налівае баршчу ў міску, кладзе ў другую фасолю і ставіць на стол).* Ці дужа любіла гэтага Міхайла? Здаецца, што дужа, калі і дасюль уся калачуся, усю мяне мароз праймае, як яго ўспомню. Здаецца, што вельмі. А можа, больш баялася яго, чым любіла. У, сілішча ў яго! Вала за рогі хопіць дый на зямлю кіне. Госпадзі, такіх, як мой, то ён можа двух адной рукой падняць. Адным поглядам, здаецца, наскрозь цябе пранізвае, усё роўна як распаленым дротам. Ох, дый баюся ж я яго! Баюся, як найгоршага ворага! І пэўна, што як на нашу галаву зваліўся, то сатрэ нас у пыл, знішчыць, зруйнуе. Бо хіба ж мой чалавек зможа з ім пазмагацца?

М і к о л а *(за сцэнаю).* Ганна, гэй, Ганна!

Г а н н а. Чаго табе?

М і к о л а. Дзе ты рэзгіны падзела? Трэба коням сена даць.

Г а н н а. Ды рэзгіны ў сенях; я даўно сена паклала. Хадзі есці. *(Выграбае агонь з печы.)*

М і к о л а. Зараз, толькі яшчэ застаўкі папраўлю. Недзе два білкі дзеліся.

Г а н н а. Ды пакінь ты тыя застаўкі на потым, не ўцякуць. О Божа, чым далей, тым чамусьці горай мне робіцца. Трывожна, як перад пажарам. Усё мне здаецца, што вось-вось нейкае няшчасце...

З'ява трэцяя

Мікола і Ганна.

Мікола *(скрыпнуў дзвярыма, заходзіць).* Н-ну!

Ганна *(усхопліваецца ад печы).* Ох! Гэта ты?

Мікола. Што з табою, жонка? Цябе не пазнаць.

Ганна. Нічога, нічога. Нешта мне нядобрыцца. Гэта, відаць, ад печы... Я трохі разгарачылася, то галава кружыцца. Сядай лепей ды еш, я нап'юся вады, мне і палягчэе.

Мікола *(сядае за стол, хрысціцца і бярэ лыжку).* Ды хадзі і ты палуднаваць. Мне аднаму неяк страва ў рот не лезе.

Ганна. Э, што так! Не думай нічога, еш! А я тым часам падбягу да Бабіча, спытаюся, ці едзе ён у лес.

Мікола. Калі так, то падскоч. Крыху пройдзешся, то, можа, і галава перастане балець. Ідзі, ідзі! *(Есць.)*

Ганна накідае на галаву хустку і кіруецца да дзвярэй. У той момант дзверы адчыняюцца. Уваходзяць жандар, войт і Бабіч, прысяжны і яшчэ адзін селянін.

З'ява чацвёртая

Мікола, Ганна, жандар, войт, Бабіч, прысяжны і адзін селянін.

Войт *(заходзячы).* Пахвалёны ў хату!

Мікола. На векі векаў! Просім да стала!

Войт. Абедайце самі, хай Бог благаславіць!

Мікола. Сядайце, пане войт. Што вас сюды да нас прывяло?

Войт *(сядае на ўслоне спіною да стала, жандар — на лаве, прысяжны і селянін стаяць і аглядаюць хату).* Гм, так сабе. Маем да вас невялікую справу.

Мікола. Да мяне? А што такое?

Войт. Вы ўчора сказалі пану жандару, што былі ўначы ў карчме ў Купінні?

Мікола. Ну, быў. Не ў карчме, а пад карчмою.

Войт. І позна ўночы?

Мікола. Позна. Ужо за мною ніхто, відаць, не ехаў.

Войт. Вы прыехалі дадому акрываўлены?

Мікола. Ды... ды... але.

Жандар. Што? Вы і дадому акрываўлены прыехалі? Я гэтага ад вас не чуў. Гаспадыня, гэта праўда?

Ганна. Ды праўда. Я сама яго абмывала.

Жандар. О, гэта важная дэталь. *(Запісвае ў сшытак.)* А вы ж казалі, што ў лесе скалечыліся, калі калодкі бралі. Значыць, вы і ў горад ехалі акрываўлены, і з горада вярталіся ў крыві?

Войт. Ён вам так казаў? Ну, гэта няпраўда. Ён у горадзе быў здаровенькі і зусім чысты. Я ж яго сам бачыў на саляварні.

Мікола. Скажыце ўсю праўду, пане войт!

Войт. Якую ўсю праўду?

Мікола. Гэта ж вы мяне ўсяго так распісалі.

Жандар *(усхопліваецца).* Што, што, што?

Войт. Брэшаш, Мікола! Гэта праўда, што мы трохі з табою пасварыліся за тыя паленні, але біць цябе я і мыслі не меў.

Мікола. У мяне ёсць сведкі. Я наўмысна не змываў крыві з сябе і дадому так прыехаў, каб на вас у суд падаць.

Войт. Ха, ха, ха! На мяне! У суд!

Жандар. Хто ў вас за сведак?

Мікола. Ды вось кум Бабіч і кум Калініч таксама там былі, могуць і пасведчыць.

Бабіч *(чухае патыліцу).* Ды быць-то я быў, няма чаго казаць, але таго я не бачыў, каб вас кум начальнік акрывавіў. Стукнуў вас у вуха, гэта праўда, але каб вось так пабіў, то я таго не магу пасведчыць.

Селянін. І я таксама не магу.

Жандар. Мікола Задарожны, я вас арыштую. *(Дастае з сумкі наручнікі.)* Давайце сюды рукі і не думайце супраціўляцца, бо вам горш будзе.

Ганна. Ой, горачка маё!

Мікола. Арыштуеце? Мяне? За што?

Жандар. Вы самі, напэўна, лепей знаеце, за што. Учора ноччу ў карчме ў Купінні ўсіх жыдоў выразалі.

Мікола. О Божа! То што, я ў гэтым замешаны?

Жандар. Я не ведаю. Дай Божа, каб не. Але скажыце самі, ці супраць вас усё не сведчыць? Калі вы не вінаваты, то не павінны баяцца, на судзе ваша праўда выйдзе. Але я павінен сваё зрабіць! Давайце рукі!

Мікола. Бог бачыць маю душу. Я не вінаваты. Рабіце са мною, што хочаце. *(Падае рукі, жандар надзяе наручнікі.)*

Жандар. Так, гэта разумна. А цяпер скажыце мне, дзе тыя боты, што ўчора былі на вас?

Мікола. А вунь стаяць у запечку.

Жандар. Прысяжны, падайце іх сюды!

Прысяжны падае, войт і жандар аглядаюць іх каля акна.

Ёсць! Вось кроў!

Войт. І вось тут кроў!

Жандар. Шкада! Адлажыце ўбок.

Мікола. Гэта мая кроў, калі я ехаў...

Жандар. Гэта ўжо будзеце ў судзе даказваць, не наша дзела. У вас была з сабою сякера? Дзе яна?

Мікола. Ды вунь, пад лаваю.

Жандар. Прысяжны, падай яе сюды!

Прысяжны падае, жандар і войт аглядаюць.

Ёсць і тут кроў. Вось, на тапарышчы.

Войт. І вось на абуху. І вось на лязе.

Жандар. Адлажыце ўбок. А цяпер пакажыце кажух!

Аглядаюць кажух.

Ёсць і тут. Адлажыце ўбок. *(Ідзе да ложка і поркаецца пад падушкай у саломе. Да Ганны.)* Адчыніце куфар!

Ганна ўвесь час стаіць нібы аслупянелая, не кранаецца з месца, толькі глядзіць на яго.

Чуеце, жанчына, адчыніце куфар! *(Калі яна не кранаецца з месца, ён дастае ключ у яе з-за пояса, адчыняе куфар і разам з войтам пачынаюць вобыск.)* Ну, тут няма нічога.

Пане войт, прысяжны і вы, сведкі, ідзіце з ім і перашукайце ўсе будынкі, падпаветку, хлеў, гумно, усялякія сховы. А я тут дапрашу гаспадыню.

Войт. Ну, Мікола, хадзі з намі!

Мікола. Госпадзі, ты ведаеш, за што мне такая кара, няхай будзе твая воля! *(Выходзіць, за ім войт, прысяжны і селянін.)*

З'ява пятая

Жандар і Ганна.

Жандар *(пасля іх адыходу хвіліну маўчыць, стоячы нерухома пасярод хаты насупраць Ганны, якая стаіць каля патухлай печы. Тады ён выпростваецца і ўзнімае галаву. Строга)*. Ганна!

Ганна ўзнімае галаву, глядзіць на яго з невымоўнай трывогаю і апускае вочы.

Хадзі сюды!

Ганна падыходзіць да яго і спыняецца.

Бліжэй, бліжэй! Глядзі мне ў вочы! Прама!

Ганна *(намагаецца глядзець, уся дрыжыць, потым кідаецца перад ім на калені)*. Міхайле, Міхайле! Не мучай мяне! Не магу глядзець на цябе! Ты такі страшны!

Жандар. Дурная! Чаго табе баяцца? Для зладзеяў, бандытаў я магу быць страшны, гэта мая служба. Ты не бойся!

Ганна. Але ж ён ні ў чым не вінаваты! Міхайле! Што ты нагаварыў на яго? Клянуся табе, што ён не вінаваты!

Жандар. Хто — ён? А, твой Мікола! Ну, а можа, і вінаваты?

Ганна. Не, не, не! Ніколі! Ён такі добры, ён чарвяка наўмысна не растопча, не тое каб чалавека забіў!

Жандар. А мяне забіў! Мяне зрабіў няшчасным! Не, не гавары мне пра яго! Што мне да яго! Я яму не вораг, а трапіліся доказы, што сведчаць супраць яго, то я павінен яго арыштаваць. Павінен, чуеш? Такая мая служба. Калі ён не вінаваты, то суд апраўдае.

Ганна. Дык чаго ж ты ад мяне хочаш? Я ж з ім не была, нічога не ведаю. Толькі тое ведаю, што прыехаў у крыві і казаў, што яго войт пабіў.

Жандар. А мне гэта не абыходзіць. Будзе пра гэта ў судзе гаварыць. Я пра іншае хачу з табою словам перакінуцца. Ганна, паглядзі мне ў вочы! *(Бярэ яе за плечы і ўглядаецца ў вочы.)* А ты яшчэ прыгожая, маладая, свежая! Ганна, любіш мяне?

Ганна *(дрыжыць)*. Міхайле, пусці мяне!

Жандар. Не, не пушчу! Скажы зараз жа, любіш мяне?

Ганна *(адвярнуўшыся)*. Не, не, не люблю! Ты страшны! Не люблю!

Жандар *(грозна)*. Глядзі мне ў вочы, чуеш?

Ганна глядзіць яму ў вочы.

Скажы цяпер, любіш мяне?

Ганна. Міхайле! Родненькі мой, не мучай мяне! Калі вось так узіраешся ў мяне, то мне так цяжка, так страшна! Сама не свая стаю!

Жандар. Глупства! Кажы, любіш мяне?

Ганна *(ледзь чутна)*. Люблю.

Жандар. Яшчэ раз скажы! Гучней!

Ганна. Люблю.

Жандар. Запомні гэта. І будзеш маёю? Стой прама, не дрыжы! Ведай, што ад мяне не ўцячэш! О, я не такі, каб цябе выпусціць з рук! Калі мне шчасце ўсміхнулася праз столькі гадоў, то цяпер я ўжо не выпушчу яго! Зубамі ў яго ўвап'юся, а не выпушчу. Гавары, будзеш маёю?

Ганна. Богам малю, Міхайле! Не гавары такога! Я замужняя жанчына! Я прысягала на вернасць. Грэх мне такое слухаць, грэх нават падумаць пра такое!

Жандар. А не грэх было даць мне слова, а пасля пайсці за другога? Не грэх украсці маё шчасце?

Ганна. І маё ўкрадзена, родны мой! І маё сэрца разбіта, і мяне з нялюбым сасваталі! З цельпуком гэтым, з якім ні ў прыпрэжку, ні ў гуж, з якога людзі смяюцца — хіба толькі той, хто не хоча, над ім не пацяшаецца! А яшчэ ты дабіць мяне хочаш!

Жандар. Кінь! Глупства мелеш! Калі гэта праўда, што кажаш, то будзь маёю! На злосць тым, што нас разлучылі!

Насупор тым, што ўкралі наша шчасце. Мы яго адкрадзём, наша шчасце!

Ганна. Бог нас пакарае, Бог!

Жандар. Не вер таму! Богу наша мука не патрэбная. А ўсміхнуўся нам лёс, то і пажывём свабодна і пакаштуем шчасця.

Ганна. Ці доўга яно патрывае?

Жандар. Шчасце ніколі доўга не трывае. Шчасце ўсяго — дзень, гадзіна, адна хвіліна.

Ганна. А пасля?

Жандар. Пасля? А ліха з ім, што пасля будзе! Дагэтуль бедавалі ды мучыліся, і пасля тое самае будзе. Потым бог бацька! Хіба табе страшна?

Ганна *(не зводзячы з яго вачэй, ледзь чутна)*. Не, не страшна.

Жандар. Дык хочаш быць шчаслівою?

Ганна *(гэтаксама)*. Хачу.

Жандар. Дык будзеш маёю?

Ганна *(гэтаксама)*. Буду.

Жандар. Запомні гэта! Лаўлю цябе на слове. А калі і цяпер мяне падманеш, то наракай на сябе! Ой, як я папомшчуся і табе і яму!

Ганна *(гэтаксама)*. Не, не абману.

Жандар. Ну, прачынайся! Што гэта ты нібы праз сон гаворыш? *(Трасе яе за плечы.)* Вунь яны ідуць. Плач, ламай рукі, каб яны ні пра што не здагадаліся. Прасі мяне, каб я яго памілаваў. А як адправяць яго ў горад, то я да цябе наведаюся.

Ганна з заламанымі рукамі стаіць моўчкі каля печы.

З'ява шостая

Тыя самыя і Мікола ў наручніках, войт і сяляне.

Жандар. Ну, што, войт, знайшлі што-небудзь падазронае?

Войт. Нічагуткі, пане жандар. Толькі ў санях на застаўках двух білак няма, а трэцяе трохі крывёю завэдзгана.

Жандар. Ага, гэта таксама важна. *(Запісвае ў кніжку.)* Ну, а цяпер вядзіце яго. І гэтыя рэчы забярыце. Білка з заставак дасталі?

Прысяжны. Я дастаў, вось яно.

Жандар. Добра. Вазьміце загарніце, каб кроў не сцерлася. А вы, войт, фурманку для нас знайдзіце. Па снезе цяжка будзе арыштанта ажно ў горад пяшком гнаць. А можа, у яго хаўруснікі ёсць, то каб дзе ў лесе не напалі ды не адбілі.

Мікола. Госпадзі! Што гэта са мною робіцца? За што на мяне такая кара звалілася?

Войт *(чухае галаву)*. Фурманку, пане жандар, цяжка будзе цяпер выстарацца. У каго ёсць коні, то ўсе на заробкі пацягнуліся: хто метры ставіць, хто лес траляваць. Вось хіба яго, Міколавы, коні ўзяць і ў яго сані запрэгчы.

Жандар. А што ж, і гэта можна.

Войт. То, можа, хто-небудзь з вамі прысядзе: будзе коні паганяць, а потым назад прыедзе.

Жандар. Вельмі добра. Мне яшчэ і так, мабыць, давядзецца сюды вярнуцца, хаўруснікаў шукаць.

Войт. То яшчэ і лепш. Ану, кум Бабіч, ідзіце запрагайце!

Бабіч выходзіць.

Мікола *(які дагэтуль сядзеў на ўслоне і выціраў рукамі слёзы)*. Ганна!

Ганна *(быццам аслупянелая)*. Чаго табе, Мікола?

Мікола. У цябе чыстая душа, нявінная... Маліся Богу, каб хутка і мая нявіннасць выявілася.

Ганна. Чыстая душа... А хіба ж твая менш чыстая?

Мікола. І гаспадарку пільнуй! Няшмат у нас таго набытку, то каб і тое не прапала. А на адвакатаў не трацься, каб мяне баранілі. Маю ў Бога надзею, што і без іх мяне Ойча Міласэрны з таго няшчасця выбавіць.

Ганна. Ну, калі так кажаш...

Мікола. Так, так, так, не рабі таго! Спадзявайся на Бога. Але толькі... *(Дрыжыць, яго твар крывіцца ад плачу, рукі сутаргава абдымаюць яе.)* Ганна! Ганначка мая! Толькі ты... не забудзь мяне! *(Выцірае вочы.)*

Ганна. Вось табе і анёлы божыя над хатаю праляцелі!

Заслона

ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

Месца перад карчмою. З правага боку — вясковая вуліца, з левага — высокі плот, у глыбіні сцэны — карчма з шырока расчыненымі дзвярыма. Пад карчмою лавы, каля плота — тоўстыя калоды, на якіх можна сядзець.

З'ява першая

Тры дзяўчыны выходзяць з карчмы, па-нядзельнаму апранутыя.

Першая дзяўчына. Жывей, дзяўчаткі, жывей бяжым клікаць хлопцаў.

Другая дзяўчына. Дык што? Што казаў Шлёма?

Першая дзяўчына. Будзе музыка. Бяжыце!

Трэцяя дзяўчына. А войт дазволіў?

Першая дзяўчына. Ды, відаць, дазволіў, калі Шлёма кажа.

З'ява другая

Войт і дзяўчаты.

Войт *(ідзе вуліцаю і заварочвае да карчмы, пачуўшы іх словы)*. Ага, вы ўжо пра музыку! Не дазволіў войт, не дазволіў і не дазволіць, як бы вы ні прасілі!

Трэцяя дзяўчына. Ну што, бачыш? А ці не казала я?

Другая дзяўчына. Як гэта, то і на запусты музыкі не будзе?

Войт. Не будзе, не будзе!

Першая дзяўчына. Не слухайце, дзяўчаткі! Бяжым хутчэй! Калі Шлёма сказаў, што будзе, то напэўна будзе!

Бяруцца за рукі і, смеючыся, выбягаюць.

Войт. Ах вы, сарокі траскучыя! Дык гэта для вас Шлёмава слова важней, чым маё? Пачакайце ж! *(Пагражае ім кавенькаю, потым, паправіўшы кажух, ідзе ў карчму.)*

З'ява трэцяя

Насця і яшчэ дзве жанчыны выходзяць з карчмы.

Насця. Ды куды вы, суседкі?

Першая жанчына. Ды хіба дадому.

Насця. Пастойце ж, маеце час. Там у вас, дзякаваць Богу, дзеці не плачуць. Сядайма вось тут на калодзе. Глянь-це, як сонейка прыгравае. Яшчэ толькі запусты, ■ тут ужо нібы вясна ў разгары.

Другая жанчына. А што, і прысядзем, няма куды нам спяшацца. Бачу, што музыка будзе, то пагледзімо, як маладыя гуляюць.

Сядаюць.

Першая жанчына. То, кажаш, Насця, што з Міколам кепска?

Насця. Хай Бог нас ратуе, кумачка! Кажуць, што яго вешаць будуць.

Абедзве жанчыны. Госпадзі! *(Хрысцяцца.)*

Першая жанчына. І хто б падумаў, што ён душагуб! Такі ціхі ды смірны...

Другая жанчына. Ой, кумачка, у ціхім балоце чэрці водзяцца! Ды і тое: мужчына ёсць мужчына, а нячысцік, каб яму кепска было, усялякага спакусіць.

Першая жанчына. Кажуць, што там вялікія грошы ў Абрамкі забралі. Не ведаеце, ці знайшлі іх?

Насця. Дзе там, ані следу! Мікола маўчыць, як сцяна, не хоча хаўруснікаў выдаць.

Першая жанчына. Во дурны! Нібы яму тое паможа, як ён будзе гніць, а тыя спажываць.

Другая жанчына. Гэ, то ў іх ужо такі зладзейскі закон, што адзін другога не пасмее выдаць, каб нават і сам гінуў.

Першая жанчына. Гэта каменныя душы. Божачка! І дзе такія людзі родзяцца, і матчына малако смокчуць, і па зямлі ходзяць, і песні спяваюць.

Другая жанчына. Не, кума, песень яны не спяваюць. Ніколі не спяваюць. Хіба ты чула калі, каб Мікола спяваў?

Першая жанчына. А і daпраўды! З таго часу, як яго знаю, то песні ад яго я ніколі не чула! Ото дзіва!

Другая жанчына. Ну, а што з яго жонкай? Вось яшчэ бедная! Такая маладая, такая красуня і з такога роду добрага! Пра яе ж бацьку слава па ўсіх вёсках ішла. Першы багацей быў на ўвесь павет і прадстаўнік грамадскі. А цяпер вось да чаго дайшло!

Насця. Ой, кумачкі! Не ведаеце вы, што гэта за жанчына!

Першая жанчына. Ну, якая? Скажы!

Насця *(паніжае голас, з націскам)*. Апошняя!

Абедзве жанчыны *(б'юць аб падолы рукамі)*. Што вы кажаце?

Насця. Што чуеце. Мы ж блізкія суседзі. То я і не падглядаю, але ўсё добра бачу, што ў яе робіцца.

Абедзве жанчыны. Ну, ды што, што? Расказвай!

Насця. Ды што вам расказваць? Брыдка расказваць. Знаеце, з кім скруцілася? З жандарам. З тым самым, што яе мужыка арыштаваў!

Жанчыны. Божа! Госпадзі!

Насця. Яна даўно з ім любілася, яшчэ дзеўкаю быўшы. Ён з той вёскі, што і яна. А яе сілаю выдалі браты за Міколу.

Жанчыны. Ну, гэта мы ведаем. Але з жандарам!..

Насця. Ён у яе на тыдні па дзве ночы начуе. Шарай гадзінай прыходзіць, на досвітку адыходзіць. Ён, бачыце, быццам за Міколавымі хаўруснікамі сочыць. Майму чалавеку сам так казаў, а як жа!

Жанчыны. Божа! Госпадзі!

З'ява чацвёртая

Ганна, жанчыны і Насця.

Падчас тае размовы сцэна пастуопова запаўняецца хлопцамі і дзяўчатамі. Яны стаяць групамі, гавораць, смяюцца. Сталыя жанчыны і мужчыны адны праходзяць вуліцаю, другія заходзяць у карчму або выходзяць з яе.

Ганна *(уваходзіць, адзетая па-святочнаму, баязліва азіраецца і набліжаецца да жанчын)*. Слава Ісусу Хрысту!

Першая жанчына *(холадна)*. Навекі слава!

Ганна. А не было тут?.. *(Змайкае і азіраецца.)*

Другая жанчына. Вы свайго мужа шукаеце? Не, не было яго тут.

Ганна *(паварочваецца да яе, спалохана)*. Мужа? Не, не, я не мужа.

Насця *(са здзеклівым дакорам)*. А мы тут якраз яго ўспаміналі, кума Ганна, чуеце? Кажуць, што ён надта хворы.

Ганна *(быццам непрытомная)*. Хворы? Я не чула. А што ў яго такое?

Насця *(гэтаксама)*. Ды вешаць яго павінны.

Ганна *(схамянулася, а потым, бачачы, што Насця кпіць з яе, адказвае таксама здзекліва)*. Вешаць? Га, гэта такая хвароба, што я ад яе яго не вылечу. Як правініўся, так няхай і адказвае.

Насця *(адварочваецца ад яе да першай жанчыны)*. А ведаеце, там адзін чалавек з Няпытава сядзеў з ім у адной камеры, а цяпер выйшаў. То расказваў майму мужыку. «Пераказваў, кажа, з вашай вёскі Задарожны: папрасіце там маю Ганну, каб мяне хоць раз адведала, няхай мне які крэйцар перадасць, чыстую кашулю прынясе. Дый няхай мне адваката нойме».

Ганна адыходзіць на вуліцу і знікае.

З'ява пятая

Тыя самыя без Ганны. Хлопцаў і дзяўчат становіцца больш. Гамана.

Першая жанчына. Нягодніца!

Другая жанчына. Пустадомак!

Насця. Няма ў яе сэрца! І адразу гэта было відаць. Калі яго забіралі, то каб хоць вам слова сказала, хоць слязу пусціла, як гэта чэснай жонцы палагаецца! Дзе там!

Першая жанчына. Цікава, а каго гэта яна тут шукала?

Насця. Ды ясна, каго, яго! Свайго жандара.

Першая жанчына. Вой, а хіба ён тут?

Насця. Сёння я бачыла яго ў царкве. Відаць, што тут.

Другая жанчына. Дый мне выдае, што я яго бачыла, як ішоў да войта.

Насця. Яна, пэўна, чакала яго ў хаце, але, не могучы дачакацца, пайшла па вёсцы шукаць.

Другая жанчына. Ну, таго быць не можа! Гэта трэба ўвесь сорам згубіць...

Насця. А вы думаеце, што не згубіла? Пабачыце, яна тут яшчэ з ім і танцаваць будзе.

Жанчыны. Цьфу! Прападзі ты пропадам!

З'ява шостая

Тыя самыя, музыкі, потым войт.

Галасы сярод моладзі. Музыкі ідуць! Музыканты! Вызваляйце месца для музыкаў!

Некалькі хлопцаў выносяць высокую лаву з карчомных сеняў і ставяць знадворку, пад сцяною.

Вось так! Тут будзе добра!

Музыкі — трое сялян, адзін са скрыпкаю, другі з басэтляй, трэці з тамбурынам,— кланяюцца ва ўсе бакі, потым узлазяць на лаву, на якой для іх пастаўлены табурэткі. Яны сядаюць і пацягваюць смыкамі па інструментах, настройваюць іх. Гамана навокал, смех, жарты. Сцэна запаўняецца.

Войт *(выходзіць з карчмы, грозна)*. А гэта яшчэ што такое? *(Убачыўшы музыкаў.)* А вы што тут робіце? Хто вам дазволіў?

Музыкі *(устаюць, знімаюць шапкі, скрыпач гаворыць)*. Пане начальнік, нас папрасілі. Мы зарабіць прыйшлі. Не наша дзела пытацца дазволу. Нас паклікалі, казалі, што можна.

Войт. Хто вас паклікаў?

Скрыпач. Ды хлопцы, ды хто ж яшчэ? Вунь Андруха, ды Алекса, ды Сцяпан.

Натоўп сціхае. Трое хлопцаў выходзяць наперад і кланяюцца войту.

Войт. А вам чаго трэба?

Першы хлопец *(кланяецца).* То мы прасілі б, пане начальнік, каб дазволілі крыху патанцаваць. Сёння запусты, то ўжо апошні раз.

Войт *(строга).* А ты чый будзеш?

Хлопец. Ды Васіля Папярэчнага Алекса.

Войт. А ты быў сёння ў царкве?

Хлопец. Быў, пане начальнік.

Войт. А ці чуў, як бацюшка настаўляў?

Хлопец. Чуў, пане начальнік.

Войт. А гаварыў ён вам на музыку ды на танцы ў карчму хадзіць?

Хлопец. Ды не казаў.

Войт. Ну, а вы так слухаеце настаўленне?

Хлопец *(чухае патыліцу і ўсміхаецца).* Ды хто яго там слухае, пане начальнік! Наш бацюшка старэнькі, хіба ён ведае, што маладым патрэбна? Гэта ўжо як вы дазволіце... Гэта ад вас залежыць, а не ад бацюшкі.

Іншыя хлопцы. Так, так! Мы ўжо пана начальніка просім дазволіць нам.

Войт. Не дазваляю! Няможна.

З'ява сёмая

Тыя самыя і Шлёма.

Шлёма *(выбягае з карчмы з пляшкаю і чаркаю).* Як гэта няможна? Чаму няможна? *(Да хлопцаў.)* Не, не, не бойцеся, пан начальнік жартуюць. То чаму б не было можна? *(Налівае чарку.)* Ну, пане начальнік, дай вам Божа здароўя!

Войт. Не, Шлёма, раз табе сказана, што няможна, значыць, няможна. А выпіць вып'ю, бо нешта мне ў жываце млосна *(п'е)*, і заплачу табе, але ні танцаў, ні музыкі не будзе!

Шлёма. Але ж, пане начальнік, вы не маеце права мне забараняць. Гэта мой заробак. У мяне ёсць патэнт.

Войт. Патэнт? Які патэнт?

Шлёма. Як гэта які? Царскі патэнт. З пячаткаю! Вось глядзіце! *(Выцягвае з-за пазухі паперу, складзеную ўдзесяцера, і падае яе войту.)*

Войт *(няўмела расхінае паперу, глядзіць на яе з розных бакоў, відаць, не ўмее чытаць, а потым аддае жыду).* То калі так, калі маеш патэнт, то іншая рэч. То ўжо не мая ўласць.

Шлёма. А бачыце? А ці не казаў я, што танцы будуць? Ану, хлопцы, чаго стаіце? Выбірайце дзяўчат! Гляньце, як яны тым часам на танцы настроіліся! А вы, музыкі, вып'еце?

Музыкі. Го, ды нам так і належыць.

Скрыпач. Сам Бог вялеў.

Шлёма *(частуе іх).* Ну, піце ж, піце ж і добра іграйце!

Музыкі. Гэта ўжо наша дзела.

Войт. А глядзіце ж мне, каб усё ў парадку было, каб без абразы божае.

Шлёма. Чуеце, што пан начальнік кажа? Каб без абразоў божых!

Войт. А як толькі сонца зойдзе, тут жа мне перастаць і дадому разыходзіцца. Я сюды прысяжнага прышлю, каб ніхто не пасмеў...

Шлёма. Для чаго, пане начальнік? Для чаго прысяжнага турбаваць? Хіба я не ведаю, што трэба рабіць? Як настане не той час, то ўжо я сам ім скажу перастаць. Ну, ну, гуляйце! А вы, пане начальнік, хадзіце са мной, я вам нешта надта прыемнае хачу сказаць. *(Цягне яго ў карчму.)*

З'ява восьмая

Тыя самыя без войта і Шлёмы.

Натоўп расступаецца, вызваляючы месца пасярэдзіне. Сталыя мужчыны і жанчыны рассаджваюцца каля музыкаў, пад сцяною на лавах, на калодах. Дзеці ўзлазяць на плот. Хлопцы і дзяўчаты ў два рады стаяць кругам. Музыкі пачынаюць іграць.

Першы хлопец. Гэй, і пагуляем жа сёння! Няхай ліха трэсне! Ану, музыкі, каламыйку! Ды такую ўрэжце, каб аж ногі ходырам захадзілі!

Музыкі іграюць каламыйку, некалькі пар танцуе. Праз нейкі час музыкі сціхаюць, танцоры спыняюцца.

Што такое? Чаго вы змоўклі?

Скрыпач паказвае смыком на вуліцу.

Галасы. Жандар! Жандар! Той, што Міколу пасадзіў!

Усе сціхаюць, на тварах відаць неспакой, нават страх.

З'ява дзевятая

Тыя самыя, жандар і Ганна.

Жандар *(цягне Ганну за руку)*. Ды хадзі ж ты, хадзі! Чаго так упарцішся?

Ганна. Пабойся Бога, Міхайле! Пусці мяне! Вунь людзі глядзяць.

Жандар. Ну, то што што глядзяць? Каму цікава, хай глядзіць. А мне што да таго? Я з іх узірання не буду ні сыты, ні галодны.

Ганна. Але ж сорамна. Твар гарыць. Шэпчуць, пальцамі паказваюць.

Жандар *(сурова глядзіць на яе)*. Ганна, я думаў, што ты разумная жанчына, а ты ўсё яшчэ дурное пляцеш. Пасля таго, што сталася, ты яшчэ можаш зважаць на людскія шэпты і позіркі! Цьфу, чыста бабская натура!

Ганна. Міхайле!..

Жандар. Ну, дык ідзеш?

Ганна. Божа, а што мне застаецца!..

Жандар. І танцаваць будзеш са мною?

Ганна *(з жахам)*. Тут? Пры ўсіх?

Жандар. Ты зноў за сваё? Ні слова больш! Будзеш ці не будзеш?

Ганна *(шэпча)*. Божа, дай жа мне сілы! *(Падае яму руку. Абое падыходзяць да натоўпу перад карчмою.)*

Жандар. Слава Ісусу!

Сяляне *(кланяюцца)*. Навекі слава!

Жандар. Я толькі што чуў тут музыку, бачыў танцы...

Першы хлопец. Ды нягож. А што, няможна нам?

Другі хлопец. Сёння ж запусты.

Трэці хлопец. Нам пан начальнік дазволіў.

Жандар. Ну, ну, ды я нічога не кажу. Танцуйце сабе. Ну, музыканты, іграйце! Хачу пачуць, што вы тут у Нязванічах вартыя. Можа, і мяне ахвота возьме з вамі пакруціцца. Дазвольце, хлопцы?

Хлопцы. То просім, просім!

Іграе музыка. Жандар, паслухаўшы трохі, бярэ Ганну за руку і ідзе з ёю ў карчму.

З'ява дзесятая

Тыя самыя без жандара і Ганны.

Першая жанчына. Глянь, і дапраўды пайшла з ім.

Другая жанчына. Відаць, адразу ёй няёмка было. Працівілася крыху.

Насця. Яшчэ не прывыкла, кумачка. Але прывыкне скора. Ён яе прывучыць.

Другая жанчына. Але і страшны які! А найгорай, калі ўсміхаецца. Як выставіць тыя белыя зубішчы, дык, здаецца, вось-вось укусіць.

Музыка, танцы. Праз хвіліну жандар і Ганна выходзяць з шынка, бяруцца за рукі і пускаюцца таксама ў танец.

З'ява адзінаццатая

Тыя самыя, жандар і Ганна танцуюць. Паступова пары танцораў расступаюцца. На ўсіх тварах абурэнне. Жандар і Ганна застаюцца адны.

Жандар *(убачыўшы гэта, спыняецца. Грозна)*. А гэта што? *(Паварочваецца кругом.)* Чаму не танцуеце?

Хлопцы *(кланяюцца, хітравата)*. Нам хопіць.

Жандар. Як гэта? Не хочаце больш?

Першы хлопец. Не. Стаміліся.

Жандар. Хлопцы, гэта вы праз мяне?

Хлопец. Можа, і так.

Жандар. Што? І вы пасмелі мне такі сорам рабіць?

Хлопец *(смялей)*. А пан смее нам такі сорам рабіць?

Ж а н д а р. Які?

Х л о п е ц. Танцаваць з такою жанчынаю.

Ж а н д а р. З якою?

Х л о п е ц. Самі лепей ведаеце, з якою. Мы з ёю не танцуем.

Ж а н д а р. Але ж я з ёю танцую. Вы не павінны такі сорам рабіць. Я царскі слуга.

Х л о п е ц. Мы ўсе царскія дзеці. А танцаваць вы нас не прымусіце.

Ж а н д а р *(мякчэй)*. А можа, і прымушу. *(Крычыць.)* Гэй, жыд! Шлёма!

З'ява дванаццатая

Тыя самыя, Ш л ё м а, пасля в о й т.

Ш л ё м а *(з лейкай у руцэ)*. Чаго вам хочацца, пан урадНік?

Ж а н д а р. Вядро гарэлкі і паўбочкі піва для ўсёй грамады, за мой кошт, разумееш? І ў адзін міг!

Х л о п е ц. Вы, пане жандар, дарэмна не фатыгуйцеся! Мы ні вашай гарэлкі, ні вашага піва піць не будзем і танцаваць з гэтай кабетаю не пойдзем. Мы ні з вас, ні з яе кароны не знімем. Што сабе хочаце, тое рабіце, але танцаваць мы з вамі не будзем. Калі пан начальнік забараняў нам танцы, то мы і разыдземся. Гэй, хлопцы, дзяўчаты, хадзем дадому!

В о й т *(выходзіць на сярэдзіну)*. Гэй, гэй! Што такое тут сталася?

Х л о п е ц *(кланяецца)*. Нічога, пане начальнік. Патанцавалі дый дадому ідзём.

В о й т. Го, ды так хутка?

Х л о п е ц. Дык жа бацюшка строга забараняў.

В о й т. Хопіць блазнаваць! Што ты мне тым тыцкаеш пад нос! Тыцкай таму, хто не разумее. Ты думаеш, што я такі дурны і не бачу, што тут робіцца?

Х л о п е ц. Ну, дык чаго ж пан начальнік пытаецца?

В о й т. Маўчы, смаркач! Хлопцы, сорам вам такое рабіць! Пан жандар сёння ваш госць, самі вы яго запрасілі — не бойцеся, я бачыў праз акно! Ну, а цяпер такую плюху яму робіце? Фу, як непрыстойна!

Хлопец. А мы што, павінны з такою разам танцаваць?

Войт. Ганна прыстойная жанчына! Што вы ад яе хочаце?

Хлопец. Мужа вешаць будуць, а яна тут разгулялася. Гэта так прыстойная жанчына робіць?

Войт. Не слухайце, дзеці мае! Гэта плёткі. Яе мужа яшчэ не судзілі, яшчэ невядома, ці вінаваты ён, а без суда нікога не вешаюць. А калі пан жандар не грэбуе весці яе ў танец, то вы не маеце права яе старанiцца. Ну, ну, не фыркайце, а радуйцеся, што вам танцы дазволены. А вы, пан жандар, даруйце маладым. Самі бачыце, яны гэта не са зла. Ану, музыканцікі, рэжце!

Музыкі іграюць; павольна, з неахвотай пачынаюцца танцы. Па нейкім часе жандар з Ганнаю зноў пускаюцца ў танец. Аднак раптоўна, на паўтакце, музыка сціхае, пары, апрача жандара і Ганны, становяцца быццам укопаныя.

З'ява трынаццатая

Тыя самыя, праз хвіліну Мікола.

Музыкі і частка танцораў бачаць Міколу яшчэ да таго, як ён з'явіўся на сцэне. Жандар і Ганна абернуты да яго спінамі.

Жандар *(тупае нагою)*. К чортавай мацеры вас! Што такое ізноў? Чаго перасталі? Гэй, музыканты! Вы хочаце...

Музыка моўчкі паказвае смыком.

(Азіраецца, убачыў Міколу.) Га, а гэта што?

Мікола *(у кажусе, аброслы барадою, з торбаю на спіне ўваходзіць і кланяецца народу)*. Слава Ісусу Хрысту!

Усе. Навекі слава!

Ганна *(убачыўшы яго, ускрыквае)*. О Божа! Прапала я! Мікола!

Мікола *(сумна ўсміхаецца)*. А што, і мая жонка тут? От добра, і вы тут, пане жандар? Ды, бачу, я вам забаву перапыніў!

Жандар. Ну, як маешся, Мікола? Што чуваць у цябе? Пусцілі цябе?

Мікола. Ды, дзякаваць Богу, пусцілі.

Жандар. Я вельмі рады. *(Падыходзіць і падае яму руку.)* А ведаеш, каму за гэта павінен дзякаваць?

Мікола. Ды адкуль мне ведаць? Хіба мне там скажуць? Прыйшлі, адамкнулі камеру, сказалі збірацца, дый усё.

Жандар. Мне павінен дзякаваць.

Мікола. Табе? А за што?

Жандар. Бо я такі знайшоў сапраўднага забойцу. Дый не аднаго, а цэлую кампанію. Не сёння-заўтра іх арыштую. Канечне, каштавала гэта мне нямала. Быў чалавек і ў такім пераплёце, што ледзьве галавой не налажыў, але ведаеш, калі я цябе арыштаваў, то так нешта мне ў сэрцы пачало балець. Усё мне здавалася, што ты невінаваты і будзеш думаць, што гэта я цябе сумысля ў бяду ўцягнуў. І я не мог спакойна спаць, пакуль не натрапіў на след забойцаў.

Мікола *(кланяецца яму)*. Хай табе Бог заплаціць за ўсё добрае, а за благое... *(Глядзіць з дакорам на Ганну.)* А за благое хай вам Бог даруе!

Жандар *(смяецца)*. Ну, благое! Многа благога я нікому не зрабіў. Мне, можа, нехта больш зрабіў, і то я нікому не ўспамінаю.

Мікола *(паспешліва)*. Я таксама не, таксама не! Барані Божа! Што там успамінаць!

Жандар. А я вось сёння тваю кабету ледзьве сілай з дому выцягнуў, каб трохі праветрылася дый людзям паказалася.

Мікола. Дзякуй, дзякуй табе, што хоць ты пра яе клапаціўся. Чуў я там, у тым пекле, чуў, як ты яе глядзеў. Дзякуй! *(Кланяецца.)* Ну, Ганна, а ты што так стаіш, нібы асуджаная? Чаму не вітаешся са мною?

Ганна. Будзе яшчэ час вітацца. Што тут, перад усімі людзьмі?

Мікола. Ды праўда, праўда. Гэта наша дзела, нашто яго перад людзьмі паказваць. Ну, дык хадзем дахаты. З Богам заставайцеся, добрыя людзі! *(Кланяецца і адыходзіць.)*

Ганна — за ім.

Жандар. Гэй, Мікола! Пастой жа!

Мікола *(аглядваецца)*. А табе чаго?

Жандар. А мяне не завеш да сябе? Сёння ж святочны дзень, трэба яго неяк замачыць. Го, го, не думай, што гэта табе так абыдзецца!

Мікола *(заклапочаны)*. Што ж, калі табе так хочацца... А, праўду кажучы, не думаў...

Жандар. Дзе ты ў сваім жыцці калі пра што думаў? Усё другія за цябе думалі. Дык чакай жа, не ўмееш ты, то я цябе пачастую. Гэй, жыд!

Шлёма *(выбягае з пустымі шклянкамі)*. Чаго вам захацелася?

Жандар. Пляшку гарэлкі, вішнёўкі, яшчэ што там маеш добрага, спакуй у кошыкі — кулём! Плачу гатоўкай.

Шлёма. Не, не, ці я ад пана ўрадніка вымагаю? А куды ўсё гэта адасласць?

Жандар. Да Міколы. І жыва!

Шлёма. Добра, добра! *(Ідзе ў карчму.)*

Жандар *(махае шапкаю)*. Ну, людзі, бывайце здаровы! *(Адыходзіць.)*

Насця *(бурчыць)*. На скрут галавы!

Музыка. Хлопцы і дзяўчаты зноў ладзяцца да танцаў.

Заслона

ДЗЕЯ ЧАЦВЁРТАЯ

Міколава хата.

З'ява першая

Ганна адна.

Ганна *(пад акном матае прадзіва на матавіла і лічыць ніткі)*. Адзінаццаць, дванаццаць, трынаццаць, чатырнаццаць, пятнаццаць. *(Спыняецца.)* Сёмы дзень ужо яго няма. Відаць, сёння прыйдзе. І баюся яго, і жыць без яго не магу. *(Матае зноў.)* Шаснаццаць, семнаццаць, васемнаццаць, дзевятнаццаць, дваццаць. *(Спыняецца, заплюшчвае вочы і задумваецца.)* Які страшны! Які грозны!

А што за сіла! Здаецца, калі б захацеў, то так бы і раздушыў мяне і таго... майго... цельпука. Позіркам адным прыгваздзіў бы. І чым страшнейшы, чым суровей гаворыць са мною, тым, відаць, я болей люблю яго. Уся дрыжу, а так і адчуваю, што тану ў ім, раблюся часцінкаю яго. І няма ў мяне тады ні сваёй волі, ні сваёй думкі, ні сілы, ні жадання, нічога. Усё мне тады абыякава, усё гатова аддаць яму, утаптаць у балота, калі ён таго захоча! Ах! *(Матае зноў.)* Дваццаць і адна, і дзве, і тры, і чатыры. *(Завязвае пасму.)* Дый ці ж не аддала я яму ўсё, усё, што можа аддаць кабета любімаму мужчыну? Нават душу сваю, гонар жаночы, сваю добрую славу. Прысягу дзеля яго парушыла. Сама сябе на людское пасмешышча аддала. Ну і што! А мне ўсё адно! Ён для мяне ўсё: і свет, і людзі, і гонар, і прысяга. *(Матае.)* Адна, дзве, тры, чатыры, пяць, шэсць...

З'ява другая

Жандар і Ганна.

Жандар *(уваходзіць)*. Дзень добры, Ганна! Ты адна?

Ганна *(выпускае з рук матавіла і верацяно)*. Ах! Гэта ты? Дзе ж гэта ты так доўга? Чаму не прыходзіў столькі часу?

Жандар. Дзе мужык?

Ганна. Ажно ў гумне, малоціць.

Жандар. Ну, што ён?

Ганна. Як гэта што?

Жандар. Не дакарае цябе, не б'е, не сварыцца?

Ганна. Ён? Ані слоўца. Нават не пытаўся, чаму я не прыходзіла яго адведваць у турму. Круціцца па хаце, капошыцца па гаспадарцы па-ранейшаму.

Жандар. Ну, а ты не пачала з ім гаворку?

Ганна. Пра што я буду з ім гаварыць? Агорк ён мне. Лепей гніў бы сабе ў астрозе.

Жандар. Ну, а як думаеш, ведае ён пра тое, што паміж намі выйшла?

Ганна. А хто яго ведае? Мне нават адным намёкам не паказаў гэтага.

Жандар. Ну, але, можа, суседзі нагаварылі яму?

Ганна. Можа быць. Ды што мне да таго? Я цяпер спакойная, нічога не баюся, ні пра што не думаю, нічога не ведаю, толькі цябе аднаго. *(Набліжаецца да яго, баязліва.)* Міхайле, можна цябе абняць?

Жандар абнімае яе.

І пацалаваць?

Цалуюцца.

Ведаеш, раней я, здавалася, лепей бы памерла з сораму, калі б толькі падумала, што, замужняя баба, магу так цалаваць другога. А цяпер! *(Цалуе яго без памяці.)* Любы мой! Цяпер у мяне ані крыху ніякай трывогі, ніякага сораму няма!

Мікола прачыняе дзверы, але, убачыўшы, як Міхайла з Ганнаю цалуюцца, адступае назад і бясшумна прычыняе дзверы.

Жандар *(шэптам)*. Ён быў.

Ганна. Няхай сабе! Я яго не баюся.

Жандар. Ну, я таксама не з пужлівага роду. Але цяпер я не хачу з ім бачыцца. Я толькі на хвіліну забег. Павінен яшчэ заглянуць да войта, аддаць яму ліст, а потым прыйду да вас на колькі гадзін. Бывай! *(Забірае карабін і адыходзіць.)*

Ганна. Прыходзь толькі! Буду чакаць надвячоркам! *(Бярэцца зноў матаць.)* Так, ён бачыў нас. Ну і што з таго? Калі дасюль вочы не павылазілі, то павінен быў бачыць. Не цяпер, то ў чацвер убачыў бы. Я хавацца ад яго не думаю. Няхай робіць са мною, што хоча! *(Лічыць паволі ніткі, завязвае пасму.)*

З'ява трэцяя

Мікола і Ганна.

Мікола *(уваходзіць з цэпам у руцэ)*. Ты адна, Ганна?

Ганна. Адна.

Мікола. А той... жандар... пайшоў ужо?

Ганна. Пайшоў да войта, але праз гадзіну, казаў, прыйдзе. А што, ты хацеў з ім пра нешта пагаварыць?

Мікола. Я?.. Ну, не... Хіба так... пару слоў... Але не! Што мне з ім гаварыць? Вось, бачыш, гужык на цэпе парваўся, то я прыйшоў звязаць. Можа, у цябе ёсць які матуз?

Ганна. Няма. От табе прадзіва, спляці сабе.

Мікола. Ды нібы ўжо сапраўды сплесці. *(Бярэ прадзіва, убівае ў стол шыла, робіць з прадзіва касмылі, сліміць іх і пачынае плесці.)*

Ганна матае далей, лічачы ніткі. Мікола праз хвіліну.

Ганна!

Ганна. Чаго табе?

Мікола. Дык гэты жандар, гэты Міхайла Гурман...

Ганна. Ну, што табе ад яго трэба?

Мікола. Я ведаю, што ты дзеўкаю любіла яго... і цяпер любіш.

Ганна *(перастае матаць і глядзіць на яго)*. Ну, і што з таго?

Мікола *(панурыўшы галаву)*. Ды нічога. Хіба я штонебудзь кажу? *(Хвіліну маўчыць, а потым пачынае плакаць і хіліць галаву на стол.)*

Ганна. Дык чаго ж ты плачаш? Чаго рвеш маё сэрца?

Мікола. Бо... бо... маё рвецца. *(Устае і падыходзіць хутка да яе.)* Ганна! Няўжо ж ты мяне так... так ані крыху не любіш?

Ганна. Не.

Мікола. І ніколі не любіла?

Ганна. Не.

Мікола. І не можаш прымусіць сябе, каб хоць жыць са мною па-ранейшаму?

Ганна. Не. *(Апускае галаву.)* Мінулася ўжо.

Мікола *(адварочваецца)*. Ох, відаць, Божая воля такая ўжо. Госпадзі, нашто ты вызваліў мяне з астрога? Чаму ты не даў мне там згніць? Я думаў, што няма горшай мукі за няволю. А як прыйшлі і сказалі мне: «Мікола, ты вольны, бачым тваю невіноўнасць»,— Госпадзі, мне сэрца ледзь не выскачыла з грудзей ад радасці. Я крылаў у Бога прасіў,

каб дадому хутчэй даляцець, а тут застаў такое... такое, што і язык не паварочваецца сказаць! Такое, што няволя і астрог супраць таго здаюцца мне раем! *(Рыдае.)* І за якую гэта правіну мяне Бог так цяжка карае? Чым я яго абразіў, чым прагнявіў?

Ганна. Замаўчы, Мікола, не плач! І на мяне віны не зварочвай. Ты ж знаеш добра, што і маёй віны тут мала. Сілаю аддалі мяне за цябе. Пакуль сіла ў мяне была, я была табе вернаю, хоць другога любіла. Але цяпер не стала маёй сілы.

Мікола. Дык што ж нам рабіць? Як жыць?

Ганна. Рабі, што знаеш, што табе сумленне падказвае. Забі мяне, ці прагані мяне, ці пакінь мяне пры сабе — мне ўсё адно.

Мікола. Слухай, Ганна! Я цябе разумею. Я люблю цябе. Мне шкада цябе, як сваёй душы. Я не хачу быць тваім катам, бо ведаю, што ты і без мяне нямала выцерпела. Толькі пра адно цябе прашу: зважай на людзей! Не на мяне — няхай ужо я так і буду нічым для цябе,— але на людзей. Каб людзі з нас не смяяліся.

Ганна. Хіба ж я ім забараню зубаскаліць? Няхай смяюцца, калі ім смешна.

Мікола. А ўсё ж такі... Не паказвайся прылюдна... з ім. Не плюй на маю сівую галаву. А не, то забі мяне, каб я не бачыў таго!

Ганна. Гэта не ад мяне залежыць, Мікола. Я цяпер аднаго мужчыну ведаю — яго, так, як дагэтуль ведала цябе. Што ён мне скажа, тое і зраблю, а больш ні на што не гляджу. Ганьба, то ганьба; смерць, то смерць. З ім мне нічога не страшна. А ты рабі што хочаш.

Мікола *(хапаецца рукамі за галаву)*. Госпадзі, Божа мой, яна зусім звар'яцела. Гаворыць як у гарачцы. Гэта ён, пракляты, зачараваў яе, даў нейкага зелля, ён яе з глузду звёў, каб пасмяяцца з мяне! *(Ходзіць па хаце з выразам цяжкага болю.)*

Ганна матае зноў.

З'ява чацвёртая

Тыя самыя і ж а н д а р.

Ж а н д а р *(уваходзіць)*. Пахвалёны ў хату! Здароў быў, Мікола!

М і к о л а *(пахмура)*. Здароў быў, Міхайла!

Ж а н д а р *(пляскае яго далонню па плячы)*. Го, хоць раз ты звярнуўся да мяне, як да старога знаёмага.

М і к о л а. Лепш бы нам ніколі не знацца.

Ж а н д а р. Чаму? Цьфу, Мікола, як ты набычыўся! Усё роўна як я твайго бацьку забіў.

М і к о л а. Ты мне яшчэ горш зрабіў.

Ж а н д а р. Эт, кінь, не плявузгай лішняга! Вось лепей садзіся сюды! *(Садзіць яго сілком у канцы стала, кладзе карабін і шапку на другім канцы стала, а потым дастае з сумкі пляшку гарэлкі.)* Глядзі, з гэтаю чараўніцаю мы параімся, як на свеце жыць. Ганна, ану знайдзі нам нейкі напарстак!

Ганна ўстае і ставіць на стол чаркі, хлеб і сыр.

М і к о л а. Дзякую, але я не п'ю.

Ж а н д а р. Як гэта не п'еш? Што гэта ты выдумляеш, Мікола? Тыдзень таму назад піў, а цяпер не п'еш! Ну, гэта ты дурное выдумаў! *(Налівае.)* За тваё здароўе, Мікола! *(П'е.)* А! Бачыш, я сам п'ю. *(Налівае.)* На, выпі! І не журыся! Пляснi ліхам аб зямлю! Каб у нашым доме не журыліся!

М і к о л а *(бярэ чарку)*. Га, бачу, з табою няма іншае рады. Каб ты здох, Міхайла! *(П'е.)*

Ж а н д а р *(смяецца)*. Ха, ха, ха! Жартаўнік ты, Мікола, дальбог, жартаўнік! *(Пляскае яго па плячах.)*

М і к о л а. Што ж, Міхайла, хто на што здатны!

Ж а н д а р. Дык ты думаеш, што мне варта здохнуць?

М і к о л а. Думаю, што гэта было б лепей і для мяне, і для цябе, і для гэтай *(паказвае на Ганну)*.

Ж а н д а р. І для гэтай! А, мы забыліся пра гаспадыню! *(Налівае.)* Ну, Ганна, выпі за здароўе свайго мужа!

Г а н н а. За тваё здароўе, Міхайле! *(П'е.)*

Жандар. Ха, ха, ха! Бачыш, Мікола, твая жонка мне трохі іншага зычыць, чым ты! Ну, вып'ем жа цяпер за яе здароўе!

П'юць.

Мікола. Але ж і моцная твая вішнёўка, Міхайла. Ад дзвюх чарак ужо і ў галаву стукнула.

Жандар. Не прыслухоўвайся, дзіця маё! Гэта толькі таму, што твая галава слабая, вось што! Да моцнай галавы яна і па дзесятай чарцы не прыстане.

Мікола *(падпірае галаву локцем)*. Слабая галава, кажаш. Праўду кажаш! І без тваёй вішнёўкі яна ў мяне ходырам хадзіла, а цяпер яшчэ горш. Ведаеш, Міхайла, што я табе скажу, так, па дружбе, як старому знаёмаму?

Жандар. Ну, што?

Мікола. Можа б, ты перастаў у мяне бываць?

Жандар. А гэта чаму, Мікола? Абрыдлі табе мае адведзіны?

Мікола. Абрыдлі не абрыдлі, а так. Мне выдае, што яно лепей было б, калі б ты не паказваўся.

Жандар. Не магу, братачка, дальбог, не магу. Служба мая такая, што ўсё паўз вашу хату мая дарога ідзе. А прытым, мой галубок, яшчэ адна рэч падкруцілася.

Мікола. Якая?

Жандар. Хоць гэта нібыта дзяржаўная тайна, але што ўжо рабіць, скажу табе. Але наперад давай вып'ем! Хай мінецца ўсё ліхое! *(Налівае, п'юць.)* Дык вось якая справа, братачка. Цябе быццам выпусцілі з астрога...

Мікола *(устрывожана)*. Быццам?.. Як гэта быццам?

Жандар. Ну, ну, ты цяпер так прымаеш да сэрца, усё роўна як і напраўду адчуваеш сябе вінаватым! Э, Мікола! Ты ж сам адчуваеш сябе невінаватым, праўда? *(Падкрэслена.)* Уласнае сумленне кажа табе, што ты невінаваты? Праўда? *(Глядзіць яму проста ў вочы.)*

Мікола *(сумеўшыся, крыкліва)*. Богам прысягаю, што праўда!

Жандар *(насмешліва)*. Ну, ну, Мікола! Не гавары так! Асабліва перад жандарам такімі словамі не кідайся. Бо мы, жандары, так сабе думаем, што калі на каго падазрэнне

íадзе, а ён пачынае Бога ў сведкі клікаць, то, значыцца, у го сумленне не зусім чыстае. Нешта там у яго нядобра.

Мікола *(спалохана)*. Дык... значыць... ты думаеш, іто я?..

Жандар *(смяецца і пляскае яго па плячах)*. Ха, ха, ха! ;зіця ты, Мікола, вось што я думаю! Абы-чым цябе застраыць можна. Не бойся! Не такі чорт страшны, як яго малюоць. Тое, што табе цяпер здаецца такім страшным, таксама е такое ўжо і страшнае. Да ўсяго чалавек прывыкне!

Мікола. Гэта ты на што намякаеш? Неяк я не зусім разумею цябе.

Жандар. Зразумееш, братачка, зразумееш, як на тое ıас прыйдзе. А цяпер ведаеш, што я табе параіў бы?

Мікола. Ну, што?

Жандар. Трымай сябе спакойна. Не паднімай ніякага твалту. Жыві сабе ціха, смірна, як Бог на душу пакладзе, і ні на што не зважай, што навокала цябе чыніцца.

Мікола. Ні на што не зважаць? А ты думаеш, што так можна?

Жандар. А чаму б і не? Пэўна, што можна. Павер мне, дружа! Я шмат па свеце пахадзіў, многа чаго бачыў і ведаю. Дык вось што я табе скажу: тысячы людзей жывуць так, як ты, і не пытаюцца нават, як яно склалася, адкуль пайшло, хто каму вінен. Дзе б чалавек мазгоў узяў, каб ва ўсім гэтым разабрацца? Сталася, склалася — што параіш? Трэба прымаць жыццё такім, якім яно ёсць, трэба жыць, як жывецца.

Мікола. І з разбітым сэрцам?

Жандар. Што там сэрца? У каго яно цэлае?

Мікола. І на людскім пасмешышчы?

Жандар. Наплюй ты на людзей! Што табе ад іх трэба? А калі ты з іх будзеш смяяцца, то яны перастануць з цябе хіханькі строіць. Яшчэ самі да цябе прыйдуць пакланіцца.

Мікола *(задумаўшыся)*. Што ж, разумная парада. Толькі, мабыць, замудрая на маю слабую галаву. *(Хапаецца рукамі за галаву і пачынае рыдаць.)* Ой, замудрая, замудрая! Не вытрымае мая галованька!

Жандар. Не бойся, вытрымае. Я табе памагу. Я кожнаму галаву скручу, хто пасмее з цябе смяяцца.

Мікола. Многа будзе скручаных галоў.

Жандар. Не бойся, гэта ўжо маё дзела. А цяпер, дружа мой Мікола, ведаеш што?

Мікола. А што такое?

Жандар. Я бачу, што ты дужа знясілеў. Цябе ў сон хіліць. Ідзі сабе ў гумно і засні.

Мікола. А ты?

Жандар. Пра мяне не турбуйся. Я таксама трохі адпачну, а потым пайду дадому.

Мікола. То, можа б, ты, Міхайла, сам пайшоў у гумно і там заснуў?

Жандар. Ну, ну, не строй камедыі! На табе кажух *(бярэ з жэрдкі кажух і накідвае яму на плечы)*, падушку і пасцілку. *(Сцягвае з ложка падушку і пасцілку і таксама кладзе на яго.)* Ідзі! *(Выпіхвае яго за дзверы.)*

Маўчанне. За сцэнаю чуваць цяжкія ўздыхі і павольныя крокі Міколы.

З'ява пятая

Жандар і Ганна.

Жандар *(абдымае Ганну)*. Ну, цяпер мы адны.

Ганна. Пастой! Я баюся, каб ён там з сабою што-небудзь не зрабіў.

Жандар. Не бойся! Ён цяпер надта знясілеў, раскіс! Закапаецца ў салому і засне.

Ганна *(прыпадае да яго)*. Міхайле, Міхайле! Што будзе з намі? Да чаго яно дойдзе? Чым яно скончыцца?

Жандар. Дурная! Вось яна пра што думае! Быццам нехта ў свеце ведае, чым што скончыцца і да чаго яно дойдзе? Жыві і дыхай, пакуль жывеш! Дрэнна табе? А калі не дрэнна, то дзякуй Богу. Як будзе дрэнна, то тады хопіць часу падумаць пра тое кепскае! Чым скончыцца! Нічым не скончыцца. Будзем жыць, пакуль можна. Будзем любіцца, пакуль можна. Будзем людзям у вочы смяяцца, пакуль

можна, пакуль яны нас пад ногі не падтопчуць. А пасля? Пасля адзін канец: усе памрэм і чорту ў зубы трапім. Вось чым яно скончыцца, калі хочаш ведаць. *(Абдымае яе.)*

З а с л о н а

ДЗЕЯ ПЯТАЯ

Міколава хата. Дзень. Стол адсунуты, за сталом і на лаўках мужчыны і жанчыны, сярод іх Бабіч і Насця. Мікола, на падпітку, з кілішкам у руцэ, пасярод хаты. На стале вялікая пляшка гарэлкі, хлеб і соль.

З'ява першая

М і к о л а, Б а б і ч, Н а с ц я, м у ж ы к і, ж а н ч ы н ы.

С я л я н е *(п'янымі галасамі спяваюць «Журайля»)*

Ой там у лісі, ой там у лісі плужочок,
Плужочок-чок-чок-чок (2), плужочок.
Ой виорав він (2) ланочок,
Ланочок-чок-чок-чок (2), ланочок,
Ой посіяв він (2) конопель,
Конопель-пель-пель-пель (2), конопель.
Та впронадився (2) журавель,
Журавель-вель-вель-вель (2), журавель.
Ой я, я тому (2) журавлю,
Журавлю-влю-влю-влю (2), журавлю
Та бучком ноги (2) поломлю,
Поломлю-млю-млю-млю (2), поломлю.

Мужчыны і жанчыны ў час спявання апошніх куплетаў пахістваюцца, дакранаюцца адно да аднаго плячыма ды ківаюць галовамі, пазіраючы на Міколу, які сядзіць з апушчанай галавою і трымае чарку ў дрыжачай руцэ. Спеў скончыўся.

М і к о л а. Ну, куме, дай Божа здароўя! *(П'е.)*

Б а б і ч. Дай Божа ўсяго добрага!

М і к о л а. Не, не кажы гэтага! Чаго добрага? Я добрага нічога ў Бога не прашу. Досыць ужо таго дабра зведаў, будзе з мяне! *(Налівае і перадае чарку Бабічу.)* Ну, проша!

Бабіч. Дзякую сардэчна! Не, кумок, не гняві Бога! Што Бог дасць, то не напасць. Не раз чалавек думае, што вунь якая на яго бяда абрынулася, але за дзень, за другі агледзіцца, аж яно ўжо яму на добрае выйшла. Ваша здароўе, суседзе! *(Паварочваецца да іншага селяніна і п'е.)*

Першы селянін. Дай Божа і вам!

Мікола. Ну, ужо вы мне гэтага не кажыце. Ужо я на ўласнай скуры выпрабаваў, якое яно дабро выходзіць. Не, людцы добрыя, верце мне ці не верце, а мне выдае, што Пан Бог часам кепікі над намі строіць!

Сяляне. Пабойцеся Бога, куме, што вы гаворыце! Гэта ж абраза Божая!

Мікола *(махае рукою)*. Адно мяне яшчэ на свеце трымае — гэтая жывіца! *(Бярэ чарку, налівае і п'е.)*

Насця *(пад акном да другой жанчыны, ківаючы галавою)*. Я-то ведала, што яно гэтым скончыцца. Крый божа, гэтая кабета ані сораму не мае, ані сэрца.

Першая жанчына. Чыстая праўда! Мой стары казаў, што будзе на вясковай радзе пра тое гаварыць, каб яе пры ўсёй грамадзе бізунамі высцебаць, няхай не падае дрэннага прыкладу.

Насця. Пэўна, што варта было б. Вось і сёння ў царкве. Пабойцеся Бога! Таксама такога яшчэ свет не бачыў: з чужым хлопцам аж да самай царквы прыйшла, а потым, як адна засталася, то каб вам да абразоў, да алтара святога тварам павярнуцца! Дзе там! Да яго павярнулася, да яго, акаянная, малітву шэпча. Жанчыны вакол яе расступіліся, круг утварылі, не раўнуючы як ад пракажонай, адхлынулі, а яна нічога, быццам бы і не бачыць. Так усю абедню і выстаяла. Ды не ўсю, бо ледзь «Дастойна» праспявалі, той жандар з царквы міргнуў ёй, дык і яна ходу за ім.

Першая жанчына. Куды ж яны павалакліся?

Насця. Мабыць, у карчму. Там у бакоўцы і цешацца сабе.

Бабіч. Куме Мікола, дык вы кажаце, што жонка вас голадам морыць?

Мікола. Хто? Я? Калі я тое казаў? Дзе?

Бабіч. Ну, я такое чуў.

Першы селянін. І я чуў. Па вёсцы чутка такая ходзіць.

Мікола *(у п'яным запале).* Брэша тая чутка! Усе брэшуць, хто яе па вёсцы распускае. Што каму да мяне і да маёй жонкі?

Насця. Ну, то пэўна, што нам дзела няма. Але ёсць нехта такі, што мае да яе дзела.

Мікола. Каму гэта абыходзіць, што мы ямо, што гатуем, ці сытыя, ці галодныя?

Бабіч. Ды вы, куме, не гневайцеся, што я ў вас спытаўся. Я ж гэта не са зла. Бо тут, бачыце, некаторыя хацелі на радзе грамадскай...

Мікола. Што, што, што? Што радзе грамадскай да маёй жонкі?! Не мае рада права!

Бабіч. Ну, калі вы самі не крыўдуеце — ваша воля. Толькі, бачыце, людзі навокал гамоняць, кажуць, што яна дужа паганы прыклад падае, выбачайце, на людзях з тым Гурманам валочыцца.

Мікола *(хапаецца за галаву).* Ой, ой, ой! Людзі добрыя! Не рэжце мяне без нажа! Не мучце мяне! Не капайцеся ў маёй душы! Хай вам мая жонка не стаіць у вачах! От, піце-ешце, калі да мяне прыйшлі, частуйцеся і гаварыце што-небудзь весялейшае. А то цьфу! Чалавеку і без вас цяжка, а вы яшчэ дабаўляеце.

Насця. Ой, кумочак, ды ці гэта мы не ведаем, што вам цяжка?

Мікола. Ой, цяжка, кумачка, цяжка! *(Налівае і п'е.)*

Насця. Кажуць, што яна з вамі цэлымі днямі не гаворыць?

Мікола. А пра што гаварыць? Яна маўчыць, і я маўчу. Так цэлы дзень, як нямкі, ходзім. А яна толькі ў акно выглядае, ці ён не ідзе. А да мяне каб хоць слоўца прамовіла.

Насця. Ой, бедны ты, кумочак, бедны! *(Налівае і п'е.)*

Мікола. Ой, бедны, кумачка, бедны! *(Налівае і п'е.)* Як той гарох пры дарозе. *(Плача.)*

Насця. Ды хіба я не ведаю, што ты не раз з голаду млееш, а яна што зварыць, то таму паганцу трымае. Куме, я ж твая блізкая суседка. Усё ведаю, усё бачу, хоць калі б і не хацела бачыць. Не раз аж маё сэрца рвецца. Дальбог, куме, рвецца. *(Плача і абдымае яго.)*

Бабіч. Ну, ну, жонка, можа, нам пара дадому?

Сяляне. Ды пара б ужо ісці.

Мікола. Людцы родныя, суседзі добрыя! Пасядзіце яшчэ крыху! Не спяшайцеся, не разыходзьцеся! Я рады, што чалавечы голас у гэтых сценах чую. Пагаманіце, пачастуйцеся. Ну, проша! О, чарка стаіць! Што такое? Пляшка парожняя? Я зараз другую прынясу. У мяне глячок ёсць, схаваны ў хляве. Што мусіць грэшны чалавек рабіць? Калі ўжо такое на маю галаву звалілася, то што ўжо чыніць? Ніякая работа мне ў рукі не ідзе, жыць ахвота адпала, гаспадарыць не хочацца. Цьфу, нашто яно мне! Прадаў я коней, грошы прыхаваў дый прапіваю пакрысе. Хай разыходзяцца! Не стане тых, зноў нешта прадам.

Бабіч. Ой, куме, куме, благое ты робіш! Занадта сабе ў галаву ўзяў тое глупства ды з-за такой нягодніцы дабро сваё мазольнае марнуеш!

Мікола. А нашто яно мне! Хіба мне жыць дадуць? Не дадуць! Усё прапала! Ужо мне гаспадаром не быць, дык няхай прападае пропадам. І поле прадам, і хату прадам, няхай прападае.

Бабіч. Гавары, гавары! Прадам, кажаш. А потым што будзе?

Мікола. Калі потым? Як потым? У мяне, куме, ужо цяпер потым. Ужо цяпер усё скончана. Далей ужо нічога не будзе. Нічагусенькі! Ды ліха з ім усім! *(Выходзіць з пляшкаю.)*

Першая жанчына. Зусім зламалі чалавека! Зусім з панталыку збілі!

Другая жанчына. Не шмат таго розуму ў бедалагі было, дый той выскачыў.

Насця. Каб мне з гэтага месца не сысці, што яна яго нейкім зеллем апаіла.

Бабіч. А найболей шкада гаспадаркі. Гараваў чалавек, увесь век рабіў, выжыльваўся, цярпеў — о Божа, колькі нацярпеўся! Нарэшце дарваўся да лусты хлеба, толькі і жыць, ды Бога хваліць, ды дзетак чакаць, а тут на табе! Быццам пажар усхапіўся, нібы гром з яснага неба!

Першая жанчына. Ой, і не кажыце, куме! Гаворыце, на дзетак спадзяваліся? У тым і ўся бяда, што ў іх дзяцей няма. Калі б у яе былі дзеці, то яна б на такое не рашылася. Я й на яе, я й за яе.

Першы селянін. А я таму не веру. Ужо як каторая баба такой удасца, то ты яе і вяроўкай да дому не прывяжаш! І дзяцей пакіне.

Першая жанчына. Не слухай таго, куме, дальбог, не слухай! Дзеці — ого! Дзеці — палова маці. Адна палова, можа, і хацела б пайсці куды-небудзь, дазволіць сабе нештачка, а другая не пускае, крычыць: «А мы, мама! А што з намі будзе?» І не пусцяць той паловы.

Мікола *(уваходзіць з пляшкаю і ставіць яе на стол)*. Вось яна! Вось наша радасць! Вось адзіная ўцеха! *(Паднімае пляшку, трасе ёю і зноў ставіць.)* Поўная, хопіць нам! Ану, кумочкі родныя, суседзі мае добрыя,— дай нам Божа здароўя! *(Налівае, п'е і пускае чарку па крузе.)*

Бабіч. Куме Мікола, гэй, куме!

Мікола. Га!

Бабіч. А я табе, куме, нешта сказаў бы, ды баюся, каб ты на мяне не загневаўся.

Мікола *(сядае каля яго, абдымае яго за шыю, плачучы)*. Кажы, кумочак, кажы! Ты ў мяне самы блізкі сусед, ты мой дарадчык. Гавары!

Бабіч. Ты, куме,— не ў гнеў табе кажучы,— занадта мяккі, занадта падатлівы.

Мікола *(ківае галавою і цяжка ўздыхае)*. Ой так, так, занадта мяккі, занадта падатлівы.

Бабіч. А яны бачаць, што ты такі, дый вяроўкі з цябе ўюць.

Мікола *(хапаецца за галаву)*. Ой, уюць, уюць! Ажно косці трашчаць! *(Плача.)*

Бабіч. Перастань, куме, цьфу! Не плач! Не будзь дзіцем!

Мікола. Не быць дзіцем? Але як гэта?

Бабіч. Ты б узяўся за сваю жонку трохі стражэй. Накрычаў бы на яе, прыгразіў бы ёй, а то б і стукнуў раз, другі. Знаеш, жонка, што кабыла, любіць бізун, а без яго яна зусім разгультайваецца.

Мікола. Ой, разгультайваецца, разгультайваецца.

Бабіч. Ну, і да таго Гурмана пастаўся як след. Што ён, закупіў цябе, ці што? Пакажы яму, што ты ў хаце гаспадар. Забарані яму бываць у сябе.

Мікола. Ой, прасіў я яго, ды дзе табе, яшчэ і насміхаецца.

Бабіч. Прасіў! Бойся Бога, куме, хто ж пра такое просіць? Пэўна, што ён такой просьбы не паслухае. А ты стражэй да яго!

Мікола. Ой, кумочак, баюся я яго! Страшны ён, усё роўна як кат які!

Бабіч. Хе, куме! Ты ж не дзіця. Чаго табе баяцца? Ён жа табе нічога не зробіць!

Мікола *(выпроствaецца)*. Твая праўда! Чаго мне яго баяцца?

Бабіч. Ты яму прыгразі, што ў суд на яго падасі за тое, што ён табе жыцця з жонкаю не дае.

Мікола. Дый то праўда! І над ім жа ёсць старшыя! У суд падам!

Бабіч. Што на ўсю вёску спакусу наганяе, сорам робіць усёй грамадзе.

Мікола. Га, дык жа за гэта цяжкая кара!

Бабіч. А ты думаў! Зараз жа яго адсюль перавядуць! А ты ўжо жонцы потым дасі нейкую раду. Каб толькі яго адсюль халера забрала.

Мікола. О, пэўна, што з ёю я неяк саўладаю. Вы ж, суседзі, ведаеце, якая яна была добрая, шчырая і верная, пакуль яго на нашы галовы ліха не прынесла! Да раны можна было прылажыць, не тое што! *(Плача.)*

Насця. Ты, куме, яго ў хату не пускай, вось што! Дзверы ў яго перад носам зачыні. Цэпам па галаве заедзь. Так бы я на тваім месцы зрабіла!

Мікола. Так, так, так! Цэпам па галаве! Мундзір на шматкі! Няхай скардзіцца на мяне! Я ўжо буду ведаць, як бараніцца!

Бабіч. Нас, куме, за сведкаў вазьмі. Мы пасведчым, як яны з табою абыходзіліся.

Сяляне. Так, так! Усе пасведчым! Яго зусім са службы прагоняць, а табе нічога не будзе!

Мікола *(схамянуўся)*. Добра! Усё зраблю, адважуся нарэшце. Што, хіба я не чалавек, не гаспадар у сваёй хаце? Ану, вып'ем жа, суседзі! Бог заплаціць вам за параду. Пабачым, чый верх будзе! *(П'е сам і частуе іх па чарзе.)*

З'ява другая

Тыя самыя.

Уваходзяць жандар і Ганна.

Жандар *(на падпітку)*. Го, го, го! А тут што! Свята нейкае, радзіны ці памінкі?

Мікола. Ды памінкі, памінкі спраўляю.

Жандар. А па кім?

Мікола. Па сабе самім. Па сваім гонары, па сваім спакоі, па сваім жыцці.

Жандар *(ідзе да стала — людзі расступаюцца перад ім, ён сядае. Ганна таксама сядае на ляжанцы)*. Ага, у цябе, бачу, ужо трохі... гэта самае... язык блытаецца!

Мікола. Як гэта блытаецца? Я не блытаю, я праўду гавару! Гэта ты, Міхайла, маё жыццё паблытаў, так што і канцоў не знайду.

Жандар. Эт, Мікола, не малоў бы ты глупства, дый яшчэ пры чужых людзях! Лепей пачастуй госця.

Мікола. Ой і пачаставаў ты мяне! Не такога ты пачастунку ад мяне варты!

Жандар *(усхопліваецца і падступае да яго)*. Што ты пляцеш? Якога пачастунку?

Мікола *(плюе яму ў твар)*. Вось якога, калі хочаш ведаць.

Жандар *(б'е яго кулаком па галаве)*. От табе за гэта!

Мікола падае на зямлю. Людзі кідаюцца да Міколы, Ганна да Міхайла.

Ганна. Міхайла, супакойся, што ты робіш?

Жандар. Я спакойны і нічога больш не раблю, але пляваць на сябе не дазволю! Не бойся, гэта яму не зашкодзіць. Невялікая свечка пад вокам, і ўсё. Працверазіцца хутчэй! А я і так хацеў яму разумнае слова сказаць.

Мікола *(з цяжкасцю ўстае, яго садзяць на лаву)*. Дык ты вось як мне плаціш за маю дабрату!

Жандар. Не за дабрату, Мікола! За дабрату толькі Бог заплаціць. А я за дурату. За тое, што ты плюеш на царскі мундзір.

М і к о л а. Я не на царскі мундзір плюю, але на таго нягодніка, што ганьбіць імя Божае. Ты яго ведаеш? Міхайла Гурман!

С я л я н е. Так, так!

Ж а н д а р *(суцішае ў сабе злосць)*. Ведаеце што, панове сведкі, я тут хачу Міколу разумнае слова сказаць. Вы тут не патрэбныя. Можа б, вы пайшлі к чорту?

М і к о л а. Не, суседзі! Сядзіце, не адыходзьце! Я вас прашу. Я вас сюды запрасіў, ён не мае права вас выганяць.

Ж а н д а р *(ускоквае і хапаецца за карабін)*. А я вам кажу, п'янюгі, вон адсюль! Хто зараз жа не выйдзе, той тут жа кулю атрымае. Вон!

М у ж ч ы н ы і ж а н ч ы н ы хутка выходзяць. Некаторыя хрысцяцца і плююць.

З'ява трэцяя

М і к о л а, ж а н д а р і Г а н н а.

М і к о л а *(падбягае да яго)*. Па якому праву ты смееш маіх гасцей [redacted] маёй хаты выганяць, га? Да цябе прыйшлі? Тваю гарэлку пілі?

Ж а н д а р *(адсоўвае яго ўбок)*. Маўчы, дурань! Слухай, што я табе буду казаць. Сядай вось тут!

Мікола неахвотна сядае.

Слухай, Мікола, што ты сабе ўздумаў?

М і к о л а. Як гэта што?

Ж а н д а р. Чаго ты сам сабе шкодзіш? Работу кінуў, гаспадарку занядбаў, коней прадаў ды ўсё толькі з п'яніцамі водзішся дый сваё дабро разбазарваеш. Ці гэта добра так, га?

М і к о л а. Лепей, чым чужую жонку ў блуд уводзіць.

Ж а н д а р. Мікола, Мікола, не павінен бы ты і ўспамінаць пра гэта.

М і к о л а. Вунь як! Не павінен і ўспамінаць пра тое, ад чаго сэрца рвецца і галава трашчыць? Дзякуй за ласку! А скажы ты мне, Міхайла, што я павінен успамінаць? Для чаго павінен старацца? На каго рабіць?

Ж а н д а р. Хаця б на сябе самога.

М і к о л а. Не бойся, пра сябе самога я клапачуся! Прадаю, раздаю, раскідаю, прапіваю тое, што мне не патрэбна,

а бяру толькі тое, што мне патрэбна. А патрэбна мне цяпер толькі адно — вось што! *(Размахвае пляшкаю.)*

Ж а н д а р. Фэ, Мікола, пасаромся!

М і к о л а. Я павінен саромецца? Ха, ха, ха! А ты саромеешся? А гэта нягодніца саромеецца, што ўсё па вёсцы з табою швэндаецца? У вас ёсць сорам?

Ж а н д а р. А што табе да нас!

М і к о л а *(узрываецца)*. Каму? Мне? А ты хто тут? Якое права ты маеш за мяне рашаць!

Ж а н д а р *(сілаю ўсаджвае яго на месца)*. Ну, ну, не гарачыся! Я табе скажу, якое я маю права. Слухай, Мікола! Ты ведаеш, хто я быў калісьці, яшчэ там, у нашай вёсцы?

М і к о л а. Як хто? Урвіс, бандзюга.

Ж а н д а р. Ілжэш, братка мой. Я быў чэсны хлопец, можа, трохі загарачы, завадны. Але крыўды я не любіў, няпраўды не мог цярпець — і ў тым было маё няшчасце.

М і к о л а. Было нешта і большае.

Ж а н д а р. Праўду кажаш. І я табе зараз скажу, што яшчэ прычынілася да майго няшчасця. Я палюбіў гэту бедалагу, Ганну, сірату, пакрыўджаную нелюдзямі братамі. Гэтая любоў была маім адзіным, самым дарагім скарбам, яна магла б зрабіць з мяне добрага, прыстойнага чалавека. А ты, Мікола, ты супольна з тымі нелюдзямі ўкраў у мяне тое адзінае шчасце.

М і к о л а *(узрываецца)*. Я? Украў у цябе... *(Хапаецца за галаву.)* Божа, што гэта са мной? Ці ўвесь свет дагары нагамі перавярнуўся? Я, утаптаны ў гразь, пазбаўлены гонару, спакою і павагі, знішчаны, зарэзаны без нажа,— я, па-твойму, яшчэ і злодзей?

Ж а н д а р. Не хапайся за галаву, Мікола! Бо тваё сумленне само табе кажа, што мая праўда.

М і к о л а. Не, брэшаш! Я яе насільна не браў. Яна яшчэ ўдзячная мне была...

Ж а н д а р. Ты і бачыш яе ўдзячнасць.

М і к о л а. Уражына, гэта ты яе звёў, адурыў, прычараваў!

Ж а н д а р. У цябе было тры гады часу прычараваць яе да сябе. Чаму не зрабіў гэтага?

М і к о л а. Бо я не вядзьмар — вось чаму!

Ж а н д а р. Бо тыануча, а не мужчына — вось чаму!

М і к о л а. Хто ануча? Я ануча?

Ж а н д а р. А ўжо ж не я.

Мікола. От жа я зараз пакажу табе, што я неануча. Вон з маёй хаты! *(Хапае яго за плечы.)*

Жандар *(адпіхвае яго)*. Ідзі спаць, Мікола! Ты выпіў.

Мікола. Выпіў ці не выпіў, не тваё дзела. Але з хаты вон вымятайся!

Жандар. А вось і не пайду! Тут і заначую, калі мне захочацца.

Мікола *(спакойна)*. Саступі, Міхайла! Не даводзь мяне да шаленства.

Жандар *(спакойна)*. І не даходзь да шаленства, нябога, гэта не здарава. А я і сапраўды ў цябе заначую. А заўтра абодва разам пойдзем у горад.

Мікола. Абодва разам? Чаго?

Жандар *(дастае паперу і паказвае)*. Паглядзі, ведаеш гэту паперу?

Мікола. Чэрці б яе ведалі, а не я!

Жандар. Гэта нядобра, Мікола! Не зашкодзіла б і табе яе ведаць. Тут і пра цябе тое-сёе напісана.

Мікола. І што там пра мяне напісана?

Жандар. Загад з суда, каб цябе даставіць. Я яшчэ сёння павінен яго войту ўручыць. Там зноў на цябе ў судзе нешта нагаварылі.

Мікола. Га, юда! Дык ты зноў з таго боку пад мяне падкопваешся? Зусім мяне даканаць хочаш? От, ужо не дажджэш! *(Вырывае ў яго з рук паперу і рве яе на кавалкі.)* На табе, на табе, на табе!

Жандар. Дурань, што ты нарабіў? Ці ведаеш хоць, што табе будзе за гэта?

Мікола. Не мне, а табе.

Жандар. Не, табе! На, атрымлівай раз! *(Б'е яго па твары.)* Гэта на задатак. На, атрымай два! *(Замахваецца.)*

Мікола *(хапае карабін)*. На табе таксама раз! *(Кідаецца на Міхайла.)*

Ганна *(кідаецца паміж іх)*. Мікола, перастань!

Мікола *(адштурхоўвае яе)*. Ты сама перастань!

Жандар. Пусці яго, Ганна! Я яго і так не баюся. *(Хапаецца за карабін, хоча вырваць у Міколы.)* Пусці, дурань! З гэтым не жартуюць!

Мікола. Вось табе мой жарт! *(Адпускае карабін, хапае сякеру і заганяе ў грудзі жандару. Той падае.)*

Ганна. Госпадзі! Божа! Што з табою, Міхайле? *(Кідаецца да яго.)*

Жандар *(схапіўся рукою за грудзі, з якіх льецца кроў).* А так! Нічога! Нічога мне не трэба.

Ганна. Кроў! Кроў! Ты паранены, Міхайле, забіты. Любенькі! Дзе рана?

Жандар. Нічога, Ганна, нічога! Гэта толькі жарт. Трохі пабаліць дый перастане. Годзе, Мікола! Чаго стаў ды дрыжыш? Дай руку!

Мікола *(кідае сякеру).* Ды... ды... няўжо яно нічога?

Жандар *(цішэй).* Дай руку! *(Працягвае яму акрываўленую руку, Мікола падае сваю.)* Дзякуй табе! Ты зрабіў мне паслугу, і я не гневаюся на цябе. Я хацеў і сам сабе такое зрабіць, ды неяк рука не паднялася.

Ганна. Міхайле, родненькі, скажы, што табе? Дзе ў цябе рана?

Жандар. Кажу табе, што мне зусім добра. Нават і лекаў не трэба! А вось і сведкі. Ну, дзякуй Богу! Дзякуй Богу!

З'ява чацвёртая

Тыя самыя, войт, Бабіч, Насця, сяляне.

Войт. Гэй! Што тут такое? Хто тут крычыць?

Насця. Ой, ліханька! Жандар забіты.

Войт. Няўжо нежывы? Мікола, Ганна! Што тут такое? Гаварыце, што стаіце як аслупянелыя!

Жандар *(ціха).* Пане войт! Пакіньце іх у спакоі! Яны не вінаватыя! Я... я сам...

Войт. А з табою што такое сталася? Чаму рукі на сябе налажыў?

Жандар. Так трэба было. Гэта маё дзела!.. Ганна! Мікола... бывайце здаровы... і прабачайце. *(Памірае.)*

Ганна *(кідаецца да нябожчыка).* Міхайле, Міхайлічак! На каго ты мяне пакідаеш? Што я без цябе на свеце рабіць буду?

Мікола. Ганна, супакойся, хіба табе няма дзеля каго жыць?

Заслона

МІХАЙЛА КАЦЮБІНСКІ
(1864—1913)

Міхайла Міхайлавіч Кацюбінскі нарадзіўся на Украіне, у Вінніцы. Скончыў Шаргародскае духоўнае вучылішча (1880), самастойна падрыхтаваўся і экстэрнам здаў экзамен на званне народнага настаўніка (1891). Некаторы час (1892—1897) як член спецыяльнай філаксернай камісіі знаходзіўся на поўдні Украіны і ў Малдавіі, дзе змагаўся з татальным захворваннем вінаграду — галоўнай харчовай культурай гэтых зямель. Два гады Кацюбінскі (1897—1898) займае пасаду журналіста-аглядальніка ў газеце «Волынь». У пачатку 1898 г. ён стала пасяляецца ў Чарнігаве, працуе ў статыстычным бюро земскай управы, актыўна ўдзельнічае ў літаратурна-грамадскім жыцці: узначальвае чарнігаўскае аддзяленне культурна-асветнага таварыства «Просвіта», арганізуе традыцыйныя літаратурныя «суботы» і «панядзелкі», часта выступае ў друку... Захварэўшы на сухоты, Кацюбінскі вымушаны лячыцца за мяжою. У 1909—1911 гг. ён тройчы выязджаў у Італію, дзе пазнаёміўся і зблізіўся з Максімам Горкім. У гэты час Максім Горкі, таксама ў сувязі з хваробай, трывала жыў на італьянскім востраве Капры, куды яму прыходзілі па пошце сярод іншых выданняў і нумары першай беларускай газеты «Наша Ніва». Народазнаўчы, дэмакратычны накірунак гэтага выдання прыцягнуў увагу Горкага. Як вядома, «Наша Ніва» з'явілася калыскай новай беларускай літаратуры. Дзякуючы газетным публікацыям Максім Горкі пазнаёміўся з творчасцю беларускіх пісьменнікаў. Менавіта Кацюбінскаму ў вядомым лісце ад 7 лістапада 1910 г. вялікі рускі пісьменнік раіў зацікавіцца літаратурай беларусаў. Горкі з цеплынёй расказаў пра «вельмі цікавых хлопцаў» — Янку Купалу і Якуба Коласа, даслаў на Украіну «песню і ноты, нешта накшталт беларускага гімна» — знакаміты твор Янкі Купалы «А хто там ідзе?» (музыка Л. Рагоўскага).

Першыя зборнікі прозы ўкраінскага пісьменніка — «У путах шайтана» (1899), «Па-людску» (1900) — выйшлі ў Заходняй Украіне (Галічына). Землі Галічыны знаходзіліся тады ў складзе

Аўстра-Венгрыі, дзе нацыянальны ўціск украінцаў быў значна слабейшы, чым у Расійскай імперыі. Таму творы многіх украінскіх пісьменнікаў з Усходняй Украіны, дзе афіцыйна забаранялася друкаванае ўкраінскае слова, убачылі свет менавіта ў Львове, найбольшым культурным цэнтры ўкраінскага захаду. З лепшых пазнейшых твораў празаіка варта назваць «сцэны з вясковага жыцця» — «Fata morgana» (1903 — I частка, 1910 — II частка), шэраг навел, якім аўтар даў сваё жанравае вызначэнне,— акварэль «На камені», эцюд «Цвет яблыні» (абодва 1902), палемічную навелу «Intermezzo» (1908), скіраваную супраць культу індывідуалізму, а таксама вяршыню сатырычнай навелістыкі — «Коні не вінаватыя» (1912). Кацюбінскі значна пашырыў жанравыя гарызонты ўкраінскай прозы. З-пад яго пяра выйшлі лірычныя аповесці, апавяданні, эскізы, эцюды, акварэлі. Наватарскім для тагачаснай украінскай літаратуры быў паказ пісьменнікам простых людзей іншых нацыянальнасцей — яўрэяў, малдаван, татараў, італьянцаў і інш. Пісьменніка-гуманіста хвалявала жыццё маленькага чалавека вёскі і горада, прадстаўніка самых розных прафесій. Уменне Кацюбінскага раскрыць псіхалогію чалавека ў невялікім па аб'ёме творы нагадвае майстэрства выдатнага рускага пісьменніка Антона Чэхава.

У спадчыне Кацюбінскага асаблівае месца займае этнаграфічная аповесць «Цені забытых продкаў» (1911), створаная пад уражаннямі ад паездак у жывапісныя мясціны ўкраінскіх Карпатаў, непасрэднага знаёмства з жыццём горных украінцаў-гуцулаў. Да напісання аповесці Кацюбінскі аднёсся вельмі адказна. Ён старанна вывучыў спецыяльную краязнаўчую літаратуру, таму ў творы выявілася грунтоўнае веданне пісьменнікам тапаграфіі Гуцульшчыны, звестак з галіны батанікі, разуменне своеасаблівай псіхікі гуцулаў, захопленасць іхнімі дзівоснымі песнямі і звычаямі, каларытнай мовай. У рэалістычны паказ жыцця гуцулаў уплецены мясцовы фальклорны матэрыял, які не адыгрывае ролі мастацкай дэкарацыі, а напоўнены філасофіяй пазнання душы чалавека. Як сапраўдны мастак Кацюбінскі выдатна перадае ўсе адценні і фарбы, усю каляровую гаму унікальнай прыроды Карпатаў. Праўдзіва паказваючы побыт гуцулаў, іх нялёгкую працу, пісьменнік з асаблівай увагай засяроджваецца на ўнутраным свеце сваіх герояў, раскрывае іх пачуцці і мары. Аналагічны, новы для таго часу, падыход да выкарыстання народнай творчасці здзяйснялі і Леся Украінка, і Максім Багдановіч. Максім Багдановіч добра ведаў і цаніў прозу Міхайла Кацюбінскага, папулярызаваў яе ў асяроддзі рускамоўнага чытача (артыкул «Образы Галиции в художественной литературе»).

Паводле аповесці «Цені забытых продкаў» кінарэжысёр Сяргей Параджанаў стварыў фільм, які прынёс сусветную славу ўкраінскаму кінамастацтву. Ролю Івана выдатна сыграў артыст Іван Мікалайчук. На беларускую мову творы Кацюбінскага пераклалі А. Жук, Т. Кабржыцкая, У. Рагойша, Л. Салавей і інш.

Для дадзенага выдання аповесць «Цені забытых продкаў» (пераклад Вячаслава Рагойшы) узята з кнігі:

Кацюбінскі Міхайла. Аповесці. Мінск: Маст. літ., 1980.

Цені забытых продкаў

Аповесць

(Скарочана)

Іван быў дзевятнаццатым дзіцем у гуцульскай сям'і Палійчукоў. Дваццатай і апошняй была Аннычка.

Хто яго ведае, ці то вечны шум Чарамоша і скаргі горных патокаў, што перапаўнялі самотную хату на высокай кічэры[1], ці то сум чорных яловых лясоў так палохаў дзіцяня, толькі Іван усё плакаў, крычаў па начах, блага рос і глядзеў на матулю такім глыбокім, старэча разумным паглядам, што маці ў трывозе адводзіла ад яго вочы. Не раз яна са страхам думала, што не яе гэта дзіця. Не «асцераглася» баба пры родах, не абкурыла недзе хаты, не паставіла свечкі — і хітрая ведзьма паспела замяніць яе немаўля на сваё чарцяня.

Паволі расло дзіця, ды ўсё ж падрастала, і не заўважылі нават, як давялося шыць яму штаны. Але таксама было дзікаватае. Глядзіць перад сабой, а бачыць штосьці далёкае і нікому не вядомае або без дай прычыны крычма крычыць. Майткі з яго з'язджаюць, а яно стаіць сярод хаты, заплюшчыць вочы, разявіць рот і верашчыць.

Тады маці вымала люльку з зубоў і, замахнуўшыся на яго, злосна крычала:

— Цьфу на цябе! Ты, падкідыш! Згінь, каб вочы мае не бачылі!..

І ён знікаў.

Каціўся зялёнымі царынкамі[2], маленькі і белы, нібы шарык з дзьмухаўца, смела забіраўся ў цёмны лес, дзе ялінкі махалі над ім лапкамі, быццам мядзведзь лапамі.

---

[1] Бязлесная гара. *(Заўвага аўтара.)*

[2] *Царынка* — абгароджаная сенажатка недалёка ад хаты. *(Заўвага аўтара.)*

Адсюль дзівіўся на горы, на блізкія і далёкія вяршыні, што ўпіраліся ў блакітнае неба, на яловыя чорныя лясы з іх сінім дыханнем, на светлую зеляніну царынак, якія, нібыта люстэркі, блішчэлі ў рамах дрэў. Пад ім, у даліне, кіпеў халодны Чарамош. На далёкіх узгорках драмалі пад сонцам самотныя хаціны. Было ціха і сумна, чорныя елкі бесперастанку спускалі сум свой у Чарамош, а ён нёс яго долам і расказваў.

— Івась!.. Гэ-эй! — гукалі Івана ад хаты, але ён не слухаў, абіраў маліны, страляў з лісткоў, рабіў свістульку або пішчаў на травінцы, намагаючыся пераняць галасы птушак ды ўсе тыя гукі, што чуў у лесе. Ледзь прыметны ў лясным зеллі, збіраў кветкі і ўплятаў іх у свой капялюшык, а стаміўшыся, лажыўся дзесьці пад сенам, што сохла на астрывах[1], і спявалі яму на сон ды будзілі яго сваім звонам горныя ручаі.

Калі Івану мінула сем гадоў, глядзеў ён на свет іначай. Ён ведаў ужо многа. Умеў знаходзіць зёлкі — красаўку і герань, разумеў, чаму плача каня, з чаго пайшлі зязюлі, і калі расказваў пра ўсё гэта дома, маці падазрона пазірала на яго: можа, я н о з ім гаворыць? Знаў, што на свеце пануе нячыстая сіла, што злы дух кіруе ўсім; што ў лясах поўна лесавікоў, якія пасуць там сваю скаціну: аленяў, зайцоў і сарнаў; што там блукае вясёлы чугайстыр[2], які тут жа просіць першага стрэчнага ў скокі і знішчае мавак; што жыве ў лесе голас сякеры. Вышэй, на дзікіх бязводных вяршынях, маўкі водзяць свае бясконцыя карагоды, а ў скалах хаваецца зніч. Мог бы расказаць і пра русалак, якія пагодлівым днём выходзяць з вады на бераг, каб спяваць песні, прыдумляць казкі, гаварыць пацеры, пра тапельцаў, што па захадзе сонца сушаць белае цела на камянях у рэчцы. Усялякія злыя духі насяляюць скалы, лясы, цясніны, хаты і загарадкі ды падсцерагаюць хрысціяніна або скаціну, каб зрабіць ім шкоду.

---

[1] *Астры́ва* — сухая яліна з галінамі, на якіх сушыцца сена. *(Заўвага аўтара.)*

[2] *Чуга́йстыр* — міфічная істота, добры лясны дух. *(Тут і далей, за выключэннем асобна агавораных выпадкаў, заўвагі перакладчыка.)*

Не раз, прахапіўшыся ўночы, сярод варожай цішыні, ён дрыжаў ад жаху.

Увесь свет быў як казка, поўная цудаў, таямнічая, цікавая і страшная.

Цяпер ён ужо меў абавязак — яго пасылалі пасвіць кароў. Гнаў у лес сваіх рыжуню і сівуню, і калі яны патаналі ў хвалях лясных траў і маладых ялінак і ўжо адтуль абзываліся да яго, як з-пад вады, тужлівым звонам сваіх званкоў, ён садзіўся дзе-небудзь на схіле гары, вымаў сапілку і найграваў няхітрыя песні, якія пераняў ад старэйшых. Аднак музыка не ўлагоджвала яго. Са злосцю кідаў сапілку і слухаў іншыя мелодыі, што жылі ў ім, незразумелыя і няўлоўныя.

Знізу ўзнімаўся да Івана і затапляў горы глухі рачны гоман, а ў яго ка́паў час ад часу празрысты звон. З-за яловых лапак выглядалі журботныя горы, напоеныя сумам ценяў ад хмар, што ўсё сцiралі і сцiралі бледную ўсмешку дарынак. Горы штохвіліны мянялі свой настрой: калі смяялася дарынка, хмурыўся лес. І гэтаксама цяжка было ўхапіць зрокам тое рухомае аблічча гор, як нялёгка было дзіцяці злавіць капрызную мелодыю песні, што вілася, трапятала крыльцамі каля самага вуха і не давалася.

Аднаго разу ён пакінуў сваіх кароў і пакараскаўся на самую вяршыню. Ледзь прыкметнай сцежкай падымаўся вышэй і вышэй, сярод густога зарасніку выцвілай папараці, калючых ажын і малін. Лёгка пераскокваў з каменьчыка на каменьчык, пералазіў цераз паваленыя дрэвы, прадзіраўся скрозь голле кустоў. За ім падымаўся з даліны вечны шум рэчкі, раслі горы, і ўжо ўставаў на даляглядзе блакітны прывід Чарнагоры. Доўгія ніцыя травы ўкрывалі цяпер бакі гары, званкі кароў абзываліся, як далёкае ўздыханне, усё часцей траплялiся вялікія камяні, што далей, на самай вяршыні, тварылі хаос пакрышаных скал, спісаных лішаямі, здушаных у змяіных абдымках карэннем ялін. Пад нагамі ў Івана кожны камень укрывалі рудыя імхі, тоўстыя, мяккія, шаўковыя. Цёплыя і пяшчотныя, яны хавалі ў сабе пазалочаную ваду летніх дажджоў, мякка ўгіналіся і абдымалі нагу, як пуховая падушка. Кучаравая зеляніна брусніц і чарніц запусціла сваё карэнне ў глыбіню моху, а зверху сыпанула расою чырвоных і сініх ягад.

Тут Іван сеў адпачыць.

Над ім завіс ласкавы звон хвоі, змешаны з шумам ракі, сонца наліло золатам глыбокую даліну, пазеляніла травы, дзесьці курыўся дымок ад вогнішча, з-за Ігрыца аксамітным гулам каціўся гром.

Іван сядзеў і слухаў, зусім забыўшыся, што трэба глядзець кароў.

І вось раптам у гэтай звонкай цішыні пачуў ён ціхую музыку, якая так доўга і няўлоўна вілася ў яго каля вуха, што нават мучыла. Застылы і нерухомы, выцягнуў шыю і з радасным напружаннем лавіў дзіўную мелодыю песні. Так людзі не ігралі, прынамсі, ён ніколі не чуў. Але хто іграе? Навокал нікога не было, самотны лес і ніводнай жывой душы. Іван азірнуўся назад, на скалы,— і скамянеў. На камені, вярхом, сядзеў «той», зніч. Скрывіў вострую бародку, нагнуў рожкі і, заплюшчыўшы вочы, дзьмуў у флаяру[1]. «Няма маіх коз... Няма маіх коз...» — разлівалася жалем флаяра. Ды вось рожкі падняліся ўгору, шчокі надзьмуліся і расплюшчыліся вочы. «Ёсць мае козы... Ёсць мае козы...» — заскакалі радасна гукі, і Іван з жахам убачыў, як, выткнуўшыся з-за лапак, затрэслі галовамі барадатыя казлы.

Ён памкнуўся ўцякаць — і не мог. Сядзеў, прыкуты на месцы, і нема крычаў ад халоднага жаху, а калі нарэшце прарваўся голас, зніч прапаў раптам у скале, а казлы зрабіліся карэннем дрэў, паваленых ветрам.

Іван нёсся цяпер уніз, без памяці, усляпую, ірваў здрадлівыя абдымкі ажын, ламаў сухое голле, каціўся па слізкіх імхах і з жахам чуў, што за ім штосьці гоніцца. Нарэшце ўпаў. Колькі ляжаў, не помніць.

Апамятаўшыся і ўбачыўшы знаёмыя мясціны, ён крыху супакоіўся. Здзіўлены, нейкі час прыслухоўваўся. Песня, здавалася, гучала ўжо ў ім самім. Ён дастаў сапілку. Адразу ў яго не выходзіла, мелодыя не давалася. Пачынаў іграць спачатку, напружваў памяць, лавіў нейкія гукі, і калі ўрэшце знайшоў, што доўга шукаў, што не давала яму спакою, і лесам паплыла дзіўная, не вядомая яшчэ песня,— радасць

[1] *Флаяра* — гуцульская дудка, якая, як і сапілка, выразаецца з дрэва і нагадвае беларускую жалейку.

уварвалася ў яго сэрца, заліла сонцам горы, лес і траву, заклекатала ў ручаях, ускінула Іванавы ногі, і ён, шпурнуўшы сапілку ў траву і ўзяўшыся ў бокі, закружыўся ў танцы. Перабіраў нагамі, станавіўся лёгка на пальцы, біў босымі пятамі аб зямлю, выкідваў каленцы, круціўся і прысядаў. «Ёсць мае козы... Ёсць мае козы...» — штосьці спявала ў ім. На сонечнай пляме палянкі, што схавалася ў пахмурным царстве ялін, скакаў беленькі хлопчык, нібы матылёк пырхаў з сцяблінкі на сцяблінку, а абедзве каровы — рыжуня і сівуня,— прасунуўшы галовы паміж ялін, ветліва глядзелі на яго, жуючы жуйку, ды зрэдку званілі ў такт.

Так знайшоў ён у лесе тое, што шукаў.

Дома, у сям'і, Іван часта быў сведкам неспакою і гора. На яго памяці ўжо двойчы каля іх хаты трубіла трэмбіта, апавяшчаючы горы і долы пра смерць: раз, калі брата Алексу раздушыла дрэва ў лесе, а другі раз, калі брат Васіль, хвацкі вясёлы хлопец, загінуў, пасечаны тапаркамі, у бойцы з варожым родам. Гэта была даўняя варагоўля іх роду з родам Гутанюкоў. Хоць усе ў сям'і кіпелі злосцю на той сабачы род, ніхто, аднак, не мог дакладна сказаць Івану, адкуль пайшла варожасць. Ён таксама гарэў жаданнем помсціцца і, гатовы кінуцца ў бой, хапаўся за татаў, зацяжкі яшчэ яму, тапарок.

Гэта толькі гаворыцца, што Іван быў дзевятнаццаты ў бацькі, а Аннычка дваццатая. Іх сям'я была невялікая: двое старых ды пяцёра дзяцей. Рэшта, пятнаццаць, спачывае на цвінтары каля царквы.

Усе яны былі багамольныя, любілі хадзіць у царкву, асабліва на фэст. Там можна было пабачыцца з далёкім родам, што асеў у навакольных сёлах, дый надаралася нагода аддзячыць Гутанюкам за Васілёву смерць і за кроў, што не раз лілася з Палійчукоў.

Вымаліся тады самыя лепшыя строі, чырвоныя суконныя штаны, вышываныя кажушкі-безрукаўкі, чэрасы[1] і табіўкі[2], густа арнаментаваныя цвікамі, панёвы, чырвоныя шаўковыя хусткі і нават пышная і беласнежная гугля[3],

---

[1] Полая скураная дзяга, у якой носяць грошы.
[2] Скураная сумка, якую носяць цераз плячо на рэмені.
[3] Верхняе суконнае адзенне накшталт каўказскай буркі.

якую маці асцярожна несла на вяровачцы цераз плячо. Іван таксама дастаў новы капялюш і доўгую дзёбню[1], што біла яму па нагах.

Сядлаліся коні, і зялёнаю сцяжынаю цягнулася квяцістае шэсце, нібы ўплятаючы чырвоныя макі ў стужку дарогі.

Па гарах, нізамі і хрыбтамі, плылі святочна ўбраныя людзі. Зялёная атава царынак раптам расквачвалася, уздоўж Чарамоша цёк рознакаляровы паток, а дзесьці высока, на чорнай завесе яловых лясоў, жарам гарэла ў ранішнім сонцы чырвоная стрэшка гуцульскага парасона.

Неўзабаве Іван убачыў сустрэчу варожых родаў.

Яны ўжо вярталіся з фэсту, тата быў трошкі на падпітку. Раптам на вузкай дарожцы, паміж скалою і Чарамошам, узнік затор. Вазы, коннікі і пешыя, мужчыны і жанчыны спыніліся і збіліся ў кучу. Над раз'юшаным крыкам, што ўсхапіўся адразу, як віхор, заблішчалі жалезныя тапаркі ды заскакалі перад самымі тварамі. Як каса і камень, стаялі роды — Гутанюкі з Палійчукамі, і перш чым Іван паспеў расшалопаць, што да чаго, тата размахнуўся тапарком і ўдарыў плазам камусьці па галаве, з якой пырснула кроў, заліла твар, сарочку, шыкоўную аўчынную безрукаўку. Войкнулі жанчыны, кінуліся бараніць, а ўжо чалавек з тварам чырвоным, не раўнуючы як яго штаны, чмякнуў тапарком ворагу ў галаву, і пахіснуўся Іванаў тата, як падсечаная елка. Іван кінуўся ў бойку. Не памятаў, што робіць. Штосьці падняло яго. Але дарослыя патаўклі яму ногі, і ён не мог праціснуцца туды, дзе біліся. Усё яшчэ гарачы, раз'юшаны злосцю, ён з налёту наскочыў на маленькую дзяўчынку, якая трэслася ад страху каля самага воза. Ага! Гэта, пэўна, Гутанюкова дзеўка! І, не думаючы доўга, пляснуў ёй па твары. Яна скрывілася, праціснула рукамі да грудзей кашулю і стала ўцякаць. Іван злавіў яе каля ракі, хапануў за пазуху і разадраў. Адтуль выпалі новыя стужкі, а дзяўчынка з крыкам кінулася іх бараніць. Але ён вырваў і кінуў іх у ваду. Тады дзяўчынка, уся згорбленая, паглядзела на яго спадылба нейкім глыбокім паглядам чорных матавых вачэй і спакойна сказала:

[1] Суконная сумка, якую носяць цераз плячо на шлейцы.

— Нічога... У мяне ёсць другія... нават лепшыя.

Яна нібы смяшыла яго.

Здзіўлены лагодным тонам, хлопец маўчаў.

— Мне мамка купіла новую панёву... і пасталы... і вышытыя капчуры[1]... і...

Ён усё яшчэ не ведаў, што сказаць.

— Я файна ўбяруся і буду дзеўкай...

Тады яму стала зайздросна.

— А я ўжо ўмею граць на сапілцы.

— Наш Фёдар зрабіў сабе такую файную флаяру... ды як зайграе...

Іван надзьмуўся.

— Я ўжо зніча бачыў.

Яна недаверліва паглядзела на яго.

— А чаму ты б'ешся?

— А ты чаго каля воза стаяла?

Яна падумала крыху, не ведаючы, што адказаць, і пачала шукаць нешта за пазухай.

Выцягнула нарэшце доўгую цукерку.

— Глянь!

Палавіну адкусіла, а другую важным, поўным даверу рухам падала яму:

— На!

Ён завагаўся, але ўзяў.

Цяпер яны ўжо сядзелі поруч, забыўшыся пра віск бойкі і сярдзіты шум рэчкі, а яна расказвала яму, што завецца Марычкай, што пасе ўжо авечак, што нейкая Марцінова — сляпая на адно вока — пакрала ў іх муку... і падобнае іншае, абаім цікавае, блізкае і зразумелае, а пагляд яе чорных матавых вачэй мякка ныраў у Іванава сэрца...

І трэці раз затрубіла трэмбіта пра смерць у самотнай хаціне на высокай кічэры: на другі дзень пасля бойкі памёр стары Палійчук.

Цяжкая пара настала ў Іванавай сям'і пасля смерці гаспадара. Загнездавала бязладдзе, адплывала шчасце, прадаваліся царынкі адна за адной, і скаціна ўбывала так, як на гарах вясною снягі.

---

[1] Від зімовых штаноў у гуцулаў.

Але ў Іванавай памяці татава смерць не так доўга жыла, як знаёмства з нявіннай дзяўчынкай, якую ён пакрыўдзіў і якая поўным даверу рухам падала яму палавіну цукеркі. У яго даўні і беспрычынны смутак улілася новая ручаінка. Яна няўцямна цягнула яго ў горы, насіла па суседніх кічэрах, лясах і далінах, дзе б ён мог сустрэць Марычку. І ён сустрэўся нарэшце з ёю: пасвіла ягнят.

Марычка яго прыняла, як быццам даўно спадзявалася: ён будзе з ёю пасвіць авечак. А і дапраўды! Няхай рыжуня і сівуня б'юць самі сабе ў званочкі ды парыкваюць у лесе, а ён стане з ёю пасвіць ягнят.

І як яны пасвілі!

Ягняты, забіўшыся ў халадок пад елку, дзівіліся дурнымі вачыма, як качаліся па імхах двое дзяцей, звонячы ў цішыні маладым смехам. Натаміўшыся, яны ўскараскваліся на белыя камяні і спуджана ўзіраліся адтуль у прорву, з якой строма ўзнімаўся ў неба чорны прывід гары і дыхаў сінечаю, што не хацела раставаць на сонцы. У шчыліне паміж гор ляцеў у даліну паток і трос па камянях сівою барадою. Так было цёпла, самотна і страшна ў векавечнай цішыні, якую сцярог лес, што дзеці чулі сваё дыханне. Але вуха ўпарта лавіла і збольшвала да незвычайнасці кожны гук, які мусіў жыць у лесе, і ім часам здавалася, што яны чуюць чыюсьці асцярожную хаду, глухі стук сякеры, хаканне стомленых грудзей.

— Чуеш, Івась? — шаптала Марычка.

— Чаму не чую? Чую.

Яны абое ведалі, што гэта блукае па лесе нябачная сякера, стукае па дрэвах і хакае стомленымі грудзямі.

Страх праганяў іх адтуль у даліну, дзе паток плыў спакайней. Яны рабілі сабе калдабан у ручаіне і, раздзеўшыся, боўталіся ў ім, як двое лясных зверанят, што не ведаюць, што такое сорам. Сонца спачывала на іх светлых валасках і біла ў вочы, а ледзяная вада з ручая шчыпала за цела.

Марычка першая замярзала і кідалася бегчы.

— Стой,— гукаў яе Іван,— адкуль ты?

— З Я-вар-рова,— стукацела зубамі ссінелая Марычка.

— А чыя ты?

— Кавалёва.

— Бывай здарова, кавалёва! — шчыпаў яе Іван і пускаўся наўздагон, аж пакуль, натомленыя, але сагрэтыя, яны не падалі на траву.

У ціхім плёсе ручая, над якім сонцам блішчаў лужок і сінелі боцікі, жалобна крумкалі жабы.

Іван нахіляўся над ручаём і пытаўся ў жабы:

— Кума-кума, што варыла?

— Бурак — боршч. Бурак — боршч. Бурак — боршч... — кракатала Марычка.

— Буракі-кі-кі! Буракі-кі-кі! Буракі-кі-кі! — верашчалі абое, заплюшчыўшы вочы, ажно жабы здзіўлена змаўкалі.

Гэтак пасучы, яны не раз гублялі авечак.

Калі падраслі, забавы сталі ўжо іншыя.

Цяпер Іван быў юнаком, стройным і моцным, як яліна, намазваў валасы маслам, насіў шырокі чэрас і шыкоўны капялюш. Марычка хадзіла з каснікамі, а гэта павінна было значыць, што яна ўжо на выданні. Не пасвілі больш ягнят разам і страчаліся толькі на свята ў нядзелю. Сыходзіліся каля царквы або недзе ў лесе, каб старыя не ведалі, як любяцца дзеці варожых родаў.

Марычцы падабалася, калі ён іграў на флаяры. [...] Марычка адгукалася на ігру флаяры, як галубка да шызага голуба,— каламыйкамі. Яна іх ведала безліч. Адкуль яны браліся — не магла б расказаць. Яны, здаецца, гушкаліся з ёй яшчэ ў калысцы, пялёхкаліся ў калдабане, узыходзілі ў яе грудзях, як узыходзяць кветкі-самасейкі на сенажацях, як яліны растуць па гарах. Куды б ні кінула вока, што б ні сталася на свеце: прапала авечка, пакахаў хлопец, здрадзіла дзяўчына, захварэла карова, зашумела елка — усё вылівалася ў песню, лёгкую і простую, як тыя горы ў іх даўнім, пачатковым жыцці.

Марычка і сама ўмела складаць песні. Седзячы на зямлі поруч з Іванам, яна абдымала свае калені і ціха гайдалася ў такт. Яе круглыя лыткі, апаленыя сонцам і голыя ад калень да чырвоных анучак, чарнелі пад падолам сарочкі, а поўныя губы міла ламаліся, калі яна зачынала:

Закувала зязюленька у зялёным лесе.
Ой, склалася у Марычкі каламыйка-песня...
Ой, кувала мне зязюля ды каля крынічкі.
А хто склаў жа каламыйку? Йванкава Марычка.

Яна даўно ўжо была Іванкава, яшчэ з трынаццаці гадоў. Што ж у тым дзіўнага было? Пасучы статак, бачыла часта, як палююць каровы або маркатуюць авечкі,— усё было так проста, звычайна, як свет стаіць, што ні адна нячыстая думка не запарушыла ёй сэрца. Праўда, каровы ад таго становяцца цельныя, а авечкі котныя, але людзям памагае варажбітка. Марычка не баялася нічога. За поясам, на голым целе, яна насіла часнок, над якім шаптала варажбітка. Ёй нішто цяпер не зашкодзіць. Успамінаючы гэта, Марычка гарэзна пасміхалася сама сабе і абдымала Івана за шыю.

— Любы Іванка! Ці будзе з нас пара?

— Як Бог дасць, мая салодзенькая.

— Ой, не! Вялікі гнеў трымаюць у сэрцы нашы старыя. Не налюбіцца нам.

Тады яго вочы цямнелі і тапарок угрызаўся ў зямлю.

— Мне не трэба іх згоды. Хай што хочуць робяць, а ты будзеш маёю!

— О-ё-ёй! Што ты гаворыш...

— Што чуеш, галубка...

І ўсё роўна, як на злосць старым, ён на танцах круціў дзяўчынай так, што аж пасталы разлазіліся.

Аднак не ўсё так складалася, як думаў Іван. Гаспадарка яго руйнавалася, ужо не было каля чаго ўсім увіхацца і трэба было ісці ў наймы.

Маркота грызла Івана.

— Давядзецца ісці на паланіну[1], Марычка,— сумаваў ён загадзя.

— Што ж, ідзі, Іванка,— пакорліва адказвала Марычка.— Такая, відаць, наша доля...

І яна каламыйкамі ўпрыгожвала іх разлуку. Ёй было шкада, што надоўга перапыняцца іхнія сустрэчы ў ціхім лесе. Абдымала за шыю Івана і, тулячы да яго твару бялявую галоўку, ціхенька спявала яму над вухам:

Мяне ўспомні, мой міленькі,
Хоць разок адзіны,
А я цябе прыгадаю
Сем раз на гадзіну.

---

[1] *Паланіна* — высакагорны луг.

— Успомніш?

— Успомню, Марычка.

— Нічога! — суцяшала яна яго.— Ты будзеш, мой родны, аўчарыць, а я сенаваць. Узлезу на капу дый пагляджу ў горы на паланінку, а ты мне затрубі на трэмбіце... Можа, пачую. Як туман будзе ападаць на горы, я сяду ды заплачу, што не відаць майго любага. А як у пагодлівую ночку высыплюць на небе зоркі, я буду прыглядацца: якая зорка над паланінкаю — тую бачыць Іванка... Толькі спяваць пакіну...

— Чаму? Спявай, Марычка, не губляй весялосці сваёй, я хутка вярнуся.

Але яна толькі сумна галавой хістала.

Ой, мае вы каламыйкі,
Дзе я вас схаваю?
Хіба вамі, каламыйкі,
Дол пазасяваю,—

ціха абазвалася да яго Марычка.

Вы будзеце, каламыйкі,
Травой разрастацца,
А я буду, маладзенька,
Слязой умывацца.

Марычка ўздыхнула і яшчэ сумней дадала:

Ой, як добрай будзе доля,
Я вас пазбіраю,
А як дрэннай стане доля,
Я вас занядбаю...

— Так і я... Можа, і занядбаю...

Іван слухаў тонкі дзявочы галасок і думаў, што яна даўно ўжо ўсё засеяла каламыйкамі сваімі, што іх спяваюць лясы і сенажаці, пагоркі і паланіны, звоняць ручаі і выспеўвае сонца... Але прыйдзе пара, ён вернецца да яе, і яна зноў пазбірае каламыйкі, каб было чым адбыць вяселле.

* * *

Цёплым вясновым ранкам ішоў Іван на паланіну.

Лясы яшчэ дыхалі халадком, горныя воды шумелі на спадах, а сцяжынка радасна падымалася ўгару паміж варыннем[1]. Хоць яму цяжка было пакідаць Марычку, аднак сонца і тая шумная зялёная воля, што падпірала вяршынямі неба, улівалі ў яго бадзёрасць. Ён лёгка скакаў з каменя на камень, як горны ручай, і вітаў стрэчных, радасна прыслухоўваючыся да свайго голасу:

— Слава Ісусу!

— Навекі слава!.. [...]

Трэба было спяшацца.

За ўзлобкам, у далінцы, ён знайшоў закураную стаю[2]. Дзірка для выхаду дыму чарнела ў сценцы халодным правалам. Загарадкі на авечак стаялі пустыя, і аўчары ўвіхаліся там, каб было дзе начаваць пры скаціне. Старшы аўчар здабываў жывы агонь.

Ушчаміўшы ў шула лучыну, два чалавекі цягалі рэмень, ад гэтага лучына круцілася і скрыпела.

— Слава Ісусу! — павітаўся Іван.

Але яму нічога не адказалі.

Таксама фуркала лучына, і два чалавекі, засяроджаныя і строгія, тым самым рухам цягалі рэмень. Лучына пачынала курэць, і скора маленькі агеньчык выскачыў з яе і запалаў з абодвух канцоў. Старшы аўчар набожна падняў агонь і ўторкнуў у кастрышча, складзенае каля дзвярэй.

— Навекі слава! — павярнуўся ён да Івана.— Цяпер у нас ёсць жывы агонь, і пакуль ён гарэцьме, ні звер, ні сіла нячыстая не возьме скаціны дый нас, грэшных...

І завёў Івана ў стаю, дзе ад парожніх даёнак, дзежак ды голых лавак патыхала запусценнем.

— Заўтра прыгоняць нам скаціну, каб толькі памог Пан Бог усю людзям аддаць,— абазваўся аўчар і расказаў, што Іван павінен рабіць.

Штосьці было спакойнае, нават велічнае ў словах і ў руках паланінскага гаспадара.

---

[1] Агароджа з драўляных жэрдак. *(Заўвага аўтара.)*

[2] Драўляны шалаш, у якім жывуць аўчары і робяць сыр (будз, брынзу). *(Заўвага аўтара.)*

— Міка!..— гукнуў ён праз дзверы.— Раскладзі барзжэй агонь у стаі...

Тонкі кучаравы Мікола, з поўным жаночым тварам, унёс у стаю агонь.

— Ты ж хто, братка, будзеш — аўчар? — зацікавіўся ван.

— Не, я — спузар,— паказаў зубы Мікола,— павінен пільнаваць вогнішча, каб не згасла, бо будзе бяда!..— Ён нават з жахам азірнуўся наўкола.— Дый вады схадзіць да ручая, дый у лес дроў...

Тым часам вогнішча разгаралася. Поўным павагі рухам, як даўнейшы жрэц, падкідваў у яго старшы аўчар сухі ельнік ды свежыя лапкі, і сіні дым лёгка ўзнімаўся над ім, а далей, адкінуты ветрам, чапляўся за горы, перабіраўся праз чорную паласу лясоў і слаўся па далёкіх блакітных вяршынях.

Паланіна пачынала сваё жыццё жывым нязгасным агнём, што меўся яе бараніць ад усяго ліхога. І, нібы ведаючы пра гэта, агонь горда віўся сваім змяіным целам, дыхаў усё новымі клубамі дыму...

Чатыры дужыя аўчаркі, паклаўшы на траву свае кажухі, глядзелі задумліва ў горы, гатовыя ў адну хвіліну ўскочыць на ногі, выскаліць зубы ды натапырыць поўсць.

Дзень ужо гас. Горы мянялі сваё блакітнае ўбранне на ружовыя, з золатам рызы.

Мікола клікаў вячэраць.

Тады сышліся ў стаю ўсе аўчары і паселі каля жывога агню, каб спакойна з'есці сваю першую паланінскую кулешу... [...]

* * *

Паланінка, верхавінка, чым ты так зрадзела, ці не тымі авечкамі, на якіх глядзела?..

— Ашкір! Ашкір! — падганяе ззаду аўчар. Авечкі лена згінаюць калені, трасуцца на тонкіх ножках і цярушаць воўну.— Ашкір! Ашкір! — Голыя морды, з старэчым выразам нуды, растульваюць слінявыя губы, каб паскардзіцца бог ведае каму: «Бэ-э... мэ-э...» Два аўчары вядуць гурт.

Чырвоныя порткі разразаюць паветра, ад руху ківаецца кветка на капелюшы.— Шкір-шкір!.. Аўчаркі прынюхваюцца да ветру і адным вокам скоса пазіраюць на авечак, ці ўсё ў парадку. Трэцца воўна аб воўну, белая аб чорную, падымаюцца пухнатыя хрыбты, як дробныя хвалі ў возеры, і дрыгаціць атара.— Да гурту! Да гурту! — Гарлавы вокліч вяртае крайніх у атару, трымае паводку ў берагах. Горы блакітнеюць навокал, як мора, вецер груваcціць на небе хмары. Трасуцца кучаравыя авечыя хвасты, а галовы ўсе нахіліліся, і белыя пляскатыя зубы выгрызаюць да кораня салодкі дзядоўнік, чартапалох, ружовую канюшыну.— Шкір! Шкір! — Сцеле паланіна атары пад ногі свой кілім, а яна накрывае яе рухомым рабым кажухом. Хрум-хрусь... Бэ-э... мэ-э... Хрум-хрусь... Цені ад хмар блукаюць па бліжэйшых узгорках, перасоўваюць іх з месца на месца. Ходзяць, здаецца, горы, як валы ў моры, і толькі далёкія непарушна блакітнеюць на месцы. Сонца заліло авечую воўну, рассыпалася ў ёй вясёлкай, запаліла травы зялёным агнём, за аўчарамі ідуць доўгія іх цені.— Да гурту! Да гурту! — Хрум-хрусь... Хрум-хрусь... Нячутна ступаюць пастухі ў пасталах, коціцца мякка воўністая хваля па паланіне, а вецер пачынае іграць на далёкім варынні. Дз-з... — тонка спявае ён на адшчапанай трэсцы, дакучна звініць, як муха. Дз-з... — гучна абзываецца другое варынне, наводзячы сум. Хмары ўсё прыбываюць. Яны ўжо закрылі паўнеба, гасне далёкі Бэскід, і чарнее, і пахмурнее ў ценях, нібыта ўдавец, а паланіна яшчэ маладая. І пытаецца вецер тонкім голасам у варыння: «Чаму ж ты не жэнішся, высокі Бэскідзе?» «Бо зялёная паланінка за мяне не пойдзе»,— сумна ўздыхае Бэскід. Блакітнае неба ўмурзалася ў шэрань, мора гор пацямнела, паланіна пагасла, і атара авечак паўзе па ёй, як шэры лішай. Халодны вецер распраўляе крылле і б'е ім у грудзі пад безрукаўку. Так цяжка дыхаць, што хочацца павярнуцца да яго спіною. Няхай б'е... [...]

Закаціліся авечкі ў далінку, і тут зацішней.

На шэрым небе выглянула блакітнае азерца. Вострая паланінская трава мацней запахла. Азерца ў небе выходзіць з берагоў і ўжо шырока разліло воды. Заблакітнелі зноў вяршыні, а ўсе даліны наліліся золатам сонца.

Іван углядаецца ўніз. Там недзе, сярод гор, дзе людзі, на зялёнай траўцы паходжваюць Марыччыны белыя ногі. Не вочы скіраваны на паланіну. Ці спявае свае песенькі? А можа, сапраўды, парассявала па гарах, па долах, яны ўзышлі кветкамі, а Марычка замоўкла?

Ой, як будуць аўчарыкі
Авечачак пасці,
Будуць мае каламыйкі
За капялюш класці... —

згадваецца яму мілы дзявочы голас, і ён зрывае кветку і ўтыркае ў капялюш. [...]

Стаміліся аўчаркі. Кладуцца і задыхана сапуць у траве. На доўгі чырвоны язык, што звісае між ікламі, садзяцца мухі.

— Да гурту! Да гурту! — злосна галёкае Іван, і ўжо сабакі пры авечках.

Далёка, на паланіне, пад густым лесам, пасуцца каровы. Пастух абапёрся ў задуме на доўгую трэмбіту.

Так паволі цягнецца час! Горнае паветра прапаласкала грудзі, хочацца есці. І як самотна! Стаіш тут маленькі, як былiна ў полі. Пад нагамі зялёны востраў, які абліваюць блакітныя воды далёкіх гор. А там, на суровых дзікіх вяршынях, на бязводдзі і бязлюддзі, гнездзяцца ўсялякія здані, нячыстая сіла, з якой цяжка змагацца... Толькі адно — берагчыся...

Ашкір-ашкіра! Пхнуцца авечкі зялёным полем, мякка ступаюць па траве пасталы... Цішыня такая, што чутно, як кроў цячэ ў жылах... Сон адольвае. Кладзе мякенькую лапу на вочы і на твар і нашэптвае на вуха: спі... Авечкі меншаюць перад вачыма... Вось ужо з авечак сталі ягняты, а вось нічога няма. Паплылі травы, як зялёная вада. Прыходзіць Марычка. Ой не абдурыш, нябожа, ой не... Іван ведае, што гэта маўка, лясная русалка, а не Марычка, што гэта яна зводзіць яго. Штосьці цягне яго за ёй! Не хоча, а ўжо плыве, як плывуць травы зялёным патокам...

І раптам дзікі перадсмяротны роў каровы выкідвае яго са сну. Што? Дзе? Пастух як стаяў, абапёршыся трэмбітай на зямлю, так і застыў. Рыжы бугай стукнуў нагамі аб

зямлю, выгнуў валасатую шыю і падняў хвост. Ён ужо імчыць на той роў, высока скача і рве нагамі траву. Рэжа нагамі паветра. Пастух схамянуўся і гоніцца за ім да лесу. Бахнуў у лесе стрэл. Бах-бах-бах... — загрымелі са стрэльбаў вяршыні. Бах-бах-бах... — адазваліся далейшыя, і ўсё нямее. Цішыня.

«Пэўна, «вуйка» задраў карову»,— думае Іван і пільней прыглядаецца да сваёй атары. [...]

Раптам да вуха далятае даўно чаканы покліч трэмбіты. Ён прыносіць ад стаі пах кулешы і дыму ды доўгім меладычным трымценнем апавядае, што кашары чакаюць авечак...

— Ашкір-ашкір!..— Гойсаюць сабакі, бляюць авечкі і льюцца стракатым патокам у даліну, трасучы вымем, ацяжэлым ад малака...

* * *

Ужо трэці дзень сыпле на паланіну дождждык-макасей. Закурыліся вяршыні, ухуталася неба, і ў шэрым змроку зніклі горы. Авечкі ледзьве валакліся, цяжкія, набрынялыя вадою, як губка; апратка на аўчарах стала халодная і цупкая. Толькі і спачынку было, што пад стрэшкай у струнцы[1] ў часе даення.

Іван сядзіць, упёршыся плячыма ў дошку, а нагамі сціскае даёнку. Каля яго — чорны калматы козар[2], што за кожным словам кляне, а там яшчэ аўчары. Нецярплівыя авечкі, у якіх прыбывае малако, пруцца з загарадкі ў струнку, каб іх скарэй падаілі. Аднак жа пачакайце, няўструі, бо так не пойдзе!.. Толькі па адной... [...]

Іванавы рукі бесперастанку ціскаюць цёплае авечае вымя, адцягваюць даёнку, а па руках цячэ малако, што пахне лоем і патыхае з даёнкі тлустай салодкай парай.

— Шкір! Шкір! — Ускокваюць авечкі як ачмурэлыя, раскірэчваюць над даёнкамі ногі, і дзесяць аўчаровых пальцаў ціскаюць цёплае вымя. Жаласна плача мокрая атара па гэты і па той бок стрункі, падаюць у загарадку знясіленыя

---

[1] Паветка, дзе дояць авечак. *(Заўвага аўтара.)*
[2] Казіны пастух. *(Заўвага аўтара.)*

вечкі, а густое малако звонка цурчыць у даёнку ды зацяне цёплым ручайком аж за рукаў.— Шкір! Шкір!

Козар усміхаецца вачыма сваім козам. Яны не тое, што авечкі, у іх моцнае сэрца. Не падаюць трупам, як рахманыя авечкі, а цвёрда стаяць на тоненькіх нагах. Цікаўна падняўшы рожкі і ўглядаюцца ў змрок, быццам скрозь яго штосьці бачаць, і так бадзёра трасуцца ў іх тонкія бародкі...

* * *

Апусцелі кашары. Цішыня і пустка. Можа, дзесьці там, у глыбокіх далінах, адкуль пачынаюць расці горы, і лунаюць людскі смех ды галасы, але ў гэта верыцца мала. Тут, на паланіне, дзе неба накрывае бязлюдныя прасторы, што жывуць у самотнасці толькі дзеля сябе, вякуе адна цішыня.

Толькі ў стаі трашчыць нязгасны агонь і ўсё пасылае сіні свой дым у вандроўку. Здоенае малако важка спачывае ў драўлянай пасудзіне, над ім нахіліўся старшы аўчар. Ён ужо яго заправіў. З паліцы, дзе сохнуць вялікія круглыя боханы будзу, павявае на аўчара вецер, але не можа прагнаць са стаі паху вугалю, сыру і авечай воўны. Бо тым самым пахне і аўчар. Новыя дзежкі і даёнкі маўчаць у куце, аднак толькі пастукай па іх — і абзавецца голас. Халодная сыроватка свеціцца з конаўкі зялёным вокам. Аўчар сядзіць паміж свайго начыння, як бацька сярод дзяцей. Усё яно — чорныя лаўкі і сцены, вогнішча і дым, будз, дзежкі і сыроватка,— усё яно блізкае і роднае, да ўсяго дакранулася яго цёплая рука.

Малако ўжо гусне, але яшчэ яму не пара. Тады аўчар вымае з-за чэраса вязку драўляных калодак і пачынае чытаць. Там памечана ўсё, у той драўлянай кнізе,— хто колькі мае авечак і што каму належыць. Турбота зводзіць яму бровы, а ён упарта чытае: «Масійчук мае штырнаццаць авец, а яму належыць...»

За сценкаю стаі спузар выводзіць:

У баранчыка пытае
Аўца-крутарожка:
— Ці ты сена зелянога
Насянуеш трошка?

— Рассяваўся! — злуецца аўчар і нанава пералічвае паметкі.

Ты не знаеш, крутарожка,
Што стане зімою,
Ці ты будзеш, ці ты будзеш
Увесну жывою,—

даспеўвае спузар у сенях і ўваходзіць у стаю.

Закураны, чорны, згінаецца над агнём, і яго белыя зубы блішчаць. Патрэсквае ціха агонь.

Малако ў катле жоўкне і гусне. Аўчар схіліўся над ім засяроджаны, нават суровы. Расшпільвае паволі рукавы і па самы локаць засоўвае ў кацёл свае голыя валасатыя рукі. І так застывае над малаком...

Цяпер павінна быць ціха ў стаі, дзверы зачынены, і нават спузар не пасмее кінуць вокам на малако, пакуль там дзеецца штосьці, пакуль варожыць аўчар. [...] Толькі па лёгкім руху жыл на аўчаровых руках заўважаецца, што на дне пасудзіны адбываецца нешта. Рукі паволі ажываюць, то падымаюцца вышэй, то апускаюцца ніжэй, закругляюцца локці, рукі нешта боўтаюць, пхаюць і гладзяць там, усярэдзіне, і раптам з дна пасудзіны, з-пад малака, падымаецца круглае сырава цела, што нейкім цудам нарадзілася. [...]

Аўчар з палёгкай уздыхнуў. Цяпер і спузар можа глянуць. Слаўны нарадзіўся будз, аўчару на ўцеху і на спажытак людзям... [...]

А калі сонца заходзіць, старшы аўчар выносіць са стаі трэмбіту і трубіць пераможна на ўсе пустынныя горы, што дзень скончыўся мірам, што будз яму ўдаўся, кулеша гатова і даёнкі чакаюць новага малака...

* * *

За сваё летаванне на паланіне зазнаў Іван нямала прыгод. Раз ён пабачыў дзіўную карціну. Меўся ўжо гнаць авечак дахаты, як незнарок азірнуўся на блізкую вяршыню. Туман знізіўся і ўхутаў лес, што стаў лёгкі і сівы, як прывід. Толькі палянка зазелянела пад ім ды чарнела адзінокая

яліна. І вось тая яліна задыміла і пачала расці. Расце ды расце — і вось выйшаў з яе нейкі чалавек. Стаў на палянцы, белы, высокі, і гукнуў сабе за спіну ў лес. І зараз жа выйшлі з лесу алені, адзін за адным, а ў кожнага, што выйдзе, нагага — рогі яшчэ прыгажэйшыя ды весялейшыя. Гуртам выбеглі сарны, патрымцелі на тоненькіх ножках дый пачалі шчыпаць траву. А як рассыплюцца сарны, тады мядзведзь іх заверне, як авечак аўчарка. А той бялёсы пасе — яшчэ і пакрыквае на скаціну. Тут раптам узняўся вецер, і статак як пырхнуў, так і прапаў. Не раўнуючы як бы хто хукнуў на шкло: яно запацее, а пасля знікне ўсё, нібыта нічога і не было. Ён паказваў іншым, але тыя дзівіліся: «Дзе? Адзін туман толькі».

За два тыдні «вялікі» — так аўчары пошапкам называлі мядзведзя — задраў яшчэ пяць кароў.

Часта туман заставаў авечак на паланіне. У густым змроку, белым, як малако, усё знікала: неба, горы, лясы, пастухі.

— Гэ-эй! — гукаў Іван перад сабой.

— Гэ-эй! — адгукалася глуха на яго вокліч, як з-пад вады, а адкуль, дзе быў той, хто адгукваўся,— невядома.

Авечкі сівым туманам каціліся перад нагамі, а далей знікалі і яны.

Іван ішоў бездапаможны, выставіўшы рукі перад сабою, нібы баяўся на штосьці наткнуцца, і клікаў:

— Гэй!..

— Дзе ты? — адгукалася ўжо ззаду — і Іван мусіў спыняцца. Стаяў безабаронны, згублены ў ліпкім тумане, і калі прыкладаў да вуснаў трэмбіту, каб абазвацца, другі канец трэмбіты расплываўся ў змроку, а здушаны голас яе, тут жа на месцы, падаў яму пад ногі. Так яны згубілі некалькі авечак.

«Вуйка» задраў яшчэ дзве каровы, але гэта было перад канцом: дабіраўся ўночы да стаі ды ўзнізаўся на кол. Цяпер яго шкура сушыцца на калках і на яе брэшуць сабакі.

Часам хвастаў па паланіне лівень. Святы Ілья ваяваў з «тымі» — ліха на іх! Так бліскаў мячом і так грукаў са стрэльбы — Божа святы! — што трашчала неба ды падала на горы, а хай толькі трэсне, то штосьці чорнае за кож-

ным разам заўецца туды-сюды дый шусне пад камень... Ён, нячысцік,— каб ты прапаў! — здзекуецца з Бога, падстаўляе свой азадак, ■ аўчару бяда: страху набярэшся, яшчэ і вымакнеш да ніткі...

На Пятра выдаўся зазімак— ды такі моцны, што тры дні не сходзіў снег. Тады пакалечылася многа авечак...

Зрэдку прыходзілі людзі з даліны. Іх абступалі, пытаючыся напярэймы:

— Што чуваць на сяле?

І, як дзеці, слухалі звычайныя апавяданні... [...]

Іван, перш чым класціся, клікаў да сябе Міколу, заўсёды пявучага і гаваркога:

— Міка!.. Хадзі ка мне, братка!..

— Пачакай, братка Івась, я зараз! — гукаў са стаі спузар, і ўжо адтуль далятала да Івана яго каламыйка:

Чарнагора хлеб не родзіць,
Не родзіць пшаніцы,
А гадуе аўчарыкаў
І сыр белаліцы...

Мікола быў сірата і вырас на паланіне. «Гадавалі мяне авечкі»,— казаў ён пра сябе, прыгладжваючы непаслухмяныя кучары. [...]

* * *

Так летаваў Іван на паланіне, аж пакуль яна не апусцела. Сплыла скацінка назад у даліны, разабралі яе гаспадары, адтрубілі свае трэмбіты, ляжаць вытаптаныя травы, а вецер асенні галосіць над імі, як над нябожчыкам. Асталіся толькі старшы аўчар і спузар. Яны павінны дачакацца, пакуль згасне агонь. Той агонь паланінскі, што сам нарадзіўся, нібыта Бог, сам мусіць і заснуць. А калі і іх ужо не стала, на засмучаную паланіну прывалаклася ўсялякая нечысць дый шныпарыць па стаі і загарадках, ці не асталося чаго і ёй.

* * *

Дарэмна Іван спяшаўся з паланіны: ён не застаў Марычкі жывое. За дзень перад гэтым, калі пераходзіла Чарамош, забрала яе вада. Раптоўна ўзнялася паводка, злыя хвалі збілі Марычку з ног, кінулі пасля на вадаспад і панеслі паміж скал у даліну. Марычку несла рака, а людзі глядзелі, як круцяць яе хвалі, чулі яе крыкі і мольбы і не маглі ўратаваць.

Іван не верыў. Гэта, напэўна, штучкі Гутанюкоў. Даведаліся пра іхняе каханне і схавалі Марычку.

А калі з усіх бакоў у адзін голас загаварылі тое самае, вырашыў знайсці цела. Мусіла ж яно прыбіцца недзе да драўлянай абшыўкі берага, дзесьці людзі павінны былі яго злавіць. Пайшоў уздоўж рэчкі, поўны пякучага гневу і злосці да яе вечнага шуму, да кіпучай лютасці.

У адным сяле знайшоў-такі цела. Яго ўжо выцягнулі на жвір, але ён не пазнаў у ім Марычкі. Гэта не Марычка была, а нейкі мокры мех, сіняя крывавая маса, перацертая рачным каменнем, нібы ў млыне...

Вялікі жаль ухапіў Івана за сэрца. Спярша яму хацелася скочыць з скалы ў вір: «На, жары і мяне!» Але пасля шчымлівая скруха пагнала яго ў горы, далей ад рэчкі. Затыкаў вушы, каб не чуць здрадлівага шуму, што прыняў у сябе апошняе дыханне яго Марычкі. Блукаў па лесе, сярод камянёў, буралому, як мядзведзь, што залізвае раны, і нават голад не мог прагнаць яго ў сяло. Знаходзіў ажыны, брусніцы, піў ваду з крыніц і тым жывіўся. Пасля знік. Людзі лічылі, што ён загінуў з вялікага жалю, а дзяўчаты склалі каламыйкі пра іх каханне і смерць, і разышліся тыя каламыйкі па гарах. Шэсць гадоў не было чуваць пра яго, на сёмы раптам з'явіўся. Худы, счарнелы, намнога старэйшы за свае гады, але спакойны. Расказваў, што пасвіў статак на венгерскім баку. Яшчэ з год так пахадзіў, а тады ажаніўся. Трэба ж было гаспадарыць.

Калі замоўклі стрэлы пістоляў і адспявалі вяселле, а жонка прыгнала ў загарадзь авечак і кароў, Іван быў нават задаволены. Яго Палагна была з багатага роду, фанабэрыстая, здаровая дзеўка з грубым голасам і валлястаю шыяй. Праўда, яна любіла багатыя строі, і нямала недзе пойдзе

грошай на шаўковыя хусткі ды дарагія маністы, але ліха з імі! Паглядаючы на авечак, што бляялі ў загарадках, на свой стракаты статак, на кароў, што званілі ды рыкалі на выпасах у лесе, ён не маркоціўся.

Цяпер ён меў каля чаго хадзіць. Не быў сквапны на багацце — не на тое гуцул жыве на свеце! — сам догляд скаціны поўніў радасцю сэрца. Як дзіця для маці — такою была для яго жывёла. Увесь час, усе думкі забіраў клопат пра сена, пра выгоды скаціне, каб яна не слабела, каб хто не сурочыў, каб авечкі шчасліва каціліся, а каровы цяліліся. Скрозь, ад усяго ішла небяспека, і трэба было добра сцерагчы скаціну ад гадаўя, звярыны і ад ведзьмаў, якія ўсялякімі спосабамі здойвалі кароў і губілі авечак. Трэба было шмат ведаць, абкурваць, загаворваць, збіраць зёлкі і варажыць. Палагна яму памагала. З яе была добрая гаспадыня, і свае вечныя турботы ён дзяліў з ёю. [...]

З другога боку, на самым блізкім узгорку, суседам быў Юра. Пра яго людзі казалі, што ён богападобны. Ён быў як Бог, усёмагутны і ўсёведны, той градаўнік і знахар у сваіх дужых руках трымаў сілы нябесныя і зямныя, смерць і жыццё, здароўе скаціны і чалавека, яго баяліся, і ў ім мелі патрэбу ўсе.

Здаралася, што і Іван звяртаўся да яго, але кожны раз, сустракаючы пагляд чорных пякучых знахарскіх вачэй, непрыкметна сплёўваў: «Соль табе ў вочы...»

Аднак найгорш дакучала ім Хіма. Старая ліслівая баба, заўжды такая прыветлівая, яна вечарамі перакідвалася ў белага сабаку ды швэндалася па суседскіх загарадках. Не раз Іван шпурляў тапаром па ёй, кідаў віламі і праганяў.

Рабая карова на вачах сохла і ўсё менш і менш давала малака. Палагна ведала, чыя гэта работа. Яна падпільноўвала, замаўляла, па колькі разоў на вечар бегала да кароў, уставала нават ноччу. Раз нарабіла такога гвалту, што Іван бег у загарадку, як дурны, і мусіў адганяць ад парога вялікую жабу, што намагалася пералезці ў хлеў. Але жаба раптам недзе знікла, а з-за плота скрыпеў ужо Хімін галасок:

— Добры вечар, суседзечкі любыя... хе-хе... [...]

Колькі клопату было ў Івана! Ён не меў нават калі апамятацца. Гаспадарка вымагала вечнай працы, жыццё

скаціны так цесна спляталася з яго асабістым жыццём, што выцясняла ўсялякія іншыя думкі. Але часамі, неспадзявана зусім, калі ён падымаў вочы на зялёныя царынкі, дзе спачывала ў копах сена, або на глыбокі задуменны лес, адтуль далятаў да яго даўно забыты голас:

Мяне ўспомні, мой міленькі,
Хоць разок адзіны,
А я цябе прыгадаю
Сем раз на гадзіну.

Тады ён кідаў работу і кудысьці знікаў. [...]

Ці любіў ён Палагну? Такая думка ніколі не лезла яму ў галаву. Ён гаспадар, яна гаспадыня, і хоць дзяцей у іх не было, затое была скаціна — чаго ж яшчэ больш? На добрай гаспадарцы Палагна раздабрэла, стала поўная і чырвоная, курыла люльку, як Іванава маці, насіла пышныя шаўковыя хусткі, а на валлястай шыі ў яе блішчала столькі караляў, што жанчыны аж лопаліся ад зайздрасці. Яны ездзілі разам у горад або на фэст. Палагна сама сядлала свайго каня і закладвала чырвоны пастол у стрэмя так горда, нібы ўсе горы належалі толькі ёй. На фэстах былі людзі і далёкія роды, пенілася піва, лілася гарэлка, зляталіся ўсялякія навіны з далёкіх гор. Іван абнімаў маладзіц, Палагну цалавалі чужыя мужыкі — якое тут дзіва! — і задаволеныя, што файна так прабавілі час, яны вярталіся зноў да штодзённых турбот.

Да іх таксама прыязджалі добрыя гаспадары ў госці.

— Слава Ісусу! Як жонка, скацінка, як маецеся?

— Дзякаваць Богу, а як самі?..

Садзіліся за ўзорысты стол, цяжкія ў сваім авечым убранні, і частаваліся гуртам свежай кулешай ды кіслай сыраквашай, ад якой ажно язык аблазіў.

Так ішло жыццё.

На працу — будні, на варажбу — свята.

На куццю Іван быў заўсёды ў дзіўным настроі. Усё роўна як перапоўнены нечым таямнічым і свяшчэнным, ён усё рабіў паважна, нібы службу божую служыў. Раскладваў Палагне жывы агонь для вячэры, слаў сена на стол ды пад

стол і з поўнай верай рыкаў пры гэтым, як карова, бляяў авечкаю ды ржаў канём, каб вялася скаціна. Абкурваў ладанам хату і кашары, каб адагнаць звера і ведзьмаў, а калі чырвоная ад мітусні Палагна сярод таго курыва абвяшчала нарэшце, што гатовы ўсе дванаццаць страў, ён, перш чым засесці за стол, нёс тайную вячэру жывёле. Скаціна перш шая павінна была пакаштаваць галубцоў, сліў, бобу і куцці, што так старанна гатавала яму яго Палагна. Але гэта было не ўсё. Яшчэ трэба было заклікаць на тайную вячэру ўсе варожыя сілы, перад якімі бярогся ўсё жыццё. Браў у адну руку міску са стравай, ■ ў другую сякеру і выходзіў на двор. Зялёныя горы, убраўшыся ў белыя світкі, прыслухоўваліся чуйна, як звінела на небе золата зор, мароз бліскаў срэбным мячом, сцінаючы гукі ў паветры, а Іван выцягваў руку ў гэтую скаваную зімою бязлюднасць і склікаў на тайную вячэру да сябе ўсіх чарнакніжнікаў, ведзьмароў, знахароў усялякіх, лясных ваўкоў і мядзведзяў. Ён клікаў буру, каб зрабіла ласку прыйсці да яго на тлустыя стравы, на добрую гарэлку, на вячэру святую — але яны не рабілі ласкі і ніхто не прыходзіў, хоць Іван запрашаў тройчы. Тады ён заклінаў іх, каб не з'яўляліся ніколі, і з палёгкай уздыхаў.

Палагна чакала ў хаце. Агонь натомлена ляжаў у печы, ціха драмаў жарам, стравы спачывалі на сене, калядны спакой выплываў з цёмных куткоў, голад клікаў да ежы, але яны яшчэ не маглі сесці за стол. Палагна пазірала на мужа — і яны ў згодзе разам кленчылі, просячы Бога, каб дапусціў да вячэры тыя душы, якіх ніхто не ведае,— што пропадам прападаюць, на лясных работах забітыя, дарогамі пакалечаныя, водамі патопленыя. Ніхто іх не ўспомніць, ані ўстаючы, ані кладучыся, ніхто не згадае, дарогаю ідучы, а яны, бедныя душы, горка мардуюцца ў пекле, чакаючы куцці...

І калі так маліліся, Іван быў пэўны, што за плячыма ў яго плача, схіліўшыся, Марычка, а душы заўчасна памерлых нябачна садзяцца на лавы.

— Здзьмухні, перш чым садзіцца! — патрабавала ад Івана Палагна.

Гэта ён ведаў і без яе. Старанна здзьмухваў з лавы, каб не прыціснуць якую-небудзь душу, і садзіўся вячэраць... [...]

Так ішло жыццё скацiннае і чалавечае, зліваючыся разам, як дзве крыніцы ў гарах у адзін паток.

* * *

Заўтра вялікае свята. Цёплы Юрай адбірае ад халоднага Дзмітрыя ключы ад свету, каб цараваць над зямлёй. Поўныя воды, на якіх плавае зямля, паднімуць яе вышэй да сонца, Юрай уквеціць лясы і царынкі, авечка пачне абрастаць воўнай, як летам зямля травою, а сенажаці адпачнуць ад скаціны, зарастаючы густым зеллем. Заўтра — вясна, дзень радасці і сонца, а ўжо сёння горы цвітуць агнямі, і сіні дым захінае яліны празрыстым вэлюмам. А калі сонца знізілася, адцвілі агні і дымы адляцелі ў неба, радасным рыканнем абазвалася жывёла, перагнаная цераз жар, каб была дужая летам, як гэты агонь, каб множылася так, як намножыўся ад агню попел.

Позна ўлегліся перад Юр’ем людзі, хоць рана меліся ўставаць.

Палагна ўскруцілася, ледзь толькі пачало днець. «Ці яшчэ не рана?» — падумала ўголас, але тут жа згадала, што сёння свята і трэба ісці на царынку. Адкінула цёплую коўдру і ўстала на ногі. Іван яшчэ спаў, печ пазяхала ў кутку чорнаю пашчай, а пад ёю сумна трашчаў цвыркун. Палагна расшпіліла кашулю, скінула з сябе, пастаяла голая пасярод хаты і, баязліва азіраючыся на Івана, пайшла да дзвярэй. Скрыпнулі дзверы, і ранішні холад абвеяў цела. Горы яшчэ спалі. Спалі яшчэ яловыя лясы, нібы строгія манахі, спалі пашарэлыя за ноч царынкі і сівыя шпілі, што расплываліся ў тумане. Халодная імгла падымалася з даліны ды працягвала белыя калматыя лапы да чорных ялін, а пад бледным яшчэ небам апавядаў свой сон Чарамош.

Палагна ступала па мокрых травах і злёгку дрыжала ў ранішнім халадку. Яна была пэўная, што ніхто яе не пабачыць, а калі б і пабачыў, то што? Ведама, шкада, калі б прапала яе варажба. Іншай думкі ў яе не было. Яшчэ на Благавешчанне яна закапала ў мурашнік соль, булку

і пацеркі, і цяпер трэба было гэта ўсё адтуль дастаць. Памалу звыклася з холадам. Яе тугое цела, якое не ведала яшчэ мацярынства, вольна і горда плыло ў маладых травах царынкі, такое ружовае і свежае, як пазалочаная хмара, перапоўненая цёплым вясновым дажджом. Нарэшце спынілася пад букам. Але перш чым раскапаць мурашнік, яна падняла рукі ўгору і пацягнулася смачна ўсім целам, хруснуўшы костачкамі. І ўраз адчула, што траціць сілу. Штосьці ёй нядобра. Апусціла бяссільна рукі, глянула перад сабою і раптам як бы прыкіпела да чорнай агністай бездані, што не пускала яе ад сябе.

Юра-знахар стаяў па другі бок плота і глядзеў на яе.

Яна хацела крыкнуць на яго — і не магла. Хацела закрыць грудзі рукамі — і не мела сілы іх падняць. Намагалася ўцячы — і ўрасла ў зямлю. Стаяла бяссільная, быццам самлелая, і ўпарта ўглядалася ў два чорныя вугалькі, што выпівалі з яе ўсю сілу.

Нарэшце ў ёй варухнулася злосць. Прапала ўся варажба! Палагна зрабіла над сабой намаганне, каб распаліць тую злосць, і злосна гыркнула на яго:

— Чаго зенкі вылупіў? Не бачыў?

Не спускаючы з яе вачэй, якімі скаваў яе ўсю, Юра бліснуў зубамі:

— Такой, як вы, Палагна, дальбог, не бачыў.

І закінуў нагу цераз плот.

Яна бачыла добра, як плылі да яе тыя два вугалькі, што спапялілі яе волю, а ўсё ж стаяла, няздатная паварухнуцца ці то ў салодкім, ці то ў жахлівым чаканні.

Ён быў ужо блізка. Бачыла мярэжку яго кажушка-безрукаўкі... бліскучыя зубы ў пажадлівым роце... прыпаднятую руку. Цяпло яго цела зблізку вейнула на яе, а яна ўсё яшчэ стаяла.

І толькі калі жалезныя пальцы сціснулі ёй руку і пацягнулі да сябе, яна з крыкам ірванулася і пабегла да хаты.

Знахар стаяў, раздзімаючы ноздры, і глядзеў услед, як белае Палагніна цела выгіналася на травах, нібы хвалі ў Чарамошы. [...]

Палагна прыбегла дадому разгневаная. Добра, што хоць Іван нічога не бачыў. Ну і суседзік, халера б на цябе! Не

знайшоў лепшага часу!.. Каб табе... А што варажба прапала — дык ужо прапала... Вагалася, ці сказаць Івану пра Юру, ці не. Яшчэ бойка гатова з таго ўшчацца ці сварка, а са знахаром толькі зачапіся... [...]

Ужо са два тыдні мінула з таго часу, а Палагна не казала Івану пра сустрэчу з Юрам. Яна толькі прыглядалася да мужа. Штосьці было цяжкае ў ім, нейкая журба яго грызла і аслабляла цела, нешта старэчае, вадзяністае свяцілася ў яго стомленых вачах. Прыкметна худзеў, станавіўся абыякавым. Не, Юра лепшы. Калі б захацела мець палюбоўніка, узяла б Юру. Але Палагна была гордая, яе сілком не возьмеш. І гневалася на знахара. [...]

Аднак яе думка ўсё часцёй вярталася да яго. З цікавасцю, ахвотна прыслухоўвалася Палагна да расказаў пра яго моц і дзівілася, колькі ён можа, той палкі Юра, які не бачыў лепшай за Палагну! Ён быў магутны, моцны, усё ведаў. Ад яго слова гінула адразу скаціна, сох і чарнеў, як дым, чалавек, ён мог наслаць смерць і падараваць жыццё, разагнаць хмару і спыніць град, агнём чорнага вока спапяліць ворагаў і запаліць у жаночым сэрцы каханне. Ён быў зямным богам, той Юра, што прагнуў Палагны, што працягваў да яе рукі, у якіх трымае сусветныя сілы. [...]

Стаяў гарачы дзень. Ігрэц закурыўся, зямля паравала, ад Чарнагоры бесперастанку беглі хмары і выліваліся дажджамі, на якія збоку свяціла сонца. Так было парна, што Палагна нізашто не палезла б на вяршыню, калі б не прысніўся ёй сон, які прарочыў скаціне нядобрае. Яна хацела адведаць кароў у лесе. Вакол яе горы курыліся ў імгле, нібы закіпелі горныя патокі і дыхнулі парай. Чарамош знізу шумеў. Яму мулка было ляжаць на скалах, і ён пераскокваў з каменя на камень. Але толькі паспела Палагна ўзабрацца наверх, як ад Чарнагоры махнуў крылом вецер і захістаў дрэвы. «Не нарвала б буры»,— падумала яна і павярнулася тварам да ветру. Ну, так яно і ёсць... Там бурліла цяжкая сіне-бялёсая хмара. Здавалася, сама Чарнагора паднялася ў неба, гатовая спусціцца на зямлю і ўсё раздушыць. Вецер бег перад ёю і распіхваў елкі, а горы і даліны счарнелі адразу, як пасля пажару. Не было чаго і думаць ісці далей.

Палагна схавалася пад полагам елкі. Яліна скрыпела. Здалёку мякка каціўся гром, цені імкліва беглі па гарах, змываючы фарбы, а высокі ельнік на далёкіх вяршынях перагінаўся папалам. «Як бы яшчэ градам не секанула»,— лякалася Палагна, зашпільваючы аўчынную безрукаўку. [...] «Прападуць сенажаці, засыпле іх лёдам, і будзе плакаць галодная скаціна»,— думала горка. Але думка перарвалася: ударыў гром. Захісталіся горы, ельнікі ўпалі вяршынямі на зямлю, зямля паднялася, і ўсё закруцілася ў віхры. Палагна ледзь паспела ўхапіцца за сук і, быццам скрозь туман, убачыла раптам, як караскаўся на гару нейкі чалавек. Змагаўся з ветрам, раскірэчваў ногі, нібы рак, хапаўся рукамі за камень і ўсё лез уверх. Вось ён ужо блізка, сагнуўся, бяжыць — і нарэшце стаў на макаўцы гары. Палагна пазнала Юру.

— Напэўна, да мяне... — спалохалася Палагна, але Юра, відаць, яе не бачыў.

Стаў супраць хмары, адна нага ўперад, і склаў рукі на грудзях. Адкінуў назад бледны твар і ўпіўся пахмурым вокам у хмару. Стаяў так доўгую хвіліну, а хмара ішла на яго. І раптам моцным рухам ён шпурнуў капялюш на зямлю. Вецер тут жа здзьмуў яго ў даліну і падхапіў на галаве ў Юры доўгія валасы. Тады Юра падняў да хмары палку, што трымаў у руцэ, і крыкнуў у сіні клёкат:

— Стой! Я цябе не пускаю!..

Хмара падумала трохі і пусціла ў адказ сінюю стралу.

— Ой! — закрыла Палагна вочы рукою, калі рассыпаліся горы.

Але Юра гэтаксама моцна стаяў, і кучары віліся на галаве ў яго, як гадзіны ў гняздзе.

— Ага! Ты так! — крыкнуў Юра хмары.— Тады я мушу цябе заклінаць. Я заклінаю вас, грамы і грамавяняты, хмары і хмараняты, я разганяю цябе, непагадзь, на лясы і воды... Ідзі, разляціся, як вецер, па свеце... Разбіся і рассыпся, ты тут сілы не маеш...

Але хмара толькі матлянула зняважліва левым крылом і пачала паварочваць направа, на царынкі.

— Няшчасце! — сціснула рукі Палагна.— Начыста выб'е сенажаці...

Аднак Юра не думаў паддавацца. Ён толькі больш пабялеў, толькі вочы пацямнелі ў яго. Калі хмара направа — то і ён направа, хмара налева — і ён налева. Ён бегаў за ёю, змагаючыся з ветрам, махаў рукамі, пагражаў палкаю. Ён віўся, нібы ўюн, па гары, заварочваючы хмару, дужаўся з ёю, спрачаўся... Вось-вось яшчэ трошкі, яшчэ з гэтага канца... Адчуваў у грудзях сілу, пускаў перуны з вачэй, падымаў рукі ўгору і заклінаў. Вецер расхрыстаў яго безрукаўку і біў у грудзі, хмара гыркала, ляскала громам, секла ў вочы дажджом, дрогкала над галавою, гатовая ўпасці, а ён, залíты потам, ледзьве пераводзячы дых, кідаўся без памяці па вяршыні, баючыся страціць апошнія сілы. Адчуваў, што сілы ўжо слабнуць, што ў грудзях пуста, што вецер ірве голас, дождж залівае вочы, хмара перамагае, і ўжо апошнім намаганнем падняў да неба палку:

— Стой!..

І хмара раптам спынілася. Падняла здзіўлена край, абаперлася, як конь на заднія ногі, заклекатала ўнутраным гневам, адчаем бяссілля і ўжо прасіла:

— Пусці! Дзе я падзенуся?

— Не пушчу!

— Пусці, бо гінем! — малілі жаласна душы, згінаючыся пад цяжарам перапоўненых градам мяшкоў.

— Ага! Цяпер ты просіш!.. Я цябе заклінаю: ідзі ў невядомасць, у прорву, куды коні не даржуць, каровы не дарыкаюць, авечкі не дабляюць, вораны не даляцяць, дзе хрысціянскага голасу не чуваць... Тады адпускаю цябе...

І дзіўная рэч — хмара скарылася, пакорліва павярнула налева і развязала мяшкі над ракою, засыпаючы густым градам жвірысты бераг. Белая заслона закрыла горы, а ў глыбокай даліне штосьці клекатала, ламалася і глуха шумела.

Юра ўпаў на зямлю і цяжка дыхаў.

А калі сонца прадрала хмару і мокрыя травы ўраз усміхнуліся, Юра нібы ў сне ўбачыў, што да яго бяжыць Палагна. Яна ззяла ўся прыветна, як сонца, калі нагнулася над ім з клопатным пытаннем:

— Ці з табой, Юрачка, не сталася чаго ліхога?

— Нічога, любая Палагначка, нічога... Сюды! Я адагнаў буру...

І працягнуў рукі да яе...

Так Палагна стала Юравай палюбоўніцай.

* * *

[...] Усе гаварылі пра Палагну і Юру, чуў і Іван, але ўспрымаў усё абыякава. Знахар дык знахар. Палагна цвіла і весялілася, а Іван нудзіўся і сох, трацячы сілу. Ён сам здзіўляўся з той перамены. Што сталася з ім? Сілы пакідалі яго, вочы, нейкія разгубленыя і вадзяністыя, глыбока запалі, жыццё страціла смак. Нават жывёла не давала колішняй уцехі. Ці яму падрабілі што, ці хто ўрок? Не меў да Палагны жалю, нават крыўды не чуў у сэрцы, хоць біўся за яе з Юрам.

Не са злосці, а для прыліку, калі людзі звялі. Калі б не Сямён, яго пабрацім, што заступіўся за Івана, можа б, нічога і не было. А то, сустрэўшыся аднаго разу ў карчме, Сямён садануў Юру ў твар.

— Ах ты, гультай, ты што да Палагны прыстаеш, не маеш сваёй жонкі?

Тады Івану сорамна стала. Ён скочыў да Юры.

— Глядзі за сваёй Гафіяй, а маёй не руш! — і замахаў тапарком у Юры перад самым носам.

— Ты купіў яе на рынку? — ускіпеў Юра.

Яго тапарок таксама мільгаў перад Іванавымі вачыма.

— Каб цябе пранцы паелі!..

— Бандзіта кавалак!

— На, бяры заробленае!

Іван выцяў першы, проста ў лоб. Але Юра, умываючыся крывёй, паспеў сekануць Івана паміж вачэй. Аслеплі абодва ад хвалі гарачай крыві, што залівала ім вочы, а ўсё ж красалі тапарком аб тапарок, усё цэлілі адзін аднаму ў грудзі. Яны танцавалі смяротны танец, гэтыя чырвоныя маскі, з якіх паравала гарачая кроў. У Юры была ўжо скалечаная рука, але ўдалым ударам ён раптам зламаў папалам Іванаў тапарок. Іван сагнуўся, чакаючы смерці, ды Юра на бягу

ўгаманіў сваю лютасць і прыгожым, велічным рухам адкінуў убок свой тапарок.

— На безаружнага з тапарком не іду!..

Тады яны схапіліся загрудкі.

Іх ледзь разбаранілі.

Ну што ж, Іван абмыў свае раны, пафарбаваўшы Чарамош крывёй, дый пайшоў да авечак. Там знайшоў свой спачынак і ўцеху.

Аднак бойка не памагла. Усё асталося, як і было. Гэтаксама Палагна не трымалася хаты, гэтаксама марнеў Іван. Асталіся ад яго скура ды косці, вочы запалі яшчэ глыбей, яго трэсла ліхаманка, ён стаў раздражнёны і неспакойны. Ён нават страціў ахвоту да ежы.

«Не інакш як знахарскія штучкі,— горка думаў Іван,— на маё жыццё замахнуўся, хоча са свету звесці, дык і сушыць...»

Ён хадзіў да варажбіткі, тая адварожвала — не памагло: відаць, знахар мацнейшы.

Іван нават упэўніўся ў гэтым. Праходзячы неяк паўз Юраву хату, ён пачуў Палагнін голас. Няўжо яна? Яму заняло дыханне.

Прыціснуўшы сэрца рукою, Іван прыклаў вуха да брамы. Не памыліўся. Там была Палагна. Шукаючы дзіркі, каб зазірнуць у двор, Іван ціха пасоўваўся ўздоўж паркана. Нарэшце яму ўдалося знайсці нейкую шчыліну ў плоце, і ён убачыў Палагну і знахара. Юра, сагнуўшыся, трымаў перад Палагнаю гліняную лялька і тыцкаў пальцамі ў яе ад ног да галавы.

— Забіваю калок тут,— шаптаў злавесна,— і сохнуць рукі і ногі. У жывот — мучыцца жыватом, не можа есці...

— А калі б у галаву забіў? — з цікаўнасцю пыталася Палагна.

— Тады гіне ў той жа момант...

Гэта ж яны на яго змаўляліся!..

Усведамленне гэтага туманам шыбанула Івану ў галаву. Вось каб пераскочыць цераз плот і абязвечыць абаіх на месцы! Іван сціснуў рукою тапарок, змераў вачыма паркан, але раптам звяў. Бяссілле і абыякавасць зноў абнялі ўсё яго цела. Нашто? Дзеля чаго? Так ужо, напэўна, яму суджана

на вяку. Яму адразу стала холадна, ён бездапаможна апусціў тапарок і пасунуўся далей. Ішоў апустошаны, не чуючы зямлі пад нагамі, не бачачы сцежкі. Чырвоныя кругі лятаі ў яго перад вачыма і расплываліся па гарах.

Куды ён ішоў? Не мог нават прыгадаць. Бязмэтна блукаў, узлазіў на горы, спускаўся і паднімаўся, куды ногі неслі. Нарэшце ўбачыў, што сядзіць над ракою. Яна клекатала і шумела ў яго пад нагамі, гэтая зялёная кроў зялёных гор, а ён углядаўся бяздумна ў яе быстрыню. Нарэшце ў ягоператомленым мозгу засвяцілася першая думка: гэтаю мясцінаю ішла калісьці Марычка. Тут яе забрала вада. Тады ўжо ўспаміны самі пачалі выплываць адзін за адным, напаўняць парожнія грудзі. Ён зноў бачыў Марычку, яе мілы тварык, яе прастату і шчырую ласкавасць, чуў яе голас, яе каламыйкі... «Мяне ўспомні, мой міленькі, хоць разок адзіны, [redacted] цябе прыгадаю сем раз на гадзіну...» [...]

Жаль абнімаў Іванава сэрца, душа тужыла па нечым лепшым, хоць і невядомым, імкнулася ў іншы, лепшы свет, дзе можна б спачыць.

А калі надышла ноч і чорныя горы заміргалі святлом самотных паселішчаў, як пачвары злымі вачыма, Іван адчуў, што варожыя сілы мацнейшыя за яго, што ён ужо зламаны ў барацьбе.

* * *

Іван прахапіўся.

— Уставай,— будзіла яго Марычка.— Уставай, і хадзем.

Ён глянуў на яе і ані не здзівіўся. Добра, што Марычка нарэшце прыйшла.

Устаў і пайшоў з ёю.

Яны моўчкі падымаліся на гару, і, хоць была ўжо ноч, Іван выразна бачыў яе аблічча. Пералезлі цераз жэрдкі, што адгароджвалі царынку ад лесу, і ўвайшлі ў густы ельнік.

— Чаго ты так змарнеў? Ці не захварэў? — загаварыла Марычка.

— Па табе, любая Марычка... па табе тужыў... — Не пытаўся, куды ідуць. Яму было так добра з ёю. [...]

Яна прыгадала яму ўсе іхнія дзіцячыя забавы, халодныя купанні ў ручаях, жарты і песні, страхі і пацехі, гарачыя абдымкі і мукі ростані. Усе тыя мілыя дробязі, якія грэлі ім сэрца.

— Чаму ты так доўга не вяртаўся з паланіны, Іванка? Што так доўга там рабіў?

Іванку карцела ёй расказаць, як голасам Марычкі клікала яго ў паланіны лясная русалка, але ён абмінуў той успамін. Свядомасць яго двaілася. Адчуваў, што каля яго Марычка, і ведаў, што Марычкі няма на свеце, што гэта нехта іншы вядзе яго ў бездань, на дзікія вяршыні, каб там загубіць. Аднак жа яму было добра, ён ішоў за яе смехам, за яе дзявочым шчабятаннем, не баючыся нічога, лёгкі і шчаслівы, як і некалі.

Усе ягоныя клопаты і турботы, страх смерці, Палагна, варожы знахар — усё кудысьці знікла, усё адляцела, нібы ніколі нічога такога і не было. Бесклапотная маладосць і радасць зноў вадзілі яго па гэтых бязлюдных вяршынях, такіх мёртвых і самотных, што нават лясны шэпт не мог утрымацца там і сплываў у даліну шумам патокаў. [...]

Яны ішлі далей і далей, забіраліся ў халодную і непрыветную глыбіню лясістых вяршынь.

Прыйшлі на палянку. Тут было трохі святлей, яліны быццам замкнулі за сабою чарнату глыбокай ночы.

Раптам Марычка ўздрыганулася і стала. Выцягнула шыю і прыслухалася. Іван заўважыў, як трывога слізганула па яе твары, звяла яе бровы. Што сталася? Але Марычка нецярпліва спыніла яго пытанне, паклала палец на губы, каб маўчаў, і тут жа знікла. Усё сталася так неспадзеўна і дзіўна, што Іван не паспеў апамятацца. [...]

Іван затрывожыўся. Хацеў шукаць Марычку, але не ведаў, у які бок ісці, бо не прыкмеціў, куды яна знікла. Яшчэ гатова заблудзіцца дзе-небудзь у лесе або сарвацца ў прорву. Ці не раскласці вогнішча? Убачыць агонь і будзе ведаць, куды вярнуцца.

Іван накідаў сухога галля і падпаліў. Агонь патрашчаў крыху спадыспаду і пагнаў дым. А калі дым замітусіўся над агнём, загойсалі цені каструбаватых ялін і ажывілі палянку.

Іван сеў на пянёк і агледзеўся. Уся паляна была завалена трухлявымі пнямі, калючаю сеткаю вострых сукоў, між якіх шчаміўся дзікі маліннік. Ніжнія яловыя лапкі, тонкія і пасохлыя, звісалі долу, як рудая барада.

Туга зноў ахапіла Івана. Ён зноў быў адзін. Марычка не ішла. Закурыў люльку і ўглядаўся ў агонь, каб хоць чым-небудзь скараціць чаканне. Мусіла ж нарэшце прыйсці Марычка! Яму нават здавалася, што ён чуе яе хаду і трэск галінак пад нагамі. О! Нарэшце яна... Хацеў устаць і пайсці ёй насустрач, але не паспеў.

Сухое голле рассунулася ціха, і з лесу выйшаў нейкі чалавек.

Ён быў неадзеты. Мяккае цёмнае валоссе ўкрывала ўсё яго цела, акаймоўвала круглыя і добрыя вочы, заклінівалася на барадзе і звісала на грудзях. Ён склаў на вялікім жываце зарослыя рукі і падышоў да Івана.

Тады Іван адразу яго пазнаў. Гэта быў вясёлы чугайстыр, добры лясны дух, што бароніць людзей ад мавак. Ён быў смерцю для іх: зловіць і раздзярэ.

Чугайстыр дабрадушна ўсміхнуўся, хітравата падміргнуў і папытаў у Івана:

— Куды пабегла?

— Хто?

— Маўка.

«Гэта ён пра Марычку,— са страхам падумаў Іван, і сэрца моцна затахкала ў яго ў грудзях.— Вось чаму яна знікла...»

— Не ведаю... Не бачыў,— абыякава адказаў Іван і запрасіў чугайстра: — Сядайце.

Чугайстыр сеў на пянёк, атрос з сябе сухое лісце і выцягнуў ногі да агню.

Абодва маўчалі. Лясны чалавек грэўся каля вогнішча ды расціраў сабе круглы жывот, а Іван натужна думаў, якім бы чынам даўжэй затрымаць чугайстра, каб Марычка як найдалей магла ўцячы.

Але чугайстыр сам памог. Падміргнуў Івану хітраватым вокам і абазваўся:

— Можа б, мы трошкі разам патанцавалі?

— А чаму б і не? — радасна ўсхапіўся Іван.

Падкінуў у вогнішча ялінніку, зірнуў на пасталы, абцягнуў на сабе кашулю і стаў да танца.

Чугайстыр узяўся ў бокі і ўжо пагойдваўся:

— Ну, пачынай!..

Што ж, як пачынаць, дык пачынаць.

Іван тупнуў на месцы, выкінуў нагу, страпянуўся ўсім целам і паплыў у лёгкім гуцульскім танцы. Перад ім смешна выдыгаў чугайстыр. Ён прыжмурваў вочы, пацмокваў языком, трос жыватом, а яго ногі, аброслыя, як у мядзведзя, нязграбна тупалі на адным месцы, згіналіся і разгіналіся, як тоўстыя абады. [...]

— Я яшчэ сыграю танец,— падбадзёрваў ён чугайстра і выхапіў флаяру з-за пояса.— Ты яшчэ такога не чуў, нябожа...

Ён зайграў песню, якую падслухаў у лесе ў зніча: «Ёсць мае козы!.. Ёсць мае козы!..» — і чугайстыр, ажыўлены гукамі песні, зноў вышэй падкідаў пяты, заплюшчваў ад задавальнення вочы і нібы забыўся на стому.

Цяпер Марычка магла быць спакойная.

«Уцякай, Марычка... не бойся, любая... твой вораг танцуе»,— спявала флаяра. [...]

Нарэшце чугайстыр ціха хіхікнуў:

— Ну і наскакаўся я сёння...

Пагладзіў задаволена круглы жывот, пакрактаў, разгладзіў на грудзях валоссе і пачаў развітвацца:

— Вялікі дзякуй за танец!..

— Пайдзі здаровы!

— Аставайся здаровы!

Рассунуў сухое яловае голле і нырнуў у лес.

Палянку зноў абступілі змрок і цішыня. Дагараючы, вогнішча лыпала ў цемры адзінокім чырвоным вокам.

Але дзе ж Марычка?

Іван меў шмат чаго ёй расказаць. Ён адчуваў патрэбу расказаць ёй пра ўсё сваё жыццё, пра сваю тугу па ёй, бязрадасныя дні, сваю самотнасць сярод ворагаў, нешчаслівую жаніцьбу... Але дзе ж яна? Куды падалася? Можа, налева? [...]

Раптам да яго вуха даляцела ціхенькае, ледзь улоўнае дыханне:

— Івась!..

Голас ішоў ззаду, аднекуль з глыбіні, быццам прабіваўся скрозь мора ігліцы.

Значыць, Марычка была не тут.

Трэба было вяртацца назад. Іван спяшаўся, стукаўся каленямі аб елкі, адхіляў рукамі галінкі і жмурыў вочы, каб не напароцца на хвою. Ноч нібыта чаплялася яму за ногі і не пускала, а ён валок яе за сабою і распіхваў грудзьмі. Блукаў ужо доўга, а не знаходзіў палянкі. Цяпер зямля ў яго пад нагамі пачала спускацца ў даліну. Вялікія камяні перагароджвалі яму шлях. Ён іх абыходзіў, коўзаючыся па слізкім моху, спатыкаючыся на цупкіх каранях, прытрымліваючыся за траву, каб не сарвацца.

І зноў з цясніны, у яго з-пад ног, дайшоў да яго слабенькі покліч, заглушаны лесам:

— Іва-ась!..

Ён ужо забыўся пра асцярожнасць. Скакаў па камянях, як горны казёл, ледзьве ловячы паветра адкрытым ротам, калечыў рукі і ногі, прыпадаў грудзьмі да вострай скалы, траціў часамі грунт пад нагамі і скрозь гарачы туман жадання, у якім скочваўся ў даліну, чуў толькі, як яго прыспешвае дарагі голас:

— Іва-ась!..

— Я тут! — крыкнуў Іван і адчуў раптам, што яго цягне бяздонне. Ухапіла за шыю, перагнула назад. Хапаў рукамі паветра, лавіў нагою камень, ёю ж адарваны, і чуў, што ляціць уніз, поўны халадку і дзіўнай пустаты ў целе. Чорная цяжкая гара развінула крылы ялін і ўмомант, як птах, пырхнула над ім у неба, а вострая смяртэльная цікаўнасць апякла мозг: аб што стукнецца галава? Пачуў яшчэ трэск касцей, востры нясцерпны боль, што спаралізаваў цела,— і ўсё расплылося ў чырвоным агні, у якім згарэла яго жыццё...

На другі дзень знайшлі пастухі ледзь жывога Івана.

* * *

Сумна апавяшчала трэмбіта гарам пра смерць. [...]

Жоўты Іванаў твар спакойна ляжаў на палатне, затаіўшы ў сабе штосьці толькі яму вядомае, а правае вока хітравата

глядзела з-пад узнятага крыху павека на кучку медных грошай, на складзеныя рукі, у якіх гарэла свечка.

У галавах ціха, нябачна спачывала душа: яна яшчэ не магла вылецець з хаты. Палагна звярталася да яе, да той самотнай мужавай душачкі, што сіратліва гарнулася да нерухомага цела.

— Чаму не загаворыш да мяне, не паглядзіш, не загоіш рану на маім сэрцы? А ў якую дарожку выбіраешся, мой голубе, адкуль жа цябе выглядаць? — галасіла Палагна, і грубы яе голас зрываўся на жаласных нотах.

— Файна галосіць... — ківалі галовамі старыя суседкі і чулі ў адказ уздыханні, што расплываліся ў шуме людскіх галасоў. [...]

— Ты пайшоў, а мяне адну-аднюсенькую пакінуў... З кім жа я буду цяпер жыці, з кім жа буду скацінку дагляда-ці?..— пыталася ў мужавай душы Палагна.

У адчыненыя дзверы, проста з цёмнай ночы, ступалі ў хату ўсё новыя госці. Згіналіся перад целам калені, звінелі медныя грошы на грудзях у Івана, і пасоўваліся на лавах людзі, каб даць месца новым.

Тоўстыя свечкі паціху раставалі, аплываючы воскам, нібыта слязамі, бледнае полымя лізала ўдушлівае паветра, і сіні чад, змяшаўшыся з нудным пахам воску і выпарэннямі цел, вісеў над глухім гоманам у хаце. [...] А хата ўсё напаўнялася новымі гасцямі, якія ўжо тоўпіліся каля парога.

Цела псавалася. Бледныя плямы, як лішаі, паўзлі па ім ледзь прыкметным ценем.

— Мужычок ты мой родненькі, а на каго ты мяне пакінуў... — жалілася Палагна.— Не будзе каму ні ў горад пайсці, ні прынесці, ні даць, ні ўзяць, ні прывезці...

А за акном апавяшчала пра тое самае трэмбіта, дадаючы ёй жалю.

Ці не багата ўжо суму мела бедная душа?

Такая думка, відаць, таілася пад цяжарам гнятлівага смутку, бо ад парога пачынаўся ўжо рух. Яшчэ нясмела тупацелі ногі, піхаліся локці, грукаў часам услон, галасы рваліся і мяшаліся ў глухім гомане натоўпу. І вось раптам высокі жаночы смех востра рассек цяжкае покрыва суму, і

стрыманы гоман, нібы агонь, выбухнуў з-пад шапкі чорнага дыму.

— Гэй ты, насаты, купі ў мяне зайца! — басіў з сярэдзіны малады голас, і ў адказ яму пакаціўся прыдушаны смех:

— Ха-ха! Насаты!..

— Не хачу!

Пачыналася забава.

Тыя, што сядзелі бліжэй да дзвярэй, адвярнуліся ад цела, гатовыя далучыцца да гульні. Вясёлая ўсмешка разгладзіла ім твары, хвіліну перад тым зведзеныя ў смутку, а заяц пераходзіў усё далей і далей, захопліваў шырэйшае і шырэйшае кола і ўжо дабіраўся ажно да нябожчыка.

— Ха-ха, гарбаты!.. Ха-ха, кульгавы!..

Святло хісталася ад смеху і чадзіла дымам.

Адзін за адным госці ўставалі з лавак і разыходзіліся па кутках, дзе было весела і цесна.

На твары ў нябожчыка ўсё разрасталіся плямы, нібы затоеныя думкі варушылі яго, бесперастанку мяняючы выраз. У паднятым куточку губ як быццам застыла горкае меркаванне: што наша жыццё? Як бляск на небе, як чарэшневы цвет...

У сенцах ля дзвярэй цалаваліся.

— А каго выбіраеш?

— Аннычку чарнявую.

Аннычка нібыта не хацела і ўпіралася, але дзесяткі рук выпіхалі яе з цеснага гурту, і гарачыя вусны паддавалі ахвоты:

— Ідзі, дзеўчынка, ідзі...

І Аннычка абнімала за шыю таго, хто яе выбраў, і смачна цалавала ў губы пры агульных радасных крыках.

Пра цела забыліся. Толькі тры бабулі засталіся пры ім і з тугою глядзелі шклянымі вачыма, як па жоўтым застылым твары лазіла муха. [...]

Палагна не галасіла болей. Ужо было позна, і трэба было прыняць гасцей.

Весялосць усё распалялася. Рабілася душна, людзі парыліся ў аўчынных безрукаўках, дыхалі потам, нудным чадам цёплага воску і пахам трупа, што ўжо псаваўся. Усе

гаварылі ўголас, нібы забыліся, чаго яны тут, расказвалі пра свае прыгоды і рагаталі. Махалі рукамі, ляпалі адзін аднаму па спіне і падміргвалі жанкам.

Тыя, што не памесціліся ў хаце, расклалі на падворку вогнішча і спраўлялі вакол яго вясёлае ігрышча. У сенцах патушылі святло, дзеўкі дзіка пішчалі, а хлопцы душыліся ад смеху. Забава трэсла сценамі хаты, біла хвалямі крыкаў у спакойнае ложа мерцвяка. [...]

Туга скручаны ручнік, мокры і доўгі, з лопатам хадзіў па спінах направа і налева. Ад яго ўцякалі з рогатам і крыкам, узнімаючы пыл і псуючы паветра. Падлога дрыжала ў хаце пад цяжарам маладых ног, і скакала на лаве цела, трасучы жоўтым тварам, на якім усё яшчэ блукала загадкавая ўсмешка смерці.

На грудзях ціха пазвоньвалі медныя грошы, скінутыя добрымі душамі на перавоз.

Пад вокнамі галасілі трэмбіты.

1911

ЛЕСЯ УКРАІНКА
(1871—1913)

Леся Украінка (сапр. Ларыса Пятроўна Касач) нарадзілася ў горадзе Наваград-Валынскі (цяпер Житомірская вобласць) у слаўтай сям'і. Бацька быў вядомы грамадскі дзеяч, маці праславілася як пісьменніца (пад псеўданімам Алена Пчылка), родны дзядзька — Міхайла Драгаманаў — здабыў еўрапейскую вядомасць як змагар за вольную дэмакратычную Украіну. Яго палымяныя выступленні ў друку спрыялі станаўленню і беларускай рэвалюцыйнай публіцыстыкі.

Цяжкая хвароба (касцявы туберкулёз) з дзяцінства падточвала арганізм Лесі. Не могучы хадзіць у школу, яна самастойна набыла сапраўды энцыклапедычныя веды па гісторыі, мастацтве, еўрапейскай і сусветнай літаратуры, вывучыла каля дзесятка моў. Змагаючыся [redacted] хваробай, Леся Украінка вымушана была выязджаць на лячэнне ў Крым, на Каўказ, у Заходнюю Еўропу. Гэта, у сваю чаргу, пашырыла кругагляд пісьменніцы, прынесла ёй новыя тэмы, ідэі, вобразы, дало магчымасць глыбей пазнаць свет і чалавека ў свеце. Менавіта ў Крыме ў 1897 г. яна пазнаёмілася [redacted] мінскім сацыял-дэмакратам, адным з удзельнікаў падрыхтоўкі Першага з'езда РСДРП у Мінску Сяргеем Мяржынскім. Агульнасць грамадскіх і эстэтычных ідэалаў спрыяла іхняму сяброўству, якое перарасло ў каханне. Мяржынскі клапаціўся пра пастаноўку п'есы Лесі Украінкі «Блакітная ружа» ў Мінскім драматычным тэатры, дапамог ёй надрукаваць некаторыя творы ў Пецярбургу (часопіс «Жизнь», 1900—1901).

Лёс гэтых надзвычай прыгожых і чыстых адносін аказаўся трагічным: Мяржынскі быў невылечна хворы на туберкулёз. Леся Украінка чатыры разы прыязджала ў Мінск. Тут яна напісала паэму «Апантаная» і шэраг іншых твораў. Вершы, прысвечаныя Мяржынскаму, з'яўляюцца лепшымі ўзорамі інтымнай лірыкі паэтэсы. Да іх належыць і твор «Гавораць вусны: «Ён навек загінуў!»...». Апошні раз Леся Украінка прабыла ў Мінску каля ложка паміраючага каханага са студзеня па сакавік 1901 г. На руках яе ён і памёр, яна яго і пахавала на былых Старажоўскіх могілках. Іменамі Лесі Украінкі і Сяргея Мяржынскага ў сталіцы

эларусі названы дзве асобныя вуліцы. На доме па вуліцы Куйышава, дзе калісьці стаяла хата Мяржынскага, у гонар пісьменіцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Рана абудзіліся ў Лесі творчыя здольнасці. Першы верш яна апісала ў дзевяцігадовым узросце, а ўжо ў 1884 г. яе вершы ылі надрукаваны ў часопісе «Зоря». Дыяпазон пісьменніцкага навуковага таленту Лесі Украінкі надзвычай шырокі. Яна паэт драматург, крытык і публіцыст, гісторык і тэарэтык літарауры, фальклярыст і перакладчык. А яшчэ і палымяны ідэйны магар-рэвалюцыянер, грамадскі дзеяч, актыўны прапагандыст краінскай культуры. На магутны падвой уласнай нацыянальай літаратуры Леся Украінка прышчэплівала найлепшыя гатункі іншаземных культур. Распрацоўваючы тэматыку антычнасці, пісьменніца так выкарыстоўвала класічныя вобразы, сюжэты, матывы, каб на чужых прыкладах можна было абудзіць у суайчыннікаў грамадзянскую актыўнасць, патрыятызм, мужнасць, маральную высакароднасць. Гэта дае падставы гаварыць пра Лесю Украінку як пра выдатнага майстра разгорнутых алегорый. Найбольш поўна інтэлектуальны накірунак яе творчасці выявіўся ў драматычных паэмах «Апантаная» (1901), «У катакомбах» (1905), «Касандра», «Оргія» (1913). Арыгінальнае філасофскае напаўненне атрымаў пад яе пяром і сусветнавядомы вобраз Дон Жуана — у драме «Каменны гаспадар» (1912). Дарэчы, гэтая драма ў 1980-я гг. з поспехам ішла на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Асобнае месца ў творчай спадчыне Лесі Украінкі займае вершаваная драма «Лясная песня» (1911). У гэтым творы пісьменніца выкарыстоўвае блізкі ёй з дзяцінства валынскі фальклор. Зварот да нацыянальнай міфалогіі, а менавіта да палескага фальклору, у гэты ж час здзяйсняе і наш Максім Багдановіч (цыкл «У зачараваным царстве»). Фантастычна-казачны сюжэт, наяўнасць фальклорна-міфалагічных персанажаў, шырокія пейзажныя малюнкі і адухаўленне прыроды, асаблівы лірызм — усё гэта дазваляе ахарактарызаваць твор як драму-феерыю. Аднак этнаграфічны матэрыял Леся Украінка напаўняе выключна актуальнымі для грамадства праблемамі, падаючы іх не дэкларатыўна, а інтэлектуальна шматгранна і канцэптуальна. Праз вобраз Лукаша пісьменніца паглыбляецца ў філасофскае асэнсаванне праблемы мастацтва, прызначэння мастака. Вобраз Маўкі раскрывае сілу сапраўднага кахання, якое нароўні з мастацтвам творыць цуды, дае чалавеку душу. Дзякуючы галоўным дзейным асобам твора, Маўцы і Лукашу, а таксама Дзядзьку Льву і Лесавіку, аўтар праводзіць думку пра неабходнасць гарманічнага яднання чалавека і прыроды. Разам з тым Леся Украінка ўсім ідэйна-

мастацкім напаўненнем твора нібыта папярэджвае, што нежаданне спасцігнуць сваё прызначэнне ў свеце, неразуменне прыгажосці і мастацтва могуць прывесці грамадства да бездухоўнасці, да пагібелі. Гэтая трывога за чалавека робіць п'есу пісьменніцы актуальнай і ў нашы дні. «Лясная песня» ці не найлепш раскрывае сутнасць характару самой Лесі Украінкі, для якой галоўнымі былі не знешнія праявы гераізму, не гучнасць подзвігу, а ўнутраная сіла духу, чысціня памкненняў, непахіснасць, самаахвярнасць.

На прыкладзе «Лясной песні» падкрэслім, што наватарская сутнасць творчасці пісьменніцы праяўляецца і на ўзроўні сэнсу, і ў паэтыцы. У кантэксце тагачаснай паэзіі выклікае безумоўную цікавасць культура яе верша. Белы, рыфмаваны, страфічны, астрафічны, танічны, свабодны, рытмічна разняволены класічны верш — усё гэта працуе на такую ступень знітаванасці зместу і формы, якая дазволіла літаратуразнаўцам (М. Рыльскі) драмуфеерыю «Лясная песня» ўпісаць у дыяментавы вянец творчасці Лесі Украінкі.

Пакутуючы ад хваробы, перанёсшы некалькі складанейшых аперацый, Леся Украінка непахісна імкнулася змагацца з асабістым болем праз адданасць грамадскім справам. Асноўнай сваёй зброяй паэтэса абрала пісьменніцкае пяро. Многія радкі з вершаў паэтэсы гучаць настолькі афарыстычна, што ўвайшлі ў культуру народа як своеасаблівыя прымаўкі. Вера Лесі Украінкі ў лепшую будучыню роднага народа выявілася, у прыватнасці, у вершы, назва якога таксама гучыць афарыстычна,— «Світальныя агні». Закладзены ў загалоўку вобраз успрымаецца як сімвал, як прадвеснік лепшых часоў. Жаданне знаходзіцца ў радах змагароў за народную волю выразна праступае ў вершы «Слова, чаму ты не сталь баявая...». Дэвізам усяго жыцця пісьменніцы стала яе крылатая фраза: Contra spem spero! — Без надзеі спадзяюся!

На Украіне за паэтэсай замацавалася вымоўнае імя — дачка Праметэя. «Ці не адзіны мужчына на ўсю сучасную саборную Украіну» — гэтак ахарактарызаваў пісьменніцу Іван Франко. Шчыры прыхільнік творчасці Лесі Украінкі беларус Уладзімір Караткевіч прысвяціў знакамітай Лесі цікавае эсэ «Saxifraga», у якім супаставіў пісьменніцу з гэтай горнай раслінай, назва якой перакладаецца як кветка-ламікамень. Да вобраза Лесі Украінкі не раз у сваіх творах звярталіся беларускія пісьменнікі (С. Грахоўскі, Хв. Жычка, В. Коўтун, Е. Лось і інш.). Алюзіяй на літаратурнае імя паэтэсы з'явіўся псеўданім беларускай паэтэсы-патрыёткі Лесі Беларускі. Творы Лесі Украінкі неаднойчы выдаваліся ў Беларусі. Сярод перакладчыкаў Лесі Украінкі на бе-

ларускую мову варта назваць А. Вялюгіна, Ю. Гаўрука, Н. Гілевіча, С. Грахоўскага, Хв. Жычку, В. Жуковіча, В. Стралко, В. Рагойшу і інш.

Для дадзенай публікацыі выкарыстаны выданні:

Украінка Леся. Вершы і паэмы. Мінск: Дзяржвыд БССР, 1957 (вершы пераклалі: «Світальныя агні» — Сяргей Дзяргай, «Слова, чаму ты не сталь баявая...», «Надпіс на руіне» — Канстанцін Цітоў, «Гаворацць вусны: «Ён навек загінуў!»...» — Мікола Аўрамчык, «Мара, будзь вернай!» — Юрка Гаўрук, «Песні пра волю» — Алесь Астапенка).

Кацюбінскі Міхайла. Цені забытых продкаў: Аповесць, апавяданні; Украінка Леся. Лясная песня: Драма-феерыя, вершы. Мінск: Юнацтва, 1996 («Лясную песню» пераклаў Вячаслаў Рагойша).

Світальныя агні

Ноч цёмная люд спрацаваны прыкрыла,
Пад чорным крылом прытуліла,
Ўсяму загадала: засні!
Вячэрнія згаслі агні,
Ўсіх ночка ўладарна скарыла.

Хто спіць, хто не спіць, а скарыся злой сіле.
Шчаслівы, хто сон бачыць мілы!
Адна я не сплю давідна,
Наўкола, скрозь цемра адна,
Наўкола ўсё спіць, бы ў магіле.

Раскінула цёмная ноч свае чары,
Нахлынулі сны, нібы хмары;
Як чорныя мары страшныя,
Мне сняцца такія дзіўныя
Няпэўныя здані, пачвары.

Душу маю прывіды злыя змарылі,
Паўстаць жа не мела я сілы...
І раптам світальны прамень
Прабіўся праз жудасны цень —
Світання агні засвяцілі.

Агні тыя дня перамогу прарочаць,
Знікае ў іх цемра той ночы;
Хоць сонца праменні йшчэ спяць,—
Світання агні ўжо гараць,
Агні запаліў люд рабочы.

Устань, хто жывы, ў каго думка паўстала!
Гадзіна для працы настала!
Не бойся дасветнай імглы,—
Світання агні запалалі,
Калі йшчэ зара не зайграла.

За вокнамі — светлая сцежачка. Днее.
Надзея у сэрцы квітнее.
Агні залатыя мігцяць,
Вясёлкі праменнем зіхцяць
І клічуць: за працу, з надзеяй!

1892

* * *

Слова, чаму ты не сталь баявая,
Што сярод бітвы іскрыцца і ззяе?
Слова, чаму ты не ярасны меч,
Што голаў здымае варожую з плеч?

Ты, мая шчырая, мужная мова,
Я цябе выхапіць з ножнаў гатова,
Толькі ж ты кроў з майго сэрца пральеш,
Ворага ж сэрца клінком не праб'еш.

Вывастру зброю сваю баявую,
Колькі умельства і сілы знайду я,
Потым яе начаплю на сцяне,
Іншым на ўцеху, на горачка мне.

Слова, мая ты адзіная зброя,
Мы не загінем абодва з табою!
Можа, ў руках невядомых братоў
Узнімешся мечам на катаў-паноў.

Бразне клінок аб жалеза кайданаў,
Водгулле грымне ў цвярдынях тыранаў,

Стрэнецца з бразгатам мечаў другіх,
З гукам размоў не турэмных — жывых.

Мсціўцы падхопяць тады маю зброю,
Кінуцца з ёю адважна да бою...
Зброя мая, паслужы змагарам
Лепш, чымсьці служыш ты хворым рукам!

25.XI.1896

* * *

Гавораць вусны: «Ён навек загінуў!»
А сэрца кажа: «Не, ён не пакінуў!»
Ты чуеш, як струна звініць і плача?
Дрыжыць-звініць слязінаю гарачай
Тут, унутры, і б'ецца ў лад са мною:
«Я тут, заўжды я тут, я ўсё з табою!»

Заўжды так, ці хачу забыць у песнях мукі,
Ці хто сціскае мне пяшчотна рукі,
Ці любая размова з кім вядзецца,
Ці ў сэрцы пацалунак адзавецца —
Струна звініць, як рэха, нада мною:
«Я тут, заўжды я тут, я ўсё з табою!»

Ці апушчуся ў бездань тайных мараў,
Дзе ўсё мільгаюць светлыя пачвары
І здані змрочныя, што робяць чары,
Аж апаноўваюць душу кашмары,—
Мне голас твой звініць, пяе з журбою:
«Я тут, заўжды я тут, я ўсё з табою!»

Ці раптам сон заплюшчыць на імгненне
Мне вочы, стомленыя летуценнем,
Я чую і праз цяжкі сон, як кліча
Знаёмы голас любага аблічча,
Звініць тужліва з дзіўнаю журбою:
«Я тут, заўжды я тут, я ўсё з табою!»

І кожны раз, як зазвініць ён з ласкай,
Дрыжаць у маім сэрцы тыя краскі,
Што ты не здолеў за жыццё сарваці,
Што не хацеў ты у труну схаваці,
Дрыжаць і вымаўляюць ў лад са мною:
«Цябе няма, але я ўсё з табою!»

Кімполунг, 7.VI.1901

Мара, будзь вернай!

Мара, будзь вернай! Я ж так без цябе гаравала!
Столькі бязрадасных дзён, столькі бяссонных начэй...
Ты адна ў мяне, я з табою адной сябравала,
Асвятляй жа мой шлях, разгарайся ярчэй!

Мара, будзь вернай! О, як я люблю твае чары,
Вобразаў рой дарагіх, сэрцам абуджаны гук!
Нас цяпер не разлучаць жахлівыя, чорныя хмары,
Я з табой не баюся ні смерці, ні мук.

Мара, хацела б я шчасця хоць трошкі пабачыць.
Толькі жыццё ў мяне ёсць,— што ж, і яго забірай!
Час прабіў, я выходжу на бой, каб свой лёс перайначыць,
Каб пракласці дарогу ў нязведаны край.

Толькі — жыццё за жыццё! Будзь заўсёды жывою!
Слова, як меч, навастры,— траціць не варта надзей.
Хто адрокся ўсяго і спаліў караблі за сабою,
Не памрэ, не здабыўшы дабра для людзей.

Мара, арол мой, так сумна мне сёння чагосьці,—
Дай жа мне крылы свае, сэрца маё загартуй!
Мне патрэбна вясна, мне патрэбен агонь маладосці,
А калі разаб'юся — даруй мне, даруй!

3.VIII.1905

Надпіс на руіне

«Я, цар цароў, я, сонца сын магутны,
Сабе грабніцу гэту збудаваў,
Каб славілі мяне заўжды народы,
Каб помнілі на ўсе вякі патомкі
Імя...» А далей круг і збіты надпіс.
І ўжо ніхто з нашчадкаў наймудрэйшых
Імя цара цароў не прачытае.
Хто збіў той надпіс — ці які ўладар,
Ці, можа, час сваёй рукой цяжкою,—
Нам невядома. Дзіўнай вяззю
Шмат розных слоў напісана наўкола
Пра славу безыменнага цара,
Малюнкі адлюстроўваюць учынкі
Яго. Вунь ён высока на прастоле,
Пакораныя да яго народы
Нясуць дары і нізка хіляць чолы.
А ён сядзіць, нібы каменны ідал,
Пад апахаламі з барвовых пер'яў.
Ягоны твар падобны да Тутмоса,
І да Рамзеса, і да ўсіх тыранаў.
А вунь далей, за валасы схапіўшы
Адразу цэлы гурт паўстанцаў нейкіх,
Узняў над імі люты меч крывавы,
І твар яго падобны да Тара́ка,
Да Мэнефта́, як і да ўсіх тыранаў.
З тым самым тварам ён ільвоў палюе,
Левіяфанаў[1] ловіць, птушак б'е
І едзе полем праз людскія трупы,
І банкетуе па сваіх гарэмах,
І гоніць на вайну сваіх падданых,
І з ім людзей зганяе на работу —
На тую на страшэнную работу,
Што мае ўславіць царскае імя.

---

[1] *Левіяфан* — легендарная марская пачвара.

Ідзе той люд, як хвалі ў акіяне,
Ідзе на бой натоўпам незлічоным
І трыумфальны шлях свайму ўладыку
Гарачаю крывёй шырока сцеле
І сцелецца пад ногі коням царскім.
А хто жывым застаўся з таго люду,
Той гіне на егіпецкай рабоце.
І хоча цар зрабіць з яго магілы
Славуты помнік свой — хай гіне раб!
І раб зямлю капае, чэша камень,
Прыносіць глей з ракі і лепіць цэглу,
Муры узводзіць, статуі ствapae,
Запрогшыся, ён штосьці возіць, ставіць,
І велічнае штосьці ён будуе,
Непараўнальнае па прыгажосці,
З малюнкамі, мярэжкамі, разьбою,
І кожная мярэжка і малюнак,
Калона, статуя і нават цэгла
Нябачанымі вуснамі гавораць:
«Мяне стварыў егіпецкі народ!
І тым навекі сваё імя ўславіў».

Даўно няма таго цара-тырана,
Застаўся толькі круг ды збіты надпіс.
Спявак, не мар! Вучоны, не шукай,
Хто быў той цар, імя насіў якое!
З яго магілы ўжо стварыла доля
Народу помнік,— хай загіне цар!

Зялёны Гай, 28.VIII.1904

Песні пра волю

Вось яны крочаць. Сцяг іх палае,
Быццам агонь. Мужна ідзе, наступае
Шэры натоўп. Многа смелых людзей,
«Песня пра волю» ірвецца з грудзей.

«Смела, сябры!» Але песня рыдае.
«Смела, сябры!» Як на смерць заклікае.
Страшна, які безнадзейны той спеў.
Хто ж пад яго наступаць бы умёў?

Не, не пра волю той спеў. Пра няволю
Плача, сумуе і тужыць да болю
Голас, зусім раўнадушны да слоў,
Плач пахавальны раздаўся ізноў.

«Смела, сябры!» То ў турму ці на страту
Гэтак вось смела натхняе брат брата,
Плача бяззбройны над братам-байцом,
Нібы ў зямлю зарывае жыўцом.

Лепей маўчы, калі іншай не маеш
Песні: напэўна ты духам згасаеш
Ці паніхідам настаў ужо час,
Як воля пад сцягі сабрала ўсіх нас!

Ведаю спеў той! Ён быццам атрута.
Бедныя душы, ў кайданы закуты,
Спеў той стварылі. Ён змалку нам горкі,
Нам, што раслі пад паўночнаю зоркай.

Мы нарадзіліся ў злую хвіліну,
Выйшлі у шлях прадсвітальнай гадзінай.
Чулі напеў гэты кожнай парой,
Ён нам казаў: не сустрэцца з зарой!

Што да таго вам, народжаным раннем?
Лепш праспяваць бы тут песню кахання,
Волі і юнай і буйнай сваёй,
Рана спяваць паніхіду па ёй.

Хай расцвіце ваша доля, як рута,
Бо не патрэбна вам песня-атрута.
Досыць: мы сыты песняй такой,
Вы ж захапляйцеся песняй другой.

Новаю песняй, каб сонейкам ззяла,
Каб так, як полымя, вечна шугала,
Каб разам з песняй чырвоны наш сцяг
Цуды тварыў на прасторах жыцця!

Коладзяжнае, 1.XII.1905

Лясная песня

Драма-феерыя ў 3 дзеях

(Скарочана)

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

ДЗЕЯ 1

Дзядзька Леў
Лукаш
Русалка
Лесавік
Маўка
Пералеснік
Трасца (без слоў)
Пацярчаты
Куц

ДЗЕЯ 2

Лукашова маці
Лукаш
Дзядзька Леў
Маўка
Русалка Палявая
Кіліна
Русалка
«Той, што ў скале сядзіць»
Пералеснік

ДЗЕЯ 3

Маўка
Лесавік
Куц
Злыдні
Лукашова маці
Кіліна
Хлопчык
Лукаш
Кілініны дзеці (без мовы)
Доля
Пералеснік

ДЗЕЯ 1

Старэчы, густы, дрымучы лес на Валыні. Сярод лесу — прасторная паляна з плакучаю бярозаю і старым магутным дубам. Паляна па краях пераходзіць у куп'ё і чараты, а ў адным месцы ў ярка-зялёную дрыгву — гэта берагі ляснога возера, што ўтварылася з лясной крыніцы. Крыніца тая выбягае з лясной гушчэчы, упадае ў возера, потым, з другога боку возера, зноў выцякае і губляецца ў хмызняку. Само возера ціхаводнае, пакрытае раскаю і лотаццю, але з чыстым плёсам пасярэдзіне.

Мясціна ўся дзікая, таямнічая, але не панурая,— поўная задуменнай палескай красы. [...]

Узлессе ўсё роўна як закрыта пяшчотнай зялёнай вуаллю, дзе-нідзе ўжо і вершаліны дрэваў пацягнуты зялёнаю фарбаю. Возера стаіць поўнае, у зялёных берагах, як у руцвяным вянку.

З лесу на паляну выходзяць Дзядзька Леў і яго пляменнік Лукаш. Леў ужо стары чалавек, паважны і дужа добры з выгляду; па-палеску доўгія валасы белымі хвалямі спадаюць на плечы з-пад сівой ваўнянай шапкі-рагаткі; апрануты Леў у палатнянае адзенне і ў светла-шэрую, амаль белую світку; на нагах пасталы, у руках клоўня (малая рыбацкая сетка), каля пояса на папружцы сцізорык, цераз плячо — сплецены з лыку кашэль на шырокім рэмені.

Лукаш — вельмі малады хлопец, прыгожы, чарнабровы, стройны, у вачах яшчэ нешта дзіцячае; апрануты таксама ў палатнянае адзенне, толькі з танчэйшага палатна; кашуля навыпуск, мярэжаная беллю, з адкладным каўняром, падпяразаная чырвоным поясам, каля каўняра і на манжэтах — чырвоныя засцежкі; світкі ён не мае; на галаве брыль; на поясе сцізорык на матузку і конаўка з лыку.

Дайшоўшы да берага возера, Лукаш спыніўся.

Леў

Чаго ж ты прыпыніўся? Тут нам нельга
дайсці да рыбы. Іліста і гразка.

Лукаш

Ды я хацеў бы выразаць жалейку —
чарот на гэта тут у самы раз.

Леў

Жалеек тых даліха ты ўжо маеш!

Лукаш

Ну, колькі ж іх? — з вярбы, каліны
ды з ліпы — вось і ўсё! А трэба

зрабіць яшчэ з чароту, бо яна
найлепей грае.

Л е ў

Ат, пазабаўляйся,
на тое свята Бог даў. Заўтра ж прыйдзем
хаціну ставіць тут. Бо час ужо
скаціну выганяць у лес. Вунь бачыш,
як навакол трава зазелянела?

Л у к а ш

Няўжо на гэтым месцы мы асядзем?
Мясціна, кажуць людзі, тут ліхая...

Л е ў

Як для каго. Я ведаю, нябожа,
каля чаго і як з чым абысціся:
дзе крыж паставіць, дзе ўвагнаць асіну,
дзе проста тройчы плюнуць, ды і годзе.
Пасеем ля хаціны мак-відук,
пасля пасадзім цёран ля парога
і не дамо злой сіле падступіцца.
Ну, я пайду, а ты сабе як хочаш.

Расходзяцца. Л у к а ш ідзе да возера і знікае ў чароце. Л е ў ідзе па беразе і пастунова знікае за вербамі.

Р у с а л к а
(выплывае на бераг і крычыць)

Дзядуля! Лесавік! Бяда! Ратуйце!

Л е с а в і к
(малы, барадаты дзядок, рухавы, з сур'ёзным выглядам; у рудой вопратцы колеру кары, у валахатай шапцы з куніцы)

Чаго табе? Чаго крычыш?

Р у с а л к а

Там хлопец
чарот на дудкі рэжа!

Лесавік

А-я-ёй!
Каб той бяды! Якая ты скупая!
Вось тут хаціну будуць будаваць —
я й то не бараню, абы не секлі
сырое дрэва.

Русалка

Ёечкі! хаціну?!
Дык людзі ж будуць тут?! Ой, тыя людзі
з-пад саламяных стрэх! Я не цярплю іх!
Саломеннага духу не трываю!
Я іх таплю, каб вымыць у вадзе
той ненавісны дух. Заласкачу
тых набрыдзяў насмерць!

Лесавік

Не гарачыся!
Бо Дзядзька Леў паселіцца ў хаціне,
а ён нам сябар. Гэта жартам ён
асінаю ды цёрнам нас пужае...
Люблю старога. Бо калі б не ён,
даўно, даўно ўжо гэты дуб сканаў бы,
што столькі бачыў нашых сходак, танцаў
і лесавых вялікіх таямніцаў.
Яго ўжо немцы мералі, наўкола
утрох пасталі, ўзяўшыся за рукі —
і ледзьве абнялі. Давалі грошы,
ды Дзядзька Леў запрысягнуў жыццём,
што дуб не дасць нікому спілаваць.
Тады ж і я на бараду пакляўся,
што Дзядзька Леў і ўся яго радня
век не сустрэнуць крыўды ў гэтым лесе.

Русалка

Ого! А бацька мой ўсе роўна іх патопіць!

Лесавік

Няхай не мерыцца! Бо завалю
я возера да дна апалым лісцем!

Русалка

Ой, ліханька, як страшна! Ха-ха-ха!
(Знікае ў возеры.)

Лесавік нешта бурчыць, закурваючы люльку, потым сядае на калоду. З чаротаў выплывае ціхі голас жалейкі — мілагучны, пералівісты. І па меры таго як ён ажыўляецца, ажывае ўсё ў лесе. Спачатку на вярбе і вольхах задрыжэлі завушніцы, затым бяроза лісцем залепятала. На возеры распусціліся белыя лілеі і пазалацелі кветкі лотаці. Шыпшына паказала далікатныя бутоны.

З-за камля старой, напалову ўсохлай, расшчэпленай вярбы выходзіць Маўка, у светла-зялёным адзенні ■ распушчанымі чорнымі, з зялёным адлівам косамі, распраўляе рукі і праводзіць далонню па вачах.

Маўка

Ой, як я доўга спала!

Лесавік

Доўга, дочка!
Ледзь сон-трава не адцвіла зусім.
Вось-вось зязюля маселка саб'е,
чырвоныя пантофелькі абуе
і распачне лічыць гадочкі людцам.
Папрыляталі з выраю ўжо госці:
вунь жоўтыя пушынкі-качаняткі
на чыстым плёсе бавяцца гульнёй.

Маўка

А хто мяне збудзіў?

Лесавік

Відаць, вясна.

Маўка

Вясна яшчэ ніколі не спявала
так, як цяпер. Ці гэта, можа, сон?

Лукаш зноў іграе.

Не... чуеш? Во! Няўжо вясна спявае?

Лукаш іграе тую самую мелодыю, толькі ўжо бліжай.

Лесавік

Не, гэта хлопец грае на жалейцы.

Маўка

Які хлапец? Мо «Той, што грэблі рве»?
Вось не чакала ад яго такога!

Лесавік

Ён чалавек, пляменнік Дзядзькі Льва,
Лукаш завецца.

Маўка

Я яго не знаю.

Лесавік

Бо ён упершыню тут. Нетутэйшы,
здалёку сам, аж з тых бароў сасновых,
дзе наша баба зімаваць так любіць;
асірацеў ён з маці-удавою,
дык Дзядзька Леў прытулак даў абоім...

Маўка

Хацела б паглядзець я на яго.

Лесавік

Нашто табе ён?

Маўка

Пэўна, ён прыгожы!

Л е с а в і к

Ты на хлапцоў людскіх не заглядайся.
Лясным дзяўчатам гэта небяспечна...

М а ў к а

Які ж, аднак, дзядуля, стаў ты строгі!
Няўжо мяне ты так трымаць уздумаў,
як Вадзянік Русалку?

Л е с а в і к

Не, дзіцятка,
цябе я не трымаю. Гэта той,
як толькі можа, у дрыгву гнілую
жывое ўсё засмоктвае. А я
звык волю шанаваць. Гуляй з вятрыскам,
пабаўся з Пералеснікам. А хочаш,
то сілы вод, лясоў, паветра, гораў
прываблівай к сабе і прычароўвай,
але старонься сцежак чалавечых,
бо там не ходзіць воля — там журба
цяжар свой носіць. Абмінай іх, доня:
раз толькі ступіш — і прапала воля!

М а ў к а
(смяецца)

Ну як жа так, каб воля — ды прапала?
Так некалі і вецер прападзе!

Лесавік хоча штосьці адказаць, але выходзіць Л у к а ш з жалейкай.
Лесавік і Маўка хаваюцца.
Лукаш хоча надрэзаць нажом бярозу, каб спусціць сок. Маўка кідаецца і хапае яго за руку.

М а ў к а

Не руш! не руш! не рэж! не забівай!

Л у к а ш

Ды што ты, дзеўчына? Ці ж я разбойнік?
Я толькі захацеў пакаштаваць
бярозавіку.

Маўка

Гэта ж кроў яе!
Не пі, не пі крыві маёй сястрыцы!

Лукаш

Бярозу ты сястрою называеш?
Хто ж ты такая?

Маўка

Я — лясная Маўка.

Лукаш
*(не так здзіўлена,
як уважліва прыглядаецца да яе)*

А, вось ты хто! Я ад старых людзей
не раз пра мавак чуў, але ад роду
яшчэ не бачыў.

Маўка

А хацеў бы ўбачыць?

Лукаш

Чаму б і не ?.. А ты зусім такая,
нібы дзяўчына... не, хутчэй, як панна,
і рукі белыя, і стройная надзіва,
і неяк так убрана не па-наску...
Адно — вачэй зялёных я не бачу.
(Прыглядаецца.)
Ды не, цяпер зялёныя... былі ж
як неба сіняе... О! пацямнелі
як тая хмара... чорныя цяпер
ці карыя... Ты дзіўная усё ж!

Маўка
(усміхаючыся)

Ці даспадобы я табе?

Л у к а ш
(саромеючыся)

Не знаю...

М а ў к а
(смеючыся)

Хто ж ведае?

Л у к а ш
(зусім прысаромлены)

Пра гэта не пытаюць...

М а ў к а
(шчыра здзівіўшыся)

Чаму ж пра гэта запытаць не можна?
Вунь пра сябе пытаецца шыпшына:
«Ну, як дзяўчына?»
А зверху ясень веццем ёйківае:
«Лепш не бывае!»

Л у к а ш

Я і не знаў, што так яны гавораць.
Нямое дрэва, думаў я, дый годзе.

М а ў к а

Нямога ў лесе ў нас няма нічога.

Л у к а ш

Няўжо ўвесь час ты ўсё сядзіш у лесе?

М а ў к а

З яго я не выходзіла ад роду.

Л у к а ш
На свеце ты даўно жывеш?

Маўка

Прызнацца,
ніколі я не думала пра гэта...
(Задумваецца.)
Здаецца мне, што я жыла заўсёды...

Лукаш

І ўсё была такая, як цяпер?

Маўка

Здаецца, што такая...

Лукаш

Хто ж твой род?
Ці ты яго зусім не знаеш?

Маўка

Знаю.
Ёсць Лесавік. Заву яго дзядуля,
а ён мяне дачушка або доня.

Лукаш

То хто ж ён — дзед ці бацька?

Маўка

Я не знаю.
Ці не ўсё роўна?

Лукаш
(смяецца)

Дзіва, ды і годзе,
з вас, лесавых! А хто ж табе тут маці,
ці бабка, ці ўжо як у вас завуць?

Маўка

Здаецца мне, што тая вунь вярба,
суxенькая, старая,— мая мама;

яна мяне зімою прытуліла
і мяккім лісцейкам сама заслала
маю пасцельку.

Л у к а ш

Там і зімавала?
А што ж ты там рабіла ўсю зіму?

М а ў к а

Нічога. Спала. Хто ж зімой што робіць?
Спіць возера, спяць дрэвы і чарот.
Вярба парыпвала: «Засні, засні...»
І сніла сны я, белыя ўсё сны:
на срэбры ззялі самацветаў горы,
бялелі травы, кветкі. Ціха зоры,
прыветлівыя, белыя, спадалі
і азаралі белізною далі.
Святочна, бела, чыста і ўрачыста
было навокал. Яркія маністы
гарэлі скрозь — і блізка і далёка.
Я спала. Грудзі дыхалі так лёгка!
Ружовай ніццю у тых белых снах
узор свой ткалі мроі. Ні вясна,
ні лета мрояў не саткуць такіх —
спакойных і блакітна-залатых...

Л у к а ш
(заслухаўшыся)

Як ты гаворыш...

М а ў к а

Праўда, даспадобы?

Лукаш сцвярджальна ківае галавою.

Лепш за маю — тваёй жалейкі мова.
Пагойдаюся я, а ты зайграй.

Маўка сплятае доўгае вецце бярозы, сядае ў яго і гойдаецца ціха, нібы ў калысцы. Лукаш іграе, прысланіўшыся да дуба і не зводзячы вачэй з Маўкі. Лукаш іграе веснянкі. Маўка, слухаючы, міжволі адклікаецца на той самы голас.

Маўка

Як соладка грае,
глыбока сягае,
расцінае белы грудзі, сэрцайка вымае!

На голас вяснянкі адгукаецца зязюля, потым салавейка, ярчэй расцвітае шыпшына, бялее цвет каліны, плод сарамліва ружавее, нават чорны бязлісты цёрн паказвае пяшчотныя кветкі.
Маўка, зачараваная, ціха гойдаецца, усміхаецца, а ў вачах нейкая туга ледзь не да слёз; Лукаш, заўважыўшы гэта, перастае іграць.

Лукаш

Ты плачаш, дзеўчына?

Маўка

Хіба я плачу?
(Праводзіць рукою па вачах.)
Дапраўды... Не! — вячэрняя раса...
Заходзіць сонца... Бач, ужо ўстае
на возеры туман...

Лукаш

Не, яшчэ рана!

Маўка

Ты б не хацеў, каб скончыўся ўжо дзень?

Лукаш ківае галавою, што не хацеў бы.

Чаму?

Лукаш

Бо дзядзька пазавуць у вёску.

М а ў к а

А ты пабыць са мною хочаш?

Лукаш ківае сцвярджальна галавою.

Бачыш,
і ты нібы той ясень размаўляеш.

Л у к а ш
(смеючыся)

Ды трэба ж па-тутэйшаму навучыцца,
бо летаваць я буду тут.

М а ў к а
(радасна)

Папраўдзе?

Л у к а ш

Мы заўтра тут пачнём і будавацца.

М а ў к а

Шалаш паставіце?

Л у к а ш

Відаць, халупу,
а можа, нават хату.

М а ў к а

Вы — як птушкі,
будуеце, будуеце гняздо,
каб потым кінуць.

Л у к а ш

Не, будуюць людзі
навекі.

Маўка

Як навекі? Ты ж казаў,
што толькі тут пралетаваць павінны.

Лукаш
(ніякавата)

Ды... я не знаю... Дзядзька Леў казалі,
што мне дадуць тут і зямлю і хату,
бо хочуць ажаніць мяне увосень...

Маўка
(з трывогаю)

З кім?

Лукаш

Я не знаю. Дзядзька не казалі,
а мо й не напыталі яшчэ дзеўкі.

Маўка

Хіба ты пáры сам не дабярэш?

Лукаш
(пазіраючы на яе)

Я, можа б, і дабраў, ды...

Маўка

Што?

Лукаш

Нічога...
*(Найгравае на жалейцы нешта
дужа жаласнае, потым апускае руку
з жалейкай і задумваецца.)*

Маўка
(памаўчаўшы)

Ці у людзей паруюцца надоўга?

Лукаш

Ды ўжо навек!

Маўка

Нібыта галубы...
Я часам ім зайздрошчу: так пяшчотна
кахаюцца яны... А я не знаю
нічыйнай ласкі, акрамя бярозы,
якую я сястрыцай называю;
ды толькі надта смутная яна
і бледная, усё аб нечым тужыць —
без слёзаў глянуць на яе не ў стане.
А вольхі не люблю — такой шурпатай!
Асіна нешта ўсё мяне пужае
ды і сама баіцца — ўсё трымціць.
Дубы паважаныя. А вось шыпшына
задзірыстая, гэткая, як цёран.
Клён, ясень, явар гонару не просяць.
Каліна так мілуецца сабою,
што нічагуткі навакол не бачыць.
Такой і я была, здаецца, летась,
успомніць сёння гэта нават прыкра...
Калі разважыць шчыра, то я ў лесе
самотная зусім...
(Тужліва задумваецца.)

Лукаш

Ну, а вярба?
Нядаўна ты яе матуляй звала.

Маўка

Вярба?.. Ды што ж... у ёй зімою добра,
а летам... бачыш, высахла яна,
і ўсё рыпіць, нагадвае зіму...
Не, я самотная зусім, зусім...

Лукаш

Хіба ж у лесе гэтым толькі дрэвы,—
у ім жа ёсць багата розных сілаў.

(Крыху з'едліва.)
Не трэба прыбядняцца, бо й мы чулі
пра вашы танцы, жарты і залёты!

Маўка

Ат, гэта ўсё такое, нібы віхар —
закружыць, патармосіць ды пакіне.
У нас не так, як у людзей,— навекі!

Лукаш
(падступаючыся бліжэй)

А ты б хацела?..

Раптам чуецца голаснае гуканне Дзядзькі Льва.

Голас

Гэй, Лукаш! Гоў, гоў!
Го-го-го-го! Ты дзе?

Лукаш
(адгукаецца)

Я тут, іду!

Голас

Ідзі хутчэй!

Лукаш

Ды што за нецярплячка!
(Адклікаецца.)
Іду, іду ўжо!
(Намерваецца ісці.)

Маўка

Вернешся?

Лукаш

Не знаю.
(Ідзе ў прыбярэжны хмызняк.) [...]

У лесе грае чырвоны захад сонца, потым гасне. Над возерам устае белы туман.

Дзядзька Леў і Лукаш выходзяць на паляну.

Леў
(зласліва бурчыць)

Пракляты Вадзянік! Бадай ты спрах!
Я рыбы налавіў, і толькі выплыў
на плёсы душагубкаю й хацеў
на той бок перабрацца,— калі ён
за днішча лапай цупкаю ўхапіўся,
што ані руш! Траха — і затапіў бы!
Дый я не дурань, ухапіў рукою
за бараду і наматаў, як смычку,
ды ножычак з-за пояса,— дальбог,
так і адцяў бы! Ды аднекуль пара —
штурхель! — і перакінула чаўнок!
Я ледзьве выбраўся жывым на бераг
і рыбу разгубіў... А каб ты скіс!
(Да Лукаша.)
А тут цябе яшчэ ўсё ліха носіць,—
крычу, гукаю, клічу — хоць бы што!
І дзе ты дзеўся?

Лукаш

Я ўвесь час быў тутка,
жалейку выразаў.

Леў

Ты нешта доўга,
пляменнічак, жалейкі выразаеш!

Лукаш
(ніякавата)

Хіба ж я, дзядзька...

Леў
(усміхнуўся і падабрэў)

Эх! Маніць вучыцца
не гожа, не да твару ў тваім веку!

Вось лепей пашукай галля у лесе
ды распалі агонь,— хоць абсушуся,
бо як яно такім ісці дадому?
Яшчэ і тая возьме нападзе —
не тутка спамінаючы — цьфу-цьфу! —
ды стане з цела вытрасаць душу...

Лукаш ідзе ў лес; неўзабаве чуваць, як ён трашчыць сухімі сукамі.

*(Сядае пад дубам на тоўсты корань
і спрабуе выкрасаць агонь,
каб прыкурыць люльку.)*
Нягож! Тут выкрашыш! І губка змокла...
І трут згубіўся... Каб жа на цябе
ліхая трасца!.. Ці не нарасла
на дубе свежая?
(Абмацвае дуб, шукаючы губку.)

З возера, з туману, праступае белая жаночая постаць, больш падобная да паласы туману, чым да чалавека; прасцёртыя доўгія белыя рукі заграбаста варушаць тонкімі пальцамі, калі яна набліжаецца да Льва.

(Спалохаўшыся.)
Ой, што за відма?
Ага, ўжо знаю! Добра, што пабачыў!..
*(Асвойтаўшыся, дастае з кашаля нейкія
карэньчыкі і зелле і працягвае насустрач
здані, быццам баронячыся ад яе. Яна трохі
адступае. Ён шэпча, замаўляючы, штораз
шпарчэй.)*
Шыпля-дзявіца,
Трасца-Трасавіца!
Ідзі сабе на куп'ё, на балоты,
дзе людзі не ходзяць, пеўні не спяваюць,
куды мой голас не даходзіць.
Тут табе не хадзіць,
белага цела не сушыць,
жоўтых касцей не ламаць,

чорнай крыві не співаць,
веку не ўкарачаць.
Вось табе палын —
згінь, згінь, згінь!
Амін!

Здань падаецца назад да возера і зліваецца з туманам. Прыходзіць Лукаш з бярэмем галля, кладзе перад дзядзькам, дастае з-за пазухі крэсіва і губку і распальвае агонь.

Лукаш

Вось наце, дзядзька, грэйцеся.

Леў

От дзякуй!
От угадзіў свайму старому дзядзьку!
(Прыкурвае ад агню люльку.)
Цяпер зусім інакш!
(Кладзецца насупраць агню на траве,
падклаўшы кашэль пад галаву,
пыхкае люлькаю і жмурыцца ад вогнішча. [...]
Змаўкае, зможаны сном.) [...]

Лукаш нейкі час глядзіць задуменна на агонь, потым устае, адыходзіць далей ад вогнішча, прахаджваецца па паляне, ціха-ціхенька, ледзь чутна іграе на жалейцы.
У лесе вечарэе, але цемра не густая, а прызрыстая, як бывае перад узыходам месяца. Вакол вогнішча водбліскі святла, і звівы ценю ўсё роўна як водзяць хімерны танец; блізкія да агню кветкі то паблісквають колерамі, то гаснуць у цемры. На ўскрайку лесу бялеюць таемна камлі асінаў і бярозаў. Вясновы вецер нецярпліва ўздыхае, абабягаючы ўзлессе і расхінаючы голле плакучай бярозы. Туман на возеры белымі хвалямі наплывае на чорныя хмызы; чарот перашэптваецца з асакою, схаваўшыся ў імгле. З гушчару выбягае Маўка. Бяжыць хутка, быццам уцякаючы; валасы яе развеяліся, адзенне расхрыстана. На паляне яна спыняецца, азіраючыся, прыкладае рукі да сэрца, потым кідаецца да бярозы і яшчэ раз спыняецца.

Маўка

Шчыры дзякуй табе, ночка-
чараўнічанька,
што прыкрыла мяне ты ад ліханька!

І вам, сцежачкі, і вам, зорачкі,
што вялі мяне да бярозачкі!
Ой, схавай мяне ты, сястрычанька!
(Хаваецца пад бярозу, абдымаючы яе камель.)

Л у к а ш
(падыходзіць да бярозы, ціха)

Ты, Маўка?

М а ў к а
(яшчэ цішэй)

Я.

Л у к а ш

Ты бегла?

М а ў к а

Як вавёрка.

Л у к а ш

Ты ўцякала?

М а ў к а

Так.

Л у к а ш

А ад каго ж?

М а ў к а

А ад такога, нібы сам агонь.

Л у к а ш

Дык дзе ж ён?

М а ў к а

Тсс?.. Бо зноўку прыляціць.

Маўчанне.

Л у к а ш

Як ты дрыжыш! Я чую, як бяроза
уздрыгвае і лісцем шапаціць.

М а ў к а
(адхіляецца ад бярозы)

Ой, ліха! Я баюся прытуліцца,
а так не ўстою.

Л у к а ш

Да мяне туліся.
Я дужы, калі што — абараню.

Маўка прытульваецца да яго. Яны стаяць разам. Месячнае святло пачынае хадзіць па лесе, сцелецца па паляне і пракрадваецца пад бярозу. Лес напаўняецца салаўінымі спевамі і ўсімі галасамі вясновай ночы. Вецер парывіста ўздыхае. З празрыстага туману выходзіць Р у с а л к а і цішком назірае за маладой парай.
Лукаш, тулячы да сябе Маўку, усё бліжэй нахіляецца да яе і раптам цалуе.

М а ў к а
(ускрыквае з болем шчасця)

Ой!.. Зорка ў сэрца ўпала!

Р у с а л к а

Ха-ха-ха!
(Са смехам і ўсплёскам кідаецца ў возера.)

Л у к а ш
(жахнуўшыся)

Што гэта?

М а ў к а

Не палохайся,— Русалка.
Сяброўкі мы, яна нас не зачэпіць.

Яна свавольніца, пакпіць умее,
ды мне ўсё роўна... мне ўсё роўна зараз
усё на свеце!

Л у к а ш

Я таксама?

М а ў к а

Не,
ты сам мой свет цяпер наймілы, лепшы,
чым той, што знала я дасюль, дый той —
як заручыліся — пахарашэў.

Л у к а ш

Мы заручыліся?

М а ў к а

А ты не чуеш,
як салаўі вясельным спевам звоняць?

Л у к а ш

Я чую... І яны ўжо не шчабечуць,
не цёхкаюць, як колісь, а спяваюць:
«Цалуй! цалуй! цалуй!»
(Цалуе яе доўгім, пяшчотным,
трапяткім пацалункам.)
Я зацалую
цябе насмерць!

Усхадзіўся вецер, белы цвет мяцеліцаю кружыцца па паляне.

М а ў к а

Я не магу памерці...
а шкода...

Л у к а ш

Што ты кажаш? Не хачу я!
Нашто сказаў я гэта?!

М а ў к а

Не, так добра —
памерці хутка, нібы знічка...

Л у к а ш

Годзе!
(Гаворыць, пястуючы.)
Не гавары! Я не хачу такога!
Не гавары нічога!.. Не, кажы!
Гаворыш дзіўна ты ўсё, але неяк
так добра слухаць... Ну, чаго ж маўчыш?
Разгневалася?

М а ў к а

Слухаю цябе...
тваё каханне...
(Бярэ ў рукі ягоную галаву,
паварочвае насупраць месяца
і ўважліва глядзіць у вочы.)

Л у к а ш

Што ты так? Аж страшна,
як ты ў душу вачыма заглядаеш...
Я не магу так! Гавары, жартуй,
пытай мяне, кажы, што любіш, смейся...

М а ў к а

Твой голас чысты, нібыта крыніца,
а вочы — непразрыстыя.

Л у к а ш

Мо месяц
няярка свеціць?

М а ў к а

Можа...
(Нахіляе галаву да яго сэрца і замірае.)

Лукаш

Ты самлела?

Маўка

Тсс!.. Хай гаворыць сэрца... Невыразна
яно гаворыць, як вясною ночка.

Лукаш

Нашто так прыслухоўвацца? Не варта!

Маўка

Не варта, кажаш? То не трэба, мілы!
Не трэба, любы! Я не буду, родны,
не стану прыслухоўвацца, харошы!
Я буду пеставаць цябе, каханы!
Пяшчоты любіш ты?

Лукаш

Я не любіўся
яшчэ ні з кім. Не ведаў я дасюль
такіх салодкіх любашчаў!

Маўка лашчыць яго, ён ускрыквае з мукаю ўцехі.

О Маўка!
Душу з мяне дастанеш!

Маўка

І дастану!
Вазьму тваю пявучую душу,
а сэрца словамі заваражу...
Вусны твае зацалую прыгожыя,
каб заяснеліся,
каб загарэліся,
быццам бы кветачкі цёмна-ружовыя!
Я буду вабіць блакітныя вочы,
хай яны граюць,
хай яны ззяюць,
яркім агнём палымнеюць і ўночы!

(Раптам пляскае ў ладкі.)
Ды чым жа я прываблю вочы ўночы?
Дасюль жа я не ўквечана!

Лукаш

Дарма!
Красуня ты й без кветак.

Маўка

Не, мой любы,
я кветкамі ўпрыгожуся і стану
не горш лясной царэўны.
(Бяжыць на другі бок паляны,
далей ад возера,
да квітнеючых кустоў.)

Лукаш

Пачакай!
Сам кветкі я ўпляту.
(Ідзе да яе.)

Маўка
(сумна)

Уночы кветкі
знепрыгажэлі... бо паснулі фарбы...

Лукаш

Тут светлячкі ў траве, я назбіраю,
яны засвецяцца ў цябе у косах,
дый будзе нібы зоркавы вянок.
(Кладзе некалькі светлячкоў ёй
на валасы.)
Дай палюбуюся... Краса якая!
(Не стрымліваючыся ад шчасця,
моцна абдымае яе.)
Яшчэ я назбіраю... Убяру
цябе, як каралеўну, ў самацветы!
(Шукае ў траве пад кустамі
светлячкоў.)

Маўка

А я з каліны цвету наламаю.
Яна не спіць, бо салавейка будзіць.
(Ламае белыя кветкі і ўпрыгожвае імі сваё адзенне.) [...]

Лукаш
(шукаючы светлячкоў заўважае агеньчыкі)

Якія светлячкі! Глядзі, лятаюць!
Яшчэ такіх вялікіх я не бачыў!
Павінен іх злавіць я!
(Ганяецца то за адным, то за другім, яны незаўважна вабяць яго да дрыгвы.)

Маўка

Не лаві!
Каханы, не лаві ты Пацярчатаў!
Яны цябе загубяць!

Лукаш не чуе, захоплены пагоняю, і адбягаецца далёка ад Маўкі.

Лукаш
(раптам ускрыквае)

Гіну! Гіну!
Я трапіў у дрыгву! Ой, смокча! Цягне!

Маўка прыбягае на ягоны крык, але не можа дастаць да яго, бо ён ўграз далёка ад цвёрдага берага. Яна кідае яму адзін канец свайго пояса, трымаючыся за другі.

Маўка

Лаві!

Пояс не дастае Лукашовай рукі.

Лукаш

Не дастаю! Што ж гэта будзе?

Маўка
(кідаецца да вярбы, што стаіць, нахіліўшыся над дрыгвою)

О, вербачка-матулечка, ратуй!
(Хутка, як вавёрка, узлазіць на вярбу, спускаецца па канцавым суку, кідае зноў пояс — на гэты раз ён дастае,— Лукаш хапаецца за канец, Маўка цягне яго да сябе, потым падае руку і дапамагае ўзабрацца на вярбу.)

Дзядзька Леў
(прачнуўся ад крыку)

Га?.. Што такое? Можа, зноўку відма?
Чур-чур! Знікай!
(Аглядаецца.)
Лукашка, дзе ты? Гоў!

Лукаш
(адгукаецца з вярбы)

Я тута, дзядзька!

Леў

А ты тут чаго?
(Падыходзіць і заглядае на вярбу.)
Залез на дрэва, ды яшчэ і з дзеўкай!

Лукаш злазіць з вярбы. Маўка там застаецца.

Лукаш

Я ледзьве у дрыгве быў не прапаў,
натрапіў на «акно», ды вось яна
(паказвае на Маўку)
адратавала неяк.

Леў

А чаго ты
туляешся тут поначы, нібыта
той дух благі!

Лукаш

Я светлячкі лавіў...
(Змайкае.)

Леў
(заўважае светлячкі на Маўцы)

Го! так бы і сказаў, то я ж бы ведаў!
Цяпер я бачу сам, хто ў гэтым вінен.

Маўка

Я ж, дзядзечка, яго уратавала.

Леў

Глядзі ты — «дзядзечка»! Пляменніцу знайшоў!
А хто ж яго паслаў у пастку лезці?
(Дакорліва ківае галавою.)
Лясное кодла! Гэткая ў вас праўда!
Ну, упалюю я Лесавіка,
то ўжо не вырвецца — у пень дубовы
ўшчамлю я барадзішча-памялішча,
то будзе ведаць! Бачыш, падсылае
сваіх дзяўчат, а сам — і я не я!

Маўка
(хуценька збягае з вярбы)

Не, ён не вінен! Хай Змяя-Царыца
мяне скарае, калі я ілгу!
І я не вінавата!

Леў

Зараз веру,
бо гэта ў вас найбольшая бажба.

Лукаш

Яна мяне уратавала, дзядзька,
дальбог, загінуў бы тут без яе!

Леў

Ну, дзеванька, хоць ты душы не маеш,
ды сэрца добрае ў цябе. Прабач мне,
што згарача тут выпаліў...
(Да Лукаша.)
Чаго ж ты
па светлячкі палез ажно ў балота?
Хіба ж яны на купінах сядзяць?

Лукаш

Палез, бо там лятаючых убачыў.

Леў

Эге! Я знаю! Гэта Пацярчаты!
Ну-ну, чакайце ж, прывяду я заўтра
сюды заядлых шчанюкоў, пабачым,
хто заскуголіць тут!

Галаскі Пацярчатаў
*(адзываюцца жаласна,
накшталт жабінага крумкання)*

Не, не, дзядуля!
Не, мы не вінны!
Мы ў дрыгавінні
ягадкі рвалі.
Мы ж і не знали,
што прыйшлі госці,
мы б не ўсплывалі
з той глыбакосці...
Ой, мамачка, мам!
Горачка нам!

Леў

Ты бачыў, як яны ўжо запішчэлі,
чартоўскае насенне?! Пачакай,
я разбяруся, хто тут вінаваты!..
(Да Лукаша.)

А што, нябожа, ці не час дадому?
Хадзем памалу.
(Да Маўкі.)
Будзь здарова, дзеўка!

Маўка

Вы заўтра прыйдзеце? Я пакажу,
дзе добрае тут дрэва на будоўлю.

Леў

Я бачу, распыталася пра ўсё ты.
Ну што ж, прыходзь, да вас даўно я звык,
дый вам да нас прывыкнуць давядзецца.
Хадзем. Бывай!
(Адыходзіць.)

Маўка
(больш да Лукаша, чым да Льва)

Чакаць я заўтра буду!

Лукаш адстае ад дзядзькі, моўчкі цісне абедзве Маўчыны рукі, нягучна яе цалуе і, дагнаўшы дзядзьку, ідзе з ім у лес.

(Адна.)

Каб жа ты, ночка, хутчэй мінала!
Выбач мне, выбач! Яшчэ я не знала
гэткай часінкі, светлай і шчаснай
так, як і ночка,— яснай, прыўкраснай!
Што ж ты, бяроза, журыцца стала?
Глянь, мяне раптам шчасце спаткала!
Слёзаў не лі ты, вярба, над вадою,
будзе, матулечка, любы са мною!..
Татка мой родны, цёмненькі гаю,
як жа я гэтую ноч пратрываю?
Скончыцца стрэча — прыйдзе разлука...
Што ж напаткаю — шчасце ці муку? [...]

ДЗЕЯ 2

Позняе лета. У гаі на цёмным матавым лісці дзе-нідзе прабіваецца асенняя прозалаць. Возера абмялела, берагавая кайма пашырэла, чарот суха шалясціць скупою лістотаю.

На паляне ўжо збудавана хата, пасаджаны агарод. На адной ніўцы пшаніца, на другой — жыта. На возеры плаваюць гусі. На беразе сушыцца бялізна, на кустоўі тырчаць гаршкі, гладышы. Трава на паляне чыста выкашана, пад дубам складзены стажок. У лесе звоняць званочкі — дзесьці пасецца жывёла. Непадалёку чуецца жалейка, на якой іграюць нейкую жвавую танцавальную мелодыю.

Лукашова маці
(выходзіць з хаты і гукае)

Лукашка, гэй! Ты дзе?

Лукаш
(выходзіць з лесу з жалейкаю і разным кійком у руках)

Я тутка, мама.

Маці

А ці не досыць гэтага іграння?
Ты граеш, граеш, а работа — стоп!

Лукаш

Работа, а якая?

Маці

Як — якая?
А хто загон хацеў загарадзіць?

Лукаш

Чаго вам, некалі загараджу.

Маці

Калі там тваё «некалі» настане?
Табе б дык толькі гойсаць па равах
з прыблудай гэтай, з гэтым прыбышом!

Лукаш

Хто гойсае! Скаціну я пасу,
а Маўка памагае.

Маці

Адчапіся
з такой памочніцай!

Лукаш

А вы ж казалі,
калі яна скаціну даглядае,
то сырадою больш.

Маці

Вядома ж — ведзьма!

Лукаш

Не знаю я ўжо, як вам дагадзіць!
Як хату ставілі, ці ж не насіла
яна жардзіны? Хто, скажыце, з вамі
гарод садзіў і нівы засяваў?
Хіба ў нас так, як сёлета, радзіла?
А вунь яшчэ і кветак насадзіла
пад вокнамі, аж люба паглядзець!

Маці

Патрэбны тыя кветкі! Мо ў мяне
у хаце сёння дзеўка на выданні?..
Яму ўсё кветкі, спевы ў галаве!

Лукаш пацепвае нецярпліва плячыма і намерваецца ісці.

Куды ты?

Лукаш

Ды загон той гарадзіць!
*(Ідзе за хату, неўзабаве адтуль
чуецца стук сякеры.)*

Маўка выходзіць з лесу ўся ў кветках, з распушчанымі валасамі.

Маці
(непрыветліва)

Чаго табе?

Маўка

Дзе, цётачка, Лукаш?

Маці

Чаго ты ўсё за ім? Нядобра дзеўцы
самой за хлопцам гэтак улягаць.

Маўка

А мне ніхто такога не казаў.

Маці

Тады хоць раз паслухай — не зашкодзіць.
(З непрыязнасцю глядзіць на Маўку.)
Чаго ты распатланая такая?
Няма, каб зачасацца акуратна,—
усё як ведзьма ходзіш. Непрыстойна!
А лахманы якія на табе!
Яны у працы толькі замінаюць.
Штось засталося ад дачкі памерлай,
ідзі адзенься — там вісіць на жэрдцы.
А гэта ў скрыню лепей пакладзі.

Маўка

Ну што ж, магу і пераапрануцца.
*(Ідзе ў хату. Адтуль выходзіць
Дзядзька Леў.)*

Маці

Хаця б падзякавала!

Леў

Ты што, сястра,
ўсё поедам ясі дзяўчыну гэту?
Ці завініла чым перад табой?

Маці

А ты, брат, памаўчаў бы лепш, калі
не цягнуць за язык! Мо ты б яшчэ
сюды ўсіх ведзьмаў з лесу пазбіраў...

Леў

Калі б, сястра, пра тое ты казала,
што ведаеш, то слухаў бы, а то...
«Ўсіх ведзьмаў з лесу!» — дзе ж у лесе ведзьмы?
Яны жывуць па вёсках...

Маці

Ого, ты
на гэтым знаешся... Ну што ж, прынаджвай
лясную погань, мо яшчэ дачакаешся
калісь дабра!

Леў

А што ж? і дачакаю!
Усё, што ў лесе,— то, сястра, не погань,
усякі скарб ідзе адсюль...

Маці
(насмешліва)

А як жа!

Леў

Бываюць людзі з гэтакіх дзяўчатаў!

Маці

Якія людзі? Ці ты ўпіўся? Га?

Леў

Ды што ты знаеш? Вунь нябожчык дзед
казалі: трэба толькі слова ведаць,
то увайсці і ў лесавічку можа
душа зусім такая, як і наша.

Маці

Ну, а куды тады вядзьмарскі дух
падзенецца?

Леў

Ты зноўку за сваё!
Пайду я лепей што зраблю, чым тут
ваду таўчы у ступе.

Маці

То ідзі!
Ці ж я трымаю?

Леў ідзе за хату, злосна страсянуўшы галавою.
Маўка выходзіць з хаты пераапранутая: на ёй цесная палатняная, палатаная на плячах кашуля, вузкая спаднічка з набіванкі і паліня-лы фартух з дымкі, валасы гладка заплецены ў дзве касы і закруча-ны вакол галавы.

Маўка

Гляньце, як цяпер?

Маці

Вось так зусім іначай. Ну, пайду —
тым часам пагляджу на пісклянятаў.
Хацела да канопляў завінуцца,
дык тут яшчэ не скончана работа,
а да яе не надта ты...

Маўка

Чаму ж?
Што толькі ўмею — рада памагчы.

Маці

У тым вось і бяда, што мала ўмееш:
палольшчыца няўдалая з цябе,
на сенаванні — галава балела...
Як так і жаць мне будзеш...

Маўка
(са страхам)

Як? Жаць жыта?
Вы хочаце, каб я сягоння жала?

Маці

Чаму б і не? Хіба сягоння свята?
(Бярэ за дзвярыма ў сенцах серп і падае Маўцы.)
Бяры вось серп — спрабуй.
Сваё як скончу,
то падмяню цябе...
(Праступе за хату, узяўшы з сяней падсітак з зернем. Неўзабаве чуваць, як яна кліча: «Ціпанькі! Ціпанькі! Ціп-ціп-ціп!»)

Лукаш выходзіць з сякерай і падступае да маладзенькага граба, каб ссекчы яго.

Маўка

Не руш, мой любы,
яно ж сырое, бачыш?

Лукаш

Ай, адстань!
Няма мне часу!

Маўка тужліва глядзіць яму ў вочы.

Ну, то дай сухога...

Маўка
(хуценька выцягвае з гушчару доўгую сухадрэвіну)

Яшчэ знайду, калі патрэбна болей.

Лукаш

А што? Я тым адным загараджу?

Маўка

І ты ўжо стаў чамусьці непрыветны...

Лукаш

Ды бачыш... маці за цябе грызуць!..

Маўка

Чаго ёй трэба? Што яе ўкусіла?

Лукаш

Ды як жа? Я ж ім сын...

Маўка

Ну, сын — дык што?

Лукаш

Бач... ім, як ты, нявестка непатрэбна...
Ім род лясны зусім не даспадобы.
Яны табе свякрухай кепскай будуць!

Маўка

У лесе ў нас няма свякрух ніякіх.
Нашто свякрухі тыя і нявесткі —
не разумею!

Л у к а ш

Ім нявесткі трэба,
бо трэба памагаць — яны старыя.
Чужога да работы прымушаць
не выпадае... Наймічкі — не дочкі...
На жаль, ты гэтага не зразумееш...
Каб чалавечы клопат зразумець,
вядома, трэба вырасці не ў лесе.

М а ў к а
(шчыра)

Ты мне ўсё раскажы, я зразумею,
бо я цябе люблю... Я ж зразумела
тваёй жалейкі песні, ці не так?

Л у к а ш

Яшчэ не ўся навука — тыя песні!

М а ў к а

Не зневажай душы сваёй ты цвету,
бо вырасла з яго каханне наша!
Той цвет чароўней папараці-кветкі —
ён скарбы творыць, а не адкрывае.
Нібы затахкала другое сэрца
ў маіх грудзях, калі яго спазнала.
Са мною цуд стаў...
(Раптам змаўкае.)
Ты няўжо смяешся?

Л у к а ш

Дапраўды, нейк надта смешна стала...
Адзета па-будзённаму, а мовіш
такое, як на свята у царкве!
(Смяецца.)

М а ў к а
(тузае на сабе вопратку)

Спалю я ўсё!

Лукаш

Каб маці болей грызлі?

Маўка

Калі ж я ў тым убранні для цябе
нібы інакшай стала...

Лукаш

Так і ведаў!
Цяпер пачнуцца новыя дакоры...

Маўка

Не, любы, я цябе не дакараю,
мне толькі горка, што не можаш ты
сваім жыццём з сабою параўнацца.

Лукаш

Не разумею, што ты тут гаворыш.

Маўка

Бач, я цябе найбольш люблю за тое,
чаго ў сябе ты сам не разумееш,
хоць і душа твая пяе пра тое
выразна-шчыра голасам жалейкі...

Лукаш

А што ж яно такое?

Маўка

Прыгажэй
за твой увесь прывабны, мілы воблік,
ды выказаць яго і я не ў стане...
*(Тужліва-закахана пазірае на яго
і маўчыць хвіліну.)*
Зайграй жа мне, каханы, на жалейцы,
няхай яна ўсё ліха зачаруе!

Лукаш

Ай, мне цяпер зусім не да іграння!

Маўка

То абнімі мяне, каб я забыла
размову гэту.

Лукаш
(азіраецца)

Тсс!.. пачуюць маці!
Яны і так ужо ўвесь час гавораць,
што ты прыблуда...

Маўка
(успыхнула)

Так! Хто ў вас не вырас,
не зразумее вас! Бо што такое
«прыблуда» тая? Што цябе кахаю?
Што першая прызналася? Ці ж ганьба,
што сэрца нескупое свае скарбы
не затаіла, але шчодрай мерай
каханага багаццем адарыла,
не патрабуючы ўзамен нічога?

Лукаш

Была надзея, што аддзячу потым.

Маўка

Ізноў ты нешта дзіўнае гаворыш —
«аддзячу»... Даў ты мне дары, якія
нямераны, нялічаны...

Лукаш

То й добра,
калі адно аднаму мы не вінны.
Сама сказала гэта — памятай.

Маўка

Чаму павінна гэта я запомніць?

Маці
(выходзіць з хаты)

То так ты жнеш? А ты вось так гародзіш?

Лукаш паспешліва павалок жэрдку за хату.

Калі ты, дзеванька, не хочаш жаць,
то я не прымушаю. Ужо неяк
сама упраўлюся, а там на восень,
дасць Бог, знайду памочніцу-нявестку.
Тут ёсць адна рухавая ўдавіца,
сама напытвалася праз людзей,
то я сказала, што абы Лукаш
не супярэчыў... Ну, вяртай жа, любка,
мне серп — нямашака у нас другога.

Маўка

Я буду жаць. Ідзіце да канопляў.

Маці ідзе цераз паляну да возера і хаваецца за чаротам. Маўка нахіляецца да жыта і заносіць серп. З жыта раптам выскаквае Русалка Палявая; зялёнае адзенне на ёй прасвечваецца сям-там скрозь плашч залатога валосся, што пакрывае ўсю яе невялічкую постаць; на галаве сіні вянок з васількоў, у валасах заблыталіся ружовыя кветкі куколю, рамонку, бярозкі.

Русалка Палявая
(з мальбою кідаецца да Маўкі)

Сястрыца, пашкадуй!
Красу маю ты не руйнуй!

Маўка

Я мушу. [...]

Русалка Палявая
(шэпча, нахіліўшыся да пляча Маўкі)

Ці ж не здараецца часам на полі
вострым сярпом разануць сабе руку?
Родная, ўваж маю муку!
Кроплі крыві для ратунку даволі.
Хіба красе дарагая цана?

Маўка
(чыркае сярпом сабе па руцэ, кроў пырскае на залатыя косы Русалкі Палявой)

Вось табе, на!

Русалка Палявая схіляецца нізка перад Маўкаю, дзякуе і знікае ў жыце.

Ад возера набліжаецца маці, ■ з ёю маладая паўнацелая маладзіца ў чырвонай хустцы ■ аблямоўкаю, у бурачковай спадніцы з дробнымі і роўнымі зборкамі; у такіх жа зборках і фартух ■ нашытымі на ім белымі, чырвонымі ды жоўтымі стужкамі; кашуля густа вышыта чырвоным і сінім, маністы са срэбных манетак звіняць на белай, пульхнай шыі, моцная жычка туга перацінае стан — і ад гэтага круглая, поўная постаць здаецца яшчэ больш пышнаю. Маладзіца ідзе спораю хадою, ажно старая ледзьве паспявае за ёй.

Маці
(да маладзіцы ласкава)

Сюды, Кілінка, вунь каля бярозы
паўнютка зелля. Вось расце крываўнік,—
збаны свае папарыць вы хацелі?
Ён добры, любачка, да малака.

Кіліна

Ды малака ў мяне хоць ты заліся!
Хутчэй бы той кірмаш — набуду посуд.
Карова ў мяне турскага заводу,—
яшчэ нябожчык мой прыдбаў,— о Божа,
малочная якая! Я ўжо неяк
управілася ў полі, дык патрэбна
рабоце хатняй рады даць. Ой, цётка,
удоўцы — хоць ты напал разарвіся.
(Прыгаруньваецца, падцяўшы губы.)

Маці

Ой, рыбанька, няўжо вы ўсё пажалі?
Гавораць праўду: хто як папрацуе,
той мае так... У нас — адна палоска,
і то Бог спору не дае...

Кіліна
(глядзіць на ніву, дзе стаіць Маўка)

А хто ў вас
за жнейку будзе?

Маці

Ды адна сіротка...
(Ціха.)
Такая, што, крый божа, ні да чога...

Кіліна
(падыходзіць з маці да Маўкі)

Дзень добры, дзеванька! Ці добра жнецца?

Маці
(усплясквае рукамі)

Ой, ліхачка! Яшчэ не пачынала!
О Божачка, дык што ты тут рабіла?
Няўдаліца! Нягодніца! Гультайка!

Маўка
(глуха)

Я раніла руку...

Маці

Было калі!

Кіліна

Ану, дай серп сюды — спрабую я.

Маўка хавае серп за спіну і варожа глядзіць на Кіліну.

Маці

Давай жа серп, як просяць! Ён не твой!
(Вырывае серп з рук Маўкі і падае Кіліне, тая кідаецца на жыта і жне, як агнём паліць, аж салома свішча пад сярпом.)

Маці
(задаволена)

Вось яна, работа!

Кіліна
(не адрываючыся ад працы)

Калі б хто
перавяслы круціў мне, я б уміг
палоску гэту выжала.

Маці
(гукае)

Лукаш!

Лукаш
(падыходзіць. Да Кіліны)

Дапамагай Бог!

Кіліна
(жнучы)

Дзякую!

Маці

Лукашка,
вязаць пасобіць трэба маладзіцы.
«Памочніца» ж, глядзі, калекай стала.

Лукаш пачынае вязаць снапы.

То жніце, мае дзеткі, я пайду
на полудзень вам кісяльку згатую.
(Ідзе ў хату.)

Маўка адышлася да бярозы, прытулілася да яе і скрозь доўгае вецце глядзіць на жнеяў. [...]

М а ц і
(з парога сенцаў)

Хадзеце, жнейкі! Полудзень гатовы.

К і л і н а

Сваё я скончыла, ды вось Лукаш
усё ніяк не ўправіцца.

Л у к а ш

Я зараз.

М а ц і

Ну, то канчай. Кіліначка, хадзеце!

К і л і н а ідзе ў хату. Дзверы зачыняюцца. Маўка выходзіць з-пад бярозы.

Л у к а ш
(трохі збянтэжыўся, убачыўшы яе, але тут жа супакоіўся)

А, гэта ты? Вось давяжы снапы,
а я пайду.

М а ў к а

Я не магу вязаць.

Л у к а ш

Ну, то чаго тады ты тут віжуеш,
калі не хочаш памагчы?
(Вяжа сам.)

М а ў к а

Лукашка,
хай больш кабета гэта не прыходзіць,—

я не люблю яе — яна хітруля,
як выдра.

Лукаш

Ты яе зусім не знаеш.

Маўка

Не, знаю! Чула смех яе і голас.

Лукаш

Го, мала гэтага!

Маўка

Ды не, даволі!
Яна драпежная, нібыта рысь.

Лукаш

Яшчэ што!

Маўка

Хай да нас яна не ходзіць.

Лукаш
(выпрастаўся)

А ты хіба лясной царыцай стала,
каб вырашаць, хто можа ў лес хадзіць,
хто не?

Маўка
(сумна, пагрозліва)

У лесе ёсць такія ямы,
пакрытыя ламаччам, бураломам,—
ні чалавек, ні звер іх не заўважыць,
аж покуль не ўпадзе...

Лукаш

Яшчэ гаворыць
пра хітрасць, пра драпежніцтва,—
маўчала б!
Я бачу, што не знаў тваёй натуры!

Маўка

Я, можа, і сама яе не знала...

Лукаш

Дык вось жа слухай: калі я павінен
пытацца кожны раз твайго дазволу —
каму, калі прыйсці ка мне у госці,
то лепш у вёску з лесу зноў я з'еду.
Там, між людзей, як-небудзь пражыву.
Тут, у цябе, нібыта ліс у пастцы,
сядзець не стану.

Маўка

Пастак на цябе
я не стаўляла. Ты прыйшоў самохаць.

Лукаш

Самохаць і пайду, як захачу,
ніхто нічым мяне тут не прывяжа.

Маўка

Ці ж я цябе калі вязаць хацела?

Лукаш

Ну, то даволі языком мянціць!

Давязаў апошні сноп і, не гледзячы на Маўку, пайшоў у хату. Маўка села ў баразне пад іржэўнікам і схілілася ў самотным одуме. [...]

Лесавік выходзіць з гушчару. Ён у доўгай мантыі колеру старога золата, з цёмна-чырвонаю паласою ўнізе, шапка абвіта галінкай даспелага хмелю.

Лесавік

Дачушка! доня!
як цяжка ты караешся за здраду!..

Маўка
(падымае галаву)

Каму я здрадзіла?

Лесавік

Самой сабе.
Пакінула густыя вершаліны,
спусцілася на вузкія сцяжынкі.
Ты на каго падобная? На служку,
на парабчанку, што нялёгкай працай
акрайчык шчасця зарабіць хацела
і не змагла, і толькі горкі сорам
ёй не дае жабрачкаю зрабіцца.
Згадай, якой была ты ў тую ноч,
калі тваё каханне заквітнела:
была сапраўднаю лясной царэўнай
у зоркавым вянку на цёмных косах,—
самое шчасце рукі прасцірала
тады к табе і зносіла дары!

Маўка

Дык што ж рабіць мне, калі болей зоркі
ані ў вянку не свецяцца, ні ў сэрцы?

Лесавік

Яшчэ не ўсе вянкі твае завялі.
Ты азірніся, паглядзі на свята!
Плашч залаты прымераў ясень-князь,
рубінавыя пацеркі — шыпшына.
Каліна, што табе дарыла кветкі,
дзе салавей вясну кахання славіў,
свой белы вэлюм на пурпур змяніла.

Бяроза сумная, вярба старая —
і тыя кармазынна зазіхцелі
на свяце восені. А толькі ты
жабрачае рыззё не хочаш скінуць,
бо ты забыла, што ніякі смутак
адолець прыгажосці не павінен.

Маўка
(парывіста ўстае)

То дай, дзядуля, мне убор святочны!
Я закрасуюся лясной царэўнай,
і шчасце зноў спадзе да ног маіх
і літасці ў мяне папросіць!

Лесавік

Доня,
даўно гатовы строі для царэўны,
але яна забавілася дзесьці,
адзеўшыся для жарту пад жабрачку.
(Расхінае сваю мантыю і дастае прыхаваную пад ёй шыкоўную, золатам вышытую багравіцу і срэбную вуаль; надзяе багравіцу на Маўку паверх адзення.)

Маўка ідзе да каліны, хутка ламае чырвоныя гронкі ягад, звівае вянок, распускае косы, надзяе вянок і схіляецца перад Лесавіком,— ён накідае ёй срэбную вуаль на галаву.

Цяпер я за цябе ўжо не баюся.
*(Паважна кіўнуўшы ёй галавою,
шпарка ідзе ў гушчар і знікае.)* [...]

З лесу выходзіць Лукаш.
Маўка ідзе насустрач Лукашу. Твар яе смяртэльна бялеецца на фоне ядвабнага адзення, канаючая надзея расшырыла яе вялікія цёмныя вочы, рухі яе парывістыя і аслабелыя, быццам нешта ў ёй абрываецца.

Лукаш
(убачыўшы яе)

Якая страшная! Чаго ты хочаш?
(Спяшаецца да хаты, стукае ў дзверы,
маці адчыняе, не выходзячы.
Лукаш да маці на парозе.)
Хутчэй рыхтуйце, мама, хлеб сватам —
іду я заўтра ў сваты да Кіліны!
(Ідзе ў хату.)

Дзверы зачыняюцца.
«Той, што ў скале сядзіць» выходзіць і набліжаецца да Маўкі.

Маўка
(зрывае з сябе баграніцу)

Бяры мяне! Хачу я забыцця!

«Той, што ў скале сядзіць» дакранаецца да Маўкі; яна, ускрыкнуўшы, падае яму на рукі, ён накідвае на яе сваю чорную мантыю. Абое правальваюцца скрозь зямлю.

ДЗЕЯ 3

Хмарная, ветраная асенняя ноч. Апошні жоўты водбліск месяца гасне ў хаосе голых вершалінаў. Стогнуць пугачы, рагочуць совы, назойліва крычаць сычы. Раптам усё пакрываецца працяжным сумным ваўчыным выццём, якое разлягаецца ўсё мацней, мацней і ўраз абрываецца. Наступае цішыня.

Пачынаецца хворы досвітак позняе восені. Бязлісты лес ледзьве шарэе на попельным небе чорнаю шчацінаю, а долу на ўзлессі снуецца разбэрсаны туман. Лукашова хата пачынае святлець сценамі; пры адной сцяне чарнее нейкая постаць, што зняможана прыслянілася да дзвярнога шула, у ёй ледзьве можна пазнаць Маўку; яна ў чорным адзенні, у шэрай непразрыстай вуалі, толькі на грудзях красуецца маленькі калінавы пучок.

Калі развідняецца, на паляне становяцца бачнымі вялікі пень, там, дзе стаяў калісьці стогадовы дуб, а недалёка ад яго — нядаўна насыпаная, яшчэ не парослая мурагом магіла. З лесу выходзіць Лесавік у шэрай світцы і ў шапцы з ваўчынай шкуры.

Лесавік
(прыглядаючыся да постаці пад хатаю)

Ты, донечка?

Маўка
(крыху набліжаецца да яго)

Так, я.

Лесавік

Няўжо пусціў
цябе назад «Той, што ў скале сядзіць»?

Маўка

Ты вызваліў мяне сваім злачынствам.

Лесавік

Злачынствам помсту ты назваць пасмела,
і помсту справядлівую, якую
твайму каханку [redacted] ўчыніў за здраду?
Хіба ж не справядліва, што адчуў ён
адчай нялюдскі горкае самоты,
блукаючы у вобліку ваўчыным?
Вось так! Цяпер ён ваўкалака дзікі!
Няхай скавыча, хай галосіць, вые,
хай прагне чалавечае крыві,—
злой мукі не ўталіць яму!

Маўка

А ты
не радуйся, бо я яго ўратую.
У сэрцы я знайшла такое слова,
што й азвярэлых робіць зноў людзьмі.

Лесавік
*(тупае са злосці нагою і ламае
з трэскам свой кій)*

Дачкою лесу ты не варта звацца,
бо дух твой не свабодны лесавы,
а хатні рабскі!

Маўка

О, калі б ты знаў,
калі б ты знаў, як страшна мне было...
Я спала сном каменным у пячоры,
глыбокай, чорнай, мокрай і халоднай,
калі зыначаны прабіўся голас
скрозь скалы непрыступныя, й выццё
працяжна, сумна, дзіка разляглося
па цёмных, мёртвых водах і збудзіла
даўно памерлае між скалаў рэха...
І я прачнулася. Агнём падземным
мой палкі жаль скрышыў пячорны склеп,
і зноў на свет я вырвалася. Слова
мае нямыя вусны ажывіла,
і здарылася дзіва... Я спазнала,
што забыццё не суджана больш мне.

Лесавік

Дзе ж ён цяпер? Чаму ён не з табою?
Мо неўміручая яго няўдзячнасць,
як і тваё каханне?

Маўка

Ой, дзядуля!
калі б ты бачыў!.. Нібы сцяты ясень,
у вобліку людскім упаў да ног...
І з долу ўгору на мяне узвёў ён
такі балючы погляд, поўны жалю,
раскаяннем працяты, без надзеі!..
Глядзець так можа толькі чалавек!..
Я шчэ й апамятацца не паспела,
як ён на ногі ўскочыў, ад мяне
дрыжачымі рукамі засланіўся
і кінуўся, не кажучы ні слова,
у яр цярновы, там і знік з вачэй.

Лесавік

І што ж рабіць ты думаеш цяпер?

Маўка

Не знаю... Я цяпер, як цень, блукаю
ля гэтай хаты. Я не маю сілы
яе пакінуць, бо я сэрцам чую —
ён вернецца сюды...

Лесавік моўчкі журботна хістае галавою. Маўка зноў прысланяецца да сцяны.

Лесавік

Мая ты дзетка!
Чаго пайшла ад нас у край пануры?
Няўжо няма спачынку ў гаі родным?
Глядзі: твая вярба цябе чакае
і журыцца, што ты ўсё не ідзеш.
Ідзі, спачні.

Маўка
(ціха)

Я не магу, дзядуля.

Лесавік, моцна ўздыхнуўшы, памалу падаўся ў лес. [...]
З хаты чуваць, як устае маці, потым яе голас, а затым і голас Кіліны.

Голас маці

Світае ўжо, а тая спіць і спіць.
Кіліна! Гэй, Кіліна! Ну і спіць жа!
Каб ты навек заснула!.. Уставай,
каб ты зусім не ўстала!

Голас Кіліны
(заспана)

Ды чаго там?

Маці
(з'едліва)

Даўно пара табе даіць карову,

пародзістую, турскага заводу,
што з мужычком-нябожчычкам прыдбала.

Кіліна
(ужо прачнуўшыся)

Я лепей падаю, што тут застала,
ды нацаджу тры кроплі малака —
фунт масла будзе...

Маці

Вось жа не змаўчыць!
Хто ж вінен, што не стала сырадою?
З такою гаспадыняю... ой, гора!
Ну ўжо нявестачка! І дзе ўзялася
на нашу галаву?

Кіліна

А хто прасіў
у сваты ехаць да мяне? Вы ж мелі
задрыпанку тут нейкую,— няхай бы
тут прынялі яе, адзелі добра,—
вось і была б нявестачка па сэрцы!

Маці

А, думаеш, і не? Была б, канечне!
Дурны Лукаш, што замяніў табою;
была яна такой слухмянай, добрай,
хоць прыкладай да раны... Называеш
яе задрыпанкаю, а сама
зялёную сукенку перашыла,
яе сукенку, дый дагэтуль носіш!

Кіліна

Ды ўжо ж, у вас тут новае што справіш!..
Вунь мужа зноўку недзе вецер носіць,
а ты гаруй з праклятаю свякрухай,—
ні жонка, ні ўдава,— пакінчык нейкі!

Маці

Які б мужык з табою тут уседзеў?
Адна бяда! Што ў нас было — пажэрла
з сваімі дзецьмі,— вунь наўкруг паселі! —
няхай бы вас саміх абселі злыдні!

Кіліна

Няхай таго абсядуць, хто іх кліча!
(Пры гэтых словах адчыняе дзверы ў хату.)

Злыдні ўскокваюць у сені.

(З вядром у руках шпарка падбягае да лясной крыніцы, з грукатам набірае вады і вяртаецца назад ужо крыху цішэйшаю хадою. Заўважае каля дзвярэй Маўку, якая стаіць знясіленая ля сцяны, апусціўшы шэрую вуаль на твар. Спыняецца і ставіць вядро на зямлю.)
А гэта што?.. Гэй, слухай, ты п'яная
ці, можа, змерзла?
(Тармосіць Маўку за плячо.)

Маўка
(цераз сілу, нібы змагаючыся з цяжкаю зморою)

Сон мяне змагае...
Зімовы сон...

Кіліна
(адсланяе яе твар і пазнае)

Чаго сюды прыйшла?
Табе не заплацілі за работу?

Маўка
(як і напачатку)

Мне аніхто не зможа заплаціць.

Кіліна

Ты да каго прыйшла? Яго няма тут.
Я знаю, да яго прыйшла! Прызнайся —
ён твой каханак?

Маўка
(гэтаксама)

Калісь быў ранак
вясёлы, ясны, не той, што цяпер...
ды ён ужо змер...

Кіліна

Ты звар'яцела!

Маўка
(гэтаксама)

Я волі хацела...
Сунецца хмарка па небе нясмела...
Сумнай, ёй нельга нідзе прыпыніцца...
Дзе ж ты, о дзе, бліскавіца?

Кіліна
(тузае яе за руку)

Прэч! Не дуры мяне! Чаго стаіш?

Маўка
(апрытомнеўшы, адступае да дзвярэй)

Стаю і гляджу, як жывеце шчасліва.

Кіліна

А каб ты стаяла ў цудзе ды ў дзіве!

Маўка ператвараецца раптам у вярбу з сухою лістотаю і плакучым голлем.

(Апамятаўшыся ад здзіўлення, варожа.)
Дальбог! Я ў добры час табе сказала!
Ну-ну, цяпер нядоўга настаішся!..

Х л о п ч ы к
(выбягае з хаты. Да Кіліны)

Ой, мама, дзе вы? Мы ўжо есці хочам,
а баба не даюць!

К і л і н а

Ай, адчапіся!
(Ціцком, нахіліўшыся да яго.)
Я там у прыпечку пірог схавала,
як баба выйдзе ў варыўню — паеш-це.

Х л о п ч ы к

Вярбу сухую вы тут пасадзілі?
Нашто яна?

К і л і н а

А ты ўсё хочаш ведаць!

Х л о п ч ы к

Жалейку я зраблю з яе.

К і л і н а

Як хочаш!

Х л о п ч ы к выразае з вярбы галіну і вяртаецца ў хату. З лесу выходзіць Л у к а ш, худы, з доўгімі валасамі, без світкі, без шапкі.

(Ускрыквае радасна, убачыўшы яго,
але тут жа наліваецца злосцю.)
З'явіўся ўсё-ткі! Дзе цябе насіла
так доўга?

Л у к а ш

Не пытай!

К і л і н а

Шчэ й не пытай!

Цягаўся, валацуга, ліха знае
дзе, калі і з кім — і не пытай!
Ой, дарагі, не трэба мне й пытацца...
Я знаю, недзе ёсць карчма на свеце,—
у ёй дасюль балююць світка з шапкай.

Лукаш

Не да карчмы мне...

Кіліна

Хто, дурны, паверыць!
(Пачынае галасіць.)
Галаваньку навекі я згубіла
за тым прапойцам!

Лукаш

Не скуголь! Маўчы!

Кіліна перастае, глянуўшы на яго з асцярогаю.

Вось зараз у цябе я запытаю!
Дзе дзядзькаў дуб,
што пень адзін тырчыць?

Кіліна
(спачатку разгубілася,
але хутка ачомалася)

А што, нам з галадухі лісце есці?
Прыйшлі купцы, купілі, вось і ўсё.
Вялікае там шчасце — дуб!

Лукаш

Ды дзядзька ж
пакляўся не сячы.

Кіліна

А Дзядзькі Льва
няма на свеце ўжо, то што з таго!

Ці гэта ты пакляўся або я?
Па мне, то лес увесь я прадала б
або хаця б працерабіла, пашы
няма зусім за той чартоўскай пушчай.
Ды тут як вечар — вытыркнуцца страшна!
І што нам з таго лесу за дабро!
Бадзяемся па ім, што ваўкалакі,
нядоўга й ваўкалакамі завыць!

Л у к а ш

Цыц! цыц! не гавары! Маўчы!
(У ягоным голасе чуецца вар'яцкі жах.)
Ты кажаш
прадаць наш лес... ссячы... а ўжо тады
не будзе так... як ты сказала?

К і л і н а

Як?
Што воўк...

Л у к а ш
(заціскае ёй рот)

Не, не кажы!

К і л і н а
(вызваліўшыся ад яго)

Пабойся Бога!
Ты ўпіўся, ці здурэў, ці хто сурочыў?
Ідзі у хату.

Л у к а ш

Зараз... я пайду...
вось толькі... толькі... я вады нап'юся!
*(Становіцца наўколенкі і п'е ваду з вядра.
Потым устае і глядзіць задуменна перад сабою,
не рухаючыся з месца.)*

Кіліна

Ну? Што ты думаеш?

Лукаш

Я? Так... не знаю...
(Вагаючыся.)
Ці без мяне тут хто не быў?

Кіліна
(жорстка)

Ды хто
тут меўся быць?

Лукаш
(апусціўшы вочы)

Не знаю...

Кіліна
(злосна ўсміхнуўшыся)

Ты не знаеш,
то, можа, я што знаю?

Лукаш
(трывожна)

Ты?

Кіліна

А што ж!
Я ведаю, каго ты ўсё чакаеш,
але дарма! — шкада твайго чакання!
Як што й было,
то ўжо ў камель пайшло...

Лукаш

Ты што?

Кіліна

А тое, што ты чуеш.

Маці
(выбягае з хаты і кідаецца ў абдымкі да Лукаша. Ён холадна прымае тое прывітанне)

Сыне!..
Сыночак мой! Ну й хапанула гора
я з гэтай ведзьмаю!

Лукаш
(уздрыгнуўшы)

З якой?

Маці
(паказвае на Кіліну)

Ды з гэтай!

Лукаш
(зневажальна ўсміхаючыся)

І гэта ведзьма ўжо? Відаць, ваш лёс —
вядзьмарскаю свякрухай заставацца.
Дык хто ж вам вінен? Вы ж яе хацелі.

Маці

Калі б я знала, што яна такая
няўмека, неахайніца!..

Кіліна
(умешваецца ў гаворку)

Ой, гора!
Хто б гаварыў! Такой нячыстай сілы,
такой брыды, як ты, не бачыў свет!
Ну ўжо ж і маці у цябе, Лукашка! —
жалеза дай — перагрызе!

Лукаш

А ты
мацнейшая, я бачу, за жалеза.

Кіліна

Чакай ад дурня мужа абароны!
Якая маці, гэтакі і сын!
Якога ж ліха браў мяне? Хіба каб
з мяне гужы вілі тут?

Маці
(да Лукаша)

Дык няўжо ж ты
не скажаш прыкусіць язык ёй? Болей
я кпінаў ейных знесці не магу!

Лукаш

Ды дайце мне вы хоць крыху спакою!
Вы хочаце, каб я не толькі з хаты,
а з свету прэч сышоў? Дальбог, сыду!

Кіліна
(да маці)

А што, прыждала?

Маці

Каб ты так прыждала
ад свайго сына!
(Разлютаваная, ідзе да хаты, на парозе сустракаецца з Кілініным сынам, які выбягае з жалейкаю ў руках.)
Адступіся, злыдзень!
(Штурхае хлопца і заходзіць у хату, грукнуўшы дзвярамі.)

Хлопчык

Вы ўжо прыйшлі, татуля?

Лукаш

Так, сынуля.
(На слове «сынуля» робіць іранічны націск.)

Кіліна
(пакрыўджана)

Ну, то скажы яму, як зваць павінен,—
не дзядзькам жа!

Лукаш
(трохі прысаромлены)

Ды я ж нічога...
Хадзі, хадзі сюды, малы, не бойся.
(Гладзіць хлопца па белай галоўцы.)
Ты сам зрабіў жалейку гэту?

Хлопчык

Сам.
Ды я іграць не ўмею. Можа, вы?
(Працягвае Лукашу жалейку.)

Лукаш

Эй, хлопча, мне цяпер не да ігры!..
(Сумна задумваецца.)

Хлопчык
(хныкае)

І... вы ізноў не хочаце!.. Ну, мама,
чаму не хочуць тата мне зайграць?

Кіліна

Яшчэ чаго! Патрэбна тое гранне!

Лукаш

А дай сюды жалейку!
(Бярэ жалейку.)

Неблагая.
З вярбы зрабіў?

Хлопчык

Нягож, з вярбы во гэтай.
(Паказвае на вярбу,
у якую ператварылася Майка.)

Лукаш

Чамусь яе раней я тут не бачыў.
(Да Кіліны.)
Ты пасадзіла?

Кіліна

Чорт яе б садзіў!
Тырчэў пруток вярбовы дый разросся.
Тут як з вады расце — ліюць дажджы!

Хлопчык
(капрызліва)

Чаму вы не іграеце?

Лукаш
(задуменна)

Зайграць?..
(Пачынае іграць спачатку ціха, затым гучней, потым пераходзіць на тую вяснянку, якую калісьці іграў Майцы.)

Голас жалейкі пачынае прамаўляць словамі:

«Як салодка грае,
глыбока сягае,
расцінае мае грудзі, сэрцайка вымае...»

(Выпускае з рук жалейку.)
Ой! Голас у жалейкі?!. Чары! Чары!

Хлопчык, напужаўшыся крыку, збег у хату.

Што гэта за вярба, скажы мне, ведзьма?
(Хапае Кіліну за плячо.)

Кіліна

Ды адчапіся, я і знаць не знаю!
Не цацкаюся з кодлам я лясным
так, як твой род! Ссякай, калі ўжо хочаш,
хіба забараняю? На сякеру!
(Дастае яму з сяней сякеру.)

Лукаш
(узяўшы сякеру, падышоў да вярбы, ударыў раз па камлі, яна ўздрыганула і зашалясцела сухою лістотаю. Ён замахнуўся яшчэ раз і апусціў рукі)

Не, рукі не ўздымаюцца чамусьці...
За сэрца нешта сціснула...

Кіліна

Дай я!
(Выхоплівае ў Лукаша сякеру і шырока замахваецца на вярбу.)

У тое імгненне з неба вогненным змеем-метэорам злятае Пералеснік і абдымае вярбу.

Пералеснік

Каханая, я вызвалю цябе!

Вярба раптам успыхвае полымем. Дасягнуўшы вяршаліны, агонь перакідваецца на хату, саламяная страха займаецца, пажар хутка ахоплівае хату. Лукашова маці і Кіліны дзеці выбягаюць з хаты з крыкам: «Гарыць! Гарыць! Ратуйце! Ой, пажар!..» Маці з Кілінаю мітусяцца, выхопліваючы з полымя, што толькі льга выхапіць, і на клунках ды мяшках выносяць скурчаных Злыдняў, якія потым хаваюцца ў тыя самыя мяшкі. Дзеці бегаюць з вёдрамі па ваду, залліваюць агонь, але ён разгараецца яшчэ мацней. [...]

1911

ВАСІЛЬ СТАФАНІК
(1871—1936)

Васіль Сямёнавіч Стафанік нарадзіўся ва ўкраінскай карпацкай вёсцы Русаў (цяпер Івана-Франкоўская вобласць) у заможнай сялянскай сям'і. Вучыўся ў польскай гімназіі ў Каламыі, з якой быў выключаны за палітычную дзейнасць, затым — з перапынкамі — на медыцынскім факультэце Кракаўскага універсітэта (1892—1900). Некалькі разоў абіраўся дэпутатам аўстрыйскага парламента (1908—1918). На пэўны час адышоў ад літаратурнай працы. Аднак, уражаны крывавымі падзеямі Першай сусветнай вайны, зноўку ўзяўся за пяро. Навелы гэтага, другога, перыяду яго творчай працы склалі зборнік «Зямля» (1926).

У заходнеўкраінскую літаратуру Стафанік прыйшоў на пераломе XIX і XX стст, у перыяд інтэнсіўнага жанрава-стылёвага абнаўлення мастацтва слова. Літаратурную дзейнасць распачаў у 1896—1898 гг. версэтамі (паэтычнымі творамі ў празаічнай форме) і абразкамі, якія затым прадвызначылі з'яўленне асноўнай формы стафанікаўскай прозы — вобразна-метафарычнай, лаканічнай псіхалагічнай навелы. Ужо першы зборнік навел пісьменніка «Сіняя кніжачка» (1899) стаў значнай падзеяй ва ўсёй украінскай літаратуры. Абіраючы аб'ектам мастацкага адлюстравання вёску, Стафанік адмаўляецца, у адрозненне ад многіх сваіх папярэднікаў, ад этнаграфічна-побытавага, фальклорнага кантэксту, разгорнутага сюжэта, розных апісанняў. Пісьменніка найперш цікавяць унутраны свет чалавека, яго псіхічны стан, перажыванні, душэўныя канфлікты і катастрофы. Кожны ягоны твор — гэта лаканічна перададзеная трагедыя сялянскай сям'і, абумоўленая беспрасветнай беднасцю, гэта катастрофа індывідуума, яго звычайных спадзяванняў і правоў на жыццё, на хлеб, на дах над галавой, на родны кут. Навелы Стафаніка, сабраныя ў зборніках «Каменны крыж» (1900), «Дарога» (1901), «Маё слова» (1905) і інш., выявілі арганічны сінтэз старых традыцый і новай вышуканай манеры пісьма ў духу мадэрнізму. Творчасць Стафаніка — вяршынная стадыя эвалюцыі так званай «сялянскай навелы», якая паяднала ў сабе вопыт усёй папярэдняй «малой

розы», сфарміраванай на ўкраінскім нацыянальным грунце, з ːмай навейшай «тэхналогіяй» сусветнай навелістыкі.

«Ідыятызм вясковага жыцця», па-майстэрску намаляваны тафанікам, быў добра вядомы ў дарэвалюцыйны час і белару-ам. Не дзіва, што асобныя творы пісьменніка з'явіліся яшчэ на гаронках «Нашай Нівы» ў 1909—1911 гг. У перакладзе Р. Зям-евіча былі надрукаваны дзесяць яго навел — «Смерць», «Сіняя ніжачка», «Выводзілі з сяла», «Ліст», «Кацярынка», «Дарога», Сон» і інш. М. Багдановіч дзве навелы Стафаніка («Кляновае ісцейка», «Смерць») пераклаў на рускую мову і надрукаваў у раслаўскай газеце «Голос». Творы Стафаніка ў перакладах і ў рыгінале, несумненна, паўплывалі на станаўленне беларускай розы пачатку XX ст. Стафанік, разам з рускімі пісьменнікамі Ф. Дастаеўскім, А. Чэхавым і іншымі, дапамог беларускай прозе адразу ж, амаль з самага пачатку яе ўзнікнення, стаць псіхала-гічна заглыбленай, здольнай паказваць найтанчэйшыя зрухі ча-лавечай душы, ісці, як гаварыў І. Франко, «не ад індывідуальнай псіхалогіі да сацыялогіі, а наадварот, ад сацыялогіі да індывіду-альнай псіхалогіі». Менавіта гэтым можна растлумачыць той факт, што ўжо раннія творы Якуба Коласа («Нёманаў дар», «Ма-лады дубок»), М. Гарэцкага («Ціхая плынь»), Змітрака Бядулі («На Каляды к сыну»), Ядвігіна Ш. («З бальнічнага жыцця», «За-рабіў»), Цёткі («Асеннія лісты») і іншыя прыемна ўражваюць глы-бінёй псіхалагічнага аналізу. На жаль, у наступныя гады XX ст. са Стафанікавай спадчыны на беларускай мове было надрукавана не шмат, хоць уплыў гэтай спадчыны на творчасць асобных бела-рускіх пісьменнікаў (у прыватнасці ранняга Кузьмы Чорнага) не выклікае сумнення.

Навела «Каменны крыж» (у перакладзе Янкі Саламевіча) пе-радрукоўваецца з часопіса «Полымя» (1971, № 5), «Кляновае ліс-цейка» (у перакладзе Кузьмы Чорнага) — з «Чырвонага сейбіта» (1926, № 6—7). Пераклад навелы «Дарога» зроблены Вячаславам Рагойшам для дадзенага выдання.

Каменны крыж

I

З таго часу як Івана Дзідуха памяталі ў сяле гаспадаром, з таго часу ён меў усяго аднаго каня і малы вазок з дубовым дышлем. Каня ён прыпрагаў, сам станавіўся ў баразну; на каня меў раменную шляю і нашыйнік, а на сябе Іван надзяваў малую шляю з матузоў. Нашыйнік яму быў непатрэбны, бо леваю рукою ўпіраўся, можа, лепш, як нашыйнікам.

Калі яны цягнулі снапы з поля або гной у поле, дык і ў каня і ў Івана аднолькава выступалі жылы; таксама ў іх абодвух пад гару пастронкі напіналіся, як струны, а з гары валачыліся па зямлі. Пад гару конь лез як па лёдзе, а Івана як бы хто кіем па лбе трэснуў, такая вялікая жыла ўздувалася ў яго на лбе. З гары конь выглядаў так, як бы Іван павесіў яго на нашыйніку за якую-небудзь вялікую правіннасць, а левая рука Івана абвівалася сеткаю сініх жылаў, нібы ланцугом са сталі.

Не раз раніцаю, яшчэ да ўсходу сонца, ехаў Іван у поле палявою дарожкаю. Шляі на ім не было, ён толькі ішоў з правага боку, і дышаль у яго быў як бы пад пахаю. І конь і Іван трымаліся на нагах моцна, бо абодва адпачылі за ноч. І калі ім даводзілася сыходзіць з гары, дык абодва беглі. Беглі ў лагчыну і пакідалі за сабою сляды колаў, капытоў і шырачэзных Іванавых пятаў. Прыдарожнае зелле і бадылячча матлялася, пагойдвалася ва ўсе бакі за возам і атрасала расу на тыя сляды. Але часамі ў самы найбольшы разгон на сярэдзіне гары Іван пачынаў налягаць на нагу і прыпыняў каня. Сядаў каля дарогі, браў нагу ў рукі і слініў, каб знайсці тое месца, куды загнаў асот.

— Ды гэту нагу сапаю трэба скрабці, а не слінаю прамы-аць,— гаварыў Іван са злосцю.

— Дзеду Іване, бізуна гэтаму стаенніку, няхай бяжыць, алі авёс есць...

Так сёй-той падсмейваўся з Івана, хто бачыў яго шчыра-анне на сваім полі. Але Іван даўно прывык да такіх сме-ıак і спакойна выцягваў асот. А як не мог асот выцягнуць, кулаком заганяў яго далей у нагу і, устаючы, казаў:

— Нябось выгнієш і сам выпадзеш, а мне некалі з табою яньчыцца...

А яшчэ Івана звалі ў сяле Пераломаным. Нешта было ў яго ў паясніцай, бо ўсё хадзіў сагнуты, нібы два жалезныя крукі цягнулі тулава да ног. Гэта яго ветрам прахапіла.

Як прыйшоў ён з войска дадому, дык не застаў ні бацькі, ні маткі, толькі паваленую хаціну. А ўсяго багацця, што пакінуў яму бацька, гэта кавалак гары, самай высокай і найгоршай за ўсё вясковае поле. На той гары жанкі капалі пясок, і зеўрала яна ярамі і пячорамі ў неба, як страшны волат. Ніхто не араў яе і не сеяў, і мяжы на ёй ніякае не было. Адзін толькі Іван узяўся свой загон капаць і сеяць. Падвозілі яны з канём гною пад горку, а Іван ужо сам насіў яго мяшком наверх. Часам на нівы, што ляжалі ўнізе, зля-таў з гары яго зычны крык:

— Э-эх, як грымну цябе, то і па нітцы разляцішся, які ж ты цяжкі!

Але, бач, ніколі не грымнуў, бо шкадаваў меха, і паволі спускаў яго з плячэй на зямлю. А аднойчы вечарам расказ-ваў жонцы і дзецям такую прыгоду:

— Сонца смаліць, не, не смаліць, проста агнём пячэ, а я паўзу з гноем наверх, ажно скура з каленяў злазіць. Пот з кожнага валаска цурчыць, і так мне салёна ў роце, аж горка. Ледзьве я дабраўся на гару. А на гары такі вятрэц дзьмухнуў на мяне, але такі лёгенькі, што вой! І ведае-це — праз мінуту мяне ў паясніцы пачало як нажамі рэ-заць — думаў, кончуся!

Пасля гэтае прыгоды Іван хадзіў сагнуты ў поясе, а лю-дзі празвалі яго Пераломаным.

І хоць тая гара яго пераламала, але ўраджаі давала доб-рыя. Іван забіваў па́лі, заганяў калы, выносіў на яе цвёрдыя

плахі дзёрну і абкладаў свой участак наўкол, каб асеннія і веснавыя дажджы не змывалі гною і не зносілі яго ў яры. Век свой звекаваў ён на той гары.

Чым больш старэў, тым цяжэй было яму, пераломанаму, сходзіць з гары.

— Такая сабачая гара, што стрымгалоў у даліну прэ!

Не раз, як заходзіла сонца і заставала Івана наверсе, яго цень і ад гары разам падаў далёка на нівы. І ён лажыўся на тых нівах як цень волата, схіленага ў паклоне. Іван тады паказваў пальцам на свой цень і казаў гары:

— От жа сагнула ты мяне, галубка, у дугу! Але ж, пакуль мяне ногі носяць, мусіш радзіць мне хлеб!

На іншых палетках, што Іван купіў сабе за грошы, прынесеныя з войска, рабілі сыны і жонка. Іван найбольш уходжваўся каля гары.

Яшчэ Івана ведалі ў сяле з таго, што ў царкву ён хадзіў толькі раз у год, на Вялікдзень, і што муштраваў курэй. І так ён іх вывучваў, што ні адна не адважвалася зайсці на панадворак і разграбаць гной. Каторая раз лапкаю драпнула — згінула ад лапаты ці ад кія. І няхай сабе Іваніха Богам прасіла — не памагала.

Ды хіба яшчэ тым быў адметны Іван, што ніколі не еў за сталом. Усё на лаве.

— Быў наймітам, а потым адбыў дзесяць гадоў у войску. Стала [redacted] не знаў, таму каля стала яда не ідзе мне на карысць.

Вось такі быў Іван, дзіўны і натураю і работаю.

II

Гасцей у Івана поўная хата, мужчыны і жанкі. Іван прадаў усё, што меў, бо сыны з жонкаю наважыліся ехаць у Канаду, і стары ўрэшце мусіў паддацца.

Стаяў перад гасцямі, трымаў у правай руцэ чарку гарэлкі і нібы камянеў, бо слова не мог выгаварыць.

— Дзякую вам ласкава, гаспадары і гаспадыні, што лічылі мяне за гаспадара, жонку маю за гаспадыню...

Не дагаворваў і не піў ні да каго, толькі тупа глядзеў перад сабою і ківаў галавой, нібы гаварыў пацеры і на кожнае слова галавою падтакваў.

Гэта як часам якаясьці ніжняя хваля выкаціць вялікі амень з вады і пакладзе яго на бераг, і той камень ляжыць а беразе, цяжкі і бяздушны. Сонца адлушчвае з яго даўні арост і запальвае на ім маленькія фасфарычныя зоркі. Іаблісквае той камень мёртвымі блікамі, адбітымі ад усоду і заходу сонца, і каменнымі вачыма сваімі глядзіць а жывую ваду і сумуе, што не гняце яго цяжар вады, як нёў ад веку. Глядзіць з берага на ваду, як на страчанае нчасце.

Вось так Іван глядзеў на людзей, як той камень на ваду. Страсянуў сівымі валасамі, як грываю, і казаў далей:

— Дык шчыра вам дзякую, і няхай вам Бог дасць, што вы самі хочаце. Дай вам Божа здароўя, дзеду Міхайла...

Ён падаў Міхайлу чарку і пацалаваў у руку, той пацалаваў яго руку.

— Куме Іване, дай вам Божа пажыць яшчэ на гэтым свеце, і няхай Гасподзь міласэрны шчасліва заправядзе вас да месца і паможа сваёю ласкаю нанова гаспадаром стаць.

— Каб Бог дазволіў... Гаспадары, прашу, дапівайце ж... Думаў жа я, што вас за стол пасаджаю, як прыйдзеце на вяселле сынава, а выйшла іначай. Гэта ўжо такое настала, чаго нашы дзяды і бацькі не ведалі, а мы мусім ведаць. Гасподня воля! Давайце, гаспадары, яшчэ па адной, а на рэшту выбачайце.

Ён узяў чарку гарэлкі і падышоў да жанок, што сядзелі на другім канцы стала, ад ложка.

— Цімафеіха, кума, хачу я да вас выпіць. Гляджу я на вас, і мне, як той казаў, маладыя леты ўспамінаюцца. Дзе, дзе яны, дзе-е? От жа былі вы ладная дзеўка, дастойная былі! Гэта ж не адну ночку маркоціўся я па вас, а ў танцы як хадзілі, як сноўня — так роўна! Ох, дзе ж, кума, тыя гады нашы! Ну, перакуліце і выбачайце, што на старасці танец прыпомніў. Будзьце ласкавыя...

Глянуў на сваю старую, што плакала між жанок, і выняў з-за пазухі хусціну.

— Старая, слухай, на табе хустку і добра абатрыся, каб я тут ніякіх плачаў не бачыў! Гасцей частуй, а плакаць яшчэ хопіць часу, яшчэ так наплачашся, што вочы выцекуць.

Адышоў да мужчын, круцячы галавою.

— Я яшчэ нешта сказаў бы, але лепш памаўчу, лепш пашаную абразы ў хаце і вас, грэшных. Але не дай Божа нікому добраму жаночым розумам жыць! Бачыце, як плача, і праз каго — праз мяне? Праз мяне, гаспадыня мая? Гэта я цябе выкарчаваў на старасць з твае хаты? Маўчы, не хліпай, бо гэтыя сівыя коскі зараз абарву, і пойдзеш у тую Гамэрыку з голай галавою.

— Куме Іване, ды пакіньце ж вы дакараць жонку, яна ж вам не вораг і дзецям сваім не вораг, і шкадуе яна не толькі сваю радню, але і ўсё сяло.

— Цімафеіха, калі не знаеце, дык і не кажыце анічога! Ёй шкода, а я туды што — з выскакам іду?!

Ён заскрыгітаў зубамі, як жорнамі, пагразіў жонцы кулаком, як доўбняю, і стаў біць сябе ў грудзі.

— Вазьміце і ўсадзіце мне сякеру вось тут, у пячонкі, дык, можа, тая жоўць лопне, а то не вытрываю! Людзі, такая туга, такая туга, што не помню, што са мною робіцца!

III

— Дык прашу, гаспадары, вазьміце па чарцы без цырымоніі і выбачайце, бо мы падарожныя ўжо. І з мяне, старога, не дзівіцеся, што трохі гыркаю на жонку, але гэта недарэмна, ой, недарэмна! Гэтага ж ніколі б не было, каб не яна з сынамі. Сыны, бачыце, пісьменныя, дык як трапілася ім нейкае пісьмо ў рукі, як дасталі нейкую карту ды як падкаціліся да старое, дык пілавалі-пілавалі, пакуль не ўгаварылі. Два гады ў хаце нічога больш не гаварылася, толькі Канада і Канада. А як мяне прыціснулі, як убачыў, што ўсё роўна мяне на старасці гадоў грызцімуць, як не пайду, то ўсё прадаў. Сыны не хочуць быць наймітамі і кажуць: «Ты — наш тата, дык і завядзі нас да зямлі і дай нам хлеба, бо як нас падзеліш, дык не будзе з чым кратацца». Але, гаспадары, дзе мне, пераломанаму, да вандровак? Я спрацаваны — усё цела мазоль, косці трухлявыя, так што пакуль іх раніцай збярэш у кучу — дзесяць разоў войкнеш!

— Дык гэта ўжо ж, Іване, прапала, а вы сабе тугу да галавы не бярыце. А можа, як нам дарогу пакажаце, дык і ўсе за вамі пойдзем. Па нашым краі не варта так горна

тужыць! Наша зямля не можа столькі народу пратрымаць і столькі бяды вынесці. Мужык не можа, і яна не можа, абое ўжо не могуць. І саранчы няма, і пшаніцы няма. А падаткі накіпаюць: што плаціў лева, то цяпер пяць, што еў саланіну, то цяпер бараболю. Ой, вырабілі нас на ірху, так узялі нас у рукі, што з тых рук ніхто нас не можа вырваць, хіба толькі ўцякаць. Але некалі на гэтыя землі будзе збавенне, бо народ возьмецца за нажы. Няма вам па чым тужыць!..

— Дзякую вам за гэтае слова, але яго не прымаю. Правільна, народ возьмецца за нажы. А то ж ці не гневаецца Бог на такіх, што зямлю на продаж пускаюць? Цяпер зямлі нікому не трэба, толькі векселяў ды банкаў. Цяпер маладыя гаспадары мудрыя парабіліся, такія фраеры, што за зямлёю не надта ўпадаюць. А гляньце на тую старую скрыпку — дзе ўжо ёй пускацца ў гандаль?! Ды гэта ж трухлявая вярба: ткні пальцам — і ў парахню разляціцца! І, думаеце, яна зайдзе да месца? От, перавернецца недзе ў яму, і сабакі расцягнуць, а нас пагоняць далей і паглядзець не дадуць! Адкуль такім дзецям Бог мае блаславенне даць? Старая, ідзі сюды!

Падышла Іваніха, старэнькая і сухенькая.

— Кацярына, што ты сабе, нябога, думаеш? Дзе я цябе пакладу ў магілу? Ці рыба цябе павінна з'есці? Ды тут добрай рыбе няма чаго на адзін зуб узяць. Глядзіце! — І ён нацягваў скуру на жончынай руцэ і паказваў людзям.— Адна скура ды косці. Куды ёй, гаспадары, ісці з печы? Была ты добрая гаспадыня, цяжка працавала, не траціліся ўпустую, але на старасць у далёкую дарогу выбралася. Вунь, бачыш, дзе твая дарога і твая Канада? Вунь там!

І паказаў ёй праз акно на могілкі.

— Не хацела ісці ў гэтую Канаду, дык пойдзем за свет і развеемся на старасць, як ліст па полі. Бог знае, як з намі будзе... а я хачу перад гэтымі нашымі людзьмі з табою развітацца. Так, як шлюб мы з табой перад імі бралі, так хачу перад імі развітацца з табою перад смерцю. Можа, цябе так кінуць у мора, што я не буду бачыць, а можа, мяне кінуць, што ты не бачыцьмеш... Ты даруй мне, старая, што не раз табе даўся ў знакі, што, можа, цябе калі пакрыўдзіў, даруй мне і першы, і другі раз, і трэці.

Пацалаваліся. Старая ўпала Івану на рукі, а ён казаў:

— Я ж цябе, нябога, у далёкую магілу вязу...

Але гэтых слоў ужо ніхто не чуў, бо ад жаночага стала наляцеў плач, як вецер, што павеяў спаміж вострых мячоў і ўсе галовы мужыкоў на грудзі пахіліў.

IV

— А цяпер ідзі сабе, старая, да баб і пільнуй, каб кожны сваё меў, ды напіся, каб я хоць раз на вяку цябе бачыў п'яную. А вас, гаспадары, я яшчэ праз дзве рэчы папрашу. Можа, сыны прышлюць вестку, што нас са старою ўжо няма, так я прасіў бы вас, каб вы па нас абедню справілі і каб так, як сёння, зайшлі на абед і згаварылі «Ойча наш» за нас. Можа, Пан Бог граху менш прыпіша. Я грошы пакіну Якаву, бо ён малады і справядлівы чалавек і не прысвоіць дзедаў крэйцар.

— Справім, справім, і «Ойча наш» за вас згаворым...

Іван задумаўся. На яго твары адбіўся нейкі сорам.

— Вы са старога не дзівіцеся і не смейцеся з дзеда. Мне самому — ох, як сорам вам гэта казаць, але здаецца мне, што я грэх меў бы, каб гэтага вам не сказаў. Вы знаеце, што я сабе на сваёй гары крыжык каменны паклаў. Цяжка яго было везці, цяжка яго наверх дастаўляць, але ж паклаў. Такі цяжкі, што гара яго не скіне, мусіць яго на сабе трымаць, так, як мяне трымала. Хацеў я памятку якую-небудзь пасля сябе пакінуць.

Ён склаў далоні ў трубу і прыціскаў да вуснаў.

— Так я тужу па той гары, як дзіця па цыццы. Я на ёй век свой звекаваў і акалечыўся. Каб мог, схаваў бы яе за пазуху і павёз з сабою ў свет. Шкода мне кожную крыху ў сяле, кожнае малое дзіця, але па той гары такі ніколі не перастану тужыць.

Вочы яго засвяціліся вялікім жалем, а твар задрыжаў, як чорная ралля пад сонцам.

— От гэтаю ноччу ляжу я ў стадоле і думаю, і думаю: «Госпадзі міласэрны, у чым я гэтак моцна саграшыў, што гоніш мяне за свет?» Я ўсё жыццё толькі рабіў, і рабіў, і

рабіў! Не раз, як канчаўся дзянёк, я падаў на ніву і шчыра маліўся Богу: «Госпадзі, не пакінь мяне ніколі без кавалка чорнага хлеба, а я буду ўсё працаваць, хіба ўжо ні рукою, ні нагою не змагу павярухнуць...» Потым такая туга на мяне напала, што рваў на сабе чуб, качаўся па саломе, як скаціна. І тут нячысцік да мяне прыстаў! Не знаю — і як, і калі апынуўся я пад грушкаю з вяроўкаю. Яшчэ крыху — і засіліўся б. Але Гасподзь міласэрны знае, што робіць. Успомніў я свой крыж, дык мне і адлягло. Эх, як пабягу ж я, як пабягу на сваю гару! За гадзінку ўжо сядзеў пад крыжам. Пасядзеў, пасядзеў доўгенька — і мне нейк лягчэй стала. Вось і цяпер: стаю я перад вамі і гавару з вамі, а тая гара не выходзіць у мяне з галавы. Так і бачу яе, і бачу, і паміраць буду, дык бачыць яе буду. Усё забуду, а яе не. Песні знаў — ды на ёй забыўся, сілу меў — ды на ёй пазбыўся.

Адна сляза пацілася па яго твары, як жамчужына па скале.

— Я вас прашу, гаспадары, каб вы, як будзеце на Святую нядзелю поле свянціць, каб ніколі маёй гары не міналі. Каторы малады няхай забяжыць і няхай пакрэпіць крыж свянцонаю вадзіцаю, бо знаеце, што ксёндз на гару не пойдзе. Вельмі прашу, каб вы майго крыжа ніколі не міналі. Буду за вас Бога і на тым свеце маліць, споўніце толькі дзеду яго волю.

Ён нібы па зямлі слацца перад імі хацеў, сваімі добрымі сівымі вачамі хацеў навек захаваць у сэрцах гасцей сваю просьбу.

— Іване, куме, ды кіньце вы нудзіцца, вон гэты жаль праганіце. Мы вас усе будзем успамінаць. Вы ж былі прыстойны чалавек, ні да каго не лезлі сляпіцаю, нікому не перааралі, не перасеялі, чужога зернетка не зачапілі. Ой, не! Будуць вас людзі ўспамінаць і крыжа вашага на Святую нядзелю не мінуць.

Так вось Міхайла заспакойваў Івана.

V

— Дык вось, панове гаспадары, я сказаў усё, а цяпер хто мяне любіць, той будзе са мною піць. Сонейка ўжо над могілкамі, а вы яшчэ чарку гарэлкі са мною не выпілі. Пакуль я яшчэ ў сваёй хаце і маю гасцей за сваім сталом, буду з імі піць, а хто мяне любіць, той будзе таксама піць.

Пачалася п'янка, такая п'янка, што робіць з мужыкоў падурэлых дзецюкоў.

Неўзабаве п'яны ўжо Іван загадаў заклікаць музыку, каб іграў моладзі, якая заняла ўвесь панадворак.

— Гэ, мусіце так танцаваць, каб зямля гудзела, каб і адной травінкі на таку не асталося!

У хаце ўсе пілі, усе гаварылі, а ніхто нікога не слухаў. Гаворка ішла сама па сабе, бо яе край трэба было сказаць, мусілі сказаць, хоць бы на вецер.

— Як я яго вычысціў, то быў такі дагледжаны — дзе чорнае, дык як срэбрам пасыпана па чорным, а дзе белае, дык як масла снег прысыпаў. Коні былі ў мяне ў парадку, цэсар мог садзіцца! Але грошай меў, ой, меў, меў!

— От, каб апынуцца сярод такой пустыні, дзе толькі я і Бог каб быў! Хадзіў бы, як дзікі звер, толькі каб не бачыў ні паноў, ні ксяндзоў. От, тады называлася б, што я пан! А гэта зямля хай правальваецца, няхай і зараз праваліцца, то не пашкадую! Дзеля чаго? Білі і каталі нашых бацькоў, у ярмо запрагалі, а нам ужо і кавалка хлеба не з'есці... Э, каб гэта па-мойму...

— Яшчэ не знаходзіўся такі зборшчык падаткаў, каб з яго сыскаў за падатак, ой, не! Быў чэх, быў немец, быў паляк — г... выбачайце, узялі... Але як настаў мазур, дык і знайшоў кажушыну аж пад вішняю. Кажу вам, мазур — гэта бяда, вочы яму выпечы, і граху за яго няма.

Усялякай гамонкі было шмат, але яна разляталася ў розныя бакі, як падгнілыя дрэвы ў старым лесе.

У шум, гоман і крыкі і ў жаласную весялосць скрыпкі ўрэзваўся спеў Івана і старога Міхайлы. Той спеў, што яго не раз чуць на вяселлях, як старыя сяляне дабяруць ахвоты і завядуць старадаўнія песні. Словы спеву ідуць праз старое горла, нібы не толькі на руках у іх, але і ў горле мазалі панарасталі. Ідуць словы тых песень, як жоўтае асенняе

лісце, якое вецер гоніць па замёрзлай зямлі, а яно раз-пораз спыняецца ў кожным ярочку і дрыжыць падранымі краямі, як перад смерцю.

Іван з Міхайлам вось так спявалі пра маладыя леты, нібы дагналі іх на кедравым мосце, а яны ўжо не хацелі назад вярнуцца, нават у госці.

Калі яны падцягвалі ўгару якую ноту, то сціскалі адзін аднаго за рукі, аж суставы хрусцелі, а як падыходзілі да вельмі жаласнай мясціны, то нахіляліся адзін да аднаго, прытуляліся лбамі і сумавалі. Лавілі адзін аднаго за шыю, цалаваліся, білі кулакамі ў грудзі і па стале і такой сабе сваім заржавелым голасам тугі задавалі, што нарэшце не маглі вымавіць ніводнага слова, акрамя: «Ой, Іванку, браце!», «Ой, Міхале, прыяцелю!».

VI

— Тата, чуеце, ужо час выходзіць на чыгунку, а вы расспяваліся, як немаведама што.

Іван паставіў вочы, але так дзіўна, што сын збялеў і падаўся назад, а ён паклаў галаву на далоні і доўга штосьці ўспамінаў. Устаў з-за стала, падышоў да жонкі і ўзяў яе за рукаў.

— Старая, гайда, марш — інц, цвай, драй! Ідзі, прыбяромся па-панску ды пойдзем панаваць.

Яны абое выйшлі.

Як уваходзілі назад у хату, то ўся хата загаласіла. Нібы хмара плачу, што навісла над сялом, прарвалася, нібы людское гора прарвала дунайскую гаць — такі быў плач. Жанкі заламалі рукі і так, сплеценыя, трымалі над старою Іваніхаю, каб што зверху не ўпала і не раздушыла яе на месцы. А Міхайла злавіў Івана за плечы і шалёна тармасіў яго і верашчаў як здурнелы:

— Чалавеча, калі ты гаспадар — скінь з сябе гэтыя лахманы, бо цябе адхвашчу па мордзе, як курву.

Але Іван не глядзеў у той бок. Схапіў старую за шыю і пусціўся з ёю ў танец.

— Польку мне грай, па-панску, маю грошы!

Людзі адзеравянелі, а Іван тармасіў жонку, нібы не думаў ужо выпусціць яе жывую з рук.

Убеглі сыны і сілком вынеслі абаіх з хаты.

На панадворку Іван скакаў далей нейкую польку, а Іваніха ашчаперыла рукамі парог і прыгаворвала:

— От жа я цябе выхадзіла, от жа выгрызла цябе гэтымі во нагамі!

І ўсё паказвала рукою ў паветры, як глыбока яна той парог вытаптала.

VII

Платы абапал дарогі трашчалі і падалі — усе людзі праводзілі Івана. Ён ішоў са старою, згорблены, у таннай сівай апранасе, і штохвіліны скакаў польку.

Калі ж усе спыніліся перад крыжам, што Іван паклаў на гары, ён трохі ачомаўся і паказваў старой крыж:

— Бачыш, старая, наш крыжык? Там ёсць выбітае і тваё імя. Не бойся, ёсць і маё і тваё...

1899

Дарога

— Я іду, іду, мама.

— Не ідзі, не ідзі, сыне...

Пайшоў, бо слалася перад яго вачыма ясная і далёкая.

Усе вароты мінаў, усе белыя вокны.

Любіў сваю дарогу, не сыходзіў з яе ніколі.

Удзень яна была бясконцая, як сонечны прамень, а ўначы над ёю ўсе зоркі начавалі.

Зямля квітнела і кветкамі сваімі ўсміхалася яму. Ён іх ірваў і ўквечваў імі свае густыя валасы.

Кожная кветка кідала яму адну пярліну пад ногі.

Яго вочы вясёлыя, а чало яснае, як тая крынічка пры пыльнай дарозе.

І вось людзей спаткаў.

Увагнаныя па калена ў зямлю, яны ў бяздумнай многасці падалі і ўздымаліся.

Чорнымі далонямі змахвалі пот з ілба і вялікімі рукамі капаліся за зямлю.

Стома валіла іх, яны душылі сабою сваіх дзяцей і раўлі ад болю.

Уздымаліся і падалі.

А ноч кідала іх у сон, быццам камяні, адзін каля аднаго.

Страшнымі тварамі павернуты да неба, морам галоў супраць мора зорак.

Зямля стагнала пад ударамі іхніх сэрцаў, а вецер уцёк за горы.

Ён чытаў тыя твары і вялікую песню бою на іх.

З іхніх губ злізаў словы, з ілбоў вычытаў думкі, з сэрцаў усмактаў пачуцці. А калі сонца з'явілася ў крыві і цалавала між доўгімі вейкамі іх вочы, то ў ягоным сэрцы нарадзілася песня.

Расспявалася ў яго душы, як бура, раскалыхалася, як маміна слова.

І стаў дужы і горды. Вецер нахінуў да яго ўсе кветкі.

Ступаў сваёй дарогай далей.

Яна, што палатно, пад ім угіналася. Мінаў усе вароты, белыя вокны адплывалі. І зноўку людзей пабачыў.

Стаялі лавінай. Перад імі каласістае мора золата, за імі дзеці ў холадзе снапоў.

Агонь іх пражыў, жалеза плакала ў іх руках.

Зліняла пустэча нябесная бяздушна звісала над імі.

Усе ў белых кашулях, як на Вялікдзень.

Але снапы прападалі па-над дзецьмі, і агонь уядаўся ў іх белыя галовы.

Яны ўгрызаліся зноў у жоўтыя палі.

Чытаў іх роспач і іх бяссілле.

На іхніх ілбах капаліся раўчукі адзін каля аднаго. Губы іх засыхалі і бялелі. Сэрцы заходзіліся жоўцю.

І песня ягонай душы згоркла, як гнілая пшаніца.

Вочы яго памутнелі, а чало стала ўсё роўна як скаламучаная крынічка пры дарозе.

Моц яго і гордасць упалі на цвёрдую дарогу.

Атруціўся.

Пайшоў сваёй дарогай, як птах, што сваіх крылаў на сабе не адчувае.

На свежай раллі пад вясёлаю вясёлкай стаяла яго любоў. Зямля радавалася з яе белых слядоў.

Як маламоцнае дзіцяня, працягнуў да яе рукі.

— Хадзі!

— Не магу, бо ты атрута!

Захістаўся, а калі праглынуў свой прыгавор, то паклаў на чорную раллю крошкі сваёй песні і паваloкся далей. Ішоў, як цень спарахнелага дуба перад захадам сонца.

Дарога цёмная, як сляпому маладзенькаму калеку.

Аднаго разу спатыкнуўся аб труну сваёй мамы.

Зарыдаў сухімі вачыма і ўпаў.

Зарыў лоб у магілу і прасіў маму, каб яго называла так, як ён быў яшчэ дзіцем.

Адно маленькае слоўца каб сказала!

Доўга прасіў.

Потым паклаў галаву на крыж і адчуў ад яго мароз.

Уздрыгнуў, пацалаваў магілу ў маленькую яблыньку і паплёўся безыменны і самотны.

— Божа, ты падаруй мне рэшту маёй дарогі, бо я не магу ўжо ісці!

І скакаў з магілы на магілу, як восеньскае перакаціполе.

А калі пераступіў сто трунаў, то сто першая была ягоная.

Прыпаў да яе, як некалі да маміных грудзей.

1900

Кляновае лісцейка

I

Пасцель заслана палатном, каля стала на задняй і пярэдняй лаве заселі кумы, на краі печы ў радок дзеці. Яны паспускалі рукі, як стадка перапёлак, што спачываюць, але ўсе гатовы ляцець. Затое кумы сядзелі як укопаныя, толькі рукамі даставалі хлеб або чарку гарэлкі, але і рукі лепш бы не варушыліся, лепш бы спачывалі, згарнуўшыся ў кулак на каленах. Не радасна яны бралі хлеб і чарку. Каганец свяціў на прыпечку і парабіў з кумоў вялікія, чорныя цені і кінуў іх на сцяну. Там яны пераламаліся на стале і таксама не варушыліся.

Каля стала, паніклы, стаяў Іван, гаспадар хаты і бацька маленькага дзіцяці, толькі што ахрышчанага.

— Будзьце ласкавы, мае кумы, ды выпіце яшчэ па аднэй. Хоць гэта не гарэлка, а гразь, але з мужыком то гэтак заўсёды: дзе што на свеце ёсць найгоршага, дык ён павінен тое спажыць, дзе што на свеце ёсць найцяжэйшае, дык ён павінен тое выканаць...

— На тое мы і радзіліся,— адказвалі набожна кумы.

Калі чарка абышла ўсіх, Іван яе палажыў бокам каля пляшкі, бо баяўся, каб не ўпала, гэтакая маленькая, на зямлю.

— А закусіце... Ды і бачце, які мне клопат найшоў у самае жніво, самы агонь. А я, дальбог, не ведаю, што з гэтага можа быць?! Ці павінен я кінуць жніво ды даглядаць жонку і варыць дзецям есці, ці павінен кінуць іх тут на ласку Божую ды галодны цягаць касу? Бо ўжо мне так мае быць, бо ў такі час ніхто да хаты не прыйдзе і за вялікія грошы. На табе, Іване, дзіцё ды і радуйся, бо яшчэ іх мала маеш!

— Не наракайце, куме, ды не гнявайце Бога, бо гэта яго воля, а не ваша. А дзеці... як пена на вадзе, што-небудзь на іх нойдзе... дык і панясеце ўсіх на магілу.

— У мяне не пойдзе, але там, дзе ёсць адно, там нойдзе. Жабрак, каб так не туліўся да жонкі, каб не глядзеў у той бок, дзе жонка, дык бы найлепш зрабіў. Тады і Бог не дасць...

— Куме, вы гэта дарэмна гаворыце, так ніколі не будзе, бо людзі павінны пладзіцца.

— Каб жа гэта людзі, [redacted] то жабракі плодзяцца. А я пра тое і кажу, што ты, жабрак, не пладзіся, не разводзься, як мыш, ты будзь задаволены, калі маеш на плячох сарочку, калі маеш акраец хлеба, каб не быў галодным, ды калі цябе ніхто па твары не лупіць. Калі гэтыя тры справы маеш, дык і павінна табе быць добра, [redacted] ад жонкі вон адступіся.

— Куме Іване, дайце трошкі спакою, бо жонцы, як гэта звычайна ў гэтакім інтарэсе, не трэба гэтага слухаць, бо гэтакая гаворка не дае здароўя. Калі-небудзь іншым, лепшым часам.

— Я вас вельмі перапрашаю за маю гэтакую гаворку, але вы думаеце, што я пра яе дбаю або я пра сябе дбаю?! Дальбог, не дбаю, няхай іх зараз... і мяне з імі. Ай! Ото ж бо мы ўтрацілі б рай на зямлі і маёнткі б згубілі.

Кумы ўжо не адзываліся, не пярэчылі, бо бачылі, што Івана не перамогуць, і хацелі, каб хутчэй ён выгаварыўся ды хутчэй іх пусціў спаць.

Іван устаў ад стала, супыніўся пасярод хаты, спусціў рукі так, як дзеці на печы, і пачаў гаварыць да іх:

— Дык чаму ж не ляціце з мае галавы? Я вам адчыню і вокны і дзверы!..

Дзеці схаваліся на печы так, што іх не было ўжо відаць.

— От, плойма, абы адно хлеба, дый хлеба, дый хлеба. А адкуль жа я табе таго хлеба набяруся? Калі табе кожнае каліва жыта ў сэрца коле!

Гэта было да дзяцей, а цяпер ён звярнуўся да кумоў:

— А ўвечар, абы толькі з'явішся да хаты, такі, як вехаць, вялы, стомлены, а яны табе ў адзін голас... і жонка і дзеці: «Няма хлеба!» Дык ты не йдзеш, бедны чалавеча, спаць, але ты цягнеш цэп ды малоціш прыцемкам, каб заўтра мелі з чым ісці ў жорны. Ды так цябе цэп і зваліць на сноп, ды так і дзеравянееш да ранку ў сне, аж цябе раса пройме. А як толькі вочы пралупіш, дык зараз цябе тая раса есць, бо мала цябе бяда есць, яшчэ яна ўночы цябе знойдзе! Прамыеш вочы дай ідзеш, гэтакі чорны, што сонца перад табою меркне.

— Іване, не трэба журыцца дзецьмі, бо гэта не столькі вы, але Бог ім тата, старэйшы за вас.

— Я з Богам не братаюся, але нашто ён пускае на свет, як голае ў крапіву? Пусціць на зямлю, таленту ў рукі не дасць, манны з неба не спусціць, а потым увесь свет крычыць: «Мужыкі — зладзеі, разбойнікі, душагубцы!» Запрэцца адзін з адным у царкве такі гладкі, што муха на ім не паўзе, ды каркае. «Вы, кажа, дзяцей не навучаеце страху Божаму, вы іх самі пасылаеце красці!..» Ці ж я даслужыўся, каб мяне так ганьбілі? А каб каля майго дзіцяці і мамка, і нянька, і дабрадзейка хадзілі, каб мне людзі ўсяго назносілі, дык і я, ягомасць[1], знаў бы, як дзяцей вучыць. Але мае дзеці растуць па бур'янах разам з курамі... дык ніхто не ведае, што яны цэлы дзень ядуць? Ці крадуць, ці жабруюць, ці пасуць, а я адкуль ведаю?.. Я кашу вашы гоні дый забываю не толькі пра дзяцей, але пра сябе не памятаю! Вы хацелі б, каб я ваша поле вырабіў і дзяцей каб я вучыў. А вы ад чаго? Так, людзі, вы самі ведаеце, якое наша жыццё...

— Ведаем, куме, ведаем! Як не ведаць, калі самі ў ім бродзім.

— Я на дзіцё гляджу, але не думаю, каб яно было вельмі здольнае, каб умела да ладу зрабіць. Я адно гляджу, ці яно ўжо добра па зямлі ходзіць, каб яго як на службу ўперці, от чаго я чакаю. Я не чакаю, каб яно ўбралася ў сілу, каб розуму набрала, каб яно каля мяне нажылося. Каб толькі багатыр або пан разявіў сківіцы, дык я яго туды кідаю, каб абы збыць! А пасля яно бегае каля жывёлы, ногі — адна рана, раса есць, іржышча коле, а яно скача дый плача. Ты б яму адвярнуў жывёлу, пацалаваў бы яго ў ногі, бо ты яго спладзіў, дый сумленне ў цябе ёсць, але мінаеш, яшчэ й хаваешся ад яго, каб яго не чуць.

Аж пачарнеў, аж задыхаўся.

— Дый расце яно пад сталом або пад лаваю, есць кулакі, мыецца слязамі. А падрасце, ды што-небудзь украдзе, бо яно ніколі дабра не ведала, дык крадзеным хоча пацешыцца. Глядзіш... ідзе да цябе жандар. Цкуе цябе і наб'е, як жывёліну, бо ты бацька злодзея дый мусіш з ім быць у змове.

---

[1] Ягомасцем у Галічыне завуць папа.

Дык і станеш злодзей навек! Але гэта яшчэ не ўсё, канец яшчэ наперадзе. Няхай бы сын, ваша дзіця, а людскі злодзей, няхай бы згінуў у астрозе, бо злодзея не шкода! Няхай бы! А то яны адбяруць здароўе дый аддадуць лячыць, а пасля пасылаюць ліст да войта, каб бацька плаціў кошт. З хаты выганяюць, пад плот выкідаюць з бэбахамі. Ідзеш да войта, у рукі цалуеш: «Войтачку, вызвалі мяне ад гэтае кары». «Ты,— кажа войт,— бедны чалавек, дык, можа, цябе выпусцім, але якую я буду мець з таго выгаду?» Сціснеш плячыма, складзешся, як ножык, дый кажаш: «Месяц вам буду дарам служыць». Так ці не так, людзі? Праўду кажу ці брашу, як сабака?!

— Усё так, ні на адно слова вы не памыліліся.

Іван дрыжаў увесь, чуў на сабе ўвесь ценжар страшных сваіх слоў.

— Каб вы не казалі, людзі, што каркае над галовамі сваіх дзяцей, як варона над падлаю! Не кажэце, людзі, не кажэце! Я не каркаю, я праўду гавару, мой жаль каркае, сэрца каркае.

Вочы яго загарэліся, і ў іх з'явілася страшнае замілаванне да дзяцей. Ён шукаў іх вачыма па хаце.

— Бо выходзіць так, што я сваіх дзяцей цураюся, горш як цёмны вораг. А я, бачыце, не цураюся, а я толькі разгарнуў перад вачыма сёння і заўтра, і год, і другі і паглядзеў на сваіх дзяцей, што яны там робяць? А што я ўбачыў, тое і сказаў. Я пайшоў да іх у госці, ды і кроў мая застыла на іх бытаванні...

Праз хвіліну:

— Каб да тае Канады не было мора, дык я б іх у мех забраў бы дый пешкі б туды з імі ішоў, каб іх занесці далёка ад гэтага бэшчання. Я б тое мора берагамі абходзіў...

Кумы забыліся былі пра адпачынак, а цяпер успомнілі, хутка паўставалі й пайшлі.

II

Рана.

Дзеці снедалі на зямлі, аблівалі пазухі і стукалі лыжкамі. Каля іх ляжала мама, худая, жоўтая, і клала калені пад грудзі. Па чорным, нечасаным валоссі сплывала пакута і

боль, а губы сашчапіліся, каб не крычаць. Дзеці з лыжкамі ў роце абарочваліся да мамы, глядзелі і зноў абварочваліся да міскі.

— Сымонка, ты ўжо наеўся?

— Ужо,— адпоўз шасцігадовы хлапец.

— Дык вазьмі венічак, пакрапі зямлю ды падмяці хату. Мама не можа нагнуцца, бо вельмі баліць усярэдзіне. Не пылі вельмі.

— Паднімецеся, бо цераз вас я не магу месці.

Мама паднялася і павалаклася на пасцель.

— Сымонка, а цяпер добра памыйся, і Катруся, і Марыя няхай памыюцца, і пабяжы ў збанок вады начэрпай, але не ўпадзі ў крыніцу, не схіляйся вельмі...

— Сымонка, пайдзі ды нарві агуркоў у рэшата, каб мама ў гаршчэчку наквасіла, бо я бачу, што буду слабая, дык не будзеце мець што з хлебам есці. Ды нарві хрэну і вішнёвага лісця.

— Сымонка, здымі з вешала сарочкі, каб я палатала, бо ходзіце чорныя, як вораны.

Сымонка ўсё бегаў, усё рабіў, што маці казала, і раз-поразу падганяў меншых сёстраў і казаў, што дзеўкі не ведаюць нічога, апроч як есці.

— Яны яшчэ малыя, Сымонка, як вырастуць, дык і будуць табе сарочкі прасці.

— Я наймуся, дык і там мне будуць сарочкі прасці... я ад іх не патрабую.

— Не цешся, дзіцятка, службаю, бо не раз будзеш свае дні аплакваць.

— А вось тата выраслі ў службе, і нічога ім не бракуе.

— І ты вырасцеш у службе, аж скура будзе лузацца ад таго росту. Але ты, Сымоне, не гавары, але збірайся тату несці абед. Ён недзе такі галодны, што вочы за табою праглядзеў.

— Я мушу татаву палку браць, каб ад сабак адганяцца.

— А калі згубіш, дык і будзе тата нас абаіх біць. Ды не ідзі з голаю галавою, але вазьмі хоць татаў капялюш.

— Той капялюш толькі на вочы насоўваецца, што не відаць дарогі.

— Вымый збанок дый налі баршчу.

— Вы мяне не вучэце гэтулькі, бо я ведаю.

— Сымонка, глядзі, каб цябе сабакі не пакусалі.

III

Дробна ступаў нагамі па грубай жарстве дарожнага пяску і пакідаў за сабою маленькія сляды, як белыя кветкі.

— Пакуль я зайду, дык сонца мяне спарыць. Але я сабе збяру валасы так, як салдат, дык і будзе мне лепш ісці.

Паклаў абед на дарогу і сабраў валасы наверх галавы, каб прыцiснуць іх капелюшом і выглядаць, як абстрыжаны салдат.

Вочы смяяліся, падскочыў і пакаціўся далей. Ды валосcе з-пад шырокага капелюша ссунулася на патыліцу.

— Гэта брыдкі капялюш, але няхай я наймуся, дык я тады сабе капялюшак...

Толькі аблізаўся. Прайшоўшы шмат дарогі, ён зноў паставіў абед на зямлю.

— Я нарысую сабе вялікае калясо са спіцамі.

Сеў пасярод дарогі ў пясок і абвёў наўкола сябе кійком, пасля рысаваў спіцы ў калясе. Пасля сарваўся, пераскочыў за обад і пабег, вельмі зарадаваны.

Да кожных весніц прыкрадаўся, зазіраў, ці няма на дварэ сабакі, і тады хуценька перабягаў.

З аднаго двара выбег сабака і пусціўся за ім. Сымонка перапалохаўся, закрычаў і сеў з полуднем. Палка таксама ўпала на дарогу. Доўга, скурчаны, сядзеў, чакаў сабакі, каб кусаў. Пасля адважыўся паглядзець і ўбачыў над сабою чорнага сабаку, што спакойна стаяў каля яго.

— На, на, Цыган, на крупніку, але не кусай, бо баліць вельмі, дый штраф твой гаспадар будзе плаціць. Тады ён табе ногі паломіць за той штраф.

Шчыпаў з хусткі ежу, кідаў сабаку па кавалачку і смяяўся, што ён у паветры хапае.

— А ты чый, шыбенік, што сабак на дарозе корміш? А ў поле што панясеш?

І нейкая жанчына гопнула яго па шыі.

— Дык вы яшчэ б'еце, калі й так сабака хацеў мяне раздзерці.

— А ты чый, гэтакі спрытны?

— Я Івана Пятровага, але мама радзіла дзіцё ды вельмі слабая, дык я павінен несці абед, і мяне сабакі кусаюць, а вы яшчэ б'еце...

— Ой, як я цябе біла... Куды ж ты нясеш есці?

— Тату нясу на поле, каля става.

— Ідзі за мною, бядача, бо я таксама нясу туды абед.

Пайшлі разам.

— А хто абед варыў?

— Мама варыла, бо я яшчэ не ўмею, а Мар'я і Кацярына яшчэ меншыя за мяне.

— Дык не слабая мама?

— Чаму не слабая, так качаюцца па зямлі, так енчаць, што аж! Але я за яе раблю...

— Ото ж ты работнік!

— Вы не ведаеце дый гаворыце абы-што. Ану, запытайцеся ў мамы, які я разумны, я «Отча наш» ведаю на памяць...

Жанчына засмяялася, а Сымонка пацiснуў плячыма і змоўк.

За ім бег сабака, а ён нібыта кідаў яму яду і вабіў ісці за сабою.

IV

Тры дні пасля.

Пасярод хаты сядзелі Сымонка і сёстры і ночвы з маленькім дзіцём стаялі. Калі іх міска з зялёнымі накрышанымі агуркамі і хлеб. На пасцелі ляжала маці, абложаная зялёнымі вербавымі галінкамі. Над ёю гуў рой мух.

— Панаядайцеся дый ціха сядзеце, бо я панясу дзіцё да Васіліхі, каб пазабаўляла. Тата казалі, каб несці рана, апаўдні і пад вечар, а ўвечары яны самі прыйдуць.

— Сымонка, не пераламі дзіцянёці.

— Я думаў, што вы спалі. Тата казаў даваць вам халоднай вады і булку есці. Мар'я такая спрытная, што яна гэтую булку схапіла і ўкусіла ўжо раз. Але я набіў яе. Будзеце есці?

— Не хачу.

— Тата ссукаў яшчэ свечку ды казаў, што калі будзеце ўміраць, дык даць вам у рукі і запаліць. Але я не ведаю, калі даваць?

Маці паглядзела вялікімі, бліскучымі вачыма на сына. Бяздонне смутку, увесь жаль і бяссільны страх зышліся разам у вачах і разам спладзілі дзве белыя слязы, яны выкаціліся на павекі і застылі.

— Тата рана на панадворку таксама плакалі ды галавою аб вушак стукалі. Заплаканы ўзяў касу і пайшоў.

Сымонка ўзяў дзіцё і выйшаў.

. . . .

— Сымонка, каб ты не даваў Катрусю, і Марыйку, і Васілька біць мачысе. Чуеш? Бо мачыха будзе вас біць, ад яды адганяць і белых сарочак не даваць.

— Я не дам і тату буду казаць.

— Не паможа нічога, сынку мой міленькі, дзіцятка мае найзалацейшае! Як вырасцеш, каб вы між сабою дужа любіліся, дужа, дужа!.. Каб ты памагаў ім, каб не даваў у крыўду!

— Як буду я служыць ды калі буду дужы, дык я іх не дам, буду да іх штотыдзень прыходзіць.

— Сымонка, прасі тату, што мама наказвала, каб вас любіў...

— Ешце булку.

— Спявай дзіцяці, няхай не плача...

Сымонка калыхаў дзіцё, але спяваць не ўмеў. Дык маці абцерла далонню сухія губы і заспявала.

У слабым, абарваным голасе вылівалася яе душа і паціхеньку ападала між дзяцей і цалавала іхнія галовы. Словы, ціхія, невыразныя, гаварылі, што кляновае лісцейка развеялася па пустым полі, і ніхто яго пазбіраць не можа, і ніколі яно не зазелянее. Песня намагалася выйсці з хаты і паляцець у пустое поле за лісцейкам...

1900

ПАЎЛО ТЫЧЫНА
(1891—1967)

Паўло Рыгоравіч Тычына нарадзіўся ў сяле Пяскі на Чарнігаўшчыне ў сям'і сельскага дзяка. Вучыўся ў бурсе, потым — у духоўнай семінарыі, у Кіеўскім камерцыйным інстытуце (1913—1917). Працаваў у рэдакцыях розных украінскіх газет і часопісаў, пэўны час узначальваў Інстытут літаратуры імя Т. Шаўчэнкі, быў міністрам асветы Украіны. З 1929 г. — акадэмік Акадэміі навук Украіны. Апрача паэзіі займаўся літаратуразнаўствам, мастацкім перакладам (перакладаў з пятнаццаці моў).

Надзвычай адораны ад прыроды, Тычына быў надзелены здольнасцямі мастака і хораша маляваў. Ён мог рэалізавацца ў жыцці як спявак і музыка, бо меў выдатны музычны слых і прыемнага тэмбру голас, валодаў многімі музычнымі інструментамі. Аднак іншы від мастацтва — паэтычнае слова — забраў яго ў свой палон. Тычына пачаў друкавацца з 1912 г., і першы яго зборнік «Сонечныя кларнеты» (1918) спаўна адкрыў шматграннасць таленту пісьменніка. Аўтар адшукваў такія слоўныя вобразы (часам нават ствараючы новую лексіку), якія б змаглі перадаць не толькі думку і пачуццё, але і гукавое шматгалоссе наваколля, і каларыстычную гаму сусвету. Вершы маладога Тычыны ўражваюць эмацыянальнай узрушанасцю лірычнага героя, музычнасцю, дзівоснай сонечнасцю і, здаецца, абсалютнай дасканаласцю формы. Рэалістычныя прыёмы мастацтва слова геніяльна спалучаны ў творчай майстэрні паэта з тэхнікай сімвалізму, імпрэсіянізму і футурызму. Па сутнасці, напісанае ў 1920-х гг. з'явілася вяршыняй яго паэтычнай творчасці.

Натхнёна праслаўляючы жыццё, Тычына напаўняў свае творы аптымістычнай энергетыкай, імкненнем да рашучага ўдасканалення свету. Да нядаўняга часу чытачам былі даступныя толькі тыя творы, якія перадавалі веру маладога тагачаснага пакалення ў шчасце рэвалюцыйнага абнаўлення грамадства. Аднак сёння адкрыліся вершы, раней забароненыя, праз якія творчы партрэт пісьменніка вымалёўваецца больш поўна і аб'ектыўна. Аказваецца, побач з радаснай надзеяй у вершах паэта гучалі настроі

смутку і болю, прадчуванне трагічных катаклізмаў 1930-х гг. У пазнейшыя перыяды сваёй дзейнасці Тычына пад ціскам таталітарнай ідэалогіі схіліўся як творца ў бок дэкларатыўнасці і голай публіцыстычнасці, заглушыўшы голас уласнага арыгінальнага таленту. І толькі ў гады ваеннага ліхалецця 1941—1945 гг. ён здолеў наблізіцца да колішняга ўзроўню, узнімаючы праблему неўміручасці роднага народа, як і раней, яскрава і эмацыянальна, па-майстэрску выказваючы патрыятычныя пачуцці.

У даваенны і пасляваенны час Тычына свой асноўны творчы патэнцыял скіраваў у рэчышча мастацкага перакладу. Ён самастойна вывучыў многія мовы, прапагандаваў на Украіне лепшыя творы армянскіх, грузінскіх, турэцкіх, яўрэйскіх, башкірскіх, азербайджанскіх і іншых паэтаў. Актыўна Тычына перакладаў, даследаваў, прапагандаваў на Украіне таксама творчасць беларускіх пісьменнікаў — Ф. Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, П. Панчанкі і інш. З Янкам Купалам і Якубам Коласам яго звязвала асабістае сяброўства. Неаднойчы Тычына бываў у нашай краіне. Асобныя творы ён прысвяціў Беларусі, Янку Купалу, дружбе ўкраінскага і беларускага народаў. У сваю чаргу беларускія паэты ахвотна папулярызавалі ў роднай краіне творы Тычыны. У 1954 г. на беларускай мове выйшлі яго «Выбраныя творы». Вершы паэта, артыкулы пра яго творчасць рэгулярна друкаваліся і друкуюцца на старонках беларускай перыёдыкі.

Творы для гэтага выдання ўзяты з кнігі:

Украінская савецкая паэзія: Анталогія ў 2-х т. Мінск: Маст. літ., 1975. Т. 2 («На плошчы» — пераклад Юркі Гаўрука; «Вецер з Украіны» — пераклад Максіма Танка; «Я ўзмацняюся» — пераклад Максіма Лужаніна). Пераклады вершаў «Арфамі, арфамі...», «О панна Інна...», выкананыя Вячаславам Рагойшам, друкуюцца ўпершыню.

Арфамі, арфамі...

Арфамі, арфамі —
Залатымі, маладымі абазваліся гаі
Самазвоннымі:
Йдзе вясна,
Йдзе красна,
Кветам-жэмчугам
Упрыгожаная.

Думамі, думамі —
Нібы мора караблямі, перапоўніўся блакіт
Святлатоннымі:
Бой узвыў
Агнявы!
Смех будзе, плач будзе
Перламутравы...

Стану я, гляну я —
Скрозь званочкі-ручаёчкі, жаваронкі залатыя
З пералівамі:
Йдзе вясна,
Йдзе красна,
Кветам-жэмчугам
Упрыгожаная.

Любая, мілая —
Ці тугою, а ці шчасцем ты наліта цераз край.
Там за нівамі:
Лёс твары
Ветравы!
Смех будзе, плач будзе
Перламутравы...

1914

О панна Інна...

О панна Інна, панна Інна!
Адзін. Вакно. Снягі.
Сястру я Вашу так кахаў —
Дзяцінна, сонцаплынна.
Кахаў? — Даўно. Цвілі лугі...
Каханне вяне — ўраз і беспрычынна...
Снягі, снягі, снягі...

Я Вашы вочы памятаю —
Іх бляск на сэрца спаў.
Зімовы вечар. Ціша. Мы.
Я Вам чужы — я знаю.
І раптам — неба... шэпты гаю...
О не, то вочы Вашы.— Я рыдаю.
Сястра ці Вы? — Кахаў...

1915

На плошчы

Ля царквы на люднай плошчы
рэвалюцыя ідзе.
— Хай пастух,— усе гукнулі,—
атаманіць і вядзе.

Шчасця-долі, вольнай волі,—
гэй, на коні, ўсе на шлях!
Закіпела, зашумела,
палыхнуў чырвоны сцяг...

Ля царквы на люднай плошчы
маткам горатна старым:
ой ты, месячыку ясны,
асвяці дарогу ім!

Пыл на плошчы ападае.
Заціхае крок...
Вечар.
Змрок.

1918

Вецер з Украіны

Нікога так я не люблю,
як ветру шапаценне.

Чортаў вецер! Пракляты вецер!

Ён замахнецца раз —
рык! свіст! кружэнне!
І ўжо ў гаі апалы ліст —
як чортава насенне...

Або: упрэцца ў гразкую раллю,
прыдасць вагонам волі —
эх, як імкнуць яны па рэйках,—
аж нагінаюцца таполі!..

Чортаў вецер! Пракляты вецер!

Праз шкельца Захад, бы з-за крат:
ці звера крок, ці крок людскі няспынны?
Рагоча вецер з Украіны,
вецер з Украіны!

Чортаў вецер! Пракляты вецер!

Ён выкарчаваў галаву з Дняпра:
не мець, паны, дабра.
Прыйшла пара!

Ах,
нікога я так не люблю,
як ветру шапаценне,
яго шляхі, яго імкненне
і зямлю,
сваю зямлю.

1923

Я ўзмацняюся

Я ёсць народ, якога Праўды сіла
яшчэ нікім зламана не была.
Якою пошасцю, бядой мяне касіла! —
а сіла зноўку расцвіла.

Каб жыць — ні ў кога права не пытаю.
Каб жыць — я ўсе кайданы разарву.
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву.

Тэўтонія! Мяне ты паглынала,
твой кат пятлёй дзяцей маіх караў,
маё жалеза, хлеб і вугаль крала...
Як шал цябе апанаваў!

Ты думала — ўсяго мяне з'ядаеш? —
але ўдавілася і ўпала на траву...
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву.

Я ёсць народ, якога Праўды сіла
яшчэ нікім зламана не была.
Якою пошасцю бядой мяне касіла! —
а сіла зноўку расцвіла.

Сыны мае, чырвоныя ўкраінцы,
я вас за подзвіг буду праслаўляць,—
вазьміце крылле ў грознай навальніцы,
спяшайце родных вызваляць!

На нівах украінскіх і на рускіх,
па беларускіх — дзе б вы ні былі! —
знішчайце ўвесь варожы зброд дзікунскі,
змятайце прэч з зямлі!

Не ў сорам раны мне, іх зажыўляю,
гляджу, як збожжа, ўзняўшы галаву.
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву.

З тых ран — наноў жыццё закаласіцца,
аж свет здзіўлёны будзе пазіраць,
якая руны! а зерне! а расіца! —
Ну, як жа тут не ззяць?

І ззяю я, і крылле развінаю,
сваіх арлоў склікаю зноў, заву...
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву.

Зноў будзе неба чыстым і блакітным,
наш дабрабыт узнімецца, як ртуць,
жняяркі пойдуць клінам жытнім,
заводы загудуць.

І я, жыццём багаты, узыграю,
пушчу пад сонца хмару ў сіняву.
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву.

Я ёсць народ, якога Праўды сіла
яшчэ нікім зламана не была.
Якою пошасцю, бядой мяне касіла! —
а сіла зноўку расцвіла.

Фашысцкі зброд, дрыжы! Я расцвітаю,
а на труну табе я кідаю жарству.
Я узмацняюся, я ўсё мужаю,
бо я жыву!

1943

МАКСІМ РЫЛЬСКІ
(1895—1964)

Максім Тадэевіч Рыльскі нарадзіўся ў Кіеве ў сям'і вядомага ўкраінскага этнографа і культурнага дзеяча Тадэя Рыльскага. Дзіцячыя гады прайшлі на радзіме маці, у вёсцы Раманаўка (цяпер Папяльнянскі раён Жытомірскай вобласці). Пасля заканчэння прыватнай гімназіі ў Кіеве вучыўся на медыцынскім і гісторыка-філалагічным факультэтах Кіеўскага універсітэта (1915—1919). Першы паэтычны зборнік «На белых астравах» убачыў свет, калі паэту было ўсяго 15 гадоў. Сёння творчая спадчына пісьменніка змешчана ў 20-томным выданні яго Збору твораў.

Праз жыццё творцы прайшлі амаль усе катаклізмы трагічна складанага XX стагоддзя: рэвалюцыі, Першая сусветная, Грамадзянская, Другая сусветная войны, галадамор 1932—1933 гг., жудасныя праявы сталінскага рэжыму. Рыльскі, як ніхто іншы, змог раскрыць новы змест праз даўнія класічныя формы верша, прыўнесеныя ім ва ўкраінскую літаратуру з папярэдняй уласна нацыянальнай традыцыі, а таксама выкарыстаць дасягненні паэтычнай культуры іншых народаў — ад антычнасці да сучаснага яму літаратурнага працэсу. Таму за Рыльскім замацавалася азначэнне паэта-неакласіка. Пісьменніка хвалявалі філасофскія праблемы дабра і зла, нацыянальнага і агульначалавечага. Адзін са зборнікаў паэта, які атрымаў шырокае прызнанне грамадскасці і быў адзначаны найвышэйшай у СССР Ленінскай прэміяй, меў назву «Ружы і вінаград» (1957). У праграмным вершы, які даў назву ўсяму зборніку, паэт праз разгорнутую паэтычную метафару выказвае сутнасць народнай маралі, мудрасці, дабрыні. Сцвярджаючы родасную сутнасць прыгожага і карыснага, ён пісаў: «Мы дружым з працаю, што ў творчасць перайшла, / З хвалюючаю музыкаю сэрца дружым. / Людское шчасце мае два крылы арла: / Карысць і хараство і вінаград і ружы».

У творчасці Рыльскага адметна прыярытэтнымі аб'ектамі мастацкага асэнсавання былі чалавек, прырода і нацыянальная

мова. Пісьменнік быў і ахоўнікам, і таленавітым стваральнікам украінскай літаратурнай мовы. Нават звычайнае слова набывала пад ягоным пяром асаблівае напаўненне, паколькі яго ён умела ўключаў ва ўласна паэтычны стылістычны і сінтаксічны кантэкст. Пры гэтым неабходна адзначыць празрыстую яснасць твораў Рыльскага. Яго пісьменніцкі індывідуальны творчы почырк вызначаўся гармоніяй думкі і пачуцця. Так, з падачы паэта нават строгая форма санета, яго ідэя (існуе цэлы санетарый Рыльскага!) нібыта падсвечаны тонкімі акварэльнымі фарбамі, сагрэты душэўнай лірычнасцю. Вельмі пашыраны ў паэтычнай спадчыне Рыльскага лірычны верш-роздум, у якім у спакойна-разважлівай манеры вядзецца гаворка з чытачом пра розныя праблемы сусвету, у тым ліку — і адвечна філасофскія (жыццё і смерць, сяброўства і каханне і інш.). Шмат такіх вершаў-медытацый гучаць афарыстычна і застануцца заўсёды актуальнымі.

Глыбіня інтэлекту, рэдкасная эрудыцыя — з аднаго боку, шчырая даверлівасць, нявымушанасць — з другога, выразна праяўляюцца ва ўсёй творчай і навуковай дзейнасці Рыльскага. Паэт і празаік, вучоны-літаратуразнавец і фальклярыст, перакладчык і публіцыст, акадэмік Акадэмій навук Украіны і СССР, Рыльскі заняў пачэснае месца ў культуры многіх народаў. Яго небеспадстаўна называлі будаўнікам мастоў дружбы. Такія літаратурныя шэдэўры, як «Яўгеній Анегін» А. Пушкіна, «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча, «Арлеанская цнатліўка» Вальтэра, творы М. Лермантава, Ф. Цютчава, М. Някрасава, А. Цэрэтэлі, А. Ісаакяна, Я. Райніса, Ю. Славацкага, І. В. Гётэ, В. Гюго і многіх іншых сусветна вядомых аўтараў знайшлі ў асобе Рыльскага кангеніяльнага перакладчыка.

За мэтаскіраванасць таленту, апантаную працавітасць Рыльскага, як і Івана Франко, украінцы называюць паэтам-каменярам. А яшчэ Вялікім Гранасловам, які дыяментавыя грані народнага слова адточваў і адшліфоўваў сэнсава глыбока, музычна чуйна, філігранна.

Моцныя повязі звязвалі Рыльскага з асобнымі беларускімі пісьменнікамі (Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Танкам і інш.), з Беларуссю ўвогуле, з якой ён знаёміўся завочна, перакладаючы «Пана Тадэвуша», і дзе неаднойчы бываў. Беларусі Рыльскі прысвяціў два цыклы вершаў — «Шчодрасць» (1955) і «На братняй зямлі» (1958), як літаратуразнавец ён даследаваў і прапагандаваў творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, П. Панчанкі і іншых, пераклаў на ўкраінскую мову многія творы беларускіх паэтаў (Ф. Багушэвіча, А. Куляшова, А. Вялюгіна, В. Таўлая і інш.).

У сваю чаргу ў Беларусі Рыльскі карыстаўся і карыстаецца шырокай любоўю і павагай. Яго творчасці прысвечаны многія артыкулы. У 1952 і 1985 гг. убачылі свет на беларускай мове кнігі яго выбраных твораў.

Вершы Рыльскага для дадзенай публікацыі ўзяты з выдання: *Рыльскі Максім. Світальная зара: Вершы і паэма. Мінск: Маст. літ., 1985* («Яблыкі даспелі, чырванню наліты!..», «Янка Купала» — пераклады Уладзіміра Шахаўца; «Ластаўкі лятаюць, бо лятаецца...» — пераклад Максіма Лужаніна; «Слова пра родную маці» — пераклад Рыгора Няхая; «Ружы і вінаград», «Туга па маладосці» — пераклады Максіма Танка).

* * *

Яблыкі даспелі, чырванню наліты!
Па сцяжынцы ў садзе
мы ідзём з табой.
Любая, мяне ты правядзеш да поля,
Я пайду — і, можа, не вярнуся больш.

Выспела каханне
пад праменнем цёплым,
І яго сарвалі вусны ў забыцці,—
А цяпер у сэрцы штось трымціць няспынна,
Як галінка ў ззянні сонечным трымціць.

Вунь палі жаўцеюць,
і сінее неба,
Вунь далёка ў полі аратай відаць...
Пацалуй, абняўшы, можа, ў раз астатні;
Расставацца ўмее той, хто ўмеў кахаць.

1911—1918

* * *

Ластаўкі лятаюць, бо лятаецца,
І Ганусю любіць, бо пара.
Хваляю зялёнаю гайдаецца
У вясне Батыева гара.

Хіляць голле клёны буйналістыя,
Галубы залоцяць хмарны шчыт...

Дзень ці два — і кінем усё чыста мы,
Паплывём, вандроўнікі, ў блакіт.

Хай зямля старая завіхаецца,
Кружыць, хоць наўкола ліхтара!..
Ластаўкі лятаюць, бо лятаецца,
І Ган   уся плача, бо пара.

1929

Слова пра родную маці

Будзь благаслаўлёны, дзень і час,
Калі палегла дыванамі
Зямля, што выхадзіў Тарас
Малымі босымі нагамі,
Зямля, што акрапіў Тарас
Сваімі росамі-слязамі.

Будзь благаслаўлёна ў болі ран,
Спрадвечча гэта стэпавое!
Стэп, як зялёны акіян,
Херсона парус напінае,
І ніцай вербы гнуткі стан
Дняпроўскай хваляю люляе.

Будзь благаслаўлёная ў вяках,
Як сонца наша напрадвесні,
Як вешчы белакрылы птах,
Туга і радасць наша — песня.
Гартуеш мужнасць ты ў грудзях,
Калі зямлі ад хмар балесна.

І благаслаўлёны вы, сляды,
Не змытыя ў вяках дажджамі,
Вандроўніка Скаварады,
Што з кайстрай пыльнымі шляхамі
Да жыццядайнае вады
Прастуе, выкляты багамі.

Будзь баслаўлёна, заціш стрэх
І меч, айчыны абарона,
Казацкіх коней хмарны бег,
Марскіх паходаў шлях салоны
І «Энеіды» ўладны смех,
Палтавы ціхае карона.

Гарачай думы Кабзара
Узлёты зорна-агнявыя,
І малаток Каменяра,
І струны Лысенкі жывыя,
І славы залатой зара
Над Занькавецкаю Марыяй.

Будзь баслаўлёны, працы пот,
Цяжкія гроны вінаграду,
Кляны над плынню ясных вод
І мудрае святло лампады,
Пародненых сцягоў узлёт
Наўкруг Крамлёўскай аграмады.

Будзь баслаўлёна, сінь азёр,
І Псёл, і сад у руце-мяце,
Народа дух, што не памёр,
Непадуладны ён гармаце.
У гроне залатых сясцёр
Будзь баслаўлёна, наша маці.

Ды баслаўлёны вы, браты,
У ззянні дружбы на свабодзе,
Абралі верна шлях круты,
Як рэкі ў веснім паўнаводдзі.
Будзь баслаўлёны славай ты,
Расіі-матухны народзе!

Хто можа асушыць Дняпро,
Хто можа сціхамірыць мора,
Хто золата і серабро
Схавае плугам у разоры,

Хто сэрца чыстага дабро
Абразіць крыўдаю сурова?

Настане дзень, настане час,
І разліецца зноў мядамі
Зямля, што асвяціў Тарас
Сваёй пакуты мазалямі,
Зямля, што акрыліў Тарас
Грамовагучнымі радкамі.

Хіба памерці можна ёй,
Пазбавіцца крыві і мовы,
Калі на правы клічуць бой
І стогны зраненай дубровы,
Калі яна ў сям'і адной,
Сям'і вялікай, вольнай, новай.

Ці ж ёй пазбыцца пекнаты,
Калі цвітуць зары павевы
І свет аглух да нематы
Ад рыку льва, ад болю, гневу,
Лісіцы брэшуць на шчыты,
І кліча дзіў паверху дрэва!

...Не! Сілы на зямлі няма
І сілы на зямлі не будзе,
Каб нас схіліла да ярма,
Каб растаптала нашы грудзі,
Мы помнім: партыя сама
Каля стырна на варце, людзі!

Грыміць Дняпро, шуміць Сула,
І голас падалі Карпаты,
І кліч падольскага сяла
Чуцён Пуціўлю ў час расплаты.
Ці совы здужаюць арла?
Ці праўда ўбачыць свет праз краты?

Зямля-матуля! Знаеш ты
Свой шлях у буры, у нягодзе!

Паўстаў народ, гудуць масты,
Ракочуць рэкі ў веснаходзе!..
Лісіцы брэшуць на шчыты,
Ды сонца — устае на Ўсходзе!

1941

Янка Купала

Хто знаў яго, тым не забыць ніколі
Яго вачэй праменнага цяпла,
Ён рыцарам быў волі і святла,
Ён ворагам быў цемры і няволі.

Ён мовы беларускае алмаз
Граніў штодня любоўна і рупліва,
Братам-народам выграніўшы дзіва,
Як выграніў калісьці наш Тарас.

Вучыў усіх ён паважаць глыбока
Святыню працавітае рукі,—
І увайшоў наш Янка у вякі
Як вобраз Беларусі сінявокай.

1947

Ружы і вінаград

Дзяўчына з поля, прытаміўшыся, прыйшла
І, хоць вячэраць клапатліва кліча маці,
У кветнік — з цапкаю, дзе ружа расцвіла,
Дзе ціш настоена на цьмянай руце-мяце.

З дарогі дальняе вярнуўся машыніст,
Прапахлы дымам паравозным, пылам станцый,—
Да вінаградніку! — Ці тля часамі ліст
Дзе не пашкодзіла? Ну, трэба з ёй змагацца!

Калгасны росціць сад дапытлівы юнак
І дрэў апыльвання даследуе законы,
А як жа хораша над чорнай глебай мак
Пераліваецца, гарыць агнём чырвоным!

Мы дружым з працаю, што ў творчасць перайшла,
З хвалюючаю музыкаю сэрца дружым.
Людское шчасце мае два крылы арла:
Карысць і хараство і вінаград і ружы.

1955

Туга па маладосці

> Жыцця не шкода мне. Пакутлівая Лета
> Ўсіх паглыне. А шкода мне агню,
> Што ўскінуўся і ззяў аж пад сусветам.
>
> *А. Фет*

Якім бы быў я ёлупам жахлівым,
Калі б пачаў зайздросціць юнакам,
Чырванашчокім і бліскучавокім,
Або ў нікчэмную запаў я зайздрасць
Да дужых, да здаровых, да прыгожых,
Да маладых, якія, пэўна, слушна
Сябе залічваюць да ўладароў зямлі,
Да змены, што прыйшла табе і мне,
Мой неназваны і далёкі дружа!
Ды гэта было б трызненнем старэчым!
Шкада зарніц мне, што адпалымнелі,
І тых маланак, што адзіхацелі,
І першых трапятанняў ў сэрцы, на губах,
І першай той вясны, што знікла, нібы птах,
Парою ранняю ў сівеючым тумане.
Шкада і шчырых слёз па дарагому зману,
І горычы нямой, якая колькі раз
Мне арашала светлы маладзецкі час,
Як сок бярозавы, што па кары сплывае...

Шкада і прадчуванняў тых, што астываюць
Ад першых непагодных подыхаў вятроў...
Шкада прагалін між аблок-снягоў,
Палёту ластаўкі, што сіняй бліскавіцай
Імкне па-над зямлёй вяшчункай навальніцы,
І гаю стомленага — быццам ацяжэў
Ад салаўёў, ад рос, ад шчасця, шуму дрэў,
Шкада дзявочых белых рук, вачэй іх цёмных,
Шкада сну моцнага пасля начэй бяссонных,
Такіх жа, як і сон, як светацені йгра...
Шкада мне першага і ліха, і дабра,
І дружбы на ўвесь век, што згасла за хвіліну,
Хвілінных радасцей, што ў сэрцы век не згінуць,
Снягоў і снегіроў, узлётаў і няўдач...
Шкада нябёс, зямлі — ўсяго жыцця шкада!

1962

ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Прыналежнасць да агульнага славянскага этнічнага кораня, блізкасць моўная і культурная, блізкасць і нават агульнасць (у пэўныя перыяды) гістарычнага лёсу беларусаў і палякаў прадвызначылі і цесныя іх літаратурныя ўзаемаадносіны на працягу многіх вякоў. Гэтаму не змаглі перашкодзіць ні асобныя ваенныя канфлікты, ні жаданне польскіх улад і клерыкальных колаў (найперш у перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай і міжваеннай Польшчы) асіміляваць беларусаў, акаталічыць і апалячыць іх.

Калісьці кіраўнік польскай дзяржавы Юзаф Пілсудскі сказаў, што Польшча нагадвае яму абаранак, дзе самае каштоўнае — па краях. Сапраўды, ускраіны («крэсы») былой Рэчы Паспалітай, этнічна беларускія і ўкраінскія землі, у вялікай ступені сталі своеасаблівымі донарамі польскай навукі, палітыкі і культуры. У прыватнасці, на беларускай тэрыторыі ўзніклі такія метады польскага прыгожага пісьменства, як класіцызм (Адам Нарушэвіч, г. п. Лагішын Пінскага р-на, 1733—1796; Юльян Нямцэвіч, в. Скокі Брэсцкага р-на, 1757—1841), сентыменталізм (Францішак Князьнін, г. Віцебск, 1750—1807), рамантызм (Адам Міцкевіч). З Беларуссю сваім паходжаннем звязаны нацыянальны герой Польшчы, Францыі і ЗША Тадэвуш Касцюшка (фальварак Мерачоўшчына Івацэвіцкага р-на, 1746—1817), заснавальнік польскай оперы Станіслаў Манюшка (фальварак Убель Чэрвеньскага р-на, 1819—1872), класікі польскай літаратуры Адам Міцкевіч, Юзаф Крашэўскі, Эліза Ажэшка. Ды і сам Юзаф Пілсудскі паходзіў з беларуска-літоўскага памежжа. Ён добра валодаў беларускай мовай. У адной з анкет падчас арышту яго царскай ахранкай у графе «нацыянальнасць» ён нават запісаў: «беларусін». Можна назваць

і шэраг іншых імён польскіх культурных і палітычных дзеячаў ранейшага і пазнейшага часу, сваім паходжаннем або асноўным месцам жыхарства звязаных з беларускімі і ўкраінскімі землямі і на якіх пэўны, а часам значны ўплыў аказалі ўсходнеславянскія мовы і культуры.

У сваю чаргу польская асвета, культура, літаратура ў многім паўплывалі на станаўленне і развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу беларускага народа. Прыгадаем, што Ягелонскі універсітэт у Кракаве стаў alma mater не толькі для Францішка Скарыны і Сымона Буднага, але і для многіх іншых жыхароў Вялікага княства Літоўскага. Лацінская мова, якая ў тыя часы была ў Еўропе міжнароднай, мовай асветы і культуры, дазваляла нашым продкам паступаць у еўрапейскія навучальныя ўстановы, пісаць на гэтай мове творы, якія тут жа станавіліся вядомыя на ўсёй еўрапейскай тэрыторыі. Як прыклад — паэтычная творчасць Міколы Гусоўскага, публіцыстыка Сымона Буднага, лацінамоўныя вершы Андрэя Рымшы, Сімяона Полацкага, Міхала Карыцкага і інш. Зрэшты, гэтыя, як і некаторыя іншыя, літаратары ў той ці іншай меры карысталіся ў сваёй творчасці і польскай мовай. Несумненна, іх лацінамоўная і польскамоўная творчасць уздзейнічала так ці інакш і на развіццё нацыянальнага польскага пісьменства.

На жаль, пасля заключэння ў 1569 г. паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім Люблінскай уніі і ўтварэння адзінай дзяржавы — «Рэчы Паспалітай двух народаў» (так афіцыйна называлася створаная саюзная дзяржава) — пачалося паступовае, планамернае апалячванне беларускага насельніцтва. На рэлігійным узроўні яно праводзілася шляхам акаталічвання праваслаўных беларусаў, чаму, у прыватнасці, садзейнічала Брэсцкая унія (1596). Што да дзяржаўнага ўзроўню (а агульнай сталіцай стаў польскі Кракаў), то тут быў выкарыстаны яшчэ ў часы Рымскай імперыі выпрабаваны механізм: «Чыя мова, таго і ўлада». Як вядома, дзяржаўнай мовай ВКЛ была беларуская ў яе літаратурна-пісьмовым варыянце (старабеларуская, або «руськая»). Дарэчы, на гэтай мове напісаны асобныя граматы польскага караля Уладзіслава II (Ягайлы), у тым ліку князю Скіргайлу (1387). На гэтую мову

перакладзены з лацінскага арыгінала Вісліцкі статут (1347). Урэшце, гэта мова ў якасці адзінай дзяржаўнай была замацавана ў Статуце ВКЛ (1588). Аднак не прайшло і паўтары сотні гадоў пасля ўзнікнення «саюзнай» Рэчы Паспалітай, як сойм гэтай дзяржавы пастанавіў: адзінай дзяржаўнай мовай лічыцца польская (1696).

Усе названыя акалічнасці прывялі да ўзнікнення з'явы, якую можна назваць беларуска-польскай літаратурнай агульнасцю. На тэрыторыі Беларусі пачалі стварацца вершаваныя, празаічныя і драматычныя творы, польскія па мове і краёва-беларускія (ліцвінскія) па змесце. Узнікла так званая беларуская (ліцвінская) школа польскай літаратуры, якая налічвала дзесяткі імён паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў. Яна існавала не толькі ў XVI—XVIII стст., у перыяд Рэчы Паспалітай, але і пазней, калі з канца XVIII ст. гэтая дзяржава, падзеленая паміж Расіяй, Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй, знікла ■ палітычнай карты свету. У канцы XVIII—XIX ст., у сувязі з прабуджэннем нацыянальнай самасвядомасці насельнікаў беларускіх зямель, з яе лона спакваля пачала вызваляцца і ўласна беларуская літаратура — літаратура на беларускай мове. Хаця, як мы ведаем, да канца XIX ст. нашы пісьменнікі, нават тыя, што свядома пачалі ўжываць у сваёй творчасці родную беларускую мову (Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Аляксандр Рыпінскі, Вінцэсь Каратынскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Лучына, Францішак Багушэвіч і інш.), па розных прычынах (забарона друку на беларускай мове, стылёвая яе нераспрацаванасць, прыніжанасць яе сацыякультурнага статуса і інш.) карысталіся ў сваёй творчасці і мовай польскай.

Узнікненню ўласна беларускай літаратуры спрыялі, у прыватнасці, высокія словы пра беларусаў і беларускую мову выдатнейшых польскіх пісьменнікаў, сваімі радаводнымі каранямі звязаных з беларускай зямлёй. Такіх, напрыклад, як Адам Міцкевіч. У прыватнасці, у лекцыях пра славянскія літаратуры, якія ён чытаў у Калеж дэ Франс (Парыж) у 1840—1843 гг., студэнты маглі пачуць наступнае: «Мова поўдня Расіі — маларуская, на якой гаворыць амаль дзесяць мільёнаў чалавек, бясспрэчна, самая музычная, самая паэтычная і звонкая... На беларускай мове,

якую называюць русінскай альбо літоўска-русінскай, таксама размаўляе каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і выдатна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для сваёй дыпламатычнай перапіскі. Мова велікаросаў... вылучаецца багаццем і чысцінёй, але ў ёй няма ні цудоўнай прастаты беларускай мовы, ні гарманічнасці і музычнасці маларускай...» Безумоўна, такія выказванні вялікага польскага паэта (а ён ужо быў аўтарам славутага «Пана Тадэвуша») усялялі ў сэрцы студэнтаў (а сярод іх былі і выхадцы з гістарычнай Літвы) веру ў магчымасць і неабходнасць стварэння яшчэ адной славянскай — а менавіта беларускай — літаратуры. Ёсць звесткі, што і сам Міцкевіч спрабаваў пісаць на «самай багатай і самай чыстай гаворцы», якую ён цудоўна ведаў з маленства, але творы тыя, на жаль, не захаваліся. Другі класік польскай літаратуры XIX ст. Уладзіслаў Сыракомля, яшчэ адзін ураджэнец Беларусі, горача падтрымліваючы творчасць Дуніна-Марцінкевіча на беларускай мове, таксама ўслаўляў яе: «Прыгожае гэта адгалінаванне славянскай мовы — крывіцкі дыялект, і то старадаўні! Бо гэта мова нашага Літоўскага Статуту... бо смела можна сказаць, што гаварылі на ёй тры чвэрці насельніцтва Літвы ранейшай, народныя нізы, шляхта і магнаты... Пан Марцінкевіч, выдатна адчуваючы дух і найдалікатнейшыя адценні крывіцкай мовы, першы адважыўся з большым размахам сам пісаць творы на нашай народнай гаворцы...» Хіба такія словы з вуснаў Сыракомлі не падтрымлівалі свайго калегу ў яго беларускамоўнай творчасці, не заахвочвалі і іншых пісьменнікаў да творчасці на «крывіцкай мове»?!

У XIX ст. завязваюцца цесныя творчыя стасункі паміж асобнымі беларускімі і польскімі (найперш па культурнай арыентацыі) пісьменнікамі. Такія сяброўскія адносіны звязвалі Дуніна-Марцінкевіча і Юльяна Крашэўскага, Янку Лучыну і Марыю Канапніцкую, Багушэвіча і Ажэшку. Новага ўзроўню беларуска-польскія ўзаемасувязі дасягнулі з пачатку XX ст., калі нарэшце ўзніклі Польшча і Беларусь як асобныя дзяржавы, а іх літаратуры і культуры атрымалі новыя стымулы для свайго развіцця. Не толькі беларускі

народ заняў «свой пачэсны пасад між народамі» (Янка Купала). Пачэсны пасад заняла і яго мастацкая літаратура, якая на роўных пачала ўзаемадзейнічаць з іншанацыянальнымі літаратурамі Еўропы і свету.

Праўда, на жаль, новая Польская дзяржава, у склад якой паводле Рыжскага дагавора 1921 г. увайшла вялікая частка беларускіх і ўкраінскіх зямель (іх афіцыйна сталі называць «крэсамі» — ускраінамі), пачала праводзіць у дачыненні да беларусаў і ўкраінцаў асімілятарскую палітыку. Зачыняліся адкрытыя яшчэ да 1921 г. беларускія школы і гімназіі, перыядычныя выданні, грамадска-культурныя ўстановы. Многія беларусы ў пошуках працы і адукацыі павінны былі выязджаць у заходнееўрапейскія краіны або нелегальна пераходзіць польска-савецкую мяжу. Аднак нельга ўжо было спыніць ні сацыяльна-палітычных, ні сацыякультурных працэсаў на спрадвечна беларускіх этнічных землях. Тым больш што на ўсходзе ў складзе СССР існавала маладая беларуская рэспубліка, дзе — няхай сабе і не заўсёды ў спрыяльных умовах — усё ж развівалася «нацыянальная па форме, сацыялістычная па змесце» беларуская культура. Больш таго: у БССР была звернута ўвага і на польскую культуру. Там былі адкрыты польскія школы, працаваў Польскі дзяржаўны вандроўны тэатр, выходзіла некалькі газет на польскай мове, пры Інбелкульце быў створаны польскі сектар, у складзе Саюза пісьменнікаў — польская секцыя і г. д. Перакладаліся кнігі польскіх пісьменнікаў, у тэатрах ставіліся спектаклі па п'есах польскіх драматургаў.

У супрацьвагу польскім уладам, у Заходняй Беларусі прагрэсіўныя польскія дзеячы, у тым ліку пісьменнікі, як маглі спрыялі беларусам. У Вільні дзейнічалі Таварыства беларускай школы, Беларускі студэнцкі саюз, Цэнтральны саюз культурных і грамадскіх арганізацый, знаходзілася кіраўніцтва Беларускай сялянска-работніцкай грамады — масавай заходнебеларускай арганізацыі, якая, апрача іншага, садзейнічала развіццю беларускай культуры і асветы. Працягваў сваю дзейнасць Беларускі музей. У Вільні ў міжваенны час выходзіла звыш 100 беларускамоўных часопісаў і газет («Шлях моладзі», «Калоссе», «Маланка»,

«Беларускі летапіс», «Наша воля», «Хрысціянская думка» і інш.). Тут у розны час жылі і працавалі беларускія пісьменнікі Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Ігнат Дварчанін, Максім Танк, Міхась Машара, Наталля Арсеннева, мастакі Пётра Сергіевіч, Язэп Драздовіч, музычныя і грамадскія дзеячы Рыгор Шырма, Генадзь Цітовіч, Адам Станкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі і інш. Несумненна, без падтрымкі з боку не толькі знаных польскіх палітыкаў і дзеячаў культуры, але і простых палякаў утрымліваць пэўныя ўстановы і арганізацыі, выпускаць асобныя і перыядычныя выданні, атрымаць нават звычайную працу было б нельга. Пра гэта, у прыватнасці, добра сведчаць тагачасныя дзённікі маладога Максіма Танка, сабраныя ў кнізе «Лісткі календара». У кнізе — дзесяткі прозвішчаў віленскіх, варшаўскіх, львоўскіх польскіх літаратараў, грамадскіх дзеячаў, якія непасрэдна ці апасродкавана падтрымлівалі жаданне беларусаў «людзьмі звацца», быць гаспадарамі на сваёй тэрыторыі, развіваць сваю нацыянальную культуру, літаратуру, мову. Сам Максім Танк выдаў у віленскіх друкарнях чатыры кнігі паэзіі: «На этапах» (1936), «Журавінавы цвет» (1937), «Нарач» (1937), «Пад мачтай» (1938). Несумненна, паэтычных вышынь ён не дасягнуў бы, калі б не быў знаёмы з творчасцю такіх польскіх пісьменнікаў — сваіх сучаснікаў (а з некаторымі — і асабіста), як Юліян Тувім, Ежы Путрамант, Чэслаў Мілаш, Марыян Чухноўскі, Андрэй Струг, Станіслаў Ежы Лец, Бруна Ясенскі, Ян Гушча, Казімеж Яворскі. Асобныя з іх прапагандавалі творчасць Максіма Танка, перакладалі яго вершы на польскую мову. У сваю чаргу беларускі паэт перакладаў творы польскіх пісьменнікаў, а праз пасрэдніцтва польскамоўных перакладаў — і заходнееўрапейскіх літаратараў на беларускую мову.

У XX ст. узнік беларуска-польскі мастацкі ўзаемапераклад. Праўда, яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Дунін-Марцінкевіч зрабіў спробу перакласці «Пана Тадэвуша» на беларускую мову, але царскія цэнзары пусцілі пад нож той пераклад. Другую такую спробу ажыццявіў Аляксандр Ельскі, якому ў 1892 г. у Львове ўдалося надрукаваць пераклад першай часткі паэмы. Аднак толькі ў XX ст. гэты геніяльны твор

цалкам загучаў па-беларуску, ды ажно ў трох розных узнаўленнях — Бранiслава Тарашкевiча, Пятра Бiтэля i Язэпа Семяжона. У перакладзе на беларускую мову з'явiлiся i iншыя творы таго ж Мiцкевiча, а таксама Юльюша Славацкага, Юзафа Крашэўскага, Генрыка Сянкевiча, Элiзы Ажэшкi, Канстанты Iльдэфанса Галчынскага, Уладзiслава Бранеўскага, Чэслава Мiлаша, Вiславы Шымборскай i iнш. З другога боку, i беларуская лiтаратура змагла прадставiць на суд польскага чытача творы высокай мастацкай вартасцi. Вершы, паэмы, раманы, аповесцi Янкi Купалы, Якуба Коласа, Максiма Багдановiча, Кузьмы Чорнага, Максiма Танка, Янкi Брыля, Iвана Мележа, Iвана Шамякiна, Васiля Быкава, Уладзiмiра Караткевiча, Iвана Пташнiкава, Вячаслава Адамчыка i iншых беларускiх лiтаратараў арганiчна загучалi ў стыхii польскай мовы. У перакладзе Чэслава Сенюха з'явiўся поўны польскi пераклад паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» — гэтай своеасаблiвай вiзiтнай карткi беларускага прыгожага пiсьменства.

Сучаснаму беларуска-польскаму лiтаратурнаму i ўвогуле культурнаму ўзаемадзеянню спрыяе вывучэнне польскай мовы ў розных навучальных установах Беларусi i адпаведна беларускай мовы — у Польшчы. З 1956 г. у Варшаўскiм унiверсiтэце iснуе кафедра беларусiстыкi. Падобная кафедра польскай фiлалогii створана ў Гродзенскiм дзяржаўным унiверсiтэце iмя Янкi Купалы. У Беларусi спецыяльнасць «паланiстыка» можна набыць не толькi ў Гродне, але i ў Мiнску, Магiлёве i некаторых iншых гарадах. Беларускiя школьнiкi ў курсе лiтаратуры вывучаюць творчасць Мiцкевiча, Крашэўскага, Ажэшкi, Славацкага. Польская дыяспара Беларусi (а яна налiчвае звыш 400 тысяч чалавек) мае свае грамадска-культурныя таварыствы, мастацкiя калектывы, перыядычныя выданнi (газета «Głos z-nad Niemna», часопiс «Magazyn Polski»), нядзельныя i звычайныя сярэднiя польскiя школы (у Гродне, Ваўкавыску, Сапоцкiне) i iнш. У беларускiх тэатрах ставяцца спектаклi па п'есах польскiх драматургаў, у кiнатэатрах iдуць польскiя фiльмы. У гэты ж час для больш чым 50 тысяч беларусаў Польшчы, якiя жывуць пераважна на Беласточчыне, створана 21 грамадскае аб'яднанне, найбольшае з якiх — «Беларускае

грамадска-культурнае таварыства». З 1956 г. выходзіць штотыднёвая беларускамоўная газета «Ніва», выдаюцца штогоднія «Беларускія календары», навуковыя і мастацкія творы. Адкрыты дзве беларускія гімназіі, яшчэ ў 40 школах беларуская мова і літаратура вывучаюцца як асобныя прадметы. Каля дзесяці пісьменнікаў (Алесь Барскі, Ян Чыквін, Сакрат Яновіч, Міра Лукша і інш.), якія пішуць на беларускай мове, прыняты ў Саюз польскіх пісьменнікаў.

Асобныя вучоныя з беларускага і польскага боку прысвяцілі сябе даследаванню беларуска-польскіх літаратурных узаемаадносін. Гэта Адам Мальдзіс, Валянціна Гапава, Уладзімір Казбярук, Уладзімір Мархель, Святлана Мусіенка (Беларусь), Аляксандр Баршчэўскі, Базыль Белаказовіч, Фларыян Няўважны, Тэлесфор Позьняк, Францішак Сяліцкі, Марыя Чурак (Польшча) і інш. Далейшаму развіццю беларуска-польскіх культурных узаемасувязей актыўна спрыяюць пасольствы — Польшчы ў Беларусі і Беларусі ў Польшчы.

АДАМ МІЦКЕВІЧ
(1798—1855)

Вялікі польскі паэт, пачынальнік рамантызму ў польскай літаратуры — наш зямляк. Нарадзіўся Адам Міцкевіч на хутары Завоссе непадалёку ад Навагрудка. Скончыў Навагрудскую дамініканскую школу (1815) і Віленскі універсітэт (1819), затым чатыры гады выкладаў лацінскую мову ў адной з гімназій Коўна. У студэнцкі час разам са сваімі таварышамі (сярод якіх быў і Ян Чачот) арганізаваў тайныя таварыствы філаматаў і філарэтаў, што аб'ядналі патрыятычна настроеную моладзь. Таварыствы былі выкрыты царскай ахранкай, іх удзельнікаў пакаралі турэмным зняволеннем і ссылкай у Сібір, у розныя аддаленыя губерні Расійскай імперыі. Міцкевіч апынуўся ў Пецярбургу, жыў у Маскве і Адэсе. У Расіі ён пазнаёміўся і пасябраваў з дзекабрыстамі К. Рылеевым і А. Бястужавым, рускімі паэтамі А. Пушкіным, А. Грыбаедавым, В. Жукоўскім, Я. Баратынскім і інш. З дапамогай свайго земляка, ураджэнца Міншчыны Фадзея Булгарына атрымаў замежны пашпарт і ў 1829 г. назаўсёды пакінуў Расію. Так сталася, што да канца жыцця паэт так і не змог ступіць нагой на зямлю ні роднай Беларусі (Літвы — як тады па традыцыі называлі і як сам ён называў гэты край), ні Польшчы. Жыў у Прусіі, Швейцарыі, Італіі, найдаўжэй — у Францыі. Памёр у Канстанцінопалі. Пахавалі яго на польскіх могілках пад Парыжам, у 1890 г. прах паэта перавезлі ў Кракаў і перазахавалі ў Вавелі, побач са славутымі польскімі дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі.

Вершы Міцкевіч пачаў пісаць яшчэ ў юнацкім узросце. Адразу звярнуўся да гісторыі, фальклору, сацыяльных і нацыянальных патрэб роднага краю (паэмы «Мешка, князь Навагрудка», «Бульба» і інш.). Патрыятызмам, свабодалюбствам, сацыяльным аптымізмам прасякнуты «Песня філарэтаў», «Ода да маладосці» (абедзве — 1820), якія сталі своеасаблівым гімнам для некалькіх пакаленняў польскай і беларускай моладзі. Сцвярджаючы прынцыпы новага літаратурнага метаду рамантызму і ў літаратурнай практыцы, і ў тэорыі (артыкул «Пра рамантычную паэзію»), імкнучыся да нацыянальнай своеасаблівасці літарату-

ры, Міцкевіч стаў асвойваць яшчэ некранутыя пісьменніцкай увагай багатыя радовішчы беларускай міфалогіі, вуснай народнай творчасці. Вершы яго «ліцвінскай» тэматыкі («Свіцязь», «Свіцязянка» і інш.) склалі арыгінальны цыкл «Балады і рамансы», што ўвайшоў у першы том зборніка «Паэзія» (Вільня, 1822). Беларуская міфалогія і фальклор знайшлі ўвасабленне і ў другім томе яго «Паэзіі» (1823) — у заснаваных на народных паданнях і вераваннях паэмах «Дзяды» (часткі II і IV) і «Гражына». Ужо гэтыя дзве першыя паэтычныя кнігі маладога Міцкевіча засведчылі яго геніяльнасць.

У 1834 г. Міцкевіч апублікаваў свой галоўны твор — эпічную паэму «Пан Тадэвуш», дзеянне ў якой адбываецца ў цэнтральнай Беларусі напярэдадні і ў час вайны 1812 г. У паэме намалявана цэлая галерэя запамінальных вобразаў — прадстаўнікоў мясцовай шляхты, сялян, святароў, вайскоўцаў, пададзена шырокая карціна народнага жыцця, побыту, створаны яскравыя пейзажныя малюнкі, у якіх і сёння ўгадваюцца краявіды Навагрудчыны, Налібоцкай пушчы. Толькі «Новая зямля» Якуба Коласа — другога Міцкевіча — можа паспрачацца з «Панам Тадэвушам» у паказе беларускай прыроды ў яе непаўторнасці і разнастайнасці, у розныя поры года і ў розны час сутак. «Пан Тадэвуш» — гэта мастацкая энцыклапедыя жыцця Літвы-Беларусі канца XVIII — пачатку XIX ст., напісаная геніяльнай рукой паэта-патрыёта. Узнікшы прыблізна ў адзін час з «Яўгеніем Анегіным» (1830) А. Пушкіна і «Фаўстам» (1832) Ё. В. Гётэ, твор гэты адкрыў усяму чалавецтву непаўторнасць насельнікаў і прыроды яшчэ аднаго кутка зямлі, што быў да таго часу terra incognita.

Як і ў шэрагу іншых твораў Міцкевіча, у «Пане Тадэвушы» знайшлі адлюстраванне асобныя беларускія народныя звычаі, вераванні, абрады, міфалагічныя ўяўленні, легенды і паданні, а сама польская мова паэмы перасыпана беларусізмамі, якія дапамагаюць стварыць непаўторны рэгіянальны каларыт.

Творчасць Міцкевіча аказала вялікі ўплыў на развіццё новай беларускай літаратуры, на станаўленне ў ёй не толькі рамантызму, але і рэалізму. Не дзіва, што многія беларускія пісьменнікі звярталіся да асобы свайго геніяльнага земляка (Язэп Пушча, Максім Танк, Міхась Калачынскі і інш.), вярталі яго творам беларускае гучанне (Янка Купала, Сяргей Дзяргай, Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Мархель, Серж Мінскевіч і інш.). У Беларусі шырока ўвекавечана памяць пра паэта: у Навагрудку працуе Дом-музей А. Міцкевіча (філіял — у Завоссі) і насыпаны Курган памяці ў яго гонар, у Мінску яму ўстаноўлены арыгінальны помнік і інш.

Творы Міцкевіча падаюцца паводле наступных выданняў:

Міцкевіч Адам. Вершы і паэмы. Мінск: Маст. літ., 2000 (пераклад паэмы «Гражына» Пятра Бітэля).

Міцкевіч Адам. «Зямля навагрудская, краю мой родны...» Мінск: Беларусь, 1969 (пераклалі: «Свіцязь» — Антон Бялевіч; «Свіцязянка», «Рыбка», «Люблю я» — Аляксей Зарыцкі; «Лілеі» — Максім Танк).

Міцкевіч Адам. Да Нёмна. Мінск: Бел. навука, 1998 (верш «Да Нёмана» ў арыгінале і ва ўзнаўленнях Альбіна Стаповіча, Юркі Гаўрука, Алеся Салаўя, Міхася Дуброўскага, Хведара Жычкі, Кастуся Цвіркі, Рыгора Барадуліна, Пятра Бітэля, Васіля Жуковіча, Уладзіміра Мархеля, Яўгена Міклашэўскага).

Зачын паэмы «Пан Тадэвуш» у арыгінале і ў беларускіх перакладах перадрукоўваецца з наступных выданняў:

Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт. Творы. Мінск: Маст. літ., 1984 (пераклад Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча).

Ельскі Аляксандр. Выбранае. Мінск: Бел. кнігазбор, 2004 (пераклад Аляксандра Ельскага).

Міцкевіч Адам. Пан Тадэвуш. Мінск: Навука і тэхніка, 1981 (пераклад Браніслава Тарашкевіча).

Міцкевіч Адам. Пан Тадэвуш. Мінск: Бел. Фонд Культуры, 1998 (арыгінал і пераклад Пятра Бітэля).

Міцкевіч Адам. Пан Тадэвуш. Мінск: Маст. літ., 1985 (пераклад Язэпа Семяжона).

Пан Тадэвуш

Паэма

(Зачын)

Litwo! Ojczyzno moja! Ty jesteś jak zdrowie;
Ile cię trzeba cenić, ten tylko się dowie,
Kto cię stracił. Dziś piękność twą w całej ozdobie
Widzę i opisuję, bo tęsknię po tobie.

Літва! — родна зямейка! Ты маўляў здароўе,—
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе!
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раі,
І вось крывавы роніць слёзы ў чужым краі!
Цяпер-то, як ты красна, я чую, я бачу
І апішу, бо горка ўсцяж па табе плачу!

Пераклад Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1859)

Літва! Мая Айчына! Ты здароўю роўна;
Так веле той цябе ацэніць, хто, пажыўшы поўна,
Цябе ўтраціў! Цяпер красу тваю я лепей знаю
І апішу, бо цяжка па табе скучаю.

Пераклад Аляксандра Ельскага (1892)

Радзіма Літва! Як здароўе, так ты дарагая.
Як шмат цябе трэба цаніць, толькі той і спазнае,
хто страціў цябе. Ўсю красу тваю бачу дзіўную
й сягоння апісваю, бо па табе я сумую.

Пераклад Браніслава Тарашкевіча (1931)

Літва! Ты як здароўе ў нас, мая Айчына!..
Што варта ты, ацэніць той належным чынам,
Хто цябе ўтраціў. Вось красу тваю жывую
Зноў бачу і апісваю, бо скрозь сумую.

Пераклад Пятра Бітэля (1953)

Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:
Не цэнім, маючы, а страцім залатое —
Шкада, як і красы твае, мой родны краю.
Тугою па табе тут вобраз твой ствараю.

Пераклад Язэпа Семяжона (1985)

Гражына

Літоўская аповесць

(Скарочана)

[...] З гары высокай замак Навагрудка,
Ад месяца прыняўшы пазалоту,
Праз насыпы і рова развароты
Адкідваў ценю слуп, руды і гнуткі,
Глыбока ўніз, туды, адкуль з цясніны
Вада ўздыхала з-пад глыбокай ціны.

Агні ўжо згаслі ў горадзе і ў замку,
І толькі зрэдку адгукнецца варта
То з вежы, то з другога дзесь напрамку.
Ды вось зблізжацца стала штосьці шпарка:
Якіясь людзі на шляху маячаць,
За кожным цень чарнее сукаваты.
Імчацца хутка — коннікі, няйначай,
А свецяць іхнія, напэўна, латы.
Заржалі коні, грукнула падкова:
Тры рыцары праехалі ўздоўж рова,
Спынілі бег, і першы з іх ударыў

З латуннай трубкі голасам аб хмары,
А потым загрымеў другі раз, трэці.
І з вежы рог адкажа цвёрдым гукам.
Завала бразнула, вось факел свеціць,
І мост пад'ёмны заскрыпеў, загрукаў.

На тупат конскі падбягае варта
Пабачыць рыцараў чужых і зброю.
На першым панцыр быў з выдатным гартам,
Якія немцы надзяваюць к бою,
І чорны крыж на белай меў накідцы,
І крыж нагрудны ў залатой пятліцы;
Кап'ё тырчэла, ззяла трубка ў змроку,
Мігцеў ружанец, меч блішчаў ля боку.
Пазналі госця ўсе па гэтых цацках,
Адразу зашаптала грамада ўся:
«Дык гэта ж цюцька з псярні злой крыжацкай! —
Пузач, крывёй бо прускай упіваўся.
Каб тут вачэй было не так багата,
Уміг скупаўся б у балоце плюха —
Пад мост я ўпхнуў бы чуб, пыхліва ўзняты!»
А ён, нібы не чуе, верне вуха,
Ды зразумеў усё, бо дзіву даўся —
Ў людской гаворцы, мабыць, разбіраўся.

«Ці князь у замку?» — «Ёсць, але такою
Парой яго трывожыць немагчыма,
Бо нельга парушаць яго спакою,
Вось заўтра...» — «Заўтра? Не! Ніякім чынам!
Хоць позні час, але ідзіце скора
І пра пасольства князю далажыце.
Прымаю на сябе гнеў Літавора.
Пярсцёнак гэты толькі пакажыце,
І досыць, бо як знак ён гэты ўбачыць,
Пазнае, хто я, што прыезд мой значыць».

Навокал ціша. Замак спіць спакойна.
Якое ж дзіва! Поўнач, час асенні.
Чаму ж у Літаворавых пакоях,

Як зорка, лямпа разганяе цені?
Вярнуўся сёння — недзе быў далёка,
Спачынак трэба зморанаму воку.

А ён не спіць. Паслалі вартавога:
Не спіць. Але не знойдзецца ў палацы
З паноў і дворні ўсёй такога,
Хто б смеў к яго парогу набліжацца.
Дарма пасол і лаецца і просіць —
Ды просьбы і пагрозы тут без сілы.
Нарэшце Рымвіда будзіць рашылі.
Ён волю пана носіць і заносіць,
Ён першы ў радзе, ён найлепшы рыцар,
Яго князь называў другім сабою.
У полі, ў замку кожнаю парою
Ён права меў да князя даступіцца.

Пакой у змроку. Са стала іскрынкай
Бляск цьмяны каганца рассейваў цені,
А князь хадзіў наўкол беспарапынку,
Пасля на месцы стаў у задуменні.
Пра немцаў Рымвідавых слоў нямнога
Паслухаў, ды не адказаў нічога.
Бялее, чырванее і ўздыхае —
Відаць, грызе яго туга ліхая.
Ідзе да лямпы, каб яе паправіць,
І, быццам кнот сціраючы, нагладка
Агеньчык прытушыў, замест убавіць,
Не ведаю, сумысля ці выпадкам.

Відаць, не мог пазбыць з душы цяжару
І весялейшым трохі паказацца,
А не хацеў, каб з постаці і з твару
Слуга пра справы пана мог дазнацца.
Зноў абыходзіць стаў пакой наўкола,
Але, калі мінаў акна квадраты,
Відаць у бляску месячнага кола,
Якое ў шыбы лезла цераз краты,
Чало, наморшчанае невясёла,

Зацяты рот, і вока бляск суровы,
І сумны твар, і ссунутыя бровы.

Пасля падаўся ў кут і сеў паспешна,
Старому загадаў прыстукнуць дзверы
І, макіруючы свае намеры,
Загаварыў панура і з насмешкай:

«Ты ж з Вільні вестку сам прывёз, Рымвідзе,
Што Вітаўт, пан наш моцны і ласкавы,
Рашыў мне княскі трон аддаць у Лідзе:
Мае па жонцы землі і дзяржавы,
Нібы свае ці з ратнага набору,
Свайму слузе рашыў даць — Літавору».

«І гэта праўда, князь...» — «Таму, з увагі
На дар, яго браць будзем урачыста:
Ты дай загад сцягі ўзяць для павагі,
Хай факелы палаюць прамяніста.
Дзе трубачы? Няхай, хоць час паўночны,
Ідуць у горад, стануць там на рынку,
І трубяць хай усім вятрам у вочы,
І трубяць хай датуль бесперапынку,
Пакуль усіх вайскоўцаў не разбудзяць.
Хай кожны зразу возьмецца за зброю —
Рыхтуе пікі і мячы да бою.
Каб мелі харч як коні, так і людзі.
Жанчыны хай паруплацца, каб есці
Хапіла кожнаму на дзень, да змроку.
Чый конь на пашы, зараз жа прывесці
І захапіць на цэлы дзень аброку.
А як з-за Шчорсаў выплыве світанне
І бліскне над магілаю Мяндога,
На Лідскай вуліцы хай войска стане,
Статут вайсковы захаваўшы строга!»

Так кажа князь. Як быццам бы размова
Была звычайная перад паходам,
Але чаму загад раптоўны, з ходу?

Чаму князь гэткі змрочны і суровы?
Чаму ў гаворцы ён за словам слова
Так сыпаў, быццам іх за раз раскіне?
Ды, мабыць, іх не сказана й паловы,
А рэшта, стоеная, ў сэрцы стыне.
Благое штось задумаў ён, дый годзе!
І голас з думкаю ў яго не ў згодзе.

І князь замоўк. Здавалася, чакае,
Што Рымвід пойдзе выканаць загады.
Ды той маўчыць, мо спосабу шукае,
Як думкам, раптам зблытаным, даць рады?
Хоць ён яшчэ не ўсё і разумее,
Ды праўду горкую адчуць умее.

А што ён зробіць! Князя добра знае
І ведае, што ён не мае вуха
Да нечых слоў, парады адхіляе,
Намеры носіць у глыбінях духу,
А як рашыў што, дык на перашкоды
Ніякай не звяртае больш увагі.
Ды Рымвід, верны князю назаўсёды,
Разумны ў радзе, слаўны сын адвагі,
Лічыў за ганьбу ў справу не ўмяшацца,
Дабра з якое век не дачакацца.
Маўчаць ці радзіць? — мучыла пытанне,
Але не доўгае было ваганне.

«Мой пане, да гульні ў нас і да бою
Заўсёды коні знойдуцца і людзі.
Адно скажы — і пойдзем за табою,
Ніхто пытаць, задумвацца не будзе!
І Рымвід твой не застанецца ззаду.
Ды меркаю аднолькавай не мерай
Людзей з натоўпу, з масы цёмнай, шэрай
І тых, што могуць даць табе параду.
І бацька твой, хоць і любіў самотна
Выношваць план, намер якісьці новы,

Ды перш чым меч падняць, склікаў ахвотна
На раду ў замак мудрыя галовы,
Дзе й я не раз выказваў проста, смела
Усё, што знаў, што ў сэрцы набалела.
Дык сёння мне прабач за шчыры голас,
Скажу, што думка вуснам падказала.
Я доўга жыў, і мой ссівелы волас
І спраў, і часу перажыў нямала,
Таму і бачу (толькі б не са шкодай!),
Што новай жыць збіраешся ўжо модай.
Калі ты ў Ліду вырушыш з паходам,
Каб там замацаваць сваю уладу,
Дык твой паход падобны да нападу,
Разлад пасее між тваім народам:
Здабычы гэта частка пажадае,
А ў кайданах апыніцца другая. [...]

Інакш рабілі, добра памятаю,
Князі літоўскія ў былыя годы,
Сталіцу пераносячы. Святая
Іх памяць застанецца назаўсёды.
Калі ты хочаш жыць старым парадкам,
Дык мне даверся, і ўсё пойдзе гладка.

Спачатку мы ўсім рыцарам абвесцім:
Няхай і тыя, што паблізу тутка,
І тыя, што жывуць у сёлах дзесьці,
Збіраюцца ў сталіцу нашу хутка.

Радні, панам загад дамо прывесці
Дружыны для бяспекі і аздобы
Тваёй шаноўнай княжацкай асобы.
Пакуль яны збяруцца, я тым часам
Магу наперад ехаць заўтра рана.
Забраўшы слуг з сабой і капелана,
З усім патрэбным на банкет запасам,
Каб загадзя ўжо быць сярод народу,
Сачыць, каб мяса ўсім хапіла й мёду.
Бо не адны рамеснікі, сяляне,
Але і панства ласа на прысмакі.

А як твая ўсім шчодрасць бачнай стане,
Тут ты якраз заслужышся падзякі.
Заўсёды так было ў Літве і Жмудзі.
Не верыш, дык спытай, хай скажуць людзі!»

Закончыў, стаў к акну, прамовіў з ходу:
«Падняўся вецер вунь, на непагоду.
Якісьці конь стаіць там каля вежы,
І рыцар на сядло успёрся збоку,
Два — коней водзяць там непадалёку.
Паслы нямецкія — відаць з адзежы.
Паклікаць іх? Ці, можа, воля пана
Цераз слугу ім будзе пераслана?»

Сказаўшы гэта, фортку зачыняе,
Нібы знячэўку побач аказаўся,
Аднак паслоў тых словам закранае,
Каб князь пра іх таксама адазваўся.

Тут Літавор такім прамовіў словам:
«Калі звяртаюся я ў чым па раду,
Сваёй не верачы, к чужым галовам,
Цаню я больш за ўсё тваю параду,
Бо ты даверу варты, чалавеча:
Юнак у бітве, ў радзе ты — старэча.
Хоць адкрываць я не люблю бясконца
Таемных спраў сваіх чужому воку,—
Намер, які народжаны у змроку,
Да часу нельга выстаўляць на сонца —
Падрыхтаванае няхай павісне
І, як пярун, ударыць перш, чым бліснe.
Я коратка пытанні ўсе збываю:
«Калі?»— «Ужо».— «Куды?»— «На Русь. Да Жмудзі».
«Не можа быць!»— «Павінна быць, і будзе!»...
Табе ж душу цяпер я расхінаю.

Таму загады я такія выдаў,
Таму іду раптоўна і пры зброі,
Што Вітаўт нездарма стаіць пад Лідай —

Намер нядобры, ведаю, ён тоіць:
Задумаў ён мяне ў свой стан занадзіць,
Каб там забіць. Збіраўся, словам, здрадзіць.

Ды ў нас з магістрам Ордэна тэўтонаў
Заключан дагавор: ён мне за збожжа
Сваёю збройнай сілаю паможа
Забраць, што нам належыць па законе.
Калі паслы магістравы за ровам,
Дык гэта знак, што ён трымае слова.
І перш чым згаснуць зоры задыяка,
Мы вырушым, а недалёка ў полі
Прымкнуць да нас тры тысячы ваякаў
На конях і пяхоты двойчы болей.
З яго дазволу, пры самім магістры,
Я выбраў крыжакоў, прыдатных к бою —
Вялікіх, дужых і на конях быстрых,
У панцыры закутых з галавою.
У сечы кожны з іх мастак вялікі
І лепш за нашых ужываюць пікі. [...]

Гатова ўсё. Пара даўно настала,
Цяпер жа Вітаўт, пэўны ў сваёй сіле,
Трымае ў Лідзе абаронцаў мала,
Дык нам ускочыць толькі і — накрылі!»

І Рымвід пад ударам гэтай весці
Стаяў знямелы ад здзіўлення, ў жалі,
А думкі спрэчным гуртам налятали,
Дык зноў стараўся іх да ладу звесці.
Ды справа пільная — далоў чаканне!
З вялікай крыўдаю прамовіў: «Пане!
Я не магу сваім вушам даць веры!
На брата брату трэба ўзняць далоні?
Вось ён на немцах вышчарбіў сякеры
І вострыць іх супроць сваіх сягоння!
Нязгода — зло, ды скончыцца бядою
Яднанне гэта. Мы ж — агонь з вадою!

Бывае часам, што сусед суседа,
З якім ці мала год прабыў у злосці,
Абдыме, змякчыць сэрца напаследак,
І сябрам назаве, і клікне ў госці.
Шмат горш, аднак, чым гнеўныя суседзі,
Жывуць з сабою ліцвіны і ляхі,
Ды і яны ў супольнай п'юць бяседзе,
Адны спачынак іх вартуюць дахі,
Мячы іх лучацца ў супольных войнах.
Але шмат горш, чым ліцвіны й палякі,
Спрадвеку ў нас не могуць жыць спакойна
І ўсцяж ваююць людзі і вужакі.
Аднак калі ліцвін к сабе ў парогі,
Як госця добрага, прымае вужа
І для хвалы багоў, пакінуўшы трывогі,
Яго ён корміць, дах дае ад сцюжаў,
Тады паўзе яму гад свойскі ў рукі,
З ім разам п'е і есць з той самай міскі,
І мірна цела доўгае гадзюкі
Дзіця спаўе, улезшы ў глыб калыскі.

А вось змяі крыжацкай не аблашчыш
Ні просьбай, хабарам, хоць лезь са скуры.
Ці ж мала ўперлі прусы і мазуры
Зямлі, дабра, людзей у тую пашчу?
Пажэрла столькі ўжо, а не зарвала —
На рэшту квапіцца, і ўсё ёй мала!

Калі мы не з'яднаемся, загінем.
Дарма штогод наладжваем паходы,
Іх вёскі палім, крышым іх цвярдыні,
Праклятаы Ордэн верх бярэ заўсёды!
Ён змей, якому галаву ссякаюць,
Замест якой дзесяткі адрастаюць.
Усе адсеч! Дарма той траціць сілы,
Хто хоча прымірыць нас з крыжаносцам!
Зайдзі ў палац, зірні ў будан пахілы,
Не знойдзеш больш ні ў горадзе, ні ў вёсцы
Таго, хто б іх хлусні даў веры,

Каб іх не абмінаў, як той халеры,
Каб не сказаў, што лепш загінуць сёння,
Чым іхняй дапамогі дачакацца.
Жалеза лепш гарачае ў далоні
Сціскаць, чым з немцам за руку вітацца!

Што Вітаўт страшыць? Ці ж без чужаніцы
Не зможам разгарнуцца мы ўжо ў полі?
Ці ж справа ўжо дайшла да той граніцы,
Што не рашыць яе па добрай волі?
Ці ж самі мы не ўрадзім анічога,
Збярогшы зброю нашу на чужога?
Чаму ты ўпэўнены, што тыя словы
Пра Вітаўтавы здрады і намеры
Не выдумка, не закід нейкі новы?
Пашлі мяне да князя, я праверу,
Адновім дагавор...» — «Пакінь, Рымвідзе,
Мы знаем Вітаўтавы дагаворы.
Такі дзьмуў вецер на яго йшчэ ўчора,
А сёння іншае на думку прыйдзе.
Я ўчора верыў, што ён праўду кажа,
Што можна Ліду браць мне ва ўладанне,
А сёння ён другое штосьь наважыў.
Прыкмеціўшы, што войска ў нашым стане
Паменшала, бо частку я адклікаў,
Стаіць пад Вільняй з сілаю вялікай
І весткі распускае, што лідзяне
Мяне прыняць за пана не схацелі.
Ён хоча Ліду ўзяць сабе! Круцель ён!
А мне ўжо быццам іншы край дастане!
Русь, пэўна, голую! Варагаў багны!
Бо, па-ягонаму, там наша месца.
Ён гоніць нас, братоў, але аб'есца,
Сціскаючы Літву ў кулак свой прагны!
Глядзі, што робіць! Як стаў падбірацца:
Ён б'е ў адно, хоць цераз дзве дарогі.
Адзін хацеў бы над усімі ўзняцца
І ўсю раўню зваліць сабе пад ногі. [...]

А вотчына мая з часоў Эрдвіла
Каб хоць на пядзю пашырэла.
Зірні вунь: вал дубовы пакрывіла,
А цэгла ў сценах дома пачарнела.
Прайдзі пакоі — ўсё, як за вякамі!
Дзе шкло ў мяне? Трафеі дзе з металаў?
Заместа золата — вільготны камень,
Замест кілімаў — мох расце з парталаў!
Што вынесці жадаў я з кожнае выправы?
Багацце? Не. Нічога, апроч славы!

А славаю вышэй за ўсе галовы
Узняўся Вітаўт і заняў высоты!
Яго імя, нібы імя Міндовы,
Сягоння славяць нашы вайдэлоты[1].
У гуках песні ці на струнах звонкіх
Вякамі Вітаўт будзе жыць, не змеркне!
А вось пра нас ці будуць хоць гамонкі?
Хто з забыцця імёны нашы верне? [...]

Пакуль дыханне мне ўздымае грудзі,
Пакуль рукі жалеза слухаць будзе
І конь крылаты будзе несці полем —
Той конь, якога з крымскага паходу
Я ўзяў сабе і даў табе другога,
А дзесяць іншых роўнага ім ходу
Раздам, хай толькі прагучыць трывога,—
Пакуль мой конь... пакуль магу яго я...»
Тут гнеў здушыў яму і дух, і словы.
Замоўк, ды раптам зазвінела зброя,
Ускочыў, задрыжаў, на ўсё гатовы.
Які ж прамень заззяў над ім высока?
Як зорка, адарваная ў блакіце,
Ляціць і жар страсае з доўгай ніці,
Так меч пад столь шугнуў і ў момант вока
Падлогу секануў, аж ад удару
Азваўся камень іскрамі пажару.

І зноў глухое надышло маўчанне,
Ды князь сказаў: «Дарэмныя размовы,

Вось ноч ужо даходзіць да паловы,
Другое пеўняў блізіцца пяянне...
Загад вядомы: будзьце ўсе гатовы,
Я лягу, адпачыну трохі духам,
Бо цела так адольвае знямога.
Тры дні не спаў! Хоць звонку цёмна, глуха,
Ды маладзік святлом пальецца з рога,
На досвітку ж чакае нас дарога.
Нашчадкам Кейстутавым горка выйдзе —
Пакінем попел ім, руіны ў Лідзе!»

Сказаўшы гэта, сеў, рукамі пляснуў —
Так клікнуў слуг, каб распранаді,
А потым лёг, знак даўшы адначасна,
Каб Рымвід не затрымліваўся ў залі.
А той, убачыўшы, што ўжо нічога
Яго прысутнасць больш не дапаможа,
Падаўся тут жа моўчкі да парога —
Дружыну рыхтаваць у падарожжа.

Перш даў загад трубіць на збор ваенны,
А потым скіраваўся зноў у замак.
Чаго? Прасіць загадаў тых адмены?
Ды не. Цяпер узяў другі напрамак,
Ідзе туды, дзе замка выступ цёмны
Крылом заходзіў аж за мост пад'ёмны,
Дзе быў княгініных пакояў ганак.

А жонкай князевай была ў час гэты
Гражына[2] з княства Лідскага князёўна.
Яе назвалі так, бо, безумоўна,
У ёй былі ўсе прыгажунь прыкметы.
Хоць выйшла ўжо з пары жыцця дзявочай
І ля паўдня жаночых год стаяла,
Краса княгіні кідалася ў вочы —
Яе аблічча дзве красы злучала.
Павагай здзівіць, свежасцю прывабіць,
І бачыш быццам і вясну і лета:
Румянец кветкі ўсё той самы, мабыць,

Хоць спее плод, на сонейку сагрэты.
Не толькі твар такі знайсці не проста —
Яна адна ў сталіцы і ў палацы
Раўняцца можа з Літаворам ростам
І станам стройным можа з ім раўняцца.
І пара княжая, калі часамі
Яе абступіць чэлядзь грамадою,
Нібы таполі горда над лясамі,
Ўзнімаецца высокай галавою.

Падобная ва ўсім аж да драбніцы,
Яна і сэрцам мужа паўтарала,
Любімыя заняткі маладзіцы
Не раз адкладвала і зброю брала.
Не раз на жмудскім скакуне гарачым
Ў рысінай шапцы, у мядзведжай свіце
Паміж стралкамі, як сапраўдны віцязь,
Бывала, полем ці дарогай скача.
На ўцеху мужу часта ў той адзежы
Сустрэчных абазнацца прымушала,
Не раз ад варты ці з высокай вежы
Пашану княскую яна прымала.

Вось так, з'яднаная любоўю, згодай,
Яна развеяць князеў смутак можа
І дзеліць з ім не толькі сэрца, ложак,
Але і справы ўлады над народам.
Вайна і суд, паход ці змова
Залежаць часта ад княгіні слова,
Хоць гэта іншым цалкам невядома.
Княгіня не раўня была кабетам,
Якія ўладаю сваёй над домам
Не могуць не хваліцца перад светам.
Яна перад чужым таіла вокам,
Якую сілу ў сэрцы мужа мела,
І мала з тых, што там жылі, пад бокам,
Пра гэта знала, праўду разумела.

А вось стары разумны Рымвід ведаў,
Дзе ёсць яшчэ адзіная апора,

І ён княгіні стаў выкладваць скора,
Што думаў і што з княжай знаў бяседы:
Тут выйдзе даўніх звычаяў абраза
І ганьба ўсім ад князевых наказаў.
Гражына вестку прыняла з трывогай,
Але яшчэ валодае сабою,
Нібы не верыць доказам старога,
Не паказаўшы тварам неспакою. [...]

«Што чую! Заўтра? Заўтра ўжо ён едзе?
Я не хачу, каб чуткі ўсцяж краіны
Пайшлі, што кроў была праліта недзе
І хтось загінуў за пасаг Гражыны.
Пайду я і на першай жа бяседзе...
Цяпер пайду, хоць познія гадзіны,
І перш чым ночы адплывуць туманы,
Я веру, дасць адказ ён пажаданы».

І разыходзяцца пасля размовы,
Трывогу ў сэрцы несучы абое:
Княгіня хутка са сваёй паловы
Пайшла цішком у князевы пакоі,
А Рымвід цераз двор паўз прыбудовы —
Пад дзверы князевы. І ў неспакоі,
Ўвайсці не смеўшы, на парог сядае,
Да шчыліны ўсім тварам прыпадае.

Чакаў нядоўга. Засаўка скрыгоча —
І постаць нейкая мільгнула ў белі.
«Хто там?» — сарваўся князь з пасцелі.
«Тут я»,— быў голас у адказ жаночы.
І словы гутаркі зашалясцелі.
Хоць Рымвід ведаў змест, ды рэха ночы
Глушыла галасы, якія ў зале
Аб сцены біліся і прападалі.

Гаворка то мацнела ўсхвалявана,
То заціхала, слова зловіш рэдка,
Чуваць больш голас панін, рэдка панаў,
Ён больш маўчаў, нібы ўсміхаўся едка.

Яна мо ўкленчыла там нечакана,
Бо ўскочыў з ложка князь ад просьбы гэткай,
Тлумачыў нешта хутка і нервова,
Пасля замоўк і не сказаў ні слова.
І стала ціха. Постаць тая ў белі
Пайшла к дзвярам, і кляпнулася клямка.
Ўпрасіла? Ці спрачацца не схацелі?
Вярнулася ў сваю палову замка
Княгіня. Князь падаўся да пасцелі,
Адразу лёг. Магчыма, гэта ціша
Ізноў яго ў сон моцны закалыша.

А Рымвід, пастаяўшы час каторы,
Пайшоў і бачыць: з левага балкона
Слуга з паслом вядзе перагаворы,
Наставіў вушы, ды не чуў і тону,
Бо вецер сеяў гукі на прасторы.
На браму паказаў слуга тэўтону,
І Рымвід зразумеў размову скора.
Ўскіпеў крыжак за гэткую абразу —
І на каня ў сядло ўзляцеў адразу. [...]

«Шчаслівa едзьце! Дай Бог, каб ніколі
Вы больш не ездзілі тут нашай сцежкай! —
Прамовіў Рымвід ім услед з усмешкай.—
Хвала княгіні! Праз яе ж найболей
Такая змена! Ну цяпер мне хто тут
Пахваліцца, што сэрца іншых знае?
Той гнеўны голас — доказ цвёрдай волі,
Пра слова вернага слугі не дбае!
Пазычыў бы, здаецца, ў птушак лёту,
Каб рынуцца на Вітаўта ўсёй сілай,
Слаўцо ж мядовае, усмешка мілай
Уміг адбілі да вайны ахвоту.
Ну што ж, забыўся я, сівабароды,
Пра іх гады і пра закон прыроды!»

Вось так гаворачы, ўзнімае вочы —
Мо промень лямпы дзе на краты ляжа,
Але дарма — навокал цемра ночы.

Тады назад на ганак зноў пакрочыў,
Бо, можа, князь пазваць яго накажа.
Дарма чакаў, пытаўся ў варты княжай.
Ідзе пад дзверы: цішыня ў пакоі,
Відаць, князь моцна спіць. Тут штось не тое...

Тут дзіва нейкае! Не ясна штосьці,
Якою сёння ўсё ідзе дарогай:
Вось толькі што выкрыкваў князь ад злосці,
Збірацца на вайну загадваў строга,
А спіць дагэтуль. Думаў ехаць рана,
Вунь раць даўно стаіць ужо ў чаканні,
А немцаў так адправілі пагана.
Хто ж вынес той загад? Прыдворны панін!

«Наколькі зразумеў я з іх размовы,
Хоць слоў і не пачуў амаль ні разу
Ды просьбы, голас пана так суровы?..
Няўжо яна без князевага ўказу
На крок такі рашылася бядовы,
Так верачы у моц сваёй пяшчоты?
Каб не прыйшлося ёй трымаць адказу
З-за гэткія ўсёй справы павароты!
Хоць смеласцю яна даўно здзіўляла,
Ды сёння меру яўна перабрала!»
І тут пасланец зблытаў разважанні:
Падходзіў ціха і міргаў здалёку —
Маўляў, хадзі хутчэй, бо кліча пані.
На ганку ўжо сустрэлі пакаёўку,
А ў сенях і княгіня сустракае —
Старога ўводзіць, дзверы замыкае.

«Стары мой дружа, кепскія падзеі,
Але ж у роспач кідацца не трэба;
Калі ўжо сёння нас звялі надзеі,
Дык заўтра мо ласкавей будзе неба.
Цяпер маўчаць нам трэба вельмі строга —
І з войскам, і паміж сабою.

Пасла адправім, хай жджэ дня другога,
Каб сёння князь паспешнасцю сваёю
Не абяцаў яму таго чагосьці,
Што будзе рад вярнуць, астыўшы з злосці.

А ты не бойся! Як яно ні будзе,
Намерам пана гэта не пашкодзіць.
І войска гэтаксама ўміг прыбудзе,
Калі ўсё ж князя час не ахалодзіць.
Збіраўся ехаць, ды яго намеры
Ў мяне, прызнаюся, не будзяць веры.

Пераступіўшы ледзьве ў дом парогі
І ледзь адклаўшы баявую зброю,
Не адпачыўшы ані дня з дарогі,
Няўжо сягоння зноў шукаў бы бою?»

«Што чую, пані?! Тут няма адкладу!
На жаль, пустыя нашы разважанні!
Ужо запозна! Бачу я з загадаў,
Што князь не будзе думаць аб чаканні,
Але пабачым... Ды усё ж наколькі
Карысныя былі ў вас з ім размовы?»
Гражына адказаць хацела, толькі
Тут перашкодзіў выпадак ім новы.
Пачуўся тупат конскі на дзядзінцы,
Задыханы пасланец убягае,
Прыносіць вестку ён, што там, пад гаем,
Па Лідскім прабягаючы гасцінцы,
Разведка наша языка дастала,
Што конніца тэўтонаў выйшла з бору,
За ёй — абоз, пяхоты йдзе нямала
І што, здаецца, на світанні, скора
Крыжацкія перадавыя часці
На замак раптам думаюць напасці.

«Дык хай цяпер да князя Рымвід скочыць,
Каб разбудзіць яго і хутка ўрадзіць,
Ці абарону ў замку лепей ладзіць,
Ці ў полі немцу глянуць смела ў вочы?»

Разведчык раіць падысці употай,
Бо ўжо яны не вельмі і далёка,
На конных выскачыць і ў момант вока,
Перш чым гарматы прыпаўзуць з пяхотай,
Разбіць райтараў[3]. «І абавязкова,
Як толькі конных вояў паразносім,
Уміг фускнехтаў[4] возьмем пад падковы
І гадавае племя нагладка скосім».
Здзівіла моцна Рымвіда навіна,
Ды больш яшчэ здзівілася Гражына.

«Скажы, а дзе паслы?» — пытае ў пажа,
А той маўчыць, збянтэжаны пытаннем.
Глядзіць княгіні ў вочы з хваляваннем.
«Што чую, пані? — ён нарэшце кажа.—
Ці ж вы забыліся, што з волі княжай,
Як пеўні праспявалі час паўночны,
Загад вы князеў мне перадавалі
Сказаць паслам, каб марна не чакалі,
Бо ён наогул іх прыняць не хоча!»

«Ах так,— адказвае спакойна быццам,
Ды ў гэты момант галаву схіляе
І злёгку пачынае мітусіцца.—
Так, праўду кажаш, я прыпамінаю...
І як жа я магла аж так забыцца!
Бягу — не! стойце, або... я ўжо не знаю...»
Стаіць, маўчыць. Прыжмуранае вока,
Чало — уніз, відаць, што ў ім трывожна
Намер якісьці цьмяны дзесь далёка
То ўспыхне, то адступіць асцярожна,
То твар акрые змрочнай павалокай.
Намер, відаць, якісьці вельмі важны
Абдумала і робіць крок адважны.

«Ну так, іду будзіць яшчэ раз пана...
Хай войска ўраз выходзіць на дарогу!
Сядлайце хутка князю верхавога,
Выносьце зброю, што нарыхтавана!

Хутчэй, і не ўпусціць найменшай рэчы!
Загадваю цяпер вам імем князя.
Адказнасць на цябе кладу, старэча.
Куды, чаго ідзём, ні ў якім разе
Ніхто няхай не ведае да ранку.
Ідзіце князя сустракаць на ганку!»

Пабегла, зачыніўшы з трэскам дзверы.
Пабег і Рымвід, ды спыніўся хутка:
Куды? Чаго? Гатовы ўжо жаўнеры,
Загад дайшоў да кожнага закутка!
Дык уздыхнуў і збавіў трохі кроку,
Спыніўся, звесіў галаву на грудзі
І думкамі яе няспынна нудзіў,
Бо ў нейкім дзіўным непраглядным змроку
Таўкуцца думкі гуртам, бездарожжам,
Абняць іх розум стомлены не можа.

«Дарма чакаю. Блізка ўжо і ранак,
А дзень загадкі, пэўна, ўсе развяжа.
Пайду да князя, што цяпер ён скажа».
І ўжо ўзыходзіць пачынаў на ганак.
Як раптам дзверы скрыпнулі абое
І Літавор з'явіўся на парозе
Ў сваіх даспехах, вопратцы для бою,
У поўнай баявой і грознай позе.
Сталёвы шлем, чырвоны плашч на зброі
І панцыр лёгкі, верны перамозе,
У левай шчыт з залочанай аправай,
А пояс ад мяча ў руцэ нёс правай.

Бядой ці гневам быў усхваляваны,
Ступаў няроўным і няпэўным крокам,
Ні рыцара ніводнага, ні пана
Ласкавым не хацеў пацешыць вокам.
З дрыжаннем лук прыняў з калчанам
І меч падперазаў над правым бокам.
А хоць памылку гэту бачыў кожан,
Ніхто адважыцца сказаць не можа.

Сыходзіць з ганка, зброі пазалота
Вітае ўжо крывавае світанне.
Сядае на каня, а побач рота
Гатовая крычаць яму вітанне;
Ён знак падаў рукой: замкнуць вароты
І ехаць ціха, моўчкі, без пытанняў.
А чэлядзі загадвае з палаца
За мост на двор сумежны перабрацца.

Не ўздоўж гасцінца рушыла ўся сіла,
Але направа павярнула долам.
Перш між кустоў, узгоркаў калясіла,
Пасля на шлях ізноў выходзіць колам.
Вядзе іх змрочны яр праз зараснікі глогу
Штораз далей, на светлую дарогу.

Ад гарадской мяжы непадалёку,
Адкуль мог вецер гром стральбы данесці,
Вузенькая, прыкметная ледзь воку,
Па лесе рэчка працякала дзесьці,
Ля шляху ж разлівалася шырока
І ў возеры гублялася нарэшце.
Чарнела пушча над азёрнай гладдзю,
А спераду — гары высокай паўнаўладдзе.

Калі Літва дайшла да павароту,
З гары тэўтонаў процьма наступала.
Асвечваў месяц пікі, шлемы, роты...
Вось бліснуў раптам выстрал самапала,
За ім — стук капытоў, мячоў грымоты,
І конніца тэўтонаў мурам стала.
Вось так прыгожа, велічна, ўрачыста
Панарскі бор уночы выглядае,
Калі вятры асыплюць ліст дачыста,
А ўся раса, што бісерам сядае,
Замерзне ў серабрыстыя маністы.

І дзівіцца хадок, прыйшоўшы з даляў,
Што голле з серабра, а ліст з крышталю.

Малюнак гэты князя абурае,
Дык скочыў, меч ускінуўшы сталёвы,
А ўслед дружына кінулася краем.
Старых здзівіў напад так бесталковы:
Чаму забыта тактыка старая
І не гучаць каманды словы?
Дзе хоча князь галоўны ўдар нанесці?
Каму, дзе, як свае атрады весці?

Дык Рымвід князеву спаўняе волю —
Наводзіць лад ужо сярод дарогі.
Сціскае ўзгор'е ўвогнутым паўколлем:
У цэнтр — хто ў латах, лучнікі — як рогі.
Заўсёды так Літва займае поле.
Па знаку — лукі схілены на ногі,
Вурчаць цяцівы, вые стрэлаў хмара.
«Ісус! Марыя!» — «Гоп! Ура! Бі з жарам!»

І толькі дрэўкі пік скрышыўшы ў скоку,
Бліжэй самкнуцца, грудзі б'юцца ў грудзі...
Чаму ж не суджана нашчадкаў воку
Убачыць, як змагаліся там людзі?!
Адны другім не саступаюць кроку,
Вакол крык, гром шчытоў; меч не марудзіць —
Ляцяць пад ногі пікі і галовы...
Хто ўпаў з каня, таго даб'юць падковы.

А князь вакол сябе мячом махае,
Адважна ўеецца ў самым пекле бою.
Чырвоны плашч ягоны вораг знае,
І ўсе пазналі герб яго на зброі,
Дык адступаюць немцы з сечы,
А ён ляціць, сядае ім на плечы.

Але ж каторага вініць тут Бога,
Што князь слабы? Хоць ворагаў ён гоніць
І смела б'е, ды не забіў нікога.
Па панцырах мячом бяссільна звоніць,
А меч саслізгваецца раз за разам
І не трапляе ці кладзецца плазам.

Дык немцы бачаць, што ўцякаць не варта,
Адважна падымаюць крык вялікі,
Вяртаюцца, стаяць на месцы ўпарта,
На князя лесам наступаюць пікі.
А ён ад страху больш знясілеў быццам,—
Не можа ад напасці той адбіцца.

І галаве яго не быць бы цэлай:
Тэўтоны насядаюць, б'юць, страляюць,
Але раптоўнаю атакай смелай
З бяды ліцвіны князя вызваляюць:
Той князевы памылкі папраўляе,
Той ад мяча сабою засланяе.

Мінае ноч, зары ружовай косы
На ўсходзе раскладаюцца ў хмурыне,
Віруе бой, людзей ляжаць пакосы,
І што далей, то больш і больш іх гіне.
А бог вайны змагання важыць лёсы,
Бярэ крывёй даніну [redacted] кожнай смерці,
І шалі ўсе стаяць на той адметцы.

Так Нёман, бацька наш ласкавы, дбалы,
Сустрэўшы румшыцкага велікана,
Рукою мокрай абхіне завалы,
Капае дно і дзьмецца ўсхвалявана.
А той, баронячыся ад навалы,
Плячмі цяжар стрымоўвае старанна.
Не рушыцца скала з рачнога ложа,
І рэчка каменю ўступіць не можа.

Дык немцы, каб дабіцца перамогі,
Апошніх ратнікаў з гары з запасу
Кідаюць на Літву ў парадку строгім.
Вядзе сам комтур[5] баявую масу
На аслабелых з ран і ад знямогі
І, перастроіцца не даўшы часу,
Ламае строй, вядзе у ім баразны...
Ды раптам крык з гары пачуўся грозны.

Адразу ўсе ў той бок кіруюць вочы.
Там рыцар быў. І як з лясной яліны
Шырокім ценем стройных кос жаночых
На снег кладуцца чорныя галіны,
Так чорны плашч адзеў яго ў змрок ночы,
Бо чорны быў і шлем, і конь былінны.
Ускрыкнуў тройчы, рынуўся ўніз громам,
Ды з кім, супроць каго ён — невядома.
Дабег да немцаў і ў натоўпе тоне.
Не ўбачыш бітвы, але грукат, крыкі
Падказваюць, дзе ў жудасным разгоне
Грыміць мяча яго пярун шматлікі.
Там знікне шлем, там стройны сцяг абсядзе,
І раць бяжыць на ўсе бакі ў бязладзе.

І як у цёмнай пушчы лесарубы,
Калі б дзялянку высекчы жадалі,
Пашлюць сякеры ў ход і пілаў зубы;
Глядзіш, там-сям вярхі дрэў пазнікалі,
А ў просеках пакладаліся пні ў зрубы,
І ўбачыш і людзей, і бляск іх сталі —
Вось так, між немцаў высекшы праломы,
К Літве выходзіў рыцар незнаёмы.

Спяшайся, рыцар, ажыві адвагу,
Знямоглых падмацуй, ратуй ад гора!
Бо немцы здабылі ўжо перавагу —
Ліцвінам пікі болей не апора,
А комтур той крывёй патоліў смагу
І ўжо шукае ў полі Літавора.
Аж вось абодва павярнулі коней
І ўжо збліжаюцца на ўсім разгоне.

Князь Літавор падняў свой меч для ўдару,
А комтур пальнуў з перуновай зброі.
Хвалюецца Літва, праз дыму хмары
Глядзіць на князя ў страшным неспакоі.
На жаль, не біцца ўжо табе, ўладару!
Пусціў паводдзе, меч апаў з рукою,

А сам з сядла сплывае на дарогу,
Ды тут бягуць яму на дапамогу.

Ускрыкнуў чорны муж і чорнай хмарай,
Сыпнуўшы вокал перуновым градам,
Рвануўся да забойцы з грознай карай.
Ледзь толькі першым стрэліся нападам,
Умомант комтур на зямлю злятае,
І конь над ім узвіўся капытамі.

Да князя праз натоўп усхваляваны
Падскочыў рыцар, рве зашчэпкі латаў,
Здымае панцыр, кроўю сфарбаваны,
Знайшоў прастрэл, ды ледзь яго пакратаў,
Як кроў нанова палілася з раны.
Свядомасць князева святлее з болю,
Ён здзіўлена глядзіць на наваколле
І зноўку хоча шлемам засланіцца.
Сказаў пайсці ўсім прэч, хто тут сабраўся,
А Рымвіду загад даў нахіліцца.
«Канец ужо мне,— ціха адазваўся,—
Не руш грудзей, шануйце таямніцу.
Няма ратунку, бачу, мне ад смерці,
Вязіце ў замак — там хачу памерці».

Глядзіць і дзівіцца стары ваяка,
Не верыць сам сабе, дык зрок узносіць,
Руку ўпускае, над якою плакаў,
Уздрыгвае, лоб пот халодны росіць.
Цяпер пазнаў ён голас, чуты ўчора.
О, гэты голас быў не Літавораў!

Тым часам рыцар Рымвіду ў трывозе
Паводдзе кінуў, зноў прыпаў да пана,
Сказаў, каб коней кіраваць к дарозе,
А сам, абняўшы князя ўсхвалявана,
Заціснуў рану на грудзях рукою,
Даў знак, і ўтрох імчацца з поля бою.

А вунь і горад, замка каяніца,
Народ цікаўны выбег на спатканне,
А тыя шпораць коней, каб прабіцца
Хутчэй, і, між агульнага маўчання,
Спяшаюцца за мурам зачыніцца.
Спусцілі мост і загадалі строга
Не выпускаць і не ўпускаць нікога.

Вяртаюцца дружыннікі ў сталіцу,
Аднак хоць мужна адстаялі волю,
Ніхто не цешыцца, не весяліцца,
Усім ад жальбы цісне сэрца з болю.
Трывожна ўсе пытаюцца пра пана:
Што з ім? Дзе ён? Ці лёгкая хоць рана? [...]

Аж вось труба зайграла гулка з вежы,
Спадае мост, і брама заскрыпела,
І шэсце ў чорных рушыла адзежах,
Усклаўшы на шчыты героя цела.
Пры ім меч, піка і калчан стрэл свежых —
Усё на чырвані плашча зіхцела.
Аблічча князя не відаць, забрала
Цяжкога шолама яго схавала.

Дык вось наш князь! Пан горада і краю!
Рукі нястомнай муж, герой вядомы!
Ці немцаў біць, ці гнаць арду нагаяў,
Ці клапаціцца пра усіх без стомы!
Чаму князь звычай даўні парушае,
Вандруючы ў нябесныя харомы?
Бо старажытнасць наша тут, бывала,
Не так князёў, дзядоў тваіх хавала.
Чаму з табою не ідзе да неба
Слуга, які таптаў з табой дарогі?
Чаму не йдзе з пустым сядлом, як трэба,
Твой сябар верны — конь аленяногі?
Дзе ганчакі, дзе сокал дальнавокі?
Дзе зграя слаўная за нюх далёкі?

Шумеў натоўп. Байцы ўзнімаюць цела
На верх кастра, мёд, малако ўзліваюць.
Труба зайграла, флейта засвірчэла,
І вайдэлоты сумны гімн спяваюць.
Бярэ адзін паходню, нож ахвярны...
«Пастойце!» Сталі. Муж над'ехаў хмарны.

«Хто ён? — пытаюць.— Хто той храбры рыцар?»
Пазнала войска: ён на полі ўчора,
Калі Літва ўжо не магла адбіцца
І немцы акружылі Літавора,
Надбег, адвагу ўзняў, прагнаў трывогі,
Сек крыжакоў, збіў комтура пад ногі.

Вось што пра чорнага героя знালі.
А сёння — конь той самы, плашч і зброя...
Ды хто ён? І з якой з'явіўся далі?
Здымаем шолам... Гляньце на героя!
Дык гэта ж князь! Зірніце на аблічча!
Спярша заціхла грамада нямая,
Ды радасць з сэрца люду голас кліча,
І грамада крычыць, што сілы мае:
«Жыве наш князь! Жыць будзем з Літаворам!»
І гэты бурны крык ляціць аж к зорам.

Стаяў ён сумны, бледны, адзінокі,
А гул грымеў, разносячыся рэхам.
Узняў чало і паглядзеў навокал,
За крыкі лёгкім дзякаваў усмехам.
Ды ўсмешка не была з душы пачата,
Не з тых, што асвятляюць твар і вочы,
А нейкаю здавалася крылатай,
Што, ледзь з'явіўшыся, сарвацца хоча,
Што твар ледзь так сагрэе і асвеціць,
Як рукі мёртвага вяночак з вецця.

«Падпальвайце касцёр!» Паплыў дым сіні...
А князь пытае: «Знаеце, чые тут
Гарaць астанкі? — Ціша ў той хвіліне.—

Пад зброяй мужа бачыце кабету,
Жанчыну целам, духам гераіню!
Адпомсціў я — яна ж пайшла са свету!»

Сказаўшы, ўзбег на лоўж, прыпаў да мілай,
І хмара дыму ўраз іх засланіла. [...]

1823

Тлумачальныя заўвагі

[1] *Вайдэлоты* — жрацы-паэты старажытнай Літвы; іх абавязкам было складаць і спяваць песні пра славутых продкаў.

[2] *Гражына (літ.)* — прыгожая, прыгажуня.

[3] *Райтары* — крыжацкія коннікі, рыцары.

[4] *Фускнехты* — пяхота, у якой служылі простыя людзі.

[5] *Комтур* — так называўся ў крыжакоў вайсковы і адміністрацыйны начальнік акругі — камандоры.

Свіцязь

Балада

Міхалу Верашчаку[1]

Калі навагрудскія ўбачыш прасторы,
Ракітнік разгалісты, нізкі,—
Каня супыні ля плужынскага бору,
Каб глянуць на возера зблізку.

Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна лёду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых.

Калі пад'язджаеш начною парою
І станеш да возера тварам,—

---

[1] *Міхал Верашчака* — брат Марылі, каханай Міцкевіча.

Мігцяць зоркі ў небе, мігцяць пад табою,
Мігціць там і месяцаў пара.

Не знаеш: з-пад ног, можа, гэта шкляная
Ідзе аж да неба дарога
Ці неба шкляное скляпенне схіляе
Табе аж пад самыя ногі!

І той, другі, бераг убачыць не ў сілах —
З вышынямі возера зліта.
Нібыта вісіш ты на птахавых крылах
У нейкім бяздонні блакіту!

Так ноччу прыемна памыляцца вочы
Пры добрай, пры яснай пагодзе.
Ды толькі да возера зорнага ноччу
З храбрэйшых храбрэц падыходзіць.

Бо там вырабляе нячысцік такое!
Між хваль вадзяны там плюскоча.
Дрыжу, як дзяды мне гавораць пра тое,
Успомніць аж страх перад ноччу.

То ў возеры гоман, то лямант вялікі,
То ўспыхне агонь сіняваты.
Гул бітвы, лязг зброі, жаночыя крыкі,
Галошанне, звону раскаты.

А ўміг — дым асядзе і крык суціхае,
І толькі лес ціха шапоча,
Ды ў возеры хтосьці малітвы чытае,
Чуваць сумны голас дзявочы.

А што гэта? Людзі плятуць хто што зможа,
На дно ж з іх ніхто не спускаўся.
То гэтак раскажуць, то йнакш казку зложаць,
А хто з іх да праўды дабраўся?

І пан той, якому ад прадзедаў гэты
Куток чарадзейны дастаўся,—

І многія зімы, і многія леты
Раскрыць таямніцу стараўся.

І ён загадаў: — Лес рубіце і рэжце!..—
Чаўны й караблі збудавалі.
І невад глыбокі — стоп[1] ажно дзвесце —
Вязалі, старанна сплялі.

Я раіў, падказваў, што з Богам патрэбна,
Належна рабіць, без паспеху.
Ў касцёлах бліжэйшых далі на малебны.
І з Цырына[2] пробашч прыехаў.

На беразе стаў ён, надзеў свае шаты.
Крапіў ён вадою святою.
Вось пан даў каманду, і ветразі ўзняты,
І невад ідзе пад вадою.

І ён валачэ паплаўкі за сабою,
Вяроўкі напяты. Глыбока
Затоплены невад, ідзе пад вадою —
Не злоўлена, мусіць, ні вока[3]!

На бераг ужо два крылы узвалілі,
Карма, нібы невада рэшта...
Ці чулі, якое страхоцце злавілі?
Ніхто не паверыць, хоць рэжце!

Аднак вам скажу я: зусім не пачвара,
А проста жывая дзяўчына.
Шаўковыя косы, бялявая з твару,
А вусны яе, як маліна.

На бераг выходзіць. Адны — ўраз наўцёкі,
Другія нібы скамянелі.

---

[1] *Стапа* — старая мера даўжыні.
[2] *Цырын* — мястэчка на Навагрудчыне.
[3] *Вока* — старая адзінка вагі.

А словы красуні тае сінявокай
Прыемна, пяшчотна гучэлі:
«Адкрыю сваю таямніцу народу:
Тапельцаў ляжыць тут нямала.
Хто толькі спускаўся на гэтыя воды,—
На дно таго возера брала.
І ты б, храбры, гэта з дружынай адведаў,
Загінуў бы ў спрэчцы няроўнай,
Ды шчасце — тут край твайго прадзеда, дзеда,
Ты з нашай радні, ты нам кроўны.
За тое, што вы акрапілі тут воды,
Па-боску зрабілі чын чынам,—
Маімі Бог вуснамі скажа народу
Гісторыю гэтых глыбіняў.
Дзе сёння шуміць бор спрадвечны, вынёслы,
Дзе цар-зелле[1], лозы ды травы;
Дзе вашы ўзлятаюць над хвалямі вёслы,—
Быў горад калісьці на славу!
Быў Свіцязь, як рыцар,— яму ўся пашана,
Жылі ў ім красуні дзяўчаты.
Ў часы панавання тут князя Тугана[2]
Рос горад магутны, багаты.
І лес не шумеў тут дрымотны са смуткам —
Звінела калоссе пшаніцы.
Адсюль былі бачны муры Навагрудка —
У той час літоўскай сталіцы.

Цар грозны аднойчы напаў на Мендога[3],
Канец прыйшоў ладу й спакою.
На ўсю Літву пала бяда і трывога:
Заплаціць Мендог галавою?!

Пакуль сцягнуў войска з далёкай граніцы,
Да бацькі майго Мендог піша:

---

[1] *Цар-зелле* — падбел.

[2] *Князь Туган* — прозвішча князя ўзята ад назвы маёнтка Туганавічы, дзе жыла Марыля Верашчака.

[3] *Мендог*, або *Міндаўгас*,— вялікі князь літоўскі ў XIII ст. Сталіцай Літвы пры ім быў Навагрудак.

«Туган! На табе абарона сталіцы,
Патрэбна, каб з войскам ты выйшаў».
Той ліст прачытаўшы, Туган кліча войска:
— На бітву! Драмаць нам няможна!..—
І стала адразу пяць тысяч геройскіх —
І конны, і ўзброены кожны.

І трубы зайгралі, а трубаў тых гукі —
Склікаюць пад сцягі змагацца.
У горы Туган заламаў раптам рукі,
Ад брамы зноў скача к палацу

І кажа мне: «Хоць я чужых уратую —
Загінуць уласныя людзі,
Бо ведаеш, Свіцязь жа толькі вартуюць —
Булаты і нашыя грудзі!
Калі папалам раздзялю я дружыну —
Мендогу малая апора;

Калі ж к Навагрудку я ўсю яе кіну,—
То вам тут адным будзе гора!»
Кажу яму: «Бацька, вядзі сваю сілу,
Ідзі, куды кліknула слава!
Нас Бог абароніць, анёла я сніла,—
Над горадам нашым ён плаваў,

Маланкаю-мечам абвіў наўкол Свіцязь,
Раскрыў залацістыя пёры,
Сказаў мне: «Спакойна працуйце і спіце,
Я з вамі — не будзеце ў горы».

Паслухаў Туган — удагон за дружынай...
Ды толькі, як ноч наступіла,—
І грукат, і тупат — то грозная лавінай
Варожая коціцца сіла!

Як грымнуць тараны, град ядраў, камення.
Упалі са скрогатам брамы.

Старыя, жанчыны — на плошчу ў імгненне,
Услед бягуць дзеці за мамай.

І крыкі, і лямант: «Што будзе тут з намі?
Русь хлынула, Русь атакуе!
Ах! Лепей жыцця мы пазбавімся самі,—
Ад ганьбы хай смерць уратуе!»

І ў гневе паходні распальваюць ярка,
Кастры палыхаюць траскуча:
У попел — нажыткі, у дым — гаспадаркі,
А крыкі — са злобай пякучай:
«Праклён жа таму, хто сам сёння не згіне!»

Да смерці да ўласнай гатовы.
Ужо і сякеры блішчаць лязом сінім,
І людзі схіляюць галовы...

Ці здацца — ў палоне звінець ланцугамі,
Жыць рабскім жыццём непрыгожым?
Або сябе знішчыць сваімі рукамі?..
«Дзе выйсце,— крычу я,— о Божа?!

Калі ўжо скарыцца нам ворагу трэба,
Калі бярэ верх яго сіла,—
Няхай нас ударыць гром з яснага неба,
Хай прыме жывых нас магіла!»

І раптам праменнае нешта між ночы
Мяне абвіло белізною.
У дол апускаю спалохана вочы —
Зямлі ўжо няма пада мною!

Мы так уцяклі, не пайшлі ў паланянкі
Да ворага... Глянь — зеляніна:
І зелле, і кветкі — то ўсё свіцязянкі,—
Нас Бог абярнуў у расліны.

Лісты ўсе зялёныя, нібы ў яліны
Ігліцы, як выбеліць іней.
Плывуць над вадою, як пух лебядзіны,
Бялеюць над безданню сіняй.

Як знак чысціні, і вось гэтай парою
У колер у белы адзеты.
І той, хто кранецца крывавай рукою,—
Не ўбачыць ён белага свету.

Адчуў на самім сабе цар рускі гэта,
Адчула ягоная світа:
Нарвалі на беразе возера кветак,—
Галовы вянкамі абвіты.

Ды толькі хто браў кветкі гэтыя ў рукі,—
Была ў іх жахлівая сіла,—
Той падаў, і енчыў, і корчыўся ў муках,
Таго смерць адразу касіла.

Прайшлі з таго часу, мінулі стагоддзі,
Ды ў памяць аб тым пакаранні
«Царамі» завуць тыя кветкі ў народзе,
У песні старой, у паданні...»

І вось адыходзіць красуня памалу,
Чаўны патанулі і сеці...
Шум чуецца ў пушчы, ўздымаецца хваля
І грозна на бераг нясецца.

Да дна расхінаюцца раптам глыбіні,
Ўскіпае віроў завіруха:
Туды правалілася ў бездань дзяўчына,
І больш пра яе ані слыху!

1820

Свіцязянка[1]

Балада

Што там за хлопец з абліччам прыветным
Поруч са стройнай дзяўчынай
Крочыць павольна пад месяцам светлым
Берагам Свіцязі сіняй?

Хлопцу яна прапануе маліну,
Кветкі юнак ёй збірае.
Мусіць, той хлопец кахае дзяўчыну,
Хлопца дзяўчына кахае.

Месца іх стрэч — ясакар таямнічы,
Што шалясціць каля гаю.
Хлопец — тутэйшых лясоў паляўнічы,
Дзеўчына хто? Я не знаю.

Хто аб красуні даведацца прагне,
След не знаходзіць дзявочы:
То яна лотаццю ўзыдзе на багне,
То — знікне іскрай уночы.

«Ты ад мяне, дарагая дзяўчына,
Нейкую тайну хаваеш?
Як ты прыходзіш нязнанай сцяжынай?
Дзе ты прытулак свой маеш?

Лета мінае, няўжо ў непагоду,
Ноччу асенняй, бяззорнай,
Трэба чакаць мне каханай прыходу
Тут, у глушы прыазёрнай?

Ты быццам сарна мільгаеш лясная,
Зданню блукаеш начною,

---

[1] Ёсць чуткі, што на берагах Свіцязі з'яўляюцца ундзіны, або вадзяныя німфы, якія народ называе свіцязянкамі. *(Заўвага аўтара.)*

Лепей застанься з тым, хто кахае,
Лепей застанься са мною!

Блізка адгэтуль стаіць мая хатка,
Вунь за ляшчынай разгатай,
Досыць там хлеба і мёду ёсць кадка,
Ёсць там дзічыны багата».

«Тата казаў мне, што словы мужчыны
Не заслугоўваюць веры,
Бо хоць у словах і спеў салаўіны —
Лісавы ў сэрцы намеры.

Я крывадушнасці вашай баюся,
Штось прадчуваю я здраду.
Можа, да просьбы тваёй і схілюся,
Толькі ці любіш напраўду?»

Хлопец укленчыў, пры месячным ззянні
Дзеўчыне ён прысягае
Пеклам і раем у вечным каханні —
Толькі ці слова стрымае?

«Моцна трымай яго, гэту параду
Помні заўсёды мой мілы.
Ведай жа, кара чакае за здраду
Нават у змроку магілы».

Гэтак сказаўшы, рукою здалёку
Дзеўка махнула і знікла
Дзесь на балонні пустэльным у змроку,
Сцежкай спяшаючы звыклай.

Кінуўся ўслед ён у дзікую нетру,
Марна шукае і кліча:
Знікла, як подых раптоўнага ветру,
Ходзіць адзін паляўнічы.

Ходзіць, блукае дарожкай глухою.
Гразкаю стала сцяжынка.
Ціха наўкол, захрусціць пад нагою
Часам сухая галінка.

К возеру выйшаў юнак на прылессе,
Даль аглядае тужліва.
Раптам вятрыска пранёсся па лесе,
Воды ўскіпелі бурліва.

О нечуваная з'ява! Ніколі
Гэта не бачылі вочы.
З хваляў красуня ўсплывае паволі,
Стан выпрамляе дзявочы.

Твар яе — белая ружа нібыта,
Што акрапілі расою.
Лёгкай тканінаю постаць абвіта,
Быццам празрыстай смугою.

«Хлопец прыгожы, адважны мой віцязь,—
Чуецца голас дзявочы,—
Што ты блукаеш, дзе пеніцца Свіцязь,
Сумны, задумлівы ўночы?

Дзікай спакусніцай прычараваны,
Боль адчуваеш ты сэрца,
Ходзіш, пакінуты і ашуканы,
Дзеўчына ж недзе смяецца!

Хіба патрэбна блукаць тут з журбою
Аж да праменняў світальных?
Лепей, юнача, мы будзем з табою
Плаваць у водах крыштальных.

Хочаш, ты ластаўкай будзеш імклівай
Спрытна над плёсамі віцца,
Хочаш, у Свіцязі рыбкай шчаслівай
Будзеш са мной весяліцца?

Дзень праляціць у гульні бесклапотнай,
Выглянуць зоры начныя,
Ты на лілейнай пасцелі пяшчотнай
Сны будзеш сніць залатыя».

І лебядзіныя блiснулі грудзі...
Погляд адводзіць хлапчына.
«Добра са мною, каханы мой, будзе»,—
Зноў яго кліча дзяўчына.

То яна лёгка ўздымаецца ўгору,
Ззяе вясёлкай праменнай,
То, рассякаючы плёсаў прастору,
Срэбнаю пырскае пенай.

Хлопец падбег, але стаў нерашучы:
Хоча ён к ёй — і не хоча;
Коціцца хваля тым часам да кручы,
Злёганьку ногі ласкоча.

Хваля нахлыне, і хваля адхлыне,
Сэрца так б'ецца чулліва,
Быццам красуня каханка хлапчыне
Ціcне руку сарамліва.

Хлопец забыў ясакар таямнічы,
Словы забыў ён прысягі —
Следам за хвалямі мкне паляўнічы,
Повен дзівоснай ён прагі.

Так ён імкнецца, і так ён ірвецца
Слепа ў азёрныя далі...
Бераг далёка за ім астаецца,
Плешчуць прывабліва хвалі.

Ціcне красуні ён белыя рукі,
З ёй мілавацца ахвочы,
Ловіць ён вуснаў прывабныя гукі,
Гледзячы ў ясныя вочы.

Ветрык раптоўна на іх налятае,
Рве ён з туману заслону...
Хлопец пазнаў — гэта ж дзеўчына тая,
Звязан з ёй клятвай да скону.

«Клятву забыў ты, забыў і параду,
Помніш, казала я — мілы,
Ведай жа, кара чакае за здраду
Нават у змроку магілы.

Дзе табе бавіцца рыбкай са мною,
Ластаўкай віцца над вірам!
Цела засыплюць сырою зямлёю,
Вочы юнацкія — жвірам.

Ну, а душа? Ёй — пякельная кара,
Хай жа гарыць на вуголлі
Там, дзе ты кляўся каля ясакара,
Тысячу год без патолі».

Чуе юнак, паглядае нясмела,
Вочы агорнуты сумам,
Бура раптоўна зноў наляцела,
Хвалі ўздымаюцца з шумам.

Пашчу сваю раскрывае прадонне,
Кружыцца злосна віхура,
Дзеўчына з хлопцам у бездані тоне,
Вецер галосіць панура.

Хвалі дагэтуль на бераг у пене
Коцяцца з ярасцю шумнай,
Мрояцца ў месячным ззянні два цені —
Гэта юнак з прыгажуняй.

Скача дзяўчына над плёсам крынічным.
Енчыць хлапец каля гаю.
Хто ён? Калісьці тут быў паляўнічым.
Дзеўчына хто, я не знаю.

[12 жніўня 1821]

Рыбка

Балада

З палаца, з-пад пушчы самай
Выбегла ў смутку дзяўчына
З распушчанымі валасамі,
З заплаканымі вачыма.

Прыбегла ў канец лугавіны,
Дзе возера рэчку страчае,
Заломвае рукі дзяўчына,
Галосіць дзяўчына ў адчаі:

«О вы, падуладныя водам,
Сёстры мае свіцязянкі,
Слухайце голас нягоды
Здраджанае каханкі.

Кахала так шчыра пана,
Ён кляўся весці да шлюбу.
Князёўну бярэ нечакана,
Крысю пакінуў на згубу.

Хай млеюць сабе ў асалодзе,
З ёй можа распуснік кахацца,
Хай толькі сюды не прыходзіць
З няшчасця майго насміхацца.

Ці ж для забытай каханкі
Пачнецца жыццё спачатку?
Прыміце мяне, свіцязянкі!
Ды толькі дзіцятка... Дзіцятка!»

Гаротная, горка плача,
Хавае вочы ў далоні
І з берага ў хвалі скача
І ў быстрай знікае тоні.

Сп'янелы ад весялосці,
Палац пачынае хістацца.
Балююць прыезджыя госці —
Музыка, вэрхал, танцы.

Балююць сабе на выгодзе.
Ды чуецца плач дзіцячы —
Слуга верны з лесу выходзіць,
Малога нясе, небарача.

К вадзе прыспешвае крокі,
Дзе густа лаза ўрадзіла
І ўздоўж пакручастай затокі
Плечы рацэ акрыла.

У зацені стаў пакорна
Ды плача: «О гора мне, Крыся!
Ну хто ж дзіцятка пакорміць?
Ах! Дзе ты, Крыся, адкрыйся!»

Адказвае голас нясмела:
«На дне ляжу, маладая.
Ззалела ад холаду цела,
Мне вочы жвір выядае.

Па вострых каменьчыках мушу
Плысці за хваляй штодзённай.
Ем я ракушак, мушак,
Расой запіваю сцюдзёнай».

Слуга зноў стаіць пакорна
Ды плача: «О гора мне, Крыся!
Ну хто ж дзіцятка пакорміць?
Ах! Дзе ты, Крыся, адкрыйся?»

Што гэта ў азёрным лёху?
Ад гора ці ад дакору
Вада скаланулася злёгку
І рыбка падскочыла ўгору.

Як плітка пляскатым бокам
Зразае хвалю малую,
Так наша рыбка падскокам
Мокрую роўнядзь цалуе.

Вяслуе пёркамі лоўка
Ля берага недалёчка,
Як дробны напарстак, галоўка,
Як дробная пацерка, вочка.

Адкіне луску — тужліва
Гляне вачыма дзяўчыны,
І выплывуць косы гулліва,
Акрыюць стан лебядзіны.

Твар з ружай зраўняецца хіба.
Як райскія яблычкі, грудзі.
Раптоўна дзяўчына-рыба
Знікае ў надрэчным хлудзе.

На рукі бярэ дзіцятка
І да грудзей яго туліць:
«Люлі, маё немаўлятка,
Люлі, маленькі, люлі».

Калі малое змаўкае,
Кош пакідае на голлі
І зноў сваё цела сціскае,
Звужае галоўку паволі.

Пакрыецца зноў лускою,
Маланкамі жабры адскочаць,
Нырне — адно над ракою
Бурбалкі варам клякочуць.

І так увечар і ўранку,
Як стане слуга ў закутку,
Выплыве ўраз Свіцязянка,
Каб пакарміць малютку.

Ці вечар рана заняўся?
Што ж ціха на сенажаці?
Час звычны мінуў, а няма ўсё
Ані слугі, ні дзіцяці.

Зараз прыйсці не можа,
Мусіў слуга схавацца —
Пан выйшаў з жонкай прыгожай
Над рэчкаю прагуляцца.

Вярнуўся, чакае цярпліва
За ніцым кустом са страхам,
Чакае, чакае — і дзіва:
Ніхто не вярнуўся тым шляхам.

Устаў і зірнуў з-пад далоні
У роспачы і здзіўленні.
Дзень ціха сканаў. На гоні
Апалі шэрыя цені.

Счакаў і заход трывожна.
Як ноч запаліла зоры,
Падаўся к вадзе асцярожна
І сочыць вачыма ў зморы.

Забілася сэрца гулка.
Ці сіла пекла, ці цуды?
Там, дзе цякла рачулка,
Равы, жаўтапесу груды.

Убранне параскідана
На беразе між густалоззя.
Ні пані няма, ні пана —
І следу не засталося.

Адно выдаецца з затокі
Кавалак камення белы
І, ў цемры халодна-далёкі,
Нагадвае дзіўна два целы.

Слуга, непрытомны, не знае,
Што гэта. Не бачыў ніколі.
Мінула гадзіна, другая,
Пакуль слова вымавіць здолеў.

«Крысю, о Крысю!» — гукае.
Адказвае рэха: «Крысю».
Наўкол цішыня цяжкая
І роў туманом акрыўся.

А пот залівае вочы,
На камень глядзіць анямела,
Кіўнуў галавою тройчы,
Нібыта сказаў: зразумела.

На рукі бярэ малога,
Рагоча з вар'яцкай усмешкай,
Шле пацеры Пану Богу,
Вяртаецца ў двор паспешна.

[1820]

Люблю я

Балада[1]

Бачыш, Марыля, ля самага гаю
Вербы ўзнялі свае шаты,
Рэчка віецца далінаю з краю,
Мосцік над рэчкай гарбаты.

Вунь і царквы, і званіцы руіны,
Сыч там гняздзіцца панылы,
Зараснік побач, буяюць маліны
І захінаюць магілы.

[1] Балада гэтая з'яўляецца пераказам вясковай песні. *(Заўвага аўтара.)*

Чорт тут сядзеў ці з заклятай душою
Грэшнік, бо гэтай дарогай,—
Кажуць старыя,— паўночнай парою
Кожны праходзіў з трывогай.

Поўначчу хмарнай успыхнуць зарніцы,
Тая царква адамкнецца,
Самі зазвоняць званы на званіцы,
Нехта ў кустах адгукнецца.

Часам успыхне агеньчык журботны,
Ледзь асвятляе руіны,
Часам пачуецца грукат грымотны,
Здані ўстаюць з дамавіны.

Труп безгаловы там поўзаў уночы,
Бачылі й голаў без цела,
Рот разяўляла, расплюшчвала вочы,
Полымя ў іх зіхацела.

Выбежыць воўк, раптам крылы раскіне,
Стане арлом ён вялікім.
Толькі скажы яму: «Згінь!» — і ён згіне
З рогатам жудасным, дзікім.

Кожны, хто ездзіў, уведаў пагрозы
Гэтай праклятай дарогі:
Дышаль там зломіш, абернеш калёсы,
Конь сабе вывіхне ногі.

Дзеда Андрэя пужалі пачвары,
Мне ён рабіў засцярогі;
З чорта смяяўся, не верыў я ў чары,
Той не баяўся дарогі.

Ехаў у Руту аднойчы я позна,
Коні спыніліся штосьці,
Кучар дарэмна крычыць на іх грозна,
Ляскае пугай на мосце.

Раптам іх чорт падбухторыў ірвацца
Так, што парвалася збруя.
«Нанач ды ў полі самому застацца,
Гэта,— прамовіў,— люблю я».

Толькі я скончыў, як дзеўчына ў белым
З хваляў плыве серабрыстых,
З мёртвым аблічча́м яна скамянелым,
Скроні ў праменнях агністых.

Сэрца ад страху спыніцца гатова,
Паў на зямлю я сырую,
Крыкнуў: «Хай славіцца імя Хрыстова!»
«Ныне і прысна!» — я чую.

«Кім бы ні быў ты, табе, чалавеку,
Што ўратаваў небараку,
Шчасця жадаю і доўгага веку,
Шлю я ад сэрца падзяку.

Бачыш дзяўчыны душу бессардэчнай,
Зараз спакой свой знайду я:
Грэшніцу збавіў ад мукі ты вечнай
Слоўкам адзіным: л ю б л ю я!

Покуль сузор'ямі свеціцца неба,
Пеўні яшчэ не спявалі,
Слухай расказ мой, табе яго трэба
Ўсім расказаць тут, каб знаці.

Колісь жыла я шчаслівa на свеце,
Звалі Марыляй, мой тата
Самы вялікі меў чын у павеце,
Быў ён мажны, жыў багата.

Клопат тады быў адзін у старога —
Выбраць мне добрага мужа.
Пекнай была, жаніхоў мела многа:
Вабіў пасаг іх мой дужа.

Мноства іх марна вакол уздыхала,
Гэта было мне прыемна,
Я жаніхамі тады пагарджала,
Следам хадзілі дарэмна.

Быў там і Юзік, як весняе ранне,
Юны, прыгожы, цнатлівы.
Слоў у мяне не прасіў ён кахання,
Сам жа кахаў, нешчаслівы.

Плача і плача, з тугою вялікай
Часам у вочы мне гляне.
Цяжка яму, а я з радасцю дзікай
Бачу, як сохне ён, вяне.

Кажа: «Пайду!» — «Што ж, ідзі!» — адказала.
Хлопца любоў загубіла:
Скора матуля яго пахавала,
Бачыш — над рэчкай магіла.

Стала жыццё з таго часу нялюба,
Позняе мучыць сумленне;
Больш не вярнуць цябе, страшная згуба.
Дзе ж ад пакуты збавенне?

Раз неяк позна прыйшла я дадому,
Грукат пачуўся са свістам,
Юзік з'явіўся між гулу і грому,
Прывідам выплыў агністым.

Кінуў у пекла мяне ён, шалёны,
Ў рэкі смалы агнявыя,
Там я пад стогны, выццё і праклёны
Словы пачула такія:

«Ведала ж добра ты Божую волю:
Створана Богам кабета,
Каб упрыгожыць мужчынскую долю,—
Як жа забыла ты гэта?

Сэрца ты быццам каменнае мела,
Мольбаў было табе мала,
Ветла ні разу не паглядзела,
Слова любві не сказала.

Будзеш за чэрствасць загубную гэту
Мучыцца ў пекле, дзяўчына,
Покуль не скажа табе з таго свету
Ўголас: «Люблю я!» — мужчына.

Юзік у слёзах благаў таго слова,
Мусіць твой прывід страшлівы
Гэта не плачам прасіць ці намовай,
А праз жахлівыя дзівы».

Скончыў, схапілі мяне злыя духі,
Сто год мінула сягоння.
Мука мне ўдзень ад пякельнай задухі,
Ноччу выходжу з прадоння.

Мушу блукаць там, дзе Юзя магіла,
Небу й зямлі я абрыдла,
Людцаў пужаю, нячыстая сіла,
Прывід паўночны — страшыдла.

Зверне са сцежкі за мной падарожны,
Ў багне каня загублю я,
Лае заўсёды й кляне мяне кожны.
Першы сказаў ты: люблю я!

Добра зрабіў і за гэта пазнаеш
Лёс ад мяне ты свой, скора
Стрэнеш Марылю, яе пакахаеш...»
Певень запеў тут на гора.

Глянула радасна ў вочы і шпарка
Ўгору ўзнімаецца, тае,
Быццам вясенняя лёгкая хмарка,
Што вецярок раздзімае.

Цэлы мой воз, ацалела і збруя,
Страхі знікаюць начныя;
Людцы, прамоўце за грэшных, прашу я,
Тройчы — «Святая Марыля».

[1819]

Лілеі

Балада[1]

Выпадак нечуваны —
Забіла пані пана;
Забіла і хавае
Ля ручая, ля гаю,
Лілеі там саджае,
Саджаючы, спявае:
«Расціце так высока,
Як пан ляжыць глыбока;
Як пан ляжыць глыбока,
Расціце так высока!»

Крывёй заліта пані,
Бяжыць праз луг, паляну,
Праз нетры баравыя,
Праз долы, горы, долы;
І цені ўсе начныя
Згушчаюцца наўкола.
Пугач крычыць за борам,
Ды каркае злы воран.

Бяжыць, дзе расахаты
Па-над крыніцай бук,
І стукае у хату
Пустэльніка: стук, стук!

[1] З народнай песні. *(Заўвага аўтара.)*

«Хто там?» — стары пытае,
Ідзе з агнём, і пані,
Як прывід, улятае,
Галосячы, на ганак.

Твар, як хусціна, белы,
Страх у вачах, дрыжыць,
І вусны пасінелі:
«Муж... нежывы... ляжыць!»

«Ды Бог з табой, жанчына!
Каго, скажы, шукаеш,
Чаго ліхой гадзінай
Адна ўначы блукаеш?»

«За лесам тут, за ставам,
Мой замак мураваны,
Муж разам з Баляславам
Пайшоў на кіяўлянаў.
За годам год мінае,
А ён усё не едзе;
Адна я, маладая,
Кругом мяне — суседзі.
Парушыла я слова.
Вярнуўся муж. За здраду
Кароль заўжды сурова
Карае без спагады.

Ды грэх я свой схавала!
Вось бачыш — нож і кроў!
Не прыйдзе муж дамоў.
Табе ж я ўсё сказала...
Парай мне, што рабіць,
Каб я малітву знала,—
Ратунку папрасіць!
Гатова на край свету
Ісці праз пекла, скалы,
Каб толькі ганьбу гэту
Ноч вечная схавала!»

Стары ў адказ: «Жанчына,
Цябе не грэх трывожыць,
Баішся кары, згінуць?
Існі спакойна можаш,
Хай страх табе не сніцца!
Хто здрадзіць таямніцу?
Такая воля Божжа,
Ўсё, што зрабіла скрыта,
Муж ведае, ды ён жа
Не выдасць, бо забіты».

Прысуд — па сэрцы пані.
Зноў праз лясы, паляны
Бяжыць яна дадому
Сцяжынаю знаёмай.
А дзеці каля брамы
Яе пытаюць: «Мама!
Скажы нам, дзе наш тата?» —
«Нябожчык? Дзе? Ваш тата?»
Што адказаць — не знае.
«Застаўся ён ля гаю,
Ён хутка завітае».

Чакаюць бацьку дзеці
І дзень, другі і трэці,
І тыдзень ўжо мінае;
Нарэшце забываюць.
Ды пані грэх не можа
Ніяк забыць. У сэрцы
І нудна, і трывожна.
Ніколі не смяецца,
Ніколі ёй не спіцца!
То недзе недалёка
Цяжкія чуе крокі,
То шорахі ў святліцы,
То рэха адзавецца:
«Я тут, ваш бацька, дзеці!»

Зноў дзень. Яна не можа
Знайсці спакою ў сэрцы.
І нудна, і трывожна.
Ніколі не смяецца!

«Глянь, Ганка, на дзядзінец!
Стук капытоў на мосце,
Дыміць, пыліць гасцінец;
Мо гэта едуць госці?
Глянь, можа, ў ранні час
Хто завітаў да нас?»

«Я верхавых там бачу.
Іх коні ржуць і скачуць,
І шабель бляск люстраны
Відаць, хоць пыл густы.
Дык гэта ж едуць, пані,
Нябожчыка браты!»

«Дзень добры гаспадыні!
Пашана і прывет!
А дзе наш брат?» — «Загінуў,
Пакінуў гэты свет».—
«Калі?» — «Даўно, больш года
Няма яго з паходу».—
«Хлусня, не вер нікому!
Вайны даўно няма.
Яго ўжо хутка дома
Пабачыш ты сама».

Тут пані пабляднела,
Жахнулася, самлела,
Зрок непрытомным стаў,
З трывогаю пытае:
«Ці ж муж мой не сканаў?»
А толькі страх растаяў,
Прыкінулася, быццам
Ад шчасця ўсхвалявана:
«Дзе муж мой, дзе каханы,
Калі ж дамоў прымчыцца?»

«Ён ехаў перад намі,
Спяшаўся ў замак свой,
Каб нас прыняць з сябрамі,
Сустрэціся з табой.
Ён будзе дома скора.
На нейкім на раз'ездзе,
Сярод глухога бору,
Напэўна, збіўся недзе.
Хай пашукаюць людзі,
Ён скора дома будзе».

Паслалі слуг, шукалі,
Дзён некалькі чакалі,
Але дарма, з трывогай
Збіраюцца ў дарогу.

Выходзіць, просіць пані:
«Браткі мае, куды вы
Ў асенні час туманны,
Сцюдзёны і дажджлівы?
Яшчэ не ад'язджайце
І брата пачакайце!»
Чакаюць. Снег, зіма,
А брата ўсё няма.

Чакаюць, мо вясной
Іх збудуцца надзеі?
А брат ў зямлі сырой,
І белыя лілеі
Растуць над ім высока,
Як ён ляжыць глыбока.
Ужо вясна мінае,
Браты не ад'язджаюць.

Ім любы двор гасцінны,
Красуня гаспадыня;
Хоць пра ад'езд гавораць,
Не думаюць пра зборы.
Так лета ўсё мінае,
І брата забываюць.

Ім любы двор гасцінны,
Красуня гаспадыня,
З якою падружылі,
Якую палюбілі.
У кожнага у сэрцы
Надзея і трывога.
Жыць без яе — горш смерці,
А разам жыць — не могуць.
Удвух адна ў іх рана,
Удвух ідуць да пані.

«Паслухай, братавая, нас
І не крыўдуй дарэмна!
Мы толькі тут марнуем час,
Твой муж загінуў пэўна.
Сваёй красы ты не марнуй
І маладосці пашкадуй.
Бо ўжо не вернеш страты,
Вазьмі за брата брата!»

Што думалі, сказалі.
Іх сэрцы зайздрасць паліць,
Адзін — глядзіць варожа,
Другі — маўчаць не можа;
Ледзь злосць сваю стрымаюць,
Мячы ў руках сціскаюць.

І што ім адказаць,
І як — не знае пані.
Іх просіць пачакаць,
Сама ж хутчэй змярканнем
Бяжыць, дзе расахаты
Па-над крыніцай бук,
І стукае у хату
Пустэльніка: стук, стук!
Яму ўсё расказала,
Што ёй рабіць, спытала:

«Як памірыць іх мне?
Дваіх люблю, прызнацца.
З каторым — пад вянец,
З каторым — развітацца?
Дзяцей маленькіх маю,
І грошай ёсць багата,
Але ж без мужа, знаю,
Ужо не той дастатак.
Ах, пэўна, мне ніколі
Не быць замужняй болей!
Баюся Божай кары,
Спакою я не знаю:
Ледзь сон мяне ахмарыць,
З дзвярэй замок злятае;
Схаплюся я і чую
Гром, шорах па кутках,
І ў поўнач у глухую
Я бачу мерцвяка!
З нажом крывавым нізка
Над ложам ён сагнецца,
І сыпле з вуснаў іскры,
І рве маё ён сэрца.
Ах, досыць розных страхаў,
Не жыць мне ў гэтым гмаху,
Не знаць дабра ніколі,
Не быць замужняй болей!»

«Дачка,— стары гаворыць,—
За грэх такое гора,
Пакайся, калі можаш,
Тады і Бог паможа.
Я волю неба знаю,
Табе я абвяшчаю:
Хоць муж твой мёртвы спіць,
Магу я ўваскрасіць».

«Не, не, лепш не трывож!
Уваскрашаць не час!
Навекі востры нож,
Знай, разлучае нас!

Я заслужыла кару,
Перанясу я кару,
Каб толькі знікла здань!
Багацце ўсё раздам,
Пайду я ў манастыр,
У цёмны лес густы.
Не, не, лепш не трывож!
Уваскрашаць не час!
Навекі востры нож,
Знай, разлучае нас!»

Стары ўздыхнуў гаротна,
Слёз нават не стрымаў,
Прыкрыў свой твар маркотны
І рукі заламаў:
«Збірайся замуж, пані,
Ідзі, не бойся здані!
Памёршаму ніколі
Не ўстаць з-пад вечных меж,
Твой муж не прыйдзе болей,
Калі не пазавеш!»

«Братоў як памірыць?
Чыёй мне жонкай быць?» —
«Ва ўсім даверся Богу,
Пакажа ён дарогу.
Як толькі дзень настане,
У лес пашлі іх рана,
Хай кветак прынясуць,
Табе вянкі сплятуць.
І кожны з іх іначай
Хай свой вянок адзначыць
І ў блізкім храме Божым
На алтары паложыць!
Вянок чый возьмеш, той
Муж і каханак твой».

Павесялела пані.
Вяселле хутка з мілым.

І ўжо не страх ёй здані,
Бо век пастанавіла
Забітага не звацць
І нат не ўспамінаць.
Усцешылася пані,
Зноў праз лясы, паляны
Бяжыць сабе дадому
Сцяжынаю знаёмай.
Прыстане адпачыць
Ды зноў далей бяжыць.
Шуміць у лесе вецер,
Шуміць, а ёй здаецца,
Што нехта даганяе,
Што нехта шэпча ёй:

«Я тут, твой муж, з табой!»
Што ёй рабіць, не знае.
Прыстане, зноў бяжыць,
Змарылася, дрыжыць,
І страшна аглянуцца,
Бо стогны раздаюцца
І рэха ўслед за ёй:
«Я тут, твой муж, з табой!»

Ды хутка ўжо нядзеля,
Настаў і час вяселля.
Ледзь дзень заззяў на ўсходзе,
У лес браты выходзяць.
Вядуць дзяўчаты паню
Да шлюбу у касцёл,
Яна вянок духмяны
Бярэ, глядзіць наўкол,
Пытае ўсхвалявана:
«Вось мой вянок з лілей,
Скажыце ж мне хутчэй,
Чый ён, хто мой каханы?»

Прыбег старэйшы брат.
Смяецца, скача, рад,

Шчаслівы, б'е ў далоні:
«Мая ты, мой вянок!
Я стужкаю чырвонай
Яго абвіў знарок.
Знак гэты бачу я!
Вянок мой, ты мая!»

«Хлусня! — другі крычыць.—
Хай кожны паглядзіць,
Дзе я лілеі рваў,
Дзе я вянок сплятаў.
Я рваў іх на кургане.
Я пакажу вам той
Курган сярод паляны!» —
«Вянок не твой, а мой!»
І сварка нарастае,
Брат брату не ўступае.
Ужо мячы звіняць,
Ужо ўступілі ў бой,
І толькі крык чуваць:
«Вянок мой!» — «Не, ён мой!»

Ды вецер у касцёле
Тут дзверы расчыніў
І свечкі пагасіў,
І нехта ў зброі, белы,
Знаёмаю хадой
Прыйшоў, і ўсе наўкола
Яго пачулі голас:
«Вянок не ваш, а мой!
Вянок з майго кургана,
І мне, ксёндз, шлюб давай
З нявернаю каханай!
Я, жонка, муж твой, знай!
Бяда, браты, і вам —
Я кветак не аддам!
Спыніце смертны бой!
Я брат ваш, я муж твой.

Мае вы, мой вянок,
Ідзём у вечны змрок!»

Тут сцены задрыжалі,
Зруб трэснуў па вуглах,
І заваліўся дах,
Усё ў зямлю запала.
Адно на месцы тым
Растуць лілей кусты,
Растуць яны высока,
Як пан ляжаў глыбока.

[Май 1820]

Do Nemna

Niemnie, domowa rzeko moja! gdzie są wody,
Które niegdyś czerpałem w niemowlęce dłonie,
Na których potem w dzikie pływałem ustronie,
Sercu niespokojnemu szukając ochłody.

Tu Laura, patrząc z chlubą na cień swej urody,
Lubiła włos zaplatać i zakwiecać skronie,
Tu obraz jej malowny w srebrnej fali łonie
Łzami nieraz mąciłem, zapaleniec młody.

Niemnie, domowa rzeko! gdzież są tamte zdroje,
A z nimi tyle szczęścia, nadziei tak wiele?
Kędy jest miłe latek dziecinnych wesele?

Gdzie milsze burzliwego wieku niepokoje?
Kędy jest Laura moja, gdzie są przyjaciele?..
Wszystko przeszło, a czemuż nie przejdą łzy moje!

[1821]

Нёман

Нёман, рэчка майго дому! Дзе воды тыя,
Што я чэрпаў калісьці дзіцячай рукою
І, сэрцу шукаючы майму супакою,
Плыў калісь па табе я ў куткі дзікія?

Тут Лаўра, сабе ў косы наўплятаўшы кветак,
На цень свой прыгожы ў глыбіню глядзела,
А на хвалю той рэчкі мне сляза ляцела
І абраз муціла, дарагі мне гэтак.

Нёман, мая рэчка! Дзе ёсць воды тыя,
А з імі шчасце, надзеі дзеліся куды?
Дзе мілыя, дзіцячыя вяселля гады?

Дзе Лаўра і сябры мае дарагія?
Мінула ўсё, што прынёс мне век малады,
Усё прайшло... Чаму ж не расстаўся з слязьмі я?

Пераклад Альбіна Стаповіча (1927)

Да Нёмана

Нёман, родны мой Нёман! Празрыстай вадою
Ты абмываў мне калісьці малому далоні,
Плыў па табе я, пакінуўшы родныя гоні,
Ў землях далёкіх шукаць сваймў сэрцу спакою.

Бераг высокі, пакрыты расістай травою;
Тут Лаура фіялкамі ўквечвала скроні,
Мілы вобраз яе ў тваім чыстым улонні
Муціў я не раз гарачай юнацкай слязою.

Нёман, рака мая! Дзе тыя даўнія хвалі?
Дзе тое шчасце? Лепшыя нашы намеры?
Светласць дзяцінства, поўная радаснай веры?

Дзе ён, бурлівы парыў мой у светлыя далі?
Дзе вы, Лаура, сябры? Не адчыняцца дзверы.
Ўсё прамінула, жыццё толькі слёз не забрала.

Пераклад Юркі Гаўрука (1955)

Да Нёмна

Нёмне, рака айчыны! Дзе ёсць тыя воды,
Што іх яшчэ ў маленстве чэрпаў у далоні?
Што імі потым плаваў у дзікія тоні
Неспакойнаму сэрцу шукаць прахалоды?

Тут Лаўра ў захапленні з уласнае уроды
Любіла збіраць краскі і аквечваць скроні;
Той вобраз, люстраваны ў срэбнахвальнай лоні,
Слязьмі ці раз муціў я — натхнёны заўсёды.

Нёмне, мой родны краю! Дзе ж бедаў пагрозы,
А з імі поўна шчасця, нядолі так многа?
Дзе ўсмешкі ўяў дзіцячых — ранку залатога?

Бурлівы ўзлёт юнацкі і мройныя крозы?
Лаўра — уцеха й радасць? Сябры дзе? Нікога...
Мінула ўсё... Чаму йшчэ са мной мае слёзы?

Пераклад Алеся Салаўя (1955)

Да Нёмана

Мой любы Нёман, дзе сягоння тыя воды,
Куды мы праз квяцістыя скакалі гоні,
Каб з прыгаршчаў напіцца нам, умыць далоні
Альбо ў спякоту выкупацца з асалодай?

А дзе Лаура, што на цень глядзела горды,
Духмянай лотаццю ўпрыгожваючы скроні?
Дзе твар яе ў сярэбраным адбіўся лоне,
Там у юнацтве слёзы я раняў заўсёды.

Дзе, любы Нёман, узбярэжжа тыя росы,
Якія неслі шчасце і надзей так многа
У час, калі была бясхмарнай дзён дарога,

І ў час, калі віхура заплятала косы?
Хай ёсць Лаура, а ■ маіх сяброў — нікога...
Усё прайшло, чаму ж асталіся мне слёзы?

Пераклад Міхася Дуброўскага (1965)

Да Нёмана

Дзе тыя воды, родны Нёман мой,
Што чэрпаў я ў дзіцячыя далоні,
А потым плыў па іх у край далёкі,
Каб думцы даць разгон, душы — спакой?

У люстра іх глядзелася вясной
Лаура, кветкамі спавіўшы скроні,
Я вобраз любай у тваім улонні
Не раз муціў гарачаю слязой.

Мой родны Нёман, дзе ўжо тыя хвалі?
Дзе мары, што ў нязведаныя далі
Мяне, гарэзу юнага, вялі?

Дзе слодыч летуценняў і надзей?
Сябры, Лаура... Дзе ж вы сёння, дзе?
Усё сплыло... А слёзы не сплылі.

Пераклад Хведара Жычкі (1973)

Да Нёмана

Рака маленства, дзе ты, Нёман мой,
Чые струмені браў калісьці я ў далоні?
Тут юнаком праз даль — што мне віры і тоні! —
Я ўслед за марай плыў тваёю сінізной.

Лаура часта тут, над гладдзю люстраной,
Любіла косы заплятаць, уквечваць скроні.
Яе адбітак любы сцішана ў сутонні
Я колькі раз муціў гарачаю слязой.

Мая рака, мой родны Нёман! Дзе твая
З дзіцячых год так сэрцу любая бруя?
Дзе шчасця слодыч, дзе вы, дзе, надзеі, крозы?

Дзе маладосці бурнай выклік нецвярозы?
Дзе ты, мая Лаура, дзе сяброў сям'я?..
Усё прайшло... Чаму ж мае не пройдуць слёзы?!

Пераклад Кастуся Цвіркі (1985)

Да Нёмна

Нёмне, рэчка мая радаводная, дзе
Тыя воды, што браў я ў маленстве ў далоні,
Па якіх потым плыў у самотным палоне
Сэрца ахаладзіць, што зайшлося ў нудзе?

Цень красы тут Лаура сачыла ў вадзе,
Валасы заплятала і ўквечвала скроні,
Вобраз вабны яе ў срэбных хваляў на ўлонні
Я слязамі ў запале муціў у жудзе.

Радаводная рэчка мая, дзе твае
Маладыя крыніцы, што білі няспынна,
Дзе нявінных гадоў навіна і правіна?

Дзе бунтоўнасць, якой мне цяпер не стае?
Дзе Лаура мая? Дзе былая сябрына?..
Знікла ўсё, што ж не высахлі слёзы мае!

Пераклад Рыгора Барадуліна (1986)

Да Нёмана

О Нёман, родная рака! Дзе тыя воды,
Што чэрпаў [redacted] ў дзіцячыя далоні,
А потым у зацішша плыў па іх улонні
Шукаць для сэрца ўзбуранага ахалоды?

Там часта Лаўра, улюбеніца прыроды,
Любіла плесці косы, квецем строіць скроні,
Яе там вобраз, намалёваны ў затоне,
Слязой не раз муціў я ў маладыя годы.

О Нёман, родная рака! Дзе тыя плыні,
А з імі тое шчасце, гэтулькі надзеяў?
Дзе радасці з дзіцячых мілых спраў, падзеяў?

Гады мае бурлівыя — ў якой краіне?
Дзе зараз Лаўра? Дзе сябры? А сам вось дзе я!
Мінула ўсё!.. Чаму ж сляза ў вачах не гіне?

Пераклад Пятра Бітэля (1992)

Да Нёмана

Прысядзібны мой, хатні мой Нёман, дзе воды,
Да якіх па квяцістых скакалі мы гонях
І ў якія свае апускалі далоні,
Каб крынічнай зачэрпнуць хутчэй прахалоды?

Тут Лаура глядзела ў люстэрка прыроды,
Валасы заплятала, уквечвала скроні;
Тут выяву красы яе ў срэбным улонні
Скаланаў я слязой захаплення й лагоды.

Родны, хатні мой Нёман! Крыніцы дзе тыя,
З імі шчасце, надзеі, што так віравалі?
Дзе празрыстых лятункаў крыніцы прапалі?

Дзе сябрына, юнацтва гады залатыя? —
Ўсё панеслі з сабой хвалі часу крутыя.
Калі так — дык чаму ж маіх слёз не забралі?

Пераклад Васіля Жуковіча (1993)

Да Нёмна

Мой Нёман родны, дзе сягоння тыя воды,
Якія чэрпаў я ў дзіцячыя далоні
І заплываў з якімі ў дзікія затоні,
Калі шукаў для сэрца сцішнай прахалоды?

Лаура горда ў іх глядзелася заўсёды,
Касу любіла заплятаць, уквечваць скроні,
І вобраз там яе, адбіты ў хвалі лоне,
Не раз я замуціў слязьмі ў былыя годы.

Мой Нёман, родная рака, дзе хвалі тыя,
А з імі столькі шчасця, і надзей, і114 мараў?
Дзе весялосць, маленства мілае без хмараў?

Дзе век бурлівы, леты нашы маладыя?
Лаура дзе? Сяброў не бачу, любых твараў,
Усё прайшло, а слёзы памяці жывыя.

Пераклад Уладзіміра Мархеля (1993)

Да Нёмна

Рака мая Нёман, дзе плешчуць струмені вады,
Якую я чэрпаў далонямі ў час свой дзяцінны
І плыў па якой чым далей — у глухія мясціны,
Як сэрца ратунку шукала сабе ад нуды.

Лаура на цень прыгажосці сваёй і тады
Глядзела, заплёўшы фіялку ў касу, штохвіліны,
І вобраз, адбіты ў струменях, чароўны, адзіны,
Слязьмі я не раз каламуціў, вар'ят малады.

Дзе, Нёман, рака мая родная, тыя струмені,
А з імі і шчасце, надзея і вера ў свой лёс
І любае сэрцу юнацкіх гадоў утрапенне,

Якое, як лепшы ўспамін, праз гады я пранёс?
Дзе зараз Лаура сама, і сябры, і памкненні?
Усё ўжо мінула, усё, акрамя... маіх слёз.

Пераклад Яўгена Міклашэўскага (1998)

ЮЛЬЮШ СЛАВАЦКІ
(1809—1849)

Юльюш Славацкі, другі (пасля Адама Міцкевіча) вялікі польскі паэт XIX ст., нарадзіўся на Украіне, у горадзе Крамянец цяперашняй Тарнопальскай вобласці. Значная частка жыцця і творчасці Славацкага звязана таксама з Беларуссю. Неўзабаве пасля нараджэння Юльюша яго бацькі пераехалі ў Вільню. Вышэйшую асвету будучы пісьменнік атрымаў на юрыдычным факультэце Віленскага універсітэта (1825—1828), дзе пасябраваў з многімі выхадцамі з нашага краю, вывучыў гісторыю Беларусі-Літвы. З беларускай прыродай, культурай, мовай Славацкі знаёміўся і ў час студэнцкіх вакацый, частку якіх ён звычайна праводзіў на Ашмяншчыне, і падчас працяглых — на павозцы — паездак з Вільні ў Крамянец. Беларускія ўражанні, асобныя падзеі і постаці беларускай гісторыі затым увасобіліся ў некаторых творах пісьменніка, такіх, як трагедыя «Міндоўг, кароль літоўскі», «Песня літоўскага легіёна», фрагмент гістарычнай прозы пра князя Радзівіла Сіротку і інш. «Сасновыя лясы каля Ашмян» ён прыгадваў нават у эміграцыі, куды вымушаны быў падацца ў выніку паражэння польскага нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830—1831 гг., на якое адгукнуўся шэрагам рэвалюцыйна-патрыятычных твораў («Ода да вольнасці», «Кулік», «Гімн», «Песня літоўскага легіёна» і інш.).

Жыццёвыя шляхі вялі Славацкага ў Парыж і Лондан, у Германію і Швейцарыю, на Блізкі Усход (Сірыя, Ліван, Палесціна). Нягледзячы на нягоды вандроўнага жыцця, цяжкую хваробу (спадчынныя сухоты) пісьменнік шмат і плённа працаваў, пісаў вершы («Мой тастамант», «Пахаванне капітана Майзнера», «Савінскі ў акопах Волі»), паэмы («Гадзіна роздуму», «Ангелі», «У Швейцарыі», «Бянёўскі»), драматычныя творы («Кардыян», «Мазепа», «Баладына», «Ліля Вянеда»), спрабаваў свае сілы ў прозе. Збор ягоных твораў налічвае 15 тамоў. Разам з А. Міцкевічам ён стаў найбольш яскравым прадстаўніком польскага рамантызму, выразнікам намераў і ідэалаў палякаў першай

паловы XIX ст. Патрыятычны пафас творчасці, жанравая шматстайнасць, высокае пісьменніцкае майстэрства, віртуознае валоданне вершам — усё гэта не столькі пры жыцці, колькі пасля смерці (а памёр Славацкі ў Парыжы ва ўзросце 40 гадоў) прынесла яму еўрапейскую і сусветную вядомасць.

Творы Славацкага для гэтага выдання ўзяты з кнігі:

Славацкі Юльюш. Выбранае. Мінск: Дзяржвыд БССР, 1959 (пераклалі: вершы «Гімн» — Язэп Семяжон, «Мой тастамант» — Уладзімір Дубоўка, «Песня дзяўчыны-казачкі» — Піліп Пестрак, паэму «У Швейцарыі» — Максім Танк).

Гімн

Сумна мне, Божа! Хоць ты прада мною
Пурпурам захад заліў прамяніста,
Гасіш падсіненай хваляй марскою
Зорак маніста,
Мора і неба залоціш прыгожа.—
Сумна мне, Божа!

Я, як той колас, што выплакаў зерне,
Голаў узняўшы, стаю ля заліва.
Пройдзе тутэйшы і ўвагі не зверне:
Выгляд шчаслівы.
Хто ім тут я — пілігрым перахожы?
Сумна мне, Божа!

Як дзіцянё, не хаваючы жалю,
Тужыць па маці, так з жалем гляджу я
На небакрай, дзе, скаціўшыся ў хвалі,
Сонца начуе.
Як бы хацеў з ім і я ў падарожжа! —
Сумна мне, Божа!

Сёння у плаванні ў моры вялікім —
Сто міль ад берага Нільскай даліны —
Ранілі ў сэрца мне мілыя клікі
Стай жураўліных,
Можа, дзе ў Польшчу ляцяць яны, можа...
Сумна мне, Божа!

Частыя думы аб блізкай магіле,
Сум і туга па бацькоўскаму дому.

Гнаны вандроўнік — лічу свае мілі
Ў грукаце грому.
Вечна ў хадзе — на шляхах, раздарожжах...
Сумна мне, Божа!

Ты будзеш сведкай: зложу свае косці
Не пад плітой мармуровай у склепе.
Тым, што спачылі на родным пагосце,
Сто разоў лепей.
Мне ж ты судзіў неспакойнае ложа.
Сумна мне, Божа!

Знаю, штодзень на радзіме сіротка
Моліцца шчыра па мне без прывету.
Знаю, не ў край мой плыве мая лодка
З белага свету.
Мабыць, маленне яе не паможа,—
Сумна мне, Божа!

Гэтыя фарбы шматлікіх адценняў,
Гэтае зарыва з далі крывавай
І праз стагоддзі другім пакаленням
Будуць забавай.
Хто ж прымірыцца з нікчэмнасцю зможа?
Сумна мне, Божа!

Напісана на захадзе сонца ў Александрыі
19 кастрычніка 1836

Песня дзяўчыны-казачкі

I

У месячным бляску трывожна-дзівосным
Вандрую са смуткам сцяжынай.
Кветку шукаю я з тысячы розных,
Над ёю бярозка схілілася слёзна,
І слёзы мае — сірацінны.

Як з нецвярозае, людзі смяюцца,
Не знаюць, аб чым я смуткую.
Я кветкі зрываю — і вянуць, і гнуцца.
А я зноў па кветкі вандрую.

II

Плыве сабе слёзанька ціха і скрытна,
Бо плачу па цяжкай я згубе,
Глянь, ружа у полі пад ззяннем блакіта,
Канвалія белая ■ ружаю звіта,
Мой мілы казача, мой любы!
Што? Песня з царквы ці званкі ля аселіц?
Сябры ці сваты ўжо чакаюць?
Ах!.. Кветкі павялі — не на вяселле,
Па кветкі вандрую да гаю.
Не ад рыцарскай шабельнай згінуў ён сталі —
Узнеслі магілу высока,
А колькі жменяў пяску насыпалі,
Столькі ж праклёнаў з пяском пасылалі,—
Мой любы, спіць ён глыбока.
Праклёнаў не чуў ён, не чуў ён і плачу
У тую цяжкую хвіліну.
Пясок беспрытульніка крые, бядачы.
Вянок жа мой — на дамавіну!

28 снежня 1829

Мой тастамант

Жыў я тут з вамі, пакутаваў з вамі і плакаў,
Сёння ад вас адыходжу навекі ў нябыт я.
Варты пашаны не быў для мяне абыякім,
Ваша нядоля тугою маёй апавіта.

Не пакідаю ніякага спадчынаёмца,
Ані для лютні маёй ні наймення.
Імя маё праляціць, як маланка, пад сонцам,
Будзе, як пошчак, ісці праз усе пакаленні.

Тыя, што зналі мяне, у паданнях адзначце,
Што маладосць сваю ўсю я аддаў для народа.
На баявым караблі быў заўсёды на мачце,
Гінуць пачаў карабель — з ім пайшоў і пад воду.

Хто будзе думаць аб лёсах айчыны каханай,
Калі ў ім знойдзецца кропля святога сумлення,
Скажа, што дух мой быў славаю продкаў убраны
І не бывала на ім жабраваных адзенняў.

Прыйдуць няхай дружбакі мае ўночы, пры зорах,
Возьмуць з грудзей маё сэрца і спаляць з альвасам.
Той, што дала гэта сэрца, хай вернецца порах:
Доўг свой адбуду і свету і матцы тым часам.

Хай дружбакі мае сядуць ля поўнае чары,
Сховы мае хай зап'юць хоць уласнай нядоляй.
Духам я стану — з'яўлюся да іх, як прымара,
Дасць Бог пакуту — не ўбачымся больш мы ніколі.

Я заклінаю: жывыя, надзею не траццe!
Перад народам трымайце асветы паходню.
Трэба памерці — адзін па адным паміpайце,
Але руйнуйце варожую сілу вы штодня.

Што да мяне — вам маленькую дружбу пакіну.
Тых, што маглі пакахаць маё гордае сэрца.
Згодзен пайсці ў неаплаканую дамавіну,
Доўг свой увесь я адбыў напярэдадні смерці.

Здолее хто цераз свет, абыякасці поўны,
Так перайсці, як вось я перайшоў, без авацый?
Быць рулявым на напоўненым духамі чоўне,
Так, як яны, непрыкметна з жыццём развітацца?

Ўсё ж застанецца мая вам фатальная сіла,
Што пры жыцці магла толькі... чало мне аздобіць.
Будзе нябачна гнясці вас яна да магілы,
Можа, калі хлебажорцаў анёламі зробіць.

1839

У Швейцарыі

Паэма

I

Яна, як мара, знікла, залатая.
Я сохну з жалю, і чаму — не знаю,
Мая душа не вырвалася з цела
І да анёлаў з ёй не паляцела,
Каб недзе там, за небасхілам сінім,
Быць разам з маёй любай і адзінай.

II

Між гор швейцарскіх ёсць каскад, з якога
Аар блакітны скача на парогах.
Прыгледзься лепей да вяршынь у хмарах!
Ці бачыш там вясёлку па-над ярам?
З сярэбранай імглы яна звісае,
Пераліваецца і не згасае.
Часамі толькі белыя ягняты
Праскачуць праз вясёлку на даліны
Папасвіцца пад засенню ляшчыны.
Ці голуб прыляціць — вястун крылаты —
Вады напіцца, бліснуць апярэннем
У гэтым спектры казачных праменняў.
Тут я яе сустрэў аднойчы рана,
Нібы з вясёлкі яркай, з пены белай
Яна з'явілася нечакана.
Здаецца, ў сонцы ўся яна гарэла;
Здаецца, ўся яна была абвіта
Святлом анёльскім і нябёс блакітам.
Я на яе глядзеў, зачараваны,
Не мог вачэй адвесці закаханых.
А пачуццё любві з такою сілай
Запаланіла і душу і сэрца,
Што праз цясніну да яе, здаецца,
Я паляцеў бы на птушыных крылах.
Баяўся я, каб сонечная мара,
Пакуль душа, збудзіўшыся, аклікне,

Не згінула навек пад кручай яра,
Ў вясёлцы не растала і не знікла.
І [redacted] баяўся, як у сне баяцца,
Прачнуўшыся, са сном сваім расстацца.
Вось так упершыню я стрэўся з ёю
Пад яснаю вясёлкавай дугою.
Захоплены красой яе дзявочай,
Стаяў я, доле апусціўшы вочы.

III

Мы разам з ёй праз горы і даліны
Ішлі аж да граніцы той лавіны,
Дзе распластаны снег на сонцы ззяе,
Як плаўнікі шырокія дэльфіна,
Ў якога з храп туман клубіцца сіні,
А з белай пашчы Рона выплывае.
Я помню, як у гэты ранак парны
Спалоханыя стрэлі нас дзве сарны;
Ды быццам шчасце наша іх спыніла,
І, нерухомыя, яны застылі,
Свой затапіўшы позірк — бліскавіцы! —
Ў вачах маёй каханай, ў іх блакіце;
Яны, галовы зблізіўшы, стаялі,
На нас у захапленні паглядалі!
І я сказаў: «Ты іх зачаравала!»
І мне ў адказ усмешка з вуснаў мілай
Зляцела ўпершыню, твар азарыла
Ды зноў хутчэй вярнулася з вандроўкі
Ў гняздо да сваёй ружы, да сяброўкі.
А ўбачыўшы, што воч я не спускаю,
Яе твар белы замяніла ружай.
І ведаеце? Так не захапляе
Румянец кветак пасля зімняй сцюжы,
Так не бярэ вандроўніка за сэрца
Царыца Альп, што дыядэмай ззяе,
Калі яе зары прамень асвеціць,
Як сціплы, дарагі румянец гэты,
Усмешкаю народжаны, сагрэты.

IV

І з той пары шчаслівымі былі мы,
Калі адны азёрамі плылі мы,
Не знаў: ці лодка нас нясе па хвалях,
Ці крылы у мяне павырасталі,
І я, як горны дух, імкнуўся ўдалеч.
Яна вяла мяне, куды хацела!
Яна была як лебедзь снежна-белы.
Была азёраў гэтых гаспадыняй.
Плыла — і лодка ўслед плыла няспынна.
За лодкай ззяла паласа блакіту,
За ёю — рыб срабрыстых карагоды
Ігралі ў сонцы па азёрных водах.
Так мы, акружаныя гэткай світай,
Плылі па ціхай казачнай краіне.
Яна была як водная багіня,
Якой служылі птушкі і дэльфіны,
Ў якой былі палацы ў тонях сініх,
Кароны з зор паўночнаю парою.
І ўсё яна магла зрабіць са мною.

V

Аднойчы я задумаўся, што, можа,
Яна не пасланец, прадвеснік Божы?
Ды як я сумнявацца мог, не знаю.
Паслухайце! Перад каплічкай Тэля
На прыбярэжны камень узляцела
І голасна сказала мне: «Кахаю».
Грудзьмі сваімі белымі на хвалі
Неспадзявана лодку адштурхнула.
І я не ведаў, што са мною стала:
Ці патанаю ў хваль бурлівым гуле,
Ці я ўзлятаю ў неба па-над светам,
Ці змесцяць мае грудзі шчасце гэта,
Ці сэрца, быццам лёд нагрэты, тае,
Ці крылы херувіма вырастаюць,
Якія маёй валодае душою?

А што ў душы? Надзеі, непакоі?
Як хмары галубоў, усе пачуцці
Зляцеліся, каб слёз маіх напіцца,
Ў крыніцы майго сэрца акунуцца
І чыстымі зноў рэяць у блакіце.
Ды тут данёсся кліч са скалаў стромых.
Пачула лодка і, як бліскавіца,
Памчалася на голас, ёй знаёмы.

VI

Над кручаю, дзе дрэў вянок хваёвы,
Каплічка Тэля ў водсветах барвовых.
А побач ёсць парог, дзе б'юцца хвалі,
Дзе вусны мае вуснам прашапталі
Ўсё, што так даўно было вядома сэрцу.
Ніжэй парога — цені скал і вецце,
Адлюстраванае ў вадзе, ў якую
Глядзелі разам мы ў хвіліну тую,
Калі аб нашым шчасці гаварылі.
На бераг з шумам хвалі набягаюць.
Адна з іх, жартаўлівая, крутая,
Ў сваёй празрыстай тоні нас адбіла
І зблізіла, злучыла нашы рукі,
Хоць нас злучалі толькі словаў гукі.
Ах, жартаўніца хваля! Вусны мілай
Яна з маімі вуснамі злучыла,
Хоць толькі сэрцы мы злучыць паспелі.
Яна ў праменнях сонечных гарэла.
Нас акружыла серабрыстым колам,
Змяшала, быццам постаці анёлаў.
Успомню — стане горка і тужліва.
Як, хваля, ты адбіла ўсё праўдзіва!

VII

Аднойчы мой анёл залатакосы
Завёў мяне ў грот ледзяны, дзівосны.

Там алебастравыя сцены ззялі,
І на чале маёй царыцы сцюжа
Пасерабрыла палявыя ружы.
А са скляпення слёзы ападалі,
І сільфы гораў ■ велізарным ззяннем
Ляцелі на дзявочае адзенне.
І, чуючы сцен гэтых плач-рыданне,
Яна ўся затулілася, як ценем,
Ўсё ад цікавых позіркаў схавала
І нават свае рукі скрыжавала
На алебастры бачным, хоць і скрытым.
Стаяла так у яркім ззянні, быццам
Святлом вясёлкавым была абвіта.
Тады пачаў я на яе маліцца:
«Ave Maria!»
Як на расцвіўшай ружы, што раскрые
Бутон свой, поўны чырвані і жару,
Румянец гэткі ўбачыў я на твары
Маёй святой. Яна маленькі палец
Свой на сцяне крыштальнай затрымала,
Як тая, што задумалася ў цішы
Ці дарагое імя крэсліць-піша.
І да мяне звярнуўшыся, сказала:
— Мо за любоў сваю прыму нямала
Пякельных мук і недзе назаўсёды
Замураванай буду ў глыбах лёду,
Як пухірок паветраны, марозны...
Але калі празрыстае стварэнне,
Народжанае сонечным праменнем,
Пакутуе, я ўпэўнены, што можна
Уздыхам знішчыць путы ледзяныя...
«Ave Maria!»

VIII

З табою разам пойдзем на вяршыні!
Вышэй лясоў, там, дзе на лугавіне
Пасецца статак, гук званочкаў тае,
І дзе Юнгфрау ўся ў вясёлках ззяе

У неабсяжнай ледзяной кароне,
І дзе алені скачуць праз адхоны,
І дзе арлы на хмару снегавую
Цень крыл сваіх жалобны адкідаюць.
Туды, о любая, з табой пайду я!
Калі ж адтуль не вернемся, я знаю,
Што людзі скажуць: духі гор забралі
З сабою нас у сонечныя далі,
І мы ляцім бясконцым шляхам зорным,
Падхопленыя грамадой плеядаў,
І толькі рынуць з гэтых кручаў горных
Бліскучых слёз нястрымныя каскады.

IX

Ах, самыя шчаслівыя не знаюць,
Дзе духі гор, свае згарнуўшы крылы,
Як лебедзі, сядзяць, адпачываюць?
І нізашто ніхто не адгадае,
Ў якой краіне жыў я з маёй мілай!
І колькі руж у вокны нам свяціла,
І колькі вішань там расло ў даліне,
І колькі гнёзд было ў іх салаўіных;
Якія ў поўнач месячныя трэлі
З каскадам галасілі і звінелі,
Як са званочкамі ішлі атары —
Не ўбачыш гэтага ні ў сне, ні ў марах.
І расказаць у словах немагчыма
Пра луг зялёны, вішнякі густыя,
Дзе белы анёл крыламі сваімі,
Што ад скалы і да скалы раскінуў,
Укрыў абрывы дзікія, крутыя,
Нас, салаўёў, і ружы, і хаціну.

X

Але так моцна пахлі кіпарысы,
Агнём пунсовым ружы наліліся,
Што ледзь каханне нас не асляпіла.

Каскад — я помню — сонца азарыла,
А мы сядзелі ў гэты дзень шчаслівы,
Схіліўшыся над кнігаю чуллівай.
Ды раптам нейкі дух шапнуў спакусны,
Каб я свой позірк перавёў на вусны
Майго анёла, што аб нечым думаў,
На твар, які палаў румянцам сумным,
Празрыстым, быццам ранні золак лета.
Не ведаю, як здарылася гэта.
Брыльянты воч і вусны цалаваў я,
І на руках сваіх яе трымаў я
І сэрцам чуў, як б'ецца яе сэрца.
Ды нешта ў косах вадзяных каскада
Ўскіпела бурна, і раптоўны вецер
Дыхнуў на нас імглы вільготнай чадам,
Дыхнуў на кветкі, што тут расцвіталі.
І з той пары мы кніг больш не чыталі.

XI

Яна маркотнай, белай, ціхай стала,
Радзей мяне усмешкаю вітала,
Часцей бывала ў засені, у змроку,
Збірала ружы — кветкі над патокам.
Спынялася каля каскадаў шумных,
Гул гэтых лютняў слухаючы сумна,
Спусціўшы галаву, адпачывала.
Часамі рукі белыя ўздымала,
Як чалавек, што хоча бараніцца,
Ці як той голуб, калі п'е з крыніцы.
Часамі прыглядалася абколам,
Блукала сонным і павольным крокам,
Былую жвавасць ластаўкі згубіла.
Нявіннасць яе ўсю заваражыла.

XII

Хацеў я апраўдацца перад ёю,
Перад каханай, любаю маёю.

Сказаў: — Даруй, караць мяне не варта —
Ва ўсім адна лілея вінавата.
Калі прыйшла ты ўчора да крыніцы
У асвяжаючай бруі памыцца,
А недалёка за табой стаяла
Лілея ў свежай, у вясновай белі,
Нібы служанка з вопраткай чакала,
Калі ты выйдзеш з вадзяной купелі.
І, вас убачыўшы перад сабою,
Падумаў: сню і пра анёлаў мрою.
Я здрыгануўся і неасцярожна
Крануў галінку, а яна — другую,
І разбудзіў шум цішыню лясную,
І ты, пачуўшы гэты шум трывожны,
Спалохалася, і калі ўцякала
Ты, выбегшы на бераг з ручаіны,
Сваймі грудзьмі дзявочымі зламала
Лілеі беласнежную сцябліну.
Падумаў я: ты жвавая якая,
А кволая раслінка вадзяная.
Не я, знай, вінаваты, а лілея,
Што ля каскада гэтага бялее.

XIII

Яна палала пахам свежай міры,
Хоць мо сама таго не адчувала.
І паглыбелі воч яе сапфіры,
Усхваляванай, неспакойнай стала.
І ад румянцу, што гарэў заўсёды,
Блакітны позірк адцвітаў заўчасна.
І мігатлівым зорным карагодам,
Як матцы, скардзілася на нягоды.
Калі сыходзіў з неба месяц ясны
І кветкі ёй шапталі пра каханне,
Задумаўшыся, марыла да рання.

XIV

Няўжо і сёння, любая, сумуеш,
Анёлам Божым скардзішся, бядуеш
І плачаш ты, што неба ў навальніцу
Гарэла ад чырвоных бліскавіцаў?
Ты помніш грот сярод панурых скалаў,
А ў ім заслону з ледзяных крышталяў,
І неспакой у цемрадзі трывожны,
І забыццё аб пакаранні Божым,
Рыданні чыстых німфаў у цяснінах?
Ты помніш, як дзень шэры нас пакінуў,
А золак блізка нашы твары ўбачыў
І разбудзіў нас звонкі хор птушыны?
Няўжо былое ўспамінаеш з плачам?
Не скардзься прад анёламі на лёс свой,
Бо кожная твая сляза малая
У сэрцы іх пажарам запалае.
Калі б і я быў пасланцом нябёсаў
З чалом, якое б німбам прамянела,
Калі б нат уладаў сусветам цэлым
І кіраваў зор незлічоных роем,—
Я не хацеў бы ззяць у небе сінім,
Пакінуў бы я зорныя вышыні,
Каб на зямлі жыць, разам быць з табою.

XV

Адна не смела з грота паказацца,
Баялася, што сонца можа здацца
Надзвычай прамяністым, велізарным
Ці нейкай чорнаю жалобнай плямай.
Ды ўбачыла нявыплаканай хмары
Перад сабой вясёлкавую браму
І выйшла. І здзівілася, што столькі
Ізноў квітнее ружаў, як і ўчора.
Адну сарвала. Паглядзела ўгору
І залюбавалася вясёлкай,
Блакітам неба, месяцам срабрыстым,

Што раставаў у сіняве празрыстай.
Здаецца, ўсё ў жыцці яе дзівіла —
То йшла, то зноў спынялася нясмела.
Крыштальная тонь возера адбіла
Яе твар засмучоны, пабялелы,
І стомленасць, і вусны, як каралы,
І ўсмешку, поўную тугі і жалю.
Схавалася у косах, што апалі,
І на мяне вачэй больш не ўзнімала.

XVI

Ёсць прад усходам месяца хвіліна,
Калі ў дуброве салаўі змаўкаюць
І нават шэпат лісця заміраe,
Ледзь дыхаюць у травах ручаіны,
Нібыта зорка ў час маўклівы гэты
Збіраецца пагаварыць са светам,
З лісткамі, кветкамі і салаўямі.
Ёсць час, калі ўзыходзе над гарамі
Дыяны персцень бледна-серабрысты,
Калі галосяць салаўі ў гушчарах,
Шум чуецца у кронах густалістых,
Звіняць патокі на абрывах яра —
У гэткі час два сэрцы разам плачуць!
Калі ім ёсць прабачыць што — прабачаць!
Калі ім ёсць запомніць што — запомняць.
У гэткі час, у веснавую поўнач,
Сядзелі мы з ёй ля хаціны сельскай,
Аб рэчах гаварылі аб анельскіх.

XVII

Як жаўрука трэль весняя ў блакіце,
З гор плыў звон урачысты ад капліцы.
«Наведаем пустэльніка старога.
Мо што параіць, радаснае скажа.
Кахаць дазволіць, рукі нашы звяжа!» —
Сказала, ўмомант знікла за парогам,
Замкнула шчыльна ў хаце аканіцы,

Каб кветкі не маглі з яе дзівіцца.
І калі выйшла — думаў, што загіну!
Такіх вачэй прыгожых, вуснаў свежых
Не бачыў я ў жыцці сваім ні ў кога.
На галаве матыль быў, цень якога
Ляжаў на алебастры беласнежным,
Надзейна засланяючы твар мілай
Ад сонца, каб яго не апаліла.
З-пад вэлюма, з-пад матыліных крылаў
Цікавыя дзве ружы выглядалі,
І свежасцю пялёсткі іх палалі.
І, знаючы, што я пільную сэрца,
Матыль прысеў каля яго пагрэцца,
Перахіліўся праз плячо дзяўчыны.
Ледзь я стрымаўся, каб яго не скінуць.
І хто б паверыць мог у прадчуванне,
Калі у сэрцы радаснае ззянне!
Ды глянуў я з гары на край даліны:
Труной здалася дальняя хаціна,
А ля яе магільнікам суровым
Цямнеў, пакінуты, наш сад вішнёвы.
Па нас галубкі ціха буркавалі,
Ды на лугах атары сумавалі,
І пасінелі чорныя крыніцы,
Смерць наглуха забіла аканіцы.
Усё мяне журбою напаўняла,
Нібы назад звароту не было нам.
Ішоў я сумны ў горы, праз адхоны...
Азёры чорныя, снягі і скалы,
Арлоў гірлянды на блакітным лёдзе,
Дыск сонца, быццам у крыві, заходзе,
Пустэльніка дом, гурбы снегавыя,
На прывязі аўчаркі вартавыя.
Над келляй — крыж і снегіры, а ў келлі —
Святыя кнігі і стары пустэльнік.
Мне ўсё здаецца гэта сном сягоння.
Я толькі помню: яркі і чырвоны
Зары вячэрняй водбліск на іконе,
Калі на палец на яе халодны
Надзеў пярсцёнак.

XVIII

Гаі, даліны, горы, сенажаці,
Вы пра яе ў мяне лепш не пытайце.
Мне слёзы гаварыць забараняюць.
Калі пачну — адразу ўспамінаю
Яе блакітны позірк і чытаю
Спагаду ў ім, ды бачу вусны тыя,
Што цалавалі мяне ў дні былыя.
Дрыжу і ўвесь агнём ізноў палаю.
Куды пайду і вочы дзе схаваю?
І дзе змагу я адпачыць, самотны?
Стаю, зноў бачу дарагія рысы.
Пішу імя я на пяску вільготным,
Блукаю паміж руж і кіпарысаў,
Як чалавек, што скарб згубіў багаты,
І звар'яцеў ад беззваротнай страты,
І плача над магіламі, як быццам
Яму што змогуць адказаць грабніцы.

XIX

Тут ёсць фантан пад вокнамі маімі,
Які слязамі плача залатымі,
І дрэва ёсць, дзе салаўі гняздуюць,
І шыбіна шкляная, праз якую
Глядзіць у поўнач бледная Дыяна
І вабіць мяне сумнымі вачамі.
І прачынаюся я са слязамі
Ад шуму дрэва, гоману фантана.
І, бледны, праз акно я пагдядаю
І слухаю галошанне ў даліне.
Фантана плёскат, гоман салаўіны
Аб ёй гавораць. Сэрца раскрываю
І смерць сваю малю аб спачуванні.
Я сохну, вяну, ды не паміраю...
Фантана плач зноў будзіць на світанні.

XX

Калі мінулае прыпамінаю,
Як лепш яе намаляваць — не знаю.
Ці той галубкаю, што прылятала
Мяне будзіць і ціха цалавала?
Ці німфаю альпійскай палахлівай?
Ці той, што некалі, парой шчаслівай,
Схіліўшыся, над кнігаю сядзела,
За кожным рухам сочачы нясмела?
Ці ля хаціны, па двары гуляла,
Як зачарованая каралева?
Ці калі спала пад цяністым дрэвам,
Хавалася або мяне страчала?
Ці белай, як той месяц, ці ружовай,
Як снег альпійскі ад зары барвовай?

XXI

Як толькі ў небе загарацца зоры,
Я падымуся на вяршыні гораў,
Я пагляджу на ключ на лебядзіны
І паляту ў далёкі свет за імі.
Бо у якой бы я ні жыў краіне —
За далямі, за хвалямі марскімі —
Я знаю: з горам і з тугой сваёю
Нідзе ніколі не знайду спакою.
Таму і не шукаю больш мясціны,
Дзе мог бы я свой сум забыць, пакінуць,
Дзе нават горны дух не дакранецца
Да ранаў акрываўленага сэрца,
Дзе месяц, ззяючы з вяршынь надземных,
Залоціць снежныя лавіны, рэкі
І зачаруе так душу таемна,
Што збудзецца і адляціць навекі.

Сарэнта, чэрвень—ліпень 1836

ЮЗАФ КРАШЭЎСКІ
(1812—1887)

Выдатны польскі пісьменнік Юзаф Ігнацы Крашэўскі сямейнымі каранямі моцна звязаны з беларускай зямлёй, адкуль паходзілі яго бацькі, дзе нарадзіўся яго малодшы брат Каятан, які таксама стаў пісьменнікам. Нарадзіўся Юзаф Крашэўскі ў Варшаве, але дзіцячыя гады правёў на Брэстчыне. Там знаходзіўся маёнтак бацькоў. Беларускае Палессе прываблівала Крашэўскага і ў пазнейшыя гады. Многія творчыя задумы лучаць яго таксама і з украінскімі землямі Валыні.

Вучыўся Крашэўскі ў Свіслацкай гімназіі на Гродзеншчыне, пасля — у Віленскім універсітэце. За ўдзел у тайным студэнцкім патрыятычным гуртку каля двух гадоў знаходзіўся ў турме. Напярэдадні паўстання 1863 г. царскія ўлады выслалі «ненадзейнага» Крашэўскага за межы Польшчы, у Германію. На працягу ўсяго жыцця ён настойліва займаўся самаадукацыяй. За каласальную эрудыцыю ў 1872 г. Крашэўскага абіраюць акадэмікам Акадэміі ведаў у Кракаве, ганаровым доктарам навук універсітэта ў Франкфурце-на-Майне.

Ю. Крашэўскі працаваў у розных галінах мастацкай творчасці. У Вільні і Варшаве ён выдаваў і рэдагаваў часопісы. Дзякуючы Крашэўскаму дзесяць гадоў у Вільні выходзіў літаратурна-навуковы альманах «Athenaeum» (1841—1851), некалькі гадоў ён быў рэдактарам «Gazety Polskiej». На Украіне, у Жытоміры, Крашэўскі ўзначальваў дзейнасць драматычнага тэатра. Уражвае тытанічная, ні з чым не параўнаная працаздольнасць пісьменніка. Творчая спадчына Крашэўскага складаецца з шматлікіх вершаў, драм, апавяданняў, аповесцей, сацыяльна-побытавых і гістарычных раманаў, нарысаў, літаратурна-крытычных артыкулаў, публікацый па філасофіі, лінгвістыцы, краязнаўстве, археалогіі. Ён аўтар 232 раманаў і аповесцей, у тым ліку — 88 гістарычных!..

Сярод вызначальных адметнасцей творчай канцэпцыі пісьменніка, якія яскрава выявіліся ў яго прозе,— патрыятызм і гуманізм, дэмакратычнасць поглядаў, паважлівае стаўленне да чалавека з народа. Крашэўскі сваімі творамі спрыяў станаўленню

рэалістычнага літаратурнага метаду. З'яўляючыся своеасаблівым мастком паміж рамантызмам і рэалізмам, яго проза падрыхтавала нараджэнне такіх знакамітых польскіх пісьменнікаў, як Генрык Сянкевіч і Эліза Ажэшка.

Шматлікія падарожжы па Беларусі натхнілі Крашэўскага на навуковае і мастацкае асэнсаванне гісторыі нашага краю. Так, у прыватнасці, адна з яго шматлікіх навуковых прац, прысвечаных беларускай зямлі, мае назву «Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні...». Пяру Крашэўскага належаць творы і ў галіне жывапісу, ён маляваў беларускія пейзажы, пакінуў цікавыя замалёўкі этнакультурнага характару — беларускае адзенне, архітэктура, народныя абрады і г. д. У гістарычнай прозе Крашэўскага, побач з уласнапольскімі навуковымі крыніцамі, хронікамі, летапісамі, паданнямі, выкарыстоўваюцца дакументы Вялікага княства Літоўскага. Такія творы, як «Апошнія хвіліны князя-ваяводы (Пане Каханку)», «Кароль у Нясвіжы. 1784», «Маці каралёў (Ягайлавы часы)», адлюстроўваюць падзеі, што адбываліся ў Вільні, Нясвіжы, Навагрудку, Гродне, Белавежскай пушчы і іншых беларускіх мясцінах.

Месца дзеяння ў аповесці Крашэўскага «Паперы Глінкі» — беларускі Нясвіж, палац князя Караля Радзівіла (Пане Каханку). Час дзеяння — XVIII ст. Аповед у гэтым творы, як да гэтага і ў «Апошніх хвілінах князя-ваяводы (Пане Каханку)», вядзецца ад імя аднаго з ахоўнікаў палаца — Глінкі (адсюль і назва твора). Яго вуснамі даецца апісанне побыту і нораваў, што панавалі пры двары князя, ён — як непасрэдны сведка — апісвае і ўсе падзеі, якія ў той час адбываліся на Нясвіжчыне, дае характарыстыку асноўным дзейным асобам аповесці — самому Каралю Радзівілу, авантурысту шляхціцу Кшыскаму і інш. Урэшце, праз характар аповеду, ацэнку тых ці іншых падзей, адносіны да Кшыскага і іншых персанажаў твора мы, чытачы, можам скласці пэўнае ўяўленне і пра самога Глінку. Аповесць, як і многія іншыя творы Крашэўскага, чытаецца з цікавасцю, мае немалое пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Творы Юзафа Ігнацы Крашэўскага на беларускую мову перакладалі Янка Купала, Васіль Сёмуха, Міхась Кенька.

Аповесць «Паперы Глінкі» перакладзена Міхасём Кенькам. Яна падаецца паводле выдання:

Крашэўскі Юзаф. Маці каралёў. Паперы Глінкі: Гістарычныя аповесці. Мінск: Маст. літ., 2007.

Паперы Глінкі

Аповесць

(Скарочана)

Ужо шмат панапісвана, дый пэўна што многа яшчэ будзе пісацца пра нясвіжскую даўніну, час ардынацыі[1] яго княскай мосці Караля Радзівіла Пане Каханку, аж пакуль не звядуцца людзі, што помняць яго самога і ягонае жыццё, ад якога цяпер ужо і следу не засталося. А колькі сапраўды можна нараcказваць усякай усячыны — усіх успамінаў пра Радзівіла і на валовай скуры не змясціць! Было на што паглядзець і чаму падзівіцца, бо тады сіла і моц ішлі на пару з выдумкай; тады чыніліся такія рэчы і дзеі, якім цяпер проста цяжка даць веры. Свет прайдзі, а пра такое не пачуеш. І трэба расказаць, бо ўсё тое, што дзейкаюць пра тыя часы, тых людзей, тыя выпадкі, не толькі не зусім праўдзівае, але нават дужа далёкае ад праўды ў розных пераказах. Пра многія прыгоды цяпер ужо цяжка ўспамінаць, бо ім не паверaць. Іншыя часы тады былі, іншыя прыгоды, цяпер мы іх не разумеем, а раней часта досыць было адной думкі, каб для вяльможнага пана немажлівае стала мажлівым.

Я помню безліч гісторый, падобных да тых, якія цяпер апісваюць, але сам і ў думках не маю ахвоты прастарэквацць пра іх: навошта выстаўляць напаказ тое, што рабілі няпростыя людзі, чые справы цікавілі шмат разумнейшых за мяне, як бы каму ні хацелася пра іх уведаць. Двор князя Караля, як і яго маетнасць і ўладанні, яго багацці, быў велізарным. Найперш гэта — шляхта, сваякі, якіх, калі ўлічваць сем'і, было гэтулькі, што яны ўтваралі свой малы свет і своеасаблівы ўдзельны край. Уся гэтая процьма народу жыла ў Нясвіжы і ў навакольных княскіх вёсках і мястэчках або пры самой асобе князя ў замку. Калі прылічыць да прыдворных яшчэ і чыноўнікаў, пасэсараў[2], начальнікаў над войскам, аканомаў, старых кліентаў роду, духавенства, бедных сваякоў — дзесятую ваду на кісялі, то лік іх пераcягне за тысячу. Ставала яшчэ і гэтак званых рэзідэнтаў — рознага кшталту нахлебнікаў, якія з княскай ласкі карміліся рэшткамі ад ягонага стала ды падарункамі; яны нічога не рабілі, толькі ўслаўлялі Бога і свайго дабрадзея.

Што да мяне, то я ніколі не любіў людзей, якія жылі з чужой ласкі. Хай сабе мусяць так жыць старыя і калекі, а для здаровага чалавека гэта надта няхораша — есці не зароблены ўласным гарбом хлеб. А такіх дармаедаў у Нясвіжы было шмат, бо князь ахвотна прымаў іх, трактаваў і трымаў пры сабе па завядзёнцы ў сваім родзе і дзеля пагалоскі сярод людзей пра сваю шчодрасць і дабрыню.

Я ў той час служыў у рэгіменце[3] князя, мы неадменна з усім нашым аддзелам стаялі ў Нясвіжы і, вядома, круціліся пры двары. Мы не так ужо і ўлягалі ў службу, хіба толькі час ад часу рабілі экзэрцыцыі[4] ў полі, віталі пачэсных гасцей, а больш за ўсё тыднямі, ды што там — месяцамі гулялі ў мар'яж[5] ды пазяхалі. Князь пад старасць любіў выкідваць розныя конікі, часам быў занадта вясёлы, а часцяком, наадварот, змрочны, хоць пры чужых людзях стараўся паказаць сябе гасцінным і добрым, але ж кожны з наблізаных бачыў, які ён няшчасны. Таму ягоныя прыдворныя, прыяцелі і мы ўсе, колькі нас было, стараліся неяк развесяліць яго.

Колькі народу дзень пры дні раілася ў замку! Не было таго дня, каб не прыязджаў нехта чужы: пасланец, шляхціц [redacted] просьбай, госць, кліент, квестар[6], артыст, цыркач або купец. А асабліва тыя, хто ганяўся па свеце за звонкай манетай, дык зляталіся, як матылі на агонь, бо князь нездарма славіўся сваім багаццем. Калі хто здолеў дагадзіць Радзівілавай душы, то ўзнагароджваўся па-каралеўску. Некаторыя дзеля гэтай узнагароды проста вылузваліся са скуры. Каля нашага двара аціралася нямала і набрыдзі. Ад некаторых проста немажліва было ўхіліцца, а бывала і так, што князь Караль сам прымаў іх і запрашаў застацца; ну, яны і асталёўваліся на цэлае лета — елі, пілі, адбываліся дробнымі паслугамі... а гаспадар часам не мог іх нават з твару ўспомніць.

Помню, неяк надта гарачым днём, аж парнасць стаяла ў паветры, як толькі паабедалі і ўсталі з-за стала, то ўсім гамузам пайшлі за князем у сад. Там была альтанка, дзе раслі грабы, дагледжаная, густая, цяністая, чалавек дзвесце лёгка маглі б схавацца ў ёй. Князь любіў там адпачываць, бо туды сонца не зазірала, ды каб і дождж надарыўся, то не вельмі намачыў бы, так густа спляліся галіны.

Пасярэдзіне альтанкі стаяў круглы каменны стол, вакол яго — такія ж лавы, а яшчэ былі зладаваны сядзенні з дзярніны ў некалькі радоў. Ганаровыя госці сядзелі на каменных лавах, астатнія — на дзярніне, якая хоць і была мякчэйшай, але часам убірала ў сябе вільгаць у гэтым зацененым месцы. Аднак улетку сядзець было не мокра.

У тыя часы ў Нясвіжы ўжо не пілі так, як раней, ды і сам князь страціў цікавасць да бурапенных кубкаў, а ўсё ж па абедзе не абходзілася без кілішка; і ледзь толькі, бывала, двор атабарыцца ў альтанцы, як слугі адразу прыносілі бутэлькі з пітвом. Пілі, хто што хацеў, хто што жадаў. У буднія дні рэдкіх він не падавалі, але сухое венгерскае было заўжды. Каб ставілі на стол кожны дзень усё найлепшае, то на столькі вуснаў і горлаў не стала б ніякіх прыпасаў. З Венгрыі штогод прыходзілі абозы з віном, і з ім абыходзіліся па адной завядзёнцы. Маладога віна не пілі, давалі яму выстаяцца, і толькі вытрыманае падавалі на стол. Ключар князя, у распараджэнні якога былі скляпы, поўныя самых розных гатункаў віна, дзе кожны мог бы знайсці тое, што хацеў, апрача хіба птушынага малака, быў важнай фігурай, меў ясную галаву, добрых памочнікаў і патрабаваў, каб за віном быў добры нагляд. Бочак тут была процьма, розных бутэлек, буслоў[7], пляшак — не злічыць. Каля іх, нібы мурашы, мітусілася нямала рознай набрыдзі — немцаў, французаў, ды і сваіх ставала. Калі князь хацеў выпіць нечага асаблівага з адмысловага склепа, дзе захоўваліся старыя мядовыя віны віленскіх ваяводаў або віны гішпанскія, валашскія[8], бургундскія, мальвазія[9] і іншыя, то на гэта выпісваўся спецыяльны квіток. Для тых вінаў падаваліся спецыяльныя малыя кілішкі, адумысна зробленыя ў Венецыі — з разьбой, гербамі і вензелямі. Я такіх болей нідзе не бачыў: па празрыстым шкле ідуць нібыта ніці, малочна-белыя, па-майстэрску выразаныя. Калі такія кілішкі ставілі на стол, то гэта была пэўная адзнака: падаваць будуць не сухое венгерскае. Бывала, зойдзе князю ў галаву якая фантазія, ні з таго ні з сяго загадае падаць такога абамшэлага віна — і тады малы кілішак нікога не міне, хоць двор быў ніштаваты. А ў гэты дзень зайшла размова пра тое, чым лепей наталяць смагу. Генерал Фрычынскі,

які часта ездзіў на Усход, або купляць арабскіх коней, або з якім-кольвек даручэннем, спрачаўся з усімі і даводзіў, што вадой такую смагу не натоліш, нічога не вартая і вада з лімонным сокам, а настоеная на садавіне, асабліва на фігах, можа быць на Усходзе нават атрутнай. У гарачыню, лічыў ён, няма нічога лепшага, як выпіць моцнага віна. Тут узгарэўся дыспут *pro et contra* — за і супраць — як піць, што і калі, але большасць дыспутантаў стаяла на тым, што Бог стварыў ваду для піцця.

— Я ўжо адчуваю, пане каханку, да чаго ваша мосць хіляць,— прамовіў князь.— Вам хочацца паспытаць старога віна з радзівілаўскага склепа... ну, то хай маршалак выцягне на свет божы бутэльчыну-другую, але, пане каханку, на сёння не старэйшую, чым князя Крыштафа Першага.

Патлумачу: віны ў нас называліся па імені князя, пры якім яны былі закладзены. Віно князя Крыштафа Першага славілася тым, што было вельмі салодкім... цягучым, густым і моцным. Ніводзін лікёр не мог зраўнацца з ім у сіле, а пра смак і казаць няма што. Час — лепшы майстра, чым чалавек, калі ён зажадае нешта зрабіць, то ніякі фармацэўт не зраўнаецца з ім.

— З ласкавага дазволу вашай княскай мосці хачу сказаць слоўца,— скарыстаўшы момант, звярнуўся Фрычынскі да князя, бо сёння ён быў у добрым гуморы.

— Асіндзею[10], пане каханку, ты ж ведаеш, што ў Рэчы Паспалітай Нясвіжскай неабмежаваная свабода слова,— адказаў князь.

— Калі ўжо мы загаварылі пра віно,— пакланіўшыся, працягваў Фрычынскі,— то самы час мне нагадаць вашай княскай мосці, што ўжо цэлы тыдзень гасцюе тут, у Нясвіжы, і дамагаецца аўдыенцыі нейкі шляхціц, які хоча падараваць вам нешта незвычайнае. Але я не дапускаў яго да вас, бо ён падаўся мне баламутам...

— Мой Фрычынскі,— перабіў князь,— ты давай проста з моста, без усялякіх прадмоў, выкладвай, што маеш за душой. З цябе рытар нікудышны, а я не люблю, калі цягнуць ката за хвост.

— Але гэты шляхціц, відаць, авантурыст... Знайшоў дзесь бутэльчыну, кажа, што хоча паднесці князю віно,

якое каштаваў Ной, калі ступіў на зямлю з ладдзі пасля патопу. Гэтаму цяжка паверыць,— засмяяўся Фрычынскі.

— Чаму? Чаму? — перапыніў яго князь.— Які вы, пане, недаверлівы... Я сам чуў пра такое віно. Толькі я не быў упэўнены, ці то сам Ной, ці ягоны прайдзісвет сын Хам яго каштаваў. Але чаму вы не запрасілі сюды таго шляхціца? Тут сухмень такая... знайшлі пра што гаварыць, пра што спрачацца, а шляхціца згрыпцілі сабе...

— Ды надта ж ён, шляхціц гэты, падобны да штукара, а можа, нават і да махляра... — азваўся Нямекша.

— Ну і што? А хіба махляры на свеце не патрэбныя? — спытаў князь.— Не ўмееце вы, панове, разбірацца ў людзях, дайце яго мне... я мігам ушалоплю. Ты ж, асіндзею, ведаеш, што мне, як і ўсім Радзівілам, сам Бог гэты дар даў, мы нюхам чуем круцяля... Таму мне, пане каханку, так цяжка жыць сярод людзей, што адчуваю, як усюды смярдзіць. Але годзе прастарэкаваць —клічце сюды шляхціца з віном ад Ноя!

Прыдворныя адразу ж пабеглі па яго, а князь неспакойна разглядаўся на бакі і нарэшце ўбачыў абяцанага шляхціца, якога вёў цэлы натоўп. Князь доўга ўглядваўся ў яго, і было чаго, дальбог!

Перш-наперш, ліха яго ведае, якога ён быў роду, бо з твару — цёмны, цыганісты, валасы чорныя як смоль, кучаравыя; вочы пукатыя, нібы вугольчыкі, зубы доўгія, белыя... аблічча выцягнутае, нібыта кім груба, складкамі, абчасанае... Твар увесь зрос, нібы рудымі купінамі, бародаўкамі, пакрытымі доўгімі валасамі; рукі, у якіх ён трымаў шапку, таксама абраслі шэрсцю, як у мядзведзя... Ішоў ён, ківаючыся з боку на бок, хістаючыся так, нібыта хацеў паламаць косці, яго ногі лёталі, рукі матляліся, галава танцавала, вочы пучыліся, вусны трэсліся. Не зразумець было, ці такі ў яго стан заўжды, ці толькі ад вялікай радасці, што дапусцілі нарэшце да князя. Дый адзенне ягонае хоць і наскае, але асаблівага крою і колераў. На ім былі шырокія шаўковыя шаравары, малінавыя боты, атласны аранжавы жупан і яшчэ зялёны кунтуш. Мала таго, відаць, дзеля большага ўражання яго аздаблялі блакітны з чырвоным пас, а на кунтушы яшчэ і аранжавы, з пазалотай ці

мішурой галун. На шапцы тырчала блакітнае з шэрым пяро нейкай незвычайнай птушкі. Шабліца нагадвала турэцкую, хутчэй за ўсё ўсходняй работы. Ён яшчэ не падышоў да князя, а пачаў адбіваць паклоны, нібы падбіраў з зямлі арэхі... Пакланіўся так раз, другі, трэці, і потым выпрастаўся, як жэрдка, і застыў.

— Адкуль гэта цябе, пане каханку, Бог прыслаў? — спытаў князь.

— З самага Стамбула,— адказаў шляхціц.

— А хто ты, шляхціц, якога ты, пане каханку, роду? — зноў спытаў князь. У яго ажно вусны варушыліся хутчэй за думкі, так карцела яму распытаць.

— Шляхціц з прапрадзедаў і вядомага роду,— запэўніў госць.— Можа, ваша мосць князь, чулі — я з роду Кшыскіх.

— Кшыскіх? — двойчы паўтарыў князь і пацiснуў плячыма.

— Каля сотні год таму мы аселі на Русі... — патлумачыў Кшыскі.— Мая маці была *de domo Poraitarum* — з роду Паратаў — шляхцянка, Анна Ільдэфонсава. Бацька служыў харунжым у панцырнай харугве князя кароннага гетмана. Я таксама служыў у войску, вучыўся ў семінарыі, быў на гаспадарцы, вандраваў, па-рознаму спрабаваў знайсці шчасце, але мне ўсё не фарціла.

Князь пазіраў на госця з усё большай цікаўнасцю.

— Як жа гэта, васпан, натрапіў на тое Ноева віно, пра якое я ўжо чуў, пане каханку?

— Гэта, мабыць, маё адзінае шчасце ў жыцці,— адказаў Кшыскі.— Натрапіў я на яго ў Стамбуле.

— Але ж туркі не п'юць віна! — усклікнуў князь.— Дык, можа, ты нам, пане каханку, спрабуеш?..

— Якраз таму, ваша мосць князь, што туркі не п'юць віна, бутэльчына і захавалася. У мяне ёсць нават папера, якая пацвярджае гэта.

І ён дастаў з-за пазухі паперы, абвязаныя тонкім шнурком.

— Ну то расказвай, асіндзею, пане каханку,— прабурчаў князь.

Якраз у гэтую хвіліну ў альтанку зайшоў слуга, ён нёс невялікую скрынку, усыпаную жоўтымі зоркамі. Скрынка

была зроблена рукой майстра, усе з цікаўнасцю пазіралі на яе.

— Гісторыя, якую я вам раскажу, праўдзівая, і ў гэтым я магу прысягнуць, калі трэба,— паспешліва пачаў шляхціц.— У Стамбуле я апынуўся, шукаючы шчасця, вёз бурштын, быў у свіце нашага ваяводы, які нядаўна ездзіў туды з пасольствам.

— Пан там гандляваў? — удакладніў князь.

— Дальбог, не гандляваў,— запэўніў Кшыскі.— Бурштын мы везлі ў дар султану, спадзеючыся, што ён нам аддзячыць. Але там гэтыя Агі і Магі так хітравалі, што і бурштын сплыў, і нам нічога не перапала. Я сноўдаўся па вуліцах Стамбула, заходзіў у лаўкі да грэкаў. Завёў знаёмства з адным, які гандляваў з Усходам. Аднаго разу ён запрасіў мяне ў лаўку і многа расказваў пра свае вандроўкі па Арменіі і Персіі, пра розныя дзівосы, якіх там нагледзеўся. Расказаў і пра тое, як ён патрапіў у склеп, дзе Ной захоўваў віно. Паказаў мне пергамін, у ім было засведчана, што Сім і ягоныя нашчадкі вельмі дбайна ахоўвалі той склеп. Але час ішоў, віно раскрадалі, пілі, і ўрэшце засталося ўсяго тры бутэлькі. Іх купіў гэты самы грэк Андропулас і за вялікія грошы прадаў адну аўстрыйскаму цэсару, другую — французскаму каралю, а трэцюю, ваша мосць, з вялікай цяжкасцю выпрасіў я і змеркаваў, што прыдасца каралю і цэсару — можна прапанаваць і вашай мосці князю, якога наш народ шануе нароўні з каралямі і царамі. Падношу яго, не разлічваючы атрымаць за гэты *curiosum* — дзівос — за гэты нектар нічога, апрача панскай ласкі і жадання ўславіць несмяротнасць Літвы *patrem* — у вяках.

Сказаў так, пакланіўся, выставіў адну нагу ўперад, рукой даў знак, каб слуга падаў тую скрынку, узяў яе і з вялікай грацыёзнасцю паклаў ля князевых ног. Радзівіл заўжды выглядаў важным, нават калі расказваў нешта смешнае, а тут ён, здавалася, выйшаў з розуму, не спускаў вачэй з госця.

— Віно самога Ноя, пане каханку! — усклікнуў ён, прымружыўшы вочы.— Яго варта пакаштаваць... але хто

ведае, можа, Хам падсыпаў у яго дайвэльдрэку[11]? А можа, грэкі, армяне ці персы падмянілі яго?

— Там ёсць пячатка самога Ноя, на ёй адбітак ягонага герба, які ўсім вядомы,— галубка з галінкай у дзюбе,— без ценю замяшання адказаў Кшыскі.

Ён падышоў да скрынкі, зняў з яе вечка, і ўсе цікаўныя ўбачылі на мяккай атласнай падсцілцы старадаўнага выгляду бутэльчыну. Яна была тоўстая і сапраўды закаркаваная пячаткаю з выявай галубкі.

Кшыскі асцярожна ўзяў бутэльку і аддаў яе ў рукі князю, той абгледзеў яе з усіх бакоў, паківаў галавой і... вярнуў шляхціцу.

Нейкі час стаяла маўчанне, князь нахмурыўся і пра нешта змрочна раздумваў.

— Ведаеш што, асіндзею,— загаварыў князь, звяртаючыся да шляхціца,— я нават і не ведаю, што з ім рабіць. Самому піць — многа гонару, людзей частаваць — на ўсіх не стане... захавай ты лепей гэтае віно для каго-кольвек, хто сам з ахвотай яго вып'е... а мне яно... не патрэбна... Але раз ты ўжо так стараўся дзеля мяне, зрабіў такі падарунак, то я табе таксама пастараюся аддзячыць.

Кшыскі доўга ўпрошваў князя пакласці бутэльку ў свой склеп, нарэшце той кіўнуў галавой і загадаў захаваць яе *ad perpetuam rei memoriam* — на вечную памяць, а шляхціца пакінулі пры двары. Ён туляўся тыдзень, другі, дасыта еў і піў, неўзабаве асвойтаўся, пачаў усім слугаваць, мянціць языком, забаўляць князя — і здолеў так яму прыдацца і спадабацца, што князь Караль даў яму пры двары жытло, дамок, які застаўся пасля нябожчыка Барвінкоўскага. Дамок быў нішто, каля яго — невялікі садок і лужок, на якім магла пасвіцца кабыла. Для нас Кшыскі быў і своеасаблівай забавай, але ў той жа час і загадкай.

Хоць ён даводзіў, што паходзіць ад Кшыскіх, і многа чаго пераказваў пра свае прыгоды... аднак, слухаючы яго, увесь час думалася, што гэта круцель, якіх мала. Ён быў майстрам да ўсяго патроху, але добра рабіць не ўмеў нічога. Пра ўсякую рэч мог гадзінамі разважаць, і, пакуль не даходзіла да справы, магло здацца, што роўнага яму тут няма і не можа быць.

Князь быў, па праўдзе кажучы, вельмі паблажлівы да людзей і чалавечых заганаў, але гэтага балабона, які так стараўся дагадзіць яму, не любіў. Дазваляў мянціць языком, смяяўся, але ніводнага разу сам не загаварыў да яго, ні пра што больш не распытваў, не паказваў, што рады яму, карацей, усяляк стараўся пазбыцца назолы. Але нішто не дапамагала. Кшыскі наважыў убіцца ў ласку да князя і бессаромна, нахабна дамагаўся гэтага. На прыёмах, пры сустрэчах ён умудраўся стаць так, каб князь яго бачыў, чапляўся, шчаміўся, прымазваўся, загаворваў, калі ж не чуў адказу, рабіў выгляд, што жартуе. Праглынаў пігулку і зноў гнуў сваё. Урэшце мы да яго прывыклі і перасталі звяртаць увагу на ягоныя выбрыкі.

Хоць Кшыскі быў баламут і лгун, якіх мала, але лгаў ён дужа складна — падман у яго выглядаў праўдзівым; ды часам з мухі ён мог зрабіць слана, і падман раскрываўся. Аднак у яго заўжды знаходзілася апраўданне, спосаб выкруціцца.

Ягоны язык быў не раўнуючы як мянташка, а сам ён трапло несусветнае: не запнецца, не заікнецца, не збянтэжыцца, не пачырванее. Ён ні на кога не злаваўся, а легкаверных слухачоў у яго заўжды было як рыбы ў вадзе. З усімі пачцівы, паслухмяны, паслужлівы, заўжды вясёлы, незласлівы, ён урэшце нібы зросся з нясвіжскім дваром, яго цярпелі, хоць і не любілі, забаўляліся ягонымі выдумкамі, калі ж яго не было, то здавалася, быццам нечага не стае.

Усе яго ведалі, і ён ведаў усіх, бо стараўся кожнаму дагадзіць і заслужыцца... а слугаваў ён нават па найменшых дробязях ахвотна і жвава. Ніводзін навучаны нямецкі пудзель не вытанцоўваў так на задніх лапках перад гаспадаром, як ён перад намі стараўся паказаць сваю адданасць і паслужлівасць.

Якім мы яго ўбачылі ў першы дзень, такім ён заставаўся і надалей, мала што ў ім змянілася. Хіба што кунтуш у яго з'явіўся бурачковы, жупан блакітны, шаравары памяняліся на жоўтыя, але пярэстасць у адзенні засталася такой, як была. Плюмаж на шапцы быў калі такі, калі іншы, але заўжды відаць здалёк. З яго насміхаліся, аднойчы ў тэатры нехта з акцёраў надзвычай трапна імітаваў яго. Гледачы

аж за жываты браліся, і сам ён быў сярод іх. І вы думаеце, ён пакрыўдзіўся? Дзе там! Пайшоў шукаць актора, а той ад страху некуды зашыўся. Урэшце знайшоў. «Гэта было дужа, дужа ўдала, мілы пане Ганскі, але васпан трымаў рукі ў бокі, вось так... а я ніколі не расстаўляю рукі ў бокі, каб выпадкам не зачапіць каго локцем, гэта не ў маім характары»,— зрабіў такую вось заўвагу актору, пакланіўся і выйшаў.

Ён быў не дурань, часам вельмі дасціпны... а што насамрэч было ў яго пад той пярэстай апранахай... ніхто не ведаў. Трэліў, што паходзіць з Русі, называў мясціну, дзе жыў, а потым выяўлялася, што пра яго там ніхто не чуў і не ведаў.

Князь Пане Каханку называў яго спадчыннікам Ноя, з гэтай мянушкай ён і прыжыўся пры двары. Горш за ўсё для князя было тое, што Кшыскі ў сваіх паводзінах часам як бы прыпадабняўся да яго самога. Калі князь бываў у гуморы, то любіў прыдумляць розныя неверагодныя гісторыі... І вось Кшыскі пачынаў паддакваць яму, дадаваў сваё, працягваў, выдумляў нешта ўжо зусім дзівоснае. А князь тут жа змаўкаў і надзімаўся.

Неяк аднаго разу выйшла так, што князь паводле сваёй завядзёнкі стаў апісваць, як ён нібыта трапіў на неба, што там бачыў і чуў. А неасцярожны Кшыскі пачаў дапамагаць яму сваімі каментарыямі. І зараз жа князь змоўк. Толькі скоса зірнуў на Кшыскага. Сеў, што называецца, макам. Дзеялася тое па вячэры. Усе тут жа разышліся, засталося нас няшмат — генерал Фрычынскі, я, камендант крэпасці дэ Лажак, Пузына, якога князь вельмі любіў, нейкі Мацэвіч і яшчэ Заблоцкі. Мы збіраліся назаўтра на ловы ў Налібокі і хацелі абмазгаваць, як і калі ехаць. Але замест таго князь, які перад гэтым насупіўся і маўчаў, раптам звярнуўся да Пузыны:

— А мой жа ты князю! Князюхна, пане каханку! Падкажы, хто б мог збавіць мяне ад гэтага Кшыскага? Я б таму чалавеку даў бы каня з усёй збруяй... Косткай у горле ён мне перасеў, пане каханку, моташна глядзець на яго, выліты арлекін... Даводзілася бачыць такога самага ў валахаў на сцэне. Але там, пане каханку, добра было пасмяяцца

якую гадзінку — і па ўсім, а тут жа дзень у дзень з ім валаводзімся... Годзе! Пане каханку — годзе! Дайце вольна дыхнуць!

— Дык у чым рэч, ваша мосць, што можа быць прасцей? — здзівіўся Пузына.— Перадайце яму заўтра праз дворнага маршалка, што хочаце расстацца з ім, дайце на дарогу дзесяць дукатаў, і мы яго болей не ўбачым.

— О не! Так нельга,— адказваў князь.— Гэта не па-радзівілаўску. Няможна так. Трэба, каб ён сам з добрай волі паехаў з Нясвіжа.

— Яму тут добра! Яго адсюль і дымам не выкурыш! — усклікнуў Заблоцкі.

— То хай князь дасць яму дзе-колечы між лясоў пяць хатак у пажыццёвае ўладанне, ён і з'едзе, а мы пра яго забудземся,— дадаў Фрычынскі.

— Я даў бы яму дзесяць, прытым у спадчыну,— уздыхнуў князь,— але ж ён не такі дурны, каб паміраць з голаду пры дзесяці хатах.

— Тады б ён зажыў як пан... Заснаваў бы фальварак і вярнуўся б... Хай бы ўжо сабе еў і піў тут, але толькі каб не лез пішчом у вочы, Пане Каханку. А то ўсюды толькі яго і бачыш...

— О! — выгукнуў Заблоцкі.— Паспрабуйце, ваша княская мосць, даць яму даручэнне — адвезці ліст, вось мы яго і выкурым.

— Ага! Так ты яго і выкурыш! — запратэставаў Радзівіл.— Ды я мог бы вытурыць яго адным словам, каб толькі захацеў. Але я хачу расстацца з ім па-добраму.

Пузына задумаўся, а праз хвіліну прапанаваў:

— Ведаеце што, пане ваявода? Кшыскі вельмі ж хацеў бы ажаніцца, толькі шукае сабе вартай дзяўчыны, такой, каб яму падыходзіла. Дык хіба ў Нясвіжы не знойдзецца нахлебніц, што былі б радыя пакрыць свае дзявочыя грахі вянцом? Давайце яго ажэнім!!

— Ну, ну! — нявесела пахітаў галавой князь.— Мне здаецца, пане каханку, што ён вырвецца і ад жонкі, абы толькі сядзець тут у мяне на карку.

На тым і скончылася ўся размова, бо ўжо наставала пара, калі князя забірала на сон. А назаўтра мы паехалі ў

Налібоцкую пушчу, пасля князь яшчэ аглядаў фабрыку[12], дзе яму рабілі адмысловую ванну з блакітнага шкла.

Здавалася, нібыта пра тую размову ўсе забыліся і толку ад яе не было, але ў Нясвіжы дзеялася так, што ўсе тыя, хто любіў ваяводу, кожнаму ягонаму слову не давалі ўпасці на зямлю... Не забыліся яны і пра ягоную просьбу. Калі ўжо князь нечага захацеў, тое павінна было споўніцца, на гвалт...

А тым часам Кшыскі ўсё круціўся пры двары...

Як я ўжо казаў, пры двары ў Нясвіжы было безліч усялякіх нахлебнікаў і нахлебніц. Жанчын быў повен двор, некаторыя засталіся яшчэ з тых часоў, калі былі жывыя маці і сёстры князя. Выхаванкі, радня, служанкі, нават добрага роду шляхцянкі, бяднейшыя, багацейшыя, маладыя, маладжавыя — выбіраць было з каго. Хто з іх не прагнуў замуства пад высокім князевым апякунствам? Моладзі ставала, старэйшыя таксама не адмаўляліся ісці замуж, таму не было таго месяца, каб мы не танцавалі на вяселлі. А трэба сказаць, што панна, якая ішла замуж з двара, заўсёды мела ад князя нейкі падарунак: або пенсіён, або пажыццёвае ўладанне, або вёсачку ў пасаг, у найгоршым разе — аснову на гаспадарку і нешта пад падушку... Таму ўсе яны пакідалі замак задаволеныя. Князь заўжды браў на вяселлі ролю маршалка, наладжваў застолле з танцамі, баль, часам нават ставілі спектакль... бывала, што спраўляліся яшчэ і пераносіны.

Сярод нясвіжскіх панначак была Зарына Піскульская. Некалі ад яе хараства кавалеры трацілі розум, некаторыя нават страляліся. Цяжка сказаць, як тое сталася, што яна, нягледзячы на такую красу, не выйшла замуж. Можа, таму, што была залішне прыгожая. Яна надта ўжо задзірала нос, а яшчэ людзі спадцішка шапталі, што ў свой час у яе быў закаханы сам князь... Было тое ці не, хто яго ведае. Я на свае вочы бачыў, як князь цалаваў ёй руку, вось і магла пайсці пагалоска... У той час панне Зарыне было недзе гадоў сорак, можа, крыху за сорак — старэй яна не выглядала. Адным словам, выглядала яна яшчэ вельмі хораша і зграбна.

Зарына была сярэдняга росту, з цудоўнай таліяй, трымалася проста, хоць у паводзінах адчувалася нешта каралеўскае. Хадзіла яна, высока ўзняўшы галаву, прымружыўшы вочы, пазірала на свет як бы зверху. Заўсёды была добра прыбраная, адмыслова прычасаная, прыпарфумленая, ад яе здалёк веяла тонкім пахам. А ножкі ў яе былі такія слаўныя, што як ступала па пяску ў сваіх чаравічках на корках, то след заставаўся, як ад дзіцячай рукі. Строяў было ў яе не раўнуючы як у княжны, здаецца, я і не бачыў яе двойчы ў тым самым адзенні. Былі ёй даспадобы таксама каралі, і хоць не часта яна іх насіла, але надзяваць любіла, гэта заўважалася. Што да іншых прыкмет, дык тут мала што можна дадаць, бо панна Зарына абы з кім не зналася, у размовы надта не ўступала. Некалі яна прыгожа спявала, потым, калі голас змяніўся, перастала. Грала на клавікордах, ▪ яшчэ тыя, хто быў добра дасведчаны, казалі, што яна ведала розныя мовы, любіла чытаць і нават перакладала п'ескі для нясвіжскага тэатра.

Ніякай радні, ні далёкай, ні блізкай, у панны Піскульскай не было, апрача адзінага брата, якому князь падараваў вёску. Раз на год гэты брат прыязджаў станавіцца на вочы да князя, доўга не затрымваўся, бо ў яго было нешта з мовай, ён не мог складна гаварыць — заікаўся, кашляў, цэлы канфуз быў з ягонай гаворы. Добра б яшчэ, каб ён, ведаючы гэтую сваю загану, маўчаў, дык жа не, лапатун быў — рот не закрываў. Рэдкую фразу прамаўляў, не спатыкнуўшыся, другі стараўся б меней гаварыць, а гэтага нібы хто за язык цягнуў, хоць ты плач... На яго нібы якая магнасць нападала, мог гаварыць без канца. Калі ж хто спрабаваў смяяцца, быў гатовы схапіцца за шаблю. Можа, таму панна Зарына заўжды старалася як найхутчэй адправіць балбатлівага брацiка з Нясвіжа. Ёй не шчасціла на радню, адно толькі было вядома: князь выдзеліў панне Зарыне пяць тысяч злотых, з якіх яна рэгулярна атрымвала працэнты. Апрача таго, яна мела пенсіён як рэзідэнтка і прыяцелька князевых сясцёр, значныя прэзенты па святах, на Новы год, на імяніны, а на пражыццё ў яе грошы не ішлі, так што прыдворныя цанілі яе на 10 000 злотых. Ведалі і тое, што каб знайшоўся жаніх

для яе, то ён атрымаў бы ў арэнду вялікую ўласнасць, а можа, і нешта большае.

Аднак, нягледзячы на гэтакае хараство і іншыя звабы, ніхто да яе не заляцаўся. Кожны разумеў, што трапіць пад пяту, а каму ж воля не дарагая... Пані ахмістрыня, старая Выжынская, якая ведала Зарыну з малых гадоў, дагаджала ёй, была ёй як маці, вельмі хацела выдаць панну замуж... але не за каго папала. Трэба, каб жаніх быў [redacted] імем і дастаткам, і не дурань які, бо ў яе было сяброўства і прыхільнасць нават пры каралеўскіх дварах.

Заблоцкі і Мацэвіч надта блізка ўзялі да сэрца жаданне князя пазбыцца таго няшчаснага Кшыскага. Сядзім мы аднойчы вечарам у маршалкоўскай зале, многа нас там набралася. Адны гулялі ў мар'яж, іншыя — у шашкі або ў шахматы. Быў тут і Кшыскі, але з ім ніхто не сядаўся гуляць у карты, бо ён вычвараў [redacted] імі, што хацеў. Ён нам не раз паказваў такія штукі, што здавалася, быццам ягонымі рукамі сам нячысты водзіць: адкрываў, якую захоча, пстрыкаў пальцамі, і тыя пераляталі з рукі ў руку. Ён іх глытаў, даставаў з рота, з рукава,— зразумела, што сядаць з ім гуляць не мела сэнсу. Кшыскі проста хадзіў ад адной купкі прыдворных да другой, перакідваўся слоўцам-другім, пачціва кланяўся.

І тут я раптам убачыў, як да яго падышоў Заблоцкі. Я добра ведаў яго — гэты чалавек быў няпросты. Звонку суровы, змрочны, хмуры, а насамрэч ён быў шчырай душы, да таго ж хітрун, якіх мала. Ён нічога не рабіў без патрэбы. З Кшыскім дагэтуль не знаўся. Таму я загарэўся цікаўнасцю, стаў воддаль, слухаю. Пачаў Заблоцкі здалёк:

— Васпан многа пахадзіў па свеце, многа падэшваў стаптаў... а ці не прыходзіла васпану ў галаву, што пара ўжо і жаніцца?

Кшыскі зірнуў на яго, падышоў бліжэй, ягоныя шустрыя бровы імкліва падскочылі ўгору і зноў упалі... ён махнуў рукой.

— Вы ведаеце, пане краўчы[13] (так пачціва называлі Заблоцкага), якраз так і было, што я ўсё жыццё толькі і дбаў пра тое, каб ажаніцца. Па адной сохнуў, па другой уздыхаў, заляцаўся, стараўся, кахаў, біўся...

— Хіба вашай мосці даводзілася нават біцца? — здзівіўся Заблоцкі.

— А чаму ж не! — усклікнуў Кшыскі.— Які з мяне шляхціц быў бы, каб я не папсаваў нечую скуру, не падстаўляў сваю? А што да вашых слоў, то скажу як на споведзі: адзінае, што мне ў жыцці не ўдавалася,— гэта ажаніцца. Іводная кабеціна мяне не ўпадабала... — Ён уздыхнуў: — Займелі сваё шчасце і старэйшыя, і брыдчэйшыя за мяне, дый сам я не заўсёды быў у чорным целе, як во цяпер... сватаўся і да бедных і да стараватых... дык і тыя Кшыскага выракліся...

— А я не сказаў бы, што васпан такі ўжо брыдкі ці страшны,— не згадзіўся Заблоцкі.

— Мабыць, такі ўжо мой лёс! — усклікнуў Кшыскі.— Давядзецца мне скончыць свае дні ў цэлібаце[14].

— Трэба ж, каб роду не было зводу, вельмі шкада, калі ў вас да таго ідзе,— прамовіў Заблоцкі, нібы яго ўсур'ёз усхваляваў лёс Кшыскага. Памаўчаў хвілінку, а потым зноў звярнуўся да яго: — Нічога, я вам дапамагу, вы толькі мяне слухайцеся. Мы вас тут, у Нясвіжы, ажэнім.

— Згодзен, але [illegible] адной умовай,— папярэдзіў Кшыскі.— Я ажанюся з той жанчынай, якую вы мне прапануеце, але хацеў бы, каб яна пакахала мяне і каб я закахаўся ў яе.

— Дужа вы, асіндзею, на многае прэтэндуеце,— усміхнуўся Заблоцкі.— Для шчасця годзе і паловы таго, але чаму ж — можа, удасца дабіцца і ўсяго, чаго жадаеце.

Яны хвіліну памаўчалі, потым зноў загаварыў краўчы:

— От што б пан сказаў пра панну Ізабелу Кужанец?

Тут трэба вам нагадаць, што панне Ізабеле было шаснаццаць гадоў, вельмі ладная, сірата, выхоўвалася ў Нясвіжы, праз Кішкаў раднілася з Радзівіламі. За ёй далі б дужа добры пасаг, сама яна была як ружа.

У Кшыскага аж вочы палезлі на лоб.

— Пан, няйначай, жартуе або кепікі строіць...

— Не жартую,— звыклым сур'ёзным тонам прамовіў Заблоцкі.— Чаму б вам не паспрабаваць сягнуць вышэй? У вас слаўнае імя... сам нішто сабе... ну, і спрыту стае.

— Але ж я стараваты для яе! — запярэчыў Кшыскі.

— Ну, а як вам панна Шарчынская?

Шарчынская была васпаватай, злой, балбатлівай, звадлівай, ёй баяліся трапіць на язык. Аднак жа за многіх яна заступалася перад князем. Пане Каханку асцерагаўся яе, але і любіў.

— Панна Шарчынская! Панна Шарчынская... ведаеце, пане краўчы, тут варта спачатку пра многае падумаць,— адказаў Кшыскі.— Спачатку трэба ўпэўніцца, ці падыдзе жаніх ёй да твару, потым — ці сцерпіць ейны язык, нарэшце... як яна... і ёй жа давядзецца...

— Але ж яна жанчына зграбная, энергічная...

— Я ж нічога не кажу, але трэба ж, каб было каханне...

— Да яе можна заляцацца ў змроку,— параіў Заблоцкі.

— У мяне, на жаль, вочы, як у ката,— усміхнуўся Кшыскі.

Увага Заблоцкага расчуліла Кшыскага, ён паціснуў краўчаму руку, потым абняў і пацалаваў яго, дзякуючы за прыязнасць. Якраз у гэты момант краўчы шапнуў яму на вуха:

— Ну, а панна Зарына... яе ж можна нават у каралеўскія пакоі весці...

Пачуўшы гэтае імя, Кшыскі аж змяніўся з твару — ягоны выраз я і апісаць не магу. Хутчэй за ўсё ён значыў: і хочацца і колецца, высокія парогі не на мае ногі, карацей — пра гэта і думаць няма чаго.

Тут Заблоцкі ўзяў яго пад руку, пачаў шпацыраваць з ім па зале і з паўгадзіны ўсё нешта даводзіў... нашэптваў, раіў, калі ж яны развіталіся, па твары Кшыскага можна было заўважыць, што хітры краўчы ўсё ж абрытаў яго. Шляхціц выйшаў у задуменні, засяроджаны, ні на кога не глянуўшы. Мусіць, разважаў над тым, што ўвёў яму ў вушы Заблоцкі.

Назаўтра ў тэатры быў паказ балета... Яго мосць князь сядзеў у сваёй ложы, вакол яго двор, цэлая плойма дзяўчат. З княскай сям'і нікога не было, а таму адно з першых месцаў займала Піскульская. Прыйшла яна як зазвычай прыгожа апранутая, важна так села, а раз у зале было горача, пачала абмахвацца веерам. Відаць, не варта напамінаць аб тым, што найлепей спазнаеш характар дзяўчыны, паглядзеўшы, як яна ўмее абходзіцца з веерам: з яго дапамогай можна ўсміхацца, злавацца, вабіць, прызнавацца ў каханні...

выказаць усё, што захочаш... У руках панны Зарыны гэты просты кавалак дрэва з размаляванай паперай хадзіў як жывы. Яна ўмела гулліва прыкрыцца ім, гуляць, засланіць твар так, каб толькі вочы ранілі, адхіліць занадта пільны позірк, паказаць акторам сваю зацікаўленасць іх ігрой ці, наадварот, абыякавасць... Абыходжанне з веерам паказвала, што панна была не з простых...

У гэты дзень усе, у тым ліку і князь, цешыліся ёй, бо выглядала яна проста па-каралеўску. Раптам бачу... Насупраць панны сеў каля парога прыгожа апрануты Кшыскі і вачыма проста ўтаропіўся ў яе.

«Гэта ўжо другая камедыя,— падумаў я,— і што з таго будзе?»

Бачу, што панна Зарына адразу не згледзела новага залётніка, іх ставала яшчэ, хоць ёй і было каля сарака. Яе вочы бегалі па зале, хоць здавалася, што яны ўвесь час засяроджаныя на акторах. Зірнула яна і на Кшыскага, але не надала яму ўвагі і далей разглядалася на бакі. Праз хвіліну зноў зіркнула на яго, а той Кшыскі, як утрапёны, вачэй не зводзіць; панна павярнулася, зрабіла выгляд, што не глядзіць у той бок, але ж я бачу — яна яго разглядае. А той як сеў, як утаропіўся, так і скамянеў, узіраючыся на яе. Толькі раз-пораз, калі ўжо, мусіць, было няўсцерп узірацца, павядзе брывом, уздыхне, і глядзіць, і глядзіць...

Панна засланілася веерам, але праз шчыліну ёй быў добра відаць твар Кшыскага. Зарына ці не ўпершыню так пільна прыглядалася да яго. Ды яшчэ так хітра павярнула галоўку, нібыта глядзела на сцэну і ўважліва сачыла за ігрой актораў. А Кшыскі гэтак захапіўся красою, што нават твар яго палагаднеў, папрыгажэў. Ён выглядаў нейкім меланхалічным, задуменным, нібы прасіў спагады.

На вуснах панны Зарыны спачатку з'явілася іранічная ўсмешка, потым яе нібы ветрам здзьмула: панна пасур'ёзнела, уздыхнула *privatim* — неўпрыкмет, і зноў пачала сачыць за Кшыскім праз веер.

А той усё не спускаў з яе вачэй.

Гэтую сцэну мала хто мог бачыць і разумець. А мяне разбірала цікавасць, я збоку мог чытаць па іх тварах, нібы па раскрытай кнізе. Бачу: веер адхіліўся, панна смела скіра-

вала вочы на Кшыскага і нібы сказала яму: «Адумайся, асіндзею, ідзі сабе з Богам, адкуль прыйшоў».

Яна адвярнулася, перасмыкнула плячыма і пачала глядзець толькі на сцэну. Але Кшыскі, хоць і атрымаў такі адказ, быў упартым і зноў за сваё: глядзіць і глядзіць, нібы хоча яе праглынуць. На вуснах панны з'явілася ганарыстая пагардлівая ўсмешка, яна маланкава зіркнула на яго, потым на сцэну. Побач з ёй сядзела Шарчынская, яны пачалі шаптацца і перасміхацца. Чорныя вочкі Шарчынскай упіліся ў Кшыскага і нібы працялі яго, але ён паказаў сябе стойкім чалавекам і не паддаўся на яе чары... Панны смяяліся, а ён... [...]

Назаўтра па ўсім Нясвіжы пайшла пагалоска, што спадчыннік Ноя хоча ўзяць за жонку панну Зарыну, але ніхто не ўспрымаў гэта ўсур'ёз.

Усе ведалі, панна Зарына высока меціла і лічыла, што Найвышні стварыў яе не для таго, каб яна стала жонкай нейкага там Кшыскага. Нікому й да галавы не прыходзіла, быццам такое можа спраўдзіцца. Аднак князю заўсёды даносілі а хоць найменшую дзейку. Вось і на гэты раз яму ўжо надвячоркам увялі ў вушы тую чутку, ды яшчэ прыдворныя пераказалі яе па-свойму, як яны гэта ўмелі, і злажылі віну на Заблоцкага.

Князь толькі пацiснуў плячыма і коратка прамовіў:

— Зважай, пане каханку! [...]

Тут якраз зазванілі, склікаючы такім спосабам да сталоў, каго да княскага, каго да маршалковага і іншых, колькі іх там было. Кшыскі быў пры княскім стале. У гэты дзень ён прыйшоў выфранчаны, як у нядзелю, ад яго здалёку так і патыхала гваздзіковаю парфумай, хоць ты не падходзь. Князь толькі зірнуў на яго і сеў на сваё звыклае месца, ніхто з ім не загаворваў.

Але шляхціц быў упарты і нязломны.

Неяк так выйшла, што каля князя засталося адно незанятае крэсла, і Кшыскі смела сеў на яго. Капелан блаславіў ежу, і ўсе заняліся абедам, было ціха, здавалася, муха праляціць — пачуеш. Князь пацягнуў носам паветра і пачуў пах гваздзікі.

— Чым гэта васпан вусы шмаруе? — спытаў князь, наставіўшы вочы на Кшыскага.

— Масцікай, прывезенай з Турцыі,— не збянтэжыўшыся, адказаў шляхціц.

— Відаць, што турэцкая, бо брыдка смярдзіць,— прамовіў князь.— Ужо ці не лепей было смалой памазаць.

Кшыскі адразу змоўк.

— Але яна дужа карысная для здароўя, дапамагае ад усялякай заразы, ахоўвае ад яду,— усё ж азваўся ён праз хвіліну.

Мы думалі, што ён адсунецца ці перасядзе, але ён застаўся там, дзе сядзеў. Князь пачаў перашэптвацца з Пузынам. За сталом сядзелі таксама жонка генерала Мараўскага, панна Зарына і яшчэ некалькі прыдворных паненак. Мы заўважылі, што Цівуноўна была дужа важная, не пазірала на Кшыскага, на яе твары, бадай што, нічога не адбівалася, не відаць было ніякай злосці, толькі як бы нейкі смутак.

За сталом пачаліся размовы, князь гаварыў мала, але на людзях ён як быццам крыху супакоіўся. Пузына пачаў распытваць яго пра падарожжы, а гэта ў князя была ўлюбёная тэма для гаворкі, тут кожны мог утачыць тое, што хацеў.

— Калі я патрапіў у Венецыю, то ўчашчаў па тэатрах. І аднойчы там ігралі п'есу, якой я ніколі не забуду,— пачаў князь.— Казалі, што яна была перакладзена з нейкай замежнай мовы, але мела дачыненне да гісторыі Венецыі. Можаце сабе ўявіць, пане каханку, там негр закахаўся ў белую дзяўчыну, калі ж ажаніўся з ёй, то ■ намовы задушыў яе ад рэўнасці.

Сказаў гэта і паволі глянуў на Кшыскага і панну Зарыну, якая ў гэты час ела нейкую ягадзіну і нібыта не слухала.

— Няма горай,— дадаў князь,— калі хто не дабярэ сабе пары, ад гэтага на свеце бывае шмат няшчасця...

За сталом запанавала доўгае маўчанне. Толькі Кшыскі ціха кашлянуў, нібы хацеў падаць знак, што ён слухае і ўсё разумее.

— Што гэта асіндзей кашляе? — спытаў Радзівіл, павярнуўшыся да яго.

— Костачка ў горле перасела... — адказаў Кшыскі.

Тут усе пачалі ўставаць з-за сталоў і расходзіцца купкамі па пакоі, перамаўляючыся міжсобку. Да небаракі Кшыскага ніхто не падходзіў, ніхто не загаворваў. Кшыскі

перахрысціўся, пакланіўся, разгледзеўся на бакі, падаўся бліжэй да дам і неўпрыкмет падышоў да панны Зарыны. Князь, які назіраў за ім, пахаладзеў. Відаць, яго больш за ўсё выводзіла з раўнавагі тое, што панна Піскульская не выказала Кшыскаму сваёй непавагі. Яна была абыякавай, халоднай, але нібыта хацела, каб ён наблізіўся, дазволіла падысці да сябе, завязаць размову.

У Кшыскага язык быў нібы маслам намазаны — гаварыць ён умеў, мог зацікавіць сваімі гамонамі каго хочаш, але ягоная няшчасная постаць і непрыгожы твар рабілі непрыемнае ўражанне. Аднак досыць было яму растуліць рот, як ён зачароўваў сваімі байкамі хоць якога слухача і ўжо не выглядаў смешным.

Пра што гаварыла з ім панна Зарына, можна было здагадацца толькі па жэстах, пэўна што, ён расказваў пра сваё падарожжа ў Стамбул, дзе ён расстараўся таго віна і масцікі для вусоў; панна Зарына слухала яго неяк рассеяна.

Князь у сваім коле распачаў нейкае доўгае казанне, але яго так зацікавіў Кшыскі, што ён мусіў спыніцца і, павярнуўшыся да Пузыны, ледзь стрымваючы злосць, папрасіў яго: «Напрамілы Бог, схадзі ты ды адцягні яго ад Цівуноўны, мне шкада дзяўчыны... ён жа атруціць яе сваёй парфумай».

Усім нам не заставалася нічога іншага, як думаць, што князь зайздросціў Кшыскаму, бо сам некалі быў закаханы ў панну Зарыну. Пузына, вядома, пабег, але калі наблізіўся да іх, то пачуў, што Цівуноўна дужа захоплена нешта пераказвае Кшыскаму з прачытанай кніжкі. Не так проста яму было перапыніць іх размову, але ён узяў Кшыскага пад локаць і адвёў убок. Мяне дзівіла, як такая гордая панна, пра якую нават нельга было падумаць, што яна можа мець нешта агульнае з гэтым прыблудам, слухала ягоныя байкі і не праганяла яго. Заблоцкі прытаіўся, схаваўся ў цень, ён ужо шкадаваў, што заварыў гэтую кашу, бо наспявалі надзвычайныя неспадзеўкі.

Усе былі ўражаны, а князь бурчаў нешта сабе пад нос, нерваваўся, сам не ведаючы чаго.

Назаўтра Пузына змеркаваў, што найлепшым выйсцем будзе ўзяць Кшыскага на паляванне, і хоць нахлебнік

выкручваўся і адмаўляўся як мага, яго пераканалі, угаварылі, змусілі... і павезлі. Князь застаўся дома. Заблоцкі таксама.

Тое зламыснае паляванне было задумана так, каб замест вяртання ў Нясвіж у той жа вечар затрымацца ў лясах аж на чатыры ці пяць дзён. Якраз у той самы дзень, калі Пузына забраў з сабой засмучанага каханка, Заблоцкі стаўся міжвольным сведкам і слухачом сцэны, якая пераканала яго, што ў князя захаваўся ў сэрцы афект[15] да панны Піскульскай. Па абедзе пані Цівуноўна сядзела за вышываннем каля акна ў пакойчыку, шкляныя дзверы якога выходзілі ў сад. Заблоцкі сядзеў побач на лавачцы, дыхаў свежым паветрам. Яго нельга было згледзець, а ён мог чуць усё, што далятала з пакойчыка. Цівуноўна старанна вышывала шаўковымі ніткамі па атласе. Князь, нібыта ідучы ў свой кабінет, мімаходзь зазірнуў да яе.

— Што гэта панна Зарына так прыгожа вышывае? — спытаў ён.

— Ды так, жаночыя забавы,— адказала яна.

— Праўда, хараша, як і ўсё, што выходзіць з гэтых прыгожых ручак.

Панна Зарына засмяялася:

— Што гэта вашу княскую мосць пацягнула на кампліменты?

Князь памаўчаў, потым прамовіў:

— А што, хіба я вам непрыемны і вы з большай ахвотай нюхалі б гваздзікі і марцыпаны Кшыскага?

— А чаму менавіта Кшыскага?

— Э, панна Зарына, я ведаю... — пачаў князь.

— А я не ведаю,— перапыніла яго Зарына.

— Хіба гэты цыган спадабаўся вам?

— І так, і не,— прамовіла панна Зарына абыякавым голасам.— А чаму гэта вашу княскую мосць цікавіць, хто можа мне спадабацца, хто не?

— А чаму нельга?

— А таму, што я для вас чужая, і...

— Але ж я некалі быў без памяці закаханы ў панну...

— Гэта вам, шаноўны князю, толькі здавалася...

— Як гэта здавалася? Як такое можна падумаць?

— Здавалася,— працягвала панна Піскульская,— таму што той, хто сапраўды кахае, раскахаць ужо не зможа. А ў князя потым і жонка была, і розных амураў ставала.— Яна крыху памаўчала, потым спыталася: — Хіба з тае прычыны, што вы, ваша княская мосць, нібыта былі ў нейкім даўным веку закаханымі ў вашу пакорную слугу, перад ёй з той пары павінен зачыніцца свет, ні на кога нельга глянуць, нікога не выбраць у пару?

— Толькі не Кшыскага! — усклікнуў князь.— Напраміны Бог, каго хоця, толькі не гэтага цыгана!

— Адкуль у вас такая антыпатыя да яго, князю?

— А адкуль у вас сімпатыя? — спытаў Радзівіл.

— І хто вам пра яе расказаў?

— Мае ўласныя вочы.

— Гэта толькі яшчэ адзін довад, што князь чым далей, тым болей недабачыць,— рассмяялася панна Зарына,— а чаго не ўгадае, тое прыдумае.

— Хіба цяжка здагадацца, што робіцца з паннай? — прамовіў князь.— Панна хоча выйсці замуж. Але ж можна было знайсці каго лепшага, а не гэтую абсмаленую галавешку...

Стала ціха.

— Мой княжа,— загаварыла панна,— марная ўся гэтая наша гутарка, нічога няма, і нічога не будзе, адно толькі князь можа і сябе і мяне выставіць на смех людзям, болей нічога.

Яна задумалася, потым загаварыла зноў:

— Прашу вас, князю, паслухайце, што я скажу. Што патрэбна ад мужа разумнай жанчыне? Імя, сякая-такая маетнасць і такі характар, каб не ўпарціўся і не меў благіх навычак. Род Кшыскіх стары і паважаны; у яго няма з чаго жыць, але гэта лёгка паправіць, калі пастарацца; упарціцца я б яму не дала, а што да навычак...

— Панна так усё прыгожа разрахавала,— перапыніў князь,— але, як кажуць французы,— хто лічыць без гаспадара, той лічыць двойчы. Гэты Кшыскі, трасца яго ведае хто — ці Кшыскі, ці Крыскі, ці Крыньскі, ці яшчэ хто... маетнасці ў яго — як у дзіцяці ў люльцы... а ягоныя благія звычкі адразу відаць — шэльма, хлус несусветны, а нездарма кажуць — хто маніць...

— Але ж князь яго і раней бачыў і раптам так узненавідзеў. За што? — спытала панна.

Болей Заблоцкі нічога не пачуў, бо Радзівіл змоўк, а потым зайшла жонка генерала Мараўскага, і гутарка перайшла на іншае.

Увечары Заблоцкі быў у князя, калі ён раздзяваўся, збіраючыся спаць. Радзівіл выглядаў маркотным, яго спрабавалі развесяліць, але дарма. Толькі калі прыдворныя пачалі расходзіцца, князь папрасіў краўчага на часінку затрымацца. Калі яны засталіся ўдвух, князь жэстам паказаў, каб той сеў каля ложка.

— Ты добры чалавек і мой прыяцель,— загаварыў князь.— Я ж — грэшнае стварэнне, не раз гнявіў і цяпер гняўлю Пана Бога, але, павер мне, я ў душы не злы чалавек. Нікому зла не зычу... Тут спее нешта нядобрае, пане каханку,— Цівуноўна наша, не маючы лепшых жаніхоў, намецілася на гэтага трутня... і я нюхам чую, што дабром такое не скончыцца... Шкада кабеціны, пане каханку... Гэтаму Кшыскаму, калі папраўдзе, трэба найперш думаць пра кавалак хлеба, а не пра Цівуноўну. Яму варта падабраць іншую пару, парай ты яму, дружа, якую-колечы панну па ім.

Заблоцкі ўстрывожыўся.

— Ты нешта дрэнна выглядаеш, пане каханку,— скончыў князь.— Ідзі сабе спаць. Дабранач.

Кшыскі вярнуўся з палявання вельмі стомлены. Відаць, яго добра пацягаў па лясах Пузына, што той два дні мусіў адлежвацца, націраўся мазямі, шмараваўся, але ўсё роўна нагамі ступаў яшчэ няцвёрда. Кульгавым пры двары ён паказвацца не захацеў. Панна Зарына даведалася пра тыя ловы, назаўтра паклікала Пузыну і вельмі на яго сварылася. Пузына пераказаў усё князю, і той моцна раззлаваўся. Што намеркавалі, я не ведаю, але думаю, што князь з тымсім параіўся. На трэці дзень, калі Кшыскі падлячыўся і паказаўся ў князевых пакоях, дэкарацыя памянялася, князь сам падышоў да яго і спытаў:

— Што з вамі здарылася, пане каханку? Цэлы тыдзень я вас не бачыў.

— Ваша княская мосць, мы палявалі з князем Пузынам,— нізка пакланіўшыся, адказаў Кшыскі,— і я моцна натрудзіў ногі.

— Трэба было памазаць воўчым тлушчам,— параіў князь.— А рукі не адняліся, пане каханку? Варта было яшчэ пару дзён паляжаць... А можа, пану што трэба?

— Нічога не трэба, апрача ласкі вашай княскай мосці. Я заўжды гатовы служыць вам,— запэўніў шляхціц.

Князь падкруціў вус.

— Вы мой дабрадзей, пане каханку, — сказаў так і адышоўся.

У гэты дзень Кшыскі нібы сыр у масле качаўся. Як жа — князь ласкава загаварыў з ім, увесь двор навыперадкі стараўся выказаць яму сваю ўвагу, прылашчыць. Усе, што называецца, танцавалі вакол яго, займалі размовамі, проста дыхнуць не было калі. Ён не чакаў такіх перамен, быў бы рады ўцячы, але не выходзіла. Не паспее ён і кроку ступіць, як ужо нехта падходзіць, загаварвае, і атрымвалася так, што ён не змог нават наблізіцца да Цівуноўны і перакінуцца з ёй хоць бы парай слоў. Усё было нібы разыграна па нотах, ды так складна, што ён, бядак, нават пакрыўдзіцца не мог, наадварот, мусіў яшчэ і дзякаваць. Ён хмурыўся, але дарма; яго не адпускалі да самай ночы, узялі ў такую апеку, што нават давялі да кватэры і пакінулі аднаго толькі тады, як ён сабраўся спаць.

Ледзь толькі ён устаў назаўтра, як да яго зайшоў Заблоцкі. Ён быў ужо рады паправіць тое, што напсаваў, але ж праўду кажуць, што ў сто разоў лягчэй учыніць зло, чым яго пазбыцца.

У хацінцы Кшыскага было цесна, краўчы сеў на ўслончык.

— Сумнеў мяне ўзяў, васпане,— пачаў ён,— ці не задаў я вам клопату, калі навёў на думку Цівуноўну? Калі разважыць як след, то відавочна, што з гэтага нічога не выйдзе.

— Пра што вы? — спытаў Кшыскі.— З чаго не выйдзе?

— Ну, з залётаў і жаніцьбы.

— А чаму не? — спытаў шляхціц.— Панна спадабалася мне, яна не выказвае непрыхільнасці, і пры некаторай

цярплівасці (і Кракаў жа не адразу збудаваўся) нешта дый выйдзе.

— Нічога не выйдзе, гэта я вам кажу,— запэўніў Заблоцкі.— Дарма толькі час страціце. Але тут паненак процьма, і з добрым пасагам, я для вашэці якраз падабраў адну ўдавіцу...

— Удавіца... — скрывіўся Кшыскі.— Гэта не тое. Хоць хлеб гатовы, але не здаровы.

— Ну што вы!

— А я скажу пану краўчаму адно — або яна, або ніхто.

— Хто? Цівуноўна?

— Ну так...

— Злітуйцеся, я ўжо не буду ад вас утойваць, сам князь некалі быў закаханы ў яе, і пасія да яе засталася... яна таксама...

— Шчэ лепей, пане, шчэ лепей!.. — парывіста ўсклікнуў Кшыскі.

Заблоцкі аслупянеў.

— Але ж князь не дапусціць!

Шляхціц пакруціў рукой і засмяяўся:

— Гэта ўжо мой клопат, мая справа. І ў мяне ж ёсць галава на плячах. Пане краўчы, вы падалі мне блаславёную думку, за яе вам будзе мая вечная ўдзячнасць, я вам абавязаны на векі вякоў, але далей я ўжо як-колечы спраўлюся сам.

— Васпан не ведае князя! — спрабаваў перасцерагчы Заблоцкі.

— Так, так, праўда, я згодзен, гэта святая праўда, але ж пры вялікім жаданні чалавек можа многага дамагчыся і многаму навучыцца... — сказаў Кшыскі.— Князь бывае часам грубы, але ўсё ж у яго залатое сэрца...

— Яно ж так,— згадзіўся Заблоцкі.— А раптам — стрэліць і заб'е, і што вам потым з таго, што ён справіць па вас пышную паніхіду і паставіць шыкоўны помнік.

— Не, пане краўчы, да гэтага не дойдзе.

Сказаўшы гэта, Кшыскі абняў Заблоцкага. Той, сустрэўшыся з такой упартасцю, адступіўся. Я ведаю пра ўсё гэта, бо Заблоцкі мне пазней расказваў, і не раз, ды я і на свае

…чы бачыў: у краўчага стала нават спакайней на душы, … адчуў, што сустрэўся з перашкодай… і забіў трывогу. …аблоцкаму не абыходзіла, што ягоныя словы, сказаныя …артам, стануць прычынай такіх непрыемных падзей. Ён … ведаў, з чаго пачаць, але разумеў, што ад шляхціца …рэба неяк пазбыцца, бо князь незалюбіў яго, больш таго, … надоўга сапсаваў яму настрой. А ў Нясвіжы ад ягонага …астрою залежала ўсё: калі князь быў вясёлы, то ўсе былі … не на сёмым небе — двор танцаваў, весяліўся; калі ж на …анскі твар набягала хмурынка, прыдворных нібы варам …блівала.

Усе адчувалі, што іх гняце гэты цяжар, і ўсе шукалі …ады, як ад яго пазбыцца. На той час князь быў ужо не …ершай, дый не другой маладосці, даваліся ў знакі розныя …варобы, даймала падагра, пра якую стараліся яму не напа…інаць, стала горай са зрокам, хоць князь не нудзіў сябе ні …ытаннем, ні пісаннем; часам адмаўляліся служыць ногі, … паўната рабіла яго непаваротлівым. А ўсё ж, нягледзячы …а гэта, яму, як і ў маладыя гады, калі ён быў закаханы ў …княжну Тараканаву[16], у княжну Кінгстан і ў многіх, вельмі …многіх іншых, так і цяпер западалі ў галаў нявінныя фан…азіі і ўспаміны пра маладосць. Звычайна ўсё канчалася …тым, што бедная паненка, якая ўжо не магла схаваць на…ступстваў княскага захаплення, выдавалася замуж з доб…рым пасагам, а князя зноў прывабліваў нечы гожы тварык. З князя пасмейваліся родныя, жартавалі сёстры, напамінаў ксёндз Кантэмбрынк, ягоны капелан і спавядальнік, але нішто не дапамагала.

Усе тыя пані і паненкі, у якіх князь быў закаханы хоць адзін вечар, потым заўжды былі ў яго ў вялікай лас…цы; аднак жа ні разу не было такога, каб князь вярнуўся да старога кахання другі раз. Праўда, гэта, у асноўным, былі амуры маладосці, таго шчаслівага часу, які залаціць усё, яны, як казалі мне людзі, цягнуліся значна даўжэй і зблізалі каханкаў так, што сямейнікі асцерагаліся, як бы закаханы князь супраць волі радні не ўступіў у мезаль…янс[17]. Трэба ведаць звычаі роду Радзівілаў, каб уявіць сабе, якой немажлівай праявай лічыўся шлюб магната з простай шляхцянкай.

Гэты род ставіў сябе поруч з каралямі, значыўся найважнейшым між шматлікіх княскіх родаў, ганарыўся сваімі крэўнымі сувязямі з многімі манаршымі дварамі.

Не было такой каралеўскай сям'і ў Еўропе з панавалых у тыя часы, якая не была б злучаная хоць бы нават танюсенькай нітачкай параднёнасці з сямействам Радзівілаў, а многія двары былі звязаныя нават дужа цесна. Сярод князёў Рэчы Паспалітай яны мелі мноства сваякоў, а розных дробных каралькоў не толькі раўналі з сабой, але і перасягалі бляскам і значнасцю. Дык хіба ж нашчадак такога роду мог ажаніцца з беднай шляхцянкай, такое не магло нават у сне прысніцца. І ўсё ж князь быў нешчаслівы ў каханні, таму як мог шукаў суцяшэння, але часцей расчароўваўся, чым суцяшаўся. [...]

Ніколі яшчэ Кшыскі не выглядаў такім сціплым і ціхім, да таго ж як бы заспакоеным. Мы са здзіўленнем глядзелі на яго і ўпэўніваліся ўсё болей, што ён быў чалавек абачлівы, умеў абараніць сябе. Мне нават падумалася, ці не ўмаслілі яго ўжо, але я памыляўся, бо з учарашняга дня ніякіх навін не было. Панна Цівуноўна нібыта не звяртала ніякай увагі на свайго прыяцеля, але з усяго было відаць, што паміж імі ўсталявалася нейкае паразуменне. Я мушу прызнацца ў граху цікавасці: калі ўбачыў, як яны ідуць у другую залу, то стаў так, каб можна было падслухаць, пра што яны будуць гаварыць. Не буду ўтойваць: я тлумачыў свае паводзіны тым, што рабіў гэта дзеля інтарэсаў князя, а не ад сваёй слабасці. Яны спачатку пра нешта шапталіся, і я не мог нічога падслухаць, нарэшце пачуў, як Кшыскі сказаў:

— Не разумею.

— Пан не хоча сказаць мне ўсёй праўды,— загаварыла Цівуноўна.— Я з тых людзей, якія могуць задаволіцца нават нямногім, але цярпець не магу маны. Прашу васпана сказаць мне ўсю праўду пра сябе, бо я павінна яе ведаць.

— Пытайцеся, я даю слова шляхціца, што не зманю,— запэўніў Кшыскі.

— Дзе, васпан, нарадзіўся і ці праўда, што паходзіш з тых самых Кшыскіх... пра якіх казаў князю?

Шляхціц памаўчаў.

— Так, я Кшыскі, магу паказаць метрыку, там запісана ра маё нараджэнне... у тым, што я не шляхціц, мяне ніхто е зможа ўпікнуць... а тое, што быў бурсаком у Львове, дык эта ж не ганьба...

— У пана ёсць радня?

— Яна вымерла...

— Уся?

Кшыскі маўчаў.

— Кажы мне, пане, усю праўду.

— Амаль што ўсе... засталася адна сястра, яе можна е лічыць... бо я адрокся ад яе. Яна выйшла замуж за мепчаніна Тучака.

— Фэ! — вырвалася ў Цівуноўны.

— Яе цяжка было б утрымаць нават на ланцугу... — уздыхнуў Кшыскі.— ...І цяпер мы не знаемся... муж яе — вядомы купец і багаты чалавек, армянін...

— Больш нікога ў васпана няма?

— Аніводнай жывой душы...

— І дзе ж, васпан, дагэтуль бавіў час? — пацікавілася Цівуноўна.

— Э! Ды па ўсім белым свеце! З розных місак давялося паесці. Праўду сказаць, пачаў я з семінарыі, два гады пабыў паслушнікам ды адчуў, што няма ў мяне схільнасці да духоўных спраў... Давялося збегчы... І ў войску я служыў, аднак там нешта не заладзілася таксама... Паспрабаваў гаспадарыць, але град і засуха пусцілі мяне з торбай... Быў прыдворным у князя ваяводы, з ім трапіў у Стамбул... а там мяне напаткала бяда...

Кшыскі горка ўздыхнуў.

— Панна Зарына, дабрадзейка мая, Богам прашу, павер мне: я не такі благі, як здаецца,— горача пачаў запэўніваць Кшыскі.— Я чалавек не злы, але адзін нядобры выпадак стаў прычынай таго, што я пачаў пагарджаць людзьмі, надумаў лупіць з іх скуры, гэтак жа як яны злупілі скуру з мяне. Я прыйшоў да высновы, што на свеце лягчэй пражыць хітрасцю і ашуканствам, чым праўдай і дабрачыннасцю; хоць я і не збочыў з добрай дарогі, ды ўсё ж займаўся падманам... але... але...

— Але што? — настойвала Цівуноўна.

— Калі я страціў любасць да людзей... я перастаў іх шкадаваць і падманваў іх, як умеў...

Панна запытальна і неяк ганарыста зірнула на яго.

— Тлумач, пане, больш зразумела.

— Ды што там — аціраўся пры дварах, прыслугоўваў... Хітрыкамі чалавек часам можа больш зарабіць, чым руплівай працай. Аднак жа,— дадаў ён,— калі б нада мной заззяла светлая зорка, я мог бы вярнуцца да ранейшых сентыментаў...

— Дык што пану замінае?

— Нядоля,— адказаў Кшыскі.

— Пачакайце, а можа, ёсць выйсце? — Яна памаўчала крыху і, нібыта асмеліўшыся, загаварыла: — Споведзь за споведзь... я таксама вінаватая перад панам... І мой лёс не з лепшых, хоць і выдае шчаслівым. Людзі заўжды лічылі мяне шчаслівай, а я такой ніколі не была. Васпан спадзяецца выправіцца, а я, напэўна, не змянюся ніколі... у мяне гордая душа, і я не магу стаць дабрэйшай сэрцам... не магу перамагчы сябе. Тыранкай я не буду, але і служанкай не хачу быць. Калі вы, васпан, думаеце, што я закахалася ў вас, то лепш гляньце ў люстэрка. Але мне трэба выйсці замуж, не жыць жа вечна з ласкі ў чужым доме. Я магла б пасяліцца ў брата... але хачу мець уласны дом і гаспадарку... І я выбіраю васпана, а ведаеце чаму? Таму што вы пакаштавалі гора, і я спадзяюся, што вы будзеце больш цаніць лепшы лёс, а той, якая вам падала руку, не адплаціце няўдзячнасцю... Што, васпан, скажаце на гэта?

— Я згодны на ўсё! — запэўніў Кшыскі і пакланіўся.

— З яго мосцю князем я пагавару сама,— дадала Цівуноўна і працягнула яму руку, якую ён узяў у сваю і пацалаваў.— Будзь, васпан, спакойны...

На тым яны і разышліся...

Князь у зале расказваў свае дзівосныя гісторыі, стоячы каля стала. Апошнімі днямі ён спахмурнеў, быў невясёлы. Таму нас асабліва зацікавіла, што ён зноў апавядаў усёй кампаніі вясёлую гісторыю. Пад тое ён час ад часу кідаў позіркі на Цівуноўну.

— Усе вы, панове, ужо ведаеце, што я аднойчы паплыў у Гішпанію, ды карабель разбіўся на скалах каля

афрыканскіх берагоў. Нас вылавілі з мора агромністым невадам тамтэйшыя піраты і ўзялі ў палон. Якраз вельмі прыдалося тое, што я некалі служыў кухарам у пані Галецкай, таму мяне ўзялі на кухню ў сераль бея, і я не галадаваў. Там, пане каханку, раслі вялізныя арэхі, і мы з панам Валадковічам, які таксама апынуўся ў палоне і быў садоўнікам, выгрызлі мякаць, а з лупіны зрабілі сабе лодку і падаліся ў плаванне па моры... На шчасце, дзьмуў спадарожны вецер, які вынес нас на востраў, што называўся Сільвія, недалёка ад валашскага берага... Я паслаў Валадковіча да мясцовага князя паведаміць яму, хто мы такія, адкуль прыплылі. Вяртаецца Валадковіч і кажа мне, што мясцовы князь памёр, пасля яго трон заняла князёўна Арола, якая якраз шукае сабе мужа... Прызнаюся вам, пане каханку, адразу падумаў: і я ж магу быць за кандыдата ў каралі. У прыбярэжным мястэчку я знайшоў шаўца, які некалі працаваў у Нясвіжы ў Лейзара, той пазычыў мне такі-сякі парадны гардэроб. І вось мы з Валадковічам з'яўляемся пры двары каралевы Аролы. Скажу я вам, пане каханку, ніколі за ўсё жыццё не бачыў я прыгажэйшай жанчыны. Ну, вядома ж, закахаўся па самыя вушы... на сваю бяду... Прынялі нас з вялікай пашанай; адвялі пакоі ў палацы, пачаліся баляванні, асамблеі[18], тэатр, музыка, найлепшыя гатункі віна, але князёўна — нібы з лёду. А я ледзь не ашалеў ад вялікага кахання. Мой твар выдаваў мяне, пане каханку, як жа інакш. І вось аднойчы, калі я пісаў вершы, падходзіць да мяне іх вялікі ахмістр, якому я вельмі спадабаўся... і кажа:

— Дарма вы, ваша княская мосць, марнуеце сваё здароўе гэтым палкім каханнем, усё гэта без толку... У князёўны ўжо ёсць палюбоўнік, яна даўно сама яго выбрала, я вам заўтра пакажу, як ён выглядае.

Мяне разабрала вялікая цікавасць: хто ж ён, гэты шчаслівы? І ведаеце, хто гэта быў? Кульгавы і сляпы на адно вока дробнапамесны шляхціц. Вось такія яны, пане каханку, гэтыя жанчыны, ніколі не ўгадаеш, што за фантазіі заступаюць ім часам у галаў...

Але ўсе гэтыя ягоныя намёкі былі марнымі... праз пару дзён па ўсім двары разнеслася чутка: пан Кшыскі абвясціў,

што жэніцца з паннай Цівуноўнай. І я зразумеў, што нас чакае вяселле, не горшае, чым некалі ў паненак Выгоўскіх.

Мне давядзецца яшчэ раз паўтарыць, што той, хто неведаў Нясвіжа, не бачыў радзівілаўскай пышнасці, той ніколі не зможа ўявіць сабе, наколькі цудоўным магло тут быць вяселле прыдворнага, дальбог, не горшае, чым у тых, хто насіў княскія тытулы.

У абаіх маладых не было родных, а таму панне Цівуноўне служыла пасажонай маткай Мараўская, а пасажоным бацькам маладога выступаў сам князь Караль, які з усіх сілаў стараўся паказаць, што ён не шкадуе аддаць былой каханкі. Панна Зарына мела дзесяць тысяч злотых, якія яна атрымала разам з пенсіёнам, да гэтага ў якасці пасагу яна адзержала неблагую вёску на Случчыне, якая пры гаспадарлівым кіраванні магла б штогод даваць паўтары тысячы дукатаў прыбытку. У гэтай вёсцы, якая называлася Тышова, не было іншай сядзібы, апрача фальварка аканома. Але князь Караль аддаў патаемны загад, каб за чатыры тыдні выбудавалі палац. З княскіх лясоў выдзелілі дрэва, паслалі цесляроў, і вось ужо на пагорку каля рэчкі Тышоўка вырас хорам на дзесяць пакояў, з вялікай залай, адбудаваны, абладаваны, застаўлены дыхтоўнай мэбляй. Усюды ўсяго ставала, каб і выпіць, і паесці, і з прыемнасцю адпачыць. Гэтыя клопаты ўдалося ўтрымаць у сакрэце, гаварылася толькі пра рэстаўрацыю фальварка, і маладыя даведаліся пра сваё шчасце адно тады, калі разам з гасцямі прыехалі ў свае ўладанні.

Вяселле згулялі паводле старадаўных звычаяў, з усімі належнымі цырымоніямі; аднак князь прыехаць не захацеў, сказаў, што хворы, а насамрэч яму было шкада Зарыны, а можа, проста сваіх добрых успамінаў пра яе.

У дзень вяселля і яшчэ нейкі час пасля яго Радзівіл хадзіў невясёлы, спахмурнелы, усё ўздыхаў, расказваў розныя анекдоты пра здрадлівасць жанчын і падман чыстых душ. Бадай што ў кожнага з нас па некалькі разоў ён пытаўся: «А скажы ты мне, пане каханку, як яна магла выбраць гэтага вэнджанага печкура? Я ніколі не думаў, што яна так не разбіраецца ў людзях...»

Кожны з нас адказваў яму як умеў, кожны стараўся развеяць ягоную тугу, але дарма: ён хадзіў смутны і безуважны да ўсяго. Яму не ставала яе твару за сталом, бракавала ціхай гутаркі. Я думаю, што ўспаміны пра лепшыя часы робяцца тым больш дарагімі, чым далей ідзе чалавек па дарозе жыцця...

Старалася нечым забавіць яго і Ружачка, але і ў яе нічога не выходзіла, пан Караль глядзеў на яе безуважна, панура слухаў, усміхаўся. Потым пагладзіў яе па падбародку і сказаў: «Усе вы такія, і пакіньце вы мяне ў спакоі...»

Аднойчы раніцой (толькі я сабраўся выйсці са стайні) чую галас на панадворку — шум, бягня, крыкі — і не магу датумкаць, што здарылася... Пытаюся, у чым рэч, і мне адказваюць, што князь захацеў аб'ехаць фальваркі, загадаў запрагаць коней.

У Нясвіжы так вялося заўсёды: нават калі б князь сярод ночы загадаў запрэгчы шасцёрку цугам у адзін квадранс, і то конюхі не падвялі б, бо пільнавалі цэлыя суткі; увесь час напагатове былі адзін-два выезды, калёсы падмазаныя, людзі апранутыя. Вось і цяпер — толькі князь загадаў, як ураз усё было гатова. Чую, ужо і мяне клічуць ехаць разам з князем. Ён любіў часам адпальваць такія штукі. Нібы не ведаў, як цяжка сабрацца ў дарогу так хутка. Я ледзь паспеў пераапрануцца і загадаць падаць сабе каня, а князь-ваявода ўжо стаяў на ганку і махаў хусцінкай, каб яму падавалі карэту.

Я зірнуў на князя і здзівіўся: збіраліся ездзіць па фальварках, а князь стаяў апрануты як для візітаў; дзеля аканомаў ён звычайна так пышна не ўбіраўся. Выязджаем з мястэчка за грэблю. Вазніца пытае: «Куды?» — «У Тышова...» Я скеміў: затужыў князь па Зарыне. Была ў Нясвіжы і яшчэ адна завядзёнка: калі князь збіраўся недзе быць, то заўжды, хай сабе нават сакрэтна, загадзя давалі ведамасць, каб князь не заспеў шляхціца знянацку, каб той меў час падрыхтавацца. Але гэтым разам было ўжо позна, ніякім спосабам не папярэдзіць гаспадароў; прыдворныя павінны былі знаходзіцца пры асобе князя, адлучацца крадком ім не выпадала. «Ну што ж,— думаю,— будуць яму сёння асаблівыя адведзіны, калі ён наедзе знянацку і заспее гаспадыню

ў дэзабільe, а гаспадара заспанага». Бо Зарына хоць і была выхаваная ў панскіх палацах і пражыла там нямала гадоў, але ж яна займела сваю гаспадарку, то магла, як гэта звычайна і бывае, аддаваць ёй увесь свой час.

Ехаць да Кшыскіх трэба было даволі доўга. Стаяла спякота, і мы двойчы спыняліся адпачываць. Нарэшце паказаўся той новы двор, але вакол яго ўсё нібыта вымерла — нідзе ніводнай жывой душы. Князь зірнуў раз, другі, а фурман ляскае бізуном — і хоць бы хто выйшаў паглядзець, што там дзеецца. Дзіва, дый годзе!

Заязджаем на дварышча, прыдворныя выводзяць князя з каляскі, а прывітаць яго ніхто не спяшаецца. І толькі калі адчынілі дзверы ў сені, увайшла сама яе мосць гаспадыня з падносам у руцэ, а на ім хлеб-соль, нібыта яна загадзя ведала, каго ёй давядзецца вітаць.

Яна была адзетая па-вясковаму, але ўсё было гожа і да твару ёй: белая сукенка, белы чапец, аздоблены стужкамі, і болей нічога. Здавалася, яна нават памаладзела. Я не даў бы ёй і трыццаці гадоў. Відаць, вясковае паветра пайшло на карысць.

Зарына пакланілася князю ледзь не да каленяў і кажа:

— Ваша княская мосць тут гаспадар і пан, будзьце ласкавы, прыміце ад слугі вашай паводле старадаўнага звычаю каля новага парога хлеб і соль.

Князь нешта прамармытаў, пацалаваў ёй руку. Але выглядаў ён невясёлым. Я не паверыў бы, каб хто сказаў, але сам бачыў, што слёзы паказаліся ў ягоных вачах. Ён разгледзеўся на бакі, шукаючы гаспадара, яму палягчэла, калі ён яго не ўбачыў. Не спытаўся, дзе ён, Зарына таксама нічога не сказала. Зайшлі ў залу... Убранства ў ёй было не шыкоўнае, не багатае, але ўсё выглядала дагледжаным, чыстым і ўтульным. Гаспадыня спыталася ў князя, ці еў ён і ці не захоча падсілкавацца; а мы якраз усе былі галодныя... князь жа нічога не адказаў. Зарына павярнулася і выйшла...

— А што, панове,— сказаў князь,— усё ж добра, што мы не заспелі тут таго цыгана.

Толькі ён гэта вымавіў, як адчыняюцца дзверы, уваходзіць у белым касцюме, чорных юфтавых ботах, з са-

ламяным капелюшом у руцэ сам гаспадар і падае князю ў ногі — той аж адскочыў. Усе вырачылі вочы: далібог, сам Авідый не выштукаваў бы такой метамарфозы! Бо тая смешная пачвара, круцель той, цыган той выглядаў зараз зусім прыстойным чалавекам, яго не пазнаць было. Відаць, што жонка добра яго вымуштравала, бо ён забыўся на свае колішнія выдрыганцы, выбрыкі і ламанне. Ён папаўнеў, вочы, якія некалі сядзелі глыбока, выйшлі з-пад броваў; на шчоках — чырвань, з твару нават як бы і не такі чорны. Вось што робіць з чалавекам шчасце... Князь быў у замяшанні, а шляхціц падняўся і пальнуў прывітальную казань *ex abrupto* — без падрыхтоўкі, ды так складна, што мы аж аслупянелі.

Пакуль князя садзілі за стол, віталі і ўгаворвалі... нам ужо гэта пачало надакучваць. Тут якраз вярнулася гаспадыня, за ёй слугі прынеслі цудоўную пачостку. Асабліва выдатная была ў іх вяндліна, проста надзіва, бо гаспадарку ж яны завялі нядаўна. Князь палагаднеў, захацеў паглядзець, як яны тут жывуць...

Кшыскія выйшлі з князем на панадворак, мы толькі зводдаль назіралі за імі, бо нас было ўсё ж многа, не хадзіць жа цэлай працэсіяй...

Ледзь толькі князь вярнуўся, адчыніліся, нібы магічным спосабам, дзверы і нас запрасілі за стол. Усіх было недзе ці не дваццаць чалавек, і ніхто не застаўся галодны. Абед быў не шыкоўны, наш, шляхецкі, але смачны — хоць пальцы аблізвай! Тлустае мяса, моцныя соусы, прыправы, закускі, да таго ж выборныя віны і мёд. Было чаму падзівіцца. Гаспадыня села каля князя, а былы спадчыннік Ноя пераапрануўся ў парадны касцюм, прычапіў шаблю і сам слугаваў, нават не прысеў. Гэта быў ужо зусім іншы чалавек, так яна яго перайначыла: далікатны, паважны, ветлівы, прыстойны. Пра яе і казаць няма што: выглядала яна як свецкая дама і *hic mulier* — цудоўная жанчына.

Але гэтаксама як ваўка ягоная прырода цягне ў лес, так і Кшыскі не ўстрымаўся ад таго, каб не зрабіць выбрык у сваёй ранейшай манеры. Князь вельмі хваліў іх дом і гаспадарку, радаваўся, што ў маладых усё пайшло такім добрым ладам; аж тут Кшыскі пачаў цяжка ўздыхаць, нібы яму ўзвалілі на плечы камень ад жорнаў.

Князь павярнуўся да яго:

— У чым рэч?

— Ды так, ваша княская мосць,— адказвае Кшыскі,— з вашае ласкі ўсё ў нас добра, але ж як і ва ўсім свеце няма нічога дасканалага, так і ў нас, у Тышове.

Мы бачым, што жонка падміргвае яму, каб маўчаў, а той гне сваё, зноў заўздыхаў.

Тады князь спытаў:

— Дык чаго вам тут у Тышове не стае?..

— Князь яшчэ не ўсё абгледзеў у фальварку, а там ёсць адна не вельмі прыкметная загана... надта нязручная мяжа. Куры ледзь толькі выткнуцца за плот, а там ужо чужая зямля... а гусей дык я і ўвогуле выпускаць баюся... мяжа якраз за стайнямі.

— А чыя ў тым віна?

— Чыя ж, як не вашай мосці.

Князь памаўчаў.

— Што там за фальварак? — спытаў ён.

— Гэта Вулка Загжэбска,— адказаў Кшыскі, зачырванеўшыся.

— Колькі там хат? — пацікавіўся князь.

— Напэўна, і трыццаці не будзе.

На тым і скончылася размова. Частаванне цягнулася доўга, ужо цямнела, калі мы паднялі апошні келіх. Ды тут князь захацеў, каб пані Зарына запяяла, і яна яшчэ даволі прыемным і мілым голасам крыху папяяла для нас. А таксама сыграла пару мелодый з такім асаблівым майстэрствам, што хацелася не столькі слухаць, колькі глядзець на гэтыя рукі, якія лёталі, нібы зачараваныя.

Была ўжо цёмная ноч, калі князь загадаў збірацца. У нас былі з сабой паходні. Калі выязджалі, то ўбачылі нешта такое, чаго мы ніяк не чакалі. Зала і пакоі, дзе мы сядзелі, вокнамі выходзілі на сад, дварышча мы бачыць не маглі. І за гэты нядоўгі час, пакуль мы сядзелі за сталом і гаспадары ўвесь час былі з намі, нібы нейкі чараўнік ці яшчэ хто выбудаваў на месцы пры выездзе з двара высокую трыумфальную браму, асветленую ліхтарамі, а зверху мы ўбачылі надпіс па-лацінску: *Ex tuis donis tibi offerimus* — хай падараванае табой аддзячыцца табе...

Гэтаму можна было толькі падзівіцца: з густам, з шыкам і так дарэчы...

Князь павярнуўся да Пузыны і прашаптаў яму на вуха:

— Узялі мяне шэльмы за сэрца. Нічога не зробіш — давядзецца аддаць яму Вулку Загжэбску.

Вось так у наш першы прыезд князь дадаў да ўладанняў Кшыскіх у Тышове ладны кавалак. І так яны годна ўсё зрабілі, што князь нават прасіў іх прыняць гэты падарунак.

Тут ужо патроху мы расшалопалі, што той Кшыскі, якім усе так пагарджалі, быў разумнейшы, чым хто іншы, і свае справы ён абладаваў як след. Але на гэтым яшчэ не ўсё скончылася.

Восенню гулялі вяселле панны Ружачкі, якой падфарціла выйсці замуж за дужа багатага чалавека, ужо не маладога, удаўца, да таго ж яшчэ і васпаватага — яму па твары як бы хто гарохам стрэліў. Калі мы пачалі пасмейвацца, яна адказала: «А што мне за толк з гладкага, але голага? Муж, крыху харашэйшы за чорта, ужо добры муж».

Выйшла яна замуж, князь справіў вяселле і быў надта ў гуморы, мы яго даўно такім не бачылі. Паслаў некага з прыдворных з запрашэннем да Кшыскіх, каб прыехалі на дзявочы вечар, а Зарыну прасіў, каб стала пасаджонай маткай маладой пані. Кшыскі цалкам абнавіў свой гардэроб, не было ані знаку ранейшай пярэстасці ў ягоным адзенні. Ён выглядаў дужа важна, папаўнеў... вельмі змяніўся, відаць, што як сыр у масле качаўся. І князь ужо не падаваў выгляду, як некалі быў да яго непрыхільным. Але каб сказаць, што палюбіў, таксама не скажаш...

Гэтае вяселле я буду памятаць, колькі жыў буду, такое яно было пацешнае, з жартамі, смехам, болей такіх на маёй памяці не было.

Маладая, малады, дружкі, сваты — ну проста звар'яцелі. Мы таксама. Менш радасці было, бадай, толькі на твары маладога, бо ён ужо задумваўся над тым, што праз жонку ў яго будзе шмат сяброў і што яе не стрымаеш нават на ланцугу. Але тое не спраўдзілася, яны жылі вельмі шчасліва. І ўсё ж напярэдадні вяселля небарака хадзіў задуменны. Затое прыемна было глядзець у гэты дзень на твар князя, які проста выпраменьваў весялосць, і мы

радаваліся. Я не ведаю, як магла гэтая малая Ружачка гэтулькі танцаваць: кожны ў той дзень хацеў патанцаваць з ёй. Што казаць, мабыць, жаночая натура крапчэйшая, хоць звонку выглядае слабой. Цалюткую ноч танцы, тосты, прамовы, салодкі пачастунак, падношанне падарункаў і провады забралі значна меней часу. Мы смяяліся і пасля ад'езду маладых — з Кшыскага, ён зноў адпаліў... але на гэты раз прыстойна і тактоўна...

Недзе пад раніцу, калі былі ўжо выпіты бочкі віна, усім захацелася квасу і нечага заесці, каб набрацца сілы на наступныя дні, бо адным днём мы тое вяселле не адбылі. Пайшлі перакусіць у малую залу пры пакоях князя... за намі пацёгся і Кшыскі.

Убачыў яго князь і кажа:

— Ну што, Кшысю? Цяпер ты ўжо не скажаш, што табе цесна ў Тышове? Далучыў Вулку, маеш цяпер і грошай больш, пане каханку.

— Усё з ласкі вашай княскай мосці! — адказаў Кшыскі і пакланіўся князю.— Дзякуй Богу, усё добра. Я для сябе ўжо больш нічога не хачу, але мая жонка... не было, мабыць, такой жанчыны, каб яшчэ па нечым не ўздыхала.

— Няўжо? І па чым жа, пане каханку? — з усмешкай запытаў здзіўлены ваявода.

— О! Не варта нават гаварыць пра гэта, трудзіць вушы вашай княскай мосці.

— А мне ўсё ж цікава ведаць, пане каханку, дужа цікава.

Кшыскі моўчкі пакланіўся і нічога не адказаў, а тут з князем загаварылі іншыя, і іх размова перапынілася. Аднак князь быў памятлівы: назаўтра па абедзе ён спаткаў Кшыскага і ўзяў яго за гузік ад жупана.

— Дык скажы ты мне, пане каханку, чаго там тваёй пані яшчэ не стае?

— А! Ваша мосць князю! Гэта звычайны жаночы капрыз, вечна ім нечага хочацца... — з усмешкай адказаў Кшыскі.

— А ўсё ж — чаго хочацца ёй?..

— Ох! Яна дужа любіць сваіх галандскіх кароў...

— І ў мяне яны ёсць! — усклікнуў князь.

— Але яна не можа даць ім рады ні ў Тышове, ні ў Вулцы... Нейкая ў нас паша няўдалая... Іншая рэч — побач, у Малюнічах... там добры папас, лотаць расце, сена цудоўнае, аж зайздрасць бярэ глядзець на кароў, якія там пасуцца...

— Хм... хм... і што з таго, пане каханку? — пацікавіўся князь.— А чые яны, тыя Малюнічы?

Кшыскі прамаўчаў, толькі кашлянуў.

— Чые Малюнічы? — паўтарыў князь.

— Гэта малюсенькая вёсачка, хат, здаецца, пятнаццаць, толькі лугі там добрыя. Каб можна было купіць, то я з ахвотай купіў бы...

— Не хочуць прадаваць?

Кшыскі маўчаў.

— Не хочуць прадаваць, пане каханку? — паўтарыў князь.

— Дык жа гэта вёска вашай княскай мосці, яна не прадаецца... — прашаптаў Кшыскі.

— А, праўда! Малюнічы! Гэта мая вёска, праўда. Прыпамінаю, што там былі нават бабровыя тоні.

Кшыскі памаўчаў, потым сказаў:

— Баброў там як быццам ужо няма, калі ёсць, то не больш ад адной-дзвюх хатак...

— Дык кажаш, што купіш? — спытаў князь.

— Дзеля мяне дык нічога не трэба, але муж павінен дагадзіць жонцы... калі ёй чаго захочацца... — адказаў Кшыскі і ўздыхнуў.

І зноў іх размова перапынілася... але князь адразу пайшоў да свайго заказніка Багуслаўскага і пачаў распытваць:

— Ці вялікая гэта вёска — Малюнічы, якая недзе там мяжуе з Тышовам, пане каханку?

— Яна не мяжуе з Тышовам,— адказаў Багуслаўскі,— а можа, мне здаецца.

— Ну, тады з Вулкай...

— Можа, дзе клінам і ўтыкаецца...

— І што там?

— Хат больш за дваццаць, прыгожы лес, добрая паша, яшчэ бабровыя тоні... добрая вёска.

Увечары ваявода падсеў да пані Кшыскай, а тая як бы і не ведала. Пытаецца ў яе:

— Дачуўся я, пані, што ты не можаш даць рады сваім галандскім каровам?

— Адкуль ваша княская мосць гэта ведае? — з усмешкай спытала прыгожая Зарына.

— У мяне ўсюды ёсць свае віжы, пане каханку... Значыць, у Тышове не стае добрай смятаны?

Пані Кшыская пачала смяяцца...

— А тут, як на злосць, у Малюнічах кароўкі дужа гладкія...

— І хто гэта князю пераказвае такія дробязі? Калі пры ўсіх вашых клопатах і такое вас цікавіць, то гэта знак асаблівай ласкі да нас, і я не ведаю, як вам за яе дзякаваць,— прамовіла пані Кшыская.

— Але вас гэта сапраўды так даймае, пане каханку? — спытаў ваявода.— Я быў бы рады, каб пані была шчаслівай, каб ёй не ставала хіба што птушынага малака...

Пані Кшыская з удзячнасцю глянула на князя, адказваючы толькі паглядам і ўсмешкай... Відаць, гэтыя вочы расчулілі яго, бо князь адказаў ласкава:

— Мая ты дабрадзейка, я дадам вам Малюнічы да Тышова, хай у вас будзе не толькі мяса, але і добры сыр... каб ужо ўсяго ў гаспадарцы было паддастаткам...

Расчуленая такой дабрынёй ваяводы, пані Зарына хацела пацалаваць яму руку, але Радзівіл не даў.

Яна пабегла па мужа, прывяла яго да князя.

— Ваша мосць, я быў бы не вартым тых шчадрот, якімі вы мяне асыпалі, калі б скарыстаўся [illegible] вашай дабрыні,— пачаў адмаўляцца Кшыскі.— Людзі пачнуць языкамі перакладаць, могуць сказаць, што я выпрошваю, што... Не, ваша мосць князю, як сабе хочаце, але мы гэтага дарунку прыняць не можам...

Ды калі ўжо ваявода нешта сказаў, то не было такога спосабу, каб прымусіць яго перамеркаваць па-іншаму; гэта ўсе ведалі. Таму і іх спроба, шчыра кажучы, была чыстай камедыяй... Потым былі ўкленчванні, падзякі, слёзы, выказванне вечнай удзячнасці, і Малюнічы дасталіся Кшыскім.

Пасля вяселля князь паслаў ім фармальны акт перадачы права на ўладанне, і Кшыскі паспяшаўся распачаць там гаспадаранне, ды яшчэ меў ласку атрымаць збожжа на сяўбу і розныя іншыя дробязі...

Недзе праз паўгода паехалі мы на Падляшша, у Белую, усім дваром, бо князь хацеў асталявацца там на нейкі час. З Нясвіжа рэгулярна прысылалася пошта, рапарты, лісты, князь часам пасылаў туды прыдворных, бо хоць і жыў ён у Белай як у Бога за пазухай, але Нясвіж свой любіў больш за ўсё. А тут хоць і быў таксама дома, але пачуваўся нібыта госць. Не было таго дня, каб ён не ўздыхаў па Нясвіжы... Бывала, прывязуць пошту, пачнуць разбіраць яе, а ён ужо ідзе з палаца, у якім жыў, у канцылярыю, каб уведаць пра навіны. Гаспадар гэтулькіх зямель, замкаў, маёнткаў, ён (і я таму сведка) мог распытваць пра ўлюбёную кабылу, ажарабілася яна ці не, пра псярню, звярынец. І вось аднойчы прыходзіць да яго Багуслаўскі з лістамі. А пакет быў такі тоўсты, што ваявода аж спужаўся.

— Ты мне, пане каханку, не дакладвай усяго, ліха на іх, на тыя паперы... у галаве і так думак аж занадта, дзе ўжо тут усё змясціць... пераказвай галоўнае... найлепшае...

Багуслаўскі сеў, прачытаў адзін ліст, другі, дастаў трэці... але ваявода спыніў яго:

— Пачакай! Ад каго?

— Ад сям'і Кшыскіх.

— А! Там, няйначай, няма нічога важнага, адны кампліменты, пасыпаныя цукрам.

— Мне здаецца, што там ёсць просьба да вашай княскай мосці.

— О! О! Гэта будзе ўжо занадта! — перапыніў князь.— Чаго яны там, чорт іх забяры, хочуць? Можа, каб саступіў ім Нясвіж? Даў ім Тышова, Вулку, Малюнічы, хіба не досыць?

— Ды яшчэ насення далі...

— Ну дык чаго яны хочуць, пане каханку, чаго просяць?

— Запрашаюць на хрэсьбіны! — смеючыся, паведаміў Багуслаўскі.

Ваявода ўсхапіўся з месца і пляснуў у далоні:

— Не можа быць! Гэта ж трэба, такі цуд! На хрэсьбіны! А каго ім Бог даў?

— Сына, ваша мосць,— сказаў Багуслаўскі, узяўшы ліст.— Сама пані піша, што яго пакуль проста ахрысцілі ў вадзе, а на цырымонію будуць чакаць вашу княскую мосць...

— Ану, то ж доўга ім давядзецца чакаць,— адказаў ваявода.— Я не паеду. Між намі кажучы, гэты Кшыскі выглядаў арлекінам, а напраўду быў спрытным зухам, умее так хітра дапяць да кішэні, што і не згледзіш... Не паеду... Ім зноў нечага захочацца... Ды ўжо досыць.

Багуслаўскі засмяяўся.

— Але тут яшчэ пані Зарына *manu propria* — сваёй рукой — піша,— дадаў ён, зірнуўшы на ліст,— што хай сабе хлопец прачакаецца хросту хоць дваццаць гадоў, але яна нікога не хоча бачыць хросным бацькам, апрача вашай княскай мосці, і просіць дазволу даць яму імя Караль.

Князь любіў знакі ўвагі да сваёй асобы... Кшыскі скарыстаў і гэта. Князь расчуліўся:

— Адпішы і пашлі нараджэнцу які падарунак, а сам я не паеду. Яны там зноў абдзяруць мяне як ліпку, яна падгаворыць мужа, а той зловіць мяне на слове. Хоць нешта, ды трэба будзе даць, а я ведаю, што ў маёй кішэні зараз і сотні злотых няма... як арандар, пане каханку, бяру напавер... Хай сабе чакаюць. Напішы, што я зарокся хрысціць дзяцей, бо яны пасля скора паміраюць... часам толькі дакрануся да каторага, глядзіш, году не прайшло, а яго ўжо і няма... Мне нават шчанят няшчаснай Нептуны не ўдалося выгадаваць.

Быў напісаны складны, ветлівы адказ, і на тым усё скончылася. А ўвосень мы зноў вярнуліся ў Нясвіж.

А потым было, як зараз помню, паляванне ў Налібоцкай пушчы. Выявілася, што на простай дарозе папсаваныя масты, і мы мусілі павярнуць на Тышова. Князь баяўся туды паказвацца і загадзя аддаў загад у вёску не заязджаць нават дзеля таго, каб напаіць коней. Але нехта з даўных сяброў Кшыскага ці якая сяброўка Зарыны паспелі іх папярэдзіць. Выехалі на світанні, яшчэ дацямна паказалася Тышова. Вазы паехалі па грэблі, і раптам каля млына па-

уліся крыкі: «Стой! Стой!» Князь пачуў, глянуў, спытаў: Што там?» і загадаў ехаць далей. А коні стаяць. Паслалі прыдворнага даведацца, ці не сапсавалася што. А там, каля млына, стаіць трыумфальная арка з зяляніны і засланы стол з ежай. І ўжо сама пані Кшыская ідзе да абозу...

— Ваша княская мосць,— прамовіла яна, падышоўшы да Радзівіла,— калі ўжо вы так не ласкавы да сваіх слуг, што не хочаце праведаць іх убогай хаціны, дазвольце ім хоць на дарозе вас прывітаць...

Князь вылез, пацалаваў руку пані Зарыне... крыху нахмурыўся, але ад пачосткі не змог адмовіцца, бо яго так сардэчна і міла прасілі... Кшыскі стаяў з шапкай пад пахай у такой прыніжанай і пакорлівай позе, а ягоная жонка так ласкава ўсміхалася. А за пару крокаў ад млына на спецыяльна збудаваным памосце, засланым дыванамі, на сталах стаялі пляшкі з віном і поўныя міскі... Княскія прыдворныя стаміліся пасля доўгай дарогі, апетыт разгуляўся, а тут такія прысмакі, аж слінкі цякуць... Яны вельмі ўзрадаваліся, калі князь дазволіў паласавацца. Радзівіла падвялі да парадняга шырокага крэсла, якое больш нагадвала трон... Князь зірнуў на бакі, раз, другі, мабыць, баяўся, што яго запросяць на хрэсьбіны, не ўбачыў нічога, што магло б нагадаць пра іх, і сеў за стол. Здавалася, што Кшыскі зараз падасць знак частавацца, як раптам расчыніліся дзверы млына... і выйшла прыгожа апранутая мамка з прыкрытым пялюшкай дзіцем на падушцы. А за ёй выступаў і ксёндз-пробашч ва ўсіх сваіх шатах, далей — пані падстоліна Ціханавецкая, якую князь вельмі паважаў... Князь акінуў паглядам гэтую працэсію, усміхнуўся нечаканаму сюрпрызу, але (што паробіш?) мусіў стаць хросным бацькам.

Падстоліна стала побач як кума, у другой пары былі пан Рэйтан з пані Валадковічавай, якія таксама хаваліся ў млыне, не ведаючы, ці ўдасца затрымаць князя.

— Ну, пане каханку, злавілі ў сець старога мядзведзя... трапіў у нерат, што і казаць... — мармытаў князь.— Але я не дапушчу, каб дзіця мерзла, бо вецер сцюдзёны, ды і пані падстоліна можа прастудзіцца... Хто мае ахвоту ехаць на паляванне — хай едзе. А мы — у двор.

Паляўнічых і частку прыдворных пастанавілі адправіць у Налібокі, каб яны чакалі там ваяводу, а мы астатняй світай пайшлі ў двор. Кшыскія спадзяваліся, відаць з усяго, што ім удасца іхняя хітрасць, бо ўсё было падрыхтавана: і стол для князя з распяццем над галавой, са свечкамі, і розных він, і трункаў, колькі душа зажадае... Пані Зарына Кшыская ўвайшла хораша ўстроеная, здавалася каралевай нават пры падстоліне, якая была свецкай дамай, ды і сам Кшыскі выглядаў, не схлушу, як маршалак пры яе двары... і, што асабліва цікава, зусім прыстойна. Ён ужо не рабіў ніякіх выбрыкаў, як наравісты конь, перастаў вычварацца і прыдурвацца. Апрануты ён быў багата, але сціпла, ва ўсё новае; стаяў цэлы час каля князя, падносіў яму талеркі, сам падаваў сподкі, словам, правіў шляхецкую прыдворную службу. Князь-ваявода адчуваў сябе няёмка, бо не мог зрабіць падарункі для хрэсніка, кумы, бацькоў і прыдворных, а ён заўсёды, калі бываў хросным бацькам, любіў надарыць усіх. Але ён паспеў яшчэ каля млына нешта шапянуць старшаму прыдворнаму, і той вярнуўся ў Нясвіж, каб прывезці падарункі. Тут сталі з'язджацца суседзі, відаць, загадзя запрошаныя. Сярод іх апынуўся і натарыус Качура.

Усе вельмі здзівіліся, калі яго тут убачылі, бо ён не мог быць сярод запрошаных, князю было вельмі непрыемна бачыць яго. Я заўважыў, як пані Кшыская расхвалявалася і падбегла да князя патлумачыць, што натарыуса ніхто не запрашаў... Кшыскі таксама скрывіўся, калі ўбачыў яго, але прывітаў як належыць. У пана Качуры была ўсім вядомая слава, а князь яго іначай не называў як той няздара. Калісь Качура выступаў у нейкім судовым працэсе як адвакат супраць Радзівіла, абхітрыў усіх ягоных упаўнаважаных і выйграў справу. Князя чапляла не так страта грошай, як абраза роду Радзівілаў, і ён не мог гэтага дараваць. Няздара быў цяпер ужо стары чалавек, на рэдкасць балбатлівы, аднак флегматычны, стрыманы, халодны, адважны. Ён усіх бачыў наскрозь і быў дужа хітрым. Калі ён за нешта браўся, то няўхільна дамагаўся свайго — тры разы прайграе, але заўжды *de noviter repertis* — яшчэ раз — вернецца і хоць усіх вымучыць, давядзе да шаленства, але паставіць на сваім. Звонку ён быў непрыкметны, худы, сярэдняга рос-

ту, твар бледны, вусы рэдкія, як трава на пяску... лысы... вочкі малыя, глыбока пасаджаныя... Ён прывітаўся з гаспадарамі, потым папраставаў да князя-ваяводы, нізка, аж дакрануўшыся рукамі да зямлі, пакланіўся. Хоць князь не дужа хацеў бачыць яго, а ўсё ж змусіў кіўнуць галавой. Назолу нельга было выбавіць за дзверы, і гэта канчаткова сапсавала князю ягоны і так не дужа добры настрой.

— Які чорт яго сюды прынёс? — прабурчаў князь.

Заўважу, што Качура ніколі без дай прычыны нікуды не ездзіў, калі ўжо і даваў сабе такі клопат, то заўжды меў нейкую справу. Я быў пэўны, што і гэтым разам ён не сам прыблукаў — насамрэч натарыуса запрасіў Кшыскі дзеля нейкіх сваіх інтарэсаў. Гэты Кшыскі ўмеў ёмка дамагацца свайго, у чым мы ўсе не раз пераконваліся.

Нязддару запрасілі за стол. Князю так непрыемна было бачыць яго, што ён не хацеў нават позіркам з ім сустракацца. А Качура хоць і сеў воддаль, але так, каб не выпускаць з вачэй князя. Некалькі разоў ён спрабаваў уступіць у размову, яму ніхто не адказаў, але яго гэта не збянтэжыла.

Віно было найвышэйшага гатунку, келіхі ўздымаліся часта. Качура вычэкваў, відаць, пакуль галовы разгарачацца... І праўда, пад канец абеду ўсе развесяліліся, пажвавелі. Натарыус паспеў пару разоў дасціпнымі словамі выклікаць смех, хоць сам ён ніколі не смяяўся. Неўпрыкмет ён апынуўся ў цэнтры ўвагі. Князь, каля якога шчыравала пяшчотная пані Кшыская, быў расчулены яе гасціннасцю, успамінамі пра маладыя гады, пакрысе таксама зрабіўся весялейшым, стаў раз-пораз устаўляць у размову нешта сваё, і відаць было, што ён забыўся пра колішнюю крыўду. Надвячоркам з Нясвіжа вярнуўся прыдворны і прывёз тое, за чым яго пасылалі. Акрамя тысячы чырвонцаў для дзіцяці тое-сёе дасталося кожнаму. Маці — дужа прыгожы ўбор, бацьку — дарагі гадзіннік, пані падстоліне — каштоўны пярсцёнак. Мамцы, якая была з суседняй радзівілаўскай вёскі, акрамя сумкі, рукамі робленай, якую яна атрымала ад самога князя, было дадзена на ўсё жыццё разам з усёй раднёй вызваленне ад абавязкаў і подацяў...

Калі ўсё было раздадзена і кожны па-свойму падзякаваў князю, раптам устаў натарыус і з усмешкай загаварыў:

— Добра быць у пашане ў князя, жыць з ім у дружбе і згодзе — гора не зазнаць! Усе ведаюць, якое залатое сэрца ў нашага князя-ваяводы. Але што з таго, што з таго? Што князь можа парабіць з д'яблам, які чыніць зло? Я ж ведаю, што з найлепшых учынкаў вашай мосці ніколі не выходзіла нічога добрага...

Князь запытальна глянуў на яго.

— Праўду кажаш, асіндзею,— жвава падхапіў ён,— мы аднойчы злавілі д'ябла ў Налібоцкай пушчы, потым тры дні мачылі ў свянцонай вадзе, адрэзалі яму кіпцюры, яны, можа, і дасюль не адраслі, пакінулі яго без хваста... Вось гэтай апошняй крыўды ён не можа мне дараваць. Але скажы мне, пане, адкуль ты ведаеш, што д'ябал перайначвае тое, што я раблю?

— Ды як жа не ведаць, не бачыць таго, што само лезе ў вочы? — не збянтэжыўшыся, адказаў натарыус.— Я магу пералічыць на пальцах тых, каго князь асыпаў сваімі міласцямі і каму гэта потым вылезла бокам...

Князь уздыхнуў, бо ў тым была пэўная доля праўды.

— Але дзякаваць Богу, што гэта не адносіцца да маёй шаноўнай пані Кшыскай,— засмяяўся ваявода.— Яна ведае нейкі спосаб прагнаць нячыстую сілу, бо ў Тышове, як мне здаецца, усё ідзе на добры лад.

Качура пацiснуў плячыма.

— Да пары, ваша мосць, да пары,— адказаў ён.— Я загадзя магу сказаць, што і тут бяда ўжо на парозе...

— Што тут можа здарыцца? Што ты, асіндзею, кажаш? — загаварылі разам і Кшыскі, і Кшыская.— Супакойцеся, пане! Навошта прарочыць нам у такі дзень нешта благое?

— Пачакайце! — запярэчыў Качура.— Я вам нічога благога не скажу. Проста ў мяне ўжо вялікі досвед, практыка, я многа чаго нагледзеўся, вось і навучыла жыццё варажыць...

Кшыскія спрабавалі перавесці размову на іншае, але князь зацікавіўся словамі натарыуса.

— Не, вы дайце яму сказаць, хай растлумачыць... Калі ласка, расказвайце...

— Пане Кшыскі, ці ёсць у вас карта сваіх уладанняў, ваколіц Тышова, Вулкі і Малюніч? — спытаў Качура.

— Ёсць, я папрасіў геаметра і каморніка, каб змалявалі мне ўсё на адной карце.

— Яе можна знайсці?

— Яна ў маім пакоі.

— Прынясіце,— папрасіў ваявода.

Кшыскі мусіў пайсці, праз некалькі хвілін ён разам са слугой унёс бляшаную трубку, вялікую, як бервяно, з яе дасталі нацягнутую на палатно карту ўладанняў сямейства Кшыскіх *cum attinentiis, acuratissime delineatem* — старанна, акуратна нарысаваную — княскім геаметрам. Яе развінулі на стале, але яна згортвалася, таму на рагі паставілі бутэлькі і паклалі боханы хлеба.

Натарыус стаў у такую позу, нібыта збіраўся танцаваць, узяўшыся рукі ў бокі; князь стаяў, трымаючы рукі за спінай, нахіліўшы галаву: у яго ўжо слабеў зрок. Качура пачаў паказваць:

— Перш-наперш хачу звярнуць вашу ўвагу на канфігурацыю ўладанняў... Незвычайная канфігурацыя. Нагадвае рака... або саламандру... Мноства паваротаў, нідзе няма дакладнай мяжы, адны дамоўленасці... а гэта кветкі, з якіх пазней будуць горкія ягады... Вось гляньце на ваколіцы Тышова... доўгая фігура, двор у адным канцы, за вёскай, палі — у другім... хоць гэта ў нас — рэч звыклая. Далей да двара прытыкаецца Вулка... адным бокам... Так! А цяпер прашу сачыць за маім пальцам: вось граніца пайшла ўверх, пабегла і знікла... Вулка пры Тышове — як барадаўка на носе... Але гэта яшчэ не ўсё... Малюнічы ляжаць за Вулкай і мяжуюць з імі толькі па вузенькай палосцы... Прашу паглядзець. Паміж Малюнічамі, Вулкай і Тышовам утачыліся Засыпянскія лясы... таму, каб перавезці напрасткі з Тышова ў Малюнічы хаця б воз гною, патрэбна дзерціся праз чужыя ўладанні... І гэта, ваша княская мосць, не нейкі там клінок, ражок, а трыццаць ці нават сорак валок зямлі, вокам не згледзець. Калі ўбіць каму клін у грудзі... то зараз дыхаць перастанеш... Згадзіцеся, ваша мосць князь, што ваша дабрыня да шаноўнага сямейства Кшыскіх з часам прымусіць іх мець вялікія клопаты... Я назваў бы гэтыя Засыпянскія лясы чортавым зараснікам...

Тут натарыус засмяяўся, усе астатнія маўчалі; князь нахіліўся над картай, разглядаючы яе, і не знаходзіў, што адказаць.

— Пакажы мне дакладней, асіндзею, дзе тут той клін,— папрасіў ён.— Адкуль і дакуль ідзе?.. Як? Тут жа як быццам адны лясы...

— І лясы, і балоты! — удакладніў натарыус.— А вось гэты клін... тут мяжа Малюнічаў... тут Тышова... А вось Вулка...

Ён правёў пальцам па белай частцы карты.

— Вось каб ад гэтак званага Белага груда правесці праз пушчу хвалістую лінію да Тышоўскага бору, там, дзе пазначана ўрочышча Banькі... то канфігурацыя стала б значна лепшай, прыгожа скругленай... гэта *in futurum* — у будучыні — не адгукнецца... д'ябал адступіцца.

— Так-так! — усклікнуў ваявода.— Я часам і з гэтым панам магу паладзіць... хай сямейства Кшыскіх дарэмна не хвалюецца... Сапраўды, паводле слоў натарыуса, выходзіць, што можа стацца так, як з тым мужыком, якому чорт насыпаў поўныя кішэні дукатаў, а як стаў ён іх дома даставаць, то выцяг адно лісце замест золата... Магло быць так, што і мае падарункі сталіся б фальшывымі, як чортава золата?

— Магло, ваша княская мосць! — горача і ўсхвалявана пацвердзіў Кшыскі.— Але хачу сказаць, што ўсё атрыманае ад вас, з вашае ласкі, пакуль што вядзецца і спорыцца... жонка таксама можа пацвердзіць, што нам усё ўдаецца. А што да тых Засыпянскіх лясоў, то ад іх сапраўды шкода ёсць. Нам цяжка ўтрымаць сялян, бо пад бокам чужы лес, вось мужыкі з Тышова, з Малюніч, з Вулкі чыняць шкоду... мы пільнуем як можам... але іх ловяць, забіраюць худобу, судзяць... гэта праўда... клопаты ёсць... але ж ці ў мяне аднаго?..

— Сапраўды, пакуль што яшчэ так-сяк,— падтрымаў яго Качура.— Але хто можа сказаць, у чые рукі ўсё гэта патрапіць? Зярнятка ёсць, і яно можа ўзысці. Ого! Я-то гэта добра ведаю! І вы добра ведаеце, што такое мець вось такі клін...

— Пане Качура, годзе пра гэта! — спрабавала спыніць размову пані Зарына.

— Маўчу, пані дабрадзейка, маўчу! У такі шчаслівы і памятны для вашай сям'і дзень я не хачу быць Касандрай[19]... і псаваць настрой не хачу князю, якога я люблю і паважаю...

— Дык ты, пане натарыусе, мой прыхільнік? — з'едліва спытаў князь.— Гэта нешта новае! Хутчэй наадварот... але чаму ты думаеш, што псуеш мне настрой? Дарма, васпане, зусім не...

— Я сапраўды шчыры прыхільнік вашай княскай мосці, заўжды ім быў і да скону не перастану быць, у тым я гатовы прысягнуць,— запярэчыў яму натарыус, жэстыкулюючы так, нібы ён выступаў у судзе.— Калі вы лічыце сваімі сябрамі толькі тых, хто гаворыць вам прыемнае, а горкай, ды здаровай праўды слухаць не хочаце, то я сапраўды не аднашуся да лісліўцаў, гэтага не дазваляюць мой гонар і сумленне, калі б вы, ваша княская мосць, зараз маглі зазірнуць у маё сэрца...

— Мой ты пане каханку,— перапыніў яго князь,— я рады быў бы паглядзець на сэрца, але цяпер не варта... можа, калі-колечы пан мне яго пакажа... іншым разам... але мне здаецца... можа стацца так, што вам яго прырода не дала...

— Як жа б я жыў без яго? — спытаў натарыус.

— Ведаеш, асіндзею, калі я ездзіў у Гішпанію па табаку для князя прымаса, каб праз гэта заміріцца з Панятоўскімі, выпала мне спаткаць у Саламанцы вучонага доктара,— пачаў расказваць князь.— І ён мяне запэўніў, пане каханку, што разрэзаў трыста восемдзесят шэсць нябожчыкаў і толькі ў трыццаці чатырох знайшоў сэрца. Вось так, пане каханку...

— А што было ў іншых на тым месцы? — усміхнуўшыся, спытаў натарыус.

— У іншых? Хто іх там ведае! Гішпанцы часта лгуць, пане каханку,— прамовіў князь.— Але ён паказваў мне свае запісы. На месцы сэрца ў некаторых было вотруб'е, а ў каго — мяшэчкі накшталт кашалькоў, нават зялёныя, у каго — каменне, цагліны і розныя іншыя інгрэдыенты, пане каханку.

На тым і скончылася гутарка пра абсягі маёнтка Кшыскіх. Натарыус зрабіў выгляд, што паверыў выдумцы. А князь улёг у аповеды пра свае бадзянні па свеце, пачаў з Гішпаніі, а потым дабраўся аж да Месяца; але ж назаўтра трэба было ехаць у Налібоцкую пушчу, і ён нарэшце пайшоў у спальню. Кшыскія праводзілі яго з ліхтарамі ў руках. Ды размова з натарыусам гэтак запала князю ў галаву, што праз колькі дзён хроснаму сыну была пасланая дарчая на Засыпянскія лясы, і такім спосабам пяцьдзесят валок пушчы з найлепшым таварным лесам дасталіся Кшыскім. Насамрэч ніякіх балотаў і багны там не было, а за выборныя мачтавыя сосны пазней гаспадары атрымалі пару тысяч дукатаў.

Пасля таго як князь так нечакана папаўся на грэблі ў Тышове і шчодра аплаціў свае ўспаміны пра цудоўную Зарыну, ён болей не ездзіў каля ўладанняў Кшыскіх і нейкі час не бачыўся з іх гаспадарамі. Пазней яны прыязджалі ў Нясвіж на розныя святы і ўрачыстасці, і князь, як і раней, быў з паняй Зарынай дужа ласкавы і ўважлівы.

Другіх хрэсьбінаў не надарылася, бо муж і жонка былі ўжо не першай маладосці; ды і князя цяжка было абдурыць яшчэ раз, ён і так даў ім надта многа. Кожны раз, калі яны прыязджалі ў Нясвіж, ён цешыўся з малога Караля, а ў Кшыскага пытаўся, ці не замінае яму там д'ябал... але заўжды чуў толькі словы ўдзячнасці...

Калі мяне памяць не падвяла, можа, гадоў праз пяць па тых хрысцінах, неяк раніцой я ўбачыў князя; задуменны і засмучаны, ён наўзлукаткі сядзеў за сталом над толькі што прачытаным лістом.

— Ведаеш, асіндзею, пане каханку,— павярнуўся ён да мяне,— пані Зарына... памерла... Далібог, не ведаю чаму... яна ніколі не скардзілася ні на што... Усе кажуць, што Кшыскі хадзіў перад ёй на пальчыках, а мне здаецца, што гэты ашуканец яе замучыў. Яна была жанчына сціплая і разумная, утойвала свае беды, так і не пажыла шчасліва.

— Ад чаго яна памерла? — спытаў я.

— Кашляла... захварэла на сухоты... — прамовіў князь сумным голасам.— Бяда ходзіць па свеце... Кшыскі запра-

шае на пахаванне, але я не магу паехаць — апухлі ногі... едзь ты... памажы, калі будзе ў чым патрэба...

На загад князя мы паехалі ў Тышова і ўбачылі там Кшыскага — спалатнелага, сумнага, у слязах. Нас узяло за сэрца, што ён вельмі гараваў, не адыходзіў ад труны, а ў касцёле горка плакаў. Як тут было не пашкадаваць бедака? Памінкі ён справіў як належыць; ксяндзам, якіх прыехала многа, падзякаваў, надарыў іх, накарміў і напаіў.

Пра гэта ўсё мы расказалі князю. Кшыскі паставіў на магіле жонкі прыгожы помнік; на мармуровай пліце быў выбіты складзены прыёрам прачулы надпіс на лацінскай мове.

Усім гэтым Кшыскі здабыў сабе прыхільнасць князя. Калі Кшыскі неўзабаве пасля пахавання жонкі прыязджаў, каб падзякаваць князю, Радзівіл прыняў яго вельмі прыязна, быў з ім як ніколі ласкавы. Сваё гора і жалобу па жонцы Кшыскі выказваў так красамоўна, так плакаў, што і мы ўсе вельмі шкадавалі яго.

Праз некалькі тыдняў ён прыехаў у Нясвіж і прывёз з сабой маленькага Караліка, які сваім дзівосным хараством нагадваў нябожчыцу маці; для сваіх гадоў ён быў вельмі жвавым, і пані Мараўская з прыдворнымі дамамі, якія былі ў гэты час у Нясвіжы, не маглі нагледзецца і нацешыцца з яго.

Бацька таксама шмат часу праводзіў са сваім адзіным сынам, насіў яго на руках, песціў, цалаваў; здавалася, ён хацеў замяніць яму маці.

— Але дзе ж, як бы я яго ні песціў, ніякай чуласцю я не замяню яму той, якую страціў,— сказаў ён аднойчы князю.— Клопатаў і старанняў бацькавых мала, такому хлопцу патрэбна жаночая апека... каб за ім быў сталы догляд. Мужчына то на гаспадарцы, то некуды ад'язджае, тысяча праблем... а дзіця марнуецца адно...

Час ад часу ён зазіраў у Нясвіж то з Каралікам, то адзін, яго заўжды добра прымалі... І вось неяк, толькі ён паехаў дахаты, князь кажа нам:

— Ну і жук ён, пане каханку!

— Хто? — спытаў Заблоцкі.

— Хто ж яшчэ? Наш самотны пан Кшыскі... Я здагадваўся, што нездарма ён тут круціцца. Сёння з паўгадзіны

гаварыў з паннай Ядвігай Асухоўскай... А перад тым некалькі разоў зазіраў даваспаватай Шарчынскай, але, мусіць, не ўпадабаў, бо брыдкая.

Ніхто з нас не верыў, што Кшыскі намеркаваў зноў ажаніцца; тым болей каб ён намеціўся на панну Асухоўскую, якая была маладзейшая, чым нябожчыца. Праўда, і не такая прыгожая, але затое досыць багатая. Ёй было трыццаць два гады, але выглядала маладзей. Князь не быў закаханы ў яе, але яму падабалася, што яна ўмела добра гаварыць, была вясёлая.

— Ваша мосць князю, яшчэ панна Шарчынская, калі б захацела, магла б за яго пайсці, бо ёй даўно пара ўжо ісці да вянца,— сказаў Заблоцкі.— Але каб панна Асухоўская...

Усе пасмяяліся з такой, як нам здавалася, нісянеціцы; князь таксама кіўнуў галавой: «Нічога з таго не выйдзе... пане каханку...»

Тым часам Кшыскі прыехаў раз, другі, трэці і чацвёрты, і мы зразумелі, што ён захацеў ажаніцца, не чакаючы, пакуль скончыцца жалоба. А панна Асухоўская спачатку ні тое ні сёе, прымала яго толькі, каб пагаварыць, потым падабрэла, прывыкла, а можа, ён завабіў яе якімі салодкімі словамі, ці то былі ў яго нейкія свае чары, але яе згоды на шлюб дабіўся. Ваявода даведаўся пра тое і стаў змрочны. Аднойчы сустрэў ён Кшыскага і ўзяў яго на роспыты:

— Што ты сабе думаеш, пане каханку? Будзеш па адной забіраць з Нясвіжа паненак, пакуль не застанецца ніводнай? Як табе не сорамна? Яшчэ тую не аплакаў, а ўжо думаеш жаніцца зноў...

— Ваша мосць,— узмаліўся Кшыскі,— не буду хлусіць, бо вінаваты... але на знак памяці пра нябожчыцу, маю незабыўную дабрадзейку Зарыну, я шукаю новую жонку. Бо Караль наш змарнее без жаночай апекі... а дзе ж я магу яшчэ шукаць жонкі, як не пад крылом вашай княскай мосці, майго дабрадзея...

Тут ён расплакаўся, выцягнуў хусцінку і ўсё палка пераконваў князя, наракаў на лёс. Нарэшце той паціснуў плячыма і пакінуў яго ў спакоі.

І што ж вы, панове, думаеце? Асухоўская пайшла за яго, і ў Нясвіжы зноў спраўлялі вяселле, князь даў разам з паса-

гам свой *addytament* — дадатак... але з таго часу паводзіў сябе з Кшыскім асцярожна, унікаў яго, не загаворваў і не даў нешта яшчэ адхапіць. Не скажу, што спроб з ягонага боку не было. Прыязджала жонка і цэлымі тыднямі бавілася пры двары, прыязджаў і ён, ваявода ласкава прымаў абаіх, але на намёкі Кшыскага пра ягоныя клопаты адказваў маўчаннем і ў Тышова, хоць яго шмат разоў запрашалі, болей не ездзіў. Здавалася, што нашаму Кшыскаму ўжо ніколі не ўдасца пакарыстацца з Радзівілавай кішэні, але выйшла іначай, і зусім неспадзявана.

Прыбыткі з уладанняў у Радзівіла былі вялізныя, а крэдыт — непамерны, дык калі на Святога Яна прыходзілі кантракты, часта не ставала сродкаў на ўсё; тады пазычалі, бралі дзе толькі можна, з розных рук. Неяк у сярэдзіне года, калі ў шляхты не было асаблівых прыбыткаў, князю спатрэбілася пяць тысяч дукатаў для нейкай справы, якая пагражала вялікімі стратамі. Грошы шукалі з асцярогай, каб не пачалі языкамі перакладаць... і хоць мала хто ведаў пра тое, але аднойчы Кшыскі прыехаў у Нясвіж і папрасіў пагаварыць з князем сам-насам. Пазней князь расказаў мне, як гэта было. Прыняў ён Кшыскага холадна, бо асцерагаўся яго, нават баяўся сустракацца. Кшыскі ўкленчыў перад князем і пачаў гаварыць пра сваю бясконцую ўдзячнасць за яго дабрадзейства.

— Хай жа будзе мне дазволена, як мізэрнаму чарвяку, хоць раз мець шчасце нечым аддзячыць вам, каб паказаць належным парадкам, як я вам удзячны,— папрасіў Кшыскі пад канец размовы.— Я ведаю, што ваша мосць шукае пяць тысяч дукатаў, я прывёз шэсць і кладу іх да вашых ног...

Спачатку князь адпіраўся, не хацеў браць... потым, бо ўсё ж была вялікая патрэба, узяў і загадаў выдаць распіску. Кшыскі адгаварыў яго ад гэтага і напрасіўся сам выгадна ўладзіць справы з заступнікам князя, але з дамовай усё цягнуў, адразу не ўклаў яе, сказаў, што прыедзе пазней... Грошы тым часам разышліся. Праз пару тыдняў, калі іх ужо не было, Кшыскі прыехаў на камісію. Яму зноў прапанавалі распіску, ён адмовіўся. Тут і выйшла шыла з мяшка. Ён папрасіў які-колечы заклад... быццам бы так, абы

адбыць... Спачатку князь хацеў вярнуць яму тыя грошы. Але якраз іх у касе і не было. Дый заклад заўсёды можна было выкупіць. Ну, князь і даў яму ў заклад пару вёсачак пад Мірам; кантракт склалі Кшыскі і Качура, ды так добра, гэтулькі кручкоў там розных паўстаўлялі, што вёскі так і засталіся ў Кшыскага. Прынамсі, я не чуў пра спробы выкупіць іх, але пра тое, што Кшыскі не аддае іх і дагэтуль, добра ведаю; вось так ён яшчэ раз пашырыў свае ўладанні.

Помню, як князь пасля ўсіх гэтых прыгод неяк жартам сказаў пра яго:

— Малюся, пане каханку, каб Бог даў здароўе пані Кшыскай: калі ненарокам памрэ, то ён прыедзе да мяне па трэцюю жонку, а з ёй ужо забярэ і ўвесь Нясвіж...

1872

Тлумачальныя заўвагі

[1] *Ардынацыя* (лац.) — упарадкаванне — непадзельная і неадчужальная ўласнасць пэўнага магнацкага роду. Тут — уладанні Радзівілаў.

[2] *Пасэсар* — арандатар.

[3] *Рэгімент* (пол.) — полк.

[4] *Экзэрцыцыі* — вайсковыя практыкаванні.

[5] *Мар'яж* — гульня ў карты.

[6] *Квестар* (пол.) — загадчык фінансавага аддзела ў вышэйшай навучальнай установе.

[7] *Бусел* — старадаўняя мера вадкасці. Тут — бутэлька, якая змяшчала чвэрць літра.

[8] *Валашскі* — італьянскі.

[9] *Мальвазія* — гатунак белага віна.

[10] *Асіндзей, асінжка* — старадаўні польскі ветлівы зварот.

[11] *Дайвэльдрэк* (ням.) — тут ужыта ў значэнні — атрута.

[12] *Фабрыка* — тут маецца на ўвазе шкляная мануфактура ў Налібоках, закладзеная ў 1712 г. Ганнай Кацярынай Радзівіл, жонкай Караля Станіслава Радзівіла.

[13] *Крайчы* — прыдворная пасада.

[14] *Цэлібат* — абавязковы для каталіцкага духавенства аброк, абяцанне, не ўступаць у шлюб.

[15] *Афект* — пачуццё, жарсць; лацінскае слова, якое ўжывалася ў старабеларускай мове.

[16] *Княжна Тараканава* — Лізавета Тараканава (1745—1775), авантурыстка, якая выдавала сябе за дачку рускай імператрыцы, абвясціла сябе прэтэндэнткай на рускі трон. Была знаёмая з Радзівілам Пане Каханку, бывала ў Нясвіжы.

[17] *Мезальянс* — шлюб з асобай ніжэйшага сацыяльнага паходжання.

[18] *Асамблея* — баль у палацах вяльможаў, магнатаў.

[19] *Касандра* — жрыца-прарочыца ў Старажытнай Грэцыі.

ЭЛІЗА АЖЭШКА
(1841—1910)

Выдатная польская пісьменніца Эліза Ажэшка нарадзілася і амаль усё сваё жыццё пражыла на беларускай зямлі. Месца яе нараджэння — маёнтак Мількаўшчына Гродзенскага раёна. Выхоўвалася ў манастырскім пансіёне ў Варшаве (1852—1857). У час паўстання 1863—1864 гг. была сувязной атрада Р. Траўгута, што дзейнічаў на Брэстчыне, збірала і перадавала паўстанцам лекі і харчы. З 1870 г. і да апошніх дзён свайго жыцця Э. Ажэшка жыла ў Гродне, дзе і пахавана. У яе былым доме цяпер знаходзіцца літаратурна-мемарыяльны музей. Адна з галоўных вуліц горада носіць яе імя. На гэтай жа вуліцы стаіць помнік пісьменніцы.

Дэмакратычны характар светабачання Ажэшкі раскрыўся ў першым яе творы — апавяданні «Малюнак з галодных гадоў» (1866). Не толькі таленту, але і працавітасці пісьменніцы могуць пазайздросціць многія аўтары. За сваё творчае жыццё яна напісала звыш 30 раманаў і аповесцей. Збор яе твораў налічвае 52 тамы. Пісьменніца рэалістычна падавала праўду жыцця на сацыяльным і побытавым узроўнях, пісала пра разарэнне шляхты, маральны ўпадак арыстакратыі, абараняла абяздоленых людзей горада і вёскі. Вялікую цікавасць выклікалі яе творы, прысвечаныя тэме жаночай эмансіпацыі. Эліза Ажэшка сродкамі пісьменніка — мастацкім словам — актыўна выступіла ў абарону грамадзянскіх і чалавечых правоў жанчыны. Сусветнае прызнанне Ажэшка атрымала напрыканцы XIX ст., калі з асаблівым майстэрствам раскрыла праблемы жыцця не толькі палякаў, але і беларусаў, яўрэяў. Не дзіва, што знакаміты ўкраінскі пісьменнік Іван Франко, які называў Ажэшку «зоркай першай велічыні на небасхіле сучаснай польскай літаратуры», выяўляў жаданне перакласці на ўкраінскую мову «такія дасканалыя і напісаныя з такой душэўнай цеплынёй творы... з жыцця беларускага народа».

Беларускія матывы (падзеі, вобразы, пейзажныя малюнкі) прысутнічаюць у многіх творах пісьменніцы, у тым ліку ў аповесцях «Нізіны» (1884), «Дзюрдзі» (1885), «Хам» (1888), рамане «Над Нёманам» (1887), шэрагу апавяданняў («Рэха», «Раманіха», Зімовым вечарам», «Тадэвуш» і інш.). Беларускі фальклор,

сялянскі побыт, беларуская флора апісаны ў нарысах пісьменніцы «Людзі і кветкі на берагах Нёмана» (1888—1891). Скажам, у апавяданні «Зімовым вечарам» усе дзейныя асобы твора — вясковыя беларусы. Аўтарскія адносіны да герояў вызначаюцца сапраўднай сімпатыяй, гэта выяўляецца праз усе сродкі стварэння вобразаў, у тым ліку і праз партрэтныя апісанні. Як галоўныя, так і другарадныя героі твора — госць, гаспадар хаты, іншыя члены яго сям'і — выпісаны з глыбокім раскрыццём іх псіхалогіі. Гуманістычная аснова ідэі твора, глыбокія карані народнай маралі раскрываюцца дзякуючы звароту да біблейскай сімволікі і да беларускага фальклору. Тое, што ў польскім тэксце апавядання «Зімовым вечарам», як і ў іншых творах з беларускай тэматыкай, Ажэшка ўжывае беларускую лексіку (яна ў беларускіх перакладах звычайна пазначаецца курсівам), што асобныя народныя песні падаюцца ў беларускамоўным варыянце, таксама сведчыць пра глыбокую павагу пісьменніцы да беларускага народа.

Многія гады творчай дружбы звязвалі Элізу Ажэшку з Францішкам Багушэвічам, фалькларыстам і этнографам Янам Карловічам, знакамітым славяназнаўцам з Ракава Мар'янам Здзяхоўскім і іншымі вядомымі пісьменнікамі і вучонымі, народжанымі на беларускай зямлі. Пісьменніца ўсяляк садзейнічала развіццю беларускай нацыянальнай культуры і літаратуры, у прыватнасці, заахвочвала Ф. Багушэвіча да напісання твораў на роднай мове. У сваю чаргу ўдзячны аўтар «Дудкі беларускай» прысвяціў ёй — «Каралеве жывога слова і пакутлівай Праўды» (словы Багушэвіча) — прачулы верш «Яснавяльможнай пані Арэшчысе» (1891) у сувязі з 25-годдзем яе літаратурнай дзейнасці.

З творамі Ажэшкі беларусы знаёміліся і знаёмяцца як у арыгінале, так і ў перакладах (Янкі Брыля, Ядвігі Бяганскай, Анатоля Бутэвіча і інш.). Апавяданне «Зімовым вечарам» (пад назвай «У зімовы вечар»), аповесць «Хам» яшчэ ў дарэвалюцыйны час былі інсцэніраваныя і неаднойчы ставіліся рознымі беларускімі тэатральнымі калектывамі, у тым ліку Першай беларускай трупай Ігната Буйніцкага (1910—1912), Беларускім вандроўным тэатрам Уладзіслава Галубка (1923) і інш. Спектаклем «У зімовы вечар» распачаў сваю працу ў Мінску ў 1920 г. Беларускі дзяржаўны тэатр (сёння — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). На творах Ажэшкі адточвалі акцёрскае майстэрства сам Ігнат Буйніцкі, славутая Паўліна Мядзёлка, іншыя вядомыя беларускія акцёры.

Пераклады твораў Элізы Ажэшкі перадрукоўваюцца з наступных выданняў:

Ажэшка Эліза. Аповесці, апавяданні, нарысы. Мінск: Бел. кнігазбор, 2000 (пераклалі: апавяданне «Зімовым вечарам» — Янка Брыль, аповесць «Хам» — Ядвіга Бяганская).

Ажэшка Эліза. Выбранае: Апавяданні і аповесць. Мінск: Маст. літ., 1975 (пераклад апавядання «Раманіха» Янкі Брыля).

Хам

Аповесць

(Скарочана)

I

Было яму за сорак. Аб гэтым сведчылі маршчыны, што тонкімі лініямі праразалі яго высокі лоб, які здаваўся яшчэ вышэйшым ад таго, што цёмныя, прыцярушаныя на скронях сівізной валасы ўжо значна парадзелі. Аднак, нягледзячы на гэтыя маршчыны і першую сівізну, выглядаў ён бадзёрым і дужым. Ён быў рыбак і цэлыя дні, а часам і частку ночы праводзіў на рацэ. Сонца, вятры і вільготны подых ракі цёмным і здаровым загарам пакрылі яго прадаўгаваты, худы твар, асветлены крыху нерухомым і паважным позіркам блакітных вачэй. Павага гэта і роздум адчуваліся ў рухах яго высокай, зграбнай і дужай постаці.

Калі было яму гадоў васемнаццаць, бацька ажаніў яго з дзяўчынай [redacted] суседняй вёскі, бо ў хаце патрэбна была гаспадыня. [redacted] гэтай сваёй лагоднай і працавітай, праўда, дурнаватай і непрыгожай жонкай жыў ён спакойна, але нядоўга, бо праз некалькі гадоў яна памерла, не пакінуўшы яму дзетак. Неўзабаве памёр і яго стары бацька, а калі адзіную сваю сястру, маладзейшую за яго на дванаццаць гадоў, ён выдаў замуж, дык застаўся зусім адзін у сваёй хаце, якая стаяла ў канцы невялікай вёскі ля сасновага бору на высокім беразе Нёмана. Не было ў яго ні валоў, ні коней, ды і зямлі амаль не было, а таму і памочнікаў для сваёй гаспадаркі ён не шукаў. [...]

Яго вабілі неаглядны шлях ракі, яе блакітная цішыня ў пагодлівы час і напеўны шум у час непагадзі, ружовы

ўсход сонца над ёю і фарбы захаду, што адбіваліся ў вадзе. Ён любіў чыстае паветра, хоць бы нават спякотнае або марознае, адкрытае неба, хоць бы нават пахмурнае і сумнае. У дзяцінстве ён стругаў чаўны, рабіў вуды, а калі падрос, стаў рыбаком. [...] У карчму ніколі цяпер не заглядваў і з людзьмі наогул вадзіўся рэдка, апрача сястры і швагра, у якіх зімой, калі рака замярзала, моўчкі сядзеў пад сцяной. Нельга сказаць, каб ён не любіў людзей, бо не толькі нікому зла не рабіў і сваркі ні з кім не заводзіў, але, наадварот, таму-сяму па гаспадарцы дапамагаў, дробную рыбу прыносіў, а кожнаму, хто да яго звяртаўся, адказваў ветліва і ахвотна. Але ён не шукаў людзей, хутчэй нават унікаў іх, нібы ў доўгіх вандроўках па рацэ прызвычаіўся да маўчання. [...] Круг яго думак быў, напэўна, даволі абмежаваны, але, відаць, глыбокі, бо чалавек гэты, здавалася, цалкам патанаў у ім і адчуваў сябе тады найлепш.

У вёсцы яго лічылі дзіваком, але сумленным і спакойным чалавекам. Калі ён замалада аўдавеў, яму раілі ажаніцца нанова, сваталі дзяўчат. Але, зірнуўшы раз-другі на дзяўчыну, якую яму прапаноўвалі, ён адмоўна ківаў галавой і, махнуўшы рукой, хутчэй ішоў на раку. Куме Аўдоцці, якая вельмі любіла яго і была заўзятай сваццяй, на пытанне, чаму ён не хоча жаніцца, ён, паціскаючы плячыма, адказваў:

— Навошта? Неба — мая хата, а рака — жонка. Кожны жыве па-свойму, а калі граху няма, дык усякае жыццё добрае.

І, усміхаючыся, дадаваў:

— Можа, прынесці вам, кума, печкуроў на вячэру?

І ішоў на раку.

Ніякія спакусы ні да кампаній, ні да жаніцьбы схіліць яго не маглі. Не паддаваўся ён ні ўгаворам, ні чужым уплывам, меў, відаць, моцную волю.

Месяцы праз два пасля таго, як яму ў дзень Пятра і Паўла споўнілася сорак два гады, плыў ён неяк раніцай на досвітку ў тое месца, дзе напярэдадні пакінуў шнур пад вадой з прыладай для рыбы. І раптам з берага пачуўся прарэзлівы жаночы крык:

— Езус! Марыя! Ратуйце!

Раніца толькі займалася. Над цёмным борам працягнуўся яркі шлях золку, акаймаваны золатам узыходзячага сонца, ад якога на паверхню вады, усхваляваную ранішнім ветрыкам, падалі пунсовыя водбліскі. Пачуўшы крык, рыбак азірнуўся і спачатку ўбачыў нешта блакітнае, што плыло побач з яго чоўнам, а пасля жанчыну, якая стаяла непадалёк ад берага ў вадзе і працягвала рукі ці то да гэтай рэчы, што сплывала па вадзе, ці то да яго. На фоне зялёнай гары, ля вяршыні якой у засені дрэў стаяла белая прыгожая дача, яе шчуплая і зграбная, напаўраздзетая жаноцкая постаць з жаласна працягнутымі рукамі выглядала ў ружовым святле раніцы як дасканала вытачаная статуэтка. [...] Чорныя валасы бязладна развяваліся над яе прыгожай галавой і густымі, кароткімі, крутымі струменямі ападалі на плечы. Нават здалёк было відаць, як блішчаць на смуглявым твары яе чорныя прамяністыя вочы і плывуць з іх слёзы. Заўважыўшы, што рыбак павярнуўся і глядзіць у яе бок, яна закрычала:

— Злітуйцеся, чалавеча, злавіце гэтую шмату і падайце мне! Богам прашу, злавіце... Ратуйце мяне!

Вясёлая ўсмешка, якая так рэдка з'яўлялася пад цёмнымі вусамі, расцягнула вусны рыбака і ўжо не знікала з іх. [...] Рыбак толькі пару разоў мацней ударыў вяслом па вадзе, працягнуў руку і лёгка схапіў сукенку. Цела яго, натрэніраванае грэбляй, загартаванае жыццём на паветры, захавала юначую зграбнасць і гнуткасць. Здалёк жа, у сваёй шэрай кароткай світцы, высокіх ботах і шыракаполым капелюшы, ён выглядаў зусім маладым.

Усё з тою самай прыязна-жартаўлівай усмешкай ён падплыў да жанчыны, якая стаяла ў вадзе, і падаў ёй мокрую блакітную шматку. А яна, апусціўшы рукі, ужо гучна смяялася, бліскаючы белымі зубамі і ўтаропіўшыся ў яго чорнымі палаючымі вачыма. Толькі цяпер ён заўважыў, што ў празрыстай вадзе ля яе голых, пазалочаных сонцам ног ляжаў стос мокрых адзежын. Ён глядзеў на жанчыну і дзівіўся, як гэта яна магла так хутка перайсці ад плачу і ляманту да вясёлага залівістага смеху. [...]

— Ну, бярыце ўжо сваю шмату, мне трэба плыць. І чаго было так лямантаваць? Можна было падумаць, што з вамі

здарылася бог ведае якое няшчасце ці хто, барані божа, утапіўся.

— Ого! Чаму лямантавала?! — усклікнула яна і злосна і гарэзліва адначасова.— Была б я бедная, калі б гэта шматка, барані божа, загінула. Ужо тры дні гаспадыня не дае мне спакою з мыццём дзіцячых рэчаў. Учора ўвечары я іх памыла, а сёння ранічкай устала, каб выпаласкаць іх у рацэ. Аж тут раптам адна з іх узяла і паплыла.

Седзячы на вузкай лаве ў чоўне, ён слухаў яе хуткую, жывую гаворку, у якой словам, здавалася, было цесна і яны абганялі адно другое. Рыбак не глядзеў на дзяўчыну, але слухаў з цікавасцю яе высокі і крыху рэзкі голас.

— А хто вы такая?

— Я?

Яна паказала рукой на гару, дзе бялела дача.

— Я служу пакаёўкай у тых паноў, якія прыехалі сюды на лета... Узялі мяне зімой, і да канца лета пабуду яшчэ ў іх... А ўвосень, як вернемся ў горад, пайду ад іх... Даўжэй як да восені не застануся...

— Чаму ж гэта? Хіба крыўдзяць ці лаюць цябе? — з усмешкай запытаў рыбак.

Яна выпрасталася, пачырванела, і вочы яе загарэліся.

— Ого! Хай бы толькі паспрабавалі! На лаянку ёсць адлаянка! Я сябе ў крыўду не дам! Я дзяўчына з добрай сям'і. Бацька мой у канцылярыі служыў. Хай толькі мяне хтонебудзь абразіць злым словам, дык я яму так адкажу, што дзесяць гадоў будзе помніць! А пасля хай мяне судзяць... Была я і ў судах! Не спалохаюся!

Ён паглядзеў на яе са здзіўленнем, амаль з жахам, але зноў адвёў позірк, бо гарачы румянец твару дзяўчыны і бляск яе чорных вачэй нібы апяклі яго жарам.

— Дык чаму ж тады вы збіраецеся ад іх ісці? — запытаў ён.

— Чаму? Ды проста так! Я нідзе доўга жыць не магу. Хай сабе будуць самыя найлепшыя гаспадары, а на адным месцы я заўсёды знуджуся і — бывайце! Шукайце тады ветру ў полі. Гэткі ўжо ў мяне характар. Аднак і я хачу ведаць, хто вы.

— Хто я такі? Цікава? Ды я чарвяк...

Ён задумліва ўсміхнуўся, а яна звонка зарагатала.

— Няма чаго смяяцца,— сказаў ён павольна.— Паміж чалавекам і чарвяком розніца малая. Чарвяка есць рыба, а чалавека зямля. Ці пан ты, ці мужык, ці кароль, ці парабак — кожнага зямля праглыне, як рыба чарвяка. Вось так!

Яна слухала яго з цікавасцю. А калі скончыў — заўважыла:

— Разумна гаворыце, але сумна. Што там думаць аб смерці, калі жыць часам так добра?!. Не заўсёды, але бывае... Ой, і добра! А чым жа вы займаецеся?

— Я рыбак.

— А дзе жывеце?

Ён назваў вёску, у якой жыў.

— Селянін? — вагаючыся, запытала яна.

Ён кіўнуў галавой.

— Вось дзіва! Колькі жыву на свеце, ніколі яшчэ так доўга не размаўляла з ніводным селянінам! А чаму ж вы гаворыце не па-мужыцку?

— А чаму ж мне не гаварыць таксама, як вы... калі я ўмею?

— Цікава, селянін, а такі ветлівы, разумны! А ведаеце, зблізку вы выглядаеце значна старэйшым, чым здалёк. Калі былі на сярэдзіне ракі, я думала, што гэта нейкі малады хлапец плыве, а цяпер бачу, што вам, мабыць, гадоў сорак будзе!

Яна дзівілася, рагатала, размахвала рукамі, то адной, то другой нагой боўтала ў вадзе, выкідаючы маленькія фантаны пырскаў, і ўсё мільгала перад ім залацістасцю свайго цела, чарнатой валасоў, бляскам вачэй, беллю зубоў.

— Але нічога,— дадала.— Хоць маеце сорак гадоў, а мужчына хоць куды!.. Прыгожы...

Гаварыла яна ўсё гэтак жа гучна, ані не бянтэжылася і не апускала вачэй. Яна нават ухапілася цёмнай гібкай рукой за нос чоўна і нібы хацела наблізіцца да яго, абы даўжэй затрымаць пры сабе. Ён таксама перастаў ужо сарамліва адводзіць ад яе вочы і глядзеў, не хаваючы захаплення. Яна зблізку выглядала таксама не такой ужо і маладой: твар яе з прыгожа акрэсленымі дробнымі рысамі ўжо трохі пры-

вяў, колер яго быў нездаровы, вялікія вочы глыбока запалі пад ілбом, над якім ніткі чорных валасоў крыжаваліся з некалькімі тонкімі, як валаскі, рыскамі маршчын. Мела, напэўна, гады трыццаць два, і, відаць, жыццё яе не было асыпана ружамі. Але, нягледзячы на гэта, была яна вельмі жвавая, імклівая, нагадвала сабой яркі прамень, і ў вачах яе, у рухах, усмешках і нават нездаровым колеры твару было нешта такое, што вабіла, цягнула да сябе. Асабліва здзіўляла ў ёй спалучэнне рыс на першы погляд вельмі супярэчлівых: нервовай напружанай сілы і хваравітай кволасці, нястрыманага вясёлага свавольства і нейкага глыбокага цярпення. Калі яна сціскала раптам свае малыя вусны і позірк яе рабіўся пануры, здавалася, што яе мучыць нейкі спазм болю ці злосці.

— І не сумна вам увесь час плаваць і лавіць рыбу? — запытала яна, абапіраючыся рукой аб нос чоўна.

— Чаму ж гэта сумна? Мне вельмі добра,— запярэчыў ён з усмешкай.

— Вазьміце калі-небудзь мяне на раку. Хоць на гадзінку-дзве! Мне ніколі не даводзілася так доўга плыць у лодцы... Каб вы ведалі, як мне тут сумна... Сумна!..

— А чаму сумна? Работы, мабыць, хапае?

— Работы хапае! У паноў нас толькі дзве — я ды кухарка, больш няма нікога: ні фурмана, ні лёкая не трымаюць. Пан стары, увесь час чытае кніжкі, а пані ад злосці, што пан стары, да ўсяго чапляецца, усё ёй нядобра, усё не так: то вельмі хутка, то вельмі марудна, то вельмі холадна, то вельмі горача... Дзяцей ажно трое, а гэткія невыносныя, барані божа! Гасцей амаль ніколі не бывае. Цалюткі дзень круцішся, як тая вавёрка ў коле, а добрага слова ніколі не пачуеш, людскога аблічча не ўгледзіш. Каб гэтую вёску д'яблы ўзялі! У горадзе куды лепш!

Ён слухаў уважліва, пасля паважна і павольна адказаў:

— Вёску няма чаго праклінаць! Добраму чалавеку скрозь добра, а дрэннаму — дрэнна!..

Яе твар загарэўся ўласцівым ёй крывавым, хутка знікаючым румянцам.

— Выходзіць, я дрэнная?

Аж затрэслася ўся і, плюнуўшы ў ваду, сказала да сябе:

— Вось хам!

Ён не пачуў, а можа, словы гэтыя яго зусім не абразілі, бо спакойна махнуў рукой:

— Адкуль жа мне ведаць, ці вы дрэнная, ці добрая? Я проста так сказаў... А калі мне па вас прыехаць?

У сціснутых вуснах яе і панурым позірку рыбак заўважыў той самы спазм болю ці злосці, які надаваў яе абліччу выраз глыбокай пакуты, і яму стала шкада яе. Апрача павагі і задуменнасці ў ясных яго вачах свяцілася часамі і глыбокае спачуванне да людзей.

— На свеце ўсе грызуць адзін аднаго, не дзіўна, што і вас нейкае ліха грызе... Хіба я ведаю якое? Калі хочаце, паважу вас крыху для весялосці па рацэ. Чаму не? Чоўна майго ад гэтага не ўбудзе! Дык калі па вас прыплыць?

— У нядзелю! Калі ласка, у нядзелю прыплывіце!.. Гаспадары мае з дзецьмі ў горад паедуць, а я адна дома буду, толькі з кухаркай... Ой, які ж вы добры чалавек!.. Хай Бог вам заплоціць! Вось пагуляю! Не спадзявалася, што ў гэтай пустэчы такога мілага чалавека сустрэну.

Яе пахвальба, відаць, цешыла яго, а можа, што іншае радавала,— толькі ўсміхаўся ён усё шырэй, нібы яе шумная весялосць, якая так хутка прыйшла пасля смутку і злосці, перарадзіла яго. [...]

Ступні яе, як рыбы, плюхнуліся ў вадзе, у два скокі яна апынулася на пясчаным беразе і, нахіліўшыся, пачала збіраць мокрую бялізну. А ён, злёгку заграбаючы вяслом, павольна адплываў. Ён адплыў ужо даволі далёка ад берага, калі пачуў раптам за сабой вокліч:

— Пачакайце! Гэй, пачакайце!

Ён азірнуўся і спыніў човен, які загойдаўся на хвалі. Уся ў ззянні сонца, дыск якога ўжо высока яснеў над гарызонтам, стаяла яна, яшчэ больш раскалмачаная, са стосам мокрай бялізны, і крычала:

— А як ваша імя? Як завуць вас?

— Павел Кабыцкі! — адгукнуўся.

— А я Францішка Хамцуўна! — усклікнула яна і пабегла пароснай траве на гару.

На сярэдзіне гары спынілася, кінула позірк на далёкі човен, і з яе бледных прывялых вуснаў бліснулі белыя зубы.

— Прыгожы хам! Хоць не такі ўжо малады, але прыгожы і нейкі мілы... мілы...

Апусціўшы галаву, яна задумалася, перабіраючы пальцамі мокрую бялізну.

У нядзелю Франка ні на хвіліну не адыходзіла ад акна кухні, з якога быў відаць Нёман. За гэтыя чатыры дні яна яшчэ больш схуднела і павекі яе пацямнелі. [...] Раптам яна ўскочыла з лаўкі і, усклікнуўшы: «Едзе! Далібог, едзе!» — як звар'яцелая кінулася з дома. Птушкай зляцела яна з зялёнай гары ўніз на пясчаны бераг Нёмана і, пачырванеўшы, замахала рукамі насустрач чоўну:

— Добры вечар! Добры вечар! А чаму так позна? Я ўжо думала, што вы ашукаеце, не стрымаеце свайго слова, не прыедзеце! Хіба гэта прыгожа, каб я вас так доўга чакала? Чаму так позна?

Відаць было, што за чалавекам, які ёй спадабаўся, за новымі ўражаннямі і забавамі жанчына гэта гатова была паляцець хоць на край свету, што адсутнасць іх магла давесці яе да вар'яцтва.

Паплылі. Спачатку Франка вельмі баялася вады, з якой ніяк яшчэ не звыклася. За кожным пакалыхваннем чоўна яна вішчала і хапала Паўла за рукі і світку. Гэта яго вельмі смяшыла. Ён ніколі не думаў, што нехта можа так баяцца вады. Пры гэтым Франка выгіналася ўсім сваім целам і ўзмахвала рукамі, нагадваючы то спалоханую кошку, то дзіця.

Павел, каб яе супакоіць, засмяяўся так гучна і сардэчна, як смяяўся, мабыць, усяго некалькі разоў у жыцці. Нарэшце Франка і сама пераканалася ў тым, што човен толькі калышацца, але і не думае перакульвацца, і, супакоіўшыся, пачала сваволіць. Вада была ціхая, блакітная, злёгку пазалочаная сонцам, якое хілілася да захаду, пакрытая мноствам дробных маршчын, што плылі адна за адной, аднастайна, без шэлесту, рассыпаючы кроплі-перлы, успыхваючы часам дробнымі агеньчыкамі. Нахіліўшыся, Франка лавіла сваёй малой загарэлай далонню гэтыя перлы і агеньчыкі, а пасля з цікаўнасцю і асалодай прыглядалася да струменяў расплаўленага крышталю, які сцякаў з яе пальцаў.

— Ой, каб нанізаць іх ды зрабіць пацеркі на шыю і завушніцы! — усклікнула Франка.— Кажуць, што з крышталю яны вельмі дарагія. А мне яны так падабаліся, так падабаліся, што вытрымаць не магла. Бывала, як толькі гаспадыня выходзіла з дому, а мяне куды-небудзь запрашалі, заўсёды іх надзявала...

— Гэта нядобра,— заўважыў Павел.

— Вось яшчэ! Я ж не ўкрала іх... Як прыйду дадому, адразу здыму, пакладу на месца, і ніхто не заўважыць, што брала...

— Чужога нельга чапаць, Бог гэта забараняе. Я саромеўся б чужую рэч узяць.

Франка гарэзліва зірнула на яго, набрала поўныя прыгаршчы вады, лінула яму ў твар і засмяялася:

— Ой, ой, які строгі!

Павел ніяк не мог у прысутнасці гэтай дзяўчыны захаваць свае звычайныя паважнасць і сур'ёзнасць. Абціраючы рукавом світкі твар, ён засмяяўся зноў:

— Дзіця, дый годзе! Ой, каб вас! Мяне аж дзіва бярэ, што такія, як вы, бываюць на свеце. [...]

Франка нахілілася да вады, сарвала жоўтую кветку і прымацавала да сукенкі.

— Пахне! — заўважыла яна радасна і раптам, паказаўшы пальцам на раку, усклікнула: — Ай, што там?

Быў гэта, напэўна, вялікі шчупак, а можа, і сом, які на момант выскачыў з вады і адразу схаваўся пад ёю, пакідаючы на паверхні шырокія кругі.

— Ага! Ты тут? — усміхнуўся Павел, пазіраючы на кругі.— Хутка скончыцца тваё панаванне. Заўтра злаўлю цябе!

Пасля ён паказаў Францы скрыню, напалову апушчаную ў ваду, у якой захоўваў дробную рыбу для прынады. У сценках скрыні былі зроблены дзіркі, праз якія наплывала вада. Другая скрыня, значна большая, для захоўвання ўлову, прызначанага на продаж, была непадалёк ад яго хаты. Франка з цікавасцю пачала распытваць Паўла, дзе ён прадае сваю рыбу і які з яе мае заробак, а калі Павел ахвотна, са сваім звычайным спакоем расказаў ёй усё, аб чым яна хацела ведаць, яна сцяла вусны і панура пакруціла галавой.

— Добра вам жывецца,— уздыхнула яна.— Хату ўласную маеце і заробак неблагі... можаце жыць, як той пан!.. Гэта зусім не тое, што ўсё жыццё па чужых кутах аціраецца, зносіць капрызы і злосць гаспадароў... Бывае, вядома, што часам і павесялішся, і парадуешся, але гэта ўсё роўна не жыццё... Хай бы яго д'яблы ўзялі, гэткае жыццё.

— *Валачашчае* жыццё, паганае! — пазіраючы на Франку і спачувальна ківаючы галавой, прамовіў Павел.

Яму зрабілася шкада Франку.

— Можа, хочаце выйсці на бераг і пахадзіць па гэтым востраве? — запытаў ён.

Франка радасна ўсклікнула:

— Ой, добра, добра! Плывіце да таго вострава. Які прыгожы востраў, як цудоўна тут пахне! Што гэта так пахне? Нават галава кружыцца... [...]

Франка, як ашалелая, як п'яная, бегала па востраве, зрывала гваздзікі, нюхала іх, уторквала ў валасы, з якіх даўно ссунулася на шыю жоўтая хусцінка, са звонкім смехам поўнымі жменямі кідала кветкі на Паўла. А ён, нахіліўшыся, паволі збіраў і старанна складаў іх у букет. Неаднойчы з гэтага вострава прыносіў ён такія белыя букеты і стаўляў у малым гладышку на акне сваёй хаты ці аддаваў сястры, якая прыбірала імі святыя абразы. Нацешыўшыся гваздзікамі, Франка знікла ў гушчары дзіванны. У адным месцы расло яе столькі, што Франкі зусім не было відаць, толькі мільгала сярод зялёна-жоўтага зарасніку яе светлая сукенка.

Павел перастаў ірваць гваздзікі, задумаўся аб нечым. Франка, нібы птушка, шалясцела ў гушчары, час ад часу высоўвала адтуль галаву, і пранізлівы голас яе звінеў не сціхаючы. [...]

— Як тут добра, прыгожа, весела,— усклікнула Франка.— Які ж вы добры чалавек, што беднай і незнаёмай дзяўчыне зрабілі столькі прыемнага. Я заўсёды вельмі ўдзячна таму, хто зробіць мне што-небудзь добрае. Такі ўжо ў мяне характар.

І раптам з гэтым павольным і паважным чалавекам сталася нешта дзіўнае. Чырвань заліла яму не толькі шчокі, але і лоб, блакітныя і заўсёды спакойныя вочы пацямнелі,

успыхнулі нейкім панурым бляскам. Ён абхапіў дужай рукой тонкі стан Франкі, прыціснуў да сябе, схіліўся над ёю і наблізіў свае вусны да вуснаў дзяўчыны, але яна спрытна выслізнула з яго абдымкаў і, адскочыўшы, зноў спынілася каля дзіванны. Прыкрыўшы далонню вочы, яна са смехам ускрікнула:

— Бач, які! Здаецца, добры, ветлівы, а такі самы, як усе. У чоўне павазіў і адразу платы хоча!

Словы гэтыя, відаць, балюча ўкалолі Паўла, бо ён адразу апамятаўся, пацёр рукой скроні і прашаптаў:

— Вось табе на! Яшчэ што прыдумала!

Узяўшы яе за руку, Павел збянтэжана сказаў:

— Глупства! Хіба я думаў што благое? Барані божа, каб [redacted] вас з такой грэшнай думкай на раку павёз. Вось так, найшло на мяне нешта. Не гневайцеся і не бойцеся. Сядайце і адпачывайце, а я тым часам човен сюды прыганю і дадому вас давязу.

Франка села на гваздзікі і абедзвюма рукамі з усёй сілы ўхапілася за крысо яго світкі.

— Я не хачу дадому! — ускрікнула яна.— Які гэта дом? Пекла, а не дом! Не адыходзьце ад мяне! Калі ласка, не адыходзьце! Я з вамі ні на хвілінку б не разлучалася! Я за вамі ў ваду скочыла б. Сядзьце каля мяне! Сядзьце!

Ад здзіўлення і збянтэжанасці Павел нават рот разявіў, аднак, крануты яе словамі, сеў побач з ёю.

— Бліжэй,— папрасіла яна,— бліжэй сядзьце, вось так.

Франка цягнула да сябе Паўла датуль, пакуль плячо яго не дакранулася да яе пляча. Пасля яна прыціхла і пачала глядзець на раку, якая каціла паўз пясчаны бераг ля самых іх ног свае шэрыя, нібы сталёвыя, хвалі. Надыходзіў змрок, неба пабляднела, і толькі светлыя аблокі, што плылі ў вышыні, паблісквалі срэбрам у шэрай яе глыбіні.

— А вада ўсё плыве... плыве... плыве,— прашаптала летуценна Франка.

— Скажыце мне... — задуменна пачаў Павел і раптам змоўк, перабіраючы пальцамі гваздзікі.

— Што сказаць? — запытала Франка.

— Скажыце мне, хто вы такая, як жылі. Ну, што вы пра тую плату...

Ён вырваў раптам з пяску цэлую жменю кветак і з нечаканай для яго імклівасцю зашаптаў:

— Ой, каб цябе! Язык у горле калом устаў! Сорам, дый годзе!

Франка выпрасталася і жыва загаварыла:

— Калі хочаце, я ўсё вам пра сябе раскажу: хто я і якая. Калі добры чалавек просіць, чаму ж не расказаць? Чаго-чаго, а роду свайго мне саромецца няма чаго. У дзядулі майго былі два ўласныя дамы, бацька служыў у канцылярыі, яшчэ маю заможнага стрыечнага брата. Ён адвакат у адным вялікім горадзе. Ключкевіч прозвішча яго. Жонку таксама з заможнага дому ўзяў і жыве як пан. Вось ▪ якога я роду! З-пад сарочынага хваста не выскачыла! А што служыць пайшла, дык такая ўжо няшчасная мая доля... Бацькоў мне Бог даў шэльмаў.

— Пра бацькоў грэх так казаць! — спалохана спыніў яе Павел.

— Вось яшчэ! — злосна кінула Франка.— У вас усё грэх. А ў мяне што праўда, тое праўда. Я ніколі не хлусіла. Вось паслухайце ды скажыце, праўда гэта ці не.

Яна села выгадней на сваім квяцістым сядзенні, выцягнула ногі так, што ступні яе ў прунэлевых чаравіках павіслі над самай вадой. Гаворка яе была жывая, перамяжоўвалася то смехам, то ўздыхамі і плыла няспынна, як гэта вада.

Дзед яе, ангродскі[1] мешчанін, меў два ўласныя дамы — напэўна, маленькія, бо назвала вуліцу, на якой стаяць толькі драўляныя халупы,— і яшчэ пры жыцці аддаў сына служыць у канцылярыю. У гэтай канцылярыі бацька Франкі, відаць, займаў самую сціплую пасаду і атрымліваў маленькую зарплату. Ён часта хадзіў у дзіравых чаравіках, бо ў дадатак да ўсяго быў яшчэ п'яніца. Піць пачаў яшчэ ў маладосці, трапіў, відаць, у дрэнную кампанію, а з часам і зусім распіўся. Маці, паводле слоў Франкі, была з добрага роду Ключкевічаў, нават на фартэпіяна ўмела граць. Калі мела яшчэ фартэпіяна, дык як пачне, бывала, граць польку ці мазурку, дык на суседніх вуліцах было чутно. Прыгожая была, любіла добра апранацца і мела шмат кавалераў. У доме іх бывала вельмі весела! Калі бацькі не было, да маці

[1] Ангродам Э. Ажэшка называла ў сваіх творах Гродна.

прыходзілі госці, гралі, спявалі, танцавалі. Але вяртаўся бацька і, п'яны або нават цвярозы, разганяў гасцей, а маці лаяў і біў. Спачатку толькі лаяў, а пасля і біў. Франца было якіх шэсць гадоў, калі яна ўпершыню ўбачыла, як маці цалавалася з кавалерам, і восем, калі маці ўцякла ад мужа да сваякоў. Тады Франка і два старэйшыя браты пачалі жыць, як тыя вераб'і, якія задавольваюцца толькі тым, што дзе-небудзь знойдуць зерне-другое, а саграюцца, калі пад страху якую пашанцуе зашыцца. Шкадавалі іх людзі, то той, то другі накорміць, на нейкі час дасць прытулак. Хлопцам было лепш. Адзін з іх падрос і ў войска пайшоў, а другі стаў мулярам, хоць мулярства, вядома, не адпавядала яго паходжанню, але што рабіць? Беднасць. Нядоўга і пажыў ён. Бледны быў, худы, як чарвяк. Аднойчы, відаць, закруцілася ў яго галава на рыштаванні, упаў ён на брук, скалечыўся, і хоць спачатку яго быццам вылечылі, а неўзабаве ўсё ж памёр.

Пра старэйшага, салдата, даўно ніякіх чутак ужо не было. Хлопцы як хлопцы, ім лепш на свеце, але яна сапраўднае пекла пазнала і з бацькам, і з тымі дурнямі, якія ёй, дванаццацігадовай дзяўчынцы, давалі піражныя, арэхі, каб дазваляла сябе цалаваць. Казалі, што яна прыгожая, і гэта ёй падабалася, але самі яны не падабаліся ёй. Яна вельмі баялася іх, не хацела ні тых піражных, ні арэхаў, хавалася ад іх. Аднак хавацца было цяжка, бо яна часта выходзіла на вуліцу, то з дзецьмі гуляла, то да добрых людзей хадзіла за кавалкам хлеба або за паленцам дроў. Дамы бацька даўно ўжо прадаў і разам з маці грошы прагуляў. А маці праз некалькі гадоў зноў да мужа вярнулася, бо дзядзька Ключкевіч тады памёр, а дзеці яго параз'язджаліся па свеце. Адзін сын яго ў вялікім горадзе жыве, адвакат і багаты, такі багаты! Дык вось, маці да мужа вярнулася. Але бацька тады ўжо ў канцылярыі не служыў, спіўся дарэшты, звар'яцеў, паўгода ў шпіталі прабыў і памёр. Маці яшчэ гады тры пажыла. Рукадзеллем займалася, бялізну шыла, з гэтага і жылі. Аб кавалерах тады ўжо і не думала, па цэлых начах кашляла і плакала, Франку пры сабе трымала, чытаць і шыць вучыла, а перад самай смерцю знайшла для яе месца пакаёўкі ў адной пані і, прывёўшы яе туды, на каленях прасіла, каб тая ўзяла сірату пад сваю апеку.

— Няшчасная! — заўважыў Павел.

— Ага! — з зацятай нянавісцю ўсхліпнула Франка.— А грошы тыя, што за дамы ўзялі, разам з бацькам прагуляла, нас жа, дзяцей, як тых шчанят, кінула ды да сваякоў уцякла! Што з таго, што яна пазней, перад смерцю, дрыжала нада мной, як курыца над кураняткам? Я ёй ніколі не дарую таго, што яна раней на пагібель маю рабіла! Што з таго, што яна апамяталася толькі тады, калі ад яе скура ды косці засталіся і ніхто глянуць на яе не хацеў? Ды і тады, хай бы толькі нехта пальцам ёй кіўнуў, пабегла б зноў і на мяне забылася. Ого, як бы яшчэ пабегла! Я яе ведала! Толькі таму, што Бог і людзі яе пакінулі, яна за мяне ўхапілася... А раней што было? *Каб гэткіх* матак свет не ведаў!

— Гэта праўда! *Каб гэткіх* матак свет не ведаў! — горача падтрымаў Павел.

Першая яе гаспадыня была добрая, абыходзілася з ёю лагодна, навучыла яе вязаць, мыць карункі, але гаспадар пачаў да Франкі заляцацца, і хоць спачатку яна, баючыся і саромеючыся, выкруцілася ад яго, урэшце, аднак, ён свайго дамогся. Падабаўся ёй вельмі. Быў гэта першы мужчына, у якога яна шалёна закахалася, першы яе палюбоўнік, бо тыя, ранейшыя, піражныя і арэхі давалі ёй толькі за пацалункі. А калі пані, даведаўшыся пра ўсё, адправіла яе з дому, ён даў ёй пяцьдзесят рублёў, якія яна за месяц пражыла, бо, плачучы па ім, нічога не рабіла, а, каб пацешыць сябе, праводзіла час у вясёлых кампаніях. Пасля знайшла месца ў іншым доме — і пайшло! Нельга і пералічыць усіх тых месцаў, якія дагэтуль змяніла.

Найдаўжэй — цэлы год — служыла яна на адным месцы, ды і то ўсяго два разы. Звычайна ж пасля першай заўвагі гаспадыні кідала месца. І калі работы было шмат, а часу для гулянак мала, яна таксама кідала службу. [...] Былі выпадкі, калі яна за грубіянства і перад судом стаяла. Першы раз вельмі баялася суда, а другі раз была там як у сябе дома. І хоць штраф давялося заплаціць, але гаспадароў гэтых яна так на судзе размалявала, што, мабыць, да самай смерці помніць будуць...

Аднаго разу было горш: тры дні пад арыштам прасядзела без усякай прычыны. У адной яе гаспадыні знік каштоўны

пярсцёнак, і яна, не пашукаўшы яго як след, накінулася на Франку: «Гэта ты ўкрала! Ты!» Колькі ні клялася тады Франка, колькі ні плакала — нічога не дапамагло. Выклікалі паліцыю, арыштавалі. І што ж? Пярсцёнак знайшоўся, гаспадыня сама закінула яго за камод. Ой, колькі Франка тады наплакалася! Пасля гэтая пані за дарэмнае абвінавачванне грошы ёй давала, але Франка з яе рук выхапіла паперку, падзерла на шматочкі, нагамі растаптала і, выляўшы пані, пайшла. Ніколі ніхто не пакрыўдзіў яе так, як гэтая пані. Бо што праўда, то праўда, а што няпраўда, тое няпраўда. Часам здаралася, што якую-небудзь сукенку гаспадыні апранала, але заўсёды пасля клала яе на месца. Якая б яна ні была нядобрая, але трох рэчаў не робіць ніколі: не п'е, не крадзе і не хлусіць. [...]

Яна гаварыла, гаварыла. Казала, што палюбоўнікаў у жыцці мела шмат, а адзін з іх нават хацеў ажаніцца з ёю, але яна не пайшла за яго, бо быў нейкі недарэка і хутка ёй надакучыў. [...]

— Кожны мае некага, хто яго ў бядзе пацешыць, прыгарне, пашкадуе: маці, сястру, брата ці мужа... Я ж нікога не маю. Даў мне Бог сірочую долю, валачыцца па свеце загадаў і кожную кроплю радасці атрутай запіваць...

Па твары яе плылі слёзы, яна выцірала іх ражкамі шаўковай хусцінкі і гаварыла, гаварыла. І ва ўсім, што яна гаварыла, зусім не адчувалася цынізму, а хутчэй поўная адсутнасць сораму і суровая, палкая шчырасць. Адчуваліся ў ёй таксама назапашаная на працягу доўгіх гадоў неўтаймаванасць інстынктаў і горкая, злая крыўда на людзей і свет.

Франка істэрычна рыдала. Схапіўшыся раптам за галаву, яна ўсклікнула, што ёй страшэнна баляць скроні. [...]

Што думаў і адчуваў, слухаючы яе доўгі расказ і седзячы побач з ёю, гэты паважны і спакойны чалавек, які ніколі не ад'язджаў далей навакольных мястэчак, дзе ён прадаваў свой улоў? Чалавек, душа і цела якога зжыліся з вольнымі прасторамі ракі і неба, з чыстым паветрам, з глыбокай цішынёй самотных дзён і начэй, чалавек, вочы якога, нягледзячы на гады, захавалі дзіцячую нявіннасць і чысціню? Можа, ён, па-мужыцку плюнуўшы ўбок, груба штурхне яе ў човен і з пагардлівым маўчаннем павязе туды, адкуль

узяў? Ці, выслухаўшы яе споведзь, захоча стаць адным з тых, аб якіх яна гаварыла, і дадаць яшчэ адну ганебную пляму да гразі, якой яна сябе пакрыла? А можа, палічыць яе вар'яткай або праклятай грэшніцай і, пераҗагнаўшыся, чым хутчэй уцячэ ад гэтага д'ябла ў жаночым абліччы?

Калі Франка расказвала, у вачах Паўла неаднойчы адбіваўся жах, а часамі ён сарамліва адварочваўся ад яе і перабіраў пальцамі гваздзікі ці ўглядаўся ў пацямнелую раку і са здзіўленнем і жахам ківаў галавой. Мабыць, бачыў тады замест вады чорную бездань, а ў ёй — вогненны дождж палаючай смалы.

Калі Франка змоўкла, ён нейкую хвіліну думаў, а пасля пачаў гаварыць:

— Бедная ты! Ой, якая бедная! За ўсіх людзей на свеце бяднейшая! Я чуў, што недзе ў гарадах людзі так жывуць, але не верыў. Цяпер бачу, што гэта праўда... *Валачашчае* тваё жыццё... сірочае... і такое дрэннае, такое грэшнае, што барані бог! Кінь ты ўсё гэта, апамятайся, пакайся... бо і на тым свеце дабра табе не будзе, загубіш ты душу сваю. [...]

— Глупства! — усклікнула яна.— У чым гэта, цікава, я павінна каяцца?

Яна і тут была шчырай: ніякай віны сваёй яна не адчувала. Заняты сваімі думкамі, Павел не звярнуў увагі на яе словы.

— І на гэтым свеце дабра табе не будзе, і душу сваю загубіш,— паўтарыў ён.— Чаму не быць сумленнай? Сумленнай быць добра. Калі чалавек ніякага граху на душы не мае, дык робіцца такім лёгкім, як тая птушка, што пад самае неба лятае. І смерць тады не страшная. Хоць бы і сёння памерці, усё адно, калі душа чыстая...

— Якая там душа? — узлавалася Франка.— Глупства ўсё гэта! Калі чалавек памрэ, дык яго ў зямлі чэрві з'ядуць — і канец.

— Няпраўда! Ёсць неба і пекла, вечнае збавенне і вечная пакута. І калі б на тым свеце нічога не было, дык усё роўна ў чалавеку ёсць нешта такое, што ў грахах ён купацца не хоча, як, напрыклад, цела ў лужыне. [...] Ведаеш што? Кінь ты сваё *валачашчае* жыццё. Якая табе ахвота аціраць чужыя куты? Ты ж чалавек, а не шмата! Мне здаецца, што

чалавеку найлепш на адным месцы жыць. Сядзі і ты на адным месцы. Лепш ужо ўсё знось, цярпі, а сядзі на адным месцы. Прызвычаішся да людзей, палюбіш іх, і яны цябе палюбяць. А на тых, што цябе на грэх штурхаюць, плюнь! І добрых людзей сярод іх, відаць, няма, бо каб быў каторы з іх добры, дык з дзяўчынай, якая дзеля яго на сумленне сваё забылася, ажаніўся б. Хіба ў іх сумлення і літасці ніякай няма? Плюнь ты на іх! І на гэтыя вясёлыя кампаніі, што да граху даводзяць, плюнь! Апамятайся, пакайся, тады і душу сваю выратуеш, і лягчэй табе жыць на свеце *стане*.

Павел змоўк, а Франка зашаптала:

— Колькі на свеце жыву, а такога чалавека першы раз бачу. Ці ты які пераапрануты ксёндз, ці, можа, святы? Дзіва, дый годзе!

Яна засмяялася, спрытна, нібы кошка, ускочыла з месца і сказала:

— Ну, даволі гэтай гаворкі! Добра мне з вамі, але дадому трэба. Ужо вечар. Гаспадары хутка вернуцца з горада, а як вячэру не сабяру ды самавар не пастаўлю, пачнуць кракаць. Паехалі! [...]

Калі на высокім беразе паказаліся нерухомыя сілуэты дрэў вакол дачы, галава Франкі раптам схілілася на калені Паўла. З валасоў яе выпалі белыя гваздзікі, а з вуснаў паліліся ціхія словы:

— Ой, які ж ты добры, які мілы, мілы, мілы! Такога добрага і мілага, як жыву на свеце, не бачыла. Такі прыгожы, добры, мілы! Каб ты стаў маім прыяцелем, нічога б на свеце больш не хацела... І ніколі не пакінула б цябе, хоць бы паміж намі бездань раскінулася! Хоць бы паміж намі сто сусветаў паўстала, праз горы і лясы да цябе пабегла б! Хоць бы паміж намі вялікае мора было, прыплыла б да цябе! А ўсё таму, што ты такі добры, так шкадуеш мяне. Ніхто ніколі не шкадаваў мяне, усе мяне крыўдзілі, і найбольш тыя, што нібы любілі мяне. А ты мяне не пакрыўдзіў, нічога ад мяне не захацеў і як бацька родны гаварыў, як найлепшы сябар. Ой, хай табе Бог заплоціць за ўсё, мой мілы, залаты, брыльянтавы!

Яна схапіла яго руку і прыціснула да сваіх вуснаў. Нібы распалены вугольчык упаў на яго далонь. Ён нахіліўся,

узяў у свае шырокія далоні галаву Франкі і пацалаваў яе валасы. Пад гэтым пацалункам Франка, як маленькае кволае птушанё, прыціхла, задрыжала ўсім целам.

Павел адразу адарваў свае вусны ад яе валасоў і зашаптаў:

— Супакойся, дзіцятка! Супакойся, маё беднае дзіцятка! Зірні, як на небе зоркі ззяюць! Паслухай, як пяе вада! Я ўсё жыццё гляджу на гэтыя зоркі і слухаю гэту песню. Паглядзі і паслухай ты! Можа, табе будзе лягчэй? Можа, і твая душа, як мая, гэта высокае неба і гэту чыстую ваду палюбіць! Супакойся! Ціха, ціха, ціха! [...]

Пасля гэтага Павел прыязджаў увечары разы тры, але ненадоўга. [...]

У трэці вечар, калі дзяўчына, больш як калі занудзіўшыся па ім, свавольна закінула яму на шыю рукі і той самы гарачы вугольчык, які ўжо аднойчы ён адчуў на руцэ, апаліў яго твар, Павел адапхнуў яе з такой сілай, што яна нават захісталася і схапілася за нос чоўна, каб не перакуліцца.

— Слухай, Франка,— сказаў ён больш панура і сурова, чым заўсёды.— Ты да мяне не чапляйся, бо я ніколі больш не прыеду і ты мяне не ўбачыш. Я табе дабра, а не ліха жадаю. Я душу тваю выратаваць хачу. З таго часу, як ты мне на востраве ўсё расказала, я ўдзень і ўночы толькі аб тым і думаю, як табе дапамагчы і што зрабіць, каб ты сваё праклятае жыццё змяніла... А ты яшчэ і мяне на грэх спакушаеш... Цьфу, якая брыдота! Сапраўдная п'яніца... хоць і гарэлкі не п'еш!

Ён плюнуў у ваду і сказаў анямеўшай ад здзіўлення дзяўчыне:

— Заўтра зноў прыеду. Калі будзеш такая, як сёння, дык бывай здарова! Відаць, што табе, як таму апошняму п'яніцу, не дапаможаш. Ніякага ратунку табе не будзе!

Аднак назаўтра Паўлу ўжо не давялося ехаць на тое месца, дзе ён упершыню ўбачыў Франку. Увесь дзень ён лавіў на рацэ рыбу, а калі, на хвіліну зазірнуўшы дадому, зноў вяртаўся на раку, дык угледзеў Франку, якая спяшалася ад ракі ў вёску. Ужо змяркалася, але ён адразу пазнаў яе па светлай сукенцы і хадзе. Нават здалёк было відаць, што ёй, кволай і прызвычаенай да гарадскіх тратуараў, узыходзіць

на высокую гару было цяжка. Здзіўлены, Павел зрабіў некалькі шырокіх крокаў і апынуўся побач з ёю.

— Ты навошта сюды прыйшла? — запытаўся ён сурова, але ў голасе чулася затоеная радасць.

Франка схапіла яго за руку і, спяшаючыся, пачала:

— Ой, міленькі, бяда на мяне звалілася, такая бяда, што ўжо не ведаю, як і вытрываю... Як толькі даведалася пра сваё няшчасце, адразу да цябе пабегла. Ішла берагам і ў чалавека аднаго запытала, дзе тая вёска і тая хата, у якой жыве Павел Кабыцкі. Можа, ты мяне выратуеш, можа, ты мне параіш... бо калі не ты — загіну, *далібог*, загіну! — захлынаючыся слязьмі, казала Франка.

— А якая ж у цябе бяда? Кажы... — здзівіўся Павел.

Агледзеўшыся, ён убачыў на гары некалькі кабет з вёдрамі і збанамі, узяў Франку за руку і крутой сцежкай павёў у сасоннік, які цямнеў за вёскай. [...]

Моцна ўхапіўшыся за руку Паўла і калоцячыся ад жаху і плачу, Франка расказала, што ў горадзе ў яе гаспадыні захварэў бацька, і таму яе гаспадары не праз месяц, як намерваліся раней, а праз два-тры дні пакідаюць дачу. Калі яна даведалася пра гэта, дык сэрца яе ледзь не разарвалася ад болю і роспачы.

— Я цяпер ні за якія скарбы не паеду адсюль! Памру, а не паеду! Як сабака, буду ляжаць на беразе, пакуль не здохну ад голаду, а нікуды не паеду. Хай сабе яны хоць у самае пекла едуць, толькі без мяне! Для мяне тут упершыню адкрылася неба, адкрылася шчасце, якое я ніколі не сніла, і я не паеду адсюль, не паеду... Не расстануся з табой, голуб мой, дружа мой мілы, бацька мой родны! Гані мяне, бі, зусім забі, а я не паеду адсюль, не паеду з імі!..

Прыпаўшы галавой да грудзей Паўла, яна цалавала яго рукі, абліваючыся слязьмі. Павел слухаў яе спачатку моўчкі, апусціўшы галаву. Відаць, і яго навіна гэта моцна засмуціла. А пасля, у адказ на яе воклічы і плач, паціху сказаў:

— І праўда, што бяда! Я і сам не чакаў гэтай бяды і ніколі пра яе не думаў.

І раптам горача, як ніколі дагэтуль, загаварыў на сваёй роднай мове:

— *Не хачу! Не пушчу! Далібог, не пушчу!* Зноў на нядолю і здзек пойдзеш! *Не пушчу!* Не аддамо ні цела твайго, ні душы на пагібель.

Пачуўшы гэта, Франка радасна ўскрыкнула, абхапіла яго за шыю і ўсім сваім кволым, гнуткім целам абвіла яго дужую постаць. А ён падняў яе на рукі і, смеючыся нейкім бесклапотным, шчаслівым смехам, пачаў гушкаць яе, як дзіця, і цалаваць. Але неўзабаве схамянуўся і, злёгку адпіхнуўшы яе ад сябе, пціху прамовіў:

— Дык, можа, пажэнімся, га? Буду любіць цябе да самай смерці і ніколі не пакрыўджу. Будзе ў цябе ўласная хата, кавалак хлеба, і зажывём сумленна. Ну як, Франка?

Казаў гэта з трывогай. Можа, баяўся, што Франка адмовіцца, а можа, слоў уласных спалохаўся?

Франка ўзняла вочы на высокі крыж, які вызначаўся на фоне змроку, і, абняўшы Паўла, пад таямнічы шолах бору парывіста, горача прамовіла:

— Хай дапаможа мне Бог, каб я і пасля смерці аблічча тваё бачыла, каб д'ябал душу маю не спакушаў, каб я да самай смерці любіла і шанавала цябе, голуб мой мілы, залаты, брыльянтавы!

Пачуўшы гэта, Павел адразу супакоіўся. Ён верыў у шчырасць яе слоў, як верыў моцна ў тое, што ніхто на свеце не можа прысягаць фальшыва. Зрэшты, Франка прысягала шчыра, і гэта адчувалася ў яе голасе, ва ўсім яе выглядзе. І Павел падумаў, што цяпер ён заручаны з гэтай кабетай і не пакіне яе ніколі ні на адну хвіліну.

— Толькі ж як яно будзе? Дзе ты будзеш жыць да нашага шлюбу? — заклапочана спытаў ён.

— Як гэта дзе? — усклікнула Франка.— Пабягу зараз да гаспадароў, развітаюся з імі, збяру свае рэчы і праз хвіліну прыбягу сюды.

— Прыбяжыш, але куды пасля падзенешся?

— Да цябе пайду! У тваю хату!

Павел усміхнуўся:

— Дзіця ты горкае, дый годзе! Нічога ты не разумееш! Нібы ў лесе нарадзілася і ніколі сярод людзей не жыла, як жа ты ў маёй хаце будзеш жыць, калі мы перад людзьмі яшчэ не муж і жонка?.. Ды табе ў вёсцы ніколі не даруюць гэтага, бо так рабіць нельга.

Падумаўшы хвіліну, Павел сказаў, што, калі гаспадары Франкі паедуць, ён адвядзе яе да сястры, дзе яна два-тры тыдні пажыве, пакуль яны не возьмуць шлюб. Аб тым, што ў Паўла ёсць замужняя сястра, Франка ведала. І яна пачала прасіць яго, каб ён адвёў яе да сястры ўжо сёння. Заўтра яна сходзіць па свае рэчы, а сёння будзе начаваць у вёсцы, бліжэй да яго. Аднак Павел запярэчыў. Ён сказаў, што гаспадарам цяпер, перад ад'ездам, яна асабліва патрэбна... [...]

— Я не пераЖыву гэтыя тры дні без цябе,— сказала яна.

Павел не здзівіўся. Ён і сам хацеў як найхутчэй убачыцца з ёю.

Назаўтра, пад вечар, ён прыплыў на месца і паставіў човен ля самага берага. Франкі на беразе яшчэ не было, але неўзабаве яна прыбегла, чырвоная ад абурэння і гневу:

— Каб ёй дабра на свеце не было! Каб яе д'яблы ўзялі!

Франка праклінала сваю гаспадыню за тое, што тая, складаючы ў дарогу рэчы, увесь дзень ганяла яе, як каня, як вала ў ярме, ні на хвіліну не адпускаючы ад сябе. Вось і цяпер яна загадала складаць у скрыню кнігі пана, але Франка ведала, што Павел напэўна ўжо чакае яе, усё кінула і пабегла.

Паўлу, як заўсёды, непрыемна было слухаць скаргі Франкі і яе праклёны, але сёння ён не ўшчуваў яе, толькі махнуў рукой і сказаў:

— Ну, гэта ўжо апошняя твая служба, больш ужо нікому не будзеш служыць, і злосць у табе сціхне. [...]

Слухаючы яго, Франка павесялела, а калі ён сабраўся адплываць, яна, як і ўчора, моцна абняла яго. Яна дзякавала, што ён бярэ яе за жонку, назвала яго прыгожым, мілым, залатым, брыльянтавым. І Павел паехаў дадому памаладзелы і шчаслівы, хоць, як заўсёды, быў спакойны і паважны.

Сястра і швагер адразу заўважылі, як памаладзеў і павесялеў Павел, калі напярэдадні ўвечары ён увайшоў у іх хату. У хаце гэтай не было вялікага дастатку, але і беднасці таксама не было. У ёй панаваў парадак. Стаяла яна ў самым канцы вёскі, толькі пясчанай дарогай ад сасонніку і могілак адасобленая, а двор яе прымыкаў да сядзібы Паў-

ла. Магчыма, таму, што яны жылі па суседству, прыгожы і высокі Піліп Казлюк пасватаў сястру Паўла, калі ёй было ўсяго шаснаццаць гадоў. [...]

Калі Павел пасля размовы з Франкай на могілках увайшоў у гэтую хату, сястра яго, Ульяна, прыгожая і мажная кабета гадоў каля трыццаці, стаяла ля печы з малым на руках, а Піліп, які толькі што вярнуўся з ракі, ляжаў на лаве і трымаў аберуч трохгадовага сына, які стаяў у яго на грудзях. Брат яго, шаснаццацігадовы Данілка, заўзяты рыбак, вязаў пры лямпе сеці.

— Пахвалёны!..— сказаў Павел.

— На векі вякоў! — адказалі яму тры галасы.

Абліты здаровым румянцам твар Ульяны яшчэ больш пачырванеў ад агню. Яна падышла да брата, пацалавала яго руку. Піліп сеў на лаве, апусціў на падлогу сына, які з плачам кінуўся да маці і заціх, ухапіўшыся за яе спадніцу. Павел сеў на сваё звычайнае месца ля сцяны, паклаў на калені рукі і, апусціўшы вочы, паволі пачаў:

— Прыйшоў я да вас сёння, дзеці мае, па адной справе і буду вас вельмі прасіць, каб вы зрабілі так, як я скажу.

Ульяна слухала яго, усё яшчэ стоячы з дзецьмі на сярэдзіне хаты. Данілка ўзняў галаву, Піліп лагодна запытаў:

— А чаго вы хочаце?

— Паслухай, пакуль я ўсё раскажу,— сказаў Павел і, звярнуўшыся да сястры, запытаў: — Скажы, Ульянка, калі нашы бацькі памерлі і пакінулі цябе маленькую на мяне, хіба я быў табе дрэнным братам?

— Божухна мілы! Ды хто ж гэта гаворыць? — усклікнула Ульяна.

— Ніхто не гаворыць, але я сам хачу прыгадаць і сабе і вам, дзеткі мае, што дапамагаў я вам, як толькі мог. Не крыўдзіў я цябе, мая галубка, не кінуў. Любіў цябе, песціў і дабру-розуму вучыў. А калі ты замуж пайшла, палову агарода свайго аддаў, дзве каровы і дзесяць авечак купіў і грошай крыху даў. Праўду я кажу?

Ульяна з дзецьмі падышла да Паўла, пацалавала яго руку, а Піліп сказаў:

— А хто ж гаворыць, што няпраўда? Ды і мы, здаецца, нядобрымі для вас не былі і ніколі не будзем.

— А хто ж кажа, што вы нядобрыя,— прамовіў Павел.— Вось таму, што вы для мяне былі заўсёды добрымі, я і прыйшоў да вас з гэтай сваёю справай.

І Павел паволі, разважліва, нічога не ўтойваючы, расказаў ім усё. Калі ён скончыў, у хаце якіх пару мінут панавала маўчанне, якое парушаў толькі малы, што сядзеў на руках у Ульяны, енчыў, просячы есці. Але Ульяна, уражаная тым, што пачула, не звяртала на яго ніякай увагі. Ды і чорныя вочы Піліпа пад густымі бровамі глядзелі ашаломлена. А Данілка нават ускліснуў ад здзіўлення і ніжэй нахіліў галаву, каб схаваць у сеці свой смех. Хоць Паўлу было ўсяго толькі сорак два гады, яго, паважнага і маўклівага, людзі лічылі амаль старым, і нікому нават у галаву не прыходзіла, каб ён мог яшчэ ажаніцца. Нарэшце, схамянуўшыся, Ульяна першая адказала:

— Прымем! Чаму ж не прыняць? Хіба наша хата цесная? Якая бяда, калі яна ў нас тыдні тры пажыве? Яшчэ весялей будзе!

Піліп падтрымаў жонку:

— Мы для вас і не тое гатовы зрабіць... Чаму ж не? Ці мала мы дабра ад вас бачылі? Ды толькі...

Ён устаў з лавы, падышоў да швагра. Упёршыся адной рукой у бок, а другой правёўшы па валасах, нерашуча прамовіў:

— Швагер, ці добра вы толькі робіце, што жэніцеся з ёй? Чужая, гарадская, ніхто не ведае, якая яна. Каб вы, барані божа, не набраліся з ёю якой бяды!

— І праўда,— падыходзячы бліжэй да брата, падтрымала мужа Ульяна.— Каб вы, Паўлючок, якой бяды з ёю не набраліся!

Павел устаў, ласкава паглядзеў на маладых і рашуча сказаў:

— Не бойцеся, ніякай бяды не будзе. Яна паклялася шанаваць і любіць мяне аж да самай смерці. Паклялася. А што да таго, якая яна была, гэта нічога. Я яе люблю і хачу выратаваць. Інакш ужо не можа быць. А за дабрату вашу дзякую вам, дзеці мае, і, дасць Бог, яшчэ чым-небудзь вам адслужу. У чацвер яе прывязу да вас. Дабранач! [...]

Яны доўга дзівіліся з Паўла. Яны не ведалі, што ў крыві гэтага чалавека, з выгляду спакойнага, як Нёман у ціхае надвор'е, закіпела першая ў жыцці страсць, што ў сэрцы яго, як Нёман, глыбокім і ціхім, нарадзілася бязмежнае адчуванне, што перад позіркам яго, які прывык аглядаць неабсяжныя прасторы Нёмана і далёкі краявід, паўстала святая і высакародная чалавечая задача і асвяціла яго аблічча.

II

[...] Неяк у пачатку восені Піліп вынес са *свірна* Паўла старыя кросны яго першай жонкі, прынёс іх у хату і цэлую гадзіну напраўляў. Ульяна ў нядзелю паехала ў мястэчка і за братавы грошы купіла льну і каляровых нітак, а назаўтра прыладзіла кудзелю на калаўрот і на кросны нацягнула аснову. Яна смяялася да слёз і выцірала рукавом вочы, пазіраючы, як нязграбна і няўмела Франка бярэцца за работу. Колькі жыла на свеце, не ведала, каб кабета не ўмела прасці і ткаць. Яна нават не ведала, што такія кабеты існуюць на свеце. Насмяяўшыся, яна пачала цярпліва і старанна вучыць Франку. Тая спачатку з захапленнем узялася за справу і прасці навучылася хутка, але як толькі дайшло да ткання, спахмурнела і страціла ахвоту да гэтай работы.

— Цяжка! — злосна прабурчала яна.

— Дарма, прывыкнеш! — угаворвала яе Ульяна. [...]

Пасля некалькіх спроб, у часе якіх Ульяна ўжо не смяялася, а пачала хмурыцца, Франка адскочыла ад кроснаў і, размахваючы рукамі, закрычала:

— Не хачу! Не буду! Рукі мае баляць, ногі самлелі. На якое ліха патрэбна мне гэта работа? Даволі я нагаравалася і напрацавалася, калі гора мяне прымушала, а цяпер хай сабе д'ябал сядзіць за гэтымі кроснамі. А я не буду, не буду!

— Як сабе хочаце,— абыякава сказала Ульяна і, кіўнуўшы на развітанне галавой, выйшла з хаты.

У гэты дзень, пад вечар, ідучы па ваду, Ульяна сустрэла брата і, спыніўшыся перад ім з вёдрамі, сказала:

— А Франка ткаць не хоча.

— Дык няхай сабе не тчэ,— спакойна адказаў Павел.

Але Аўдоцця, якая, нягледзячы на свае шэсцьдзесят гадоў, каб дапамагчы нявестцы, спускалася з гары па ваду і чула размову брата і сястры, паставіла на зямлю вёдры і паклікала Паўла. Яе чорныя вочкі на румяным твары задаволена блішчалі: яна вельмі любіла ўмешвацца ў чужыя справы.

— Паўлюк! — пачала яна, прыклаўшы палец да прывялых вуснаў.— Слухай, Паўлюк, нешта ты жонцы вельмі вялікую волю даеш. Глядзі, каб праз гэта бяды якой не было.

Аўдоцця ўжо не раз чула ад Марцэлі сёе-тое аб паводзінах Франкі. І тое, што Франка позна ўстае, папівае чай і бясконца есць цукеркі, вельмі дзівіла і абурала старую.

Сур'ёзна пазіраючы на яе, Павел сказаў:

— Не бядуйце, кума, я ведаю, што раблю. Не для таго яе ад пакут ратаваў, каб зноў на пакуту аддаць, але для таго, каб ёй на свеце добра жылося. Калі чалавеку жыць дрэнна, дык і ён сам дрэнны, а калі добра, дык і ён добры. Ды і чаму ж не быць добрым, калі ні для злосці, ні для граху прычыны няма? Вось так! [...]

— Глядзі, каб ад гэтага панавання, якое ты ёй даеш, зноў не прычапілася да яе якое ліха.

Але гэтая перасцярога старой, сэнс якой ён добра разумеў, не зрабіла на Паўла ніякага ўражання. Ён усміхнуўся, махнуў рукой і спакойна адказаў:

— Гэтага ўжо напэўна не будзе. Яна паклялася мне. Перад Богам паклялася.

Відаць было, што ніпто на свеце не можа пахіснуць яго веры ў клятву.

Ён не мог сабе ўявіць, каб хто-небудзь асмеліўся адступіцца ад сваёй клятвы. [...]

У Казлюкоў усё часцей і часцей пачалі гаварыць пра Франку. Гаварылі пра яе так, як звычайна абмяркоўваюць нешта незвычайнае.

Гарэза Данілка, у якога зімой і ўвосень работы было мала, і ён ведаў усё, што робіцца ў вёсцы, са смехам расказваў, як Павел, маючы жонку, сам паліць у печы, гатуе страву, доіць карову, а Франка або ляжыць у пасцелі, або абнімаецца і цалуецца з мужам, ці дурэе, як малое дзіця. Піліп ажно за жывот хапаўся, пачуўшы гэта, а Ульяну гэтыя расказы трывожылі.

— Не будзе яму ад яе дабра! — сказала яна аднойчы мужу.

— Каму? — запытаў Піліп.

— Паўлюку.

Калі яна выйшла на двор і пачала склікаць у хату курэй, Франка стаяла ля паркана, які падзяляў агарод на дзве паловы, і ела грушы. Грушы гэтыя раслі на адзіным дрэве, якое стаяла ля самай хаты Паўла. Даўней Павел прадаваў іх у мястэчку або аддаваў сястры, цяпер пакінуў сабе, бо Франка іх вельмі любіла. Ці то выгляд тых груш, якімі ў мінулым годзе ласаваўся яе сынок, ці Данілкавы расказы ўзлавалі Ульяну, толькі яна спынілася непадалёк ад паркана і сказала Францы:

— Хіба табе не сорамна, што твой сам доіць кароў? Не *мужыцкая* гэта работа, а жаночая.

І хоць Ульяна гаварыла спакойна і хутчэй жартам, чым злосна, твар Франкі ўспыхнуў яе звычайным, хутка знікаючым гарачым румянцам.

— А табе што да таго? — усклікнула яна.— Не ўтыкай носа туды, куды цябе не просяць. Я вашай хамскай работы ніколі не рабіла і рабіць не буду. Ад'ё!

Яна адбегла ад паркана, а Ульяна, пачырванеўшы ад абурэння, кінула ёй услед:

— А ты хамамі нас не абзывай! Якое маеш права вытыкаць нам тое хамства, калі сама была горшая за хамку? [...]

Аднаго разу, калі Франка вярнулася з касцёла і, як заўсёды, нядбайна кінуўшы на стол малітоўнік, пачала са шчэбетам і смехам кружыцца па хаце, Павел, не адрываючы ад кніжкі позірку, прамовіў:

— Франка... Ведаеш, Франка, я даўно ўжо хачу аб нечым цябе папрасіць.

Франка была ў цудоўным настроі, бо сёння раніцай, калі яна круцілася на рынку, нейкі пан у прыгожым футры, відаць, пісар з суседняга маёнтка, паказваючы на яе другому, сказаў: «Вось прыгожая, шэльма!» А гэты другі, пажылы,— напэўна, аканом, кіўнуў галавой: «А нічога сабе круцёлка!» Кароткая гэта размова вельмі ўзрадавала Франку. У дадатак, на дванаццаць грошаў, якія засталіся ад куплі круп і солі, яна купіла сабе карамелек і цяпер,

скруціўшыся, што котка на лаве, грызла іх, як вавёрка. На словы Паўла яна адказала ветліва і пяшчотна:

— Для цябе, Паўлючок, я гатова ўсё на свеце зрабіць!

— Ну, калі ты такая добрая, дык зрабі ласку і навучы мяне чытаць.

Пачуўшы гэта, Франка спачатку аслупянела ад здзіўлення, а пасля зрабілася вельмі паважнай. Вось што значыць паходзіць з добрага роду! Калі б яна паходзіла з мужыкоў, хіба ўмела б яна чытаць! Добра. Чаму не? Навучыць яна Паўла чытаць. Вялікая гэта рэч! У дамах сваіх даўнейшых паноў яна бачыла такіх гувернантак, у якіх у галовах было меней розуму, чым у яе мезенцы, аднак жа яны вучылі. Толькі для гэтага трэба мець буквар. Буквар Павел меўся папрасіць у аднаго знаёмага чалавека і, пачырванеўшы ад хвалявання, пачаў настойваць, каб Франка тым часам паказвала яму літары па малітоўніку.

— Пакажы, Франка. Пакажы хоць па малітоўніку! Я так доўга чакаў гэтага шчасця.

Яна зноў здзівілася. Якое ж гэта шчасце — умець чытаць? Але Павел сказаў ёй, што нікому ў жыцці так не зайздросціў, як тым, хто можа ў касцёле па кніжцы маліцца, а ў хаце, калі ёсць час, розныя цікавыя гісторыі чытаць. [...] А можа, ён, калі навучыцца чытаць, будзе лепшым, бо Павел чуў, што ў кніжках пішуць, якім чынам душа чалавечая можа ачысціцца ад граху і стаць белай, як голуб.

— Глупства душа, глупства голуб! — ускочыўшы з лаўкі, усклікнула Франка.— Але што ў кніжках розныя цікавыя гісторыі апісваюць — гэта праўда. [...]

Зіма была суровая, і на рацэ, скаванай ільдом, рыбакам работы было мала. Вольнага часу ў Паўла цяпер было даволі, і ён штодзень то пасля полудня, то ўвечары прасіў Франку, каб яна вучыла яго чытаць. Спачатку тая рабіла гэта ахвотна. Ля маленькага акенца, за якім стаяў заснежаны сад і калела акрытая інеем самотная груша, у слабым зімовым святле за сасновым, старанна выцертым Паўлам сталом сядзелі над разгорнутай кніжкай ці букваром муж і жонка. У гэтыя хвіліны высокі і дужы саракагадовы мужчына ператвараўся ў пакорнага, баязлівага хлапчука. Са-

гнуўшыся ледзь не ўдвая над сталом і амаль дакранаючыся тварам да старонак, ён так напружана ўглядаўся ў літары, на якія кончыкам пальца паказвала Франка, што здавалася, вочы яго вось-вось выскачаць з-пад шырока расплюшчаных павекаў. Твар яго ў гэтыя хвіліны выглядаў зусім інакш: бровы ўзнімаліся высока ўгару, лоб праразалі дзве глыбокія маршчыны, губы выпіналіся. Калі ён пачаў ужо адрозніваць першыя літары алфавіта і манатонна, паволі вымаўляў: «А... Б... Ц...», гукі яго голасу былі падобныя да стогнаў, якія з цяжкасцю вырываліся з грудзей. Нялёгка яму было адрозніваць гэтыя дробныя чорныя знакі, дасюль зусім незнаёмыя яго вачам, і мозг яго вельмі марудна спраўляўся з гэтай чужой для яго работай.

— Гм... га...

Над кожнай новай літарай ён доўга сядзеў моўчкі і моршчыў узмакрэлы лоб. Нялёгка яму было адрозніць яе ад іншых. Нарэшце пацiху і нерашуча вымаўляў:

— Л...

Франка нецярпліва круцілася на табурэце, калі муж доўга сядзеў над новай літарай, нарэшце ўскаквала з месца і крычала:

— Вось дурань! Якое гэта «Л»? Вось мужыцкая галава! Ты такі здатны да чытання, як вол да карэты!

Не звяртаючы ўвагі на яе абразлівыя словы, ахоплены гарачаю прагай ведаў, ён пакорна ўзнімаў на яе вочы і казаў:

— Ну, Франка, не злуй! Я ўжо ўспомніў, што гэта «І». Ну, сядзь і пакажы яшчэ крышку... Годзе ўжо злавацы!

Ён браў яе за руку, цягнуў да стала і супакойваў:

— Ты ж бачыш, Франка, што я да гэтага яшчэ не прывык. Пачакай крышку... Пачакай, мая любая, пацярпі, пакуль я прывыкну.

Франка зноў садзілася на месца, але ўжо надзьмутая, за кожную памылку крычала на яго ўсё больш. Але Павел цярпліва зносіў усё і толькі паўтараў:

— Пачакай, мілая, пачакай крышку, хай толькі прывыкну.

Прывык ён сапраўды хутка і, адолеўшы ўсю азбуку, ужо даволі бегла мармытаў: ба-ба, бэ-бэ. Але аднойчы Франка,

слухаючы яго мармытанне, падскочыла, як спружына, з лавы і закрычала:

— Не хочу! Не буду! Даволі! Да д'ябла гэтае чытанне! Хіба я да цябе ў гувернанткі нанялася? Ад нуды я хутка завыю, як той сабака!

Яна кінулася на ложак, заклала за галаву рукі і, пазіраючы ў столь, пачала пазяхаць так працягла і голасна, што пазяханне гэта і сапраўды нагадвала выццё. Павел узняў ад буквара засмучаны твар, моўчкі паглядзеў на Франку, паківаў галавой і, зняважліва махнуўшы рукой, прамовіў:

— Цябе ўсё яшчэ злосць адольвае. Відаць, табе спаць хочацца, калі так рот дзярэш. Ну, і добра. Калі спаць, дык спаць. [...]

Павел засынаў хутка і моцна і, калі ляжаў нерухомы, заплюшчыўшы вочы, выглядаў значна старэйшым, чым тады, калі рухаўся і глядзеў.

Удзень гнуткасць рухаў і ясны блакіт вачэй надавалі яму амаль юнацкі выгляд. Цяпер маршчыны, якія перараралі лоб, зрабіліся больш акрэсленымі, а сур'ёзная складка вуснаў рабіла твар яго суровым.

Сцяўшы зубы, Франка прамовіла:

— Вось *балван*! Зноў заснуў!

Быў ён зараз непрыгожы. Зусім не такі, як тады, калі яна ўпершыню ўбачыла яго на Нёмане! Тады ён паказаўся ёй гэткім стройным, спрытным і з такім захапленнем глядзеў на яе! А цяпер...

— Стары! — прашаптала яна.

Вакол хаты гуляў, свістаў, грымеў і скавытаў вецер. А Франка з раскалмачанымі валасамі ўсё яшчэ сядзела на пасцелі, углядалася ў твар мужа, і злосныя агеньчыкі ўспыхвалі ў яе чорных вачах.

Аднак, калі ён прачынаўся на досвітку і абдымаў яе, Франка тулілася і ласцілася да яго, як кошка, асыпала яго пацалункамі, а пасля са смехам і шчэбетам ускаквала з ложка, распальвала ў печы і гатавала снеданне.

Але ўсё часцей і часцей Павел, не пабудзіўшы жонкі, выходзіў з хаты, каб зазірнуць у сеці, што апусціў учора ў палонку, або, калі лёд ужо крануўся, паглядзець на крыгаход і вызначыць, дзе і калі ў бліжэйшыя дні можна будзе

лавіць рыбу. Пажадлівасць не была галоўнай уласцівасцю яго натуры, і хоць яна, позна і ўпершыню абуджаная Франкай, успыхнула бурна, цяпер ужо аслабела пад ацяжэлым спакоем цела і духу і схільнасцю да маўклівага назірання і роздуму. Калі лёд на рацэ крануўся і Павел упершыню выйшаў на бераг паглядзець на крыгаход, ён добрую гадзіну стаяў нерухома, падпёршы рукой падбародак, і любаваўся краявідам, які раскінуўся перад яго вачыма. У цёплым блакіце неба адчувалася набліжэнне вясны. Над лесам самотна стаяла бледнае, але ўжо цёплае сонца. За ракой, сярод цёмнай зеляніны соснаў, дзе-нідзе бялеў яшчэ рыхлы наздраваты снег, а над вяршалінамі дрэў з вясёлым карканнем лятаді вароны. А па Нёмане, які нагадваў неаглядны паток расплаўленага серабра, плылі крыгі, падобныя на пагоркі і дамочкі з крышталю. Дзе-нідзе ля берага, пад тоўстым покрывам лёду, чутно было кіпенне і бурчанне заняволенай вады, але шырокай сярэдзінай Нёмана то гуртам і шпарка, то паасобку і павольна плылі крышталёвыя крыгі,ззяючыя, празрыстыя, пазалочаныя праменнямі сонца або палітыя барвамі вясёлкі. Крыг гэтых было такое мноства, што яны здаваліся фантастычным шматлікім натоўпам, які паспешліва і маўкліва ўцякае з нейкіх невядомых краін. Згрудзіўшыся на дальнім канцы ракі, яны нагадвалі казачны горад з высокімі вежамі і дахамі, а на другім канцы ракі такі самы ледзяны горад разбіваўся на дробныя часткі і ўкрываў сярэбраны шлях Нёмана. А ў паветры стаяла ўрачыстая цішыня, скрозь холад прабівалася кволае і няўстойлівае цяпло, і пахла ўжо адталай зямлёй, якая пачынала вольна дыхаць пад рэшткамі снегу.

Штогод Павел назіраў гэты краявід і штогод вітаў яго прыязнай усмешкай і радасным бляскам вачэй.

Гэта цудоўнае абуджэнне прыроды выклікала ў душы яго не толькі захапленне, але і радасць ад сустрэчы з нечым добра і здаўна знаёмым. Ён любіў прыроду тою магутнай любоўю, якая прымушае дзіця, што не ўмее яшчэ вымавіць імя маці, вуснамі і рукамі цягнуцца да яе грудзей. [...]

А ў гэты час Франка, абуджаная рыпеннем дзвярэй, адрывала ад падушкі ўскалмачаную галаву і, праціраючы заспаныя вочы, убачыла спачатку сукаваты кій, а пасля, ля самага парога, кучу лахманоў.

— Пахвалёны,— пачуўся рыплівы голас.

Пацягваючыся ляніва ў пасцелі, Франка сказала:

— Зрабі ласку, Марцэля, распалі агонь, а я яшчэ крышачку паляжу.

За міску крупніку, за шклянку чаю, а часам за кавалак сала і жменю мукі жабрачка стала яе прыслужніцай. Была яна таксама і яе сяброўкай, адзінай кабетай у вёсцы, з якой Франка любіла бавіць час і якую нават у думках не называла мужычкай і хамкай. Седзячы на падлозе ля парога або на лаве і папіваючы з зеленаватай шклянкі чай, Марцэля ўжо даўно расказала Францы пра сваё жыццё. Марцэля, у адрозненне ад усіх вясковых кабет, ніколі не была замужам. Усе свае маладыя гады тулілася па панскіх маёнтках, то цяжка працавала, то весела гуляла, у залежнасці ад таго, які лёс выпадзе. [...]

Абедзве яны пасылалі самыя жахлівыя праклёны свету, у якім прайшла іх маладосць і які спустошыў душу і сэрца і зрабіў іх жабрачкамі. Але праз якую гадзіну-дзве або найбольш назаўтра яны зноў з захапленнем і смуткам пачыналі ўспамінаць аб раскошы і радасцях, зазнаных у мінулым.

Неяк увечары Марцэля, як заўсёды, сядзела ля парога і ела хлеб з сырам, якім пачаставала яе Франка. Пад'еўшы, яна доўга маўчала, а пасля сказала Францы, што заўтра паедзе ў горад, каб на пачатку Велікоднага тыдня пахадзіць па людзях ды назбіраць крыху грошай, бо ў гэтую пару людзі ахвотна абдорваюць жабракоў. Пачуўшы гэта, Франка ажно ўся затрымцела. Яна і сама на крылах паляцела б у горад, каб паглядзець на дамы і вуліцы, на сяброў і сябровак і хоць бы раз па-даўняму павесяліцца і пагуляць! Але ёй цяпер і думаць нельга пра гэта шчасце! Яна сама сябе закапала ў магілу. Сядзець ёй цяпер век у гэтай хаце, слухаць, як скуголіць вецер, ды глядзець на хамаў! Вось што яна зрабіла з сабой... Доўга жалілася так Франка, але, не дачакаўшыся ад Марцэлі ніякага адказу, скурчылася ў хаце на лаве і панура заціхла. Цішыня і змрок напаўнялі хату. З вёскі даляталі гукі, падобныя да аднастайнага цурчання. На тым беразе Нёмана мужчынскі голас працягла, нібы спяваючы кожны склад, крычаў:

— Паром! Паром!

І адразу стала чутно, як бягуць з гары Піліп і Данілка.

А вясна растапляла рэшты холаду, пахлі ажыўшыя іголкі соснаў, зелянела трава. З двара, дзе гулялі ля паркана дзеці Казлюкоў, чуліся часамі то плач, то смех.

А ў змрочнай хаце воддаль адна ад адной сядзелі і маўчалі дзве кабеты. Нарэшце пасля доўгай хвіліны маўчання з кучы лахманоў, што шарэла ля парога, пачулася нешта падобнае да спеву:

> Павей, вецер, павей, вецер, з зялёнага гаю,
> Павярніся, наш паночак, з далёкага краю!
> Як я маю павяваці, калі гай высокі,
> Як я маю павярнуцца, калі край далёкі![1]

Дзіўны быў гэты спеў. Нізкі, ахрыплы голас Марцэлі дрыжаў, абрываўся на высокіх нотах, быў поўны журботы і скаргі. Праспяваўшы адну страфу песні, Марцэля пачала так гучна ўздыхаць, што ўздыхі гэтыя, як перад тым песня, напоўнілі хату, у якой з кожнай хвілінай гусцеў змрок.

— Ох! Ох! Ох!

А неўзабаве ўздыхі гэтыя змяніліся свісцячым шэптам:

— У імя Айца і Сына і Духа Святога. Амінь. Ойча наш...

У шэпце гэтым чуліся скруха, пакора і шчырае маленне самотнай і стомленай душы.

Скончыўшы малітву, Марцэля перажагналася і зусім ужо іншым голасам прамовіла:

— Ой, ды я забылася сказаць табе навіну!

Гучна і працягла пазяхаючы, Франка запытала:

— Якая яшчэ навіна?

— Нейкія паны з горада нанялі на лета палац.

Франка ведала, што сяляне называюць палацам тую дачу, дзе яна служыла летась і адкуль узяў яе Павел.

Яна ўсхапілася і запляскала ў далоні:

— Ужо і нанялі! А мая ж ты міленькая, чаму ж ты раней мне гэта не сказала? Цікава, што за паны? Можа, я іх ведаю? Можа, каго знаёмага з сабой прывезлі? Як толькі

---

[1] Тут і далей творы беларускага фальклору Э. Ажэшка падае ў іх беларускім гучанні. *(Заўвага ўкладальнікаў.)*

прыедуць, пабягу туды даведацца ды паглядзецы! Не чула ты часам, Марцэлька, ці багатыя, ці маладыя, ці вялікую службу трымаюць?.. [...]

IV

З часу знікнення Франкі мінула ўжо тры зімы, і ўсе ў вёсцы былі ўпэўнены, што Павел даўно на яе забыўся. У апошні час ён нават павесялеў. Праўда, ён не хадзіў на гулянкі, не смяяўся на поўны голас, але людзей ужо не ўнікаў і з кожным, хто пачынаў [redacted] ім гаворку, размаўляў ахвотна і ветліва. [...]

Павел запаліў лямпу і, адсунуўшы ўбок кручкі і шнуры, разгарнуў кніжку. На працягу першай зімы Павел прачытаў старонак шэсцьдзесят, на працягу другой — удвая больш, а за трэцюю яшчэ болей. Аднак усёй кніжкі да канца яшчэ не адолеў. Малітвы, якія падабаліся яму найбольш, ён закладваў святымі абразкамі, якіх было нямала ў малітоўніку Франкі. Сярод іх траплялiся і паштоўкі яе гарадскіх сяброў і знаёмых з віншаваннямі з нагоды Новага года або імянінаў. На картачках гэтых былі намаляваны вялікія ружы, гірлянды, букеты, чырвоныя сэрцы, прабітыя залатымі стрэламі, і жоўтыя, з зіхатлівымі крыламі купідоны. А ўнізе або збоку напісаны імёны і прозвішчы кавалераў, ад якіх яны былі прысланы, а таксама даты. Аднак Павел надпісаў прачытаць не мог і паштоўкі гэтыя таксама прымаў за святыя абразкі, а купідонаў за анёлаў. Вось і цяпер, разгарнуўшы малітоўнік, ён набожна паднёс да вуснаў паштоўку з чырвоным сэрцам, якое трымалі купідоны, пацалаваў, асцярожна, далікатна паклаў яе ў кніжку і пачаў паволі мармытаць:

— «Прыгатуй твой пышны храм, о Сыёне!»

Ён замаўчаў і, утаропіўшыся вачыма ў кніжку, задумаўся. Ён думаў аб тым, хто гэты Сыён? Мабыць, нейкі кароль, а можа, вельмі багаты пан, калі святая кніжка загадвае яму пышны храм прыгатаваць. Што азначае пышны храм, ён разумеў, але словы гэтыя выклікалі ў яго ўяўленні вялікую, пышна прыбраную залу, якую ён бачыў аднойчы ў панскім палацы праз прыадчыненыя дзверы. Аднак жа хто гэты Сыён?

— «І прымі караля Хрыста...»

Каля брамы раптам загрукаталі калёсы. Забрахаў на суседнім двары Курта, зарыпелі вароты. Павел узняў галаву і прыслухаўся. Ціха. Акно нібы хто чорным саванам завесіў, а вецер і дождж з кожнай хвілінай шумяць мацней. Павел зноў нахіліўся над кніжкай.

— «Палюбі Марыю...»

Павел хвіліну падумаў:

«Ага! Гэта таму Сыёну, каралю або багатаму пану, святая кніжка загадвае палюбіць Марыю!..»

Ён чытаў далей:

— «Бо яна — брама нябесная».

Павел уздыхнуў:

— Ой, каб пасля смерці ўвайсці ў гэту браму нябесную...

Цяпер ён выразна пачуў, што ў сенцах ад двара зарыпелі дзверы.

«Напэўна, Аўдоцця»,— падумаў ён.

У сенцах пачуліся крокі, але гэта была не Аўдоцця. Тая ступала цяжка, моцна грукала грубымі ботамі. А тут нехта ступаў паціху, нясмела, краўся, як мыш. Павел напружана слухаў, несвядома камечыў пальцамі жоўтую старонку кніжкі і не зводзіў вачэй з дзвярэй. Ціхія, нясмелыя крокі заціхлі, а дзверы не адчыніліся. Нешта за імі зноў зашамацела і сціхла, і Паўлу здалося, што ён чуе нечае стрыманае цяжкое дыханне. Бровы яго ўзняліся ўгару, ён падышоў да дзвярэй і парывіста расчыніў іх насцеж.

— Хто тут? — запытаў ён.

— Гэта я.

— Хто? — зноў запытаў Павел і ўвесь падаўся наперад.

— Я... Франка.

Павел пераскочыў цераз высокі парог, вобмацкам знайшоў ля сцяны плячо ў шорсткім прамоклым рукаве і, моцна схапіўшы, уцягнуў у хату невысокую кволую кабету ў цёмным паліто, з якога на падлогу сцякала вада, у падзёртай хустцы, што закрывала галаву і твар. Калі бледнае святло лямпы ўпала на яе, яна, апусціўшы рукі, моўчкі спынілася ля дзвярэй. Павел адпусціў яе плячо, адступіў на крок, утаропіўся ў яе вачыма і голасам, падобным на ікаўку, усклікнуў:

— Ты!.. Ты!.. Ты!..

Сярод складак мокрай хусткі свяціліся, як вуголле, яе вялікія чорныя запалыя вочы, а вузкія бледныя вусны яшчэ цішэй, яшчэ баязлівей прашапталі:

— Я... Не гневайся...

Але Павел нават не чуў яе слоў:

— Вярнулася-такі!.. А я ўжо не спадзяваўся. Спачатку — чакаў... а пасля перастаў...

Ён пляснуў рукамі і замаўчаў, нібы захлынуўся слінаю і слязьмі. Прамоклая Франка ўсё яшчэ нерухома стаяла ля дзвярэй, толькі крыху гучней, хоць усё яшчэ нясмела, прамовіла:

— Калі можна мне тут застацца, дык добра, а калі не, дык я зараз пайду...

— Вось дурніца! — засмяяўся Павел.— Хутчэй, хутчэй распранайся, а то яшчэ *захварэеш* ад гэтай сырасці... — усхвалявана казаў ён, дрыжачымі рукамі зрываючы з Франкі хустку. [...]

Ён заклапочана правёў рукой па валасах:

— Трэсак няма... Каб на іх!.. У сенцах пакінуў... Пачакай хвіліначку, пачакай.

Ён хацеў быў адчыніць дзверы, калі Франка зноў, яшчэ гучней, з нейкім жахам усклікнула:

— Ой, не ідзі туды... не ідзі!

Павел устрывожана паглядзеў на яе.

— Чаму? — запытаў.

Яна не скранулася з месца, дрыжала як у ліхаманцы і, заламаўшы рукі, казала:

— Ой, што мне рабіць? Што рабіць? Калі пойдзеш туды папацёмку, дык наступіш і задушыш яго, а калі з лямпай пойдзеш, дык убачыш і мяне адразу прагоніш. Што мне, няшчаснай, рабіць? Што з ім будзе? О Ісусе! О Прасвятая Дзева Марыя, ратуйце мяне, няшчасную!

Трымаючыся за клямку дзвярэй, уражаны Павел запытаў:

— Што ты гаворыш? На каго я наступлю? Хто там у сенцах?..

Франка закрыла далонямі твар і, сутаргава ўсхліпнуўшы, усклікнула:

— Дзіця!

Павел акамянеў. Некалькі хвілін ён стаяў, як прыкаваны да месца. Лоб яго прарэзалі глыбокія маршчыны. Пасля ён павольна падышоў да стала, узяў лямпу і таксама павольна выйшаў з ёю ў сенцы.

Неўзабаве ён вярнуўся з нейкім скруткам вільготных лахманоў і моўчкі паклаў яго на пасцель побач з Франкай. Яна спалоханым позіркам сваіх чорных палаючых вачэй сачыла за кожным яго рухам. Не гледзячы на яе, Павел глуха запытаўся:

— Чаму ж ты адразу не ўнесла яго ў хату, а кінула, як шчаня, у холадзе на зямлі?

Сутаргава сціскаючы рукі, Франка прашаптала:

— Баялася...

Павел падышоў да печы і пачаў распальваць агонь. Рабіў ён гэта ўжо спакваля, без той бурнай радасці, якая толькі што свяцілася на яго твары. Дзве глыбокія складкі на яго лбе і моцна сціснутыя вусны надавалі яму змрочны, суровы выгляд. Ён прыставіў да агню гаршчок з крупнікам, заварыў чай у малым чайніку, паклаў на стол бохан хлеба і вялікі нож:

— Ідзі есці!

Гэта былі першыя словы, якія ён вымавіў за чвэрць гадзіны, не глянуўшы на Франку. Яна сядзела як акамянелая і не зварухнулася з месца.

Са скрутка, які ляжаў на пасцелі, пачуўся жаласны вокліч:

— Мама! Мама!

Вокліч гэты ўжо пераходзіў у плач, а Франка ўсё яшчэ не краналася з месца і, здавалася, нічога не бачыла і не чула. Павел раптам павярнуўся да яе. Маршчыны на яго лбе паглыбіліся яшчэ больш, а ў голасе загучалі злосныя ноты:

— Чаму дзіця са шмат не раскруціш? Можа, табе хацелася б, каб яно задыхнулася, га? Нягодніца! [...]

— Хрышчонае?

— А як жа! — прашаптала яна.

— А як завецца?

— Актавіян.

— Хтавіян,— паўтарыў Павел і змоўк. А праз нейкую хвіліну запытаў зноў: — А колькі ж яму?

— Год і восем месяцаў,— адказала Франка.

Дзіця толькі некалькі разоў глытнула чаю, а рэшту з прагнасцю выпіла Франка, заядаючы яго хлебам.

— Хочаш яшчэ? — запытаў Павел.

Яна паціху, слабым голасам, адказала, што чаю болей не хоча і што дзіця засынае. Яно і сапраўды засынала. Яго стаміла падарожжа і размарыла цяпло. Схіляючы галоўку на плячо маці і жмурачы павекі, яно яшчэ раз ціхенька прашчабятала:

— Цукаль! Дай... дай... дай!

І доўгія, як у Франкі, вейкі апусціліся, вусны, падобныя на бледную пялёстку ружы, замкнуліся. Але Франка ўсё яшчэ не ўставала з месца і не адрывала вачэй, поўных слёз і панурага смутку, ад няроўнай паверхні стала. Павел таксама доўга маўчаў. Нарэшце ўстаў.

— Ну, *ідзі* спаць! — паказаў ён на сваю пасцель.— Кладзіся і дзіця каля сябе пакладзі... Я на лаўцы пераначую...

Франка ўстала з дзіцем на руках і, зрабіўшы некалькі крокаў, спынілася перад ім.

— Чаго табе? — жорстка запытаў Павел.

Яна моўчкі ўзяла яго руку і паднесла да вуснаў. Але ён вырваў руку і павярнуўся да сцяны.

— Ну, *ідзі* спаць... *ідзі*... Бог з табой,— прамовіў Павел і хуткім, нібы мімавольным рухам пагладзіў яе па валасах, тут жа адвярнуўся ад яе, пагасіў лямпу і рэшткі агню ў печы.

У хаце стала зусім цёмна, і ў гэтай цемры было чутно, як распраналася Франка, а пасля даносілася толькі ціхае дыханне заснуўшых маці і дзіцяці. Толькі ля процілеглай сцяны да глыбокай ночы варочаўся на цвёрдай лаве Павел, чуліся яго доўгія ўздыхі і шэпт: то з жалем і роспаччу, то з трывогай і скрухай гэты гарачы шэпт быў звернуты да Бога. [...]

V

Мінула пара касавіцы і жніва. Шмат чаго адбылося за гэты час у дзвюх хатах, што стаялі побач. Аднаго разу, калі касілі лужок Піліпа непадалёку ад вёскі, Павел выйшаў раніцай з хаты і, акінуўшы позіркам неба, сказаў швагру, які нёс у хлеў салому:

— Хутчэй звазі сена з лугу, Піліп, бо не сёння, дык заўтра Гасподзь дожджык прышле. І па паветры відаць, што пашле надоўга.

У прадказанні Паўла наконт змен надвор'я Піліп верыў свята, а таму ён паспешна пачаў запрагаць каня, [redacted] Данілку загадаў падрыхтаваць граблі і вілы. [...]

Калі Піліп скончыў запрагаць каня, з-за спіны Паўла выскачыла Франка і сказала, што яна таксама паедзе на луг зграбаць сена. Дома яна ўсё ўжо зрабіла: ежу на цэлы дзень згатавала, карову падаіла і хоча дапамагчы Піліпу згрэбці сена. На Францы была белая як снег сарочка, блакітная паркалёвая спадніца і ружовы фартух. Чорныя валасы, выбіваючыся з-пад квяцістай хусткі, ападалі на яе лоб і плечы. Яна была сёння нейкая ажыўленая, пабліскавала вясёлымі вачыма і белымі зубамі.

Піліп сустрэў яе прапанову іранічным смехам:

— Ад гэтай тваёй работы хіба толькі *чорту* будзе пацеха!

Але Данілка запярэчыў:

— Хай едзе! Утраіх яно лягчэй і хутчэй будзе...

— Хай едзе! Пакажаце ёй, як грэбці, дык і патрапіць! А ўсё ж хоць крыху дапаможа,— сказаў Павел.

Франка села з Піліпам на воз і паехала, а Данілка пайшоў пехатой карацейшай дарогай. Але як толькі воз крыху ад'ехаў, Франка саскочыла на зямлю і пабегла да Данілкі.

— Гэй! — крыкнула яна Піліпу.— Мы той дарогай хутчэй дойдзем, як ты даедзеш!

Вярнуўшыся з лугу, Піліп са здзіўленнем расказваў жонцы, што «гэта вар'ятка» Франка даволі няблага зграбала сена і сапраўды дапамагла ім у рабоце.

— Каб не была гультайка, дык усё патрапіла б рабіць,— заключыў Піліп.

— Яна, як захоча, усё здолее, такая спрытная,— заўважыў Данілка, запіхаючы ў рот кавалак хлеба і пазіраючы праз акно на Франку, якая завіхалася на сваім двары, а вочы ў яго, як у ката, зелена паблісквалі. [...]

І раптам у канцы аднаго жнівеньскага дня ў хаце Казлюкоў закіпела, як у гаршку. Узняўся там пякельны крык дарослых і плач дзяцей. Піліп біў брата.

Было гэта ўвечары. Невядома дзе і адкуль Піліп даведаўся аб тым, за што цяпер біў брата, але даведаўся так нечакана і агідна, што тая агіднасць уразіла да глыбіні душы нават гэтага дужага і простага чалавека. Дагэтуль ён ніколі не крыўдзіў свайго малодшага брата, але зараз нібы звар'яцеў — такі гнеўны быў выраз яго твару і так моцна ён біў брата, адной рукой трымаючы яго за каўнер.

— Садом і Гамора! — крычаў ён, б'ючы яго.— З-за цябе пярун божы спаліць нашу хату! Гэта ж ён табе за роднага *дзядзьку* быў, на руках цябе насіў, розуму вучыў! А ты яму так аддзячыў! А ты [redacted] яго жонкай... За плуг, за цапы, за работу бярыся, а не [redacted] лайдачкай цягацца! Кару божую на нас і на дзяцей нашых хочаш наклікаць? [...]

І разам з градам абразлівых слоў на галаву і спіну Данілкі зноў пасыпаліся ўдары. Браты, як звар'яцелыя, тузаліся ля дзвярэй. Ульяна, заліваючыся слязьмі, крычала, ламала рукі і спрабавала іх разняць, дзеці раўлі што было сілы, у запечку кудахталі куры, і нават Курта працягла завыў пад лавай, а буры кот спалохана мяўкаў і кідаўся па хаце, не ведаючы, куды ўцячы. Якраз у гэту хвіліну ўвайшоў у хату Павел, які вяртаўся з ракі, пачуўшы крык і плач у хаце Казлюкоў, устрывожаны і здзіўлены, заспяшаўся туды.

Убачыўшы ў дзвярах Паўла, Ульяна, ці то жалем над няшчасцем брата пранятая, ці то баючыся страціць яго прыязнасць, заходзячыся ад плачу, упала яму ў ногі. Данілка вырваўся з рук Піліпа і выбег з хаты, а Піліп, з ускалмачанымі валасамі, з п'яным бляскам у вачах, звярнуўся да Паўла з тымі самымі грубымі, агіднымі словамі, якімі лаяў хлопца за яго злачынства. Расказ гэты заняў не больш як тры хвіліны, і калі Ульяна, стоячы на каленях, закрычала: «Маўчы, Піліп! Ой, Піліп, што ты робіш? Маўчы!» — Піліп ужо ўсё сказаў, і Павел выйшаў з хаты.

Ён пайшоў да сябе не праз двор, а пераступіў праз нізкі паркан у агарод і пакрочыў проста па градах. Ён быў бледны як палатно, і вочы яго кідалі маланкі. Гнеў і рэўнасць расхадзіліся ў яго мазгу, нервах і ў тым кавалачку цела, які б'ецца ў чалавека ў грудзях і завецца сэрцам. [...] Абышоўшы хату, ён прыпаў тварам да сцяны і зарыдаў. Выбух гневу і рэўнасці апаў, растаў у вялікім, разрываючым грудзі болю, у жалю да сябе, да Франкі і ў крыўдзе за тую чалавечую святую справу выратавання, якая двойчы азарыла яго душу нябесным святлом і двойчы скончылася нічым. Заламаўшы рукі і прыпаўшы тварам да шурпатай сцяны, ён, захлынаючыся ад плачу, мармытаў:

— Не, няма ўжо, відаць, для яе ратунку і збавення! Няма ўжо для мяне шчаслівай долі на свеце! Што мне рабіць? Божа мой усёмагутны! Божа мой літасцівы, што мне цяпер рабіць?

Праз гадзіну ён ужо плыў на сваім чоўне, які мільгаў маленькай чорнай кропкай на сталёвай паверхні Нёмана, пад небам, на якім запальваліся залатыя зоркі. За чоўнам бегла сярэбраная сцяжынка і журчала сваю адвечную манатонную песню. Усю гэту ноч Павел правёў на рацэ, а можа, на якім самотным узбярэжжы пад старой вярбой або дрыжачай асінай. [...]

Данілка казаў праўду. Думка аб сустрэчы з ім цвіком засела ў галаве Франкі і варам цякла ў яе жылах. Яе вабіў да хлопца не столькі інстынкт кахання, колькі жаданне паставіць на сваім, назло ўсяму і ўсім, дзікі бунт супраць кайданоў, якія звязвалі яе, і супраць ненавіснай рукі, якая яе ўтаймоўвала. І чым большую нянавісць яна адчувала да Паўла і яго сваякоў, тым мацней прагнула хоць на момант у абдымках маладога хлопца забыцца на тое, што яе паліла, мучыла. Яна была ўпэўнена, што Данілка прападае за ёю, што ён рады быў бы нават ажаніцца з ёю, каб яна была вольная, і ўцякае ад яе толькі таму, што баіцца Піліпа і Паўла.

Данілка і сапраўды ўцякаў ад яе. Хоць спачатку, асляплены і захоплены першай у жыцці любоўнай прыгодай, ён лёгка паддаўся шэптам Марцэлі і залётам Франкі, цяпер ён

баяўся не толькі гневу брата, але і граху, сораму. Ён астыў, махнуў рукой і рашуча сказаў сабе:

— І ведаць яе не хачу!

І таму, калі Франка, выбраўшы нарэшце зручны момант, прыбегла да яго на гумно і пачала ласціцца, абдымаць і шаптаць нешта, ён адпіхнуў яе і злосна сказаў:

— Адчапіся! Чаго прыліпла, як тая смала! Чаго табе трэба?

А калі яна яшчэ настойлівей пачала чапляцца да яго, ён ударыў яе кулаком і ўцёк.

Гэтага Франка дараваць ужо не магла. Як гэта! Хіба на тое яна нарадзілася, каб кожны хам біў яе кулакамі? Хто ж яна такая, каб цярпець гэта? Яна ім пакажа, хто яна такая! Папомняць яе!

Усё гэта назаўтра пасля няўдалага спаткання з Данілкам яна выказвала і выкрыквала, сноўдаючыся ўздоўж агароджы і пагражаючы кулакамі ў бок Казлюковага двара. Было яшчэ вельмі рана, але Павел на досвітку пайшоў на раку, а Піліп і Ульяна стаялі ля сваёй хаты і не ведалі, што рабіць. Іх пабляднелыя твары былі ўстрывожаны. Ля варот стаяла кучка цікаўных людзей, якія прыглядаліся, разявіўшы раты, да таго, што рабілася на Паўлавым двары. Была сярод іх і Аўдоцця, якая, вяртаючыся з суседняй вёскі ад хворай кабеты, спынілася ля брамы.

— Я пакажу вам, хамы, хто я такая! — крычала Франка.— Я навучу вас, як шанаваць тых, хто вышэй за вас. Я з панскага роду! Бацька мой у канцылярыі служыў, дзядуля свае дамы меў, маці на фартэпіяна грала... Чуеце? Вось хто я! Напішу Ключкевічу! А вы ведаеце, хто ён такі? Адвакат! Усё яму напішу, а ён вас усіх за мае крыўды ў Сібір сашле! Ён — пан і на пані жанаты. Ён багацей, усе паны перад ім шапкі скідаюць. Ён усе суды ў руках трымае і ўсё можа! Ён мой брат і за мяне ўступіцца... Усіх вас у Сібір сашле... усіх... усіх! На катаргу! На ўсё жыццё сашле! Каб і нагі вашай тут не было! [...]

Ульяна, калоцячыся ад жаху, стаяла пад сваёй хатай, адной рукой жагналася, а другой прыціскала да сябе спалоханых дзяцей, сярод якіх быў і Актавіян.

Раптам з-за хаты паказаўся Павел. Нехта ўжо збегаў на раку і паведаміў аб тым, што робіцца на яго двары. Ішоў

ён хутка, насунуўшы нізка на вочы шапку, і твар яго быў наліты чырванню. Насустрач яму пабегла Аўдоцця, заламаўшы рукі, пачала скардзіцца, што Франка назвала яе ведзьмай, накінулася на яе з кулакамі і, напэўна, забіла б яе, каб Аляксей і іншыя людзі не абаранілі яе. Павел парывістым рухам адсунуў сваю прыяцельку, адапхнуў двух мужчын, што стаялі на яго шляху, і, схапіўшы Франку за руку, пацягнуў у хату. Усё гэта рабіў ён моўчкі, не пераводзячы духу. Вачэй яго не было відаць з-пад казырка шапкі, твар палаў агнём. Калі разам з Франкай ён знік за дзвярыма хаты, прысутныя пачалі разыходзіцца, толькі некаторыя з іх засталіся на Казлюковым двары і, нібы яшчэ нечага чакаючы, маўчалі. І сярод гэтага маўчання пачуўся з хаты Паўла крык Франкі і паўтарыўся ўжо не два-тры, а шмат разоў. Пасля ўсё сціхла, людзі разышліся, а Казлюкі нават узяліся за сваю штодзённую працу. Толькі ў ляску ля могілак, дзе гулялі чацвёра малых, звінеў вясёлы смех ды час ад часу брахаў Курта, які выгравaўся на бледным вераснёвым сонцы.

У гэтым бледным святле вераснёвага сонца хата Паўла стаяла ціхая, як магіла. Дзверы яе былі зачынены, акно завешана саламянай матай і падпёрта жэрдкай. У цёмнай хаце Франка падпальвала ў печы. Адыходзячы, Павел суровым і глухім голасам загадаў:

— Падпалі ў печы і згатуй паесці, каб было гатова, калі я з ракі вярнуся. Калі не згатуеш — зноў буду біць!

Апынуўшыся ў цемры, Франка нейкі час, анямелая, скурчаная, сядзела на зямлі. Пасля ўскочыла і пачала, спяшаючыся, падпальваць у печы. Дрыжачымі рукамі яна кідала ў печ дровы і сухія трэскі і перарывістым, хрыплым, сіпатым шэптам казала:

— Згатую я табе страву, убачыш, якая будзе смачная. Аддзячу я табе... Усім вам пакажу... Будзеш задаволены сёння з маёй стравы... Будзе табе добра, калі паясі! Пачакай, пачакай! Хіба ўжо на тым свеце паспрабуеш такіх, як я, малаціць сваімі хамскімі кулакамі. [...]

Калі крупнік быў ужо гатовы, Франка падышла да сваёй скрынкі, што стаяла ў куце, адчыніла яе, дастала адтуль брудную падзёртую спадніцу і пачала шукаць кішэню.

Намацаўшы, яна засунула ў яе руку, дастала нешта, завернутае ў паперку. [...] Высыпаўшы з паперкі белы парашок у запраўлены малаком крупнік, яна пачала мяшаць у гаршку вялікай драўлянай лыжкай. Мяшала старанна, не спяшаючыся, вусны яе былі моцна сціснуты, у вачах свяцілася нерухомае полымя, на шчоках гарэлі чырвоныя плямы.

Было відаць, што рабіла яна ўсё гэта зусім свядома, нават з роздумам, і хіба толькі вопытны псіхіятр мог бы сказаць, ці была яна зараз у поўнай свядомасці. Пэўна толькі тое, што ў гэтую хвіліну яна жыла выключна гэтай хвілінай і ніякія ўспаміны, ніякія думкі аб будучыні яе не займалі. Не было ў яе душы ні дакораў сумлення, ні бараცьбы пачуццяў... [...]

Гадзіны за дзве да ранняга вераснёвага змроку Павел вярнуўся дадому, зняў з акна мату, адчыніў дзверы і ўвайшоў у хату. Печ была прыкрыта драўлянай засланкай, а Франка сядзела на ложку, скурчыўшыся і абхапіўшы далонямі галаву. Як толькі ў хаце стала светла, яна ўскочыла, схапіла кавалак палатна, што ляжаў на лаве, іголку і, ускочыўшы зноў на ложак, пачала шыць. Зірнуўшы на драўляную засланку, якой вясковыя кабеты зачыняюць печ, калі ставяць туды згатаваную страву, Павел успомніў, што ў яго ад учарашняга вечара нічога не было ў роце.

— Ці ёсць што з'есці? — запытаў ён лагадней і спакайней, чым некалькі гадзін таму, тонам чалавека, які пасля выбуху вялікага гневу пачынае адчуваць вялікую літасць. Атмасфера буры і сварак была яму неўласціва, ён прагнуў згоды і спакою.

— Ці ёсць што з'есці, Франка? — запытаў ён другі раз.

— Ёсць,— не ўзнімаючы галавы і вачэй, прамармытала яна.

— Налі і падай.

— Вазьмі сам,— адказала.

Ён адсунуў засланку, дастаў з печы гаршчок і, адрэзаўшы кавалак хлеба, стаў перад прыпечкам, які замяняў яму стол, і пачаў есці. Еў вельмі павольна. Хвіліну таму ён адчуваў сябе галодным, а цяпер страва не ішла яму ў горла. Яна здавалася яму гаркаватай. Ён думаў, што гэта прыкрасці залілі яго вусны і горла горыччу. Гэта яны,

прыкрасці, а не гаркаваты смак заглушаюць голад. З'еўшы толькі частку стравы, ён пакінуў лыжку ў крупніку, зняў світку, паклаўшы яе пад галаву, выцягнуўся на лаве і цяжка ўздыхнуў. [...] На дварэ пачынала шарэць, дзень ужо схіляўся к канцу. Павел у сне неспакойна паварушыўся раздругі і ціха застагнаў. Вусны яго скрывіліся, нібы ад болю, аднак ён не прачнуўся. Франка ўзняла галаву, зірнула на яго і, ускочыўшы з ложка, выбегла з хаты. Абышоўшы яе, яна хутка пакрочыла па сцежцы за стадоламі, якія стаялі блізка адна ля адной. Па ёй было відаць, што яна сама не ведала, навошта і куды ідзе. [...]

Раптам ад Паўлавай хаты, з двара, пачуўся вокліч:

— Ульяна! Ульяна! Ульяна!

Голас быў гучны, моцны, але нейкі дзіўны, у ім чуўся боль, ён клікаў на дапамогу. Франка падалася ў той бок, адкуль ён даходзіў, і куляй памчалася дадому. Прыпаўшы да сцяны, яна з-за вугла глядзела на двор. Павел стаяў ля дзвярэй тварам да хаты Казлюкоў і ўсё слабей і цішэй клікаў Ульяну. Дзеці гулялі тут жа, ля варот, але ніякай увагі на гэты вокліч не звярталі.

Нарэшце з хлява абазвалася Ульяна:

— Чаго?

— *Хадзі!* — паклікаў яшчэ раз Павел.— Богам прашу, хутчэй... Ратуй мяне!..

Хістаючыся і прыціскаючы да грудзей рукі, Павел пайшоў у хату. Спалоханая яго словамі і голасам, Ульяна выбегла з хлява.

Піліп высунуўся з хаты і закрычаў услед жонцы:

— Ты куды бяжыш, Ульяна?

— *Хадзі! Хутка!* — адгукнулася Ульяна і ўбегла ў хату Паўла.

Добрую гадзіну чуліся там прыглушаныя стогны Паўла, галашэнне кабет, якія мітусіліся вакол хворага. [...] Толькі калі Павел моцна застагнаў і Аўдоцця, падбегшы да яго, ускліннула ў роспачы: «Ён паміра! Хутчэй нясіце *грамніцу*! Людзі, злітуйцеся, хутчэй *грамніцу*!» — Піліп пабег дадому і прынёс адтуль кавалак тоўстай васковай свечкі. Абедзве кабеты з плачам запалілі яе і ўклалі ў руку хворага. З гэтай хвіліны яны то галасілі, то запальвалі свечку, то

падавалі яе хвораму, то забіралі яе ад яго. Кожны раз, калі пакуты Паўла ўзрасталі, свечку паспешліва запальвалі і падавалі яму, калі ж боль нібы заціхаў, яе адбіралі ў хворага і гасілі.

Тым часам у хату ўвайшла Франка і ціха, як прывід, прасунуўшыся ля сцяны, села на падлогу ў куце. Ніхто не звяртаў на яе ўвагі. [...]

Ужо гадзіны [illegible] дзве ў хаце Паўла панавала мітусня, і гэта другая гадзіна была страшнейшая за першую. На трэцяй гадзіне хворы пачаў стагнаць радзей, яго цяжкое цела, выцягнутае на пасцелі, цяпер курчылася менш, а твар, які ў змроку быў падобны на сутаргава перакрыўленую сінявата-белую маску, ужо набываў свой звычайны выгляд.

— Табе лягчэй? — схіляючыся над ім, спытала Аўдоцця.

— Лягчэй,— слабым голасам адказаў Павел. [...]

— Вось яно як! *Ведаеш*, Паўлюк, цябе атруцілі! Жонка табе атруты дала! Чуеш?

Павел, пачуўшы гэта, нібы спружынай падкінуты ўгару, падняўся, сеў на пасцелі, і з вуснаў яго вырваўся толькі адзін пытальны гук:

— Га?

— Атруціла,— паўтарыў Піліп.— У ежу атруты табе ўсыпала...

Аўдоцця і Ульяна заламалі рукі.

Аўдоцця кінулася да хворага:

— Ты еў сёння што-небудзь?

Павел цяжка ўпаў на пасцель. [...]

І раптам у гэтай цішыні, якую парушаў спалоханы шэпт жанчын і трэск агню, здалёк, з процілеглага берага ракі, даляцеў басовы, працяглы, некалькі разоў паўтораны вокліч:

— Паром! Паром! Паaром!

Піліп, мабыць, першы раз з таго часу, як меў паром, не звяртаў на гэты крык ніякай увагі, але Данілка адразу выбег на вуліцу, а праз хвіліну вярнуўся, сунуў галаву ў дзверы і голасна прашаптаў:

— Піліп, хадзі хутчэй! *Ураднік!*

Ён здалёк пазнаў добра знаёмых коней *урадніка* і голас яго фурмана.

Піліп падхапіўся і куляй вылецеў з хаты. Ён схапіў *шост*, які стаяў пад сцяной яго хаты, і пабег уніз да ракі, забыўшы нават надзець шапку. [...]

Хата Паўла на нейкую хвіліну апусцела.

Павел расплюшчыў вочы.

— Франка! — паклікаў ён слабым голасам.

У куце паміж вядром з вадой і гаспадарчымі і рыбацкімі прыладамі пачуўся лёгкі шолах, і адтуль, як пануры прывід, з'явілася ціхая, згорбленая Франка з галавой, абкручанай зрэбнай шматай. Яна зрабіла некалькі крокаў наперад і, сутаргава сціскаючы на грудзях сарочку, спынілася, апусціўшы галаву.

— Франка,— слабым і павольным голасам пачаў Павел,— гэта праўда?

Яна маўчала, не адрываючы вачэй ад зямлі.

— Франка, ты ніколі не хлусіла... Скажы, ці гэта праўда?

— Праўда,— адказала яна.

Павел зноў заплюшчыў вочы. Ён не застагнаў, нічога не сказаў, толькі лоб яго стаў мокры ад поту і яшчэ мацней сцяліся яго вусны. Франка ўсё яшчэ стаяла на тым самым месцы, утаропіўшы позірк у агонь. У вачах яе не было ні жаху, ні жалю, у гэтую хвіліну ў іх не было нічога пэўнага. У застылым яе позірку толькі час ад часу мільгалі з'едлівыя агеньчыкі.

У сенцах пачуліся паспешлівыя крокі, і, задыханы, ускалмачаны, без шапкі, увайшоў Піліп.

— Не сярдуй, швагер,— сказаў ён рашуча.— Зараз прыйдзе *ўраднік* і забярэ гэту шэльму. [...]

Некалькі хвілін у хаце панавалі мітусня, гоман, тупат ног. Піліп, Ульяна і Аўдоцця, якая вярнулася з зёлкамі, гаварылі ўсе разам, расказвалі, сведчылі, паказвалі гаршчок з крупнікам. Калоцячыся ад жаху, Франка некалькі разоў кідалася да дзвярэй, але яе затрымлівалі і штурхалі ў глыб хаты. *Ураднік* слухаў, дзівіўся, абураўся, потым падышоў да Паўла і пачаў задаваць яму пытанні. Але той ляжаў з заплюшчанымі вачыма і моцна сцятымі вуснамі, нерухомы,

як бервяно, і маўклівы, як магіла. Ён толькі тады расплюшчыў вочы, калі *ўраднік* голасна загадаў Францы:

— Ну, апранайся, ды хутка!.. Паедзеш на шпацыр... [...]

Пілін праводзіў *ўрадніка* да брычкі, а жанчыны наблізіліся да хворага.

— Ну як, лепей табе, Паўлюк? — пыталі.

— Зусім ужо добра,— адказаў Павел.

Ён хлусіў. Праўда, ён праглынуў атруты не столькі, каб ад яе памерці, але і не столькі, каб так адразу ад яе ачуняць. Самы страшны боль ужо мінуў, моцны, здаровы арганізм паспяхова змагаўся са смяротным дзеяннем атруты, крыху дапамаглі таксама і Аўдоцціны лекі. Усярэдзіне ён яшчэ адчуваў боль, які, аднак, мог ужо ўтоіць. [...]

— Дзякуй вам, даражэнькія, і за дапамогу, і за ратунак, і за добрае сэрца... Ідзіце цяпер спаць, адпачніце... Шмат каля мяне напрацаваліся... [...]

Зусім супакоіўшыся, кабеты пагасілі ў печы агонь, на стале лямпу і пайшлі. Калі іх крокі і галасы заціхлі, Павел са стогнам прыўзняўся на пасцелі, спусціў ногі, сеў і нейкі час сядзеў нерухома, нахіліўшы галаву. Чаму ён так настойліва выпраўляў усіх з хаты? Чаму хацеў застацца адзін? Яму трэба было ў самоце і цішыні падумаць над тым планам, што ўзнік тады, калі Франка з *урадніком* праходзіла амаль ля самай яго пасцелі, дрыжачая, паслухмяная, са смяротным жахам у вачах. [...]

Доўга ў цёмнай хаце панавала грабавое маўчанне, аж нарэшце праз якую гадзіну пачуліся словы:

— Не пакіну цябе аж да самай смерці.

І амаль адначасова з гэтымі словамі, вымаўленымі шэптам, бліснуў сіні агеньчык запалкі. Павел, хістаючыся, зрабіў некалькі крокаў і запаліў лямпу.

У вокнах Казлюкоў было цёмна, там ужо спалі. Спала ўся вёска.

Павел укленчыў перад ложкам і, прыгнуўшыся амаль да самай падлогі, пачаў выцягваць з-пад яго нейкі важкі прадмет. Гэта было справай нялёгкай. Ён некалькі разоў выпростваўся, адпачываў, стагнаў. Яго даймалі боль і слабасць, але таксама, як нядаўна Франку, адно нейкае пачуццё, адна думка ўзбуджалі яго нервы, заглушалі боль, узнімалі

сілы. Нарэшце ён выцягнуў з-пад ложка ладную скрынку, акаваную жалезам і замкнёную на ключ. [...]

Саслабелымі рукамі ён дастаў з-пад выкінутага са скрыні адзення даволі ладную палатняную торбачку, набітую нечым цвёрдым і моцна завязаную шнурком. Бацькоўскі гаршчок з сярэбранымі рублямі, закапаны некалі пад печчу, ён адкапаў даўно, грошы перасыпаў у торбачку і схаваў на дно акаванай жалезам замкнёнай скрыні. Спадзяваўся скарыстаць іх калі-небудзь на пабудову новай хаты або скарыстаць у чорны дзень хваробы ці старасці. Ён добра ведаў, колькі круглых бліскучых манет было ў гэтай торбачцы. Не вельмі багата. Крыху болей за сотню. Але ведаў, што *ўраднік* быў бедны, любіў гарэлку, меў дзяцей... Схаваўшы торбачку за пазуху, Павел паклаў адзенне назад у скрыню і засунуў яе пад ложак, а пасля нацягнуў боты і надзеў світку. Ён вельмі спяшаўся. [...]

Мінула некалькі гадзін. Позні асенні досвітак пагасіў ужо зоркі на небе, а над зямлёй і ракой клубіўся халодны і вільготны туман, калі да берага пад гарой прыстаў човен, у якім сядзелі два чалавекі. Ці сілы было мала ў Паўла і, вяслуючы слаба, ён плыў павольна, ці размова з *урадн**і**кам* болей, чым ён спадзяваўся, заняла часу, і таму ён вяртаўся так позна? Затое ён вяртаўся не адзін. [...]

Калі Павел адчыніў дзверы сваёй хаты і ўвайшоў у сенцы, Франка спынілася ля парога.

— Уваходзь!

Франка пераступіла парог, прайшла следам за ім праз сені, а ўвайшоўшы ў хату, зноў спынілася ля дзвярэй і, нібы сляпая, не ведала, куды ісці.

Павел цяжка апусціўся на лаву і сказаў:

— Распранайся!

Яна павольна зняла хустку, адкрываючы чорныя раскалмачаныя валасы і воскава-жоўты твар з сінімі вуснамі і апушчанымі павекамі. Яна стаяла, апусціўшы рукі, і выглядала зусім так, як абвінавачаны перад судом, і ўсё ў ёй казала аб страшэнным цяжары сораму. [...]

Павел сеў на лаўку і слабым голасам пачаў:

— Вось і гэтым разам я цябе выратаваў, хоць ты і ўчыніла вялікі грэх... Але каб ты засталася там, дык ужо навекі

згінула б, а тут, можа, яшчэ адумаешся, можа, хоць цяпер злосці сваёй спалохаешся... Пашкадаваў я цябе, ой як пашкадаваў. А яшчэ і таму я цябе выратаваў, што прысягаў перад Богам не пакідаць цябе да самай смерці... А калі прысягаў, што не пакіну, дык і не пакіну... і да смерці, як прысягаў... не пакіну...

Цяжка было яму гаварыць, але ён бачыў, што Франка стаіць нерухомая, як аслупянелая, а таму дадаў:

— Ну, чаго ж ты стаіш? У хаце холадна, ты бы ў печы падпаліла ды чаю зварыла сабе і мне... Рабі што хочаш, што трэба. Ты тут такая самая гаспадыня, як і раней была.

Якая сіла захоўвалася ў яго апошніх словах, чаму яны так уразілі Франку? Яна захісталася, нібы сэрца яе прабіла куля, калені пад ёю падламіліся, і, заліваючыся чырванню, а пасля слязьмі, яна ўпала ніц. Яна не крычала, не рыдала, не стагнала. Наадварот, прыпаўшы тварам да зямлі, ляжала некалькі мінут як нежывая, і толькі мерныя рухі яе плячэй, якія то ўздымаліся, то апускаліся ад ціхага, бязгучнага плачу, сведчылі аб тым, што яна жывая. [...]

З таго часу яна ніколі не падыходзіла да Паўла, а калі падавала яму што-небудзь, дык працягвала на ўсю даўжыню руку. Яна ніколі першая не звярталася да яго, а калі ён выклікаў яе на гаворку, адказвала мякка, далікатна, апусціўшы вочы. [...]

На твары яе часта без усялякай прычыны адбівалася боязь, блізкая да жаху, нібы палохалі яе нейкія патаемныя думкі або паўстаўшыя перад яе вачыма прывіды. [...] Аднойчы яна нават спалохана ўскрыкнула.

— Чаго ты? — павярнуўшыся ад сцяны, запытаў Павел.

Франка нібы апрытомнела і неахвотна адказала:

— Нічога. Вельмі спалохалася.

— Чаго? — запытаў Павел.

Не адказала, а далей пачала замятаць хату.

А ў Паўла ад яе пакорнасці сэрца млела ў грудзях.

Нарэшце адумалася! Нарэшце ён адолеў таго д'ябла, які ў ёй сядзеў! Але тым больш ён шкадаваў яе. [...]

Неўзабаве пасля вячэры Франка пакорпалася ў сваёй скрынцы і дастала каляровы шарсцяны пояс. На ёй была саматканая спадніца, ружовы фартух і падзёрты гарадскі каптан, які яна падперазала тым поясам. Павел на гэта не

звярнуў увагі. Ён ужо распранаўся, седзячы на пасцелі, і якраз сцягваў боты, калі Франка падышла да яго з заснуўшым Актавіянам на руках. Яна моцна пацалавала малога і паклала яго на ложку каля Паўла.

— Будзь да яго такім жа добрым, якім быў да мяне... Ён ні ў чым не вінаваты,— прашаптала яна.

Павел здзівіўся:

— Ці ты *здурэла*, Франка? Хіба я яго не люблю і не шкадую?

Франка, стоячы перад ім, нахілілася амаль да зямлі, таксама як тады, калі ён з-пад арышту яе вызваліў, хуткім і нізкім паклонам. Так кланяўся Павел *ураднiку*, калі спачатку прасіў яе вызваліць, а пасля дзякаваў яму за гэта.

Павел нічога не сказаў. Паклаўшы галаву на падушку, ён думаў: «Саромеецца яшчэ! Яшчэ не можа забыцца аб тым, што зрабіла, не можа! Ну і дзякуй Богу!»

З гэтымі думкамі ён і заснуў. Спаў і не чуў, як усё мацней шуміць на двары вецер. Не чуў і таго, як сярод ночы лёгка зарыпелі дзверы хаты.

А на досвітку абудзіў яго гоман людскіх галасоў. І ў гомане гэтым паўтараліся імёны яго і Франкі. Ён ускочыў з ложка і, як быў у зрэбнай бялізне, босы выбег [illegible] хаты. Там, дзе канчалася сядзіба Казлюкоў, якая аддзялялася пясчанай дарогай ад могілак, стаяў натоўп мужчын і кабет. Нечым, відаць, напалоханыя, яны крычалі і паказвалі пальцамі ў тое месца, дзе паміж дзвюх старых соснаў стаяў толькі вельмі высокі крыж. Пачуўшы сярод гэтага гоману некалькі слоў, Павел, як шалёны, кінуўся туды. Але не паспеў яшчэ дабегчы, як наляцеў моцны парыў ветру, і паміж соснаў нізка над зямлёй затрапятаў ружовы фартух Франкі. Павел убачыў толькі гэту ружовую шматку, асветленую бледным святлом сонца, якое вызірнула з-за хмар, але зразумеў усё. Цяпер ужо і ён яе не выратуе! Ён ухапіўся рукой за паркан, а Ульяна і Аўдоцця, якія беглі яму насустрач, заўважыўшы, відаць, нешта жахлівае на яго твары, выцягнулі да яго рукі і закрычалі ў адзін голас:

— Ратуйце, людзі! Трымайце, ратуйце яго! Зараз упадзе і памрэ!..

Ён не памёр. Гэта няпраўда, што людзі здаровыя, моцныя духам і целам паміраюць ад маральных пакут. Здаровы, дужы сялянскі арганізм Паўла Кабыцкага не надламалі і нават не аслабілі тыя некалькі гадоў, якія агністай маланкай або страшэннай бурай пранесліся над яго ціхім і роўным шляхам жыцця.

З таго дня, калі так раптоўна закончылася гэта гісторыя, мінула ўжо шмат гадоў, аднак і цяпер можна бачыць гэтага наднёманскага рыбака, які плыве ранкам у сваім чоўне па сярэбраных хвалях ракі насустрач ружоваму світанку або ўвечары пад хмары і змрок захаду. Калі пад сасновым борам ён выходзіць [redacted] чоўна на пясчаны бераг або прычальвае да вострава, пакрытага снежнай беллю гваздзікоў і лесам высокай дзіванны, часта побач [redacted] ім можна бачыць дзесяцігадовага хлопчыка [redacted] валасамі, светлымі, як лён, і вялікімі чорнымі, пад доўгімі вейкамі, вачыма. [...]

1888

Зімовым вечарам

(Скарочана)

Яшчэ было не позна, але вельмі цёмна. На хмарным небе — аніводнай зорачкі. Вецер вірыў над самай зямлёю, слупамі ўздымаўся ўгару, шумам, енкам і свістам спяваў у глыбокай катлавіне, па дне якой праходзіў роўны, шырокі шлях замерзлай ракі. [...]

Над самым рэчышчам сунулася наперад постаць самотнага чалавека. На фоне цьмянай белі снегу постаць гэтая здавалася тонкай рысачкай, што хутка ўразалася ў яшчэ чарнейшую цемру. [...]

Усё, што акружала чалавека, хоць і чорнае, дзікае, пустыннае, не запавольвала яго хады, не рабіла яе няўпэўненай. Наадварот, штосьці папіхала яго ззаду, падганяла наперад усё мацней ды мацней. Куды? Можа, да нейкага

месца ратунку ці прытулку, бачнага толькі яго вачам, што слеплі ад цемры і націску завірухі, а можа, і гэтым вачам невядомага, толькі напісанага ў цемры вогненнымі літарамі, як покліч: «Наперад! Наперад! Абы далей!»

Чалавек ішоў хутка, напрасткі, ціха, як прывід, пасоўваўся па крыху святлейшай за яго самога цемры. Часамі толькі каля ног чалавека чуўся кароткі металічны стук кія па не схаваным у снезе ўзбярэжным камені.

Раптам чалавек спыніўся, узняў галаву ў той бок, дзе былі чорныя плямы, што цягнуліся на гары ланцугом, мільгаючы чырванаватымі агеньчыкамі. Ён глядзеў, відаць, на гэты ланцуг, а з посвістам завірухі, якая слупам узнялася з-пад яго ног, змяшаўся чалавечы стогн, поўны здзіўлення, адзін толькі працяглы гук:

— А-а-а!

Чалавек здзівіўся. Некалькі хвілін глядзеў угару, і яшчэ раз, але ўжо цішэйшы ды карацейшы покліч пачуўся і выснаў яго паміж двух бясконца доўгіх стогнаў завірухі:

— А-а-а!

Потым ён зноў ішоў далей, аднак куды павальней, чым дагэтуль. Па рухах галавы можна было б пазнаць, з якім напружаннем чалавек глядзіць на раку, на пустыннае ўзвышша супрацьлеглай сцяны, дзе толькі зрэдку заўважаюцца тонкія рысы дрэў, як насцярожана пазірае ён на цьмянавата-белыя ўпадзіны і бугры гэтага ўзвышша, пад якім цяпер ідзе, усё больш ды больш запавольваючы хаду. [...]

Чалавек выйшаў на дарогу, перайшоў на другі бок і апусціў руку на брамку першай з краю вясковай сядзібы. Перш чым адчыніць брамку, ён пагледзеў напружаным позіркам на хату, што стаяла далей на панадворку, і яшчэ раз пачулася працяглае:

— А-а-а!

Чалавек паківаў галавой, нібы ён глыбока, бязмежна здзіўляўся. Рыпнулі вароты, дробны цень сабакі з гучным брэхам пакаціўся ад парога па двары; за акном, што пабліскавала ў цемры чырвоным агеньчыкам, чуўся нізкі, моцны, але па-маладому свежы голас, які хутка, доўга і няспынна пра нешта гаварыў, гаварыў, гаварыў...

* * *

Гэта была сядзіба старога Сымона Мікулы, які цяпер у прасторнай і нізкай хаце сядзеў на зэдліку і прытрымліваў каля рота вялікую гліняную люльку з кароткім цыбуком. Было яму, відаць, за шэсцьдзесят, аднак зусім не быў ён падобны да тых бацькоў, якіх б'юць сыны, або да тых, каго, як ужо непатрэбнага, выганяюць з хаты. На фоне задымленай сцяны, да якой ён прыхіліўся шырокімі, толькі крыху ссутуленымі плячыма, у цьмяным святле лямпы з высокім шклом, што стаяла на стале, вырысоўваліся магутныя абрысы чалавека, апранутага ў белую вопратку; густыя клубы дыму, якія ён раз-пораз выпускаў з рота, то засланялі, то адкрывалі вялікую, над ілбом палыселую, а ззаду сівую галаву, буйныя рысы прадаўгаватага румянага твару, на якім тапырыліся густыя пругкія вусы і паблісквалі мудрыя вочы, што пазіралі з-пад абвіслых броваў са спакойнай энергіяй, востра, пранізліва. [...]

А людзей у хаце было многа, і ўсе яны ў гэты момант сядзелі або стаялі, нерухома застыўшы ад цікаўнасці і ўвагі да таго, пра што расказвалася.

Старэйшы Мікулаў сын, бондар, мужчына каля сарака, абапёрся на лаву рукою з гэблікам, якім толькі што абгладжваў зуб ад бараны, унурыў галаву, а быў такі абраслы, што толькі чорныя агністыя вочы паблісквалі, як іскры ў зарасніку. Яго жонка, амаль у тых жа гадах, стаяла каля камінка, на якім гарэў агонь, асвятляючы ўсю яе — высокую, дужую, з горда ўзнятай галавой і складзенымі на грудзях рукамі. Адразу ж за гэтай самавітай, з прыгожымі рысамі, статнай гаспадыняй, крышку далей, у цені за высокай прасніцай калаўрота, сядзела Мікулава дачка. Яна толькі што прала, а цяпер застыла, узняўшы руку да жаўтлявай кудзелі, чырвоныя вусны яе раскрыліся, і ўся яна, прысадзістая, з цёмнымі рукамі, кірпатым носам, румянымі шчокамі, блакітнымі вачыма і трохі рыжаватымі валасамі, што рассыпаліся па нізкім ілбе, уся замерла, нібы зачараваная, ад здзіўлення і жаху. Такі самы жах, але яшчэ большая цікаўнасць ахапілі невялікую, шчуплую бабулю, што нізка сядзела на перавернутых ночвах, а перад ёю стаяла поўнае рэшата струкоў фасолі. З недалушчанымі струкамі ў

касцістай моцнай руцэ яна павярнула да святла галаву ў круглым, нібы прыклееным, чырвоным чапцы, а водбліскі агню дзіўна румянілі яе зморшчаны лоб і твар, запальвалі мігатлівыя іскры ва ўпалых, але быстрых вачах. Таксама ахопленая здзіўленнем, сядзела маладзенькая, свежая, стройная, як бярозка, жонка малодшага Мікулавага сына. Сядзела яна ў святле, насупраць панурага бондара, і каля грудзей, прыкрытых сіняй кофтай, калыхала немаўлятка. Вялікі лазовы кошык, у якім спала яшчэ адно малое, звісаў з задымленай бэлькі на тоўстых вяроўках, побач з шырокім тапчаном, засланым па сене дзяругай. Дзве дзявочыя галоўкі, аслоненыя пасмамі льяных валасоў, схіляліся з высокай і шырокай печы. З-за шырокіх бондаравых плячэй высунуўся светлагаловы падлетак, на каленях якога ляжалі клубкі шнура, а ў руках была ігліца, якою плятуць венцеры. Хто ў поўным асвятленні, хто ў хісткім прыцемку — усе гэтыя дванаццаць чалавек, жанчыны і мужчыны рознага веку, нерухома застылі ў нізкай хаце, у якой шмат месца займалі гаспадарскі посуд, рыбацкія прылады і шырокія кросны.

Пасярод хаты стаяў той, хто расказваў. Гэта быў малалзейшы з двух Мікулавых сыноў, высокі, статны трыццацігадовы мужчына. Яго пастава і вопратка гаварылі пра ўпэўненасць і імкненне да некаторай элегантнасці. Ён, відаць, толькі што вярнуўся з дарогі, бо яшчэ не скінуў спраўнага кажушка, над чорным авечым каўняром якога рэзка выдзялялася рыжаватая, коратка пастрыжаная барада і румяны твар. Залатыя, з рыжаватым адлівам валасы, адкінутыя назад, адкрывалі святлейшы за твар лоб, смелы і разумны. У руках мужчына ўсё яшчэ трымаў пугу, якой падганяў у дарозе коней, і вось, размахваючы рукамі, ён расказваў:

— Далібог, праўду кажу! Каб я здох, калі лгу! Увесь свет быў сёння ў мястэчку, і ўсе так пра гэта гаварылі, што і гандлю ніякага не было. Усе гавораць, што гэта Бонк, той самы, які дзесяць гадоў таму назад разам з супольнікамі, каб ім дабра не было, зарэзаў траіх чалавек...

— Яўрэяў, здаецца, ці каго? — прамармытаў, узнімаючы руку да валасоў, пануры бондар.

— Але,— пацвердзіў расказчык,— двух яўрэяў і адну бабу, што тады ў іх начавала, забілі, ды ўсяго толькі

трыццаць рублёў знайшлі ў іх. Тады яго злавілі і ўбачылі, што гэта быў той самы Бонк, які некалькі гадоў дзесьці далёка ад нас вычвараў... Крамы рабаваў і грошы падрабляў, і толькі таго, што не забіваў яшчэ... А тут ужо і забіваць пачаў!.. Ажно тут яго ў суд і на катаргу асудзілі, навечна ў Сібір, а ён з турмы ўцёк. Уцёк, злыдзень, пераапрануўся і рабочым на нейкую *хвабрыку* пайшоў... Пайшоў рабочым на нейкую *хвабрыку* і колькі гадоў жыў там з падробленым пашпартам... Ажно і там яго злавілі і білі за тое, што ўцякаў, не на жартачкі білі, кажуць, сто бізуноў, злыдзень, атрымаў.

— Ай,— жаласліва войкнула маладая жанчына, што закалыхвала на руках малое.

— А-а-а! — здзіўлена паківала галавой баба.

Падлетак, што пазіраў з-за бондаравых плячэй, шырока расплюшчыў вочы, яснасць і чыстату якіх замуціла трывога.

— Вытрымаў! Ах ты, Божа ж мой, усё ж вытрымаў! — заўважыла гаспадыня, не мяняючы паставы і не разнімаючы рук.

— Але! — выгукнуў расказчык.— *Чорт* не ўзяў яго душы! У *бальніцы* трохі паляжаў, і ў Сібір яго пагналі. Загналі далёка, ажно на край свету, каб ужо другі раз не ўцякаў. А ён *узяў-такі* ды ўцёк...

— З катаргі ўцёк? — вымаючы з рота люльку, упершыню азваўся стары Мікула.

— Але, татка, з катаргі. [...] Кажуць, па ўсёй імперыі шукалі, ды вось табе!.. *Каб яго ваўкі задушылі...* тут яго знайшлі...

— Ай,— азвалася з-за калаўрота Ганулька.

Гаспадыня расчапіла рукі, і ўпершыню задрыжалі ад страху яе прыгожыя, усё яшчэ чырвоныя вусны.

— *Дзе?* — зноў аказаўся Мікула.— *Дзе* знайшлі? Адзін дурань гаворыць, другія дурні цешацца... [...] А ты не брэшаш, Аляксей? А ты не выдумаў гэтага, каб баб напалохаць?.. А ты спрабаваў калі *бацьку* маніць? Га?

Малады мужчына, зірнуўшы на старога крыху ўстрывожана, з крыўдай у голасе адказаў:

— Калі я лгу, дык і пісар ілжэ. Ад пісара я найбольш і наслухаўся пра гэтую авантуру, бо ў канцылярыю прыйшла

папера, што ён толькі што тут быў і зноў прапаў... Але, відаць, яшчэ далёка не зайшоў, дык каб яго шукаць... Такая папера прыйшла...

— Можа, і *хватаграфію* ў канцылярыю прыслалі? — спытаўся бондар.

Аляксей пагардліва махнуў рукою:

— З такіх, як ён, *хватаграфіяў* не рысуюць... З іншых рысуюць... Але пісар гаварыў, што папера прыйшла. Шукайце, кажа, калі ў Бога верыце, шукайце, а то, кажа, усяму свету вялікая бяда будзе... Разбоі будуць, кажа, зладзейства, рабункі будуць! Так і так будзе... А калі яго хто зловіць, дык зараз жа ў турму адашлём, кажа... Цяпер, кажа, ужо не сто бізуноў, як раней, а дзвесце яму ўлепяць за тое, што другі раз уцякаў. У кайданы жалезныя, моцныя закуюць і на ўсё жыццё на катаргу запрагуць... Вось як!

Ніхто не паварухнуўся, усе маўчалі. Здавалася, нібы па гэтай хаце, такой спакойнай, цёплай і людной, праплыў пануры прывід з акрываўленай спіною. Мікула нарэшце выпрастаў плечы, пастукаў люлькай аб край стала, вытрасаючы попел, працягнуў руку па грошы, якія сын, прывёзшы з кірмашу, палажыў на стол.

— Правільна,— сказаў стары.— Так з кожным злыднем трэба рабіць. Няхай не сваволяць; чужога не чапаюць, нявіннай крыві не марнуюць, бо так рабіць забараніў сам Пан Бог Найвышэйшы, а ўсім нявінным людзям павінна быць абарона ад крыўды і несправядлівасці, павінна быць бяспека. *Годзе!* [...]

Усе маўчалі, бо ведалі, што калі ўжо стары сказаў гэтае слова, то ўсе спрэчкі і справы, як сямейныя, так і іншыя, лічацца поўнасцю вырашанымі. [...]

Рыпнулі дзверы, у хату спачатку ўварваўся з брэхам кудлаты сабака, і неўзабаве з парога пачулася прывітанне:

— Хай будзе пахвалёны!

Голас быў нізкі, хрыплы, чалавек дыхаў цяжка.

— На векі! — адказалі прысутныя.

Мікула, прысланіўшы рукою вочы, пазіраў на дзверы; гаспадыня адвярнулася ад агню, застыў бондараў гэблік, спыніўся Ганульчын калаўрот.

— Пан гаспадар і пані гаспадыня,— гаварыў з парога нізкі і хрыплы голас,— я падарожны, ласкі вашай прашу.

Дазвольце гадзінку пасядзець у цёплай хаце. Пагрэюся і далей пайду... Не надакучу вам.

— Калі ласка! Уваходзьце і пасядзіце,— адказаў стары.

— Чаму ж нельга? Уваходзьце, калі ласка, пагрэйцеся,— ветліва запрасіла гаспадыня.

Чалавек ступіў наперад, у шырокую, асветленую агнём паласу. Гэта быў рослы, плячысты мужчына, аднак вельмі худы. На ім былі грубыя порткі, засунутыя ў боты, і сурдут з даволі тонкага сукна, моцна парваны на адным плячы. Вопратка гэтая не надта падыходзіла для падарожжа ў завірушную зімовую ноч. І таму, можа, доўгі касцісты твар чалавека быў бледны, падобны на тонкую жаўтлявую паперу. Таксама падобны на пакамечаную паперу быў і высокі, з залысінамі лоб, над якім блішчалі рыжаватыя валасы. Рыжаватыя вусы прыкрывалі тонкія вусны; прадаўгаватыя вочы адлівалі такім блакітам, што здалёк прыцягвалі да сябе ўвагу. Быстрым позіркам ён акінуў усё ў хаце.

— Сядайце, калі ласка, адпачніце! — не адыходзячыся ад печы, сказала гаспадыня.— Ясік,— паклікала яна сына,— падай пану зэдлік.

Яна назвала яго панам, бо на ім быў сурдут, і хоць з парога чалавек загаварыў на мове, на якой гаварылі ў гэтай хаце, адчувалася, што звычайна ён ёю не карыстаўся.

Госць сеў на зэдліку, паставіў паміж каленяў тоўсты, з жалезным наканечнікам кій і пачаў расціраць вялікія, чырвоныя, з агрубелымі пальцамі далоні. Прыўзняўшы галаву, ён усміхнуўся, і ўсмешка гэтая, хоць і вясёлая, здавалася недарэчнай.

— Ой, холадна, холадна... — заенчыў.— І галодна! — дадаў, аднак жартаўлівая ўсмешка не сышла з яго твару. Можна было падумаць, што наракае ён жартам.

— Вецер сёння такі, што не дай табе Божа,— сказаў Аляксей.

— Хочаце есці? — спытаўся бондар, адарваўшыся ад работы і з цікаўнасцю разглядаючы госця.

Той зноў пачаў расціраць рукі:

— З'еў бы, вядома, з'еў бы, калі б што было, але нічога з сабою ў дарогу не ўзяў...

Ён пасміхаўся весела, нібы жартаўнік, што хоча развесяліць кампанію і сваёй весялосцю заваяваць яе прыхільнасць, але яго хрыпаты голас рыпеў, як непадмазанае кола, а вочы прагна ўглядаліся ў печ.

— Два дні ў дарозе... — зноў загаварыў госць.— Ды дзе там!.. Памяць мая ў галаве замерзла, ці што? Ужо два тыдні ў дарозе... іду вось, іду ды шукаю, чаго не згубіў, і невядома толькі, ці знайду... Ха, ха, ха!

Гаварыў ён голасна, яшчэ больш голасна смяяўся. Кій высунуўся паміж каленяў і ўпаў. Чалавек вельмі ж хутка і спраўна нахіліўся і падняў яго.

Усе маўчалі. Ніхто тут апрача бацькі нічым не распараджаўся.

Мікула абыякава глядзеў на госця, а потым павольна павярнуў галаву ў бок старэйшай нявесткі:

— Хрысціна! *Маеш што есці?* Калі *маеш*, дык пачастуй госця...

— Камякі з макам ёсць,— адказала яна.

Стары ахутаўся дымам.

— Здалёк? — спытаўся.

Госць напружана глядзеў на яго.

— З Прусаў,— адказаў.

— Відаць, на нейкую *хвабрыку*. Бо найбольш немцаў ідзе на *хвабрыкі*...

— Вы немец? — тонкім голасам вельмі зацікаўлена спытаўся пятнаццацігадовы падлетак.

— Я не немец, аднак іду з Нямеччыны... На фабрыку іду... Дзе палатно робяць, бо, кажуць, заработак добры... А недалёка адсюль, кажуць, казармы будуюць, можа, туды наймуся, бо я і ў мулярстве кемлю... Абы зарабіць, абы жыць беднаму чалавеку. Абы зарабіць, абы жыць...

— Ой, праўда гэта! Беднаму чалавеку — абы зарабіць... абы жыць,— з поўным разуменнем пацвердзіла некалькі галасоў.

Хрысціна паставіла на стол поўную місу камякоў, шэрых ад дамешанага туды маку, такіх застылых, зацвярдзелых, што хоць нажом іх рэж. Яна палажыла каля місы нож і добрую лусту чорнага хлеба. [...]

— Ешце, калі ласка,— запрашала госця.

Доўгія, худыя рукі схапілі спачатку хлеб, паднеслі яго да рота, але неспакойныя вочы, здавалася, шукалі яшчэ нечага на стале.

— Не гневайцеся, пан гаспадар, але я вельмі ж змёрз... Каб гэта гарэліцы чарачку... Гарэліцы!

Прагна жуючы хлеб, ён зноў, нібы вясёлы жартаўнік, пачаў паціраць рукі.

— Чаму ж нельга? Можна! — спакойна адказаў гаспадар.— Хрысціна! Дай гарэлкі!

Бондар узняў галаву ад работы, і вочы яго прагна заблішчалі.

Хрысціна прынесла бутэльку і чарку з тоўстага зеленаватага шкла. Гаспадар наліў да палавіны і, несучы яе да рота, пакланіўся госцю.

— За ваша здароўе! — сказаў і выпіў, цягнучы павольна, як па кропельцы.

Калі госць узяўся за поўную чарку, яго агрубелыя пальцы дрыжалі.

— На шчасце! — адказаў ён і ўліў у горла шчодрую мерку. [...]

Госць хапаў вялікія кавалкі камякоў, ссыпаў у рот жменяю крошкі, і, па меры таго як аціхаў голад, чалавек усё больш цікаўна і настойліва прыглядаўся да ўсяго і да ўсіх. Часамі здавалася, што ён як быццам нешта ці некага шукае. Пазіраў на тапчан, потым на печ, потым зноў на тапчан. І раптам спытаўся:

— А жонка ваша, пан гаспадар, жыве?

— Даўно памерла... Гадоў ужо ■ дзесяць будзе, як памерла... — ахвотна пачала баба, падмацаваная чаркай.— У тое лета якраз памерла, як мяне з маёнтка адправілі... Тады мяне Сымон прыгарнуў, хай яму Бог ва ўсім памагае. «Хрысціне, кажа, гаспадарыць памагай...»

— Памерла,— перапыніў яе госць, а нерухомыя вочы яго зноў утаропіліся ў твар балбатлівай бабы.— А вас, маці, Настуляй завуць... Вы ў маёнтку служылі.

— Але ж,— усцешана згадзілася баба.

— А вы адкуль пра гэта ведаеце? — спытаўся Аляксей.

Але госць не пачуў гэтага пытання, а можа, не захацеў на яго адказаць. Ён вадзіў вачыма па сценах...

— А вы, пан гаспадар, даўно пабудавалі гэтую хату? — спытаў ён.

Стомлена, абыякава Мікула адказаў, што хата старая, а толькі нядаўна ён падняў яе трохі, падлажыў новыя падваліны, выразаў большыя вокны...

— Я ж гляджу, што хата быццам не зусім такая, як была...

— А вы што — былі тут калісьці? — спытаўся бондар.

Госць зноў не адказаў. Ён прагна еў, азіраўся навокал. Доўга глядзеў на бондара, на Аляксея і раптам неяк дзіўна сказаў:

— Вось яно як. Старое ўжо няма!

А пачакаўшы — зноў спытаўся:

— І Ясіка няма?

— Якога Ясіка? — спытаўся стары, вымаючы з рота люльку і востра пазіраючы на госця.

— Якога! — засмяяўся госць.— Ды вашага ж трэцяга сына, пан гаспадар!

— Вы, мабыць, тутэйшы, што так пра ўсё ведаеце? — абазвалася Аленка.

— Мусіць, вы тут былі калісьці! — загаварыла баба, утаропіўшы ў яго бляклыя, пад чырвонымі павекамі, аднак цікаўныя вочы.

— Відаць па ўсім, вы тут не ўпершыню,— азваўся Мікула.

Госць, закіданы гэтымі пытаннямі, нахіліўся да стала, а потым глуха, неяк злосна прабурчаў:

— Ну, быў, быў... Ну, дык што з таго, што быў?

Аднак хутка пераадолеў сваю злосць ці нецярплівасць і ўжо спакойна загаварыў:

— Быў я тут, працаваў, наймаўся, калі будавалі новы панскі дом... Я працаваў на будове новага панскага дома...

— Даўно гэта ўжо было, гадоў, можа, з дваццаць таму назад,— заўважыў Мікула.

— Больш за дваццаць,— паправіў яго госць.

— Многа тады чужых людзей прыходзіла на гэтае будаўніцтва... — умяшаўся бондар.

— Ды шмат. І я прыходзіў.

Стары ўважліва паглядзеў на госця.

— Нешта мне мроіцца ў вачах: то здаецца, што я вас ведаю, а то здаецца, што не ведаю...

— Далібог,— загаварыла баба,— каб я з гэтага месца не ўстала, калі ў мяне не таксама... То здаецца, што я вас ведаю, то здаецца, што не ведаю... Відаць, вы калісьці са мною гаварылі, як былі на будаўніцтве новага дома.

Госць усміхнуўся і з дзіўнай настойлівасцю глядзеў на яе высахлыя, маршчыністыя, жоўтыя, нібы воск, рукі.

— Ой, гаварылі вы са мною, маці,— пачаў ён,— гаварылі не раз, не два і не дзесяць разоў. Ой, прыносілі вы мне вось гэтымі сваімі рукамі хлеб, памазаны мёдам ці маслам, якія вы крадком бралі з панскага свірна. Ха, ха, ха!

Госць голасна смяяўся, задраўшы галаву, а вочы яго гарэлі. [...]

Тут ён выпрастаўся на ўвесь свой рост, залажыў рукі за спіну і зверху зірнуў на дзяўчыну. А тая, перастаўшы праслі, ці то ад страху, ці ад сораму апусціла рукі на калені. Пазіраючы на яе зверху, госць спытаў:

— А ты гаспадарова дачка?

Адварочваючы ад яго пачырванелы твар, яна прашаптала:

— Але. Дачка.

— Відаць, наймалодшая? Табе, мабыць, дваццаці яшчэ няма...

— Ды няма.

— А старэйшая сястра, Марыська, жыве ці памерла?

— Жыве.

— Яна замужам?

— Замужам.

— Дзе яна? У гэтай вёсцы?

— У Дубраўлянах, у мужавай хаце сядзіць...

— Ага! У мужавай хаце. У сваёй хаце. Гэта добра. Ах, ах, ах...

Грудзі госця ўзняліся ад раптоўнага кароткага ўздыху. Ён змоўк. [...]

Раптам узняўся зычны, самаўпэўнены Аляксееў голас. Ён шырока сядзеў на зэдліку, бокам да стала, як заўсёды ганарліва адкінуўшы галаву, і звярнуўся да госця:

— А пра Бонка вы нічога не чулі, ходзячы па свеце, га?

Усе зацікаўлена змоўклі, але і госць добрыя паўхвіліны маўчаў.

Потым ён адказаў спакойна:

— Чаму ж не чуў? Чуў. Увесь свет толькі пра яго і гаворыць.

— Ды гавораць, не дай Бог нікому, каб так пра яго людзі гаварылі! — выгукнуў малады мужчына.— А як вы думаеце: зловяць яго ці не зловяць?

— Можа, зловяць, можа, не зловяць,— лена адказаў госць.

— Добра было б, каб злавілі, а то пісар кажа, што калі, крый божа, не зловяць, усім бяда будзе... Разбой, кажа, будзе, рабункі будуць, так і так, кажа, будзе. Што злыдзень гэты, калі на волі застанецца, ці мала яшчэ людзям бяды наробіць...

— Чорт яго зловіць, калі ён такі спрытны,— сказаў бондар, які крыху павесялеў ад другой чаркі,— два разы ўцякаў, дык і цяпер уцячэ.

— Мяне больш за ўсё цікавіць, як ён мог тады, дзесяць гадоў таму назад, уцячы з турмы. Я ж не раз і не два разы быў у горадзе і турму бачыў. Такія сцены, Божухна ты мой! Усюды салдаты *са штыкамі*. Птушкай трэба быць, а не чалавекам, каб вылецець адтуль. А ён вылецеў... *Каб яго...* Ну ж і спрытны! Зубамі сцяну прагрыз, ці што?

— Ды не,— перапыніў госць.

— Тады як? Бо калі б і краты жалезныя распілаваў, усё роўна праз акно не мог бы выскачыць, праз такое высокае... Калі б на каменне з чацвёртага паверха пляснуўся, дык душа з цела адразу ўцякла б...

Цяпер чалавек, які стаяў каля камінка, залажыўшы рукі за спіну, пачаў свабодна пакалыхвацца ў бакі, злёгку пераступаючы з нагі на нагу. Пераступаннем гэтым ён нагадваў гарадскога франта. Зверху глядзеў на маладога хлопца, які звяртаўся да яго.

— Ён не выскачыў праз акно, ён вылецеў... — сказаў з кплівай усмешкай.

— Хіба на тых крылах, якія яму *чорт* прычапіў,— абурыўся бондар.

— Не на крылах ён вылецеў...

— Дык, можа, на ведзьмінай лапаце,— пажартаваў Аляксей.

Жанчыны і падлетак Ясік засмяяліся таксама.

— На парасоне,— сказаў госць.

Усе змоўклі. Госць пакалыхваўся каля печы яшчэ больш свабодна і зверху вадзіў позіркам па ўсіх прысутных. Можа, так вось гарадскія фанфароны выхваляюцца перад натоўпам у шынку сваёй высокай вучонасцю, уменнем разбірацца ў сусветных падзеях. [...]

Ён узяў свой кій, што стаяў побач, прыслонены да печы, і, адпаведна памахваючы ім, пачаў расказваць:

— Бонк узяў парасон, такі вялікі парасон, раскрыў яго, перавярнуў яго вось так, уніз, і разам з парасонам шусь праз акно... Калі б без парасона, дык паляцеў бы потырч галавой і звярнуў бы сабе карак... Але парасон апускаў яго ўніз памаленьку, памаленьку, бо вецер яму хутка ляцець не даваў, і так апусціўся да самай зямлі. А Бонк толькі выцягнуўся на бруку ды носам аб камень ударыўся. З носа кроў пацякла, і косці страшэнна забалелі. Ды што там! Ногі за плечы і падаўся ў свет! Тры гады яго потым шукалі. Парасон каля турмы знайшлі, а яго тры гады дарма шукалі... Ха, ха, ха!

Пакуль ён расказваў, увесь яго доўгі, касцісты твар свяціўся амаль дзіцячай весялосцю. Чалавек быў падобны на хлапчука, які з хітрай усмешачкай расказвае пра ўдалае свавольства.

Усе хатнія прыўзнялі галовы і паразяўлялі ад здзіўлення раты. Сярод агульнага маўчання з-за клубоў дыму пачуўся нізкі, суровы голас:

— А адкуль жа вы ведаеце, як гэта было?

— *Гэта ж праўда!* Адкуль вы ведаеце? — паўтарыла пытанне некалькі галасоў.

Нібы адчуўшы ў гэтых настойлівых пытаннях варожы выклік, госць зухаватым рыўком узняў галаву і з-пад броваў, якія пагрозліва сышліся, павёў вакол палымяным позіркам.

— І ведаю! Ну і што, калі ведаю! Разумны гаворыць, дурны дзівіцца... А-а-а! Паразяўлялі раты! Адкуль я ведаю? А ці ж гэта ў людзей языкоў няма, ці не расказваюць?.. Яны расказвалі, а я слухаў. Цьфу!

Ён плюнуў і раптам зноў занепакоіўся, кінуў навокал устрывожаны позірк, пацёр рукі.

Аляксей дзёрзка глядзеў у яго вочы.

— Нешта вы, пане,— пачаў ён,— зашмат ужо ведаеце пра гэтага Бонка. Можа, вы яго калі бачылі?

Той абыякава пацісну́ў плячыма:

— А дзе я мог яго бачыць? Не бачыў. Я з Прусіі іду... Больш за дваццаць год не быў у гэтым баку.

— Шкада, бо калі б вы яго бачылі, дык сказалі б нам, як ён выглядае. Лягчэй было б злавіць... Ой, злавіў бы я яго, з вялікай ахвотай злавіў бы, і пакуль тая паліцыя даведалася б пра яго, сам бы з яго палосамі скуры надраў!..

— Бач, такі малады, а ўжо гатовы людзям скуру са спіны спускаць! — пасміхнуўся госць.

— Дык ён жа разбойнік! — выгукнуў, усхапіўшыся з лавы, малады задзірысты мужчына.— Сам пісар сёння казаў: «Крамы рабаваў, грошы падрабляў, а самае горшае, казаў, што трох чалавек забіў са сваімі супольнікамі...» Дык што — шкадаваць такую звяругу? Ой, я б з яго скуру здзёр! Няхай іншых не забівае!..

І ён падняў пагрозліва кулак.

— Ціха, Аляксей! Сціхні, *не крычы так!* — супакойвала яго маладая жонка, цягнучы за крысо расшпіленага кажуха. [...]

Баба Настуля падперла сухую шчаку рукою і голасна ўздыхала:

— Божа ж ты мой, Божа! Ой, Божа ж літасцівы!..

Пятнаццацігадовы Ясік стаяў нібы акамянелы, вылупіўшы вочы, а потым закрыў рот рукамі і дрыготкім голасам зароў:

— Гу-гу-гу!.. [...]

Госць не стаяў ужо так ганарліва, як раней. Калі Аляксей упершыню напомніў пра бізуны, відаць было, як пад тонкім сукном парванага сурдута заварушыліся і паволі палезлі ўгару яго лапаткі, а карак, як ад раптоўнага ўдару, апусціўся долу і барада дакранулася да грудзей.

— Цікава, ці вытрымае злыдзень? — прабурчаў бондар.

— Ого! Яшчэ як вытрымае! — гаварыў сваё Аляксей.— Яшчэ потым у кайданах на край свету пойдзе. А калі прыйдзе

туды, дзе жыць загадаюць, дык ад цямна да цямна будзе пад зямлёю молатам біць або тачкі цягаць...

— Ой, бедны ён, такі бедны! — уздыхнула Аленка і яшчэ мацней прыціснула да грудзей малое.

— І навошта яму было на гэты свет прыходзіць? Навошта Бог Усявышні паслаў яго на гэты свет? — уздыхала баба Настуля.

— Я, здаецца б, не вытрымала. Узяла б і ўтапілася... — вяла сваё Ганулька.

Хрысціна, пакінуўшы мыць посуд, выпрастала высокі, моцны стан, зноў склала рукі на грудзях і заглядзелася на агонь сваімі цёмнымі вачыма. Зморшчыліся яе прыгожыя вусны, сышліся цёмныя бровы. Калі ўсе змоўклі, пачуўся яе нізкі, глыбокі голас:

— А і гэтага ж некалі маці на руках насіла і калыхала...

Госць раптоўна павярнуўся да яе.

Ён доўга глядзеў на яе, нахіліўся амаль да самага твару і амаль са свістам прашаптаў:

— Добра пільнуйце свайго сыночка, ой, добра пільнуйце свайго Ясіка, каб ён ніколі не быў такім няшчасным...

Здзіўленая і крыху напалоханая жанчына адхіснулася ад яго. А госць хутка павярнуўся ў другі бок хаты, туды, дзе каля сцяны сядзеў за сталом гаспадар. [...]

— *Годзе!* З кожным можа здарыцца бяда,— спакойна і павольі азваўся Мікула.— Аднак той *найгаршэйшы*, хто другога чалавека забівае...

— Найгоршы, найгоршы... — паўтарыў госць.— А ці ведаеце вы, пан гаспадар, што найгоршае бывае часамі побач, ой як блізенька каля найлепшага... І калі б не выпадак які або нешта там іншае, чаго не палічыш, можа, замест найгоршага было б найлепшае...

У горле яго перасохла. Ён шырокім крокам падышоў да стала, наліў чарку гарэлкі, праглынуў яе і вярнуўся да печы.

— *Годзе!* — пачаў ён зноў, увесь час звяртаючыся да старога Мікулы.— Добра вам гаварыць: годзе! А ці ведаеце вы, якім чынам гэты Бонк, за якім цяпер гоняцца, нібы за дзікім зверам, каб затаўчы да паўсмерці, ці ведаеце, як ён

першы раз трапіў у бяду? Можа, ён першы раз папаўся за такую драбніцу, што і плюнуць не было на што! А бяда трасе таго, хто на ёй едзе. Ой як трасе, пан гаспадар! Так трасе, што душа наверх падкладкай выварочваецца. Ва ўсіх душа з падкладкай, толькі ў аднаго яна выходзіць навыварат, а ў другога не... Вось як!

Ён зноў падышоў да стала, але гарэлкі ўжо не піў. Машынальна працягнуў руку да бутэлькі, але, не крануўшы яе, зноў вярнуўся да печы. Ноздры яго захадзілі, бровы то падымаліся, то ападалі. Увесь ён, парывісты, дзёрзкі, адчайны, бліскаў панурымі вачыма, грудзі яго часта ўздымаліся. Аднак ён зноў засмяяўся, спыніўшыся каля печы.

— *Годзе!* — паўтарыў ён яшчэ раз, нібы гэтае сказанае старым Мікулам слова вастрыём сваім упівалася ў яго, вярэдзіла рану.— Каб жа гэта кожны мог сказаць *«годзе!»* усім тым д'яблам, што раздзіраюць чалавечую душу, і каб яны так ужо ад гэтага аднаго слова паразбягаліся! У адным гэтыя д'яблы спяць, а ў другім прачнуцца і валакуць яго на вечныя пакуты. А можа, вы думаеце, пан гаспадар, што калі д'яблы вядуць людскую душу на вечныя пакуты, дык нехта паможа ёй выратавацца? Ха, ха, ха! Саломінкі ніхто не падасць, каб чалавек за яе ўхапіўся ды з ямы вылез. Або калі чалавек пакаўзнецца і, як тая свіння, уваліцца ў гной, ці знойдзецца на ўсім свеце хоць адзін, што злітаваўся б над ім і вывеў бы на сухое месца? Ого! Ніхто нават не азірнецца, а калі і азірнецца, дык толькі каб нагою кашкануць! [...] А што яму застаецца? Калі вайна, дык вайна! Калі прападаць, дык хоць спачатку добра пад'есці, напіцца, а калі і па мазгаўні каму стукнуць прыйдзецца, ну дык і што? І так і так пагібель... Дык няхай жа хоць ворагі запомняць... А хто вораг? Увесь свет вораг, калі ніхто і не падумае ратаваць, а кожны прагне загубіць...

Склаўшы на грудзях рукі, ён зноў падышоў да стала і, крыху нахіліўшыся, зірнуў у Мікулавы вочы. Стары ўжо некалькі хвілін, падаўшыся наперад усім сваім магутным корпусам, так пранізліва глядзеў на свайго госця, што ажно рука, у якой была люлька, апала на лаву. Яны ўпершыню паглядзелі адзін аднаму ў вочы. Стары адхіснуўся назад, прыхіліўся плячыма да сцяны. Госцеў голас сарваўся, нібы

парваная струна. Чалавек адвярнуўся, зноў падышоў да печы, але ноздры яго ўжо не рухаліся. Значна цішэй, чым дагэтуль, ён пачаў гаварыць:

— Хіба ж кожны так ужо адразу і ляціць у глыбокую яму? Не, не кожны. Можа, і гэты Бонк не адразу забіваў людзей. Цікава, што там у яго за жыццё? Дзе ён нарадзіўся, у якім кутку свету маці яго насіла на руках і *калыхала*? Відаць, тады ён яшчэ не быў разбойнікам, відаць, ён па нейкіх драбінах спускаўся, пакуль не спусціўся туды, адкуль ужо ні Бог, ні чорт яго не выцягнуць. [...]

Дагэтуль усе слухалі моўчкі, здзіўленыя і зацікаўленыя тым, што ён гаварыў, спачатку дзёрзка і палка, а потым усё больш ды больш жаласліва. Ды Аляксей ужо не змог больш маўчаць.

— Гэй, гэй, панок! — выгукнуў ён.— Нешта ж вы ўжо занадта абараняеце разбойнікаў!

Госць зноў выпраставўся і зірнуў маладому мужыку проста ў вочы.

— Ой, ой! — сказаў ён з'едліва, ківаючы галавою.— Улез у цёплы кажух і рады, што яму добра! А таго, з якога і скуру хутка здзяруць, дык ужо і зусім пашкадаваць не трэба?

Стары Мікула адняў люльку ад рота і, насупіўшы густыя, касматыя бровы, цвёрда, коратка, сурова сказаў:

— Не трэба.

Здавалася, што стары кінуў два гэтыя словы госцю проста ў твар, і госць адчуў гэта, бо вельмі хутка павярнуўся ўсім целам да Мікулы, ступіў некалькі шырокіх крокаў і з ціхім смехам сеў побач з ім.

У гэты момант зноў рыпнулі дзверы, увайшло некалькі чалавек, і каля печы пачалася гутарка. Аднак госць як быццам і не заўважыў гэтага; ён сеў на зэдліку побач з гаспадаром, павярнуўся на хату спіною, шырокаю, але надта худой, ажно лапаткі вытыркаліся з-пад сурдута; упёршыся на стол локцем, ён наблізіў свой твар да твару старога. [...]

— Пан гаспадар, а што чуваць пра вашага Ясіка?

— Пра якога Ясіка? — суха спытаўся стары.

— Ды пра сына вашага, трэцяга... Два вось тут, а трэцяга няма. Ці вы ўжо зусім пра яго забыліся, пан гаспадар?

За плячыма госця моцна пляснулі нечыя рукі і пачуўся пісклявы бабскі голас:

— А *каб* я веку свайго не дажыла! *Каб* мой язык апруцянеў! *Каб* мае рукі пакруціла, як галіны на той вярбе, калі я пра яго забылася, пра Ясіка майго любага, саколіка майго няшчаснага... Гэта ж я яго, калі ён на свет нараджаўся, ад маткі прымала. Гэта ж я яго на руках сваіх не раз і не дзесяць раз насіла... Сваіх дзяцей не было, але ён быў, і палюбіла я яго, як сыночка родненькага. [...]

Нібы сілаю адарваны ад сваіх думак, стары змрочна адказаў:

— Чаму ж не памятаю? Памятаю... А вы яго добра ведалі?

— Яшчэ як добра! Добры быў хлопец, кемлівы, смелы...

— Занадта смелы,— буркнуў стары, выбіваючы з люлькі попел.— А вы чулі, што з ім здарылася?

Відаць, нягледзячы на змрочны настрой і пранізлівыя позіркі, якія стары час ад часу кідаў на госця, яму ўсё больш хацелася пагаварыць пра старэйшага сына. Але баба Настуля зноў завялася:

— Ой, гора яго напаткала, горачка! Ды *каб* ім Пан Бог грахоў не даравў, як яны яму, маладзенькаму ды дурненькаму, тады не даравалі! Загубілі яны яго, як сабаку, змарнавалі... *Нябожчыца* маці яго даводзілася мне пляменніцай. А ён мяне бабулькай называў...

Госць спытаўся ў старога Мікулы:

— А што ж з ім такое здарылася?

Стары з паўхвіліны варушыў сківіцамі, нібы певажоўваў нешта цвёрдае. І не хацелася яму раскрываць душу перад гэтым чужаком, але пагаварыць ахвота брала.

— От,— пачаў ён,— з драбніцы пачалося... Можа, ён першы раз і за справядлівасць пакутаваў. Суд супраць нас пачалі дубраўлянскія суседзі, каб ім дабра не было... Ну, мяне грамада выбрала ўпаўнаважаным, я ў горад ездзіў і з *гадвакатам* гаварыў, з тым, значыцца, што на судзе нас бараніў. Я Ясіка з сабою ў горад браў і да *гадваката* браў, так сабе, без дай прычыны, надта ж я яго любіў, а калі таму чаго вельмі ж захочацца, дык я ўсё яму дазваляў. Можа, Бог усёмагутны мяне не пакарае за тое патуранне...

Баба зноў улезла ў яго гаворку:

— Ой, любілі яго, галубілі, песцілі ўсе добрыя людзі і ўсё яму дазвалялі, бо надта ж ужо міленькі быў і ласкавы... Ручкамі, бывала, абдыме за шыю і туліцца да чалавека, як тое ягнятка, а вочкі былі — што тыя васількі ў жыце...

Стары не звяртаў увагі на бабскае прастарэкванне, ён усё больш ахвотна выцягваў з памяці даўнія падзеі.

— Вельмі ён быў разумны, але ж надта дзёрзкі і зусім не такі, як іншыя хлопцы... Ані ў яго работа, ані гульня не былі такія, як ва ўсіх... Калі працуе, дык нібы той конь гарачы, а калі гуляе, дык так, што рады не дасі... Бывала, за шыю абдыме і цалуе, чуць не задушыць, а іншым разам занаровіцца і, каб там немаведама хто,— асой у вочы кідаецца. Лаяў я яго добра, лаяў, але найбольш патураў... Але нічога дрэннага ён тады не рабіў.

Стары задумаўся, паківаў галавою.

— На пагібель браў я яго тады ў горад і да *гадваката*,— працягваў, разгаварыўшыся, стары.— Ён слухаў, пра што мы паміж сабою гаварылі, слухаў, а калі вярталіся, бывала, і кажа: «Тата, я заб'ю таго, хто несправядліва прыйдзе забіраць нашу зямлю!» Я толькі смяюся. Маладое, дурное, думаю. Зямля па справядлівасці наша была, але даўнасць зайшла, і суд мы прайгралі. Калі мы суд прайгралі, дубраўлянцы прыйшлі зямлю забіраць, а мы заўзяліся не аддаваць. *Не аддамо і не аддамо.* Усёй грамадой, бывала, выйдзем і тых захопнікаў, каб ім Бог грахоў не даравяў, праганяем. Усе сваволілі, сваволіў і Ясік. Ну, няхай сабе, думаю. Калі ўсе, дык няхай сабе і ён. Ажно вясною, кажуць, ураднік прыедзе і дубраўлянцам зямлю аддаваць будзе. Бяда! З ураднікам не тое што з мужыкамі. Мы рукой махнулі. Няхай будзе і так! Няхай будзе наша крыўда. Пан Езус больш адпакутаваў. Аднак не ўсё мы як трэба ўлічылі. Не ўлічылі мы гэтых маладых, а *надта* ж дзёрзкіх, што сваім розумам разважылі і змову зрабілі... Прыехаў нейкі высокі ўраднік і двух *ніжэйшых* з сабою прывёз, і давай яны па полі хадзіць, таму тое, гэтаму другое выдзяляць... А нашы хлопцы як выскачаць з косамі, з граблямі ды каламі! Можа, з дваццаць іх было, а мой Ясік спераду, як які генерал!.. Ураднікаў прагналі... [...]

— Значыцца,— гаварыў ён далей,— бунт. Значыцца, супраціўленне ўладзе. Ну, пасадзілі іх у турму, судзілі іх. Іншых выпусцілі або сяк-так пакаралі, а яго на тры гады турмы асудзілі. *Зачыншчык*, кажуць. Ну, добра. Тры гады — не век. А яму тады толькі васемнаццаты гадок пайшоў... Не вельмі я тады і гараваў, што ён там тры гады пасядзіць. Розуму, думаю, навучыцца, пакорлівасці навучыцца.

— Навучыўся? — спытаўся госць.— Ха, ха, ха! Што ж, ці навучыўся? Га?

Стары, пазіраючы долу, паківаў вялікай галавой.

— Якраз навучыўся! *Каб гэтак чэрці злыя* душы вучылі! Калі вярнуўся дахаты, дык ужо і дня спакойнага ў хаце не было. Сядзе, бывала, і расказвае, як зладзеі ўначы ходзяць красці і ўсе замкі адмыкаюць. «На ўсё ёсць спосаб, а я ўсе спосабы ведаю». Або кажа: «Ахвота ж гэта людзям у такіх хатах сядзець, бедаваць, калі на свеце столькі багацця і да яго такім лёгкім спосабам можна дайсці». Я яго кулаком па спіне: «Вось табе, кажу, лёгкі спосаб не думаць пра зладзейства і ўсялякую поскудзь». А ён у адказ: «*Не бі*, татка, бо ўцяку і толькі ты мяне бачыў». За шапку і ў карчму. Піць навучыўся. Раней не піў, вядома, дзіця, яму ж ледзь семнаццаць гадкоў споўнілася. А там і гэтага навучыўся. Нап'ецца, бывала, і буяніць на ўсю вёску: з хлопцамі б'ецца, дзяўчат ловіць... Я да яго па-добраму: «Ці табе, Ясік, не сорамна? Ці ты Пана Бога не баішся?» А ён смяецца: «Эх, татка, кажа, ці я такое бачыў? Ці я пра такое наслухаўся, калі там быў? Вы, дурныя, сядзіце ў сваёй вёсцы і нічога не ведаеце, а я цяпер вучоны!» Ох, вучоны ён зрабіўся, пабыўшы тры гады ў турме, вучоны! *Каб тых губернёраў*, што яго там вучылі...

Госць доўга смяяўся ціхім грудным голасам. Пасля паківаў галавой:

— Ох, пане гаспадар, сядзіце вы ў сваёй вёсцы, рукамі зямлю сваю дзераце і нічога не ведаеце! Каб вы пабачылі тых губернёраў ды каб пачулі, як яны вучылі вашага сыночка, то вас бы, пане гаспадар, можа, толькі ад аднаго страху *паралюш* разбіў бы...

Стары рэзка ўзняў галаву і зноў уважліва, як і некалькі разоў раней, паглядзеў на госця. У голасе, якім той вымаўляў

апошнія словы, чуліся нейкія гукі, што з асаблівай сілай кранулі яго слых.

— *Што ж гэта?* — сказаў ён павольна.— Ці я вас калісьці ведаў ці не ведаў... Замарок нейкі. Хто вы такі?

Але ў гэты момант госць занепакоіўся і павярнуўся да печы, каля якой цяпер пачынаўся ўсё большы ды большы рух і гоман. Там ужо замест двух, Ганульчынага і Хрысцінінага, калаўротаў аказалася цэлых пяць. Дзве дзяўчыны ўвайшлі раней і селі з калаўротамі абапал Ганулькі, а цяпер толькі што прыйшла яшчэ адна, з якою Аляксей якраз жартаўліва вітаўся, а Хрысціна ветліва запрашала, каб яна садзілася побач з ёю. У Мікулавай хаце пачыналіся зімовыя вячоркі, гаманлівыя і — да поўначы.

Госць акінуў быстрым позіркам людзей каля печы і зноў павярнуўся да старога. Але Мікула зноў сядзеў моўчкі, з люлькай у роце, апусціўшы галаву. Твар яго амаль зусім схаваўся за дымам, што вылятаў з люлькі, часамі толькі старыківаў галавою, разгублена думаючы пра штосьці, нечаму здзіўляючыся. Затое баба Настуля ўсё больш гарнулася да госця, каб пагаварыць. [...]

Яна кінула позірк на старога Мікулу і, сцішыўшы голас, таямніча працягвала:

— Біў ён яго, як сабаку якога, рукамі, калом, чым папала... *Каб я* з гэтага месца не ўстала, калі маню... Як раней патураў і галубіў, так пазней, калі нябога з турмы вярнуўся, біў... За балбатню пра зладзеяў, і за п'янства, і за лайдацтва, за ўсё, бывала, б'е ды б'е... «Я яму, кажа, выб'ю і з цела і з душы ўсю тую поскудзь, што ён адтуль прынёс!» Бывала, маці за адну руку ўчэпіцца, а я за другую і крычым: «Ой, не катуй ты, Сымоне, роднага дзіцяці, не бяры грэх на душу, бо калі хлопец зусім азлобіцца, з хаты ўцячэ і душу сваю загубіць!» [...]

Малодшыя хлопцы, як тыя зайцы, вушы стуліўшы, хадзілі, а Ясік-небарака цярпеў, цярпеў, на трэску высах, як тая хмара цёмная зрабіўся і ўжо, здаецца, крышку паспакайнеў, нібы крыху абдумаўся... Перад бацькам скарыўся, скарыўся перад родным, слухацца пачаў... Ажно раптам узяў ды ўцёк... Не вытрымаў-такі ды ўцёк. Можа, ён ад бацькавай рукі, што літасці да яго маладосці не мела,

уцёк... Можа, ад прызыву, каб яго ў салдаты не забралі, уцёк... Можа, яго нехта, з кім ён у турме пазнаёміўся, падгаварыў... Узяў ды ўцёк... І вочы нашы ўжо яго больш, галубочка, не бачылі, і вушы нашы галасочка яго сярэбранага не чулі... Маці па ім плакала, і сястра плакала, Марыська, старэйшая, бо гэтай, Ганулі, яшчэ на свеце не было, і, здаецца, па сценах вось гэтай хаты, хацінкі яго роднай, цяклі тыя слёзкі... Адзін бацька ніколі пра яго не загаварыў, ніколі не злітаваўся, сыночка свайго родненькага, найстарэйшага, ніколі не пашкадаваў... Такі ўжо ён, наш Сымон, суровы!

Цяжка было сказаць, ці слухаў госць, ці не слухаў гэтую загадкавую, з напеўным прыгалошваннем балбатню. [...]

Раптам ён зусім нечакана працягнуў руку па бутэльку і, прыклаўшы рыльца да вуснаў, прагна дапіў апошняе. Грукнуўшы дном пустой бутэлькі па стале, ён засмяяўся і кпліва паглядзеў на старую.

— Ну і дурная ж ты, бабуля! Калі ён так ні разу не пашкадаваў, дык чаму ж старэйшага ўнука Ясікам назваў? Га? Мусіць, калі яго старэйшы ўнук на свет прыйшоў, дык ён пра старэйшага сыночка ўспомніў? Га?

Мікула нібы прачнуўся з роздуму, люльку адняў ад рота, нахіліўся ўсім сваім мажным тулавам да госця, а правую руку падняў да лба.

— У імя Айца і Сына... — прашаптаў ён.

Але госць падняўся, адсунуў з грукатам зэдлік, на якім сядзеў, шырокім крокам накіраваўся да супрацьлеглай сцяны і сеў там у цяні, побач з Аленкай, якая карміла малое.

У той самы момант дзверы раптоўна адчыніліся і зачыніліся з трэскам. У хату ўварвалася высокая, плячыстая дзеўка, задыханая, з васпаватым тварам, які пачырванеў ад хуткага бегу. Паставіўшы каля парога калаўрот, яна закрычала:

— Ратуйце! *Дзяўчаты*, калі Бога любіце, ратуйце, хлопцы ідуць!

За акном пачуліся моцны тупат, смех і крык. Нехта забарабаніў па шыбе, ударыў кіем па сцяне.

Дзяўчаты з віскам паўсхопліваліся і кінуліся да дзвярэй.

— Ой, Божухна! Замыкайце! Дзверы замыкайце! Не пускайце! Адразу ж кудзелю паліць і лухту ўсялякую вярзці пачнуць! Людзі, ратуйце! Не пускайце гэтых разбойнікаў!

Дзяўчаты сцяною пасталі каля дзвярэй, як мага трымаючы засаўку. Адна з дзяўчат схапіла з камінка галавешку і, трымаючы яе, нібы вогненны сцяг, заняла абаронную пазіцыю. Другая ліла ваду з вядра на ток, трэцяя прыцягнула зэдлік і падперла ім дзверы. Дзеўкі так моцна захапіліся неабходнасцю адбіць напад, што ў іх піску чуваць быў ужо сапраўдны страх. Ганулька, чырвоная ад натугі, з якой яна прыціскала засаўку, пачала дрыжаць. Дзве дзяўчынкі, старэйшая гадоў дзесяці, абуджаныя крыкам, скаціліся, як калодачкі, з высокай печы і, дапамагаючы старэйшым, крычалі больш за ўсіх. Іх босыя ногі, як матылі, мільгацелі паміж клятчастых дзявочых спадніц, пасмы льняных валасоў то ўзнімаліся, то ападалі на белыя кашулі і на ружовыя ад сну тварыкі.

Ды найбольш крычала і мацней за ўсіх размахвала сухімі, але пругкімі рукамі баба Настуля. Яна ўбілася ў дзявочы гурт, лезла да дзвярэй.

— Пусціце! — крычала яна.— Што гэта за мода — хлопцаў на вячоркі не пускаць? Якія ж гэта вячоркі, калі на іх хлопцаў няма? Дый завошта вы іх караеце? А завошта вы іх, небаракаў, на марозе трымаеце?

Яна адпіхнула Ганульку, расчыніла насцеж дзверы і, узяўшыся ў бокі, крыкнула ў цёмныя сені:

— *Хадзіце*, хлопцы! *Ну, хутка, хадзіце!*

Сені напоўніліся цяжкім тупатам, і праз дзверы праціснуліся чатыры дзецюкі. [...] Хлопцы — хто ў кажусе, а хто ў сівай сярмязе, усе ў цяжкіх ботах — пакланіліся гаспадару.

— Добры вечар! — гукнулі яны хорам.

Стары не адказаў. Няўжо ён задрамаў? Усе, аднак, ведалі, што стары Мікула не быў санлівым, ён любіў позднія шумныя вячоркі і ветліва адказваў, калі госці віталіся, а нават часамі, хоць і рэдка, смяяўся грубым смехам услед за моладдзю. Сёння ён маўчаў. Рука з люлькай павісла каля грудзей, усе маршчыны на вялікім ілбе апусціліся ўніз, нібы цяжкая хмара павісла над касматымі бровамі. Спаў ці думаў? Гневаўся ці ўспамінаў? Хлопцы адышліся да камінка і, стаўшы за дзяўчатамі, пачалі закурваць. [...]

Каля печы з шумам калаўротаў і гоманам змяшаўся хруст разгрызаных арэхаў і лузганне семачак. Хлопцы даставалі з-за пазухі гнілаватыя дзічкі і частавалі імі дзяўчат; тыя манежыліся, адпіхалі паднесеныя да іх твараў жмені з ласункамі, а потым нібы нехаця прымалі, елі і, у сваю чаргу, кідалі хлопцам арэхі і семачкі. Кожны раз, калі каму-небудзь пападала ў лоб або ў шчаку арэхам ці калі жменя семачак рассыпалася па чым-небудзь аўчынным каўняры, з-за калаўротаў выбухаў смех. Адзін з дзецюкоў, што ўвесь час стаяў за Ганулькай, амаль не ўдзельнічаў у жартах, а ўсё нешта шаптаў дзяўчыне на вуха. Улляна, што верхаводзіла паміж дзяўчат, гукнула яму, каб загадаў якую-небудзь загадку. Бо ніхто ж не ведае столькі цікавых загадак, як каржакаваты Дзям'ян, галава якога зарасла такімі чорнымі ды кучаравымі валасамі, што яны амаль зліваліся з чорным каўняром кажуха. У гэтым чорным гушчары чырванелі толькі поўныя шчокі і паблісквалі чорныя вочы.

— Калі загадкі, дык няхай будуць загадкі,— адказаў ён настойлівым дзяўчатам. А сам выпрастаўся, адкашляўся на ўсю хату, яшчэ больш надзьмуў шчокі і, руку ўпёршы ў бок, пачаў:

Еду, еду —
Ні дарогі, ні следу,
Каня бічом паганяю.
На смерць паглядаю.

Ён змоўк. І ўсе маўчалі. Спынілася некалькі калаўротаў.

— Ну, што гэта? — здзекліва спытаўся разумны Дзям'ян.

Ніхто не змог разгадаць. Дзяўчаты заклапочана зіркалі адна на адну, а хлопцы нібы зусім абыякава курылі і прытупвалі наскамі ботаў.

Дзям'ян узяўся ў бокі аберуч.

— Ды гэта ж човен! — пагардлівым тонам сказаў ён.

— І праўда! — пачулася адразу некалькі галасоў, і ўсе дзівіліся, паўтараючы словы загадкі.

— Ага! — еду, ні дарогі, ні следу — вядома, па вадзе, каня бічом паганяю — значыцца, вяслом па вадзе... Ага! І праўда — гэта ж човен.

— Чаму ж ты, Дзям'ян, не шапнуў мне, што гэта такое! Калі б ты сказаў, я адгадала б,— ціха прагаварыла Ганулька.

— Добра, то я яшчэ адну загадаю.

Ён зноў надзьмуў шчокі, кашлянуў і пачаў:

Повен хлявец
Белых авец,
Адзін баран бляе.

Скончыўшы, ён нагнуўся, нібы паднімаючы з зямлі арэх, і шапнуў Ганульцы ў самае вуха:

— Язык!

— Язык! — сярод агульнага маўчання выгукнула дзяўчына.

— Ага! — зноў здзівіліся ўсе.— Праўда! Нічога не скажаш, праўда! Во разумная! Такая маладзенькая, а такая разумная! А можа, табе Дзям'ян падказаў? Відаць, падказаў? Праўду скажы!

Пачырванелая, як півоня, дзяўчына хавалася за кудзелю і ўмольна пазірала на разумнага хлопца.

— Я не гаварыў! — выгукнуў Дзям'ян.— Брэшаце! Нічога я не гаварыў... [...]

А чорныя вочы блішчалі над вялікай рукой, смяяліся і пераможна пазіралі на вясёлых дзяўчат. Другою рукою ён крадком абдымаў тонкі Ганульчын стан, абцягнуты сіняй кофтай.

Госць, седзячы побач з маўклівай Аленкай, неяк асабліва пільна прыслухоўваўся да жартаў і загадак. Ён успёрся рукамі на калені і, падаўшыся наперад, пачаў усміхацца, спачатку слаба, невыразна, а потым з усё большым задавальненнем. Як толькі хто каля печы выкрыкваў разгадку, ён падтакваў, ківаючы галавой. Калі б хто-небудзь тады на яго паглядзеў, дык мог бы падумаць, што чалавек гэты добра ведае ўсё, пра што гаворыцца, толькі ўсё гэта забылася і цяпер прыгадвалася настойліва, ведучы за сабою рой іншых успамінаў. Але ніхто цяпер не звяртаў на яго ўвагі. [...]

Баба, што каля самай зямлі сядзела на перавернутых ночвах, паміж двума калаўротамі, выцягнула да агню галаву ў чырвоным круглым чапцы і пачала расказваць. У агульным маўчанні, пад шум калаўротаў, голас яе — стары, працяглы, шапялявы — разыходзіўся па ўсёй хаце:

— Жылі сабе тры браты: два разумныя, а трэці дурань. Павырасталі яны, і прыйшла ім пара жаніцца. *Бацька* іх і пытае:

— Каторага з вас, сыны, першага жаніць?

Першы кажа:

— Мяне, бо я старэйшы.

Другі кажа:

— І мне, татка, пара ўжо.

А дурань таксама:

— І мне ўжо даўно была б пара.

— Ну,— кажа бацька,— ідзіце вы ўсе ў лес, а хто найхутчэй ды найбольш ягад назбірае, таго я першага і ажаню.

Пайшлі яны ўсе ў лес і так збіраюць ягады, так збіраюць, што нават не разгінаюцца, каб як найхутчэй набраць. Разумныя да дурня падышлі і пытаюцца:

— Ну што, дурань,— ты многа ягад назбіраў?

— Ого,— кажа дурань,— я ўжо дахаты хутка пайду.

Пазайздросцілі разумныя дурню, узялі ды забілі яго, нож у сэрца ўсадзілі...

— Ой! — войкнула некалькі жаночых галасоў.

— Ну, ну, так ужо адразу ўзялі і забілі! — усумніўся хтосьці з хлопцаў.

Баба Настуля з поўнай упэўненасцю паўтарыла, трасучы галавой:

— Узялі і забілі, нож у сэрца ўсадзілі, у зямлю закапалі, пяском засыпалі, замест крыжыка вішню ў галавах пасадзілі і пайшлі дахаты.

А тут па гэтай самай дарозе едзе пан. Убачыў ён вішню і думае сабе: «Ссяку я гэтую вішню і зраблю з яе дудачку».

Ссек ён вішаньку, зрабіў з яе дудачку, едзе сабе ды грае, а дудачка тая спявае:

Не грай, паночку, не грай,
Сэрцайка майго не разрывай,
Мяне браты забілі,
Нож у сэрца ўсадзілі,
Чарапком вочы накрылі,
Пясочкам засыпалі,
Вішаньку замест крыжа пасадзілі...[1]

---

[1] Гэты і два наступныя куплеты песні ў арыгінале апавядання даюцца па-польску. *(Заўвага ўкладальнікаў.)*

Дзівіцца гэты пан, дзівіцца, а дудка просіць ды просіць, каб ён на ёй не граў...

— Ага-а! — зноў перапынілі старую некалькі здзіўленых галасоў.

— Так і спявала гэтая дудка, так і прасіла! Ну!..

Вочы бабы Настулі блішчалі, як сярэбраныя іскры, завялыя губы, здавалася, што раз, то больш дрыжалі ад жаху. Успёршыся на калені локцямі і расставіўшы рукі, яна баяла далей:

— Прыехаў пан у тую вёску, дзе жылі дурнявыя браты і бацька, ночка застала яго ў дарозе, дык ён прыйшоў да іх і просіць, каб дазволілі пераначаваць. Дазволілі яму пераначаваць, выпраг ён каня, увайшоў у хату і кажа гаспадару:

— Ехаў я, кажа, цераз такі ды такі лес, гляджу — ажно стаіць сабе вішанька, такая роўная ды высокая. Я гэтую вішаньку ссек і дудку [redacted] яе зрабіў. А каб ты ведаў, як гэтая дудка грае! Я ніколі яшчэ не чуў, каб дудка так грала. Вазьмі, стары, ды пайграй трошкі.

Узяў мужык дудку, пачаў на ёй граць, а яна спявае:

Не грай, татуля, не грай,
Сэрцайка майго не разрывай,
Мяне браты забілі,
Нож у сэрца ўсадзілі,
Чарапком вочы накрылі,
Пясочкам засыпалі,
Вішаньку замест крыжа пасадзілі.

Здзівіўся стары і даў дудку сынам сваім, каб яны на ёй зайгралі. Граюць яны, а дудка спявае:

Не грайце, брацікі, не грайце,
Сэрцайка майго не разрывайце,
Гэта вы мяне забілі,
Нож у сэрца ўсадзілі,
Чарапком вочы накрылі,
Пясочкам засыпалі,
Вішаньку замест крыжа пасадзілі.

Тады ўсе здагадаліся, што разумныя забілі дурня. Пайшлі на магілку, адгарнулі пясок і ўсё так знайшлі, як расказала дудка.

Тады гэтых братоў у канцылярыю забралі і ў турму пасадзілі.

Баба змоўкла, і ніхто і словам не аказаўся. Калаўроты круціліся паволі, паволі, а праз ціхае іх тарахценне чулася цяжкое ўздыханне. Здавалася, што з расказанай казкі выплылі прывіды забойства і пакарання і нябачнай хмарай павіслі ў духаце гэтай хаты.

Аляксей, заўсёды ганарысты і вясёлы, з'едліва пасміхаўся і шаптаў Дзям'яну на вуха:

— Вось напалохаліся бабы! Ну, я ж ім яшчэ большага страху наганю!

Ён выйшаў ціха ў сені, а праз дзве хвіліны з трэскам расчыніў дзверы і гукнуў на ўсю хату:

— Людзі, ратуйце! Хто ў Бога верыць, ратуйце! Бонк ідзе! Разбойнік Бонк ідзе! Вось-вось ужо прыйшоў! З вялікім вострым нажом прыйшоў! Гу, гу, гу!..

Дзяўчаты закрычалі і пахаваліся за прасніцы. [...]

Сур'ёзная Хрысціна абурылася.

— *Не дурыся,* Аляксей! — прыкрыкнула яна на дзевера.— Ахвота табе людзей палохаць! Пасаромеўся б!

Аднак паніка прайшла не адразу. Відаць, усе прысутныя чулі ў той дзень пра Бонка. Хлопцы прывезлі з кірмашу страшныя гісторыі пра яго. Жанчыны наслухаліся іх.

Ганулька прыціскала руку да сэрца.

— Б'ецца, ой як б'ецца і не можа ўтаймавацца! — стагнала яна.

Мажная Улляна выцірала пот, што кроплямі выступіў на лбе.

Усе яны наракалі:

— *А каб цябе,* Аляксей!.. Каб такога страшнага чалавека супраць ночы ўспамінаць... Яшчэ, крый Божа, і прыгаворыш! Яшчэ сапраўды калі прыйдзе...

— А што, і прыйдзе! З такім вялікім вострым нажом прыйдзе! — пацвельваўся мужчына.

— Ай! — зноў закрычала некалькі галасоў.

— *Годзе!* — цвёрда сказала Хрысціна і, крутнуўшы мацней калаўрот, дадала: — От, заспявайма лепш.

Голас яе быў прыгожы, звонкі, сур'ёзны, як і сама яна. Усе ведалі, што хоць яна ўжо шаснаццаць год замужам, аднак вельмі любіць спяваць. Паволі ведучы з кудзелі доўгую роўную нітку, яна звонка, спаважна завяла:

Ой, валы мае ды палавыя,
Чаму ж вы не араце,
Ой, леты мае, леты маладзенькія,
Чаму ж вы марна ідзяце...

Хор галасоў — розных: серабрыстых і чыстых, піскля-вых і фальшывых — ураз падхапіў:

Каб валам маім ды паша была,
То яны пааралі б,
Каб летам маім ды раскоша была,
То яны пагулялі б...

Песня лілася ў душнай хаце доўга, то ўздымалася, то ападала, нібы хваля. Калаўроты ўторылі ёй роўным, але павольным, прыцішаным тарахценнем. [...]

Стары гаспадар, што адзін моўчкі сядзеў каля сцяны, расплюшчыў вочы. Нібы з нейкіх глыбіняў, аднаму яму вядомых, вынеслі яго на паверхню хвалі песні. Ён прыўзняў павекі і з аслупянелай упартасцю пачаў углядацца ў супрацьлеглы бок хаты. Нядаўна, калі Аляксей з трэскам адчыніў дзверы і гукнуў: «Бонк ідзе! Разбойнік Бонк ідзе!» — госць, які сядзеў побач з Аленкай, закалаціўся ўсім целам і ўсхапіўся, нібы падкінуты мінай. Наступную казку ён слухаў з яшчэ большай увагай, чым раней загадкі, вачэй не зводзіў з бабы, пасміхаўся толькі часамі, паблісківаючы вачыма. Аляксееў крык вырваў яго з задумы. Госць усхапіўся, моцна сціснуў свой кій, што стаяў паміж каленяў. Кінуўся да дзвярэй. Але тут раптам пачуўся рогат, якім дзецюкі даводзілі, што яны прынялі за жарт Аляксеевы словы. Госць затрымаўся каля парога і нейкую хвіліну вадзіў па хаце памутнелымі вачыма. Ён глядзеў на сцены, на столь, на яркі агонь камінка, пакуль не спыніў позірк на старым, што нерухома сядзеў каля сцяны. Госць пачаў паволі апускацца долу. Ён прысеў за бочкай на таку, відаць, на хвіліну толькі прысеў, трымаючы свой кій у апушчаных руках. Увесь ён схаваўся за бочкай, пад якой толькі ўздымалася яго галава, а збоку паблісквау сталёвы наканечнік кія. На гэтую галаву зірнуў Мікула, прыўзняўшы павекі, і ўжо не адрываў ад яе аслупянелых вачэй. У святле, што наўскос падала на яе ад агню, галава гэтая, акружаная

прыцемкам, здавалася, вісела ў паветры і ўпарта, нерухома глядзела на старога Мікулу.

Стары падняў руку да лба і раптам прашаптаў:

— У імя Айца і Сына...

Потым рука яго павольі пачала апускацца долу, абяссіленыя пальцы расчапіліся, ажно люлька высунулася з іх і ўпала на зямлю. Ён гэтага не заўважыў.

— Божа літасцівы! — зашаптаў ён зноў і, падаўшыся наперад усім целам, пазіраў на твар, які з другога канца хаты глядзеў на яго і рабіўся ўсё больш падобны на трагічную маску, худую, змарнелую. Косці на шчоках выпіралі пад упалымі скронямі. Твар гэты, поўны бязмежнай тугі, нібы застыў у ціхім рыданні. Скрыўленыя вусны былі моцна сціснуты, аднак ён гаварыў, выразна гаварыў старому: «Татачка, ці вы пазнаеце мяне? Ох, татачка, успомніце, які я быў калісьці, і паглядзіце, які я цяпер!»

— Божа літасцівы, злітуйся над намі! — прашаптаў стары.

Каля печы зноў хорам выводзілі песню:

Ой, узыдзі, узыдзі, ясны месячэньку,
Як млыновае кола,
Выйдзі, дзяўчына, сэрца адзіна,
Прагавары да мяне слова...

Твар над бочкай, які нібы вісеў у паветры, выразна гаварыў старому: «А памятаеш, тата, ой, ці памятаеш той летні сонечны дзянёк, калі ты на гару ўзыходзіў, на плячах несучы сетку з рыбай, а я за табою босы бег і па пяску скакаў і так крычаў ад радасці, што голас мой званочкамі разлятаўся па вёсцы, паміж соснамі над магілкамі?.. Памятаеш, татка, ой, ці памятаеш?..»

Песня каля печы пад шум калаўротаў мацнела, нарастала, здавалася, што сцены разнясе:

Як мне да цябе выйсці,
З табой гаварыці,
Калі людзі смяюцца,
Што мне з табой не жыці...

Галава над бочкаю, галава, што нібы павісла ў паветры, пачала павольі трэсціся, падміргваючы старому Мікулу, вачыма.

«Не жыць мне з табою, тата, не жыць мне ў гэтай хаце, дзе хлеба заўсёды хапае і людзі ў згодзе жывуць, на вясёлыя вячоркі сыходзяцца і весяляцца. Я выпадкова сюды зайшоў, сам не ведаючы, куды іду, абы толькі далей зайсці, уцячы ад таго, што мяне падганяе, ой, так падганяе, ажно мароз па спіне ходзіць, а то агнём пячэ. Я выпадкова сюды прыйшоў і не вытрываў, у хату зайшоў. Ды мне тут не жыць... Я ўстану зараз і пайду, бо шмат грахоў на свеце нарабіў, дык нельга, каб за іх ды не было ніякага пакарання, тата... Ты ж сам сказаў і асудзіў, што нельга...»

Услед за галавой, што трэслася за бочкай, пачала трэсціся таксама галава старога. Як быццам адказвала, паўтарала: «Нельга, сынок, ніяк нельга!»

Раптам стары, але дужы Мікула правёў вялікай, жылістай рукой па вачах і пачаў шаптаць заклінанне:

— То і згінь, прападзі, калі ты такі... Цьфу, прывід з таго свету! Якая нячыстая сіла водзіць цябе па свеце? Згінь, прападзі!

Ён павярнуўся шырокімі плячыма да хаты, а да сцяны — тварам, такім змрочным і грозным, нібы навальнічная хмара.

— Згінь і прападзі, калі ты такі... — паўтарыў ён.

Стары прыхіліўся да сцяны вялікім аблыселым ілбом, на якім сабралася, можа, сотня маршчын і складак. Ён ужо нічога не хацеў ведаць.

Вясёлая, гарэзлівая песня напоўніла хату:

У полі крыніца,
У ёй вада сачыцца,
Малады малойчык
Вельмі лайдачыцца.
Рабіць ён не хоча,
Ані працаваці,
Толькі піць-гуляці,
Дзевак намаўляці.

На гэты раз спявалі адны жанчыны. [...]

Раптам песня абарвалася на палавіне страфы, нібы хто стужку нажом перарэзаў, і ў цішыні, што агарнула хату, пачуўся смелы, ганарысты Аляксееў голас:

— А пашпарт, пане, у вас ёсць? Пакажыце, пане, пашпарт, каб мы ведалі, хто вы такі!

Стары Мікула зноў павярнуўся тварам да хаты, палажыўшы на калені вялікія рукі, сядзеў выпрастаны і з-пад цяжкай хмары маршчын пазіраў на тое, што рабілася ў хаце.

Амаль каля самых дзвярэй шэсць мужчын акружылі бочку, над якой некалькі хвілін таму назад уздымалася толькі госцева галава. На чале мужчын стаяў Аляксей, у расшпіленым кажусе, з папяросай у зубах. Ганарыста адкінуўшы галаву, ён звяртаўся да госця. Іншыя паўтаралі за ім:

— Пашпарт пакажыце! Цяпер без пашпарта нікому не дазволена валачыцца па свеце...

— Можа, ты бог ведае хто,— груба, панура крыкнуў бондар,— а мы адказваць будзем за тое, што цябе не злавілі...

— Можа, ты той самы Бонк, якога ловяць за нявінную людскую кроў,— намагаючыся перакрычаць іншых, загаварыў Дзям'ян.

Нездарма называлі яго разумным Дзям'янам. Гэта ён першы, зірнуўшы на госця, што сядзеў за бочкай, шапнуў Аляксею і бондару, нібы загадваючы новую загадку:

— А можа, гэта Бонк?

З-за бочкі ўсхапіўся чалавек. Люта, як у загнанага звера, заблішчалі яго вочы, ноздры раздзьмуліся, ён моцна вылаяўся. Усхапіўся, кій з жалезным наканечнікам падняў і, размахваючы ім шырока, кінуўся да дзвярэй. Але хлопцы ўмомант схапілі яго за рукі.

Пачуліся крыкі:

— То ты такі! Замест пашпарта кій нам паказваеш! Ого-го! Добрая ты, відаць, птушка...

— Бонк, напэўна, Бонк! Лавіце, трымайце!

— Трымайце, людзі, хто ў Бога верыць, не пускайце яго!

Перапалоханыя, анямелыя ад жаху дзяўчаты збіліся чародкай каля печы, нібы авечкі. [...]

Каля дзвярэй ішла тузаніна. Госця не так лёгка было схапіць. Моцны, пругкі, хоць і худы, натрэніраваны ў бойках, ён вырываўся з рук, што хапалі яго, біў нападаючых локцямі і нагамі. Ад гэтага яшчэ больш расла іх заўзятасць.

Хлопцы крычалі і лаяліся. Нарэшце Аляксей першы, а за ім бондар — самыя заўзятыя або самыя дужыя — абхапілі яго так моцна і спраўна, што той і паварушыцца не мог.

— Пастронкі! — крычалі яны.— Гэй, бабы, пастронкі давайце!

Хрысціна, аднак, не расчапіла рук. Яна глядзела, глядзела, а задуменныя вочы нібы паўтаралі: «Такі ж і гэтага маці калісьці на руках насіла і калыхала!»

Ад печы пачуўся дрыготкі голас соннай бабы Настулі:

Не грайце, браточкі, не грайце,
Сэрцайка майго не разрывайце...

А з чарады мужыкоў пачуўся пакорлівы, умольны голас, што дрыжаў ад страху:

— Пусціце мяне, людзі добрыя, калі ёсць Бог у вашых сэрцах. Я вам нічога дрэннага не зраблю, пайду адсюль, адразу пайду навечна, з вачэй прападу, толькі пусціце. Ой, пусціце!.. [...]

— Я выпадкова да вас зайшоў,— задыханым голасам гаварыў ён,— выпадкова, на гадзінку, без ніякага дрэннага намеру... Каб толькі адпачыць... І я адразу пайду... пайду... Нічога дрэннага не зраблю... Толькі пусціце мяне, калі ў вас Бог у сэрцы ёсць, калі хоць кропля літасці... Дзеля збавення душы... пусціце... Дзеля пакут Хрыста нашага... Ой, людзі!..

Хрысціна ўголас прагаварыла:

— А такі ж і гэтага маці калісьці на руках насіла і калыхала...

А побач, амаль каля самай зямлі, сонная баба Настуля мармытала напеўна:

Браточкі мяне забілі,
Нож у сэрца ўсадзілі...

— *Годзе!* — пачуўся над усімі галасамі голас, прызвычаены загадваць.— *Годзе!* Пусціце яго, расступіцеся і пусціце!

Мікула зноў устаў з лавы, ды ўжо не апаў на яе, як раней, але цяжкі, вялікі, у белай вопратцы, падперазанай

цвёрдым поясам, выпрастаны, хоць і апусціўшы да грудзей галаву, ён выйшаў на сярэдзіну хаты.

— Пусціце яго і расступіцеся! — паўтарыў ён.

Пастаяўшы хвіліну, здзіўленыя мужчыны нерашуча расступіліся.

Адзін Аляксей, які вяртаўся з вяроўкамі з сяней, паспрабаваў супраціўляцца:

— *Гэта ж Бонк, бацька! Далібог, Бонк!*

Стары змрочна зірнуў на яго.

— Маўчы! — сказаў ён і падняў свае бліскучыя ад гневу вочы на чалавека, што стаяў, згорбіўшыся, перад ім.

— *Ідзі,*— сказаў ён,— *ідзі...*

Хвіліну пазней ён закончыў:

— *І больш не грашы!*

Аднак той не ішоў. Глядзеў на старога, а потым, ступіўшы шырока наперад, рынуўся на зямлю і прыпаў вуснамі да вялікай босай запыленай Мікулавай нагі. Слёзы гарохам каціліся па шчоках старога.

Мікула хутка засунуў руку за кашулю, у руцэ яго зашамацелі паперкі. Ён нахіліўся да ляжачага і адразу выпрастаўся.

— *Больш не грашы!* — паўтарыў ён і настойліва, нібы ад страху, прагаварыў некалькі разоў: — *Ідзі... ідзі ж... Хутчэй ідзі...*

Праз момант, сплятаючы вялікія рукі, дакончыў шэптам:

— *З Богам!..*

* * *

Ноч была цёмная, неба закрывалі хмары, не свяцілася ніводная зорка. Гойсаў свавольны вецер, круціў, уздымаў угару слупы грозных шумаў, стогнаў, завыванняў, посвісту, спяваў у глыбокай катлавіне, на дне якой ляжала шырокае рэчышча замерзлай ракі. Нізка над самым рэчышчам зноў ішоў чалавек, зусім самотны.

На цьмяным фоне снегу ён быў падобны на тонкую рысу, якая хутка перасякала густую, аднак не такую

чорную, як яна, цемру. Высокія сцены, што ўзвышаліся паабапал катлавіны, рабілі чалавека яшчэ меншым. Ён здаваўся маленькай драбніцай, якая плыла па моры бязмежнай велічыні. Вялікае мора ночы і адзіноты абдымала яго з усіх бакоў. Моцны, шумлівы вецер, здавалася, нясе яго па гэтым шырокім, дзікім, змрочным свеце, перад сілай, пагрозай і веліччу якога ён быў кропляй, крушынкай, зярняткам пяску, каліўцам травы, якое ўпала ў бездань...

1887

Раманіха

(Скарочана)

Дык нават і ў гэтай жанчыны быў калісьці над галавою блакіт, а ў сэрцы сонца шчасця! Нават і такія пылінкі чалавецтва, маленькія і шэрыя, маюць свае ўспаміны, пра якія з гучным, грубаватым смехам гавораць датуль, пакуль у вачах не блісне сляза. Калі ласка! Хто б спадзяваўся, што гэтая Раманіха была калісьці шчаслівая і вясёлая, што ў жыцці яе было нават крыху паэзіі. Яна — і паэзія! Дзіўная сувязь дзвюх супрацьлеглых састаўных частак, убачыць якія ў рэторце жыцця можна толькі пры дапамозе мікраскопа.

Я ведала яе ўжо некалькі год, ды ўсё ж такі тады, калі яна расказвала мне пра сваё мінулае, я пільна, з цікавасцю прыглядалася да ўсёй яе знешнасці, а асабліва да ігры маршчын на твары. Нягледзячы на тое, што яна даўно ўжо была ў горадзе, Раманіха не прывыкла да гарадской вопраткі. З нейкім асаблівым умельствам знаходзіла яна на гарадскіх рынках каляныя спадніцы, якія вясковыя жанчыны ткуць з рознакаляровых ільняных і канапляных нітак, называючы такую вопратку самадзелкай. Жанчына стаяла перада мною ў саматканай спадніцы, пругкай, у чырвоныя і сінія палосы, у грубым і цяжкім абутку на вялізных нагах, у кофце, скроенай ужо трохі па-гарадскому, і ў паркалёвай квяцістай хустцы, зноў жа па-вясковаму завязанай так,

што галава яе выглядала як у чапцы, толькі дзве пасмачкі, ужо сівыя, спускаліся на лоб,— стаяла перада мною, размаўляючы, смеючыся, задаволеная тым, што вось і ёй можна гаварыць... гаварыць... гаварыць... Была яна калісьці, магчыма, і прыгожая, але цяпер яе смуглы твар, з нізкім ды зморшчаным ілбом, са зморшчанымі шчокамі і завялымі вуснамі, нагадваў змяты лісток старой, пажаўцелай паперы. Малы задзёрты нос прыдаваў твару выраз злёгку дурнаватай весялосці, а шэрыя малыя вочы вельмі жыва паблісквалі з-пад густых выпуклых броваў. Па руках відаць было, у якой цяжкай, няспыннай працы прайшло жыццё гэтай жанчыны. Гледзячы на гэтыя рукі здалёк, можна было падумаць, што яны ў карычневых рукавіцах. Далоні вялізныя, агрубелыя, а пальцы вузлаватыя, заўсёды пазначаныя чорнымі ды чырвонымі рубцамі, якія сведчылі пра тое, як часта рукі гэтыя сустракаюцца з агнём і варам. Склаўшы рукі на грудзях, паблісваючы шэрымі вачыма, Раманіха расказвала:

— *Бывала*, панечка, што зімою, калі яго *сматрыцель* па сена пашле, запражэ ён у сані пару коней, званок прывяжа да дышля і гукае мне: «Еўка! Бяжы хутчэй, паедзем удваіх!» *Сматрыцель* часамі крычыць з сяней: «Раман! А навошта табе гэты званок?» «Каб ваўкі ў лесе не напалі»,— адказвае. Але ж я ведала, што гэта зусім не ад ваўкоў, а таму, што я вельмі любіла з паштовым званочкам ездзіць. Другому, можа, і не дазволілі б жонку з сабою браць, але яму дазвалялі. Другога такога паштальёна не было на ніводнай *станцыі* — ад нашай да самай Вільні. Найлепшую чацвёрку коней яму заўсёды давалі. Калі прыязджаў губернатар або пан які, ніхто не вёз яго, толькі Раман. Калі пан які ехаў, дык, *бывала*, прасіў *сматрыцеля*: «Дайце ж мне толькі Рамана!» Бо ён быў, панечка, высокі, прыгожы, як дуб, мужчына, такі брунет, як быццам яму хто валасы ды вусы смалою памазаў, у руках такі дужы, што няхай Бог крые, і гарэлкі не піў. Хіба толькі на Вялікдзень чарачку якую возьме або часамі піва шклянку вып'е, але ніхто яго ніколі п'янага, як іншых, не бачыў. Коней любіў, як дзяцей, цэлымі днямі, *бывала*, то чысціць іх, то корміць, то поіць, а калі ўжо няма пры іх ніякай работы, дык ён так

сабе ў *праварыне* стане, грывы ім гладзіць і гаворыць, як з людзьмі... Часамі і мяне пакліча: «Еўка, хадзі сюды!» Што ты зробіш? Хоць ад пліты ці ад балеі адарвуся, але ў стайню іду. Ён мяне за руку і ў *праварыну* цягне. «Зірні, кажа, якія ў гэтага лайдака разумныя вочы!» А конь глядзіць на яго, як чалавек, і храпу яму, як сабака, кладзе на плячо. «Прынясі яму кавалачак хлеба»,— гаворыць Раман. Пайду, *бывала*, у хату і прынясу. Што ты зробіш? Ён жа так тых жывёлін любіў. Стаім у *праварыне*, ён з аднаго боку каня, я з другога. «Дай яму хлеб сама»,— кажа Раман. Даю. Ката ў стайні трымалі, такога вялікага, бурага, дык ён, *бывала*, як убачыць хлеб у чалавека ў руках — злезе з гарышча па драбіне, на жолабе сядзе, мяўкае і ў вочы табе глядзіць. «*Дай крышку і кату*»,— кажа Раман. Я трошкі хлеба то каню дам, то кату, а сама смяюся, як дурніца. А мой не смяецца, толькі то на мяне, то на каня з катом глядзіць і такі шчаслівы, што ажно вочы ў яго блішчаць. Іншыя *паштальёны*, *бывала*, сварацца на дзядзінцы, або ў карчме гарэлку п'юць, або б'юцца па хатах з жонкамі, а ён толькі б мяне пры сабе трымаў увесь час ды сваіх коней гладзіў... Як жа ён іх любіў!..

Відаць, і яе ён моцна любіў, а яна ведала гэта і памятала, але не хацела або не магла пра тое гаварыць. Хутчэй за ўсё — не магла. Прыгорбілася трохі, на нізкім ілбе заварушыліся, як хвалі, маршчыны, а жоўтыя вейкі заміргалі хутка, хутка...

— А што ж там было тады, калі вы разам па сена ездзілі санямі?

Яна выпрасталася, мокрыя вочы заблішчалі, зноў пачала смяяцца.

— Смех быў, дый годзе, паненачка! Ха, ха, ха!.. Пару коней, *бывала*, запражэ, тлустых, адкормленых, ажно блішчаць, як шкляныя, званок да дышля прывяжа і крычыць: «Еўка, хадзі сюды хутчэй!» А мне два разы казаць не трэба — *цап-лап* за хустку, на галаву, а сама з хаты выскачыла і старой Касьцы гукаю, каб дзіцяці і варыва дагледзела...

— А што ж гэта за Каська была?

— Кавалёва ўдава, панечка, такая старэнькая, старэнькая і вельмі бедная... Калі яе мужык памёр, яна пры за-

мужняй дачцэ жыла, пакуль зяць не выгнаў... Да сына, таксама каваля, пайшла жыць, але сын распіўся, пайшоў у свет і загінуў без усякай весткі, старую матку пакінуўшы. Пан Бог ведае, што з ім сталася... Можа, памёр дзе пад плотам, як п'яніца, ці, можа, і абакраў каго, ды ў турму яго ўзялі і далёка заслалі... Дык гэтая Каська — дзе ж ёй падзецца — на *станцыі* нашай жыла. *Сматрыцелю* ды паштальёнскім жонкам прыслужвала, а летам кароў пасвіла... Ой, панечка, бедная тая Каська была, горкая старасць яе!..

Раманіха ўзняла руку, шчаку падперла, а на твары яе з'явіўся выраз такога страху, што нават маршчыны як быццам застылі. Што за прычына для гэткага страху — мне было добра вядома.

— Ты, відаць, пра Міхалку свайго цяпер падумала?

Яна кіўнула галавой:

— Мая панечка, дарагая мая панечка, што з ім будзе? Ці ж ён таксама змарнуецца, як сын той Каські?..

Кажучы гэта, яна глядзела мне ў твар, а вочы яе, нерухомыя сярод застыглых маршчынаў, зрабіліся такімі праніклівымі, як быццам жанчына хацела зазірнуць мне ў самую душу, каб даведацца, што я думаю. Ці яе Міхалка таксама змарнуецца, як сын той Каські? Мне вельмі хацелася адказаць ёй адмоўна, аднак я не магла. Лепш ужо зноў вярнуць яе ў мінулае. [...]

— А бяды вялікай у хаце вашай не было?

— Ды не, панечка. Багацця не было, але і бяды не было. Жылі мы хораша, працавалі абое, то і жылося без голаду. *Бывала*, на абед капусты ды гароху навару або бурачкоў ды бульбы, а на вячэру зноў бульбы ці бобу звару дый салам часамі закрашу. Парсюка штогод карміла, на Каляды былі з яго каўбасы і крывянка, а на Вялікдзень Раман у аканома або ў дзядзькі якога парасятка купляў і за ногі яго дахаты прыносіў... Дык і чаго ж яшчэ было хацець?

І сапраўды — гарох ды капуста, бурачкі ды крупеня, бульба ды боб, адзін раз у год парася запечанае — чаго ж было болей хацець? Раманіха з поўнай перакананасцю сцвярджала, што больш ім нічога і не трэба было. Жанчыне прыпаміналася, што на такой ядзе ў тую пару яна была зусім шчаслівая. Раман быў таксама шчаслівы, але не зусім, бо вельмі ж хацеў мець кавалак уласнай зямлі.

— Ды так яму, панечка, зямлі тое хацелася, што з галавы яна ў яго ні днём, ні ноччу не выходзіла. Раз неяк вярнуўся і толькі *ярмяк* з плячэй, адразу кажа: «Еўка, якую ■ хату там, за мястэчкам, бачыў! Відаць, нехта толькі што паставіў, бо новенькая, страха яшчэ жоўценькая, чатыры акны з чырвонаю аблямоўкай і дзверы чырвоныя, ганачак, двор, плоцік з частаколу, агарод, поля кавалак — усё ёсць. От каб гэта мы калі-небудзь такую сядзібу мелі. Ой!..» І, можа, не паверыце, панечка, але, дальбог, дапраўду кажу. З дзесяць міляў у той дзень праехаў, змок пад ліўнем, ажно кашулю трэба было выкручваць, нават чарку гарэлкі выпіў, каб сагрэцца, але праз тую хатку і сну ў яго не было. Лёг і спачатку заснуў, а потым мяне ўсё будзіў: «Еўка, ты спіш?» «Не, а што табе?» — кажу. «Каб ты толькі бачыла тую хату! На вокнах аблямоўка шырокая, каля самага лесу стаіць, і, па загонах мяркуючы, маргоў са тры поля пры ёй! Ой!..» Варочаўся, уздыхаў, як быццам гэта, шануючы панечку, не па хаце, а па каханцы ўздыхаў. Увечары, *бывала*, калі ён каля коней падходзіцца і нікуды ехаць не трэба, прыйдзе са стайні дадому, возьме Міхалку на рукі, па хаце яго носіць, да самай столі гойдаючы, ажно той хлопец ручанятамі за бэльку кожны раз бярэцца, або спявае сам Раман ды малога вучыць спяваць, а потым зноў за сваё — пра ўласную хату, пра поле. «Каб мне Бог даў,— кажа ён хлопцу,— у сваёй хаце цябе гадаваць! Каб я мог калі-небудзь на сваёй зямельцы навучыць цябе араць! Каб я, вочы апошні раз закрываючы, думаў, што ты ў сваёй хаце жыць будзеш гаспадаром! Ой!..» Уздыхне, *бывала*, хлопца мне аддасць, а сам у куце сядзе, твар рукою падапрэ і замаркоціцца, як тое неба на дождж. [...] Толькі, бывала, калі пачуецца тады перад *станцыяй* званок, а *сматрыцель* крыкне: «Раман, запрагай!» — Раман устаў з лавы, праклінаючы і пошту, і паштальёнскае жыццё. «Чэрці іх пабралі б, кажа, з жонкай ды з дзіцем пасядзець не даюць! Валачыся цяпер на ўсю ноч, каб іх!..» А я яму *ярмяк* падаю, чырвоным поясам падпяразваю ды пацяшаю: «Пачакай *крышку*! — кажу.— Са сваёй хаты ніхто цябе на ўсю ноч выганяць не будзе!» Ага! Свая хата... Каму яе Бог дае, а каму не дае... І Раману майму даў, толькі надта ж цесную...

І сапраўды, па цесную хату адправіўся тады паштальён, калі, запрогшы шасцёрку коней у карэту нейкай праезджай пані, ускочыў у хату з крыкам:

— Еўка! Парадны *армяк* загадалі надзець! Давай!

Ён паспешліва апранаўся. Пані тая была жонкай нейкага саноўніка, *сматрыцель* нізка кланяўся ёй ды падганяў паштальёна. Ноч надыходзіла, асенняя ноч, ішоў дождж, свістаў вецер. Ад гэтай станцыі да другой было каля чатырох міляў, і, каб дабрацца туды, трэба было перапраўляцца цераз вялікую раку, ды не па мосце, а паромам. Раманіха, як заўсёды дапамагаючы мужу хутка апранацца, уздыхала: «У такую ноч! Цераз раку!» «Глупства,— адказваў той,— ці ж гэта я ўпершыню цёмнай ноччу цераз раку паеду! Вось толькі адна бяда! Прыпражныя коні, тыя, што куплены тыдзень таму назад, рукі маёй яшчэ не ведаюць і наравістыя. Далі іх мне на вывучку, але, лайдакі, як станавіліся дыба — так і становяцца. Калі чалавеку многа часу трэба, каб дрэнных звычак пазбавіцца, дык што казаць пра жывёліну». І калі ён, сказаўшы гэта, ужо апрануты, спыніўся перад агнём, што палаў у печы, дык у доўгім, з чорнага аксаміту *армяку* з чырвоным поясам, з бліскучым медалём на грудзях і ў футровай шапцы, зухавата надзетай на чорныя валасы, здаваўся такім высокім, дужым і прыгожым, што Еўка, забыўшыся пра трывогу, заглядзелася на яго, нібы на цудоўны абраз. Добра зрабіла, што так доўга на яго паглядзела, бо ўжо ніколі больш не давялося ёй яго бачыць. Не прайшло і дзвюх гадзін пасля таго, калі ён, абняўшы яе і малога, напомніўшы, каб не забылася добра замкнуць нанач дзверы, выйшаў з хаты, ускочыў на козлы, схапіў у жменю лейцы і крыкнуў на коней: «Гэй! Дзеці, гэй! Гэй!» Не прайшло і дзвюх гадзін пасля таго, як карэта, свецячы запаленымі ліхтарамі, глуха прагрукацела і знікла ў дажджлівай, ветранай цемры, што навісла над паштовай дарогай,— не прайшло і дзвюх гадзін, калі на пераправе, дзе паром, пераплыўшы раку, меўся прычаліць да берага, у дажджлівай і ветранай цемры пачуўся страшэнны крык. Нешта жудаснае рабілася там з паромам, коньмі, людзьмі... Карэту, аднак, і пані, што ехала ў ёй, выратавалі, і лёкая таксама. Толькі двое коней задушыліся і паштальён утапіўся.

Раманіха пляснула рукамі.

Вось табе і хата з чырвонымі, памаляванымі дзвярамі! Вось табе і кавалак уласнай зямлі! Выцягнулі яго з ракі, пафарбавалі чырвоным труну, у жоўтым пяску выкапалі яму...

Буйная сляза скацілася па яе цёмнай, агрубелай шчацэ. Жанчына згорбілася, затрэсла галавою, а вільготныя вочы жаласліва пазіралі кудысьці далёка... Раптам вочы яе высахлі і заблішчалі так, нібы ёй было гадоў дваццаць, як блішчалі яны, відаць, тады, калі Раман, запрогшы ў сані коней, клікаў: «Еўка, паедзем разам!» Яна выпрастала свой мажны стан і, хаваючы пад пярэднік рукі, і яўнай нецярплівасцю пачала пытацца, што прыгатаваць на вячэру. Яна пераступала з нагі на нагу і ажно дрыжала, так ёй хацелася як мага хутчэй выскачыць за дзверы. А заўсёды ж цягнула яе расказаць, пажаліцца, пасмяяцца. Яна была шчаслівая, калі магла з кім-небудзь пагутарыць. Чаму ж тады цяпер ёй так не цярпелася скончыць са мной гаворку? Відаць, убачыла кагосьці праз акно і выгляд таго кагосьці асушыў яе вочы, выпрастаў сагнуты стан. Яна ўбачыла праз акно высокага юнака, які ў паплямленым сурдуце, высокіх ботах, у шапцы, што крыва сядзела на галаве, прабіраўся дваром, накіроўваючыся да бакавога ганка, у кухню.

Размашыстай хадою ён ішоў праз двор, задраўшы галаву, махаючы рукамі так, нібы кожнага, хто напаткаецца, папярэджваў: «Са мной да трох не гавары!» Па кожным яго руху відаць быў забіяка і буян. Узыходзячы на ганак, ён пахіснуўся некалькі разоў і вылаяўся. Раманішын твар зноў спахмурнеў, а потым стаў зусім змрочны. Болем напоўніліся яе шэрыя вочы, вусны задрыжалі ад трывогі і жаху. Цяпер ёй яшчэ больш не цярпелася ісці, бо яна, здалёк убачыўшы сына, не магла разглядзець, у якім той настроі.

Праз некалькі хвілін пачуўся з кухні і данёсся ажно на двор грубы, хрыпаваты мужчынскі голас, які з лаянкай і праклёнамі дамагаўся нечага і якому час ад часу адказваў голас жаночы:

— Ціха, Міхалка, ціха!

На адной з ангродаўскіх вуліц будавалі вялікую камяніцу. Новы, амаль да самага даху ўзняты дом адгароджаны быў ад вуліцы высокім плотам. Паміж плотам і сцяною ўздымаліся каркасы мулярскіх рыштаванняў, тарчалі драбіны, на тратуары, пакрытым разбітай цэглай і вапнавым пылам, стаяў драўляны посуд з падрыхтаванай глінай і вапнай. Даволі часта раннім ранкам, калі на вуліцы было яшчэ мала прахожых, перад камяніцай, недалёка ад драўлянага плота, спынялася высокая, мажная жанчына ў цяжкім скураным абутку, у калянай саматканай спадніцы і ў шэрай хустцы на галаве. У руцэ яна трымала вялізны закрыты кош, відаць, поўны набытку з рынку і мясной крамы. Жанчына спынялася перад плотам, падымала ўгару галаву і пазірала на самы верх рыштаванняў. Там, на самым версе, працавала каля дзесятка муляраў, якія клалі цэглу, жвава махаючы кельмамі і рукамі. Але яна глядзела толькі на аднаго з іх. Крыху наводшыбе ад іншых, у белым фартуху, што закрываў яго ад шыі аж да пят, ён стаяў на найвышэйшым рыштаванні і старанна, спраўна працаваў. Работа яго была такая, што трэба было стаяць. Яго высокі, дужы і спраўны стан, а таксама галава, зарослая чорнымі валасамі, нібы скульптура, вырысоўваліся на фоне светлых аблокаў. Іншыя рабочыя гутарылі, апусціўшы рукі, часта адпачывалі, часам пачыналі кароткія, але гучныя сваркі. А ён да нікога не звяртаўся і нікому не адказваў. З нейкай прыгажосцю, што ішла ад спалучэння сілы з выдатным вопытам, ён няспынна варушыў рукою, узброенай кельмай, і толькі часам пачынаў спяваць моцным і чыстым голасам; выводзіў некалькі нотаў вясёлай, жвавай песні і раптам абрываў. [...]

— Далібог,— даводзіла Раманіха,— ён найлепшы ў горадзе работнік! Хлявінскі, калі пачынае нешта будаваць, ледзь рукі яму не цалуе, каб да яго, ні да каго іншага не ішоў працаваць. Што другі за цэлы дзень зробіць, дык ён за дзве гадзіны нібы за сябе закіне. У бацьку ўдаўся. Дужы — ажно жах, і работа гарыць у руках. За жывёлай таксама, як бацька, прападае, і такая ж бацькава натура, далібог, бацькава...

Худая, жоўтая кабеціна, ахутаная вялікай хусткай, адказвала пісклявым голасам:

— Дай Божа, пані Раманіха! Дай Божа! Толькі, кажуць, нябожчык гарэлкі не ведаў...

Раманісе стала непрыемна ад гэтых слоў кумы-ганчарыхі.

— І ён таксама ведаць яе не будзе,— крычала яна.— Далібог, не будзе! Ужо месяц прайшоў — і ў рот не ўзяў. Працуе... Хлявінскі плаціць яму па рублю ў дзень. Ці ж гэта жартачкі? Грошы ён мне аддае, каб схавала... «Мама,— кажа ён,— купіце мне прыгожую тужурку і паліто. А потым яшчэ сярэбраны гадзіннік. Буду я апранацца, як пан!..» Вось пабачыце, пані Вінцэнціха, што хутка ён свае грошы і палічыць не зможа... Разбагацее страшэнна, першым майстрам будзе ў Ангродзе... Як у Хлявінскага, свае дамы ў яго будуць...

— Дай Божа! Дай Божа! — паўтарала пісклявым голасам кума, пасміхаючыся зларадна. Маючы мужа-п'яніцу, яна добра ведала цану гэтым вялікім надзеям Раманіхі. [...]

Калі яна праз два гады пасля мужавай смерці прыплялася з дзіцем у горад, колькі ж яна нацярпелася бяды, колькі тугі сардэчнай перажыла. З вёскі ды ў горад! Не ведаеце вы, людзі, колькі пакут, колькі рознага смутку звязана з такім перасяленнем. Ідзе сабе па вуліцы бедная жанчына, ідзе па слізкім або пякучым каменні ў падзёртых чаравіках, ступае асцярожна, ад вялікага страху дурнеюць калісьці, можа, і разумныя вочы, паміж худымі шчокамі крывяцца вусны, гатовыя заплакаць, за руку вядзе малое, якое таксама восьвось заплача. Калі б у яе хто спытаўся: «Чаму і навошта сюды прыйшла?» — яна адказала б, што, як не стала мужа, бяда гнала яе ад хаты да хаты, ад двара да двара, ажно сюды прыгналі яе людскія расказы пра лепшую долю, а таксама колішнія гутаркі з мужам пра тое, што малога ў людзі вывесці трэба. А як бы яна яго там, у вёсцы, вывела ў людзі? Спачатку пастух, а потым — парабак быў бы, і ўсё! А ў горадзе — о, тут зусім што іншага! Там бацька марыў пра ўласную хату для сына, пра кавалак уласнай зямлі. Тут маці, бадзяючыся спачатку па незнаёмых гарадскіх вуліцах, галодная, у дрэннай вопратцы, напалоханая і мар-

котная, прыглядалася да высокіх камяніцаў і думала: «От, каб гэта ён калі меў сваю камяніцу!..»

Перш за ўсё — да пасрэдніцы, якую нараіла сваячка, што жыла ў горадзе,— прасіць работы. Служба знайшлася, з невялічкай платай, з марнай ядою і страшэннай залежнасцю ад чужых людзей, якія пагардліва ставіліся да нязграбнай, неачэсанай сялянкі. Потым, можа, будзе лепш.

Дзе там! Доўгі час было вельмі дрэнна. Нацярпелася і дрэннага абыходжання, і зняважлівых слоў, і няспынных пераходаў ад хаты да хаты, і вымушанага беспрацоўя, звязанага з голадам, холадам, трывогай пра будучыню сваю і дзіцяці. Успаміны, ох, гэтыя ўспаміны пра былое шчасце, пра ўласны дом, родную старонку! [...]

Ішлі гады, доля яе крыху палепшала. Якім чынам яна авалодала кухарскім майстэрствам, хоць ніколі нідзе не вучылася? Ні яна сама, ні хто іншы не змог бы адказаць. Памяняла, праўда, з-за свайго няўмельства гаспадынь з дзесяць, але там убачыла адно, там другое, сама сваім розумам даходзіла, здагадвалася, камбінавала. З кніжак вучыцца яна не магла, бо не ўмела чытаць зусім. Так, чытаць яна не ўмела і наогул нічога не ўмела. Аднак авалодала сяк-так сваім майстэрствам і ўжо атрымлівала работу ў багацейшых дамах, дзе больш плацілі, дзе людзі былі лепш выхаваныя, больш чалавечныя. А тады і Міхалка падрос ужо, у гарадскую школу пачаў хадзіць. А потым на хрысцінах у ганчара Вінцэнта ёй страшэнна пашанцавала, яна там пазнаёмілася з панам Хлявінскім, найлепшым у горадзе майстрам мулярскай справы. Хлявінскі прыходзіў да ганчара на хрысціны ўжо толькі з ласкі сваёй, бо гэта быў чалавек, які апранаўся ў сурдут з тонкага сукна і насіў сярэбраны ланцуг пры гадзінніку. У яго было два дамы, праўда, драўляныя, але ўласныя, і ў адным з іх ён сам займаў кватэру з гасцінным пакоем, дзе стаяла канапа і на вокнах былі фіранкі. Аднак мулярскай справай ён усё яшчэ старанна займаўся, маючы ад яе значны прыбытак. Як смала, прычапілася баба да гэтага цудоўнага майстра. Хадзіла за ім, маліла, енчыла, усю сваю гісторыю жаласліва яму расказала, нават да жонкі яго пайшла, рукі ёй цалавала і — свайго дамаглася. Майстар прыняў яе Міхалку вучыцца на муляра. А яна ўжо ўяўляла

свайго хлопца ў такім самым тонкім сурдуце, у якім хадзіў Хлявінскі, уяўляла сына ўладальнікам двух дамоў. Познімі вечарамі, калі яна адна сядзела ў змрочнай кухні, перад вачыма яе ўставаў высокі, прыгожы паштальён у чорным доўгім *ярмяку* з чырвоным поясам, а яна, са слязьмі на вачах і шырокай усмешкай на вуснах, гаварыла яму: «А што, бачыш, як я сыночка нашага хораша выгадавала і ў людзі вывела! Не дачакаўся ты сваёй хаты, дык у яго яна будзе!»

Невялічкая кухня, амаль палавіну якой займала пліта, а адзінае акно выходзіла на вузкі засмечаны праход, адгароджаны ад суседняга двара высокім плотам, была сведкаю розных сцэн, сярод якіх здараліся і вясёлыя. Высокі, стройны, з чорнымі, па бацьку, валасамі, Раманаў сын узяў ад маці яе малыя шэрыя вочы, што крыху псавалі яго твар, і сваім выразам выяўлялі складанасць яго натуры. Вочы былі жывыя, бліскучыя, але не такія, як у маці, дабрадушныя і крыху дурнавата-вясёлыя, а страсныя і гуляшчыя. Адлюстроўваліся ў іх бурны неспакой і вялікая прагнасць радасцей. Можна было б сказаць, што ў гэтыя бліскучыя, часамі памутнелыя, неспакойныя вочы, што пазбягалі чалавечага позірку, зазірнулі гарадскія падонкі і пакінулі там сваё адлюстраванне. Затое ўсмешка яго была шчырая, свежая, адкрывала яна два рады белых зубоў, прыдавала твару выраз дабраты і сумленнасці. Калі, ідучы да маці, ён праходзіў па двары ў сваім мулярскім фартуху і ў выпацканай вапнай шапцы, а ў нядзелю і ў святы — у чыстым сурдуце і ў ботах з доўгімі халявамі, дык па яго спрытных, дзёрзкіх рухах і па здаволеным твары можна было пазнаць працавітага і сумленнага работніка, якому хапала і хлеба, і заслужанай упэўненасці, і незалежнасці. [...]

Надыходзілі дні, а часта і тыдні, калі ніхто нідзе ў горадзе не бачыў спраўнага, малайцаватага рабочага; затое каля дзвярэй таго ці іншага шынка заўсёды можна было ўбачыць чорна-пярэстага сабаку, які з бязмежнай стойкасцю пільнаваў сваё месца. Схуднелы, сумны, ён толькі часам адыходзіўся, каб пажывіцца чым-небудзь на сметніку, зноў скручваўся клубком або ад вялікай стомы выцягваў усе лапы і пазіраў з тугою то на дзверы, то на сцяну дома.

У той час і Раманіху таксама цяжка было пазнаць. Патухалі бліскучыя, жывыя вочы, аслупянелым позіркам яна глядзела з-пад насупленых броваў; на шчоках яе і лбе выступалі чырвоныя плямы. Заўсёды рухавая, цяпер яна цяжка і сонна совалася па свеце, ужо не гаманіла, а маўчала, нібы камень. Пра сына — ні слова, а калі хто-небудзь сваімі пытаннямі прыціскаў яе да сцяны, у жанчыны хапала духу, каб упэўнена, нават нахабна схлусіць. Гаварыла, што Хлявінскі паслаў яго за горад, каб там, замест яго, кіраваў будаўніцтвам вялікага палаца. А калі заўважала недавер у вачах слухача ці слухачкі, тады доўга і надзвычай вобразна пачынала расказваць пра палац, які будаваў яе сын. Печы і столі былі там такія, якіх яшчэ ніхто нідзе не бачыў, якія ва ўсім свеце толькі адзін яе Міхалка ўмее рабіць. Такога палаца, як той, што ён за дзесяць міль ад Ангрода будуе, няма ва ўсёй *Польшчы* і нават у Парыжы. Расказваючы ўсё гэта, яна настолькі захаплялася мулярскай славай свайго сына, што сама пачынала верыць ва ўсё, пра што гаварыла. Вочы яе зноў блішчалі, голас уздымаўся іападаў, уся яе постаць надзімалася горда, мажнела. Ды раптам яна абрывала сваю цудоўную гісторыю, павекі яе пачыналі трымцець, губы дрыжалі; яна хапала вядро і без усякай патрэбы бегла па ваду або, выскачыўшы з кухні, хавалася ў цёмнай дрывотні, адкуль праз некалькі хвілін выходзіла з бярэмем дроў. Чарадзейны палац, разам з рыштаваннем, на якім у яе часовым уяўленні старанна і спраўна махаў кельмай малады высокі рабочы, рассыпаўся дашчэнту. Іншы раз яна спрабавала прыдумаць нешта іншае. Гаварыла, што сама паслала Міхалку ў вёску да сваёй радні. Там у яго цёткі, а таксама дваюрадныя браты, гаспадары з дастаткам, і хлопец павінен іх наведаць, бо ўсе яны страшэнна любяць і яе і яго. Як і пра той палац, так і тут яна падрабязна і доўга расказвала людзям пра сваю радню. І зноў сама верыла ў свой жа падман, зноў радасна і горда свяціўся яе твар, і зноў без усякай патрэбы бегла яна ў дрывотню і, схаваўшыся за стажком дроў, ламала рукі, ажно суставы трашчалі, і ціхім галасам заводзіла:

— Ой, няма ў мяне ні цётак, ні братоў, ні радні ніякай і ні роднай душы... Ой, бедная я на гэтым свеце, сірата

пакінутая, што на пагібель свайго дзіцяці роднага глядзіць!

Калі ніхто ў яе не пытаўся, яна маўчала і толькі падыходзіла да тых, каму асабліва давярала, падыходзіла і таямніча шаптала:

— Ды што ж гэта будзе? Што ж будзе з гэтага? [...]

Работу дастаць было яму не цяжка. Ён ішоў да Хлявінскага, а той усё яму прабачаў. Заможны майстар, відаць, меў слабасць да гэтага прыгожага юнака і выдатнага работніка.

Слабасць да Міхалкі адчувала таксама і мулярыха, ды амаль і ўсе, хто яго ведаў. Калі ўсё ішло добра, ён цэлымі тыднямі працаваў нястомна, старанна, быў ветлівы, паслужлівы і такі вясёлы, што знаёмыя называлі яго штукаром і шалапутам. На імянінах ці на хрысцінах ён танцаваў спрытна і нястомна, ніхто з ім не мог зраўняцца. Калі ў запускі на кватэры ў каго-небудзь з майстроў пераапранутыя гараджане паказвалі гісторыю цара Ірада, дык ён прыбіраўся за чорта і скокамі ды жартамі так смяшыў усю кампанію, што ажно жываты калола ад смеху. А колькі бывала пацехі і смеху ў Хлявінскіх, калі ён прыносіў сваіх гліняных катоў ды пеўнікаў, якіх ляпіў для панны Зосі ды так прыгожа размалёўваў, што выглядалі як жывыя! І на гармоніку таксама граў і песні розныя спяваў сваім моцным, чыстым барытонам. Наогул, ці то сярод рабочых, ці то сярод слуг, дзе ні быў пан Міхалка, там было весела і вельмі прыемна. Пры яго з'яўленні вясёласцю і радасцю свяціліся блакітныя вочы адной з дачок Хлявінскага, якая з падлетка стала ўжо дарослым зграбным дзяўчом. [...]

Міхалка спрабаваў часам апраўдацца перад маці і Хлявінскім:

— Рабочаму чалавеку неабходна крыху развеяцца...

А зімою, калі не было работы, ён гаварыў пра нуду, якая так яго пячэ, што калі б не пайшоў у шынок, дык утапіўся б ці павесіўся.

У яго было шмат сяброў, якія не нудзіліся так, як ён. Калі Раманіха звяртала на гэта ўвагу, ён адказваў:

— Падумаеш! Вахлакі і недарэкі! І працаваць не ўмеюць, і пагуляць ім неахвота. Малако ў іх жылах цячэ, а ў мяне — кроў, як агонь.

Словы гэтыя выклікалі ў жанчыны думкі, з якімі яна не магла справіцца. Гатуючы суп, секучы мяса на катлеты, чысцячы гародніну, яна думала, разважала, камбінавала і ніяк не магла зразумець, як жа гэта можа быць...

У лістападзе ў Міхалкі не было ўжо ніякай работы, і некалькі вечароў ён у матчынай кухні ляпіў для панны Зофіі рыцара з гліны. Цяпер, калі яна была ўжо дарослая, не выпадала дарыць ёй катоў ды пеўняў. Рыцар — справа зусім іншая. Яна паставіць яго на камодзе ў гасціным пакоі. На бяду, зляпіць з гліны рыцара і ўвесь убор і зброю яго прыгожа памаляваць — усё гэта выходзіла за межы мастацкіх здольнасцей муляра. Ляпіў, ляпіў, спрабаваў маляваць і сам убачыў, што работа нічога не вартая. Па тым, як гнеўна хмурыліся яго бровы і грубым рабіўся голас, можна было адчуць, што нешта ў ім пачынае бунтавацца. Аднак праседжваў ён на кухні амаль усе дні і вечары, лез за печ, спрабуючы заснуць, вучыў Жужука новым штукам, заляцаўся да пакаёўкі Разаліі, нябрыдкай дзяўчыны, ганяўся за ёю па кухні, спяваў з маці свецкія і набожныя песні, словам — рабіў усё, каб толькі нечым заняцца. Ды ўсё часцей пахмурнеў, траціў апетыт, голас яго рабіўся грубейшы, а жэсты — больш парывістыя. І вось аднойчы вечарам ён шпурнуў на зямлю свайго рыцара, якога абпаліў ужо належным чынам у ганчарнай печы, але які быў больш падобны да барана з адным рогам, чым да рыцара з настаўленым кап'ём, выняў нешта з матчынай скрыні, схапіў шапку і выйшаў... Па вуліцы спачатку ён ішоў хутка, потым усё павальней і, чаго раней не бывала, апусціўшы галаву. У цёмным завулку, як заўсёды, свяціліся Шлёмавы вокны і дзверы. Ледзь бачны ў цемры высокі мужчына памкнуўся да гэтых двух агеньчыкаў, але, не дайшоўшы да іх некалькі крокаў, раптам павярнуў назад, туды, адкуль прыйшоў. Дайшоўшы да канца завулка, ён зноў вярнуўся, пастаяў перад двума бліскучымі агеньчыкамі некалькі хвілін і пайшоў далей. Так ён некалькі разоў то падыходзіў да воўчых вачэй, то адыходзіўся ад іх, спыняўся перад імі

і, мінуўшы, як быццам уцякаў ад іх, але нарэшце рашуча ўскочыў на драўляны прыступак, па-заліхвацку перасунуў набок шапку, моцна пхнуў дзверы і знік за імі. На драўляным прыступку застаўся толькі скручаны клубком сабака, які таксама прыйшоў сюды за гаспадаром. [...]

Была зіма, работы не было. І прыемнага нічога не было, бо адзіная шчырая, прыстойная сям'я, якая яго дагэтуль ахвотна прымала, замкнула перад ім дзверы. Ды не было ўжо ў ім і былой фанабэрыі і самаўпэўненасці. Хлопец пачаў заўважаць, што прыстойныя рабочыя пазбягаюць яго, [redacted] мулярскія майстры, мінаючы яго на вуліцы, пазіраюць кпліва, [redacted] пагардай. Гонару ў яго хапала, і гэтыя праявы чалавечай непавагі моцна ранілі Міхалку. Ён зусім зняверыўся ў сабе і апусціўся; цяпер ужо нават цвярозы хадзіў ён у паплямленым сурдуце і пакрыўленых або дзіравых ботах. Цвярозы, ён ніколі нікому, нават маці, ні слова не сказаў пра Хлявінскіх, і калі каго-небудзь з гэтай сям'і напаткаў часамі на вуліцы, хутка праходзіў міма, апусціўшы вочы. Толькі Зоську стараўся пабачыць здалёк, але так, каб яна яго не заўважыла. Убачыўшы, як яна бяжыць па вуліцы або, укленчыўшы, моліцца ў касцёле, ён не зводзіў з яе закаханых журботных вачэй. Аднак, падумаўшы, што яна можа яго заўважыць, ён уцякаў, хаваўся за браму якога-небудзь дома або ў цёмны куток касцёла. Затое п'яны — ні пра што больш, толькі пра яе... На вуліцах, у шынках, у матчынай кухні ён выкрыкваў яе імя, заяўляў пра сваю любоў да яе, абяцаў, што нікому яе не аддасць, сабе яе забярэ, пагражаў, што бацьку яе заб'е, яе заб'е, але другому не аддасць. Магло здацца, што разам з гарэлкай ён піў думку пра гэтую дзяўчыну і жаль, што страціў яе. І пакуль хмель не выветрываўся з галавы, юнак не мог пазбыцца ні гэтай думкі, ні жалю, выказваючы іх прызнаннем у каханні і пагрозамі.

Ды цяпер ужо галава яго вельмі рэдка не была затуманена гарэлкай. Калі скончыліся заробленыя за лета грошы, ён запатрабаваў ад маці, каб яна аддавала яму свае. Адзін раз, спраўдзіўшы сваю колішнюю пагрозу, ён разбіў сякерай яе скрыню, а другі раз, калі маці паспрабавала яго суняць, схапіў яе за валасы і пачаў біць кулаком па спіне. Калі ён

біў, яна не енчыла, не баранілася, а толькі, як заўсёды, павольна і ўмольна паўтарала: «Ціха, ціха, ціха!» Яна не хацела, каб нехта даведаўся пра тое, што ён біў яе. Назаўтра, а то і праз некалькі дзён яна, расчуленая і шчаслівая, глядзела на яго, распасцёртага каля яе ног. Працверазіўшыся, ён успамінаў пра свой учынак, кідаўся матцы ў ногі, цалаваў іх і ўсё паўтараў, што цяпер ужо, безумоўна, канец — і нічога з яго не будзе. Яна тады абдымала яго, калыхала, як малое дзіця, пацяшала, зноў паіла чаем і пераконвала, што Бог злітуецца... Ды ён ужо ў гэта не верыў. Не верыў, што зможа адолець д'ябла, які авалодаў ім. Цалуючы маці, просячы ў яе прабачэння, ён плакаў, як бабёр, а потым на некалькі дзён лез у запечак. Вылезшы адтуль, ён некаторы час валэндаўся па горадзе або сядзеў, згорбіўшыся, з панурым тварам, у кухні... А потым — зноў прападаў, зноў прыходзіў і дамагаўся ад маці грошай... грошай...

Прыйшла вясна. Прасядзеўшы некалькі дзён у запечку, Міхалка сказаў маці:

— Пайду шукаць работы.

— Ідзі, сынок, ідзі, і хай табе Бог дапаможа.

Не было ўжо за што справіць яму новай вопраткі. З жалем і сорамам яна пазірала ўслед, калі ён амаль у рызманах выходзіў на вуліцу. Сурдут быў увесь у плямах, шапка брудная, а боты ледзь трымаліся на нагах. Ён пайшоў, пагаварыў з двума майстрамі, але работы яму не далі. Адзін не хацеў яго ўзяць, гаворачы, што набраў ужо сабе патрэбную колькасць рабочых, з другім ён пасварыўся, бо яму здалося, што той зняважліва з ім абыходзіцца. Назаўтра ён зноў паваloкся ў горад, сказаўшы, што ідзе да трэцяга майстра. Ды маці добра ведала, што і трэці яго не возьме. Цэлы дзень яна ўсё думала, відаць, меркавала нешта, планавала. Абед згатавала марны, замест солі сыпала ў стравы цукар і наадварот. Дзе там ёй было цяпер думаць пра смак супоў ды падлівак! Яна нават здзіўлялася, як людзі могуць думаць пра такія рэчы. Сама яна за ўвесь дзень нічога ў рот не ўзяла і толькі ўсё пра нешта думала.

Прыцемкам Раманіха накінула на галаву хустку і пабегла ў горад. Яна накіравалася да сядзібы Хлявінскіх, але як толькі спынілася перад брамай, ногі яе так задрыжалі,

што мусіла прысесці на лаўку, прызначаную для начнога вартаўніка. Пасядзела хвілінку, потым устала і пайшла ў двор.

У глыбіні двара стаяў нізкі, але даволі вялікі драўляны дом, які Хлявінскія здавалі кватарантам, маючы з гэтага неблагі прыбытак. Самі яны жылі ў невялікім флігелі, насупраць якога стаялі дрывотні, хлеўчукі і прымыкаў яшчэ адзін флігель, таксама для кватарантаў. Некалькі сем'яў жыло на гэтым двары, адгароджаным ад вуліцы ладным плотам і прыгожа памаляванай брамай. Вуліца гэтая, трэба сказаць, не была адной [illegible] галоўных, але даволі людная, па ёй часта тарахцелі колы рамізнікаў. У гасціным пакоі Хлявінскіх, упрыгожаным канапай, каля адной сцяны стаялі гнутыя крэслы, каля другой — паліраваны камод, застаўлены таннымі цацкамі, сярод якіх тарчалі дзве стэарынавыя свечкі ў сярэбраных падсвечніках. Два невялічкія акны, застаўленыя вазонамі, былі занавешаны кісейнымі фіранкамі, сцены пакрыты шпалерамі ў чырвоныя крапінкі, [illegible] чырвоная падлога была вельмі чыстая. Перад канапай, вакол стала, на якім кіпеў самавар і гарэла лямпа, уся майстрава сям'я піла чай з чорным хлебам, маслам і вэнджанай каўбасой. Сам гаспадар, без сурдута, у камізэльцы на каляровай кашулі, сядзеў, разваліўшыся, на канапе, жонка яго стаяла каля самавара, адна са старэйшых дзяўчат паіла чаем малодшага брацікa, другая ўнурылася ў вязанне, паабапал бацькі сядзелі хлопцы ў гімназічнай форме, едучы папоўніцы. Зоська трымала на каленях малую сястрычку, а ў той сядзеў на каленях тлусты кот.

Дастатак і спакой быў у гэтым людным, хоць і сціплым, гасціным, а заадно і сталовым пакоі. Праз акно, яшчэ не закрытае аканіцамі, відаць быў двор, заліты бляскам поўнага месяца, зелянела ранняя веснавая трава.

Аднак, апроч тых, што дружнай кампаніяй акружалі стол з самаварам і лямпай, была цяпер у гэтым пакоі яшчэ адна жанчына, хутчэй — жаночы цень, пакорлівы, ціхі, што стаяў здалёк ад лямпы, каля печы. Даўней, калі яна ўваходзіла сюды такою парой, муляры́ха віталa яе, ветліва ківаючы галавой, сам пан майстар пачынаў жартаваць з ёю, трохі грубавата, але па-сяброўску, паненкі шчабяталі,

як сінічкі, а Зоська нават абнімала яе за шыю і цалавала ў абедзве шчакі. Запрашалі яе да стала, частавалі чаем, а яна, гордая і ўдзячная, пачынала гаварыць, гаварыць і смяяцца ад усёй шчаслівай душы. А цяпер яна ледзь асмелілася ступіць некалькі крокаў ад парога, і ніхто ўжо яе далей не запрашаў.

Раманіха спынілася каля печы і ціха сказала:

— Пахвалёны Езус.

Усе адказалі: «На векі!» і здалёк абыякава кіўнулі галовамі.

Хлявінскі, разваліўшыся на канапе, нахмурыўся і спытаў:

— А чаго вы хочаце?

Ціхім, пакорлівым і ўмольным голасам яна выказала сваю просьбу. І хоць майстар, зняважліва надзьмуўшы губы, адразу рэзка адмовіў, яна не пайшла. Стаяла як укопаная, водзячы вачыма па пакоі. Ім яна захаплялася сёння нават больш, чым раней. [...]

Ды ў гэты момант Зоська спусціла з каленяў сястрычку з катом, усхапілася з крэсла і, з тварам, залітым слязьмі, укленчыла перад бацькам. Яна цалавала яго рукі і калені і, заходзячыся ад плачу, гаварыла:

— Татачка! Злітуйцеся над ім! Ён можа выправіцца... Татачка, гэта ж жахліва, каб ён ужо так прападаў... Ён, напэўна, татачка, выправіцца... Дазвольце яму, татачка, прыйсці да нас... Вы толькі паспрабуйце...

Дзяўчына ажно заходзілася ад плачу. А была яна любіміцай усёй сям'і. Ніхто не мог абыякава глядзець на яе слёзы. Старэйшыя сёстры паўздымалі галовы і глядзелі на бацьку, гаспадыня штурханула аднаго з гімназістаў, бацькавага пестуна.

— Ану, Ігнаська, прасі бацьку!.. — а сама налівала шклянку чаю, каб падаць яе гэтай няшчаснай... гэтай маці...

— Ну, татка! — пачаў сваім звонкім галаском дванаццацігадовы вучань.— Ці ж вы сам Бог, каб ведаць, выправіцца нехта ці не выправіцца! А калі праз вас, татка, ды чалавек прападзе, што тады будзе, га? Дый Зоська...

Так яно. Галоўнае тут было тое, што Зоська плакала і што лайдак гэты быў спраўны да работы, як сам чорт. Ігнась праўду казаў. Нездарма ён быў найлепшым вучнем у сваім класе. Чалавек жа не Бог, каб ведаць, што з кім яшчэ будзе!

Пан майстар узняў галаву, дачку прыгарнуў да грудзей і ўжо ласкавейшым вокам пазіраў на жанчыну, што стаяла каля печы. Нешта яшчэ абдумваў, але па тым, як варушыліся яго вусы, можна было пазнаць, што і сам ён расчуліўся.

Раптам усе ажно падскочылі, дзе хто сядзеў, гаспадыня крыкнула: «Езус, Марыя!», а майстар: «Што гэта?» Зоська ўсхапілася з каленяў, твар яе збялеў, як палатно, а жанчына каля печы ўздрыгнула ўсім целам. Яна схапілася рукамі за галаву і выбегла з пакоя.

Гэты агульны спалох пачаўся з таго, што раптам зазвінела разбітая шыба і ў пакой уляцеў камень. І тут жа грубы, ахрыплы голас пачаў крычаць з двара:

— Зоську мне дайце! Чуеце вы там?..

З вуснаў чалавека ў падзёртай вопратцы, які ледзь-ледзь трымаўся на нагах, на майстра і яго сям'ю пасыпаўся град абразлівай карчомнай лаянкі.

— Калі я яе кахаю,— крычаў ён,— дык вы яе не смейце ад мяне хаваць! Я такі самы пан, як і другія. Дзяўчыну я вазьму ўсё роўна, а хто мне пярэчыць будзе — заб'ю! Вось як!

Пры апошніх словах другі камень паляцеў у акно, другая шыба зазвінела.

— Зоська! — крычаў п'яніца.— Хадзі сюды, да мяне! Я твой каханак, а ты мая каханка! Калі не прыйдзеш, усе вокны павыбіваю, дзверы выламаю, бацьку і маці тваіх пазабіваю, а цябе вазьму!..

І зноў паляцеў камень, і зноў зазвінела шыба.

У майстравым доме паднялася страшэнная паніка.

Зоську сёстры хавалі ў найдалейшым ад двара пакойчыку, засланялі яе сабою, служанкі і дзеці плакалі, майстар, схапіўшы жалезную качаргу, ірваўся да дзвярэй, а яго трымала, моцна сапучы, заплаканая жонка.

— Заб'е цябе каменем або ты яго заб'еш гэтай жалязякай! І турма будзе! — крычала яна, абдымаючы мужа.

Ігнаська выскачыў праз акно ў сад і пабег па паліцэйскіх.

А на двары збіраўся натоўп. З галоўнага дома, з флігеля, з суседніх двароў збегліся на крык і звон шкла людзі рознага полу, узросту і стану. Прахожыя спыняліся перад адчыненай брамай і пазіралі на тое, што там адбывалася, а ўсё было добра відно пры шчодрым месячным святле. Высокі чалавек, у падзёртай вопратцы, без шапкі, з раскалмачанай грывай чорных валасоў, ледзь трымаўся на нагах, крычаў, лаяўся, дамагаўся ўвесь час нейкай дзяўчыны, час ад часу даставаў з кішэні сурдута камень і кідаў у вокны. Два паліцэйскія з цесакамі пры боку спрабавалі схапіць яго, але ён супраціўляўся з неймавернай сілай. Адпіхаў іх локцямі, асляпляў ударамі ў твар, а нагою адпіхаў жанчыну, што поўзала каля яго. Гэта была Раманіха, што са страшэнным крыкам упала да ягоных ног. [...]

Не прайшло і гадзіны, поўны месяц яшчэ ўсё асвятляў вуліцы, калі звязанага арыштанта гналі ў мясцовую турму. Пры допыце ў паліцэйскім участку ён зразумеў, чаго натварыў, што з ім зрабілася, што яго чакае, і — зусім працверазіўся. Перад уваходам у турэмную браму ён азірнуўся і доўга жаласліва глядзеў на жанчыну, якая без хусткі, што з'ехала на плечы, скамянелая, моўчкі ішла праз увесь горад з грамадой паліцэйскіх, якія вялі яе сына. Ён паглядзеў на яе, паківаў галавой і ўжо рахманы, як ягня, увайшоў у турму, а яна з такім галашэннем кінулася на жалезную браму, якая з грукатам закрылася за ім, што нават паліцэйскім, якія засталіся на вуліцы, стала шкада жанчыну і доўга не хапала духу адцягнуць яе ад брамы.

А праз некалькі месяцаў на падставе адпаведных артыкулаў закону за абразу дзеяннем, нанесеную асобе высокага чыноўніка пры выкананні ім службовых абавязкаў, Міхалку выслалі ў арыштанцкія роты на пяць гадоў.

Але і праз пяць гадоў ён не вярнуўся ў Ангрод. Што з ім здарылася? Невядома. Відаць, дарэшты з'еў яго гарадскі воўк.

* * *

Не хутка пасля гэтага я ўбачыла Раманіху яшчэ раз. Яна сядзела ў прытворы касцёла, на цаглянай падлозе, у рызманах, чырвоныя пяты павылазілі з анучаў, якімі былі абкручаны яе ногі, побач з нагамі ляжаў тоўсты кій. Жанчына была зусім падобная да іншых старых жабрачак, што сядзелі там звычайна, і толькі тым адрознівалася ад іх, што вочы яе з-пад белых валасоў былі падобныя на дзве крывавыя раны. Выпаліў іх кухонны агонь, выгрызлі слёзы. У касцельным прытворы яе ледзяніў мароз, душыла вільгаць, таварышкі-жабрачкі штурхалі кулакамі пад бок, білі кіямі па пакалечаных нагах...

Божа ты мой! Як жа далёка застаўся за ёю той паштовы тракт, па якім яна ездзіла ўзімку, калі свяціла сонца, поле было белае, неба блакітнае, калі звінеў званочак, коні беглі па снезе — чах-чах, чах-чах,— а муж, як той дуб малады, стаяў у санях і пытаўся ў яе клапатліва:

«Еўка, а табе не холадна?..»

[1894]

ЛАТЫШСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Сувязі беларусаў і латышоў распачаліся задоўга да таго, як у гэтых народаў узніклі свае пісьмовыя літаратуры. Вядома, што яшчэ ў VIII—IX стст. палачане вялі гандаль уздоўж Заходняй Дзвіны (Даўгавы) на шляху «з варагаў у грэкі», мелі ў Падзвінні свае фарпосты — Герцыке і Кукенойс і інш. У прыватнасці, пра гэта сведчыць «Дамова Полацка з Рыгай» 1210 г.— адзін з першых дакументаў справавога пісьменства, у якім засведчаны і некаторыя асаблівасці ўласнабеларускага маўлення (цеканне, дзеканне, яканне). У XV—XVI стст. у Рызе існавала некалькі беларускіх праваслаўных цэркваў і гандлёвы Крэўскі (Крывіцкі) двор. З таго часу, несумненна, пачаліся і беларуска-латышскія ўзаемаўплывы на ўзроўні народнай міфалогіі і фальклору (напрыклад, паміж латышскімі дайнамі і беларускімі народнымі песнямі).

У канцы XVIII ст. уся тэрыторыя Латвіі (як, дарэчы, і Беларусі) увайшла ў склад Расійскай імперыі. Правінцыя Латгалія (усходняя частка сённяшняй Латвіі), дзе здаўна жылі і беларусы, была ўключана ў Полацкую (з 1776), Беларускую (з 1796), а пасля (з 1802) — Віцебскую губерні. Гэта садзейнічала яшчэ больш цеснаму яднанню двух суседніх народаў. Асабліва міжнацыянальныя кантакты ўзмацніліся ў сувязі з развіццём капіталістычных вытворчых адносін — уздымам прамысловасці, гандлю, пракладкай праз Беларусь Лібава-Роменскай чыгункі, якая звязала беларускія землі з буйнымі прыбалтыйскімі партовымі цэнтрамі (Вентспілс, Рыга, Ліепая). Згодна перапісу насельніцтва 1897 г., на тэрыторыі Латвіі пражывалі 79 523 беларусы. Яны не толькі працавалі на фабрыках і заводах, але і вучыліся тут, займаліся навукай і асветай. Так, у 1905—1907 гг. у гімназіі ў Мітаве (сённяшняя Елгава) вучыўся беларускі пісьменнік Сяргей Палуян. У гэтай гімназіі, дарэчы,

выкладчыкамі працавалі два яго родныя дзядзькі. З Латвіі паходзілі, тут вучыліся або працавалі ў канцы XIX— пачатку XX ст. і іншыя выдатныя беларускія пісьменнікі, культурныя дзеячы — Ігнат Буйніцкі, Карусь Каганец, Кастусь Езавітаў, Вацлаў Ластоўскі, Іван Луцкевіч, Янка Маўр. Некаторыя з іх, а таксама іншыя нацыянальна свядомыя беларускія дзеячы развівалі тут беларускую асвету і навуку і тады, калі ўзнікла Латвія як самастойная дзяржава (16.11.1918). Так, у 1920—1930 гг. у Латвіі працавалі культурна-асветныя таварыствы «Бацькаўшчына», «Беларуская хата», «Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства», выдаваліся асобныя перыядычныя выданні, навучальная і краязнаўчая літаратура. Дзеці беларусаў маглі вучыцца больш чым у 20 школах, а таксама ў Дзвінскай (Даўгаўпілскай) і Люцынскай беларускіх дзяржаўных гімназіях. Дарэчы, беларусам у многім дапамагаў класік латышскай літаратуры Яніс Райніс, адзін час міністр асветы Латвіі, сваім нараджэннем і маленствам звязаны з Латгаліяй. Асабліва блізкія ўзаемаадносіны ўсталяваліся ў яго з беларусамі пасля паездкі ў 1926 г. у Мінск, знаёмства з беларускай рэчаіснасцю, з Янкам Купалам, Якубам Коласам і іншымі майстрамі мастацкай літаратуры, наведання БДУ і інш.

Да Вялікай Айчыннай вайны пэўная колькасць латышоў пражывала на тэрыторыі БССР (паводле перапісу 1926 г.— 14 тысяч). У месцах іх кампактнага пражывання (на Віцебшчыне) былі арганізаваны 5 латышскіх нацыянальных сельсаветаў, 12 латышскіх школ (у 1930/31 навучальным годзе). Працу па вывучэнні латышскай культуры, латышска-беларускіх культурных сувязей праводзілі латышская камісія Інбелкульта (з 1927), латышскі сектар Беларускай акадэміі навук (з 1929), выдаваліся на латышскай мове даследаванні па гісторыі латышскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. З 1933 г. вывучэнне латышскай гісторыі і культуры сканцэнтраваў Інстытут літоўскай і латышскай культур.

У пасляваенны перыяд, у перыяд уваходжання Латвіі і Беларусі ў адзіную саюзную дзяржаву СССР, беларуска-ла-

тышскія ўзаемасувязі, у тым ліку літаратурныя, асабліва ўзмацніліся, набылі паступальны і планамерны характар. Былі праведзены дэкады латышскай літаратуры ў Беларусі (1959) і беларускай літаратуры — у Латвіі (1960). Па колькасці перакладаў з беларускай літаратуры Латвія выйшла на адно з першых месцаў сярод саюзных рэспублік. У Рызе ўбачылі свет анталогіі беларускай паэзіі і прозы, «Пінская шляхта» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Івана Мележа, Янкі Брыля, Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна і інш. У латышскіх тэатрах былі пастаўлены «Паўлінка» Янкі Купалы, «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы, «Трыбунал» Андрэя Макаёнка, «Вечар» і «Радавыя» Аляксея Дударава і іншыя п'есы беларускіх драматургаў. У сваю чаргу многія творы латышскіх пісьменнікаў (Яніса Райніса, Віліса Лаціса, Юлія Ванага, Яніса Судрабкална, Андрэйса Упіта, Візмы Бэлшэвіцэ і інш.), анталогіі латышскай паэзіі, зборнікі латышскіх казак, дайнаў убачылі свет на беларускай мове. Неаднойчы перакладаліся творы выдатных латышскіх пісьменнікаў другой паловы XX ст. (О. Вацыеціса, І. Зіеданіса, М. Чаклайса, Я. Петэрса, Е. Стулпана, В. Ліеўзімніека і інш.).

Добрыя ўмовы для развіцця нацыянальных культур і беларуска-латышскіх літаратурных узаемасувязей склаліся і ў незалежных дзяржаў-суседак — Латвіі і Беларусі. Паводле перапісу насельніцтва 1989 г., у Латвіі жыве 120 тысяч беларусаў (у тым ліку ў Рызе — каля 70 тысяч, у Даўгаўпілсе — звыш 10 тысяч), у Беларусі — каля 3 тысяч латышоў. З 1993 г. дзейнічае Саюз латышоў Віцебскай вобласці «Даўгава», які арганізоўвае для жадаючых вывучэнне латышскай мовы, гісторыі і культуры. У Беларусі праводзяцца штогоднія Дні Латвіі. Пры консульстве Латвіі ў Віцебску працуе латышская нядзельная школа. Для развіцця сваіх нацыянальна-культурных запатрабаванняў магчымасці маюць і беларусы ў сённяшняй Латвіі. Да іх паслуг — сярэдняя беларуская школа ў Рызе і

нядзельная беларуская школа ў Даўгаўпілсе. У 1988 г. было створана Латвійскае таварыства беларускай культуры «Сьвітанак» (Рыга), да якога ў 1993 г. далучылася беларускае культурна-асветнае аб'яднанне «Уздым» (Даўгаўпілс). Добры розгалас набыло Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі «Маю гонар» (з 1993), якое ўзначальвае вядомы беларускі мастак з Рыгі Вячка Целеш. Шэраг беларусаў праявілі сябе ў літаратурнай творчасці. Станіслаў Валодзька, які жыве ў Даўгаўпілсе і піша вершы на беларускай мове, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Даследуюцца беларуска-латышскія культурныя сувязі. Сярод даследчыкаў — аўтар шматлікіх артыкулаў беларус С. Панізьнік, латышскія вучоныя М. Абала, Дз. Віксна (кніга «Гэта сяброўства ведае вечнасць», 1977), І. Апіне (манаграфія «Беларусы ў Латвіі», 1995).

ЯНІС РАЙНІС
(1865—1929)

Яніс Райніс (сапр. Яніс Пліекшанс) нарадзіўся ў Латгаліі, на памежнай з Беларуссю латышскай тэрыторыі, дзе здаўна жыло (дый цяпер жыве) нямала беларусаў. Таму беларуская мова, беларускі фальклор з самага маленства былі не чужымі для Райніса, а сам ён як мог падтрымліваў культурныя захады латышскіх беларусаў, цікавіўся беларускай культурай і літаратурай, з радасцю наведваў Беларусь.

Няпростым і нялёгкім быў жыццёвы і творчы шлях народнага паэта Латвіі. Яшчэ ў сваю бытнасць студэнтам юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта (1883—1888) ён праймаецца ідэямі сацыял-дэмакратыі, далучаецца да рэвалюцыйнай дзейнасці. Гэтыя ідэі ён прапагандуе і пасля заканчэння універсітэта — у час працы ў Віленскім акруговым судзе, а затым на пасадзе рэдактара дэмакратычнага латышскага «Штодзённага лістка» («Dienas lapa»; 1891—1895). У 1897 г. быў арыштаваны і прыгавораны да ссылкі, якую адбываў у Вяцкай губерні. У турме і ссылцы па магчымасці займаўся літаратурнай працай: пісаў вершы, п'есы, перакладаў (у прыватнасці, узнавіў па-латышску «Фаўста» Ё. В. Гётэ). Творы дасылаў на волю.

У 1903 г. Райніс вяртаецца са зняволення. І тады ж у Рызе выходзіць яго першы зборнік вершаў «Далёкія водгукі ў сінім вечары», у якім, апрача інтымных пачуццяў, філасофскіх разваг, паказаны неабходнасць і абавязковасць грамадскіх перамен, прага барацьбы за чалавечае шчасце. У прадчуванні вялікіх грамадскіх падзей пісьменнік стварае драму «Агонь і ноч» (1905), у якой дзеянне пераносіцца ў далёкае XIII ст., у перыяд змагання латышоў з нямецкімі рыцарамі, але якая, аднак, сімвалічна ўвасабляла думы і настроі латышскага народа менавіта пачатку XX ст. Тады ж, у 1905 г., выходзіць другі зборнік вершаў — «Пасевы буры», дзе ў трывожных карцінах вясны чытачы выразна ўбачылі сімволіку блізкіх рэвалюцыйных перамен.

Неўзабаве сапраўды грымнула рэвалюцыйная бура. Каб пазбегнуць новага арышту, Райніс разам са сваёй жонкай, паэтэсай Аспазіяй, у канцы 1905 г. пакідае Латвію і нелегальна выязджае

ў Швейцарыю. Прыгадаем: гэтаксама, па той жа прычыне і ў тым жа годзе, эмігрыруе ў Аўстра-Венгрыю (Львоў, Кракаў) наша паэтэса-рэвалюцыянерка Цётка. У Швейцарыі Райнісы затрымаліся на цэлых 15 гадоў. Тут пісьменнік напісаў свае асноўныя творы: філасофскую паэму «Ave, sol!» (1910), п'есы «Ветрык, вей!» (1913), «Іосіф і яго браты» (1919), кнігі вершаў «Ціхая кніга» (1909), «Тыя, што не забываюць» (1911), «Канец і пачатак» (1912) і інш. Жывучы на чужыне ў адносным спакоі, ён усяляк падтрымліваў у сваіх землякоў веру ў лепшае будучае, у перамогу справядлівасці, у нацыянальнае адраджэнне, ва ўваскрашэнне Латвіі як самастойнай дзяржавы (спачатку — вольнай Латвіі ў складзе вольнай Расіі). Гэта было асабліва неабходна ў час разгулу чарнасоценнай рэакцыі, якая наступіла пасля жорсткага падаўлення царызмам першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905—1907 гг.

У 1920 г. Райніс вярнуўся ў незалежную Латвію, якая трыумфальна сустрэла свайго песняра-прарока. Натхнёны новай рэчаіснасцю, ён актыўна ўключаецца ў працэс культуратворчасці і дзяржаватворчасці: піша шэраг п'ес для латышскага драматычнага тэатра (у тым ліку — для дзіцячага), выдае паэтычныя зборнікі, працуе дырэктарам Нацыянальнага тэатра ў Рызе, некаторы час займае пасаду міністра асветы. Не забывае ён і братоў-беларусаў: дапамагае ствараць для іх нацыянальныя беларускія школы, адкрываць перыядычныя выданні, абараняе іх інтарэсы ў Латышскім сейме. У 1926 г. Райніс прыязджае ў Мінск на акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі, сустракаецца з Янкам Купалам, Якубам Коласам і іншымі беларускімі пісьменнікамі, наведвае БДУ, прымае ўдзел у адкрыцці БДТ-2 у Віцебску (цяпер — Дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа). Вярнуўшыся дадому, захоплена расказвае пра дасягненні маладой беларускай навукі і культуры, пра нацыянальнае адраджэнне беларусаў дзякуючы тагачаснай афіцыйнай палітыцы беларусізацыі.

Праз тры гады пасля паездкі ў Беларусь Яніса Райніса не стала.

Творы вялікага сына латышскага народа не раз перакладаліся на беларускую мову, друкаваліся ў перыёдыцы, выходзілі асобнымі выданнямі, яго п'есы (у прыватнасці «Ветрык, вей!» у перакладзе Р. Барадуліна) ставіліся на сцэнах беларускіх тэатраў.

Для дадзенай публікацыі выкарыстаны наступныя выданні:

Райніс Ян. Выбранае. Мінск: Маст. літ., 1993 (пераклалі: «Зламаныя сосны», «Ave, sol!» — Рыгор Барадулін, «Радзіме» — Мікола Арочка, «Табе, асноўны клас!», «...Цягнік усё далей» — Хведар Жычка).

Райніс Яніс. Агонь і ноч: Даўняя песня ў новым гучанні. Мінск: Юнацтва, 1988. (Пераклад Васіля Сёмухі).

Зламаныя сосны

Зламаў выносныя сосны ўраган.
На дзюнах стаялі — мора ў нагах.
Хацелі, гордыя, у далі зірнуць,
Не ўмелі хавацца і спіны гнуць:

«Ты, лютая сіла, зламала нас,
Ды мы не здаёмся — наш прыйдзе час.
Наш стогн апошні — па далях уздых.
Не сок — нянавісць у голлях тугіх...»

З разгневанай прорвы ўпарта ўсплылі
Не сосны зламаныя — караблі.
Супроць урагану іх смелы шлях,
Нянавісць, помста — іх ветразь і сцяг:

«Ты, лютая сіла, валы ўздымай —
Мы ўсё ж прыплывём у шчаслівы край!
Ламай нас і трушчы — мы не твае,
Мы далі дасягнем, дзе сонца ўстае!»

1901

Радзіме

«За полем, за лесам, за тванню балот,
За сотнямі міль, далёка
Ляжыць мой край пасля дзённых турбот,
Прыкрыты заслонай аблокаў.

Ахутвае покрыва тое штогод
Яго ад вятроў, навальніц, нягод...»

Так песню сваю я калісьці пачаў.
Забыў яе словы даўно я.
Мой голас самотна ў выгнанні гучаў...
Ды ў памяці чэзне былое.
Калі ж я з выгнання вярнуўся дамоў,
Не стаў успамінаў трывожыць ізноў.

Калі я з выгнання вярнуўся дамоў,
Радзіма інакшаю стала.
З яе нестрыманым патокам вятроў
Заслону аблокаў сарвала.
Над ёй не аблокі, а хмары плылі,
Віхуры і буры гулі і раўлі.

Былыя выгнаннікі, мы ажылі.
Нам крыллі ў палёт развязалі.
Ад краю да краю па роднай зямлі
Каціліся радасці хвалі.
Жыццё маладое, што ледзь расцвіло,
Расплатай за нашы пакуты было.

І ледзь маладое жыццё расцвіло,
Як з ім развітацца прыйшлося.
Над намі заслалася неба імглой
І зноў груганне вілося.
Тады надышоў развітання час.
Зачынены дзверы радзімы для нас.

Цябе пакідаем без крыўд, без віны.
Ты ўсюды для нас дарагая —
Не маці сваю вінавацяць сыны,
А тых, хто яе зневажае.
Наш доўг — табе радасць жыцця вярнуць,
З той іскры, што тлее, пажар раздзімуць.

Хай спее пад бурай пасеў твой ізноў,
Няхай праплыве над табою
Вітанне далёкіх тваіх сыноў,
Як воблачка дажджавое.
З табой нас нягоды не раз'яднаюць:
Мы — з тых, што ніколі не забываюць.

Мы ў сэрцы хаваем былога сляды
І тое, што заўтра настане.
Аддадзены тваім ідэалам заўжды,
Імкненням тваім і жаданням.
Яны ў нашых сэрцах не паміраюць:
Мы — з тых, што ніколі не забываюць.

1902, 1907

Табе, асноўны клас!

Табе, асноўны клас,—
Хто будзе адчуваць, тварыць, склікаць на бой,
Пакуль не знікне з сэрцаў сум і боль;

Табе, асноўны клас,—
Хто, узняўшыся вышэй сябе і ўсіх, ідзе,
Каб знішчыць класы і разлад сярод людзей;

Табе, асноўны клас,
Байцом служыць — вышэй ці можа гонар быць?
Для чалавецтва сонца ты ідзеш здабыць!

1912

* * *

Цягнік усё далей
Імчыцца стралою.
Людзі — як хвалі
Даўгавы вясновай:

Кожная хваля мяне падганяе,
Кожная хвіля мне набліжае
Радзіму! Радзіму!

Пара мне адчуць яе блізкасць,
Знакі, прыкметы заўважыць,
У тысячалікім натоўпе
Убачыць яе родны твар,
У гомане тысячагалосым
Пачуць яе родны голас!

Ёсць ужо, ёсць прыкметы!
Яны паказалі радзіму:
Першая — гэта магіла,
Магіла матулі маёй...

Прыбегла яна мне насустрач,
З даляў далёкіх прыбегла,
Каб сына сустрэць самай першай,
Калі ён вяртаецца з ссылкі.

Яна ж і тады ішла за мной следам
Далей за ўсіх і, стаміўшыся, ўпала
На дол незнаёмы, чакаць мяне легла
У магілу.

О вы, матулі латышскія, бацькі і дзеці,
Колькі вас выгналі з дому,
Колькі вас тут засталося навекі!
Чакаеце вы ў магілах,

Калі на сваю дарагую радзіму
Вярнуцца — у думках хацят б! — было можна,
Дапамагчы землякам аднавіць
Зямлю сваю родную — новую Латвію!
Латвія там, дзе латыш пахаваны.
А дзе воля?

Будзь блаславенная, маці мая!
Няхай будзе пухам табе тут зямелька,
Няхай табе сняцца салодкія сны,
Табе і усім, хто ляжыць на чужыне!

«Зямліца мне лёгкая, сынку,
Ды цяжка і сумна адной тут ляжаць.
Бацька спачыў дзесь далёка,
Дачушка — яшчэ далей».

Тата, мой тата, цябе пахавалі
У Латгаліі,
Сястрычка ляжыць у магіле ў Курземе,
Якую зноў хоча таптаць
Нага чужаземца... Хто вас,
Мае дарагія, звядзе ў адно месца?

Агледзьце прасторы далёкія Латвії!
Дзесьці мяне і маіх дружбакоў
Закіне ў зямлю лёс суровы —
Там пракладзём мы прасеку шырокую
З Латвії ў свет, у чалавечнасць.

1906, 1919

Ave sol!

Паэма

УСТУП

Ранні ўсход, пазні́ заход —
Свята кветак пасярод.

I

Як песню векавую назаву я?
Як марным словам адшукаю след?
Як сэнсам ухаплю яе жывую,
Што гукамі запоўніла Сусвет?

Што з ветрам, паўтарыўшы дзень, світае,
Каб чуць у полі голас перуноў,
Што прабівае люд, як рунь святая,
Што ўваскрасае, згінуўшы, з выснов,
Каб сонцы нарадзіліся наноў.

II

А гэта — крокі векавечнай сілы,
Што хоча даць сляпой пустэльні зрок,
Сагрэць душой Сусвету гмах застылы,
Яднаючы вірлівых змен клубок.

Заві ўсё гэта барацьбой, дамкненнем,
Жыццём, святлом, агнём, што даў зарок,—
Вясной, паўстаннем радасці, квітненнем;
Не маю слоў, на сонца маладое
Гляджу і — вочы зашчу даланёю.

III

Табе ўсхвалюе сэрца гэта сіла,
Без меры боль — адбіўся зорна ён,—
Без меры радасць; чуеш: вогнекрыла
Уваскрасае ўсё, збудзіўшы звон,

Душа прымае новае аблічча! —
Сінее небасхіл, знікае сон,
І барацьба душу змагацца кліча;

І ў сконе дух святлее ў глыбіні;
Бясконца шчасце дораць прамяні!

AGRA GAITA

Ранні ўсход

Не жыць, каб жыць,
А дужым быць, і ёсць жыццё.

Рымская мудрасць

I

Цесна хатцы, душна хатцы,
Як і духу, што жыве ў ёй:
Сцены вычарніў куродым,
Цяжка цісне ношка столі,
Чад і дым лянотна ўюцца,
І глядзіць патухлавока
Ўдаль, міргаючы, ваконца.

II

Вольныя вятры ў пrасторах
Задзіраюць з стрэх салому,
Гнуць галіны дрэваў голых,
Гоняць леташняе лісце,
Круцяць снег у завірухі,
Рушаць скалы, юшаць мора,
Нізкае мятуць паднеб'е,
Хмары кучамі зграбаюць,
Тлеючы ў выбоях неба.

III

Вольныя вятры ў прасторах.
Неба, раптам злагаднеўшы,
Падымаецца бяскрайна:
Полымным ударам сонца
Вочы выцяла балюча,
На імгненне сэрца ў страху
Ад зіхцення замірае,
Галаву схіляе одум.

IV

У душы тады імгненна
Радасць полымем заб'ецца,
Промні цеплынёй аблашчаць,
Розум вырвецца з дурману,—
Уздыхнуць шырока грудзі,
Схочуць новыя пачуцці
Радасць браць тысячарука,
Сотню воблікаў адразу
У забыўнасці схапіўшы.

Зноў асепленыя вочы
Адчыняюцца паволі,
Ў сарамяжлівай спакусе
Светлыя ўспрымаюць чары
І захопленым паглядам
За зіхоткім сонцам сочаць.

V

Сонца ўжо высока ходзіць,
Сеючы святло далёка,
Разганяе змрок пануры.
Ззяе ўсё наўкола ў шчасці:

Сумны лес свой лоб не хмурыць,
У галін каленкі гнуцца,
Ворыва святлее ўсмешкай,
Распраўляе крылы шчэбет,
З нор жывое выпаўзае,
Далячыні поўніць радасць,
Усплывае ўгору пара.
Ўсё змянілася раптоўна!
Дол інакшы бачаць вочы,
Бо даверыліся сонцу.

VI

Сонца ўжо высока ходзіць
Поступам сваім магутным,
Апавітае паветрам:

Справа вецер крыгаломны,
Вокал ветру бураломы,
А здалёк ступаюць мроі.
Ззяюць сонечныя дзіды
У руках вятроў і крышаць
Лёд, каб ручаям пабегчы,
Разбудзіць усіх імкнуцца,
Вызваліць усіх з палону.
На палях, што дрэмлюць ціха,
Страхам схіленыя доле,
Шум цяпер спакой аглушыць.
Ды здалёк ступаюць мары
І ядвабнымі нітамі
Ткуць пяшчотны шлях на сонца.

VII

Сонца йдзе хадой вясёлай,
Хутка, спрытна лад наводзіць:
Доўжыць дні, кароціць ночы,
Што разлегліся праз меру.
Сточаны, шчарбаты ветах
З небасхілу прэч скідае:

«Вартаваць ты мусіў ночы,
Што ж ім дні забраць дазволіў!
І цяпер у стыль і цемру
Ўсю зямлю схавалі ночы».

І шпурляе на кавадла
Ветах і сячэ сякерай
Срэбнай — аж іскрацца зоркі.
«Стань маладзічком зіхоткім,

Праганяй паглядам цемру,
Ні на ноч не дай спакою!»

VIII

Сонца ходзіць бесклапотна
Сцежкай барацьбы, смяецца,
Выганяе цемру з клецяў,
За чубы лясы цягае,
Сцюжу валачэ з канавы,—
Сцюжа за кусты ўцякае;
Песціць ручаі з дажджамі,
Градам лупіць, крышыць бурай,—

Радасна глядзіць араты:
«Ат, хай бура дрэвы валіць,
Хай раллю павыб'е градам,
Хай палі разводдзе змые,
Хай і смерць, абы на момант
Абуджэнне ўчуць, якое
Трапяткое сонца жывіць!»

IX

Сонца йдзе хадой шырокай,
Над зямлёй не ціхнуць крокі:
Скідвае цянёты цемры,
Золата слядоў губляе
Над палямі, над лугамі,
Над пагоркамі, барамі,
Над шырокім светам мораў,
Над высоканедасяжным
А бясконцым небасхілам —
На блакіце і на руні
Літарамі залатымі
Славіць ясны поступ волі;
Да снягоў сягае вечных,
Што з прадоння ночы валяць
Валам напярэймы сонцу.

X

Лётае ў зіхценні сонца,
Крыламі б'ючы магутна,
Залаты арол блакіту:
Ўсход адным крылом казыча,
А другім кранае захад,
Перад ім нябёсы ніцма,
Ён здзімае хмар пушынкі,
Анішто яго не спыніць.

Сонца ўвесь абсяг трымае,
То над полюсам зіхкоча,
То ў тваіх вачах смяецца!

Крылы крыліць, ветрыць пер'е,
Кіпці з воску ў крыгі нýрыць
І нясе зямлю як здобыч.

XI

Сонца зыркімі вачыма
Пераможна пазірае,
За зямным абсягам сочыць,
Дзе хавацца мае цемра:
У глыбокіх норах, пушчах,
Пад каменнямі, пад хлудам,
У расколах, балацінах —

Ноч, і золь, і сцюжа прагна
Схоў шукаюць, адпаўзаюць,
Хоць дрыжаць, яшчэ трымаюць
Слуг сваіх прыгнётам моцным:
Чарвякоў, змяюкаў чорных
Тых, што поўзаюць і джаляць,
На святло сіпяць у злосці.

XII

Сонца палкімі вачыма
Працінае ўсё, шукае,
Дзе яшчэ ў начы прытулак?
Бачыць, што ў ілбах сцвярдзелых
Думкі цёмныя схаваны;
З-пад цвярдой шкарлупкі сэрца
Бачыць злыя дзеі цемры.
Капы тоўстыя здзірае,
З клёку тканыя і з сэрца;
У сваёй агідзе голай
Вывіваецца злачынства
На вачах людзей відушчых.

XIII

Сонца зыркімі вачыма
Пераможна пазірае
Праз куродым, пыл шукае,
Дзе яшчэ ў начы прыстанак,
У якія норы лезе.
І праз чад і тлумнасць вуліц
Прабіваецца да лёхаў,
Дзе зняволена навечна
Самае ў бядзе слабое
Ад усіх стварэнняў свету:
Чалавек, якога іншы
Чалавек у змрок заглыбіў.

XIV

Сонца ветлымі вачыма
Праз куродым, пыл, праз сцены
Прабіваецца ў падвалы,
Дзе ў кутках гібее немач.

Хвалі цёплыя прамення
Крадуцца ў людскія сэрцы,
Высахлыя ад знявер'я,

Каб збудзіла сэрцы сонца
У жыцці вялікім біцца.
І праменне гоіць раны,
Зноў надзею пасяляе,
Да сябе самога шану
Адтаюць на сонцы сэрцы,
Покуль іх не ўзрушыць радасць,
Што ідуць блакітам недзе
Дні шчаслівыя маленства,
Згубленыя ў цемры ночы.

СВЯТА КВЕТАК

Калі ў тваім сэрцы тысяча брамаў,
як у Фівах, ва ўсе ўпусці радасць!

Старадаўняя грэчаская прыказка

I

Маладая ўлада сонца
Зіхаціць над галавою.
Цуг здаўжэлых дзён спякотных
Халадком начэй кароціць,
Робіць перадых маленькі
Ў клопаце святла вялікім:
Гоніць цемру па закуццю,
Разбурае царства гнёту —
Новаму жыццю слугуе.
Прахам рушыцца старое,
Сунецца далей цямрэча,
У нутро зямлі ўпаўзае,
Цешыць злосць у немым гневе:

«Хай зіхціць, ды не асветліць
Сонца нетры, не абудзіць
Новае жыццё ў магіле!»

II

Маладая ўлада сонца
Зіхаціць над галавою,
Долу ўсмешкі сыпле зырка:
Промнямі барозніць ролі.
Грывы з злота ў белых коней,
Лемяшы як дыяменты —
У раллю святла зярняты
Сыпле з вогненнай сявенькі,
Дзірваны з кладоў здзірае,
З сажалак ваду ўздымае,
Шле дажджы і град шпурляе,
Кіпяціць вятры ў паветры,
Ўсе работы робіць лучна.

III

Веснавая ўлада сонца
Долы ўсмешкай асвятляе;
Разлівае ў наваколле
Зыркіх прамянёў разлівы,
Лашчыць і трымціць пяшчотна;
Пранікае прамянямі
У душу цвярдых галінаў;
Пад карой калянай дрэваў
Сок жывы імкліва будзіць,
Захвалюецца паволі
Сок і падымацца стане;
І па жылах разліва́цца
Да пупышак пальцаў голля,
З краскавых сцяблоў пяшчотных
Наквець вабячы на волю.

IV

Веснавая ўлада сонца
Кліча ўстаць траву з магілы;
Апярэджваючы полыск,
Водар свой палон мацуе,

Асвяжаючы паветра
Кветкавым пылком, уздыхам.

У вяночках разназыркіх,
У вачах з усмешкай вабнай,
Подых чуючы салодкі,
Кветкі вусны расчыняюць,—
Млеюць і паглядам немым
Прызнаюць мілосць, якую
У грудзях даўно хавалі,
Што сябе таіла ў марах,
Не смялела ўсё адкрыцца;
Пестунам мілосці ззяюць
Сонца ветлівага вочы.

V

Сонца цэлы дзень іскрыцца
Золата-зялёным ззяннем;
І зямлі ў мярэжах промняў
Можна млява пацягнуцца;
Па нябесным моры сонца
Скача, колеры мяняе —
Зелянее і сінее,
Чырванее і бялее,
З галавы страсае іскры,
Косы пышна распускае,
Валасы на долы льюцца,
Дзе хвалююцца шаўкова,
Плоць зямлі цяпло ўбірае;
Ў подрыгах зямлі салодка.
І з усмешкай расчыняе
Тысячы вачэй-азёраў,
Будзіцца для дзён шчаслівых.

VI

Сонца цэлы дзень іскрыцца,
Дыхае зямля да сонца;

І мілоснае дыханне
Тхне ў паўдзён ад поля спёкай,
Вечарам тхне пахам з лесу.
Цемра з нор глыбокіх сыча:

«Паскачы ды пакрасуйся —
Скокі мецьмеш на магіле,
У труне тваё вяселле,
Ложак шлюбны твой у тлене».

І ў адказ смяюцца кветкі:
«Хай табе, што нам жадаеш,—
Мы народжаны мілосцю,
Дзеці сонцавага шлюбу,
Ўсю зямлю забраць прыйшлі мы».

VII

Сонца ззяе зіхатліва,
Так што цемра зелянее:

«Паскачы на моры, доле,
Пад зямлёй заззяць не зможаш,
А на глыбіні з паўсажня
Поўнач вечны лёд трымае:
Ў моры — на паўсотні сажняў
Вечнай цемрачы пачатак,
На пятнаццаць тысяч сажняў
Цемра, там і ходзяць рыбы,
Свецяцца без сонца самі,
Смерць для іх узняцца ўгору:
Сплюшчыць ім нутро наверсе».

У адказ смяюцца хвалі,
Рыбы водбліскамі скачуць:

«Ноч і смерць табе ў прадонні,
Ў вышыні жыццё ад сонца
Зыркай радасцю іскрыцца».

VIII

У трымценні зіхатлівым
Сонца цэлы дзень іскрыцца,
Дыхае зямля да сонца,
Радасцю звініць наўколле
Ў песнях славы й перамогі:
Гэта ўсёмагутнасць сонца
Цемру з немаччу скрышыла —
Далягляд трымціць смугою,
Мору добра хвалявацца,
І дрыжэць у весялосці,
І шпурляць на бераг пену.
Сонца ў золата ўбірае
Ўсё і ўзгоркі крые срэбрам,
Пасярод брыльянціць зоркі,
Полымя льючы ў даліны,
Каб не смяглі дзеці сонца,
Свята волі ўшанаваўшы.

IX

Сонца зіхаціць без краю,
Ты стаіш пасярод сонца
І глядзіш у захапленні:

Залатыя промні зырка
Льюцца на чало, на шчокі,
Валасы, на вочы, шыю,
Толькі ты зрываеш шалік,
Давяраеш грудзі сонцу.
Сонца льецца проста ў сэрца,
Дзе прыгнётам ціснe цемра,
Аж гарыць нутро ад стогнаў;
Покуль даўнія пакуты,
Як задушаныя змеі,
З рук тваіх спадуць здранцвела;
Покуль дух твой адагрэты,
Як паўдзённае паветра,
Затрымціць, падасца ў высі.

X

Сонцам радасна спавіты
І святлом сагрэты шчырым,
Ты адчуеш — стаў празрысты.

І тады цікаўна ў грудзі
У свае ж глядзіш, нібыта
Праз бурштыннае аплечча,
У тайнік душы глыбокі.

Дзівішся: душа яснее,
Лёгка ёй, не точаць болей
Сэрца злосць, нянавісць розум,
Іх тачыла паўсядзённасць.

Леткая твая істота
Ўзвышана ляціць да сонца,
А яна ў кашулі белай
Зыркай хмаркаю бялее
З сіняй прошваю нябеснай.

XI

Сонца зіхаціць без краю,
Ззяюць сонцам сэрцы, ў сэрцах
Даўняя мілосць рунее:
Сэрцы, як паходні духу,
Свецяцца самаахвярна
І вядуць братоў да сонца,
Самі як люстэрка сонца.
Цемра юшыцца злацешна:
«Злое ў сэрцы ад пачатку —
Корань траў у чорнай глебе,
Ў сэрца — ў цёмным самалюбстве.
Сонца не расчуліць сэрца,
Лёд нянавісці мацнейшы».

Сонечна смяецца сэрца:
«Сэрца, што не сцяла цемра,—

У слязах, крыві, ў сумненнях,—
Ў сонцы ўсю зямлю абдыме!»

XII

Сонца ўсіх нароўні грэе,
Воля ўсім прыносіць яснасць —
Сэрцы ясныя лунаюць,
Думкі светлыя ўзлятаюць
Над прастораю і часам
Аж туды, дзе ўсіх павінны
Аб'яднаць дабро і роўнасць.
Цемра юшыцца ў адчаі:
«Хай жа кожны стане добрым,
Воўк ягняткам, пан халопам,
Бо інакш старое будзе».

Заглушае смех бурчэнне:
«Сонца ўсё іначыць, вучыць,
Хай у кожным зло жывое —
Ды агульнай волі ўлада
Ўсіх нароўні мкне да сонца».

XIII

Сонца зіхаціць без краю,
Ўсе ідуць насустрач сонцу
З цёмнага зямнога ўлоння,
Як трава растуць, як кветкі,
Пакрываючы зямлю ўсю,—
Выпаўзаюць з лёхаў цемры,
А з курадыму, а з пылу,
А спяшаюць з чаду, з дыму,
А з мясцін, палітых потам...
. . . .
А ідуць з лядовых пустак
Людзі працы . . . .
. . . .
. . . .

. . . .
. . . .

А ў вачах агонь якоча:
Сонца волі маладое.

XIV

Сонца волі маладое
У зямлю ўлівае сілу:
Ўбогія ў героях ходзяць;
І святкуе люд працоўны
Свята кветак — свята волі.
. . . .
Сонечнаму шчасцю вольна
Ў аб'яднаным чалавецтве
. . . .
. . . .

Чырванню сцягі світаюць,
Як кастры, гарыць праменне
. . . .

Быццам з-за пялёсткаў маку
Божыя сыны прыходзяць,
Дзеці працы сонцатвара.

ПАЗНЫ ЗАХОД

Трымайце мужнасць і шануйце сябе
для спрыяльных часін!

Вергілій

I

Сонца, поўнае зіхцення,
Смехам залатым смяецца
Пасярод паўдня і лета:

Неба ўсё — адна бліскота,
Ўвесь абсяг наўкольны — водбліск;
Кожная травінка ў полі
Шчодра сонцам набрыняла;
Зерне кожнае пясчынкі
На шляху іскрыцца зоркай;
Скварам дыхае паляна,
Варта на зямлі прысесці;
Дзень увесь зямля пад сонцам
Выдыхнуць цяпло не можа,
Возера гарыць ад хваляў,
Б'ецца ноч у снах гарачых.

II

Цэлы дзень спякота смаліць,
Сонца села, што квактуха:
Цёпла квокчацца арліцы,
Цёплая зямля — гняздзечка
Сонцава, хутчэй ад спёкі
Парасткі бягуць на волю,
Разлятаецца шкарлупка,
І жыццё смяецца сонцу.
А на ўзлобках — лес купчасты,
У лагах — пшаніца хмарай,
У пясках — мурог шаўковы,
Ў рэках — рыба, звер — у пушчах;
У паветры — грай птушыны,
Скрозь як ёсць — жывое семя;
Сонца йскрынка западае,
Як душа ў людскія сэрцы,—
Ўвесь сусвет у ёй адбіўся,
Прамяніцца сонца-творца.

III

Сонца-творца ўсёмагутны —
Разняло кулак зялёны,
Стоячы ў паветры, шчодра
Раздае жыцця дарункі.

Ветрык, у шаўкі прыбраны,
Па-над нівамі гуляе.

Жыта ўжо цвіце, і хмаркай
Ад яго пярха курыцца
Ў неба, коціццаваламі,
Каб нанова паўтарыцца;
Ладан [redacted] каласоў зялёны
Ўсім спакой і шчасце дорыць,
Смачны дух святога хлеба
Маніцца ўвесь год насыціць;
Стане есціва, не будзе
Ні сірот, ані галодных.

Ноч, стаіўшыся ў карэнні,
Травы кволыя марозіць,—
Ну, глядзі-ткі, сонца-творца!

IV

Творца і ахоўца — сонца
Грэе ўсю сям'ю жывую,
Ў весялосці — веліч сонца.

— Хто ідзе там сонца ўславіць?
Сотні сірацінак боссю
Па жарстве ступаюць смела:

— Сонца, што, як маці, грэе!
Залатой мяце мяцёлкай
Шлях і срэбраным насеннем
Засявае ніву; слёзы
Робіць жомчугам шчаслівым;
Залаты каптан паслала,
Срэбрам вышыла кашулю,
Ўсіх надзеяй надзяліла
Ад сваёй зялёнай моцы.
Ноч, стаіўшыся ў карэнні,
Травы кволыя марозіць,
Сее між людзей няроўнасць.

V

Пал распальваючы, сонца
Стала за плячыма ў ночы;
Рукі белыя світання
Цягнуцца да заранiцы;
У цісках у сонца цемра

Сыкае: «Перамагла ты?
Ўсю зямлю заваявала?
Жарало жыцця адкрыла?
Пал распальвай свой, улада
Скончыцца твая, і дні ўжо
Карацеюць; як ты смела
Ўсю зямлю падняць на ногі!
Пабурыць усё старое!
Спарадзіць дзівосы кветак!
Змусіць змрок насмерць змагацца!»

— Ну, дык смерць сама сустрэнеш,
Жарало жыцця засмягне,
Дык зямлі крывёй заліцца,
Задыхнуцца і загінуць!»

Сонечна душа смяецца.

VI

Памнажае моц улады
І сухім палае гневам,
Распаліўшыся дабела,
Сонца палкае ў зеніце.
Рукавы пазакасаўшы,
Сонца коціць вогнерука
Шар чырвонага жалеза,
Жар куе ўсё у зорках поту,
Молатамі залатымі,
Аж лятуць на долы іскры,
Дзе ўпадзе, там дым клубіцца.

Вочы ў сажалак пагаслі,
У балот запалі шчокі,
Рэпаюцца грудзі ўзгоркаў,
Ссохла ўшчэнт трава старая,
Ўсё не мае сілы выжыць.

Печ гарыць — старое паліць,
Каб адліць усё нанова.

VII

Сонца спёкаю жахае,
Цемра барацьбу іначыць,
Напускае сквар на сонца
І зямныя злыя сілы
Супраць сонца насылае:
Выпускае з багны гадаў,
З сажалак — сляпую нечысць,
Дух гнілля, глухога бруду,
Есць іржаўчынай калоссе,
Шле хваробы, немач, голад,
Ваўкалакаў, мор, макрыцу,
Сіні град і дождж чырвоны —
Здрайцаў сонцавай істоты,
Катаў сонцавага духу,
І пачварлівыя жорсці,
І пажадлівасці і цемры:

Дух і плоць народа ў брудзе
Вывазгаць і апаганіць.

Дужацца душа гатова.

VIII

Сонца спёкаю жахае,
У адной руцэ зіхоткі
Меч са срэбра, у другой жа
Сноп пшаніцы залатое;

Адбівае сілу цемры
І плады святла збірае.

Працы досыць даканана.
Дні пад сонцам карацеюць.
Цемра сунецца, бліжэе:
«Спраўна крумкачы малоцяць,
А вароны зерне веюць,
Плён не кветкамі ўзыходзіць;
І дзяцей лялёк люляе!
Ты ж спакой зямлі турбуеш,
Як пячэш, дык зелянее,
Бо сама зямля без сілы!
І маёю застанецца,
Хмель ад кветак хутка счэзне,
Смерць пачаць жніво гатова».

IX

Сонца спёкаю жахае,
Абдымаючы ў блакіце
Ўсю зямлю залатарука.
Хоць адна дачушка ў сонца,
Быць ёй сіратой,— раптоўна
Дні пад сонцам скарацелі.

«Ты, зялёная, не румзай,—
Белы цвет блішчыць і чахне,
Пачуццё гарыць і тлее,
Гром змагання сам змаўкае,
Як вянчае працу вынік.
З цвету яблык выспявае,
З пачуцця ўзгарыцца праца,
Час грыміць на калясніцы.
Зажынаць жыццё гатова,
Бо зямлю пладніла сонца,
Гэта сіла двух пачаткаў —
Спаконвечна творца свету!»
Цемра злее: «Творца! Сонца
Іншаму ўжо сонцу служыць!»

X

Сонца спёкаю жахае:

«Ты, зялёная, не румзай,
Аднясу цябе да сонца
Іншага, дзе жыццядайнасць,
Цемра там дастаць не зможа.
Час вяртаецца кругамі,
Кожны круг увыш імкнецца!
Змрок твае зняволіў сілы,
Сутыкненне іх развяжа!
Будзе рух агню ў Сусвеце,
Пара ўвесь абсяг запоўніць,
Дым сягне да зор далёкіх,
Новае жыццё ўзлунае,
Завіхурыцца кругамі,
Рэчывы ў шары застыгнуць,
Светы новыя заскачуць
У праменні новых сонцаў!»

А зямля баіцца: «Згінуць
Сонца і зямля!» І моліць:
«Маці сонца, заставайся!»

XI

Сонцу час у шлях вялікі:
«Ты, душа, іскрынка сонца,
Супакой зямлю ў бяссіллі!»

«Ды не плач,— душа гаворыць,—
Ні зімы няма, ні лета
Сонцу, вечна пал палае
Ноччу, днём, зімою, летам —
Ні спачыну, ані ценю».

І зямля свой твар гарачы
Адварочвае ад палу,
Чалавек спачыць спяшае,
І здаецца, сонца знікла.

Месяц выйдзе ўперад, здасца,
Сонцу цёмна, ды пясчынка —
Месяц, а зямля — зярнятка,
Ці ж яны зацемняць сонца?

Змрок, зіма, снягі, залевы
Не дацягнуцца да сонца;
Пасярод зімы на лета
Паварочваецца сонца!

XII

Жаўцізна ўкрывае сонца;
Страх зімы зямлю калоціць:
«Сонцу быць, а я сканаю:
Ўся мая краса загіне!»
Кажа ёй душа: «Ўваскрэснеш,
Бо жыццё ўзрастае з смерці,
А красу паўтораць дзеці.
Чалавек сваёю працай
Мёртвы жыцьме ў чалавецтве!

І на ўсіх хапае сонца:
На зямлю, чужыя зоры,
На людзей і на прасцягі,
Падымае ўсіх з сабою;
Ўсе нябёсы абыходзіць,
Адчыняе дзверы тайнаў;
Выраўноўвае няроўнасць,
Барацьбу не супыняе,
Вечнае святло ахвярна
Дорыць новым пакаленням.
У вялікім будзьма сонцам!»

XIII

Сонца, нізячыся, сцеле
Долам тканыя з туману
Шаўкавістыя прасціны.
А наўзверш вятры прастаюць
Коўдры цёплыя аблокаў;

Груба вые, прэцца восень,
На клубах хусціны буры;
І зіма вачмі шклянымі
Пазірае ў змрок спадлоб'я:
А ці скора ёй выходзіць?
Круцяць дзюбамі вароны,
Чуюць страх, бяду вяшчуюць;
Вогкасць, цьмеючы, сцірае
Гор абрысы залатыя,
Зрэдку недзе пралятаюць
Белыя арлы прасвету;

Бледныя гаі ў жалобе,
Зёлкі скардзяцца гаротна,
Ломяцца ў дрыжаках хвалі,
Ледзь ліпіць святло пазное.

XIV

Сонцу трэба ў шлях збірацца,
Небакрай заружавеўся.
Сонца ўборы выбірае.

Пышных шатаў шоўк пунсовы
Ветрае на вечарніцы;
Новую кашулю з белі
На сябе, старую — ў мора.

Едзе ў залатой карэце
Піць віно на срэбнагор'е;
Два каўшы ў руках, у правай
Белы коўш, зялёны ў левай:
Ледзяная пена ў правым,
Сок з лісця салодкі — ў левым.
Выпіць смерць, каб зноў зрадзіцца.

Ціха цягнецца карэта,
Валакуцца ўборы морам,
Як вада, махры ўцяжэлі.

Сонца нізіцца марудна,
Залаты шпурляе яблык,
Небакрай ліняе ціха.

XV

Небакрай ліняе ціха,
Цьмее чырвань швоў жывая,
Паднадолак сініх шатаў.

Дым нябёсы падвышае,
Вечарэе, змрок чарнее;
Гром гручыць, палае неба;
Сівер чару гневу выліў;
Дождж змяшаў і гразь і пару;
Сцірты хмар агонь красаюць;

Б'юцца волаты на ўзнеб'і,
Дзіды шлюць з чырвонай медзі,
Цяжка б'юць нагамі долы!
Сонечную рунь панішчыць,
Жарала жыцця засыпаць:
«Хай не стане, ў тхле растане!»
Поле, што ў бяскроўі смягла,
Трупы ў тысячы збірае.
Басанож зіма ступае.
І зямля дрыжыць, і сэрца.
Сонца ўсё яшчэ трывае.

XVI

Сонца ўсё яшчэ трывае.
Мары рупяць азірнуцца,
Зноў з зямлёю развітацца,
Сцешыць душы добрым словам.
Сонца спіхвае асілкаў:
Змоўк аглухлы грукат грому;
І святло блакітна-бела
Пралілося з чорнай хмары,
Пахам поўнячы паветра;

Пад вадою нерухома
Спіць зямля, душа, нібыта
Вопрадзень, скуль мятлік будзе.

Сонца сумна пазірае,
Кідае паяс жамчужны,
Сямiколерны — вясёлку,
Знак надзей і знак лятункаў:
«Зноў вам доля ўгору ўзняцца!
Па вясёлцы крок кіруйце
Праз завалы хмар да сонца!»

XVII

У святле блакітна-белым
Сонца шлях свой паўтарае,
Дзе часціны года ходзяць
У кругазвароце вечным;
Валачэ дзяцей з сабою:
Маладзік, зямлю і зоры —
Ў гуле полымя маланак,
Валячыся ў вір, да сонца —
Маці ўсіхнюю, якую
Цёмна душы прачуваюць.

Стуль, з глыбінь, ляціць маланка
Праз мільёны год вякамі,
Дасягнуць зямлі не можа:

Даль сцірае меры, лічбы,
Час зліваецца з прасторай.
Млечны Шлях плыве сцюдзёна,
Як туман прывідны, міма.
І туды спяшае сонца
І душа, што вечна прагне:

«Сонца новае, ўзыдзі нам!»

1910

Агонь і ноч

Даўняя песня
ў новым гучанні

(Адаптацыя)

Выткаў месяц над ракою
Кладку па тумане:
Мглістым цугам здані
З цёмных пушчаў выплываюць.

Павольна плывуць туманы. Якая цёплая майская ноч, як пяшчотна ззяе ў рацэ месяц! І вось ужо зноў яны, сны мае, вобразы майскай ночы!..

Здаецца, даўно адышоў у нябыт гэты ціхі час чакання і журбы, гэты май! Ужо і не бачу дарагіх вобразаў тых дзён. Так кіпела мора жыцця, віравала ў маёй душы, такім жарам выпаліла яе сонца, што ўжо ў ёй амаль не засталося месца для іншых вобразаў. Але разам з ціхім месяцам, у пару маіх мрой і летуценняў,— вы зноў вяртаецеся да мяне, даўнія цені, доўгі цуг прывідаў. Нібы пахаванне — труна за труною — праплывае вы бясконцаю чарадою. Не, гэта не пахавальнае шэсце! Зноў, як у старадаўняй песні, адчыняюцца дамавіны, і ўстаюць з іх мужчыны-волаты: героі ў кальчугах, з мячамі ў руках. І жанчыны, велічныя, строгія, ідуць за імі — бліжэй, бліжэй...

Бліжэй, бліжэй шэсце, і ў месячным святле бачу, як спакваля згушчаюцца расплывістыя постаці, набываюць абрысы. Я ўжо магу разгледзець кожнае аблічча: рысы абвастраюцца, абуджаецца душа, каб прадоўжыць незакончанае жыццё, каб працягваць незавершаную барацьбу.

Гэта ты, Лачплесіс! Пазнаю цябе па горда ўзнятай галаве, па ззянні, якое азарае твой твар,— так попел пакрывае жар. Гэта ты, сын Ліелвардса, ты, вялікі правадыр!

Поплеч з ім — сябры-воіны: сябар і таксама правадыр Кокнесіс, пясняр і народны змагар Пумпурс.

А вось і два дзяды, два правадыры пляменаў — Айзкраўкліс і Ліелвардс. А за імі стары мудрэц Буртніекс.

У блакітна-серабрыстым ззянні, нібы ахутаная покрывам празрыстага летняга дожджыку, ідзе Лаймдота. За ёю сяброўкі і служанкі.

А наўзбоч, на чале атрада гордых воінаў, у пунсова-залацістым убранні — уладарная Спідала з бліскучымі вачыма.

Зводдаль перад змрочным натоўпам выступае Кангарс, у... начальнік гэтага тлуму, з перакрыўленым ад злосці тварам. ... наганяючы жудасць на ўсіх ведзьмаў-дзяўчат, на стару... чараўніцу і духаў апраметнай, ідзе Чорны Рыца... Збоку ад шэсця ў белым плашчы Лайкавецiс — Стара... Часу з трыма дочкамі — Белымі Дзевамі — задуменн... паглыблены ў сузіранне, як бы не ■ гэтага свету.

На тварах воінаў імпэт і гнеў. Перада мною бразгае збро... ■ здаецца, быццам гукі даносяцца аднекуль з замагільнай д... лечы. Атрады ідуць цвёрда, падаючыся наперад, але яны ўве... час перад маімі вачыма. Бачу іх паступальны рух, і няма ям... супыну. Воіны ідуць нястрымна, як бы лунаючы над зямлёй. ... крокі плывуць, як плыве ў ветраны дзень дым над зямлёю. Я... глядзяць іх застылыя вочы, як далёка імкнуцца яны ўперад! А... бачу — толькі ў Лачплесіса вочы гараць унутраным агнём. І зд... ецца, што ён адзін вядзе ўсіх за сабою, толькі адна Спідала ід... па добрай волі, задуменна-летуценная.

Ідзі ж, Лачплесіс, ідзі зноў на змаганне! Твая перамога яшч... не поўная, пераможца! Перамажы яшчэ раз, перамажы канчатк... ва! Ідзі на вялікі подзвіг, ачысці зямліцу ад пагані!

Ці чуеш далёкія галасы? Гэта духі зямлі. Стогны іх блізк... енкі іх побач. Гэта ўжо і не стогны, не енкі — гэта грукат, па... земныя ўдары.

Самыя прыгнечаныя — найбліжэй да перамог...

Ці чуеш? Там, на дне Даўгавы, схавалі яны ключ да свабод... блішчасты ад слёз і солі крыві сваёй, што растварыліся ў хваля... Вось ён зіхаціць, ключ твой! Мы хочам падняць яго, але над... аслаблі рукі нашы. Ідзі, вазьмі яго і адчыні нам браму ў Зама... Святла!

Моўчкі праходзіць Лачплесіс, і толькі вочы яго палымнеюць...

І лунае голас, нібы з таго свету прарваўшыся. Гэта гаворыц... Лайкавецiс — Старац Часу:

«Не заважай Лачплесісу на яго смяротным шляху! Яго б... рацьба — самае велічнае з таго, што даступна зроку людском... ён б'ецца за тое, каб стаць дасканалым. Тое, што ўгледзелі в... ў несамавітай тузе небяспекі,— толькі першы пробліск раніц... Дзень вялікай бітвы яшчэ наперадзе! Будзьце чуйныя, будзь... пільныя, каб не заспелі вас сонных, калі прыйдзе ваш час і Лач... плесіс павядзе вас на апошні рашучы бой! У вас саміх — і клю... той, і Замак Святла!

Але і тады, калі ўступіце вы ў Замак, яшчэ не закончы... ца шлях Лачплесіса. Пачнецца гераічнае бяскроў... нае змаганне ў царстве Спідалы!..»

Калі прагучалі гэтыя словы з таго свету, цела маё скаланулася, і ўбачыў я вогненны позірк Лачплесіса, які бліснуў мне з-пад ацяжэлых павек. Вусны Спідалы ўсміхнуліся мне. Я хацеў ускочыць, усклікнуць: «Мы пойдзем! Пойдзем!» — але ўсё завалакло туманам. Стаяў Лайкавеціс з узнесенымі рукамі, шырока раскінуўшы за сабою белы плашч. Калыхаліся пасмы святла, наблізіліся чароўныя галасы — цені зноў ажылі...

Мрояць ноччу хвалю,—
Чуцен поўны жалю
Змрочны водгул вечнай бітвы...

. . . .

Дзе я?.. Гэта зноў ты, мая дарагая Айчына! Я чую гукі бестурботных песень... Немцы рушылі ўжо ў захопніцкі паход, але латышы яшчэ свабодныя... Яшчэ высіцца старажытны, свабодны замак латышскага народа...

. . . .

ДЗЕЯ I

Замак Айзкраўкліса над Даўгавай. Вялікі пакой у старажытналатышскім стылі, але фантастычна ўпрыгожаны. Стол з крэсламі; ложак; старадаўнія кросны; уздоўж сцен услоны; печ. Шарая гадзіна.

* * *

Спідала, Айзкраўкліс; дзевяць дзяўчат чэшуць воўну, прадуць і ткуць. Тры ў чорным, тры ў жоўтым, тры ў чырвоным.

Айзкраўкліс
(гледзячы на працу дзяўчат)

Увішна бегаюць, як мышкі,
Па воўне пальчыкі дзяўчатак.

Часалі

Вычашам шчотачкай
Воўначку-воўну,
Мяккай шчапотачкай
Высцелем роўна,—
Будзе ў саколіка
Цёплая лёленька!

Айзкраўкліс

Сваім саколікам, дачушкі,
Дагодзіце.
(Да праляў.)
А вы? Саколікам таксама?

Пралі

Калаўротак мой, круціся,
Вераценца, бегай.
Кужалёчак мяккі, віся
Нітачкаю белай,—
Напраду міленачку
На кашульку ў ёлачку.

Айзкраўкліс

Як добра, мілыя,— кашулькі любым.
(Да ткаляў.)
А вашы пальчыкі іх выткуць?

Ткалі

Жвавы чаўночак
Высцеле ўточак,
Ляжа ва ўточку
Да ніткі нітка,—
Будзе дружочку
Ноская світка.

Айзкраўкліс

Куфры напоўнены — глядзець прыемна.
Ды, можа, годзе ўжо, на вечар гледзячы,
(да Спідалы)
І адпачыць пара, мая дачушка.

Спідала, прыхіліўшыся да акна, глядзіць удалеч; месяц адсвечвае на яе сукенку чырвоныя, чорныя і жоўтыя блікі.

Ужо гавораць людцы, Спідала,
Што жорсткі бацька я, што прымушаю
Цябе да першых пеўняў працаваць.

Спідала

Не могуць людзі знаць, які ты добры!

Айзкраўкліс

Але каб толькі той нягоды! —
Пайшлі яшчэ пагудкі злыя:
Нібы сапраўдная работа ваша — ноччу,
Нібыта ведзьма ты, сяброўкі — ведзьмы.

Дзяўчаты ўскрыкваюць і перастаюць працаваць.
Спідала хутка паварочваецца.

Не, дзеткі, не! Палохацца не варта...
Не я ж кажу... Ах, Спідала, дзіця,
Не веру я намовам нехарошым,
Лухты пустое слухаць не хачу.

Спідала

Не верыш, бацька, і не вер ніколі.

Айзкраўкліс

Не гневайся дарма, мая галубка,
На словы бацькі... Каб жа прыпыніць
Няславу, кінь начную працу, лепей
Прыгледзь саколіка — пасаг даўно гатовы.

Спідала

(зноў каля акна)

Яшчэ паспею, татка.

Айзкраўкліс

Заўсёды так гаворыш
І жаніхоў адпрэчваеш дарэмна —
Не вернуцца...

Спідала

Няхай!
Змяінае пароды я, не забывай!

Айзкраўкліс

Так, чысты быць павінен род змяіны!
Але, мой Божа, вочы як блішчаць!
Рабі, як сэрца кажа; ты, галубка,
Мне даражэй за роднае дзіця.

Спідала

Я ведаю, ты вельмі добры бацька,
Але не адбірай маёй улады.
Як буру нельга ў клетку зачыніць,
Так зорку нельга мудрасці вучыць,—
Бо я ж за ўсё, што на зямлі,
Найпрыгажэйшая!
Дабранач, бацька, не ўшчувай мяне,—
Яшчэ багата часу!

[Дзяўчаты, тыя, што часалі кудзелю, пралі, ткалі,— усе выцягваюць з печы вогненныя ніткі, развешваюць іх крыж накрыж па хаце і, варожачы, рассыпаюць чароўнае зелле спрабуючы зазірнуць у будучыню. У выніку Спідала прад... чувае прыход Чорнага Рыцара, пасланніка цёмных падзем ных сіл, і героя Лачплесіса. Неўзабаве сапраўды з'яўляецца Чорны Рыцар і выразна тлумачыць Спідале тую місію якую ўскладаюць на яе «прорвы пекла».]

Чорны Рыцар
(Спідале)

З высокім даручэннем я прыйшоў!

Спідала

Сама сабе я даручэнне,
Не знаю іншых.

Чорны

Загадана, каб ты служыла цемры!

Спідала

Ніхто не можа мне загадваць.
Суніцы ўзімку есці буду,—
Як захачу сама!

Чорны

Узнесці мог бы я цябе
Да зорак у бяздоннай цемры,
Дзе царства непрагляднай
Адвечнай і неверагоднай ночы.

Спідала

Тваё там царства, што рабіць мне ў ім!

Чорны

Ты ўладай моцная — табе
Пакорны будзе вечны морак.
Памножыць сілу цемры ты магла б,
А тут ты — бляклы znічкі след.

Спідала

Я вольная, сама служу сабе!
Ты — паслугач, прыслужвацца завеш!
Ты брыдкі мне!

Чорны

Дарма супраціўляцца лёсу!
Не зменіш ты яго законаў,
Наканаванае не пераступіш!

Спідала

Што кажа лёс? Што я зрабіць павінна?

Чорны

Забіць таго, які ідзе!
Таго, хто моцны духам і адважны,
Хто замахнецца на магутнасць ночы
І ўладна скіне цемры кайданы,

Хто выкраша агонь супраціўлення
У чорным царстве ночы,
Хто абудзіць пасмее ўсіх рабоў
І хто дрымотную ўзварушыць волю,
Каб сілаю гарачае крыві
Ушчэнт разбіць магутны Хорам Цемры...
Забойцу нашага заб'еш,
Намер яго задушыш у зародку —
Такі загад табе ад лёсу!

Спідала

Калі ён гэтакі магутны,
Што зброю цемры паламае,—
Якую ўправу я знайду?!

Чорны

Ты маеш зброю іншую і ўладу;
Ты прыгажэйшая за ўсё, што над зямлёй,
Валодаеш ты сілай незямною,
Якую сіла смертных не пабора,
Нішто цябе зламаць не можа.
Бязмерным шчасцем, мірам, хараством
Ты ўзвышана над нэндзаю зямлі;
Пагружаная ў ноч, спакой дасі
Яму; хай пераможа ён, хай мір
Сабе здабудзе.
Урымсціцца яму дапамажы,
Хай улагодзіцца ў вальгоце мірнай,
Забудзе бітвы, неўгамонны.
Прынадзь яго да ўцех зямных
І шчасцем утаймуй,—
А шчасце толькі ў прыгажосці.

Спідала'

Маю ты так ацэньваеш уладу!

Чорны

На гэтым свеце дай уведаць шчасця,
Адкрый усе тайноты хараства,

Каб іх яму хапіла аж давеку:
Хай цешыцца, жыве, сябе шануе,
Хай іншых ахвяруе, не сябе,
Хай іншых прадае, купляе,
Пакуль не здрадзіць праўдзе ён
І за сабою не пацягне
Яе ў начную прорву, што зямлю
Абвалакла суцэльнай цемрай
І нерухомай!

Спідала

Сама ж я — рух,
Я — моц! Вы без мяне — нішто!
Прэч! Ён ідзе!
Я прыгажэйшая за ўсё,
Што на зямлі і пад зямлёю ў пекле!

Чорны

А ноч святла драбнічку праглыне!
(Знікае.)

За ім знікаюць чэрці. Выходзіць ведзьма.

[У наступнай яве бацька Лачплесіса Ліелвардс, выводзячы сына ў людзі, дае яму свой наказ.]

Ліелвардс
(Лачплесісу)

Сумленны будзь! —
Прымі маю карысную параду.
Твой лёс, мой сын,— змагацца супраць зла,
Перамагчы на захадзе, на ўсходзе —
Так мне калісьці прадказаў кудзеснік,
Які цябе з лясной гушчобы вынес.
Няма паноў над намі, вольны суд
Спраўляе вольна выбраны суддзя
У мірны час, а ў час ваенных бур —
Военачальнікі-правадыры.

Мы роўныя між роўных; горшых-лепшых
У нас няма, і ў гэтым наша сіла.
Ахоўвай, сын, латышскі край, узвысь
Яго сярод усіх краёў і земляў,
Трымаючыся запаветаў продкаў;
Бо мы — аратыя, зямля — аплот наш.
Дык з Богам, мілы сыне!

[Адбываецца знаёмства Спідалы і Лачплесіса, падчас якога раскрываюцца сутнасць герояў і іх асабістыя якасці.]

Лачплесіс

[...] Я — сын мядзведзіхі,
Такія ўсе латышскія героі;
І ведай, што ў вушах мядзведжых
Ўся моц мая сабрана
І сілы роўнай ёй няма!
Яна адолее ўсіх ведзьмаў,
Што круцяць полымя і сеюць снег;
Пасланы я зямлю ад нечысці ачысціць.

[Спідала ў захапленні ад Лачплесіса. Дзёрзкая і рашучая, яна не падпарадкоўваецца загаду Чорнага Рыцара і выказвае абяцанне падтрымліваць героя ва ўсім.]

Спідала

Я — гэта я. Уладарка сабе.
Я вольна іду... Я сама сябе шлю,
Куды захачу...
Сваім святлом я свячу.
Я — Спідала,
Я — дачка Агню,
Полымем пыршчу з нетраў зямлі,
Я — душа агнявая жывога ўсяго!
За мною — туды, дзе палае краса!

Лачплесіс

Пасланы змагацца я...

Спідала

Я ведаю ўсё, памагу табе:
Мне падуладныя вятры, святло,
Як зерне, сею град і ў барацьбе
Разбуру ворагаў тваіх кубло,
Пасею смерць у іх калонах,
Абрыну моц стыхій шалёных.
Я памагу табе.

[Адно не задавальняе Спідалу: Лачплесіс прыйшоў у гэты свет змагацца са злом не па ўласным перакананні ў неабходнасці барацьбы. Дужы ад прыроды і адважны, ён гатовы ісці ў бой, бо так яму загадвае бацька, у дадатак на такі шлях героя скіроўвае яго каханая Лаймдота. Зрэшты, сам Лачплесіс засяроджвае на гэтым увагу Спідалы.]

Лачплесіс

Пасланы я змагацца з пеклам:
Такі назначыла мне Лайма лёс.

[Гэтыя акалічнасці не могуць не выклікаць узрушанай занепакоенасці Спідалы: яна не хоча мірыцца з тым, што Лачплесіс не самастойны ініцыятар перамен, а толькі сумленны іх выканаўца.

З аднаго боку, Спідала імкнецца зрабіць героя падобным да сябе, а гэта значыць, абрынуць яго ў неабмежаваную актыўнасць, стан руху і несупынных перамен. З другога, яна праз неадольную рэўнасць вырашае разлучыць Лачплесіса і Лаймдоту.]

Заслона

ДЗЕЯ II

[Лаймдота, кахаючы Лачплесіса, не можа спакойна прыняць адназначнае рашэнне наконт яго будучыні. Яна ведае пра ўсе небяспекі, якія чакаюць яе абранніка на шляху барацьбы, і нават у нейкі момант гатова адмовіцца ад адзіна правільнага выбару. Аднак абавязак перад народам, яго лёсам бярэ верх над асабістым пачуццём.]

Л а й м д о т а

[...]
Слухай —
Там ключ да свабоды — апошняя тайна.
(Паказвае на малыя дзверы.)
Святло там — шчасце народа схавана,
Ляжыць і чакае —
Каб сіла і мужнасць
узнеслі яго над краем.
Хто выцерпіць змрочную жудасць,
хто самаадданы,
Той скіне з народа цяжкія кайданы,
Хто ў цемрыве поўначы сам не загіне,
Той рабскія путы з люду скіне,
І Замак Святла ўстане з цемрадзі вод,
І новым жыццём зажыве народ,
І сонейка ўзыдзе, свабоду
Азорыць і мне, і майму народу.
Тады я нявестай тваёю стану...

[Натхнёны Лаймдотай, Лачплесіс імкліва накіроўваецца да замка Буртніексаў, што знаходзіцца на дне мора. У рэмарках да драматычнага дзеяння аўтар малюе наступныя карціны.]

Л а ч п л е с і с

Хо-хо! Нявеста! Ідзі і чакай!
Свабоды ключ, шлях азарай!

Бліснуў ключ, Лачплесіс кідаецца да яго. Уздымаецца пякельны шум; бура; пачвары кідаюцца ва ўсе бакі; сіпенне; сцены распалены.

* * *

Лачплесіс збівае мячом карону з цмока і б'е яму ў грудзі; цмок здыхае з сыканнем і ровам.
Пачынаецца бура. Святло гасне, зноў загараецца ключ. Лачплесіс бярэ яго. Калені яго падгінаюцца ад стомы.

* * *

З паўзмроку ўзнікаюць тры Белыя Дзевы ў яркім ззянні. Яны схіляюцца над Лачплесісам, навяваюць сон белымі вэлюмамі.

Белыя Дзевы

Спі спакойна!

(Выходзяць.)

Уваходзіць Старац Часу.

* * *

Лачплесіс. Старац Часу.

Старац Часу

Навеялі моцны сон мае дочкі.
Спакойна паспі, мой саколе!
Адолеў ты ўладу нядобрае сілы,
Закон апраметнай ты падарваў;
Сябе пераўзмог і ў ахвяру прынёс,
Свабодны — свабоду ўсім здабываў.
Ты замак падводны да сонца падняў,
Каб ён азараў наш латышскі край.
Хай сэрцы людзей ён у Латвіі грэе,
Хай радасна ў Латвіі кожнаму будзе,
Хай стогны аціхнуць, не плача душа,
Хай шчасна жывецца ўсім латышам,
Хай праца іх радуе і адпачынак,
Хай людзі да сонца свабодна імкнуцца,
Хай думкі, пачуцці не знаюць кайданаў,
Хай людзі растуць, хай народ мой расце,
Як сад пладаносны няхай расцвіце.
Я — бацька народа. Ў калысцы яго
Я ўскалыхаў,
І ключ да свабоды яму я скаваў.
Ды вораг адолеў — пайшоў ключ на дно.
Стагоддзі змагаемся з цемраю мы...
Падняў ты святло — не спыняйся, ідзі.
Стагоддзі змагаемся з цемраю мы...
Дык не адступай перад ёю, вядзі,

Не дай на сваболу надзець ланцугі.
Ключ моцна трымай. Калі ўпусціш яго,
Патоне наш замак, патонеш і ты.
Не дай сябе ўвесці ў аблуду і зман.
Не вер, што твой вораг дужэйшы, не вер,
Ты мужнасцю злыдняў усіх пераможаш,—
Змагайся! Змагайся!
Чакаюць вялікія справы яшчэ:
Рыхтуй жа наш край для царства святла,—
Змагайся, не знаючы стомы.

(Знікае; гасне і яго ззянне.)

Лачплесіс

(праз сон)

Лаймдота! Лаймдота!
Навекі мая ты нявеста,
Прыйдзі, супакой, памажы,
«Як доўга ты спіш!» — скажы.
Як соладка тут пяюць!
Нявесту маю вядуць...

Замак Святла падымаецца з возера; на яго белых вежах звоняць званы; світае.
Узыходзіць сонца.

* * *

Збіраюцца людзі Буртніекса: воіны, сяляне, жанчыны, дзеці.

Хор

З маўклівае цемры,
З пякельнае зеўры
Да сонца праз нетры
Ўстаў Замак Святла.

Разбіўшы аковы
Вядзьмацкай замовы,
Заве ён у новы
Свет волі, дабра. [...]

Заслона

ДЗЕЯ III

Толькі што заснаваная Рыга на беразе Даўгавы. На пярэднім плане шацёр уладаркі Спідалы; вялікі пакой, багата ўбраны ў стылі старажытналатышскай варварскай раскошы са слядамі ўплыву заходнееўрапейскай культуры XII стагоддзя.

Налева трон Спідалы; абапал і насупраць крэслы правадыроў. Пасярэдзіне вялікія дзверы за чырвоным полагам. Злева яшчэ дзверы — у харомы Спідалы; направа ўваход у памяшканне воінаў. Калі адчыняюцца галоўныя дзверы, відны будоўлі Рыгі і бераг Даўгавы з прычаленымі нямецкімі караблямі і лодкамі латышоў; за ракой — лясістыя пагоркі.

Ясны сонечны дзень.

* * *

С п і д а л а стаіць каля галоўнага ўвахода, полаг на якім падняты, і глядзіць на бераг Даўгавы, дзе сабраўся вялікі натоўп: л а т ы ш ы, л і в ы, с я л я н е, в о і н ы, п р а в а д ы р ы. Сярод іх і н е м ц ы — м а й с т р ы і ц і в у н ы. Людзі праводзяць караблі, на якіх К а ў п а і я г о с п а д а р о ж н і к і збіраюцца адплыць у Нямеччыну.

Л ю д з і
(спяваюць развітальныя песні;
ва ўсім адчуваецца нешта нядобрае)

— Бывайце, браточкі, шчаслівай дарогі!
Няхай жыве Каўпа! Бывайце, нябогі!
— А долечка горка-я!
Хай ён прывязе нам дарунак багаты!
Хай вернецца цэлы-здаровы дахаты!
— А долечка горка-я!
Браты нашы, сёстры хай вернуцца з ім!
Няхай блаславіць нас магутны Рым!
— А долечка горка-я!

* * *

Уваходзяць К а н г а р с і п р а в а д ы р ы. Пакуль яны размяшчаюцца, праз адчыненыя вокны чуюцца развітальная песня і працоўны шум на будоўлях Рыгі: стук малаткоў, крыкі цівуноў, часам стогны.

Дзверы зачыняюцца.

[...]

* * *

Лаймдота

(голас за сцэнай)

Слухайце, слухайце, добрыя людцы:
Хай вашы слёзанькі горкія льюцца,
Хай мне хутчэй растопяць яны
Жалезныя рабскія кайданы.

Рэха

А долечка горка-я!

Спідала загадвае адкрыць заслону. Відаць, як вядуць на карабель нявольнікаў. Сярод іх Лаймдота ў кайданах, у парванай вопратцы.

[На фоне такога шматпланавага адлюстравання падзей ізноў гучыць матыў узаемаадносін Спідалы і Лачплесіса. Міфічна-сімвалічныя якасці Спідалы спалучаюцца з чыста чалавечымі.

Зразумела, Лачплесіс не можа не захапляцца Спідалай, якую ўспрымае усёй паўнатой адказнасці як «прыгажосць сярод бруду». У той жа час на рэпліку Спідалы: «Лаймдоту занадта ўзвысіў ты» — герой з непахісснай вернасцю каханай адказвае.]

Лачплесіс

Але толькі з ёю адужаў я цемру
І Замак Святла падняў.
Яе, хоць увесь свет наўкол абыду,—
У моры, на Востраве Смерці — знайду.
(Ідзе да дзвярэй.)

Спідала

Навошта ісці?
Навошта шукаць?
Ці варта ёй помсціць? Яна
Сама пакарае сябе,
Сама і патоне ў буднасці шчасця
І ў велічнасці змалее;

Хай шляхам абраным ідзе.
Яе, як часцінку сябе, я люблю —
Але каля мэты пагасне яна.

Лачплесіс

Нашто ж разлучыла, калі яе любіш?

Спідала

Яна — частка мяне. А табе трэба ўсё.
І я — гэта ўсё.
І лёс наш — адзін.
Са мною астанься.
Усё ўжо здабыта,
Мы разам сусветам будзем валодаць,
Бо я прыгажэй за ўсё,
Што ёсць на зямлі і пад зямлёю ў пекле.

Лачплесіс

Адна мне дарога —
Ачысціць зямлю.
Не будзе Лаймдоты —
Не будзе і сэнсу змагацца,
І я на спачын адыду!..

Спідала
(сур'ёзна, пагрозліва)

Забудзь пра яго
І бойся спакою!
У ім без мяне ты загразнеш,
Сваёй не дабіўшыся мэты.

Лачплесіс

Ха! Ха! Пагрозы твае насмяшылі.
Ты зменлівая, неспакойная ты —
Глядзі, да яснасці толькі мяняйся,
Удасканальвайся праз хараство.

Спідала

(яшчэ жудасна страшная,
нібы прадчуваючы нешта)

І сам ты мяняйся ў імкненні ўвысь!
(Умольна.)
І каля мяне аставайся!

Лачплесіс

Хо-хо! Мне пара!
(Адштурхоўвае яе.)

Спідала

(мяняючы голас)

Лачплесіс! Лаймдоту не знойдзеш ты!
Бо я толькі знаю прытулак яе.

Лачплесіс

Знайду, не схаваеш!

Спідала

(смеючыся)

Ну што ж, хай пamру й свой сакрэт
Вазьму я з сабой на той свет.
Лаймдоту па добрай волі
Табе не аддам я ніколі.

Лачплесіс

Вядзьмарка!
Пайду і Лаймдоту святую
Насуперак лёсу ўратую.
Хо-хо! Хо-хо!
(Паспешна выходзіць.)

Спідала

(у глыбокім роздуме)

Зменлівая, удасканальвайся ў яснасць...

[Заўважым, што ў гэтым дыялогу паміж Спідалай і Лачплесісам, якім завяршаецца III дзея, выпісаны ключавыя фразы філасофскага напаўнення, апорныя для спасціжэння далейшага дзеяння драматычнай паэмы. У іх аўтар выказаў, з улікам індывідуальных асаблівасцей характараў дзейных асоб, агульнае, па сутнасці, для абодвух герояў патрабаванне. Спідала — у дачыненні да Лачплесіса: «І сам ты мяняйся ў імкненні ўвысь!» Лачплесіс — у дачыненні да Спідалы: «Зменлівая, удасканальвайся ў яснасць!»]

Заслона

ДЗЕЯ IV

[IV дзея ў адрозненне ад усіх іншых мае спецыяльны падзагаловак: «Бераг на Востраве смерці». Сюжэтныя перыпетыі адбываюцца фактычна на мяжы паміж светам, які напоўнены markdown рознага роду падзейнасцю, і той уяўнай краінай, дзе можна знайсці шчасце самазаспакоенасці і забыцця. Паняцце «смерць» трэба ўспрымаць метафарычна, сэнс яго — эгаістычная самазакаханасць. Закон вострава — «забыцца ў дрымотнай млосці» і «растварыцца ў прыгажосці».

Спідала хоча падначаліць сабе Лачплесіса, спрабуючы ўзяць яго ў палон сваіх разваг, спакусіць уяўнымі каштоўнасцямі новай шчаслівай краіны, прымусіць адмовіцца ад галоўнай яго мэты. Аднак Лачплесіс усё-такі знаходзіць у сабе сілы выстаяць. Ён адмаўляецца ад «залатога яблыка», раскрывае падманлівасць крыштальна чыстай крыніцы. Ссякаючы галіны і вершаліну зачараванага дрэва, Лачплесіс тым самым уплывае на перамены ў вобліку самой Спідалы.]

Лачплесіс адсякае галіну; з'яўляецца Спідала; твар яе журботны; у яе горды выгляд уладаркі, але ў вачах свеціцца пяшчота, гатоўнасць да самаахвяравання.

Лачплесіс

Твая прыгажосць — найлепшы дар!
Як дзіўна праменіцца твар!

Спідала

Цяпер я Лаймдоту
Сама аддаю!
Спідала — гэта святло!
Яе не бярэ ніякае тло!
Камень, раскаліся,—
Лаймдота, з'явіся!

Лаймдота

Лачплесіс! Гэты час
Зноў лучыць нас.
Уратавала сіла твая,—
Шчаслівая будзе Латвія!
(Абдымае Лачплесіса.)

Спідала

Камень, раскаліся,
Народ, скінь чары, прачніся!
Ад сну векавога — да аднаўлення,
Ад рабскіх аковаў — да вызвалення!
Камень, раскаліся,
Пумпурс, пясняр народны, з'явіся!
Пра будучыню звонка пой,
Пра Лачплесіса — ён герой.

Вернутыя да жыцця камяні пачынаюць варушыцца, уставаць; ажываюць птушкі, абуджаецца ўся прырода.

[Як мы ўжо зразумелі з папярэдняга тэксту, Спідала — гэта персаніфікаваны вобраз мастацтва. Адлюстраваныя тут перамены ў характары Спідалы сведчаць аб тым, што гераіня пачынае адчуваць сваё прызванне значна шырэй, чым дагэтуль. Яна адмаўляецца ад папярэдняй самазакаханасці, калі самавартаснасць і самадастатковасць, ідэя «мастацтва дзеля мастацтва» былі яе сутнасцю. Аўтар скіроўвае Спідалу ў бок людзей. Яна падпарадкоўвае сябе ідэі служэння грамадскім запатрабаванням.]

Спідала

Свой дух абмяжую цяпер я
І веліч здабуду гэтым, давер'е.
Ясней ужо бачу веліч сваю...
Ворагі ўлезлі ў Латвію.
Спідалы зорка, сваці!
На бітву, Лачплесіс, вядзі!

[Заклік Спідалы да новых змаганняў за родную краіну, за волю народа, які ўвасоблены ў гэтых радках, становіцца матывам усяго далейшага развіцця дзеяння.]

Заслона

ДЗЕЯ V

[Лаймдота і Лачплесіс шчасліва ўладараць у сваёй краіне. Папярэднія войны ўзмацнілі іх дзяржаву. Воіны і народ, большасць людзей жадаюць міру. З імі пагаджаецца Лачплесіс.]

Лачплесіс

І сам не хачу я крыві,
Хай край наш жыве ў згодзе-любві.

Правадыры

Правадыр наш і герой,
Ты прынёс у край спакой!

Лачплесіс

Хачу, каб свабодны край латышоў
Упэўнена ў славе наперад ішоў. [...]

* * *

Уваходзяць паслы розных народаў, купцы і правадыры; лівы, эсты, рускія купцы і нямецкія рыцары, праходзячы міма Лачплесіса, складваюць каля трона падарункі і адыходзяць убок; ад іх аддзяляецца група паслоў і выходзіць наперад.

Паслы

Вітаем цябе мы, слаўны герой,
Вітаем высокі подзвіг твой!
Ад рабства ты вырataваў народ
І нас асланяеш цяпер ад нягод.
Ты кулаком мядзведзя заб'еш,
Адною рукой жарабца падкуеш.
І мы прызнаём цябе за ўладара,
Ахоўцам набытага намі дабра;
На землях тваіх жыць нам, кароль,
І нашы тавары прывозіць дазволь.
Прынеслі табе мы дарункі —
Паркаль, і сукно, і карункі.

Немец

Чаго тут з дарамі багатымі госці? —
Канечне, у гонар тваёй прыгажосці;
Лаймдота, красуня, бяры
І мужа даць мір нам угавары.

Лачплесіс

Я дзякую, суседзі, за гонар шчыры.
Жывіце ў Латвіі спакойна, у міры.
Хачу я спакою, а не раздораў,
Каб край жыў у шчасці, забыўшы гора.

Немец

Ніколі мы слоў тваіх не забудзем.
Даўно ўжо на свеце гавораць людзі,
Што любіш ты мір. Дружнай сям'ёй
Дазволь нам пажыць на зямлі тваёй.
На беразе мора мы Рыгу ўзвялі,
Тавараў навезлі туды караблі,—
Пакінь гэты бераг пясчаны для нас,
Надзейную гавань у грозны час.

Лачплесіс

Заўсёды суседа нам шкода:
Жывіце ж у Рызе, абы каб згода.

Спідала

Не, Рыгу нікому я не аддам,
Для тых яна, хто мардаваўся там,
Хто сілы свае надрываў у рабоце,
Хто веліч узвёў на крыві і поце,
Капаў хто, рубаў, убіваў там пáлі,
Для тых, што ні сну, ні спакою не зналі.
Узводзілі Рыгу бедныя людзі —
Няхай жа ім домам цяпер яна будзе.

Немец

Дык мы ж будавалі, служылі яны —
Усё гэта хітрыкі Спідалы.
(Да Спідалы.)
Ты селішча нам сама адвяла...

Спідала

Ды права валодаць ім я не дала. [...]
(З-за заслоны чуецца ціхі стогн.)
А долечка горка-я!..

Усе прыслухоўваюцца.

Лачплесіс

Чый гэта стогн?
Каго не пусцілі за стол?
(Загадвае адкінуць заслону.)

Даўгава блішчыць на сонцы, але на другім беразе чорныя хмары.

Далёкія галасы

Плачам і енчым,
Нам не падняцца.
Клятым галечай
Не ўратавацца.
З нетраў дастаньце,
Сонца нам дайце.
А долечка горка-я!

Лачплесіс
(выходзіць на парог)

Хто яны? Чаму не тут?
Хто схаваў ад мяне мой люд?

Правадыры

— Гэта Даўгавы стогн.
— Гэта далёкі гром...
— Хай не бачыць іх ён...
— Схавайся ў свой дом!

Спідала
(спалохана, ціха)

Удасканальвай і ўдасканальвайся ўгору!

Далёкія галасы
Са слёз нашых — Даўгавы воды,
Спрадвеку чакаем свабоды.

Лачплесіс
(вяртаецца)

Скажыце нарэшце, чый гэта стогн?
Завіце няшчасных за стол!

Уваходзіць Чорны Рыцар, вельмі багата ўбраны сляпец, якога вядзе хлопчык.

Спідала
(ускрыквае)

А!

Лаймдота стаіць як аслупянелая; кубак падае з яе рук. Лачплесіс, які толькі цяпер абярнуўся, бачыць Рыцара.

Кангарс

Адзін з тых, каго абдзялілі.

Лаймдота

Хіба мы яго запрасілі?

Лачплесіс

Ён госць. Хай заходзяць усе.

Чорнаму Рыцару падаюць віно, ежу; той адмаўляецца.

Лаймдота

Ай, Лачплесіс! Ён гора нясе!

Кангарс

Гэй! Звініце, кокле струны!
У скокі ўсе, хто сэрцам юны!

Госці зноў селі; танец; маладыя воіны выклікаюць адзін аднаго на барацьбу.

Няўжо тут не знойдзецца дужага немца,
Каб з волатам нашым мог сілай памерацца?

Выходзіць немец-асілак вялізнага росту і перамагае некалькіх латышоў.

Нямецкі пасол

Толькі на словах вам загрудкі брацца,
А толькі Лачплесіс майстар змагацца.

Кокнесіс і правадыры

Хо! Хо!

Кангарс

Раўней сябе тут ніхто не пакажа.

Чорны Рыцар

Канешне, ў дзяржаўцы такой, як ваша.

Шум сярод воінаў.

Кангарс

Праціўніка вартага не сустракаў.

Чорны Рыцар

Ха, бо, пэўна, сустрэчы з ім не шукаў.

Лачплесіс
(б'е мячом аб падлогу)

Гэй, ты!

Спідала і Лаймдота спрабуюць яго ўтрымаць.

Кангарс

Лачплесіс выкліку не пабаіцца.

Чорны Рыцар

З роўнымі не выпадала біцца!
Што, калі выпадзе? Мо ў перапудзе
Ён уцячэ і змагацца не будзе?

Кокнесіс, астатнія правадыры і дружыны ў гневе.

Кангарс

Ты кпіш?

Чорны Рыцар

Ну што, ці прымаеш бой?
Ніхто не адважваўся біцца са мной!

Лачплесіс павольна ўстае з трона, але па знаку Спідалы зноў садзіцца.

Лаймдота

Каб гаспадар госцю крыўду чыніў?..

Чорны Рыцар

Вашых частункаў не еў я, не піў,
І не трактуйце, не ліце ялей...

Лачплесіс
(спрабуе вырвацца з рук Лаймдоты)

Пусці! Немагчыма цярпець далей!

Спідала

Кароль ты! Табе паядынкі нягожы!
Замоўкні, чужынец варожы.
Ты дзёрзкі занадта! Кароль прад табой!

Чорны Рыцар

Глядзі ты! А мне ж бо казалі — герой!..
Геройства і сіла ў пурпуру адзеты,
А тут за цябе выступаюць кабеты.

Лачплесіс скідае пурпурную мантыю, адкладвае ўбок залачоны меч-скіпетр.

Кокнесіс

Ха! Дазволь мне — на месцы нахабу заб'ю —
За гонар свайго ўладара пастаю.

Шум зноў і зноў паўтараецца; неспакой людзей нарастае.

Чорны Рыцар

Ты жар заграбаеш чужою рукой.
З усімі я ўпраўлюся сам, не толькі з табой.

Шум узмацняецца, даходзіць да крайнасці; усе ўстаюць, крычаць.

Людзі

Адпомсці! Забі, як сабаку!
Ён бэсціць народ! Адпомсці!

Лачплесіс вырываецца з рук Лаймдоты і выходзіць на сярэдзіну памяшкання, тужэй зацягвае пояс; Спідала заступае яму дарогу.

Кангарс

Дарогу! Месца! Дайце праходу!
Герой не дапусціць ганьбы народу.
Ад бітвы ўцякаў, ды цяпер не сцярпеў,
Нарэшце адвагай былою ўскіпеў.

Кокнесіс

(Кангарсу)

Маўчы!

Лачплесіс

Хо-хо! Ану, выходзь!

Спідала

Лачплесіс, стой!
Ці варты цябе праціўнік твой?

Лачплесіс

Хто ты?

Чорны Рыцар

Я татарын, жыву з вайны.
Свет топчуць мае табуны,
Цябе, латышоў затапчу, задушу
І ў Замку Святла святло патушу.
(Падымае залаты меч.)

Агульнае хваляванне.

Далёкія галасы

А долечка горка-я!

Лачплесіс

Вось сіла апошняя цемры пякельнай.
Дай меч! Адступаць перад ёю нам нельга!
Я думаў, што ўсё зрабіў. Спакой —
Гэта смерць. Выходжу на бой!

Спідала

Тут пастка! Пастой! Смерць прынёс
Сляпец. Вяшчае твой лёс:
Стары з залатым мячом —
З табою, з народам змагаецца злом!

Далёкія галасы
(бліжэй)

А долечка горка-я!

Чорны Рыцар

(Спідале)

Цяпер не ўратуеш яго нічым,
Ад лёсу ўжо вам абаім не ўцячы.

Спідала

І лёс, і цябе я сама сакрушу
І Лачплесісу ўмацую душу.

Чорны Рыцар

Бяссільная ты супраць лёсу і зла.

Спідала

Я ўсё яшчэ ясная Спідала!
(Лачплесісу)
Узвысься, Лачплесіс, над гэтым.
Твой подзвіг не ў бойках пустых.
Вышэйшы твой подзвіг —
Жыццё для народа, не смерць!
Падступны наш вораг зброяй трасе —
Пагібель твая няволю народу нясе,
Пастой! Бо загінеш — загінем усе.
Будзь моцны, умей, калі трэба, стрымацца,
Няма чаго марна ў высі ўзвівацца!
Бо самы слабы там пераможа,
Дзе ты загінеш без сэнсу й нягожа.

Кангарс

Калі твой гнеў супроць зла патух,
Выпасвай авечак сваіх, пастух,
З каханкай. Без правадыра
Не доўга забавіцца гэта нара.

Шум, адабрэнне.

Спідала

А, здраднік! Свой план ты сказаў,
На гібель героя пазваў.
Памры ж!

Кокнесіс

Не пэцкай мяча крывёю сабакі,
Сабаку сабачая смерць ад палкі!
(Забівае Кангарса і выцірае дубіну.)

Кангарс

(паміраючы)

Я вечны! Пакіну вам чорныя чары зла!
Не скора настане твой час, Спідала!
(Плюе на падлогу.)

Нехта з правадыроў злізвае плявок, убіраючы ў сябе такім чынам вядзьмарскую сілу Кангарса.

Правадыры

Вой, гора! Герой забіты, а вораг жывы!..

Лачплесіс

Шкада вам сабачае галавы?

Спідала

Ён здраднік, ён подла да гневу цябе давёў!

Лачплесіс

Я сам яго, Спідала, закалоў,
А ты на дарозе маёй стаіш,
Баішся, што я загіну ў баі.
Я раз паміраў, а мэта была далёка;
Не страшная смерць; а памерці нялёгка,
Калі не закончана справа твая.
Ды, пэўна, такі ўжо мой лёс, і я
Насустрач яму пайду.

Спідала

Удасканальвайся ўвысь і пераможаш лёс.

Лачплесіс

У дасканаласці цэльнасць мая загіне.
Ты клікала ў вечнасць мяне і — зламала.
Паспела ядро, ў шкарлупе яму месца мала,
І трэснуў панцыр надзейны.

Сумненне ў душы, не веру ў сябе.
Хачу барацьбы і выпрабавання,
Каб веру здабыць
і цэльнасць пацвердзіць сваю,
Ты мне загадала з немцамі біцца —
Чаму ж не цяпер?

Спідала

Той бой быў патрэбны, бо вёў да мэты,
А гэты — пусты, у ім памрэш ты!

Лачплесіс

Што лёсам назначана, выканаць мушу:
Наперад пайду, не збочу, не здраджу, не схлушу.
У першай бітве загінула цэлая раць —
Цяпер жа мне аднаму паміраць.

Спідала

Ты даражэй за многіх... за ўсіх!

Лачплесіс

«За ўсіх даражэй», так скажа кожны;
Хай сам я дужы, народ — найдужэй,
Бо непераможны!

Спідала

Не, не!

Лачплесіс

Бяссмерце народа адвеку жыве,
Каштоўней яно за жыццё героя.
Памру — нашчадкі закончаць маю барацьбу.

Спідала

Памрэш ты — загіне і Латвія!

Лачплесіс

Загіне айчына, дык, значыць, сілы замала
Скапіла яна і не ўстаяла.

Ці можа яна залежаць ад лёсу майго?
Ці ж вечна мне жыць
на мілай латышскай зямлі?
Зазнае яна і свае ліхія гадзіны.
Дык будзь ёй апорай, народ мой вядзі,
Ты мудрая, моцная — у будучыню глядзі.

Спідала

Гляджу я; стагоддзямі будзе тваё імя
Удзячны народ шанаваць,
І справядлівай дарогай героі пойдуць
Без хітрых блуканняў розуму й сэрца,
Гледзячы ў будучыню, і яны
Не будуць пакутнікамі адзіноты,
Ім сілы дабавіць родны народ,
І вузкія сцены адной дзяржавы
Іх не замкнуць. Бо народы ўсе разам
Падымуцца ў бітву з сіламі пекла,
І пераможаны будзе Чорны Сляпец!

Лачплесіс

Хо-хо! Мы пераможам! Хо-хо!

Далёкія галасы
(разам са стогнам Даўгавы, яшчэ бліжэй)

А долечка горка-я!

Лаймдота
(якая была самлела, ачуняла і ўмольна прыпадае да ног Лачплесіса)

Не трэба змагацца! Што будзе са мною?

Лачплесіс

Лаймдота, ты даравана мне шчасцем —
Табе пакідаю сэрца.
Спідала, будзь ёй аслонай, краінай кіруй.
Табе — пакідаю свой дух і душу.

Спідала

Навошта мне ўлада? Як жыць без цябе?
Навошта зямля, калі я адраклася ад неба!
І не змяніліся мы, і не зрасліся.
А лёсам адзіным і сілай адзінай
Можам з табою мы свет пакарыць!

Галасы

(стогн нарастае)

А долечка горка-я!
А долечка горка-я!

Лачплесіс

(свабодна, зычна)

Годзе стагнаць! Гэй! Гэй!
Ва мне свабода, цэльнасць і рух.
Зноў умацаваны мой дух!
Гэй! Выходзь, сляпы, на бой!
Выходзь, памерайся са мной!

Чорны Рыцар

Ідзі памірай!
Цемра засцеле ваш зямны рай!

Галасы

Бяссілле зламае сілу,
І сыдзеш ты сам у магілу!
А долечка горка-я!

Лаймдота

(тужлівая, прыгнечаная)

Знясілена я... Ты быў сілай маёй!
Ты сэрца маё ажывіў у грудзях,
Заўсёды яно азарала твой шлях.
Табе памагу я, каханы:
Прадказана, што на вачах маіх
Памрэш ты. Заплюшчу я іх —
Не будзеш нікім ты зламаны.

Ідзі, мой герой!
І смерць не разлучыць мяне з табой!
(Абдымае яго, пасля апускаецца на зямлю каля трона, хавае твар у падушку.)

Чорны Рыцар

Ха-ха-ха!

Галасы
(зусім блізка)

А долечка горка-я!

Пачынаецца паядынак Лачплесіса і Чорнага Рыцара; Лачплесіс рассякае шчыт працiўніка; усе крычаць; Лаймдота ўстае, але не глядзіць на паядынак. Чорны Рыцар адсякае вуха Лачплесісу; крыкі гледачоў.

Лачплесіс

Ключ да Замка Святла! Хутчэй ключ!
(Бярэ ключ з залатой падушкі; ключ заржавеў, не блішчыць.)
Ключ заржавеў, не гарыць...
Няўжо я не буду жыць?..
Сілы няма ўжо расці,
Долі ж народа — цвісці!

Чорны Рыцар перасякае ключ, які падае на зямлю і ярка палае.

Спідала

Спідалы промень, гары!
Сілу ў яго адбяры!
Меч, ад алмаза адскоч!
(Становіцца перад Лачплесісам.)

Чорны Рыцар замахваецца мячом, але не можа абрушыць удар. Крыкі народа.

Лаймдота
(спалохана паварочваецца, ускрыквае)

О Лачплесіс,— о злая скруха!
Пакуты стрываць не магу!

Спідала паварочваецца на крык Лаймдоты, апускаючы руку з алмазам.

Чорны Рыцар
(налаўчыўшыся, адсякае Лачплесісу другое вуха)

Адрубаў і другое вуха!
Цяпер — перамагу!

Лачплесіс моцна абхоплівае Рыцара; у зацятай барацьбе абодва падаюць уніз са стромы.

Спідала

Не закончаны бой, быць барацьбе!
Лачплесіс, на дапамогу спяшаю к табе!
(Кідаецца за Лачплесісам.)

Галасы

А долечка горка-я!

Заслона

1903—1904

ЛІТОЎСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Утворанае ў сярэдзіне XIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (скарочана — ВКЛ; першая сталіца яго — беларускі Навагрудак) стала агульнай дзяржавай для некалькіх народаў, у першую чаргу — для беларусаў і літоўцаў (саманазва — летувяй). Таму пачаткі беларуска-літоўскіх культурных узаемасувязей трэба шукаць у ВКЛ: ва ўзаемаабмене творамі вуснай народнай творчасці, моўных узаемаўплывах, уздзеянні выданняў Францішка Скарыны (асобныя з іх друкаваліся ў Вільні ў 1522—1525 гг.) на з'яўленне «Катэхізіса» М. Мажвідаса (1547) — першай кнігі на літоўскай мове і інш. Як вядома, дзяржаўнай мовай ВКЛ была беларуская, і гэта таксама прадвызначала многае ў кантактах двух народаў. На гэтай мове вялося справаводства (што зафіксавана ў шасцісоттомнай «Метрыцы ВКЛ» — зборы матэрыялаў велікакняскай канцылярыі ВКЛ), выдаваліся законы, напісаны адзін з першых у Еўропе звод законаў («Статут Вялікага княства Літоўскага», 1529, 1566, 1588) і г. д. Для развіцця беларускай асветы, навукі і культуры вялікае значэнне меў адзін са старэйшых у Еўропе Віленскі універсітэт (1570 — 1832) і Віленская брацкая друкарня (XVI—XVIII стст.). Ва універсітэце, значную частку студэнтаў і выкладчыкаў якога складалі выхадцы з беларускіх і літоўскіх этнічных зямель (так, у апошнія гады яго існавання з 47 прафесараў 36 былі ўраджэнцамі Беларусі і Літвы), закладваліся асновы беларусазнаўства як навукі (А. Каяловіч, М. Бабровскі, І. Даніловіч і інш.). Многія яго выпускнікі ўнеслі значны ўклад у беларускую і сусветную навуку і культуру (Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч, Юльюш Славацкі, Юзаф Крашэўскі, Ігнат Дамейка, Іван Даніловіч і інш.). Што да Віленскай брацкай друкарні, якая з'яўлялася выдавецкім прадпрыемствам праваслаўнай царквы ВКЛ і яшчэ ў 1589 г. атрымала ад

караля Жыгімонта III Вазы прывілей на друкаванне розных кніг «па грэцку, славянску, руску і польску», то яна таксама нямала прычынілася да развіцця духоўнасці і культуры сярод беларускага і ўвогуле ўсяго праваслаўнага ўсходнеславянскага насельніцтва. Тут выдаваліся тэксты Святога Пісання, палемічныя трактаты, богаслужэбнікі, школьныя падручнікі. У 1589—1610 гг. тут выдадзены творы Мялеція Сматрыцкага, Стафана і Лаўрэнція Зізаніяў.

Гістарычна склалася так, што літаратура на літоўскай мове ўзнікла і да XIX ст. існавала найперш на тэрыторыі Усходняй Прусіі (там жа выйшаў і «Катэхізіс» Мажвідаса, і паэма Крысціёнаса Данелайціса «Чатыры пары года»). У XIX ст. сітуацыя мяняецца. Цэнтр літоўскага нацыянальнага адраджэння паступова перамяшчаецца на Віленшчыну і Ковеншчыну, дзе здаўна (асабліва на Віленшчыне) прысутнічала магутная славянская культура, а Вільня з часу яе заснавання і да 1939 г. была адным з цэнтраў беларускай палітыкі, навукі, культуры. Пачынаюцца непасрэдныя літоўска-славянскія літаратурныя кантакты. Так, у 1850-х гг. у віленскім культурна-асветным гуртку Адама Кіркора акрамя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Вінцэся Каратынскага і іншых удзельнічаў і літоўскі пісьменнік Мікалоюс Акялайціс. Менавіта ён адным з першых станоўча адгукнуўся на беларускі пераклад паэмы Міцкевіча «Пан Тадэвуш», выкананы Дунінам-Марцінкевічам (1859). Ён жа пераклаў з беларускай мовы на літоўскую ананімную антыцарскую «Гутарку старога дзеда» (1861). Асабліва ажывіліся беларуска-літоўскія літаратурныя стасункі з пачаткам XX ст., дакладней — пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. Шматнацыянальная і шматкультурная Вільня становіцца асяродкам не толькі польскай, рускай, літоўскай культур Паўночна-Заходняга краю Расіі, але і беларускай. Тут выдаюцца газеты «Наша Доля» (1906) і «Наша Ніва» (1906—1915), працуюць беларускія выдавецтвы, ствараецца Беларускі музей (з 1921 г.— імя І. Луцкевіча) і інш. Менавіта ў Вільні ўзнікаюць асабістыя кантакты паміж Янкам Купалам і літоўскімі пісьменнікамі Людасам Гіра, Лаздзіну Пяледа, мастаком Мікалоюсам Чурлёнісам. Вільня пазнаёміла (а затым і змацавала шлюбам) Вацлава Ластоўскага і адну з дзвюх сясцёр (Марыю), што друкаваліся пад агульным псеўданімам Лаздзіну Пяледа.

Надзвычай вялікую ролю адыграла Вільня ў развіцці ўласнабеларускай літаратуры і мацаванні беларуска-літоўскіх літаратурных узаемасувязей ва ўмовах існавання заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы (1921—1939). Польскія ўлады ў Заходняй Беларусі актыўна супрацьдзейнічалі развіццю як беларускай, так і літоўскай нацыянальных культур і літаратур. У той жа час і беларусы, і літоўцы, падтрымліваючы адны другіх, дасягнулі немалых поспехаў на культурнай ніве. Пэўную ролю ў станаўленні беларускай культуры і развіцці беларуска-літоўскіх культурных сувязей у міжваенны час адыграў і Каўнас, які ў той час быў сталіцай незалежнай дзяржавы Літвы. У прыватнасці, там на беларускай мове выходзіў часопіс «Крывіч» (1923—1927), убачылі свет кнігі Ластоўскага «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (1924), «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» (1926) і інш. У гэты ж час у БССР знайшлі прытулак некаторыя літоўскія пралетарскія пісьменнікі (Ф. Вайшнорас, Л. Мяркітэ, В. Скарджус і інш.). У Мінску на літоўскай мове выдаваліся іх кнігі, выходзілі перыядычныя выданні, існавала літоўская секцыя Саюза пісьменнікаў БССР. У 1933—1934 гг. у Беларусі працавалі 12 літоўскіх школ. У Інстытуце беларускай культуры была заснавана кафедра гісторыі Літвы, якая затым, пасля адкрыцця Акадэміі навук БССР, стала асобным літоўскім сектарам акадэміі (1929). З часам быў арганізаваны Інстытут літоўскай і латышскай культур (1933).

Як вядома, 17 верасня 1939 г. Вільня, як і ўся Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна, увайшла ў склад СССР. Беларускі і ўкраінскі народы былі ўз'яднаны. На кароткі час Вільня стала цэнтрам Віленскай вобласці БССР, у ёй пачалі ствараца беларускія адміністрацыйныя і партыйныя органы, пачала выдавацца абласная газета «Віленская праўда» (адным з яе супрацоўнікаў быў Максім Танк) і г. д. Аднак 10 кастрычніка 1939 г., паводле савецка-літоўскага дагавора, Вільня і Віленскі край былі перададзены Літве.

Працэс і характар развіцця беларуска-літоўскіх літаратурных сувязей добра можа ілюстраваць асоба і творчасць Максіма Танка, жыццё якога да 1939 г. уключна было цесна звязана з Вільняй. Тут ён вучыўся ў гімназіі, тут у шэрагах камсамола, а затым і КПЗБ удзельнічаў у падпольнай

рэвалюцыйнай дзейнасці, сядзеў у турме ў Лукішках, напісаў першыя свае творы. У Вільні Максім Танк упершыню сустрэўся з літоўскай культурай, пазнаёміўся і пасябраваў з некаторымі яе дзеячамі — Ёнасам Каросасам, Альбінасам Жукаўскасам, Онай Міцюта і інш. Пра гэта, у прыватнасці, сведчаць дзённікі паэта тых часоў «Лісткі календара». У іх мы знаходзім водгукі пра літоўскага паэта-рэвалюцыянера Ёзаса Кокштыса (20.03.1938), пра малюнкі Чурлёніса (27.08.1937), словы ўдзячнасці, адрасаваныя літоўскаму часопісу «Пювіс», які адзін са сваіх нумароў прысвяціў заходнебеларускай літаратуры (26.06.1938), развагі пра літоўскую літаратуру, у якой — у параўнанні з тагачаснай беларускай — на першае месца, абагнаўшы паэзію, выйшла проза (6.07.1939), пра ўзаемаўплыў беларускай і літоўскай моў (12.07.1939) і многае іншае. Не парываліся сувязі Максіма Танка з літоўскай літаратурай і ў час Вялікай Айчыннай вайны, і ў пасляваенны час. Пясняр Нарачы не раз прыязджаў у горад сваёй маладосці — Вільнюс (ранейшую Вільню), удзельнічаў у розных дэкадах і тыднях беларускай і літоўскай літаратур, якія папераменна адбываліся то ў Літве, то ў Беларусі, прысвячаў братняй Літве асобныя творы («Вільнюс», «Перад Чурлёнісам», «Готыка Святой Ганны», «Пятрасу Цвірку», «Э. Межалайціс», «Маці Пірчупіса» і інш.), перакладаў вершы літоўскіх паэтаў (А. Венцлавы, Ю. Марцінкявічуса, Э. Матузявічуса, А. Жукаўскаса, В. Рэймерыса і інш.). У сваю чаргу пра Максіма Танка не раз пісаў літоўскі друк, па-літоўску ў пасляваенным Вільнюсе выйшлі яго кнігі «След бліскавіцы» (1960), «Лісткі календара» (1979), «Глыток вады» (1986) і інш.

Увогуле ж, у XX ст. беларуска-літоўскія літаратурныя сувязі, найперш мастацкі ўзаемапераклад, дасягнулі значных поспехаў. Толькі ў 1945—1984 гг. на літоўскай мове было выдадзена 45 кніг беларускіх пісьменнікаў і каля 30 кніг літоўскіх літаратараў — у перакладзе на беларускую мову. Літоўцы і беларусы выдалі на сваіх мовах адпаведна беларускія і літоўскія анталогіі паэзіі і прозы, многія раманы, аповесці, зборнікі паэзіі літаратур-суседзяў, Так, на літоўскай мове выйшлі кнігі Янкі Купалы «Не жалейка стогне» (1957), Змітрака Бядулі «Сярэбраная табакерка» (1956), Янкі Брыля «Зялёная школа» (1963), В. Быкава

«Трэцяя ракета» (1964), І. Шамякіна «Сэрца на далоні» (1966), У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (1994), В. Коўтун «Крыж міласэрнасці» (1997) і інш. Асобнымі выданнямі выходзілі творы літоўскіх пісьменнікаў на беларускай мове — К. Данелайціса, А. Венцлавы, Ю. Балтушыса, Э. Межалайціса, А. Малдоніса, Э. Балёнене і інш.

У перыяд дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь і Літвы з дапамогай таварыстваў нацыянальных дыяспар, пасольстваў, розных установаў культуры ўзнікаюць новыя формы беларуска-літоўскіх культурных сувязей. У сучаснай Беларусі пражывае каля 6,5 тысячы літоўцаў, працуюць 2 літоўскія школы (у Астравецкім і Воранаўскім раёнах). Нацыянальна-культурнае жыццё літоўцаў забяспечвае «Беларускае таварыства літоўцаў», якое выдае бюлетэнь «Наша слова». У курс школьнага літаратурнага навучання сучаснай Беларусі ўведзена вывучэнне творчасці Данелайціса, яго славутай паэмы «Чатыры пары года». У сваю чаргу беларусы Літвы (а іх налічваецца звыш 40 тысяч, жывуць яны, як і даўней, у асноўным на Віленшчыне) маюць 19 сваіх нацыянальна-культурных суполак, у тым ліку Таварыства беларускай культуры, Таварыства беларускай мовы. У Вільнюсе працуе беларуская гімназія імя Ф. Скарыны, у мясцовым педінстытуце існуюць кафедра і аддзяленне беларусістыкі. Выходзяць кнігі на беларускай мове, выдаецца беларускамоўная перыёдыка (у прыватнасці газета «Рунь»). Наладжваюцца сувязі паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Беларусі і Літвы. У музеях, архіўных сховішчах, бібліятэках Вільнюса, Каўнаса і некаторых іншых літоўскіх гарадоў захоўваецца нямала матэрыялаў, што маюць прамое дачыненне да беларускай гісторыі, культуры і літаратуры. У сваю чаргу вучоным, дзеячам культуры Літвы ёсць чым заняцца ў музеях і архівах Беларусі.

Беларуска-літоўскія культурныя сувязі сталі прадметам даследавання асобных беларускіх і літоўскіх вучоных. Сярод іх найперш варта назваць Адама Мальдзіса і Альму Лапінскене, сааўтараў кнігі «Перазовы сяброўскіх галасоў» (Мінск, 1988).

КРЫСЦІЁНАС ДАНЕЛАЙЦІС
(1714—1780)

Пачынальнік літоўскай літаратуры Крысціёнас Данелайціс нарадзіўся ва Усходняй Прусіі, дзе здаўна жыла частка літоўскага народа, этнічна блізкага прусам. Выхадцу з сялянскай сям'і, яму пашчасціла скончыць школу для бедных, а пасля — і Кёнігсбергскі (цяпер Калінінградскі) універсітэт. Папрацаваў тры гады настаўнікам, затым усё сваё жыццё звязаў са святарствам: у 1743 г. стаў пастарам у мястэчку Тальмінкеміс (цяпер — Чыстыя Пруды Калінінградскай вобласці). Там яго як прыходскага пастара і пахавалі ў мясцовай царкве — кірсе. Зараз у ёй знаходзіцца музей вялікага літоўскага паэта.

Творчая спадчына Данелайціса, як і большасці тых, хто стаяў ля пачатку развіцця нацыянальных літаратур, адносна нешматлікая: шэсць баек, два фрагменты вершаваных аповедаў і напісаная ў 1765—1775 гг. паэма «Чатыры пары года». Твор «Чатыры пары года» — залатая спадчына літоўскага народа, у літоўскай літаратуры ён займае такое ж месца, як у нашай літаратуры «Новая зямля» Якуба Коласа.

У паэме аўтар выступае як святар і асветнік, як патрыёт з моцным нацыянальным самаўсведамленнем, як народны заступнік, які стаіць яўна на баку бураса — прыгоннага селяніна-літоўца, а не прыгонніка-немца. Пра маральна-этычную пазіцыю аўтара яскрава сведчаць наступныя радкі паэмы:

Ах, дарагія браточкі, літоўцы, не трэба
Вам, як бязбожнікі, жыць, што асляплі без веры...
Вас, як надзейны слуга, павучаў я заўсёды,
Мовай нямецкаю з вамі не зюкаў ніколі,
А па-мужыцку, як сябар ваш верны, ад сэрца
Тое казаў вам у вочы, што рупіла вельмі сказаць мне.

У кожнай частцы паэмы знаходзім разгорнутыя апісанні флоры і фауны Прыбалтыкі. Прырода падаецца ва ўсе поры года, у розны час сутак, у рознае надвор'е (сонечны вясновы дзень, летняя спёка, восеньская дажджэвіца, марозны зімовы адвячорак і г. д.). Замілаванасць вясковым пейзажам, яго ўзнёслае паэтычнае

адлюстраванне набліжаюць паэму да антычных твораў з іхнімі пастаральнымі сюжэтамі, ідэалізацыяй жыцця пастушкоў. У творы таксама паказаны яскравыя постаці літоўскіх сялян (Прычкус, Дочыс, Энскіс і інш.), даюцца малюнкі цяжкай, але плённай сялянскай працы, карціны народнага побыту, звычаяў (ворыва, жніво, касьба, попрадкі, вяселле). Пры гэтым аўтар падкрэслівае, што

Дужыя рукі, якія ахвотна за працу бяруцца,—
Найдаражэйшы з дароў, што нам Богам пасланы.

Такім чынам, твор Данелайціса мае і прыродазнаўчую, і народазнаўчую скіраванасць. Паэма сапраўды прысвечана менавіта літоўскім вяскоўцам, бурасам, іх працы, святам і прысвяткам, рэдкім хвілінам адпачынку, іх узаемаадносінам, думам і марам. Пры гэтым пісьменнік паказвае вострыя сацыяльныя супярэчнасці часу, асуджае прыгон як эксплуататарскую сістэму. Сюжэт твора залежыць ад прыроднага гадавога колазвароту, што прадвызначыла цыклічнасць яго кампазіцыі. Адначасовы паказ прыроды і жыцця чалавека сведчыць пра тое, што аўтар прытрымліваецца прынцыпу паэтычнага паралелізму.

Крысціёнас Данелайціс як адукаваны чалавек добра ведаў латынь, на якой у той час у Заходняй Еўропе пісалі не толькі царкоўныя, але і літаратурна-мастацкія творы. Жывучы ў Прусіі, ён выдатна валодаў дзяржаўнай нямецкай мовай, на якой стваралісяа багатая літаратура, філасофія. Несумненна, ён мог бы заняць пэўнае месца і ў тагачаснай нямецкай літаратуры, меў бы пры гэтым пэўныя выгоды, належную славу. Аднак, нягледзячы ні на што, паэт-святар не зрабіў гэтага. На самым пачатку станаўлення нацыянальнай самасвядомасці, у перыяд жорсткага анямечвання літоўцаў ён звярнуўся да літаратурна неапрацаванай роднай літоўскай мовы — мовы прылюдна зганьбаванай, пакінутай уласнай інтэлігенцыяй, на якой і друку ў той час не было (упершыню паэма ўбачыла свет толькі ў 1818 г.). І — стаў класікам яшчэ адной еўрапейскай, а менавіта літоўскай, літаратуры, гонарам, славай роднага яму народа, у многім вызначыўшы шляхі літоўскай нацыянальнай літаратуры.

У XIX—XX стст. паэма «Чатыры пары года» перакладалася на шэраг замежных моў. Па-руску асобныя фрагменты яе з'явіліся яшчэ ў 1916 г. ва ўзнаўленні В. Іванава. Цалкам на рускую мову паэму пераклаў Д. Бродскі (з 1946 г. яна вытрымала шмат выданняў). Па-беларуску яе ў 1961 г. выдатна перастварыў вядомы паэт і перакладчык, знаўца літоўскай мовы Аляксей Зарыцкі.

У аснову гэтай публікацыі пакладзена выданне: *Данелайціс Крысціёнас. Чатыры пары года. Выд. 2-е, дапрацаванае. Мінск: Маст. літ., 1983* (пераклад Аляксея Зарыцкага).

Чатыры пары года

Паэма

(Скарочана)

РАДАСЦІ ВЯСНЫ

Зноў узнімаецца сонейка вышай і свет абуджае,
Весела нішчыць усё, што зіма збудавала.
Гінуць сумёты — нястомная праца мяцеліц і сцюжы.
Пеніцца снег, на нішто пераводзіцца ўсюды,
І ажываюць палі ад павеваў ласкавага ветру.
Просіць лагодна ён кожную траўку ўваскрэснуць.
Лес прачынаецца, шумна выпростваюць дрэвы галіны.
Снежную коўдру скідаюць у полі лагчыны і ўзгоркі.
Тое, што з плачам увосень у багнах застыла,
Тое, што ўзімку паснула ў азёрах і рэчках пад лёдам
Ці пад карэннем у норцы зіму зімавала,—
Сёння вітае гурмою вясновае шчодрае сонца.

Выбраўся з норкі шашок, пацукі з-пад памосця вылазяць.
Мышы, краты, разам з імі вароны і совы
Хваляць і хваляць усе цеплыню веснавую.
Мухі з'явіліся зноў, камары, незлічоныя блохі,
Зразу кусаць пачалі ўсіх яны без разбору,
Джаляць вяльможнага пана яны з селянінам нароўні.
Матка пчаліная дзетак сваіх пабудзіла.
Шле іх на працу яна, хай прыносяць узятак салодкі.
Дружна з ляткоў працавітыя выпаўзлі пчолы,
Кветак шукаць паляцелі,
зайграўшы на ўласных свісцёлках.
Ніткі свае па кутках павукі ўжо сучыць пачынаюць,
Моўчкі рыхтуюць яны паляўнічыя згубныя сеткі.

Воўк і мядзведзь разгуляліся весела ў пушчы,
Там, каля ўзлескаў, блукаюць, шукаюць здабычу.

Толькі здзіўляе: ніводны з усіх, хто вярнуўся,
Не засмучоны зусім і не хоча ўздыхаць ён і плакаць.
Не, не журыцца вярнуліся ўсе, весяліцца ўсе хочуць,
Знікла ж усё, што стварыла зімовая сцюжа,
І маладая вясна на палях і лугах гаспадарыць.
Загаманіла птушынае звонкае царства,
Спевы гучаць над вясновай зямлёю няспынна.
Хто заліхвацка і зычна пяе, хто пяшчотна і ціха,
Хто да нябёс узнімаецца з песняй вясёлай,
Хто і на хісткай галінцы Ўсявышняга славіць,
Толькі не скардзіцца з іх ні адзін на мізэрную ежу.
Гэты дамоў прыляцеў у адзенні зусім абшарпаным.
А вось другі,
той вярнуўся з чубочкам ды ў латках пярэстых.
Пуста яшчэ на палетках, удосыць ніяк не пад'есці,
Толькі не тужыць ніхто з іх, не енчыць, не стогне,
Скачуць, спяваюць, вясноваму сонейку рады.
Бусел [redacted] вандроўкі вярнуўся з суседзямі разам.
Заклекатаў гаспадарліва ён, як на дах апусціўся.
Покуль ён радасць сваю гэтак шчыра выказваў,
І гаспадыня яго прыляцела, і доўгаю дзюбай
Сябра свайго дарагога яна прывітала.
Бачаць яны, што вільчак не ў парадку — зусім абадраны.
Іхняя хата, якую паставілі толькі залетась,
Сёння буслу і буслісе здалася старою.
Колькі саломы і дошак вятры-ліхадзеі
З гэтай страхі пазрывалі й кудысьці занеслі.
Перакасіцца паспелі і дзверы, і вокны.
Хата счарнела, яна пахіліцца паспела за зіму.
Без перадыху, гарліва з бусліхаю бусел
Зразу бяруцца за працу, гняздо папраўляючы ўмела.
Вось абярэмачак пруцця нясе заклапочаны бусел.
Шчыліны жонка яго канапаціць тым часам.
Адпрацаваўшы свой час і закончыўшы справу,
Разам яны на абед паляцелі к балоту,
Некалькі жабак жыўцом праглынуўшы, з бусліхаю бусел

Богу сардэчна падзяку вялікую ўзнеслі.
Людзі мізэрныя, трэба вам сціпласці ў іх павучыцца,—
Смачна пад'еўшы, вы не забывайце пра Бога.

Звонкія спевы гучалі і ў лесе, і ў полі.
Водгалас іхні звінеў над вясновай зямлёю.
Хор галасоў незлічоных Тварца Ўсёмагутнага славіў.
Ластаўкі ў неба ўзляталі на крылах нястомных
І ўвышыні, быццам кулі, насіліся хутка.
Потым, закончыўшы просты сняданак птушыны,
Побач садзіліся, каб адпачыць і пазюкаць.
Лёгка жаўрук да праменных нябёс уздымаўся,
Часам здавалася — плач адчуваецца ў спеве ягоным.
Гэта не плач, гэта слабая птушка спявае
Нам пра вялікую Богаву сілу, што ў голасе кволым
Так цудадзейна звініць, так магутна гучыць, несціхана.
Чуючы спевы, цырыкнуў стары верабей вераб'ісе:
«Славіць як быццам не горш наша племя вялікага Бога!»

А салавей, у гушчарні схаваўшыся хітра, чакае,
Покуль усе праспяваюць свае найзванчэйшыя песні.
Позна таму салавейка спяваць пачынае.
Ён, як наваліцца ноч і заснуць усе моцна,
Песню заводзіць у змроку сваю, выхваляючы Бога,
І на дасвецці ён будзіць нас песняй цудоўнай, натхнёнай.
Як нашы сэрцы ён радуе спевам павабным.
Божа наш слаўны, якая суладнасць на свеце пануе!
Часам зімовым, калі не вылазім мы з хаты
І храпака задаём бесклапотна на печы,
Мілая птушка, далёка ад нас ты такою парою.
Ты ўжо таішся дзе-небудзь у схованi ціхай.
Мух і камарыкаў смачных у сне толькі ловіш.
Ды як вясновае сонца над намі заззяе
І рыхтавацца пачнём мы да працы на гонях,
Ты прылятаеш да нас са сваёю чароўнай жалейкай,
Песні спяваць зноў на сто галасоў і ладоў пачынаеш,
Радасці многа прыносіш і робіш нам працу лягчэйшай.
Толькі скажы нам, чаму ты так любіш хавацца
І пачынаеш свой спеў на змярканні ці ўночы?

З казкай сваёю навошта ў глухія ўцякаеш куточкі?
Зачараваны ўвесь свет — і мужык, і памешчык,
І пасівелы дзядок, і дзіця — шчырай песняй тваёю.
Талент твой кожны хваліць пачынае, як толькі пачуе
Спевы твае: бо ўжо гэтак ніхто не спяе анікалі.
Поруч [redacted] табою нічога не варты ўсе нашы музыкі.
Скрыпкі, цымбалы і флейты нішто ў параўнанні з табою.
Голасам звонкім, салодкім ты гэтак прыгожа выводзіш.
«Пугаю, Юргіс, паляскай, і конік хутчэй будзе бегчы!» [...]

Ды аніхто не паскардзіўся з іх на нястачы.
Больш, чым яны, чалавеча, выгод з Божай ласкі ты маеш,
Ды ўсё бурчыш, як даводзіцца ў год неўрадлівы
Кашы гарохавай рэшткі з гаршчочка выскрэбваць.

Шчэбет птушыны, птушыныя спевы гучалі нязмоўчна.
Раптам з'явіўся, клякочучы грозна, арол перад птаствам.
«Цыц,— ён прамовіў уголас,— канчайце гамонку пустую,
Слухайце тое з увагай, што мы вам раскажам».
Заклік арліны пачуўшы, зляцеліся тысячы птушак
З розных бакоў і куткоў, каб цару паказацца на вочы.
«Вось, уладар, твае слугі, скажы нам — чаго ты жадаеш?»
«Мы,— адгукнуўся арол,— вельмі прагнем дазнацца,
Як наш народ здолеў вытрываць холад зімовы?
Кепска, напэўна, было? Можа, хто і загінуў?
Можа, шашок каго з'еў ці раздзерла сава кіпцюрамі?
Можа, задзёўб каршачок ці загрызла куніца?
Можа, каго ліхадзей-чалавек дзесь у пушчы застрэліў,
Можа, прынадзіў ён хітра няшчасную птушку,
Каб на патэльні засмажыць, а потым і з'есці».

Покуль арол пра ўсё хітра даведваўся, бусел,
Важна надзьмуўшыся, быццам той шляхціц вяльможны,
Дзюбай ківаючы доўгай, звярнуўся да птаства з прамовай:
«Бог міласэрны і мудры, будуючы свет клапатліва,
Тысячы розных стварэнняў стварыў і жыццём надзяліў іх,
Кожнай істоце прызначыўшы пэўную ежу.
Дзіва сапраўднае бачым, куды мы ні глянем.
Воды Тварэц некаторым аддаў ва ўладанне.

Іншым даў крылы, каб плавалі лёгка ў паветры.
Многія птушкі ў лясах, у лістоце, хаваюцца ўмела.
Колькі над гонямі лётае іх, над лугамі!
Колькі яшчэ на дварах у людзей мітусіцца!
Кожнаму Бог міласэрны дае і прытулак і ежу.

Часам галодныя дні выпадаюць, бывае
Гэта парою дажджлівай, калі ўсё заліта вадою,
Ці той часінай, калі за грахі нас карае Ўсявышні.
Як ліхадзей-чалавек страх наводзіць сваёй стралянінай,
Губіць бязлітасна ён нашых родных заўсёды.
Ён ад бацькоў бесспагадна малых птушанят адлучае,
Гнёзды рабуе драпежна, знішчаючы нашых нашчадкаў.
Птушкам галодным, нібы дабрадзей, чалавек насыпае
Смачных зярнятак дзе-небудзь у ціхім куточку.
— Птушкі, смялей, калі ласка, частуйцеся зернем!
Толькі асмеліцца птушка дзяўбці,
ён са стрэльбы страляе.
Ці, неразумную, сеткай накрые раптоўна...

Ёсць і між птушак нягоднікі і ашуканцы,
Друга свайго забіваюць такія, абы ім пад'есці.
Коршак-разбойнік, сава, рабаўніца ліхая,
Воран яшчэ і варона ў хаўрусе з сяброўкай сарокай
Птахаў няшчасных штогоду дзесяткамі тысяч знішчаюць.
Толькі між нас не знайшлося такіх ліхадзеяў драпежных,
Як чалавек, калі ён на здабычу палюе».
Раптам сярод той размовы нядобрае штосьці адбылося,
Голасам немым так нехта крычаў, ну, нібыта тапіўся.
«Дапамажыце, ратуйце!» — благаў ён з адчаем.
Ад перапуду ўсё птаства застыла ў маўчанні.
Нават арол, цар птушыны, і той варухнуцца баяўся.
Толькі кажан з неразлучнаю шэрай савою
Моўчкі, з аглядкай, са змрочных прытулкаў вылазяць,
Ведаць карціць ім, што робіцца тут па суседству.

Пан у багатым убранні,— пра гэта расказваць мне сорам,—
Толькі падумайце самі, шаноўны і яснавяльможны,
Добра пад'еўшы ды выпіўшы розных рэйнвейнаў заморскіх,
З лаянкай бруднай і стогнам качаўся ў пакоі.
Гэтак ён лаяў і чорта і чортава кодла,

Гэткія брыдкія словы ён з енкам выкрыкваў,
Што напужалася пекла й разбегліся чэрці,
І скалануліся нават пякельныя нетры ад жаху.
Ведаем мы, як паны гнюсна лаяцца ўмеюць.
Шкода, што вучацца бурасы лаянцы брыдкай у панства.

«Чым захварэў ты, нябога? — звярнуўся да пана
Шчыры кажан клапатліва, набраўшыся смеласці раптам.—
Мусіць, ты з'еў смажаніны зашмат і піражных?
Можа, вантробы палезлі з таўшчэзнага бруха?
Дзядзька твой летась таксама нажэрся страшэнна
Разам з сябрамі сваімі, і так жываты ім расперла,
Што давялося ім лопнуць —
жахліваю смерцю памерці».
Сэрца пузатага вельмі кранулі кажанавы словы.
Пана расперла мацней, і пачаў тут урэзваць ён штучкі:
Некалькі пасмаў з чупрыны ён з лямантам вырваў,
Вырваў пасля палавіну сваёй барады ён.
Потым нагцямі і твар абадраў па-вар'яцку.
Гэта не ўсё, бо, шукаючы грошы свае на падлозе,
Раптам пачаў ён брыкацца і стол абярнуў з пачастункам.
Збегліся зграяй сабакі тады з усяго наваколля,
Панскія стравы — булёны й біфштэксы — паелі.
Толькі і гэта не ўсё: нож вялізны і востры схапіўшы,
Горла сабе перарэзаць наважыўся пан ашалелы.
Вельмі кажан напалохаўся, сэрца ад страху зайшлося,
Крылы бяссільна павіслі, не можа ён з месца скрануцца.
Гэта здарэнне й саву засмуціла, без сябра самотна,
Хутка яна паляцела ў свой цёмны прытулак,
Свету дагэтуль вяшчае штоночы пра тую падзею.
Толькі надвор'е благое — сава і галосіць і плача,
Горка ўздыхае: шкада ёй таго чалавека. [...]

У лахманы апранаюць сялянкі сваіх немаўлятак.
Потым, спавіўшы, кладуць іх у цёмны куточак.
Ведаем добра ж усе мы, як дзетак гадуюць сяляне.
А наша пані малое, як ляльку, ў шаўкі спавівае,
Спаць на пярыну кладзе, прасціною засланай.
Ды як прыгледзішся — панскія дзеці такія, як нашы:
Плачуць яны і забруджваюць часта пялюшкі.

Мабыць, усюды малыя растуць і гадуюцца гэтак.
Першая іхняя справа —
хварэць, моцна плакаць і енчыць.
Мусіць, ніводзін на свеце без плачу не вырас.
Кожны з нас плакаў, калі немаўляткам ляжаў у калысцы.

Скора, відаць, з дапамогаю Божаю вернецца лета,
Светлае, ветлае, цёплае, з доўгімі днямі.
Голыя плечы свае прыбірае зямля ў зеляніну,
З радасцю кожны адчуў — летні час недалёка.
Птушак чароды злятаюцца ў небе блакітным.
Лётаюць спрытна, шчабечуць і весела гэтак і звонка.
Многія птушкі ўжо яйкі паспелі пакласці.
Трошкі яшчэ пачакайце, і з'явяцца ў вас птушаняты,
Будуць пішчаць, і спакою ад іх вам не будзе.
Вырастуць, потым бацькам не падзякуюць нават.
Гэтак і з намі бывае, як з птушкамі тымі,
Бо аніхто не пражыў бестурботна на свеце.

Мы і тады, калі А і Б вымавіць добра не ўмеем,
Клопату шмат і трывогі бацькам прычыняем,
Покуль навучымся бегаць ды самі пачнём забаўляцца.
Паразумнеўшы, яшчэ й пасталеўшы з гадамі,
Мусім за працу мы брацца, кладзецца на плечы нам клопат.
Лялькі й забавы, пра вас і гамонкі няма ўжо.
Іншы настрой у цябе, калі ты ў кажушку пастуховым
Коз і свіней выганяеш, сам нават скарынкі не з'еўшы,
Ці як пад ліўнем халодным да костак прамокнеш,
Ці як находзішся ў полі за плугам у спёку,
Ды занатурацца раптам валы і — ні з месца.
Стане сумотна табе, асабліва калі ў тваёй хаце
З'явяцца лялькі жывыя адна за адною.
Будуць з-за кожнай драбніцы табе яны голаў марочыць.
Цяжка даводзіцца тым, у каго гэтых лялек багата. [...]

Мусібыць, гэтак і трэба. Пакуль мы жывыя,
Божую волю павінны выконваць няўхільна.
Ды не заўсёды пакутаваць, бывае і гэтак,
Што нагаруешся ўдосыць, а потым і радасць знаходзіш.

Пэўна, спужалася злая зіма і ўцякае.
Цёмныя ночы цяпер карацейшымі сталі.
Сонца вышэй падымаецца ў небе й зямлю саграває,
Травам угору яно памагае цягнуцца.
Скора ўжо яркія кветкі мы ўбачым на гонях.
Будзем сардэчна мы славіць вясну маладую.
Толькі вясною і працы і клопату многа.
Паншчыну трэба цяпер адрабляць і на поле спяшацца.
Шмат шчыраваць нам, пакуль умалот у засекі засыплем.
Сёння ў чаканні насеннем ляжыць ён у свірнах.
Колькі ж яшчэ гараваць, покуль кашы з гароху наварым.

У спадзяванні на Божую ласку пара нам за працу
Брацца руплівa, мае дарагія суседзі.
Вы не бянтэжцеся толькі, калі непагода пачнецца:
Весняй парою надвор'е бывае няпэўным.
Час варушыцца, бо спраў у нас вельмі багата.
Ворыва хутка пачнецца, дык сохі наладжвайце ўмела.
І баране трэба новыя зуб'і і моцныя коні.
Ведаем добра, што там, дзе валы так павольна ступаюць,
Коні бадзёра ідуць, асабліва калі іх падгоніш. [...]

Хочаш, каб ежы хапала, бярыся за працу!
Будзь працавітым, і рыжая восень аддзячыць.
Тое, што трэба, палеткам аддай — будзе шчодраю глеба,
Бо задарма не дае нам зямелька пладоў сваіх смачных.
Ведаеш добра, што толькі асот, і дзядоўнік,
Ды павітуха-травіца без нашай растуць дапамогі.
Збожжа тады толькі ўродзіць, калі яго людзі пасеюць.
Любіш удосыць ты есці і мяса і сала,
А буракі ды капусту не цэніш як трэба.
Весняй парою, спажыўшы запасы дарэшты,
Ты ўжо на паншчыну ледзьве брыдзеш у знямозе.
Сеяць спяшайся, варона, бярыся за працу заўзята:
Па-гаспадарску пасей і ячмень, і пшаніцу, і жыта
Ды не забудзься пасеяць авёс на палетку:
Сам кісялю дачакаеш, а коні — прыстойнага корму.
І на гарох табе варта палоску паболей пакінуць,
Смачны з капустаю тушанай ён і свінінай.

Ах, як багата ён хлеба за год зберагае.
І пад каноплі, я раю, хоць чвэртку палоскі адвесці.
Сорам скупіцца, згадзіцца ў тваёй гаспадарцы і гэта.
Хіба не добра вяроўку трывушчую звіць, чалавеча,
Грошы схаваць у кішэні, запас не пашкодзіць?
Лёнам засей, колькі Грыта захоча, ты з ёй не спрачайся.
Нораў жаночы такі,— дай ім лёну паболей.
Прасці жанкі нашы любяць, і ткаць ім ахвота.

Напамінаю я зноў — не спрачайся ты з жонкай.
Хіба не весела слухаць табе калаўротаў гудзенне
Часам зімовым, калі ўжо за працу садзяцца кабеты?
Хіба не люба глядзець, як увішная Грыта, раздаўшы
Пражу ткачыхам, палотны бяліць пачынае?
Потым садзіцца, каб выкраіць тое, што трэба для дома.
Выкраіць так, што абрэзкі табе на анучы пакіне.
Ах, каб рабілі ўсе нашы кабеты, як Грыта,
Столькі тады абадранцаў па нашых краях не хадзіла б.
Кожны мужык апрануўся б тады, як вяльможа,
Сесці з нямецкім асэсарам побач і ён захацеў бы.
Нават французы з яго перасталі б смяяцца. [...]

Гэта, лайдачкі, кажу я пра вас, вас хачу прысароміць.
А гаспадынь, што працуюць заўсёды старанна,
Хай не бянтэжыць нікольки маё дакаранне.
Хай будзе сорамна тым, хто гультайнічаць любіць.
Слава жанчынам, чые калаўроты працуюць няўпынна,
Праллям-майстрыхам за іх адмысловую пражу.
Слава ткачыхам усім, чые кросны грымяць напрадвесні,
Чый працавіты чаўнок аніколі не ведае стомы.
Слава ўсім нашым сяброўкам, чые, быццам снег некрануты,
Ярка бялеюць палотны на лузе пад сонцам.

Працы, цяжэйшай за гэту, таксама не трэба цурацца.
Вунь агароды зноў клопатаў вашых чакаюць.
Трэба адкласці вам прасніцы і калаўроты.
Кросны таксама пастаўце ў куток куды-небудзь.
Граблі дастаньце хутчэй, за лапаты бярыцеся дружна.
Крот ужо рые зямельку вільготную ўпарта,
Вас падганяе, жанчыны; спяшайцеся брацца за грады.

Чэрава наша заўжды патрабуе багата.
Мала яму, што знадворку яго аздабляюць адзеннем,
Хоча штодзённа яно і знутры весяліцца.
Вам, ягамосці-кабеты, паклоняцца брухі пачціва:
Вы ж галізну іх прыкрылі, зімой нарабіўшы
Новых штаноў саматканых, яны яшчэ лепей пахваляць,
Сеўшы за стол у нядзелю ў прыгожых абноўках,
Вашай гатоўлі бліны і каўбасы з падліўкаю смачнай.
Сейце ўсё тое, суседзі, што можна пасеяць,
Сейце і рэпу і моркву, пасейце і рэдзьку,
Болей садзіце капусты, цыбулю вы не забывайце.
Помніце добра заўсёды пра смачную бульбу.
Сеяць, палоць, капанічыць старайцеся ў час адпаведны,
Працай вясёлай і дружнай вясновыя дні завяршайце,
Скора вас лета да іншай работы пакліча.

ЛЕТНЯЯ ПРАЦА

«Добры дзень, белы свет, ты ўжо свята вясенняе справіў!
Добры дзень, чалавек, ты сустрэў ужо мілае лета!
Кветкамі ты любаваўся і цешыўся водарам іхнім.
Дай табе Бог надалей колькі раз і бадзёрым і дужым
Весняе свята сустрэць, пагуляць на ім добра.
Тым, хто Літву, дарагую айчыну, шануе,
Хто, па-літоўску гаворачы, ходзіць на паншчыну раннем,—
Хай дапаможа Гасподзь нават лепшай вясны дачакацца.
А за вясёлай вясной хай пашле ён вясёлае лета»,—
Так мужыкоў перад Сёмухай клікаў на паншчыну Прычкус,
Шчыра вітаючы іх, ён даваў ім парады.

«Дужыя рукі, якія ахвотна за працу бяруцца,—
Найдаражэйшы з дароў, што нам Богам пасланы.
Той, хто, стаміўшыся моцна, пасля сваёй працы
Простую ежу заўжды з асалодай з'ядае,
Потым, са шчыраю верай Богу аддаўшы падзяку,
Моцным і свежым на ложку сваім засынае,—
Лепей жыве за таго, хто ў шаўкі разадзеты,
З цяжкім уздыхам уранні бярэцца за лыжку.
Што ад таго нам, што Мікалас тоўстае бруха

Любіць сваё выстаўляць, як пузыр, надзімаецца важна.
Тужыць усё, бо махлярства вярзецца пузатаму ўсюды,
Сам, нібы Каін, баіцца ён кары нябеснай.
Толку няма ў тым,
што Дзіксас стаіць перад поўнаю скрыняй
У лахманах на каленях і скарбы свае аглядае,
Грошык узяць баючыся сабе на патрэбу.
Поліўку есць ён нішчымную, быццам той дурань нікчэмны,
Ходзіць заўсёды ў рыззі, як той старац убогі.

Мы, небаракі-літоўцы, абутыя ў лапці, здаецца,
Ані з панамі, ні з чэляддзю іхняй раўняцца не можам.
Пэўна, за тое і панскіх хвароб нам не ведаць.
Нават цяпер, блаславёнаю летняй парою,
Мноства паноў з гарадоў і маёнткаў і стогне і плача.
Гэты, шалеючы, голасам немым крычыць ад падагры.
Іншы па-іншаму войкае, доктара кліча.
Людцы, чаму ж да паноў гэтак любяць чапляцца хваробы?
Вы мне скажыце — чаму іх так многа канае да часу?
Ці не таму, што яны з працы нашай смяюцца,
Самі ж не робяць нічога, займаюцца вечна распустай.
Мы ж, мужыкі, хай нас панства нікчэмнымі лічыць,
З'еўшы кавалачак хлеба або з сыраквашаю бульбы,
Добра і хутка ўсялякую робім работу.
Ну, а як выпадзе з'есці нам сала скрыгалік
Ці каўбасы пакаштуем літоўскай адменнай,
То мы яшчэ весялей і дружней за работу бяромся!» [...]

«Вось,— ён сказаў,— атрымаў я ад пана паперку.
Піша ў ёй наш гаспадар паслязаўтра на паншчыну выйсці.
Гной загадаў ён з хлявоў і са стайняў вывозіць.
Значыцца, трэба калёсы вам зараз наладзіць.
Вілы вазьміце, на працу спяшайцеся дружна.
Ведаем самі, як гной на калёсах вывозіць.
Кожны, напэўна, нагледзеў сабе для работы палетак.
Я, з дапамогай Гасподняю, з вамі за справу вазьмуся!
Буду не толькі сачыць я за вашай работай,
Сам пасаблю ад душы вам, узяўшыся з вамі за вілы».
Гэтак прамовіўшы, Прычкус пакінуў хаціну,

На жарабка трохгадовага ўскочыў ураз і памчаўся,
Каб азнаёміць вяскоўцаў з тым панскім загадам.

Толькі прызначаны дзень надышоў, як ужо на світанні
Гурбамі сталі сяляне ў маёнтку збірацца.
Хто нёс лапату, хто — новыя вілы з сабою.
Сёння спяшаюць сяляне, бягуць і бягуць да маёнтка.
Альбас калёсы [redacted] драбінамі ўзяў, хай працуецца лепей.
Новыя колы ўжо Мерчус навесіў на восі
І з тарахценнем на паншчыну разам з сябрамі паехаў.
А маладзейшыя новыя лапці абулі,
Кожны сабе і анучак яшчэ нарабіў палатняных.
Хлопцы, вось дзіва, адзін аднаго абганялі.
Кажуць, паволі на паншчыну ходзяць сяляне.
Трэба, маўляў, падганяць іншым разам іх вокрыкам грозным,
Вось тады будуць спяшацца яны на работу.

Што ж тут за дзіва? Няма тут ніякага дзіва!
Амтман[1] нядаўні, у воласці гэтай, быў пан памяркоўны.
Ён кіраваў справядліва, дасюль яго ўсе ўспамінаюць,
Нават і плачуць яшчэ. Год акурат як памёр ён, сардэчны,
Варты таго, каб яго помнілі штодзённа,
Каб нашы дзеці і ўнукі яго са слязьмі ўспаміналі!
Добры быў пан, больш такога на свеце не знойдзеш!
Толькі падумай, як шчыра народ шкадаваў ён.
Бурасы[2] нашы за гэта яго ад душы палюбілі.
Колькі на свеце паноў ёсць такіх, што, нібы на сабаку,
На селяніна плююць і яго чалавекам не лічаць.
Нават зірнуць на яго яны грэбуюць часам.
Амтман памерлы ніколі не здзекваўся так з селяніна,
За мужыкоў заступаўся заўжды па-бацькоўску.
Быў справядлівы, нас ён ні разу не скрыўдзіў.
Нават калі і пачуе, як бурасы лаюцца нашы,
То іх пакліча ён ды і ўпікне па-бацькоўску,
Ты не казаў ён нікому, заўсёды на вы ён звяртаўся.
Ну, а каго і ўшчуваў, то на вы называў і яго ён.
Лаяўся амтман даўнішні адно па-нямецку,
А як хваліў чалавека, шануючы шчыра за працу,
То гаварыў ён тады з мужыком па-літоўску.

Слухай, браточак, не гэта яшчэ раскажу я.
Ведаем мы, як вяскоўцу на паншчыне цяжка.
Як ён, пакутнік цярплівы, схіліўшыся нізка,
Цяжкую ношу нясе на плячах, ношу гора і працы.
Нашых мужыцкіх бядот ужо, мусіць, ніхто не палічыць!
Кожны нікчэмнік, калі набліжаецца лета,
Зноў мужыкоў пачынае зганяць бізуном на работу.
Каспарас, тлусты патылак напяўшы, як певень свой грэбень,
Бы на курэй, налятае на безабаронных вяскоўцаў.
Дзіксас, ягоны слуга, яшчэ большы мярзотнік.
Шабельку той папіхач, быццам пан, прычапіў сабе збоку.
Страшачы бурасаў нашых пагрозлівым крыкам, ён хоча
Хітрасцю нават і пана свайго пераплюнуць,
Пнецца на панскае месца,— вы толькі падумайце,— сесці.
Пана свайго прыніжаць — непрыстойная справа.
Гэты нахабнік да пана не мае павагі,
Дык і не дзіва, што бурасу спуску не дасць ён.
Цяжка, браточак, у полі рабіць у спякоту:
Пот з нас ліецца цурком пад бязлітасным сонцам,
А ўжо тым часам твой страўнік пусты па абедзе сумуе.
Трэба ж яго весяліць кожны дзень хоць чым-небудзь.
Толькі чым можа жабрак-селянін сваё бруха пацешыць,
Маючы хлеба скарынку і скрылічак сыру ў катомцы?
Сядзе, стаміўшыся, бурас, скарынку нішчымную з'есць ён.
Смагу адчуе знябыты, ды чым ён залье тую смагу?
Чым, бо ні півам, ні брагай яго не частуюць?
Вось і бяжыць ён да лужыны бруднай напіцца.
Ляжа, засопшыся, ніцма, ваду каламутную п'е ён.
Там — жабурынне, казявак там плавае процьма.
Ну, а ў прыдачу няшчаснага палкаю Дзіксас лупцуе». [...]

«Ах,— гучна вымавіў Сельмас,—
занадта ўжо дрэнна ў нас стала,
Дрэнна з тых дзён, як з'явіліся тут і француз і швейцарац[3].
Ёсць між літоўцаў цяпер і такія, што ганяць
Прышлых швейцарцаў на мове літоўскай, а самі
Часам выкідваюць штукі не горш за сапраўдных чужынцаў.
Быў жа упартым язычнікам некалі кожны літовец,
З дрэва бажкоў выразаў ды чапляў на галіны

Ён у няходжанай пушчы, у дзікай глухмені.
Продкі не ведалі нашы сапраўднага Бога,
Ідалаў страшных, паганых яны выдумлялі.
Мы — спаконвечныя прусы, даўно хрысціянамі сталі.
Толькі бывае, на жаль, напіваемся гэтак,
Што дурнаватыя немцы і тыя здзіўляюцца нават».

З горыччу Сельмас сваё абурэнне выказваў. Тым часам
Крыкнуў цівун[4]: «Як хутчэй за работу бярыцеся, людцы,
Непагадзь блізка: смугой зацягнулася сонца!
Што нам Плаўчунас лянівы, хай гіне ягонае збожжа!
Возьмемся дружна за працу, убраць ярыну мы павінны.
Гоні бялеюць наўкола, канчаецца лета.
Просіць ужо ярына, каб мы косы тачылі.
Боб пераспеў, і ўжо вянуць гарох пачынае,
І са струкоў перасохлых гарошыны сыплюцца долу.
Хіба не грэх, чалавеча, што Божы дарунак,
Дзеля якога нямала табе працаваць давялося,
Гіне цяпер, на вачах асыпаецца марна?
Што ж, адкажыце, мы будзем рабіць, калі ўзімку захочам
Пачаставаць нашых дзетак гарохавай кашай?
Скрозь і авёс і ячмень падзяўблі пералётныя птушкі,
Што захавалася — тое ўжо свінні даканчаць.
Вось кісялю і не будзе, дарэмна яго прамаргалі.
Ячнае кашы наўрад ці сяголета мы пакаштуем.
Я ж вам казаў, што ўпраўляцца нам трэба хутчэй з ярыною,
Толькі вы, быццам глухія, і слухаць мяне не хацелі.
Як жа на паншчыну, людцы, на цяжкую працу мы выйдзем?
Будзем, напэўна, зімой саламянаю сечкай карміцца?
Самі з пустымі кашолкамі пойдзем у поле.
Чым жа, суседзі, скаціну мы нашу накорміш?
Мусіць, саломай нішчымнай у хлеўчыку зімным.
Разленавацца і вы ўжо, кабеты, паспелі:
Лён вам ірваць неахвота, працуеце надта марудна.
Сорам вялікі вам, гляньце — руплівыя немкі
Лён абабілі як след, разасланлі даўно і смяюцца
З вашай ляноты вялікай, з нядбаласці вашай бязмернай.
Вы ж, як адна, тут літоўкі! Хіба вам не крыўдна,

Што гаспадыні нямецкія робяць спарней і старанней,
Лепей за вас і на лузе працуюць і ў полі?
Што ж гэта будзе, калі час надыдзе за прасніцы сесці,
Лён астанецца ж на гонях ды там дагніе пад дажджамі?
Ах, ужо ў Прусах мінуўся той час барадаты,
Час, калі сукняў нямецкіх не ведалі нашы літоўкі
І гаварыць ані слова не ўмелі яшчэ па-нямецку,
Сёння ж не толькі нямецкае носяць адзенне,
І па-французску яны балбатаць пачынаюць.
Гэтак балбочуць, што працу зусім забываюць.

Што ж вы, мужчыны, кабецін-няўдаліц
Не прымушаеце брацца за працу сумленна?
Мо галышом паказацца вы хочаце немцам на ўцеху
Ці на бяседах сябе выстаўляць блазнюкамі?
Мусіць, зусім вы аслеплі альбо разумець перасталі?
Сорамна ж будзе, калі ў незалапленых майтках
Пойдзеце вы на работу альбо да царквы памаліцца
У лахманах і рыззі паспяшаеце, як абшарпанцы!
Ганіць сябе не давайце, літоўцы, нікому.
Жонак сваіх выганяйце на поле, каб лён ратавалі.
Хай пастараюцца, пэўна, не ўсё яшчэ згнюсілі свінні,
Можа, яшчэ на анучкі там і асталося што-небудзь,
А пра штаны і кашулі цяпер нават думаць не варта.
Думаю, што і грыбоў мы сяголета не пакаштуем,
Немкі і тут ужо верх над літоўкамі возьмуць.
Кажуць, што з лесу кашамі грыбы яны носяць ды сушаць.
Баравікоў і лісічак, груздоў, сыраежак,
Рыжыкаў ды маслякоў, падабабкаў, апенек
Гэтак багата яны назбіралі ў лясах навакольных,
Што ў Караляўчус з іх многія ехаць рашылі,
Там і грыбы прададуць і абновак сабе накупляюць.
Шмат і ў запас тыя немкі грыбоў насушылі,
Так што цяпер нам паганкі збіраць астаецца.
Што ж гэта будзе, вось зварым мы боршч альбо кашу з гароху,
Ды ўжо не знойдзем прыправы да іх адпаведнай!
Варта напомніць: зімою грыбочкі — знаходка,
Смак адмысловы баршчу надаюць і аўсянцы.

Мы і арэхаў дагэтуль сабраць не паспелі:
Немкі іх поўныя бочкі сабе назбіралі,
Нават яшчэ і ў мяшкі панасыпалі колькі на продаж.
Нашы ж кабеты-гультайкі да гэтага часу
Не пастараліся нават арэшка сабе прызапасіць,
Добра ж зімой вечарамі палушчыць уволю арэхі.
Ды вось мужчыны, здаецца, не надта дабро гэта любяць.
Ім тытуню б, ды паболей, каб хату наскрозь прасмуродзіць.
Мусіць, смачнейшы для іх тытунец, чым арэшкі.
Не па зубах, зразумела, яны і бабулькам.
Дык не частуйце іх тым, што ўжо ім не карысна.
Бо недарэмна ж гаворыцца ў нас, гэта ведае кожны,
Грызці арэхі паджылым жанчынам ужо непрыстойна». [...]

«Стой,— за суседак сваіх заступіўшыся, крыкнула Еке,—
Хіба магчыма, кабеты, нам гэта ўсё вытрымаць моўчкі?
Дзеля чаго гэты шум, што вы ўз'еліся гэтак, мужчыны?
Мусіць, дакорамі нас вы жадаеце звесці са свету?
Мы і без вашых падказак зоймемся льном і пянькою,
Лепей палі даглядайце, каб харчу на зіму хапала!
Трэба да свята, Міхалава дня[5], нам ужо рыхтавацца,
Прыйдуць жа скора дажджы і асенняя слота,
А ярына вунь на полі стаіць недажатай,
Ды і каноплі палеглі пад ветрам шумлівым».

Спрэчку закончыць яны не паспелі, як вахмістр з'явіўся,
Следам прыйшлі і гарласты цівун і Шлап'юргіс[6].
Толькі зірнулі вяскоўцы на гэтых гасцей, як адразу
З пуду забылі пра ўсе свае звадкі, і спрэчкі, і сваркі.
Вахмістр, бярозавы кій ухапіўшы, наблізіўся к людзям,
Вось што сказаў ён, свой голас узняўшы амаль што да крыку:
«Слухайце пільна, прыгонныя, тое, што зараз скажу я,
Вы ж языкі за зубамі трымайце, жанчыны і дзеўкі!
Мы, як наглядчыкі вашы, а разам і ваша начальства,
Сёння, калі ўжо канчаецца лета і праца на гонях,
Вас па-бацькоўску жадаем давесці да добрай дарогі.
Бог наш магутны і мудры, тварэц і зямлі і нябёсаў,
Розумам нас надзяліў, даў ён нам чалавечыя душы.

Бацька наш родны і наш дабрадзей літасцівы,
Зноў абдарыў нас сваёю рукой клапатлівай,
Даў умалот землярабам, а статкам — адменнае сена.
Ведаем добра, як нашы кладоўкі і свірны збяднелі
Весняй парой, калі тварам да нас павярнулася сонца.
Мы на вясновыя гоні спяшалі — араць і скародзіць.
Шынкі й каўбасы канчаліся ў нас, на бяду, мы паспелі
Сала даесці і мяса, нішчымніца нас адалела.
І сачавічную поліўку ўжо не было чым прыправіць.
Нават кісель, нават каша з гароху, любімая ежа,
З нашых сталоў пазнікалі ў нялёгкую тую часіну.
Ды неўзабаве цяплом жыватворным дыхнула.
Зноў літасцівы Гасподзь пасылае нам шчодрае лета.
Можам цяпер мы пад'есці і сытна і смачна.
Ёсць ужо скорам, і парыць і смажыць мы зноў пачынаем,
Нашы каморы і свірны дабром напаўняем даверху,
Кажуць здаўна, што запас не пашкодзіць ніколі.
Ды вось шкада — ужо мілае лецейка нас пакідае.
Кожны грымець пачынае то міскамі, то чыгунамі,
Хоча пасля ўсіх нястач ён цяпер весяліцца,
Хоча душу ажывіць, хоча сэрца ўзбадзёрыць. [...]

Нас пасылаючы, амтман казаў, што ён хоча
Вам перадаць віншаванне ад шчырага сэрца,—
Каб вы й далей працавалі сумленна, рупліва,
Каб не ганяў я вас болей, не сек бізунамі,—
Так гаварыў ён, бо вельмі шкадуе вяскоўцаў.
Вось і сказаў я ўсё тое, што мне расказаць загадалі.

Ну, а калі святкаваць вы пачнеце дажынкі,
То пажадаю вам шмат весялосці і шчасця.
Толькі прашу, запрашаючы добрых людзей на бяседу,
Вы не забудзьце мяне запрасіць і маіх дамачадцаў.
Што ж, анічога не зробіш, як след развітаемся з летам
Ды не забудзем, што восень стаіць на парозе...»

ШЧАДРОТЫ ВОСЕНІ

Сонейка, край наш ізноў пакідаючы хутка,
К захаду хіліцца ўвечар, каб за небакраем схавацца.
З кожным дзяньком усё меней праменні ягоныя грэюць.
З кожным дзяньком, заўважаем, даўжэйшымі робяцца цені.
Зноў пачынаюць вятры памаленьку сваволіць,
Рэшткі цяпла развяваюць над полем і лесам.
Вось і паветра таму спакваля астывае.
Старасць яно прымушае ў кажух апранацца,
Бабцы і дзеду загадвае лезці на цёплую печку,
Гоніць у хаты й не надта старых — адагрэцца
Цёплым кавалкам свініны ці міскай гарачай капусты.

Плакаць прамоклая наша зямля пачынае, як толькі
Колы пакінуць сляды на спіне яе, моцна размытай.
Там, дзе нядаўна дзве клячы калёсы вывозілі лёгка,
І чатыром сёння выцягнуць іх не пад сілу.
Жаласна восі рыпяць, і ледзь-ледзь ужо круцяцца колы.
Хлюпае гразь, камякамі яна з-пад калёс вылятае.
Лужыны ўжо расплываюцца скрозь на палетках.
Дождж надакучлівы мые мужыцкія спіны.
Лапці і боты вады нахлябталіся ўволю,
Месячы гразь на дарогах і сцежках, як цеста.

Ах, куды дзеліся вы, залатыя дзянькі веснавыя?
Тыя, калі ўпершыню, адчыняючы вокны ў хаціне,
Мы прамяністую ласку гарачага сонца адчулі?
Мо падалося — ці сон мімалётны прысніўся,
Потым, прачнуўшыся, мы пра яго ўспамінаем з усмешкай.
Так адляцела і радасць ад нас разам з летам.
Слота ж усюды цяпер. Гэта слота пад лапцем,
Быццам кісель на агні закіпае, аж нават бурболіць.
Тыя, хто летняе свята, лятаючы ў нас, святкавалі,
Тыя, хто весела ў полі гулялі, скакалі на лузе,
Тыя, хто аж да нябёс узляталі на крылах імклівых
І, нагуляўшыся, елі зярняты і розных казявак,
Зноў паляцелі на поўдзень хавацца ад сцюжы.
Абезгалоселі нашы лугі і палеткі,

Летняя знікла краса, і на іх, як на могілках, ціха.

Гай наш вясёлы, дуброву, хмызняк смерць пустошыць
няшчадна,
Іх хараство абрываюць асеннія буры.
Тое галлё, дзе нядаўна яшчэ птушаняты пад лісцем,
Як у калысках, папісквалі ў цёплых гняздзечках,
Дзе, пасталеўшы, знаходзілі потым забаву ў палётах,
Мошак лавіць пачыналі ў паветры без мілай матулі,
Скінула ўбранне зялёнае, быццам ламачча, пасохла,
Сумна рыпіць пад павевамі злоснага ветру.
Там, дзе мядзведзь выграбаў лапай соты з калоды,
Там, дзе мядзведзіца дзетак з бурчаннем ласкавым карміла,
Там, дзе вучылі ваўкі ваўчанят і выццю і забойству,
А напалоханы лось уцякаў у гушчар ад пагрозы,
Там, дзе каршун ужо столькі схапіў куранятак,
А груганы гусянят неразумных ці мала пакралі,
Сёння няма весялосці ранейшай і радасці даўняй.
Толькі вароны крычаць, услаўляюць асеннюю скруху,
Пеўчыя ж птушкі даўно не спяваюць: схаваліся недзе,
Спяць бесклапотна і мараць аб лепшых часінах.

Ах, агародчыкі нашы, што ў свежым зялёным убранні,
Юныя кветкі, якімі вясна ганарыцца,
Дзе яна, ваша краса залатая, ваш водар духмяны?!
Гляньце, усё, што вясновай парой агароды
Нам паказалі ў цвіценні, што лета пазней узрасціла,
Што і ў садах і на гонях мужыцкай рукою сабрана,
Гэта багацце мы сёння ў кладоўках і склепах хаваем,
Смачныя стравы з яго мы і варым і смажым.
Гэй, ганарыстыя гусі, і вы, балбатлівыя качкі,
Плавайце ў рэчцы, аж покуль яна не замерзне.
Пеўні і куры, вы ў смецці капацца прывыклі,
На панадворак спяшайцеся, каб пагуляць яшчэ трохі.
Ды не падумайце, што за кудахтанне шумнае ваша
Ці кукарэканне зычнае сыплюць вам лепшае зерне.
Не, дзеля смачнага мяса вас кормяць дабром гаспадыні.
Люба глядзець, як умела нажы вострацьь нашы жанчыны,
Страшна, калі чыгунамі грымець пачынаюць кабеты.

Крэмень шурпаты ўжо Грыта і Піме шукаюць.
Сушыць Сельміке анучкі свае каля печкі.
Берге з Катрыне вялікую чысцяць патэльню,
А каб агонь весялей пад катлом разгараўся,
Дзьмуць па чарзе на яго, закапыліўшы губы,
Еке з Магужэ паленне шчапаюць на трэскі,
Дровы Энскіс у хаціну бярэмкамі носіць,
Толькі Дачыс-абібок, прытуліўшыся ціха да печкі,
Дрэмле, чакаючы ежы, аблізвае губы спрасонку.
Астэ тым часам к абеду ўжо тлустага пеўня зварыла,
Хоча яшчэ напячы і ляпёшак пшанічных.

Слінкі Дачыс з асалодай глытаў, прыкархнуўшы ля печкі.
Раптам на коніку порсткім з'яўляецца сват разадзеты.
Кажа, што Крызас усіх запрашае прыйсці на вяселле.
Скінулі шапкі мужчыны тады, пакланіліся свату,
Дзякаваць сталі за ласку і ўсе як адзін абяцалі,
Просьбу шануючы гэту, прыйсці на вяселле.
Тыдзень мінуў, і прыйшоў дзень вяселля чаканы.
Быццам на свята, тады апрануліся гожа суседзі.
Сцяпас і Мерчус купілі сабе чаравікі,
Новыя лапці сплялі акуратна і Лаўрас і Йонас,
Коней яны накармілі сваіх, закілзалі ў дарогу.
Ды асабліва Энскіс мітусіўся, ён выкупаў сіўку,
Потым, сядлаючы ўмела, к сядлу прысцягнуў ён страмёны.
Коніка й збрую ўпрыгожыў Энскіс, а яшчэ напаследак
Аперазаў свае чэрава туга ён поясам новым,
Новыя боты пасля нацягнуў ён з вялікай натугай.
А за мужчынамі ўслед выйшлі дружна сялянкі,
На пачастунак вясельны таксама і іх запрасілі.
Хараша гэтак прыбраліся нашы жанчыны,
Не па-нямецку, як многія робяць кабеты,
А па-літоўску, па-свойску, яны апрануліся сёння.
Любяць літоўкі старыя прыгожыя строі.
Едучы ў госці, заўжды надзяюць на галовы жанчыны
Кікі свае старасвецкія ці даматканыя шалі,
Ну, а дзявочай аздобай пярэсты вянок астаецца.

Бабы, не думайце больш аб дзявочых вяночках ніколі,
Вы ж не глядзіце, дзяўчаты, зайздросна на бабскія кікі.

Вось пацягнуліся з вёскі вялікім натоўпам
Людзі ў святочных убраннях, крычалі яны і спявалі.
Кожнага Крызас сустрэў каля брамы з паклонам.
Ветліва ў хату сваю ўсіх гасцей запрасіў ён,
Там частаваў іх гарэлкай і закуссю шчодра.
Ён і сватам падліваў, падліваў ён і дружкам.
А клапатлівая Крызава жонка гасцей частавала
Печывам розным, і так языкі развязаліся ў многіх,
Што ўжо мужыцкія жарты пачуліся ў хаце,
Нейкі абэлтух сказаў за сталом непрыстойнасць.

Так спакваля разгулялася, так разышлося вяселле,
Галас узняўся такі, ажно клячы ў канюшні
Сталі з трывогай іржаць, уздымацца на дыбы.
Зноў нечакана прымчаў на кані той жа сват разадзеты.
З крыкам каня па спіне лупцаваў пугаўём ён.
Ты, недарэка, навошта каня так лупцуеш?
Хіба на паншчыне мала яго мардавалі?
Ты ж каня-бедалагу яшчэ і прышпорыў!
Дурань, каня не ганяй і не бі без патрэбы!
Заўтра на гэтым кані мы паедзем у пушчу па дровы,
А паслязаўтра на ім будзе ездзіць пузаты памешчык.
Едзе той сват цераз двор, б'е каня ён у бокі нагамі.
Вось у вароты ўязджаюць ужо маладыя.
Перад святым алтаром абвянчаў іх епіскап
І благаслаўленнем святым паяднаў назаўсёды два сэрцы.

Збегліся да маладых і радня і суседзі,
Шчыра віншуючы іх, павялі ўсёй гурбою да хаты,
Смачнымі стравамі там, за вясельным сталом, частавалі.
Крызас і жонка яго, з галавой пасівелай жанчына,
Рады вяселлю былі, на дачушку глядзелі з усмешкай,
Бо іх Ільзбутэ была і малодшай і самай любімай.
А да таго ж выйшла замуж яна за таўкейскага войта.
Шчасныя бацька і маці, сабраўшы радню і суседзяў,
Не паскупіліся, гучна згулялі вяселле:

Ялавак трох, двух валоў загадалі зарэзаць на мяса,
Ну, а свіней і авечак яны не лічылі,
Рэдкая гуска і качка тады ацалелі.

Колькі гатуецца страў усялякіх і закусі рознай,
Крызасаў кухар, знябыўшыся, парыў і смажыў ад рання.
Гэтакі шум небывалы на вуліцы ўзняўся, што нават
Паўлукс збаяўся, ён з Крызасам жыў па суседству.
Размаляваныя міскі напоўніўшы варывам смачным,
Са смажанінай дастаўшы патэльні гарачыя з печы,
Кухар нарэшце і знак падае, з нецярпеннем чакае,
Значыць, пара пачынаць пачастунак вясельны.
Тушэ тым часам абрусы паспела прынесці,
Стол велічэзны ўпрыгожыла хутка і ўмела.
Дружкі пасля напрыносілі ежы ўсялякай:
Колькі свініны яны і гусяціны тлустай нанеслі,
Смачнай крывянкі, таксама і тушаных флякаў.
Перш «Отча наш» прачыталі ўсе хорам з пашанай,
Па-хрысціянску за стол, не спяшаючы, важна паселі,
Крызас гасцей частаваў, і прасіў ён ад сэрца,—
Колькі захоча душа, весяліцца, і піць, і закусваць.
Нож ужо выняў Энскіс, нож вялікі і востры,
Каб для гасцей смажаніну дзяліць на кавалкі.
Але не ўмеючы так, як паны, спрытна ножыкам рэзаць,
Пальцамі ён па-мужыцку хапаў і каўбасы і сала
І, на кускі разарваўшы, суседзям шпурляў на талеркі,
Выпіўшы добрую чарку, забыў далікатнасць.
Многія госці там выпілі, мусіць, не меней
І ўжо на міскі з закускай глядзець не хацелі.
А некаторыя, выпіўшы добра, хапалі
Сала і мяса рукамі і жэрлі паспешліва й прагна;
Губы ільсняцца ў іх, кропелькі тлушчу блішчаць на барадах.
Думалі госці, напэўна, што ў Крызаса бурас
Можа без звычаяў панскіх гуляць, весяліцца.
Покуль яны па-мужыцку закусвалі і выпівалі,
Слуг сваіх Крызас паклікаў, з'явіліся слугі імгненна,
Бочку дабрэннага піва прынеслі яны на насілках.
Збегліся хутка сваты, а таксама і шумныя госці,
Куфлямі дружна яны пачалі жлукціць пеннае піва,

Півам густым наталяецца смага найлепей, бо ў глотку
Льецца суцэльным струменем яно безупынна. [...]

Шумнай пярэстай гурмою музыкі прыйшлі на вяселле.
Танцы мужыцкія дружнай капэлай зайгралі.
Пліцкус іграў на цымбалах, а Кубас пілікаў на скрыпцы,
І, закапыліўшы губы, дудзеў на жалейцы Жнайрукас.
Дзевак, у цеснае кола сабраўшы, Энскіс угаворваў
З хлопцамі ў скокі ісці, не марнуючы часу.
Клішыс у ялавых ботах, глядзіш, ужо кружыцца з Піме.
Тушэ Кайрукас схапіў, ён на свята абуў чаравікі.
Тупнулі ўсе па-літоўску — дрыжыць земляная падлога.
Хто басанож танцаваць пачынае, вядома, для смеху,
Хто і ў лапцях, хто дык, скінуўшы світку, прытупвае й скача.
Бурас як вып'е на добрай бяседзе, то можа
І не такую, калі разгуляецца, выкінуць штуку. [...]

Блеберсаў парабак раптам прыбег, тупнуў лапцем і кажа:
«Ці не зашмат мы, браткі, на палях гаравалі?
Вочы расплюшчым, і трэба на паншчыну бегчы:
Трэба нам вывезці гной, трэба араць нам і сеяць,
Трэба і сена скасіць, а пасля стагаваць яго трэба,
Трэба ж і з панскіх палёў умалот нам у свірны адвезці.
Ды за наш клопат і працу падзякі ніколі не маем.
Пот з нашых спін нам змывалі дажджы ў час работы,
Сонца нам твары смаліла, апоўдні паліла няшчадна,
Сёрбалі мы незабелены крупнік паспешна,
Часта ў спякоту, каб смагу сваю наталіць, разбаўлялі
Квас застаялай вадою, зачэрпанай з лужыны ў полі.
Рагамі пот плыў па нашых ілбах, раз'ядаючы вочы,
Ён па счарнелых зняможаных тварах струменіў цуркамі.
Ах, небаракі мы, колькі ўжо гора зазналі!

Хай жа хоць сёння забудзем нягоды і беды
Ды пагуляем яшчэ на сяброўскай бяседзе,
Бо для таго нас усякім дабром Бог абдорвае шчодра,
Каб пасля клопатаў цяжкіх і мы, гарапашныя людзі,
Падсілкаваліся ласым кавалкам, душой уваскрэслі.
Кожны павінен рабіць, гэта прызначана Богам.

Есці ж Гасподзь загадаў, каб нам сілы ставала для працы.
Дык не скупіся сягоння, зрабі пачастунак багаты,
Можа, напасвіў бычка, дык забі яго, браце,
Не пашкадуй барана, рэж авечку таксама.
Качак, курэй у гаршчок пакладзі
што паболей ды ў печку.
Ты парсюка закалі і свінню, што даўно атлусцела.
Еш на здароўе, суседзе, насмаж свежанінкі,
Ты пакаштуй і крывянкі, зрабі мазгавыя каўбасы.
Мала табе, дык тады яшчэ ліверам, браце,
Страўнік свіны начыні і не бойся, што лопне.
Сальца туды, не забудзься, дабаў ды — пад гнёт і на холад,
Будзе табе сальцісон — смаката на здзіўленне.
Ведаеш сам, як нялёгка з харчамі вясною,
Добра тады перад працаю скварачку з'есці,
Летам таксама, калі нас на паншчыну гоняць.
Добра і дома, у свята, пачаставацца вяндлінкай». [...]

Мала-памалу сціхаў ужо гоман вясельны.
Ды скаланулася раптам зямля, задрыжала.
Госці спужаліся, галас узняўшы, ускочылі з лавак
І са святліцы мужыцкай на двор без аглядкі пабеглі.
Збіліся ў гурт, як авечкі яны: хто без вока застаўся,
Хто скруціў карак, а хто паламаў сабе рукі і ногі.
А з-за драбніцы, браточкі, усё пачалося.
Гэта ж Дачыс, з ім яшчэ шэсць памочнікаў дужых
Гэтак гарох пачалі малаціць ашалела цапамі,
Аж пад саломаю мышы памлелі са страху.
Госці ж не толькі там страху хапілі, зазналі і гора.
Ды не здзіўляйцеся, чуючы словы мае пра Дачыса.
Ён жа штогод, дачакаўшыся восені тлустай,
Страх на ўвесь свет наганяе сваёй малацьбою.
Ах, колькі хат і хлявоў разбурыў і пашкодзіў шаленец!
Колькі і гор і лясоў пахіснуў ён і спляжыў!
Жудасць наскрозь прабірае, калі нам расказвае Лаўрас,
Блеберсаў дзядзька, пра ўсе свае беды й нягоды.
Толькі свінюшнік ды ёўня ў яго ацалелі,
Хата ж яго выглядае, нібыта руіна.

Вось што бязглузды Дачыс нарабіў малацьбою сваёю,
Гэтулькі спрэчак і сварак у вёсцы ўсчалося.
Колькі ягоных суседзяў, пакінуўшы хаты,
Мусяць у непагадзь восенню ў полі бадзяцца,
Мусяць з жабрацкаю торбай хадзіць па сялібах!
Колькі разоў слалі скаргі, набраўшыся гора,
Бурасы суддзям высокім аж у Караляўчас,
Ды справядлівасці ўсё дачакацца не могуць.
Ведаем самі (о Божа, даруй нам), што час наш нядобры,
Слёзы людское нядолі ён топча з усмешкай.

Ну дык чаго ж той Дачыс так увосень шалее,
Так не па-людску з відна і да ночы грукоча цапамі?
Тыя вяскоўцы, якіх ён частуе гарохавай кашай,
Кажуць, Дачыс-малацьбіт так лютуе таму, што
Хоча хутчэй пагуляць, хоча выпіць ён добрую чарку,
І як Міхалаўкі пройдуць, Дачыс пачынае,
Цэпам б'ючы па снапах,
паглядаць у той бок, дзе карчомка.
На дапамогу паклікаўшы жонку, спяшаецца веяць,
Потым, насыпаўшы хуценька кошыкі зернем,
Бегма бяжыць у карчму, каб прапіць умалот свой.
Жонка ж Дачысава носіць трапаны лянок да шынкаркі,
Каб, патаемна прадаўшы, прыкласціся к пляшцы.
Часта бывае — да бацькі ў карчму адвядзе яна дзетак
Ды за бутэльку з сівухай адразу ж бярэцца. [...]

«Годзе ўжо! — вымавіў Сельмас.— Даволі нам баечкі баяць.
Столькі наслухаўся — вушы баляць ад дзівосаў.
Дзе ж, вы скажыце, той час старадаўні літоўскі,
Той, калі прусы яшчэ гаварыць па-нямецку не ўмелі,
Ботаў не ведалі, лапці насілі заўсёды,
Як ні хваліліся гэтым, ніяк не маглі нахваліцца.
Дзе ж ён, той час, адкажыце, калі ні сяброў, ні суседзяў
Лаяць не трэба было і за іх чырванець штохвілінна?
Сёння ж мне нават глядзець неахвота, як нашы літоўцы
На пагулянку, як немцы, прыходзяць у ботах.
Што ж гэта робіцца, Божа? Забыўся літовец на лапці.

Нам жа, літоўскім сялянам, насіць непрыстойна і клумпы —
Гэтак у нас па-нямецку драўляны абутак завецца,
Нашы дзяды калісь мала яго паважалі.
А чаравікі, якія па модзе французскай пашыты,
Нават не гожа было памінаць у размове.
Гэта ж французы, калі іх наехала многа,
Нас навучылі манерам сваім і прывычкам.

Нашы дзяды школ не мелі ў часы старажытныя тыя,
Зроду не ведалі азбукі, Бібліі ў рукі не бралі,
Вусна тады іх усіх навучалі псалмам і малітвам.
Бога ж яны шанавалі паболей, чым іхнія ўнукі.
З сонцам і ў свята ўставалі, спяшалі ў царкву памаліцца:
Сёння ж, хай Бог мне даруе, не хочацца бачыць,
Як, на французскі манер апрануўшыся, нашы літоўцы,
Можа, хвілінку ў царкве пастаяць і шыбуюць
З Божага храма ў шынок, каб гарэлкі набрацца.
Там, як нап'юцца, тады, бы сляпцы, анічога не бачаць.
Там балбатаць пачынаюць па-свінску яны, па-мужыцку.
Словы, пачутыя ў храме, ніхто і не ўспомніць.
Там і брыдотныя жарты, і рогат шалёны.
Там з-за драбніцы ўсчынаюцца п'яныя сваркі,
Там пачынаюць п'янчугі бязглуздыя бойкі,
Быццам разбойнікі, б'юцца, з праклёнамі, з лаянкай дзікай
Ды на падлозе качаюцца, на апляванай і бруднай.
Поскудзь якая пайшла! Як падумаеш — робіцца страшна.

Мала таго што дарослыя п'янствуюць самі,
Дзетак сваіх у шынок, як у госці, прыводзяць,
Змалку прывучваюць іх, неразумных яшчэ, да гарэлкі.
Дзеці там бачаць, як бацька іх з п'янымі б'ецца.
Клочча ляціць валасоў, і падлога заліта крывёю.
Хіба ж управы няма ўжо на вас, сатанінскае кодла?
Хіба не страшна, што бездань зазеўрае раптам прад вамі,
Спаліць пякельніца ўсіх, хто паганіць святыя законы.
Як жа не сорам сярод хрысціян вам з'яўляцца?

Скажа свяшчэннік — у школу дзяцей выпраўляйце,
Ці ўжо настаўніку трэба плаціць за вучэнне,

Вы пачынаеце галас адразу ўзнімаць несусветны.
А загадае, згубіўшы цярпенне, раз'юшаны амтман
Вахмістрам нашым апісваць маёмасць у тых, што не плацяць,
То набягае натоўп барадатых прыдуркаў,
Гэтак крычаць яны, быццам канец набліжаецца свету,
Лаюць, дурныя, настаўнікаў нашых няшчасных,
Толькі таму іх і лаюць і бэсцяць, што просяць,
Каб заплацілі нарэшце мізэрныя грошы,
Што ім належаць за іхнюю цяжкую працу.
Пайкюс дурны, «Отча наш» ён не ведае зроду,
З братам стрыечным, той гэтакі ж невук вялікі,
Лаяць уголас асмеліўся сціплых настаўнікаў школьных.
Брыдка, калі пачынаюць нахабнікі тыя плявузгаць.
Першы сыноў гадаваў неразумна, зрабіў лайдакоў з іх,
Бо патураў без развагі ўсім выбрыкам іхнім.
Ён і з настаўнікам біцца пачне, абы толькі папругай
Вісуса той сцебане па азадку, згубіўшы цярплівасць.
Ну, а другі, той зусім звар'яцеў: не дазволіў
Дзецям у школу хадзіць; ён, напэўна, імкнецца
Выхаваць так іх, каб імі заўжды ганарылася пекла.

Пайкюс, той непагадзь лае, а Ваўшкус — пагоду,
Гэтаму светла занадта, таму вельмі цёмна.
Першаму ў школе няўтульна, другому абрыдла навука.
Кажуць адны, што настаўнік няўмелы, бо малады ён,
Іншым стары ён, таму і нічога нявартьі.
Гэтым здаецца,— крычыць ён, псалмы пеючы, непрыстойна,
Іншыя кажуць, што вельмі ўжо ціха настаўнік спявае.
Смелы — адны заяўляюць, другія крычаць — баязлівы.
Так у святочныя дні за кілішкам гарэлкі
Бедных настаўнікаў нашых, свяшчэннікаў сціплых
Лаюць усюды ўсе п'яніцы і пустамелі.
Гэтак пустыя галовы разумных людзей зневажаюць.
Ды паміж нас хрысціяне яшчэ не звяліся,
Ёсць сярод нашых вяскоўцаў ці мала людзей працавітых,
Добрых бацькоў, што, шануючы Бога, не толькі
Самі прыстойна жывуць, ды і домам кіруюць умела,
Прыклад узорны даюць дамачадцам сваім і суседзям.
Гэтак у свеце вядзецца,— гаворыць Святое Пісанне,—

Добрых, сумленных людзей, шчыра Богу душою адданых,
Меней бывае заўжды, чым бязбожнікаў закаранелых.
Гэтак і ў будучым будзе: крыху павар'юецца свет наш,
Потым, аслепнуўшы, к чорту пакоціцца ў пекла.
Тое ж прарокаў гаворацць нам словы святыя,
Бог наш Хрыстос і пісанне апосталаў, вучняў ягоных,—
Перад пагібеллю свету пачнецца ў нас стоўпатварэнне.
Вылезуць з самага пекла страшыдлы-пачвары,
І між вучоных паноў і сялян невучоных мы ўбачым
Толькі шальмоўства і подласць, каварства нязмернае ўсюды.
Бачым жа мы і цяпер, як, пануючы ў свеце,
Слабых душою людзей спакушае нячыстая сіла.
Трэба, браты, нам прачнуцца! Адчуем жа сэрцам, як пекла
Бездань сваю агнявую адкрыла прад намі.
Век наш, злавесны і згубны сваім сатанінскім вучэннем,
Добрых людзей баламуціць, збіваючы іх з панталыку.
Красці, ілгаць, нажываючы скарбы разбоем і гвалтам,
Блізкіх ашукваць, распустай займацца, блюзнерыць —
Вось ён, асноўны закон бессардэчнага нашага веку,
Лютай пары, дзе падман і злачынства квітнеюць.
Ах, куды ж ён ідзе, гэты век, час ліхі і жахлівы?

Мы — спаконвеку літоўцы,— не знаючы свету дагэтуль,
Думалі ўсё, што французы адны ды швейцарцы
Спрытна сумленных людзей вакол пальца абводзяць.
Думалі мы —
толькі немцы блюзнераць і крадуць,
Ды між літоўцаў ці мала смуродных душонак бязбожных,
Гэткіх, што нашу Літву зняслаўляюць і ганьбяць.
Ах, дарагія браточкі, літоўцы, не трэба
Вам, як бязбожнікі, жыць, што аслеплі без веры,
Больш не звяртайце вы ўвагі на іх і на іхнія словы,
Хай жа смяюцца яны, хай жа кепікі строяць.
Вас, як надзейны слуга, павучаў я заўсёды,
Мовай нямецкаю з вамі не зюкаў ніколі,
А па-мужыцку, як сябар ваш верны, ад сэрца
Тое казаў вам у вочы,
што рупіла вельмі сказаць мне.

Вось і Мартынаў дзень, свята вялікае, адсвяткавалі.
Вось і Піліпаўка ўжо, і Каляды, глядзіш, недалёка.
З захаду мчацца вятры, прыганяюць халодныя хмары.
Забушавалі яны і на поўначы зноў, і на ўсходзе,
Сцюжу зімовую гоняць да нашай літоўскай старонкі.
Трэба хлявы нам агледзець ды заканапаціць старанна,
Хай і малы парсючок не загіне ад сцюжы.
Гэтай часінай, калі ўжо і гразь на дварышчах замерзла,
Не абысціся жывёле без клопатаў нашых штодзённых.
Сумна глядзіць нам на рукі яна, просіць сена і пойла.
Будзьма ж ашчаднымі, корм размяркуем разумна,
Бо невядома, як доўга працягнецца сцюжа.
Нельга прадбачыць, ці будзе й Вялікдзень з пагодай.
Ды хіба дрэнна, калі адзімуем і ўбачым,
Што й на вясну яшчэ маем нямала запасаў.

Досыць мянціць языком, ці не час разысціся па хатах?
Божа, прашу, пасабі справіць святы як трэба,
Каб, дачакаўшыся з радасцю новага года,
Мы запрашалі б сяброў і суседзяў у госці».

ЗІМОВЫ КЛОПАТ

Зноў гаспадарыць зімовая злючая сцюжа,
Зноў налятае ўскудлачаны сівер, каб нас запалохаць.
Шклом ледзяным зацягнула азёры і рэкі,
Нібыта шкляр іх умелы зашкліў па-майстэрску, як вокны.
Рэчкі, дзе плавалі рыбы, дзе кумкалі жабы ўсё лета,
Быццам бранёю закрылі сябе ад зімовае сцюжы.
Там засынаюць у змроку жывыя стварэнні.
Вецер паўночны ў палях апусцелых гуляе,
Стынуць балоты, дрыгва ўжо маршчыністай стала,
Болей не хлюпае ў нас пад нагамі асенняя слота.
Кожны прасёлак сягоння пад коламі, быццам
Нейкі тугі барабан, грукаціць на марозе,
Грукат ягоны далёка ляціць і ў вушах аддаецца.
Зноў цэлы свет сустракае зіму і вітае!

Так, ужо час сустракаць, бо Каляды зусім недалёка,
Хутка праходзіць Піліпаўка, ёй жа канец паслязаўтра.
Восень па гразкіх дарогах сланом велізарным блукала,
Слотаю пырскала ў твары, і нам яна вельмі абрыдла.
Кожны тады, абуваючы клумпы ці лапці,
Кляў яе ўголас за ліпкую гразь і хлюпоту.
Нават паны, што на конях прыгожых гарцуюць,
Што па гасцях раз'язджаюць штодзённа ў шыкоўных карэтах,
Лаюць таксама гнілую і золкую восень.
І з нецярплівасцю ўсе паглядалі на поўнач,
Гэтак чакалі, калі ўжо зіма падмарозіць макрэчу.

Раптам на захадзе неба пунсовым агнём запалала,
Крылы шырэй разгарнулі вятры-зімавеі,
Непагадзь гоняць на поўдзень, дзе дрэмлюць буслы на
зімоўках.

З хмары густой беласнежнай зіма галаву паказала
І пачала, быццам ведзьма, сварыцца з асенняй нягодай.
Скрозь маразамі макроцце яна падсушыла,
Грэблі праклала праз самыя гразкія багны
І на санях па снягах навучыла нас лётаць імкліва.
Там, дзе мы рвалі духмяныя веснія кветкі,
Там, дзе мы лета пагодныя дні сустракалі,
Гэтулькі сёння навеяна белых сумётаў,
Гэтулькі кветак зімовых зіма насадзіла.

Дзіўна глядзець, як, бароды пушыстыя звесіўшы нізка,
Перад табою пасталі, асыпаўшы кучары снегам,
Гонкія сосны, нібыта вяльможы ў напудраных буклях.
Голы хмызняк па-мужыцку ля іх прытуліўся.
Як ён пад голлем сасновым дрыжыць баязліва,
Стогне, калі налятае раптоўны вятрыска.
Нават карчы, нават пні і ламачча баяцца
Сіверу вельмі, калі ён мяхі раздзімае,
Снег прасяваючы, быццам праз нейкае дзіўнае сіта.
Пушча пусцее; адно ў глушыні загалосяць завеі —
Звера не ўбачыш і птушкі ніводнай не ўгледзіш,
Хто бесклапотна і моцна заснуў у бярлозе,
Хто у зацішным дупле,
ад сняжніцы схаваўшыся, дрэмле.

Мілыя птушкі, вам гэтак жа цяжка, як людзям,
Вас, як і нас, маразы дапякаюць сягоння.
Вас у заціхлыя пушчы загнала зімовая сцюжа.
Нас прымушае таксама яна бегчы хутка дахаты,
Каб на гарачую печку залезці і ўдоваль пагрэцца.
Вашы халодныя гнёзды, у якіх вы так мерзнеце ўночы,
Хіба ўратуюць ад замеці ды ад марозу?
Мы, толькі сівер сіберны гразіць пачынае,
Хутка хаваемся ў хаце, у цёплым куточку,
Там ужо холад і вея нас болей не страшаць.
Добра ля печкі зацірку гарачую сёрбаць.
Ах, шматпакутныя птушкі, паўголыя вечна,
Хай маразы, хай спякота, хай неблагое надвор'е,
Вы ж, дарагія, заўсёды ў тым самым адзенні.
Мы, ледзьве сонейка ўлетку пячы пачынае,
Ходзім у зрэбнай апратцы ці лёгкія носім кафтаны.
А прадзімаць пачынае нас сівер зласлівы,
Цягнем з гарышча свае кажухі ды хутчэй апранаем.
Мы і ў пасцелі ўкрываемся цёплаю коўдрай.

Так разважаў я. Тым часам сабралася воўчая зграя,
Жудасна ў змроку паўночным яна нечакана завыла.
Ах вы, разбойнікі, можа, вам зноў захацелася мяса,
Пэўна ж, спраўляеце пост мімаволі зімовы?
Сівер, спяшайся сюды, сцебані гэту погань
Ды апячы маразамі, каб згінула хціває кодла.
Страшна глядзець селяніну, як кожнае лета
Дзёрзка гайсаюць у полі ваўчугі ды рэжуць скаціну.
А ўжо калі падбяруцца ля ўзлеску да статку,
Рэжуць тады без разбору худое і гладкае быдла.
І парася і кабанчыка ладнага люба ім зжэрці,
Нават кныроў самых дужых ваўчыныя зубы асіляць.
З'еўшы свініны, ваўкі не знаходзяць спакою:
Мяса бычынага трэба ім, трэба цяляціны смачнай,
Цельных і ялавых рэзаць кароў пачынаюць.
Так з кожным днём усё болей яны вынішчаюць жывёлы,
Шасцігадовых валоў ужо рэжуць разбойнікі смела.
Колькі каровак сялянскіх пярэстых, бялявых і рыжых
Зжэрлі яны, вокамгненна задраўшы на пашы.

Нават ужо нападаць не баяцца на чорных
Злосных старых бугаёў. Уварваўшыся ў статак,
З ходу хапаюць зубамі за горла яны крутарогіх.
Крык пастухоў і падпаскаў драпежнікаў тых не бянтэжыць.
Часам грабежнікі толькі да ўзлесся здабычу дацягнуць,
Каб на вачах пастухоў ёй давіцца і жэрці.
Сівер, ты нас пашкадуй,
пакарай ты драпежнікаў гэтых!
Нельга ж цярпець, бо, паніштчыўшы нашу худобу,
Следам, напэўна, і нас разам з нашай раднёю,
З жонкамі, з дзецьмі зарэжуць бязлітасна воўчыя зграі. [...]

Гоні халодныя, мяккія спіны якіх мы вясною
Плугам глыбока ўспаролі, засеялі зернем адборным,
Спяць пад сумётамі сёння, пад ледзяною карою
І не адкрыюць, што Бог міласэрны задумаў,
Што прадрашыў ён, калі і на свеце яшчэ не было нас.
Мы гэта ўбачым, як зноў з дапамогаю Божай
Вернецца лета, і зноў цеплыню мы адчуем.
Гэтай цудоўнай пары пачакаем цярпліва,
Будзем чакаць мы з надзеяй таго, што на гонях узыдзе.

Бог міласэрны, стварыў ты і гэту зямлю і нябёсы.
Ты і тады, калі мы не маглі і падумаць,
Шлях нам у прышласць накрэсліў уласнай рукою,
Ты прадугледзеў усё, што нам будзе патрэбна:
Даў нам дапытлівы розум і даў нам здаровае цела.
Строга ўзгадніў усе нашы пачуцці і думкі.
Нашы пакуты і радасці размеркаваў вельмі мудра,
Вызначыў кожнаму час на зямное жыццё справядліва.
Вось ужо з годам старым, што ад нас адыходзіць,
Беды ад нас адыходзяць з тваёй дапамогай,
Колькі ад іх нам, галоце, паплакаць ужо давялося.

Ах, як вы хутка мінаеце, радасці цёплага лета.
Вы, духавітыя кветкі, зялёныя росныя травы,
Вы, бесклапотныя птушкі са звонкаю песняй,
Вы, усе тыя, што летняе свята ў Літве святкавалі.

Вам, дарагія, не трэба было клапаціцца
Ні аб трывалым жыллі, ні аб хлебе надзённым.
Вам ні араць, ні скародзіць, ні сеяць не трэба,
Бо не прызначыў вам Бог цяжкай працай займацца.
Ён надзяліў вас, крылатых, жыццём бесклапотным.
Грэшныя мы бедакі, мы сіроты гаротныя толькі,
Мы так не можам, як вы, бесклапотна лунаць на прыволлі:
Бо пачынаюць з маленства нягоды нас мучыць,
І аж да скону ад іх не знаходзім збавення.
Зразу, як толькі Вялікдзень як след адсвяткуем,
Дзеля надзённага хлеба бяромся за працу.
Летам мы столькі працуем у полі ў спякоту,
Што абліваемся потам, і так аж да восені, покуль
Мы не напоўнім засекі бурштынавым зернем.

Варта сягоння, вяселлямі гучна адзначыўшы восень,
Павесяліўшыся добра, параіцца ўсім па-суседску,
Як зберагчы гаспадарліва нам і разумна запасы.
Будзем варыць, ці пячы, альбо смажыць, нам трэба
Помніць пра заўтрашні дзень,
пра наступнае помніць заўсёды,
Бо яшчэ доўга чакаць тое новае лета,
Покуль са свежых прыпасаў мыварыва смачнае зварым.
Час разысціся па хатах, а там з дапамогаю Боскай
Сохі мы нашы агледзім, дзе трэба — старанна паправім.
Сонейка зноў прыгравае, і снег растае памаленьку,
Зноў жаўручок неўзабаве, спяваючы, ўзнімецца ў неба.
Зноў на парозе вясна, недалёка і лета,
Мілае лецейка нам абяцае папоўніць запасы.
Ды без цябе, міласэрны і мудры наш Бацька Нябесны,
Нам не дастанецца тое, што лецейка паабяцала,
Не дапамогуць ні клопаты нашы, ні наша старанне.
Хай сашнікі мы набудзем, прыдбаем кашы і вясною
Выйдзем у поле ўсе дружна і гоні засеем,
Плёну не дасць нам жаданага рупная праца,
Покуль ты, Госпадзі, не асяніш нас сваім бласлаўленнем.
Летась ты нам дапамог, і твой клопат усе мы адчулі.
Не пакідай нас: без ласкі тваёй мы змарнеем.

Мы прадугледзець не можам, чым нас узрадуе лета,
Толькі вядома табе аднаму, што чакае нас заўтра.
Цяжка нам, грэшным,
законы твае зразумець дасканала.
Думак магутных тваіх глыбіня нам здаецца бяздоннай,
Розумам велічы іх уявіць мы не можам.
Не забывай жа дзяцей сваіх, Бацька Нябесны,
Нас без спагады сваёй не пакінь, і, як вернецца лета,
Будзем мы ўсе ад відна да цямна шчыраваць на палетках.

1765—1775

Тлумачальныя заўвагі

[1] *Амтман* — ва Усходняй Прусіі амтманамі (альбо амтратамі) называлі кіраўнікоў каралеўскіх маёнткаў. Амтманамі (амтсратамі) былі толькі памешчыкі.

[2] *Бурас* — вясковы селянін. Германізм, паходзіць ад нямецкага слова «баўэр».

[3] *«...з тых дзён, як з'явіліся тут і француз і швейцарац».* У выніку каланізацыі Усходняй Прусіі, якая ў XVIII ст. праводзілася прускім урадам, лепшыя землі аказаліся ў немцаў, а таксама швейцарцаў і французаў, якія прыехалі туды з заходніх абласцей Германіі.

[4] *«...крыкнуў цівун».* Цівун быў пасрэднікам паміж адміністрацыяй маёнтка і сялянамі. Ён перадаваў загады ўлад старастам, дапамагаў вахмістрам спаганяць падаткі, караць прыгонных сялян бізунамі і г. д.

[5] *Міхалаў дзень* — 12 кастрычніка.

[6] *Шлап'юргіс* — мянушка (па-літоўску азначае — п'яніца).

ЧЭШСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Асаблівасці развіцця чэшскай і беларускай літаратур у многім падобныя. У якасці літаратурнай мовы на самым раннім этапе свайго развіцця яны карысталіся старaславянскай, затым (у сярэднія вякі) сталі шырока выкарыстоўваць лацінскую. Пасля таго як у бітве каля Белай Гары (1620) Чэхія страціла незалежнасць, нямецка-каталіцкая рэакцыя, што доўжылася некалькі стагоддзяў, прывяла ледзь не да пагалоўнага анямечвання чэшскага народа. Нешта падобнае было і ў гісторыі беларусаў — у выніку заключэння Люблінскай уніі (1569), а пасля — далучэння да Расійскай імперыі (перыяды паланізацыі і русіфікацыі). Аднак эпоха нацыянальнага адраджэння (канец XVIII—XIX ст.) прывяла да росту нацыянальнай самасвядомасці, фарміравання нацый і нацыянальных культур. Што да чэхаў, то вялікую ролю ў гэтым адыграла дэмакратычная навуковая і творчая інтэлігенцыя — вучоныя П. Шафарык, І. Добраўскі, Ф. Палацкі, пісьменнікі Я. Колар, К. Г. Маха, Б. Немцава, Я. Неруда, Я. Врхліцкі і інш. Урэшце, амаль адначасова ў беларусаў і чэхаў на пачатку XX ст. узніклі свае дзяржавы. 28.10.1918 г. была абвешчана незалежная Чэхаславакія як дзяржаўнае аб'яднанне двух братніх славянскіх народаў — чэхаў і славакаў. У канцы 1992 г. на яе тэрыторыі былі створаны дзве самастойныя дзяржавы — Чэхія (з насельніцтвам звыш 10 мільёнаў чалавек) і Славакія (каля 4,5 мільёна чалавек).

Беларуска-чэшскія сувязі маюць шматвяковую гісторыю. Яшчэ ў 1397 г. польская каралева Ядвіга выдала ўказ аб стварэнні ў Празе літоўскай калегіі для моладзі з ВКЛ, якая вучылася тады ў мясцовым Карлавым універсітэце (заснаваны ў 1348 г.). Як вядома, у Празе ў 1517—1519 гг. жыў і працаваў Францішак Скарына. Ён тут выдаў першыя беларускія кнігі — «Псалтыр» і 22 кнігі Бібліі. Ёсць

звесткі, што ўсходнеславянскі першадрукар знайшоў на пражскіх могілках і вечны спачын. Яшчэ ў канцы XIX ст. чэшскія вучоныя А. Чэрны і Л. Куба запісвалі на Беларусі народныя песні. Пасля, на пачатку XX ст., А. Чэрны на старонках часопіса «Славянскі агляд» расказаў сваім землякам пра нацыянальнае адраджэнне беларусаў, пра газеты «Наша Доля» і «Наша Ніва», творчасць Янкі Купалы і інш. Ён здзейсніў і першыя пераклады некаторых твораў Янкі Купалы (у тым ліку знакамітага верша «А хто там ідзе?»), Якуба Коласа, Цёткі на чэшскую мову.

З часоў Першай сусветнай вайны Чэхаславакія стала адным з цэнтраў грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця беларускай эміграцыі. Калі ўрад міжваеннай Польшчы стаў праводзіць на заходнебеларускіх землях жорсткую паланізатарскую палітыку, Чэхаславакія выдзеліла звыш 100 дзяржаўных стыпендый для беларускай моладзі. У выніку толькі ў 1922—1926 гг. у розных ВНУ Чэхаславакіі вучылася звыш 350 беларусаў. Для задавальнення сваіх нацыянальна-культурных і навуковых запатрабаванняў яны мелі шэраг грамадскіх арганізацый — Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый, Беларускае (Крывіцкае) культурнае таварыства імя Ф. Скарыны, Беларускі навуковы кабінет. У Празе выходзілі беларускамоўныя газеты і часопісы («Іскры Скарыны», «Беларускі студэнт», «Прамень» і інш.), кнігі (напрыклад, альманах «Замежная Беларусь», 1926). У 1928 г. заснаваны спецыяльны Беларускі заграпічны архіў. У пражскай Славянскай бібліятэцы быў арганізаваны беларускі аддзел, які працуе да сённяшняга дня. Сярод тых, каму дала прытулак і адукацыю чэшская зямля,— літаратары і навукоўцы Уладзімір Жылка, Ігнат Дварчанін, Віктар Вальтар, Міхал Ільяшэвіч, Янка Станкевіч, Аляксандр Орса, Ларыса Геніюш і інш. У Празе ў даваенны і пасляваенны час жыў выдатны беларускі оперны спявак Міхась Забэйда-Суміцкі.

Цікавіцца чэшскай літаратурай і культурай у Беларусі пачалі яшчэ ў даваенны час. Гэтаму, у прыватнасці, садзейнічалі асабістыя сувязі паміж вучонымі і пісьменнікамі Беларусі і Чэхаславакіі. У прыватнасці, цесныя кантакты ўсталяваліся паміж першым рэктарам БДУ Уладзімірам

Пічэтам і прэзідэнтам Чэхаславацкай акадэміі навук Здэнекам Нэедлы, які ў 1927 г. наведаў Мінск, а затым неаднаразова выступаў у Празе з дакладамі пра беларускую культуру. Некалькі разоў у Чэхаславакіі пабывалі Янка Купала (1925, 1927, 1935), Міхась Чарот (1925, 1927), Цішка Гартны (1925, 1927), Міхась Зарэцкі (1927). У выніку ў перакладзе на беларускую мову яшчэ ў 1930-я гг. з'явіліся творы асобных чэшскіх пісьменнікаў, у прыватнасці — шматлікія выданні сусветна вядомага рамана Яраслава Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка». У перыяд Вялікай Айчыннай вайны немцы імкнуліся выкарыстаць чэхаў і славакаў для барацьбы з партызанамі на тэрыторыі Беларусі. Аднак, насуперак задуме фашыстаў, браты-славяне нярэдка дэзерціравалі з нямецкай арміі, пераходзілі на бок беларускіх партызан. Гэта яшчэ больш умацавала беларуска-чэшскія кантакты. Пасля Вялікай Айчыннай вайны беларуска-чэшскім сувязям, у тым ліку літаратурным, паспрыяла тое, што і Чэхаславакія, і СССР уваходзілі ў адзін сацыялістычны лагер. Па-беларуску былі выдадзены анталогіі чэшскай паэзіі, зборнікі чэшскіх казак і апавяданняў, творы Ю. Фучыка, Я. Дрды, І. Кубічка, Я. Козака, І. Скалы, В. Незвала, К. Чапека, В. Гавела, Э. Баса і інш. У сваю чаргу ў чэшскамоўным гучанні з'явіліся творы Янкі Купалы і Якуба Коласа, аповесці і раманы Янкі Брыля, В. Быкава, У. Караткевіча, І. Мележа, І. Пташнікава, І. Шамякіна, зборнікі вершаў П. Панчанкі, Максіма Танка, п'есы А. Макаёнка і інш. У даследаванні беларускай літаратуры, перакладзе твораў беларускай літаратуры на чэшскую мову асабліва вызначыўся прафесар Карлавага універсітэта Вацлаў Жыдліцкі. Для прапаганды беларускай літаратуры ў Чэхіі шмат зрабіў супрацоўнік беларускага аддзела Славянскай бібліятэкі Міраслаў Зіма.

Новы этап беларуска-чэшскіх узаемаадносін распачаўся разам з утварэннем Рэспублікі Беларусь і Чэшскай Рэспублікі, якая на самым пачатку 1993 г. устанавіла з Беларуссю дыпламатычныя адносіны. У Чэхіі працуюць асобныя грамадска-культурныя і навуковыя беларускія таварыствы — Скарынаўскі семінар, Згуртаванне беларусаў у Чэхіі імя Ф. Скарыны, Беларускі цэнтр (пры чэшскай арганізацыі

«Чалавек у бядзе»). У розных чэшскіх ВНУ навучаюцца беларускія студэнты. У 1996 г. у Пражскім Градзе адкрыты помнік Францішку Скарыне. У 1998 г. у Празе адбыўся VII Усеславянскі з'езд, у якім удзельнічала і афіцыйная дэлегацыя Рэспублікі Беларусь.

Жыхары сучаснай Беларусі знаёмы з культурай і літаратурай Чэхіі дзякуючы чэшскім фільмам і спектаклям па п'есах чэшскіх драматургаў, творам чэшскіх пісьменнікаў у перакладах на беларускую і рускую мовы. Беларускія літаратуразнаўцы (І. Шаблоўская, А. Вострыкава і інш.) прысвяцілі свае даследаванні выяўленню заканамернасцей развіцця чэшскага прыгожага пісьменства. Чэшская літаратура вывучаецца ў курсе замежнай літаратуры на ўсіх філалагічных факультэтах універсітэтаў Беларусі. Разам з тым жадаючыя могуць набыць асобную спецыяльнасць «багемістыка» на аддзяленні славянскай філалогіі БДУ.

БАЖЭНА НЕМЦАВА
(1820—1862)

Класік чэшскай літаратуры, выдатная пісьменніца Бажэна Немцава (дзявочае імя і прозвішча Барбара Панклава) нарадзілася ў Празе, але дзяцінства правяла ў вёсцы. Прыгожая чэшская прырода: горы, парослыя букамі і вязамі, мінеральныя крыніцы, хуткаплынныя рэкі, суцэльны кветкавы дыван сенажацей — з маленства выклікала любасць да гэтых мясцін, людзей, што жылі тут, жаданне апець гэту прыгажосць і насельнікаў роднага краю. А тут яшчэ — побач кожны дзень самы блізкі чалавек, бабуля, першая памочніца і дарадчыца, выхавацелька і спачувальніца. Менавіта яна дала дзяўчынцы першыя ўрокі хрысціянскай маралі, чалавечнасці, любові да вуснай народнай творчасці, роднай чэшскай мовы. Яна пераказвала народныя легенды і паданні пра народных заступнікаў, якія адольвалі розных ворагаў, не давалі ў крыўду родны край і народ. А гэта ў дзяўчынкі выклікала гордасць за свой народ, веру ў тое, што ён не паддасца ні сацыяльнаму прыніжэнню, ні анямечванню, якое некалькі стагоддзяў працягвалася ў адносінах да чэхаў.

Урокі бабулі Барбара помніла ўсё жыццё. І тады, калі яна ў семнаццацігадовым узросце выйшла замуж за Ёзэфа Немца, дзяржаўнага чыноўніка, старэйшага за яе на пятнаццаць гадоў, і яе прозвішча афіцыйна стала Немцава. І тады, калі ў 1843 г. надрукавала свой першы верш «Чэшскім жанчынам» і падпісала яго псеўданімам Бажэна Немцава, што стаў яе літаратурным імем на ўсё жыццё. І тады, калі — пасля паражэння рэвалюцыі 1848—1849 гг., арышта мужа, які прыняў удзел у рэвалюцыйных падзеях, смерці ад сухотаў старэйшага сына Гінека — пісала сваю знакамітую аповесць «Бабуля» (1853—1855).

Пасля «вясны народаў», як называлі рэвалюцыю 1848—1849 гг., хоць і не настала «лета», усё ж наступіла некаторая «адліга». Урад Аўстра-Венгерскай імперыі, куды ўваходзілі тады чэшскія землі (як, зрэшты, і заходнеўкраінскія — пасля падзелаў Рэчы Паспалітай), вымушаны быў дазволіць асобныя формы арганізацыі славянскага грамадска-культурнага і сацыяльна-палі-

тычнага жыцця, выпуск у свет новых чэшскіх перыядычных выданняў і г. д. І Бажэна Немцава, нягледзячы на складанасці асабістага жыцця (чацвёра дзяцей, «нядобранадзейнага» мужа пераводзяць з аднаго месца працы на другое, матэрыяльныя нястачы), цалкам акунаецца ў літаратурную творчасць, бачачы ў ёй найбольш прыдатную форму свайго грамадскага служэння. Імкнучыся абудзіць у сэрцах анямечаных чэхаў і славакаў любоў да сваёй мовы, культуры, гераічнай гісторыі, яна збірае, апрацоўвае і выдае «Народныя казкі і легенды» (кн. 1—7, 1845—1847), «Славацкія паданні і легенды» (1857—1858). Побач з гэтым не цураецца і журналісцкіх жанраў. Піша шматлікія нарысы, публіцыстычныя і этнаграфічныя артыкулы, эсэ, у якіх выступае за адмену паншчыны, гарантаваную працу для рабочых, за дэмакратызацыю грамадства. Але, зразумела, асноўнае, што было наканавана ёй лёсам і ў чым яе ніхто не мог замяніць, — гэта ўласная літаратурна-мастацкая творчасць.

Збор твораў Бажэны Немцавай налічвае ажно 15 тамоў (Прага, 1950—1961). Калі ўлічыць, што першы верш яна надрукавала ў 23 гады, а ў няпоўныя 42 яе ўжо не стала, не могуць не здзівіць творчыя магчымасці і працаздольнасць пісьменніцы. Да яе творчых здабыткаў адносяцца, апрача ўжо названага, раман «Горная вёска», аповесці і апавяданні «Разарка», «Карла», «Дзікая Бара», «Бедныя людзі», «Пан настаўнік», «У замку і каля замка» і многае іншае. Творы Немцавай прыцягвалі да сябе чытача паэтызацыяй звычайных чалавечых узаемаадносін, заснаваных на асновах спрадвечнай народнай маралі, услаўленнем чалавека працы, чэшскай гісторыі, роднай прыроды, выяўленнем і шліфоўкай скарбаў чэшскай мовы, яе лексічных, фразеалагічных і сінтаксічных багаццяў. Апошняе ў перыяд станаўлення чэшскай літаратурнай мовы было асабліва актуальным. Неабходна было паказаць, што чэшская мова мае ўсе мажлівасці для выяўлення самых тонкіх думак і перажыванняў інтэлігентнага еўрапейца, як і тагачасная дзяржаўная — нямецкая. І Бажэна Немцава, разам з яе выдатнымі сучаснікамі Паўлам Шафарыкам, Карэлам Гаўлічкам-Бораўскім, Янам Коларам, Вацлавам Ганкам, Карэлам Гінекам Махам і іншымі, гэта цудоўна паказала і даказала.

Асаблівы чытацкі поспех выпаў на долю аповесці Немцавай «Бабуля» — твора, які толькі на чэшскай мове вытрымаў ужо звыш 300 выданняў. У аповесці, навеянай асабістымі дзіцячымі ўспамінамі пісьменніцы і рэальнай постаццю яе роднай бабулі, таленавіта і высакародна, як і ў «Новай зямлі» Якуба Коласа, апаэтызаваны той сялянскі мацярык, якога ўжо даўно няма ні ў Чэхіі, ні ў Беларусі. Несумненна, гэты зніклы мацярык, як і

легендарная Атлантыда, ужо сам па сабе прыцягвае і будзе заўсёды прыцягваць нашу ўвагу. Але не толькі ў гэтым каштоўнасць «Бабулі». Многія з тых маральных прынцыпаў, якімі жылі нашы продкі (паважлівыя адносіны да старэйшых, адно да аднаго, язычніцкае абагаўленне прыроды, боязь «граху» і г. д.), калі не вызначаюць цалкам, то павінны вызначаць узаемаадносіны і ў сённяшнім людскім калектыве. Такім чынам, «Бабуля» — нібы тая лакмусавая паперка, якая, апрача ўсяго, паказвае ступень маральнасці пэўнай чалавечай супольнасці, нацыі, народа. І не толькі чэшскага.

Аповесць у перакладзе Ніны Рашэтнікавай друкуецца паводле выдання: *Немцава Бажэна. Бабуля: Карціны вясковага жыцця: аповесць. Мінск: Радыёла-плюс, 2007.*

Бабуля

Аповесць

(Скарочана)

I

[...] Бабуля мела сына і дзвюх дачок. Старэйшая шмат гадоў жыла ў Вене ў сяброў, ад іх і пайшла замуж. Другая дачка паехала на яе месца. Сын, рамеснік, таксама быў самастойным і ажаніўся ў горадзе. Бабуля жыла ў горнай вёсачцы, на сілезскай мяжы, у маленькай хатцы, разам са старой Беткай, сваёй аднагодкай, што служыла яшчэ ў яе бацькоў. Яна не сумавала ў сваёй хаце: усе жыхары вёскі былі братамі і сёстрамі, а яна была для іх маці і дарадцай, без яе парад не хрысцілі дзяцей, не спраўлялі вяселля, не ладзілі пахавання.

Аднойчы бабуля атрымала з Вены ліст ад старэйшай дачкі, якая паведамляла, што яе муж перайшоў на службу да княгіні, якая мела вялікі маёнтак у Чэхіі, а гэта зусім недалёка ад горнай вёсачкі, дзе жыве бабуля. Дачка пісала, што сям'я ўжо збіраецца пераязджаць, муж таксама хутка будзе там разам з княгіняй. Напрыканцы была просьба прыехаць да іх назаўсёды, жыць у сваёй дачкі і выхоўваць унукаў, якія яе любяць. Бабуля заплакала, бо не ведала, што рабіць. Сэрца рвалася да дачкі з унукамі, якіх яшчэ не бачыла, але яна прывыкла да сваёй маленькай хаткі і добрых сяброў. Ды кроў не вада, туга перамагла даўнія звычкі, і бабуля вырашыла, што паедзе. Хатку з усёй гаспадаркай аддала старой Бетцы са словамі: «Не ведаю, ці спадабаецца мне там, калі ж не спадабаецца, то і тут, сярод вас, не памру».

Аднойчы да хаткі пад'ехаў і спыніўся вазок, на які фурман Вацлаў паставіў бабулін маляваны куфар, неадменны

калаўрот, кошык з чатырма чубатымі куранятамі, мех з двума чатырохколернымі кацянятамі. Нарэшце на вазок села і сама бабуля, якая праз слёзы нічога не бачыла. Выслухаўшы на развітанне найлепшыя пажаданні ад сяброў, яна паехала да свайго новага дома.

Як чакалі, як радаваліся яе прыезду ў Старой бялільні[1]! Так людзі называлі самотны будынак сярод маляўнічай даліны, які атрымала пад жыллё пані Прошкава, бабуліна дачка. Дзеці выбягалі штохвілінна на дарогу, каб пагледзець, ці не едзе Вацлаў, і кожнаму, хто праходзіў паўз іх, казалі: «Сёння прыедзе наша бабуля!» Самі ж разважалі: «А як бабуля выглядае?»

Яны ведалі розных бабуль, іх падабенства змяшалася ў дзіцячых галовах, і яны не ведалі, з кім параўнаць сваю. Нарэшце прыехаў стары вазок. «Бабуля едзе!» — разнеслася па доме. Пан Прошак, пані, Бетка, якая несла на руках немаўля, дзеці і два сабакі, Султан і Тырл,— усе выбеглі на ганак, каб прывітаць бабулю.

З воза злезла вясковага выгляду кабета ў белай хустачцы. Дзеці стаялі адно каля аднаго і не зводзілі з бабулі вачэй. Бацька паціскаў бабулі руку, маці, абдымаючы, плакала і цалавала яе ў абедзве шчакі. Бетка супакойвала немаўля, ружовашчокую Адэльку, а бабуля смяялася, называла дзяўчынку малым дзіцяткам і раз-пораз хрысціла. Потым абвяла позіркам астатніх дзяцей і ласкава звярнулася да іх: «Мае залатыя дзеткі, мае птушаняткі, як доўга я марыла пра тое, каб вас убачыць!» Але дзеці апусцілі вочы і засталіся стаяць, нібы прымерзлі, і толькі па загаду маці падставілі свае ружовенькія твары для пацалункаў бабулі. Яны не маглі апамятацца, бо іх бабуля была не падобная да тых, якіх яны бачылі раней. Такой бабулі яны не бачылі ніколі! Здзіўленню іх не было канца, яны хадзілі вакол яе і разглядалі ад галавы да ног.

Разглядалі цёмны кажушок з доўгімі фалдамі ззаду, зялёную спадніцу ў складачкі, абшытую ўнізе шырокай стужкай. Падабалася ім чырвоная, у кветкі хустка, якую бабуля

---

[1] *Бялільня* — памяшканне, у якім што-небудзь беляць. У творы: *Старая бялільня* — мясцовасць, якая дала назву фальварку.

завязвала паўзверх белай. Дзеці прыселі на зямлю, каб убачыць чырвоную палоску на белых панчохах і чорныя чаравічкі. Вілімек шкроб каляровыя лапікі на муфце з рагожкі, якую бабуля трымала ў руках, а Ян, старэйшы з двух хлопцаў, церабіў бабулін белы, у чырвоныя палоскі фартух, таму што намацаў пад ім нешта цвёрдае — там была вялікая кішэня. Яну вельмі хацелася даведацца, што ляжыць у ёй, але старэйшая, Барунка, стрымала яго, прашаптаўшы: «Пачакай, а то я скажу, што хочаш забрацца ў бабуліну кішэню!» Шэпт быў такі гучны, што яго было б чуваць і за дзевяццю сценамі. Бабуля ўсё зразумела, адпусціла рукі дачкі, залезла ў кішэню са словамі: «Але паглядзіце, што ў мяне ёсць!» І паклала на калені пацеркі, сцізорык, некалькі скарынак хлеба, кавалак тканіны, два конікі з марцыпана, дзве лялькі. Гэтыя рэчы былі для дзяцей. Раздаўшы іх, бабуля дадала: «І я яшчэ нешта вам прывезла!» — і хуценька дастала з сумкі яблыкі і велікоднае яйка, з мяшка вызваліла кацянят, з кошыка — куранят. Колькі было радасці, колькі было скокаў! Бабуля — найлепшая з бабуль! «Кацяняты нарадзіліся ў траўні, чатырохколерныя, спрытна ловяць мышэй, іх варта трымаць у доме. Куранятў кемлівыя, і калі Барунка іх прывучыць, будуць бегаць за ёю, як сабакі!» — казала бабуля, і дзеці пыталіся ў яе пра адно і другое, нічога не баючыся, быццам былі з ёю добрымі сябрамі. Маці прыкрыкнула на малых, каб яны супакоіліся і адпусцілі бабулю адпачываць, але тая адразу запярэчыла: «Для мяне гэта радасць, Тэрэза, я вельмі задаволена ўсім»,— і дзеці паслухаліся яе. Адзін сядзеў у бабулі на каленях, другі на лавачцы стаяў за ёй. Барунка ж стала проста перад ёю і глядзела ў твар. Аднаму было дзіўна, што ў бабулі белыя як снег валасы, другому — што ў бабулі рукі ў зморшчынках, трэці казаў: «Бабуля, у вас толькі чатыры зубікі!» Бабуля ўсміхалася, гладзіла цёмна-рудую галаву Барункі рукою: «Таму што я старая. Калі вы вырасцеце, дык будзеце таксама іншымі». А дзеці ніяк не маглі паверыць, што іх белыя, гладкія рукі могуць быць такімі непрыгожымі, як рукі старэнькай бабулі.

Бабуля назаўсёды заваявала сэрцы сваіх унукаў, аддаўшы ім сваё. Пан Прошак, зяць бабулі, якога яна да гэтага не ведала, спадабаўся ёй прыгожым тварам і мілай

сардэчнасцю, дабрынёй і ветлівасцю. Адно толькі ў ім не магло падабацца, менавіта тое, што ён не гаварыў па-чэшску. А яна, якая па-нямецку некалі разумела, ужо даўно на тую мову забылася. А ёй так хацелася паразмаўляць з Янам! Бабуля парадавалася таму, што чэшскія словы Ян усё ж разумеў. Бабуля заўважыла, што размовы [redacted] хатнімі вядуцца наступным чынам: дзеці і служкі звярталіся да пана Прошака па-чэшску, а ён адказваў ім па-нямецку. Бабуля спадзявалася, што з часам і яна яго зразумее, і дапамагала яму, як магла.

Дачку сваю бабуля амаль не пазнавала: заўсёды памятала яе вясёлай вясковай дзяўчынай, [redacted] тут убачыла негаваркую, важную з выгляду кабету, у панскіх сукенках і з панскім норавам! Гэта была не яе Тэрэзка! Бабуля бачыла, што хатняя гаспадарка дачкі была не падобная да той, [redacted] якой яна звыклася. Першыя дні былі напоўнены радасцю і здзіўленнем, але паступова рэальнасць стала яе палохаць: яна пачувалася няўтульна ў новым доме, і калі б не ўнукі, то з радасцю вярнулася б у сваю хату.

У пані Тэрэзы былі свае прыхамаці, але пра іх ніхто не ўзгадваў, бо была пані добрай і абачлівай. І маці сваю пані Прошкаву вельмі любіла і не хацела ад сябе адпускаць, тым больш што была б вымушана пакінуць службу касцялянкі ў замку, калі б не было каму займацца гаспадаркай і дзецьмі.

Аднойчы яна заўважыла, што маці сумуе, і пачала разважаць, чаго ёй не хапае. І тады Тэрэза звярнулася да яе:

— Я бачу, матуля, што вы прывыклі працаваць і вам складана цэлы дзень сядзець з дзецьмі. Можа, вам хочацца прасці, то ў мяне на гарышчы ёсць трохі лёну. Пасля новага ўраджаю будзем мець яго шмат. Я была б вельмі ўдзячная, калі б вы трошкі прыгледзелі за гаспадаркай. Увесь свой час я прысвячаю працы ў замку, шыццю і гатаванню. Прашу вас, дапамажыце мне і рабіце ўсё так, як вам падабаецца.

— З радасцю, ты ж ведаеш, што я да такой працы звыклая,— адказала задаволеная бабуля.

У той жа дзень яна палезла на гарышча па лён. Назаўтра дзеці ўпершыню ў жыцці бачылі, як прадуць на верацяне.

Галоўным бабуліным абавязкам па гаспадарцы стала выпечка хлеба. Яна не магла мірыцца з тым, што служка з

гэтым Божым дарам абыходзіцца без усялякай павагі і клопату, без душы, нібы трымае ў руцэ цэглу.

Перад замесам бабуля крыжыкам асвячала дзяжу, а потым хрысціла ўжо гатовае цеста, каб адставала ад рукі. Ніхто не меў права заходзіць на кухню, пакуль «Божы дар не паспеў». Нават Вілімек, калі заходзіў туды падчас выпечкі хлеба, памятаў, што трэба сказаць: «Памагай, Божа!»

Унукі чакалі, калі бабуля будзе пячы хлеб, бо з кожнай выпечкі мелі па пляцёнцы і піражку са слівамі або яблыкамі. Яны павінны былі з павагай ставіцца да крошак. «Крошкі трэба адпраўляць у агонь»,— казала бабуля, калі змятала са стала і кідала іх у печ. Калі бабуля бачыла, як нехта з дзяцей ссыпаў крошкі хлеба на зямлю, яна загадвала іх сабраць і казала пры гэтым: «Па крошках хадзіць нельга, бо душа ў апраметнай будзе плакаць». Яна не любіла, калі хлеб рэзалі няроўна: «Хто не ўмее добра абыходзіцца з хлебам, той не зможа гэтага рабіць і з людзьмі». Аднойчы Янік папрасіў адрэзаць яму скарынку — найбольш ім любімую, але бабуля адказала: «Ці ты не чуў, што калі так рэжаш хлеб, то адразаеш Богу пяты? Рабі як трэба і не круці носам»,— і Янічак адмовіўся ад любімага кавалка.

Недаедзеныя дзецьмі скібачкі і скарынкі бабуля клала ў кішэні, а калі праходзіла каля вады, кідала рыбам, крышыла мурашам, гуляючы з дзецьмі ў лесе, частавала і птушак. У яе дарэмна не прапаў ні адзін кавалак, і яна заўсёды казала: «Паважайце Божы дар, без яго вельмі дрэнна, і хто на яго не зважае, таго Бог карае». Калі ў некага з дзяцей падаў кавалак хлеба, то яго трэба было падняць і пацалаваць, просячы прабачэння, і калі гарошынка ляжала дзенебудзь, то бабуля падымала яе і з павагай цалавала. Усяму гэтаму бабуля вучыла дзяцей. Убачыўшы на дарозе гусінае пяро, бабуля на яго паказвала рукою: «Нагніся, Барунка!» Гультаяватая ўнучка казала: «Але, бабуля, навошта падымаць адно пяро?» А бабуля адказвала: «Дзяўчына павінна думаць так: адно да другога — і будзе шмат. Памятай прымаўку: добрая гаспадыня павінна па пяро цераз плот пераскочыць».

У пані Прошкавай стаяла ў пакоях сучасная мэбля, якая бабулі не падабалася. Ёй здавалася, што на гэтых надзвычай мяккіх фатэлях з разны́мі спінкамі нязручна сядзець і

чалавек рызыкуе ўпасці, а калі захоча абаперціся — можа зламаць. Калі яна засталася ў доме адна і ўпершыню села на канапу, а спружыны пад ёй выгнуліся, то небарака так напалохалася, што ледзьве не закрычала. Дзеці ж смяяліся, скакалі па канапе, гушкаліся, пераконваючы, што тая не зломіцца, і клікалі бабулю, каб ішла да іх, але яна адмаўлялася, кажучы: «Заб'еце мяне; гэтыя фатэлі толькі для вас».

На бліскучыя столікі і скрыні яна баялася што-небудзь пакласці, каб не сапсаваць бляску, а скрыні са шклянымі дзвярамі, за якімі месцілася ўсялякае дабро, стаялі, на думку старой, на грэх. Дзеці вельмі любілі круціцца ля бабулі і даведвацца пра нешта новае, але за гэта маці сварылася на іх. Гушкаючы малую Адэльку, бабуля любіла падысці да клавіра, таму што заплаканае дзіця змаўкала, як толькі старая пачынала лёгка брынкаць па клавішах. Барунка нават вучыла бабулю іграць простую песню «Гэта коні, гэта коні», а бабуля ківала галавою пад музыку і казала: «І чаго толькі людзі не прыдумляюць! Чалавек здагадаўся, як зачыніць тут птушак, адно галасы звіняць».

У пакоі без патрэбы бабуля не ішла. У вольны ад спраў па гаспадарцы час яна сядзела ў сваёй святліцы, што была побач з кухняй і пакоем для слуг. Пакой абсталілі ў адпаведнасці з густам бабулі. Каля печы — лаўка, далей уздоўж сцяны стаяў бабулін ложак, за ложкам — маляваны куфар, а каля другой сцяны — ложак Барункі, якая спала ў адным пакоі з бабуляю. Пасярэдзіне стаяў ліпавы стол з перакладзінамі, а над ім са столі звісаў галубок[1] як сімвал Святога Духа. У кутку ля акна стаялі калаўрот, прасніца з кужалем, у кужалі — верацяно, на грэбені матавіла. На сцяне вісела некалькі абразоў, над ложкам бабулі — распяцце, упрыгожанае кветкамі. Паміж вокнамі зелянелі мушкет і бальзамін, а ў баваўняных мяшэчках былі схаваны разнастайныя зёлкі: ліпавы цвет, кветкі бэзу, рамонкі — гэта была бабуліна аптэка. За дзвярамі вісела ацынкаваная палівачка. У шуфлядзе ляжалі бабуліна шыццё, нізка рэлігій-

---

[1] *Галубок* — фігура птушкі, звычайна выразаная з дрэва, якая падвешвалася пасярод пакоя. Гэты прадмет адлюстроўваў народную набожнасць, падобна крыжу, што з'яўляецца сімвалам Бога-Сына. Сёння прадаецца як сувенір.

ных песень, кніга «Хаджэнні па пакутах», звязак шнуроў для калаўрота, асвечаная на свята «Трох каралёў» крэйда і грамнічная свечка, якую бабуля заўсёды трымала ў руцэ, калі была навальніца. На печцы стаяла металічная скрынка з крэменем, крэсівам і кнотам. Для асвятлення пакоя карысталіся напоўненай фосфарам бутэлечкай, але бабулі не падабалася гэтая прылада. Толькі аднойчы паспрабавала, і калі тая запрацавала і прапаліла фартух, які служыў ёй пятнаццаць гадоў, і яна ледзь не задыхнулася, дык з таго моманту больш не брала бутэлечку ў рукі. Як толькі яна здымала скрыначку з крэсівам, дзеці прыносілі анучы на кнот і рабілі запалкі: макалі палачкі ў серу. І бабуля мела свае звыклыя прылады для асвятлення на печцы і, задаволеная, клалася спаць. Дзецям таксама падабалася гэтым займацца, і кожны дзень яны распытвалі бабулю, ці не патрэбна ёй сера, каб зрабіць запалкі.

Больш за ўсё ў бабуліным пакоі дзяцей прыцягваў маляваны куфар. Яны любілі разглядаць намаляваныя на чырвоным фоне блакітныя і зялёныя ружы з карычневымі лісточкамі, блакітныя лілеі і чырвона-жоўтых птушак паміж імі. Але куды большая радасць апаноўвала, калі бабуля адчыняла куфар! Там было на што паглядзець! Распісаны знутры абразамі з малітвамі, радкамі з казанняў, ён напоўнены шмат якімі цікавымі рэчамі: сямейныя запісы, лісты ад дачок з Вены, маленькі бавоўняны мяшэчак, поўны сярэбраных грошай, якія бабуля атрымала ад дзяцей, але не скарыстала; драўляная шкатулка з пяццю ніткамі гранатаў, на якіх віселі манеты з профілямі цэзара Іосіфа і Марыі Тэрэзы. Калі яна шкатулку адчыняла (а яна яе заўсёды адчыняла па просьбе дзяцей), то казала: «Глядзіце, мілыя дзеткі, гэтыя гранаты я атрымала ад нябожчыка вашага дзядулі да вяселля, а гэты талер я атрымала ад цэзара Іосіфа ўласнаручна. То быў добры пан, дай яму, Божа, добрую славу! Але калі я памру, то яна будзе ваша!» — дадавала заўсёды, закрываючы шкатулку.

— Бабуля, раскажыце, як вам імператар даў гэты талер,— папрасіла аднойчы Барунка.

— Калі-небудзь нагадайце мне, і я вам раскажу,— адказала бабуля.

Акрамя гэтых рэчаў у бабуліным куфры было двое пацерак, стужкі для каптуроў, паміж якімі заўсёды ляжаў якінебудзь ласунак для дзяцей.

На дне куфра была складзена бабуліна бялізна і вопратка. Разнастайныя спадніцы, фартухі, летнія кабаткі, шнуровачкі і хусткі ляжалі ў выключным парадку, а наверсе — два белыя скураныя каптуры, з «галубкамі» ззаду. Дзецям было забаронена перабіраць бабуліны рэчы, але калі ў яе быў добры настрой, то яна сама брала іх і казала: «Бачыце, дзеткі, гэтая каніфаска ў мяне ўжо пяцьдзесят гадоў, гэты каптан насіла мая прабабка, гэты фартух мае ўзрост вашай маці, а ўсё як новае. Вы ж сваё адзенне не шануеце! Таму што не ведаеце цаны грашам! Бачыце, гэтая шаўковая блуза каштавала сто гульдэнаў, за яе па частках плацілі ў банк»,— працягвала бабуля, і дзеці моўчкі слухалі, нібыта ўсё разумелі.

Пані Прошкава жадала іншага, на яе погляд, лепшага адзення на бабулі, але тая нічога не мяняла ў сваім выглядзе і заўсёды казала: «Пан Бог мяне, старую кабету, пакараў бы, калі б захацела пайсці такой у свет. Гэтае адзенне не для мяне, стары мой розум такога ўбору не прымае». І заставалася ў старым. Хутка ў доме запанавала бабуліна слова, кожны называў яе «бабуляю», і ўсё, што яна казала і рабіла, было хораша.

II

Летам бабуля прачыналася ў чатыры, а зімою ў пяць гадзін раніцы. Найперш яна вітала Бога і цалавала крыжык, што вісеў на фісташкавых пацерках,— яго бабуля насіла заўсёды, а ноччу клала сабе пад галаву. Устаўшы з Божым імем, апраналася і, акрапіўшы сябе святою вадою, брала верацяно і прала, прачытаўшы перад тым ранішнюю малітву. Сама яна, бедная старая, не магла доўга спаць, але, ведаючы, наколькі сон салодкі, не замінала спаць іншым. Праз гадзіну пасля таго, як яна прачнулася, было чуваць размеранае шорганне яе чаравікаў, рыпенне адных, потым другіх дзвярэй, і вось бабуля з'яўлялася на ганку. У тое самае імгненне загагаталі гусі ў хлеўчуку, зарохкалі свінні,

замычэла карова, залопалі крыламі куры, аднекуль прыбеглі каты і пачалі лашчыцца каля яе ног. Сабакі выскачылі з будак, пацягнуліся і ў адзін момант апынуліся каля бабулі, і калі б яна не засцераглася, яны штурхнулі б яе, а пляцёнку з зернем для птушак вырвалі б з рук. Усе жывёлы вельмі любілі бабулю, а яна іх. Не давядзі Божа ёй было ўбачыць, што нехта некага крыўдзіць, нават чарвячка. «Калі чалавеку нешта патрэбна для спажывы, то, калі ласка, забіце, але хай не пакутуе». Дзеці не маглі глядзець, як рэжуць курэй, бо шкадавалі іх і верылі, што тыя не могуць памерці.

Аднойчы бабуля моцна ўгневалася на абодвух сабак, Султана і Тырла. Але было за што гневацца! Сабакі падкапаліся да хлеўчука і загрызлі за адну ноч дзесяць качанят, прыгожых, жоўценькіх, на якіх нельга было глядзець без замілавання. У бабулі апусціліся рукі, калі раніцай адчыніла хлявок і гуска вылецела з гогатам, нібы аплакваючы сваіх загінуўшых дзяцей, якіх выседзела замест іх непаседлівай маці, усяго толькі з трыма качанятамі. Бабуля спачатку вырашыла, што шкоднічала зладзейка-куніца, але потым па слядах зразумела, што гэта зрабілі сабакі. Сабакі, верныя вартаўнікі! Бабуля вачам сваім не верыла. А яшчэ прыйшлі і лашчацца, нібыта нічога не здарылася! Гэта бабулю ўгнявіла: «Пайшлі прэч, нягоднікі! Што вам зрабілі качаняты? Можа, вы галодныя? Напэўна, з простага свавольства такога нарабілі? Пайшлі прэч, бо не хачу вас бачыць!» Сабакі падціснулі хвасты і папляліся да будак, а бабуля, забыўшыся, што яшчэ рана, пайшла ў пакой паведаміць дачцэ пра свой смутак.

Пан Прошак вырашыў, што, няйначай, злодзеі абрабавалі камору або забілі Барунку, калі ўбачыў бледны, заплаканы твар бабулі, якая выходзіла з пакоя. Калі ж пачуў пра здарэнне, то з палёгкай пасміхнуўся. І сапраўды, ці мог ён перажываць праз нейкіх качанят. Ён жа не садзіў гуску на яйкі, не бачыў, як з тых яек выходзілі птушаняты; ён жа не бачыў, як, засунуўшы галовы ў ваду, яны перабіраюць лапкамі. Пан Ян страціў толькі некалькі кавалкаў смажаніны. Але гэта выклікала ў яго жаданне навесці парадак, таму ён узяў пугу і пайшоў задаць сабакам па заслугах. Бабуля заткнула вушы, пачуўшы віск і лямант у двары,

але падумала: «І то праўда, няхай памятаюць!» Калі ж праз гадзіну-другую сабакі са сваіх будак не павысоўвалі насы, то бабуля пайшла паглядзець, ці не занадта пакрыўдзілі іх. «Што здарылася, тое здарылася, ■ сабакі тым не менш жывыя стварэнні!» — казала яна, набліжаючыся да будак. Сабакі пачалі скуголіць, жаласліва на яе пазіраць, ледзь не на жываце да яе паўзці. «Цяпер вы шкадуеце, ці не так? Бачыце, як караюць за непаслушэнства? Памятайце пра гэта!» Сабакі запомнілі. І ў далейшым, калі гусяняты або качаняты гулялі па двары, адыходзілі і глядзелі ў іншы бок, чым здабылі бабуліну сімпатыю.

Калі бабуля дагледзела птушак, то пацікавілася, ці не прачнуліся служкі. А шостай гадзіне яна падышла да ложка Барункі, лёгка дакранулася да лба (бо так душа хутчэй прачнецца) і прашаптала: «Уставай, дзяўчынка, уставай, ужо позні час». Потым яна дапамагла ўнучцы апрануцца і пайшла да малых, што спалі наверсе. Калі бачыла, што той ці іншы малы ляжыць яшчэ ў ложку, то шлёпала яго ніжэй спіны, гаворачы: «Уставай, уставай, певень ужо дзевяць разоў абышоў сметнік, а ты яшчэ спіш, ці не сорамна?» Памыцца дзецям бабуля дапамагала, але вопраткай займацца ёй не хацелася. Цяжка было разабрацца з гузікамі, гафтачкамі, аплікамі на куртках і сукенках; звычайна яна апранала іх дзецям задам наперад. Калі дзеці былі ўжо апранутыя, бабуля станавілася разам з імі на калені перад абразом Хрыста, які благаслаўляў дзяцей, чытала «Ойча наш», пазней усе ішлі на сняданне.

Зімою, калі не было важных спраў па гаспадарцы, бабуля сядзела ля калаўрота, а ўлетку — з верацяном на двары, у садку пад ліпай або ішла з дзецьмі на шпацыр. Пры гэтым збірала зёлкі, якія дома сушыла і захоўвала на патрэбу. Да дня святога Яна Хрысціцеля хадзіла па лекавыя травы па расе, таму што яны ў гэты час найлепшыя. Калі нехта хварэў, дык бабуля заварвала зёлкі: горкую канюшыну ад нястраўнасці, дзядоўнік ад хвароб горла... І ніколі ў сваім жыцці яна не пасылала па лекара.

Акрамя таго, зёлкі ў дом прыносіла нейкая знахарка з Крканошскіх гор, у якой бабуля набывала іх у запас. Зельніца прыходзіла кожную восень у адзін і той жа час на Старую бялільню, дзе яе хораша сустракалі. Кожны год

дзеці атрымлівалі ад яе пакеты чамярыцы ад прастуды, гаспадыні — розныя араматычныя травы і мох для курэння, акрамя таго, зельніца цэлы вечар апавядала дзецям пра Рыбрцоўля[1], пра тое, які ён штукар і што робіць у гарах. Асабліва падабаўся дзецям аповед пра тое, як скача Рыбрцоўль да сваёй прынцэсы Качэнкі кудысьці на Качэнчыны горы, дзе яна жыве. Але, як сапраўдная прынцэса, тая нядоўга трывае яго каля сябе і гоніць прэч, а ён плача так горка, што ўсе рэкі ў гарах разліваюцца. Калі ж яна клікча яго да сябе, то Рыбрцоўль з такой радасцю спяшаецца да каханай, што ўсё, што ляжыць на яго шляху, коціцца, выварочваецца і зрываецца. Словам, лес выварочваецца, каменне ляціць з гор, дахі зносіць з хат, і дарога выглядае як перад канцом свету.

Зельніца прыносіла кожны год звыклыя зёлкі і адны і тыя ж казкі, але дзецям яны здаваліся кожны раз новымі, і заўсёды малыя яе чакалі. Калі бачылі, як паступова пусцее луг, то гаварылі: «Ну, ужо хутка прыйдзе бабка з гор». Калі тая на некалькі дзён спазнялася, то бабуля перажывала: «Ці не здарылася чаго са старою, можа, захварэла ці нават, не дай Бог, памерла». Такія размовы паўтараліся да таго часу, пакуль не з'яўлялася на двары зельніца з кошыкам на спіне.

Часта бабуля з унукамі выпраўлялася ў далёкую вандроўку ў хату лесніка, або да млына, ці ў лес, дзе весела спявалі птушкі і мяккім дыванам слаўся пад дрэвамі мох, а колькі тут расло духмяных кветак: ландыш, белыя анемоны, святаяннік, пралескі, зараснікі бузіны і прыгожыя залацістыя лілеі. Гэтыя лілеі прыносіла ім бледная Вікторка, калі бачыла, што людзі збіраюць кветкі і робяць з іх букеты.

Вікторка заўсёды была бледная, толькі вочы свяціліся, як два вугольчыкі, чорныя валасы растрапаныя; ніколі не насіла яна прыгожай вопраткі, ніколі не гаварыла. Каля лесу рос вялікі дуб, пад якім Вікторка стаяла гадзінамі, гледзячы ўніз на гаць. Увечары яна спускалася да гаці,

[1] *Рыбрцоўль* — герой чэшскіх паданняў, дух гор, персаніфікаваная назва ветру. Рыбрцоўль — народная, сёння ўжо архаічная назва Крканош — самых высокіх гор у Чэхіі.

садзілася на замшэлы пень і, гледзячы на ваду, доўга, аж да ночы, спявала.

— Бабуля,— пыталіся дзеці ў старой,— чаму Вікторка ніколі не апранае прыгожую сукенку, нават у свята? І чаму ніколі не гаворыць?

— Таму што звар'яцела!

— А калі, бабуля, чалавек вар'яцее? — пыталіся дзеці.

— Ну, калі ў чалавека няма розуму.

— А што робіцца з чалавекам, калі ён не мае розуму?

— Ну, вось Вікторка, напрыклад, ніколі не гаворыць, ходзіць у лахманах, жыве ў пячоры і летам, і зімою.

— А ноччу таксама? — спытаўся Вілем.

— А як жа, ці не чуеце, як да ночы ля гаці спявае, а пазней ідзе ў пячору спаць.

— І не баіцца ні блукаючых агеньчыкаў, ні вадзяніка? — дзівіліся дзеці.

— Няма ніякіх вадзянікоў,— цвёрда прамовіла Барунка.— Тата пра гэта казаў.

Летам Вікторка зрэдку падыходзіла да хаты прасіць ежу, а зімою, як тая варона, стукала ў дзверы або ў акно: прасуне руку, атрымае кавалак хлеба і адразу ж моўчкі адыдзе. Дзеці, калі бачылі на снезе крывавыя Вікторчыны сляды, беглі і клікалі: «Вікторка, ідзі да нас, маці табе дасць чаравікі, можаш у нас жыць!» Але тая, не азіраючыся, уцякала ў лес.

У цудоўны летні вечар, калі неба было ясным і прыгожым, а зоркі ярка гарэлі, бабуля адпачывала разам з дзецьмі пад ліпай. Паколькі Адэлька была малая, то сядзела ў бабулі на каленях, а Барунка з хлопцамі каля ног. Іначай і быць не магло, бо калі бабуля пачынала апавядаць, ім трэба было глядзець ёй у твар, каб не прапусціць ніводнага слоўца.

Бабуля апавядала ім пра светлых анёлаў, якія жывуць высока і запальваюць для людзей зоркі, пра анёлаў-ахоўнікаў, што берагуць дзяцей на ўсіх шляхах жыцця, радуюцца, калі растуць годнымі, плачуць — калі непаслухмянымі. Дзеці ўздымалі вочы ў неба, дзе бачылі мірыяды зорак, маленькіх, што мігцелі, і вялікіх, якія зіхцелі ўсімі фарбамі вясёлкі.

— Якая з гэтых зорак мая? — аднойчы ўвечары спытаўся Ян.

— Гэта ведае толькі Бог. Але толькі падумай, ці можна знайсці яе сярод мільёнаў зорак? — адказала бабуля.

— А каму належаць гэтыя прыгожыя зоркі, што так блішчаць? — спытала Барунка.

— Тым людзям, якія дагадзілі Богу, выбраннікам Божым, што шмат добрага зрабілі і ніколі не гнявілі Бога,— растлумачыла старая.

— Бабуля,— пыталася зноў Барунка, калі загучалі жаласлівыя гукі бязладнай песні,— Вікторка таксама мае сваю зорку?

— Мае, але пацямнелую. А цяпер пойдзем, я вас пакладу спаць, ужо позні час,— дадавала старая, калі добра сцямнела.

Дома бабуля, разам з дзецьмі прачытаўшы малітву «Анёл Божы, абаронца мой...» і акрапіўшы ўнукаў святой вадой, паклала іх у ложкі. Малыя адразу ж паснулі, а Барунка шмат разоў клікала бабулю да ложка і прасіла: «Пасядзіце каля мяне, бабуля, я не магу заснуць». Тады старая, трымаючы руку ўнучкі, пачынала маліцца разам з дзяўчынкай, пакуль тая не засынала.

Спаць клалася бабуля а дзесятай, гэта быў яе час. Усе справы былі зроблены. Перад сном бабуля правярала, ці ўсе дзверы зачыненыя, клікала котак і зачыняла іх на гарышчы, каб тыя не прабраліся часам у пакой да дзяцей і не ўдушылі іх; залівала ў печцы кожную іскрынку, клала на стале крэмень, крэсіва і лучыну. Калі збіралася навальніца, то рыхтавала грамнічную свечку, загортвала ў белую хустку бохан хлеба і, кладучы на стол, наказвала служкам:

— Памятайце, калі пачнецца пажар, то першае, што чалавек павінен узяць,— гэта хлеб, тады не разгубіцца.

— Але, бабуля, маланка неабавязкова патрапіць,— казалі служкі.

Але бабуля не адступалася:

— Толькі Бог гэта ведае. Што вы можаце ведаць? Абачлівасць заўсёды патрэбная. Памятайце пра гэта.

Калі ўсё было дагледжана, бабуля станавілася на калені перад распяццем, малілася, яшчэ раз акрапіўшы сябе і Барунку святою вадою, клала пад галаву свае фісташкавыя пацеркі і з малітвай засынала.

III

Калі б чалавек, звыклы да шумнага жыцця вялікага горада, трапіў у даліну, дзе стаіць адзінокі дом, у якім жыла сям'я Прошкавых, то падумаў бы: «І як тут гэтыя людзі могуць жыць цэлы год? Я тут жыць не хацеў бы. Хіба толькі калі ружы квітнеюць... Божа! Якія ж тут радасці!» А між тым тут было шмат радасці і зімою, і летам! Пад нізкай страхой панавалі мір і згода, якія толькі часам азмрочваліся з нагоды ад'езду пана Прошака ў сталіцу або чыёй-небудзь хваробай.

Дом быў невялікі, але ўтульны. Па сцяне, што глядзела на ўсход, вілася вінаградная лаза, пад вокнамі быў маленькі гародчык, дзе акрамя ружаў, фіялак, рэзеды раслі таксама салата, пятрушка і іншая зеляніна. На паўночна-ўсходнім баку размяшчаўся сад, а за ім цягнуўся луг аж да млына. Вялікая старая груша стаяла каля самага дома, паклаўшы ўсе свае галіны на крытую гонтай страху, пад якой гняздзілася шмат ластавак. У цэнтры двара расла ліпа, пад ёю была лавачка. На паўднёва-заходнім баку знаходзіўся невялікі гаспадарчы дамок, а за ім аж да гаці цягнуўся ўгару хмызняк. Каля дома праходзілі дзве дарогі. Адна, для вазоў, ішла ўверх уздоўж рэчкі да Рызенбургскага замка і далей на Чэрвену Гору, другая — уніз да млына і каля ракі — аж да найбліжэйшага мястэчка, да якога было каля гадзіны шляху. Бурлівая рака Упа бегла з Крканошскіх гор, падаючы з уцёсаў і скал, прабіраючыся вузкімі цяснінамі да логу, дзе без перашкод працягвала свой шлях аж да Лабы, адзін з берагоў якой быў узгорысты і зарослы лесам.

Перад домам, якраз каля садочка, вілася сцяжынка, што бегла ўздоўж канавы, праведзенай ад гаці да млына. Ад дома праз канаву перакінуты масток на той бок, дзе стаялі печ і сушыльня. Сюды восенню, калі сушыліся слівы, яблыкі і грушы, праз масток часта забягалі Ян з Вілемам, уважліва аглядаючыся, каб бабуля не ўбачыла. Але бабуля, зайшоўшы ў сушыльню, адразу ж заўважала, колькі сліў не хапае і хто па іх прыходзіў.

— Янек, Вілем, хадзіце сюды! — клікала яна, спусціўшыся ўніз.— Мне здалося, што вы на бляху дадалі сліў?

— Не, бабуля,— адгукаліся хлопцы, зачырванеўшыся.

— Не падманвайце! — гразілася бабуля.— Ці вы не ведаеце, што Бог усё чуе?

Хлопцы маўчалі, але бабуля ведала ўсё. Дзеці здзіўляліся, адкуль бабуля даведваецца, як толькі яны нешта зробяць, і як гэта можа быць, што яна здагадваецца па іх вачах. Таму прыйшлі да высновы, што не трэба ад яе нічога хаваць.

Летам, у гарачыню, бабуля распранала дзяцей ажно да кашулькі і вяла да ручая купацца. Заводзіла ў ваду толькі да калена, бо баялася, каб дзеці не патапіліся. Яна садзіла іх на масткі, дзе паласкалі бялізну, і дазваляла дзецям боўтаць ножкамі ў вадзе і гуляць ■ рыбкамі, якія, як стрэлы, праносіліся міма. Над вадою схіляліся цемналістыя вольхі. Дзеці рвалі галінкі, кідалі іх у ваду і сачылі за тым, як плынь адносіць іх усё далей і далей. [...]

Пан ляснік, які праходзіў недалёка, убачыўшы Адэльку, сказаў, што гэта малая русалачка. Адэлька пакруціла русай галоўкай і запярэчыла: «А вось і не! Русалак не бывае!»

Бабуля, калі бачыла пана лесніка, заўсёды казала: «Заходзьце, пане куме. Нашыя дома!» Хлопцы бралі таго за руку і вялі да дома. Часам пан ляснік бараніўся, тлумачачы, што павінен даглядаць маладых фазанаў, якія толькі вывеліся, альбо зрабіць нешта ў лесе. Аднак калі яго ўбачылі пан Прошак або пані, дык хочаш не хочаш, мусіш зайсці.

Пан Прошак любіў пачаставаць шклянкай добрага віна мілага госця, а пан ляснік якраз і адносіўся да такіх чаканых гасцей. Бабуля хутка прыносіла хлеб і соль і што яшчэ было ў доме, а пан ляснік забываўся на маладых фазанаў. Потым, спахапіўшыся і дакараючы сваю дрэнную памяць, закідваў стрэльбу на плячо і ішоў. Але на двары не знаходзіў свайго сабакі. «Гектар! — клікаў ён, але таго не было.— І дзе яго чэрці носяць?!» Хлопцы з ахвотаю беглі на пошукі, упэўненыя, што знойдуць сабаку, які лётае недзе з Султанам і Тырлам, а пан ляснік садзіўся на лавачку пад ліпай. Адыходзячы, спыняўся, клікаў бабулю: «Хацелася б вас бачыць сёння на гары — мая старая для вас прыхавала яйкі тыролек пад квактуху». Пан ляснік ведаў слабыя бакі

клапатлівых гаспадынь! Бабуля тут жа пацвярджала: «Мы абавязкова прыйдзем! Найлепшыя пажаданні дамашнім». Так па-сяброўску яны і развітваліся.

Пан ляснік праходзіў ля Старой бялільні амаль кожны дзень, і так працягвалася з году ў год.

Другой асобай, якую можна было штодзень сустрэць а дзесятай гадзіне ля Старой бялільні, быў пан млынар. Менавіта ў гэты час ён хадзіў даглядаць гаць. Бабуля казала пра млынара, ці, лепей, пра «пана бацьку», як амаль усе яго называлі, што ён памяркоўны чалавек, але насмешнік.

Сапраўды, пану млынару падабалася кпіць, жартаваць, але ён мала смяяўся сам, толькі неяк крывіўся. Вочы з-пад густых броваў весела глядзелі на свет. Быў ён сярэдняга росту, каржакаваты і на працягу года насіў белаватага колеру штаны, што вельмі здзіўляла хлопцаў, але пан бацька ім растлумачыў, што гэта колер млынароў. Зімою ён апранаўся ў доўгі кажух і цяжкія боты, а летам — у блакітную камізэльку, белыя, з тонкай воўны шкарпэткі і чаравікі. Галаву заўсёды вянчала нізкая шапка з аўчыны. Незалежна ад таго, суха было на дварэ ці гразка, штаны пан млынар насіў заўсёды падкасаныя, і без табакеркі яго ніхто ніколі не бачыў. Дзеці, як толькі яго заўважалі, беглі насустрач, жадалі добрай раніцы і ішлі з ім аж да гаці. Па дарозе пан бацька заўсёды жартаваў з Вілема і Яна: у першага пытаўся, ці ведае, дзе з вала касцёл[1], а ў другога — ці зможа падлічыць, колькі будзе каштаваць булка за крэйцэр, калі корац[2] пшаніцы каштуе дзесяць рэйнскіх гульдэнаў. Калі хлопец, смеючыся, правільна адказваў, млынар гаварыў: «Ну, я бачу, што ты разумны. Цябе можна прызначыць старастам у Крамольне». Ён заўсёды даваў хлопцам панюхаць табакі, а калі тыя пачыналі чхаць, усміхаўся. Адэлька хавалася за бабуліну спадніцу, калі бачыла пана бацьку: яна яшчэ не ўмела добра гаварыць, а той дражніў яе, прымушаючы тройчы вельмі хутка паўтараць: «Наша ліштва з усіх ліштваў самая ліштвістая». Безумоўна, беднай дзяўчынцы гэта давалася з вялікай цяжкасцю, таму пана млынара яна баялася. Але атрымлівала ад яго кошык клубніц, міндальныя

---

[1] Гульня слоў: касцёл вёскі Звол.

[2] *Корац* — мера аб'ёму (93,6 літра).

арэшкі або іншы пачастунак, і калі пан бацька хацеў яе прылашчыць, то называў малой шчабятушкай.

Кожны дзень каля Старой бялільні праходзіў і доўгі Мойжыш, панскі вартаўнік. Быў ён вельмі высокі, як жардзіна, пануры і насіў за плячыма мех. Прыслужніца Бетка гаварыла, што ў той мех ён збірае непаслухмяных дзяцей, і з таго часу малыя, калі бачылі доўгага Мойжыша, адразу станавіліся цішэй вады, ніжэй травы. І хаця бабуля такія аповеды Бетцы забараніла весці, але калі даведалася ад другой прыслужніцы Воршы, што Рабэрта Мойжыш нячысты на руку, нічога не сказала ёй. Напэўна, гэты Мойжыш сапраўды благі чалавек, калі ўнукі яго так баяцца і вераць, што ў мяху сядзяць дзеці.

Летам, калі прыязджала княгіня, дзеці шмат разоў бачылі прыгожую пані на кані ў суправаджэнні вялікай світы.

Аднойчы пан млынар сказаў бабулі:

— Мне здаецца, нібы з'явілася камета, якая цягне за сабой хвост.

— Ёсць розніца, пан бацька, камета прыносіць няшчасце, а калі з'яўляецца панства, то, глядзі, людзям радасць будзе,— адказала бабуля.

Млынар перавярнуў у руцэ табакерку, нібы млынарскае кола (была ў яго такая звычка), усміхнуўся, але нічога не сказаў.

Увечары наведаць бабулю і дзяцей прыходзіла Крыстла, дачка гаспадара шынка каля млына. Дзяўчына-красачка была свежая, жвавая, як вавёрка, вясёлая, як птушачка. Бабуля заўсёды радавалася Крыстле і называла яе сакатушкаю, бо тая вельмі любіла смяяцца.

Крыстла залятала, пан ляснік заставаўся, пан млынар заходзіў толькі на хвілінку, пані млынарыха, калі часам выбіралася ў Старую бялільню, то брала з сабою верацяно. Леснікова жонка прыходзіла з малым дзіцем. А калі збіралася іх наведаць жонка аканома, то пані Тэрэза казала: «Сёння я чакаю візіту». [...]

Самым доўгачаканым госцем для дзяцей быў пан Бейер — ляснік з Крканошскіх гор. Ён спускаўся кожную вясну ўніз, каб назіраць за сплавам лесу, які накіроўвалі па Упе ў даліну.

Пан Бейер быў высокі і худы, адна скура ды косці. У яго былі доўгі смуглявы твар, вялікія светлыя вочы, нос з гарбінкай, каштанавыя валасы і велізарныя вусы, якія апускаліся ўніз.

Рызенбургскі ляснік — каржакаваты, мажны, чырванатвары, меў маленькія вусікі і заўсёды акуратную прычоску. У пана Бейера валасы былі падзелены на прабор і звісалі над каўняром. Дзеці яго адразу пазнавалі.

Рызенбургскі ляснік заўсёды хадзіў павольна, а пан Бейер — нібы праз калдобіны скакаў. Першы не абуваў высокія цяжкія боты аж пад калена, меў прыгажэйшыя стрэльбу, рэмень і сумку, насіў шапку з савіным пяром. У пана Бейера былі вылінялы плашч, вялікі рэмень, на якім вісела стрэльба, а на зялёным, з лямцу капелюшы зіхацелі пёры ястраба, каршуна і арла.

Так выглядаў пан Бейер. Дзеці палюбілі яго з першай сустрэчы. А бабуля сцвярджала, што дзеці і сабакі імгненна распазнаюць чалавека, які іх любіць. Бабуля не памылілася. Пан Бейер вельмі любіў дзяцей, асабліва Яна, шкадлівага Яна, пра якога ўсе казалі, што ён чарцянё. Тым не менш пан Бейер сцвярджаў, што той вырасце добрым хлопцам, і калі яму даспадобы будзе праца лесніка, то дапаможа яму авалодаць гэтай прафесіяй.

Пан Рызенбургскі, які таксама наведваў Старую бялільню, калі там быў яго калега з гор, казаў:

— Ну што ж, калі захоча стаць леснікам, вазьму яго да сябе, мой Францік таксама павінен леснікам быць.

— Не, пане браце, добра, калі малады чалавек праходзіць праз выпрабаванні, а вы, леснікі, якія тут, унізе, нічога не ведаеце пра сапраўдныя цяжкасці.

І тут пачынаў ляснік пералічваць складанасці сваёй прафесіі, казаць пра віхуры і заносы, пра дрэнныя дарогі і бездані, моцныя завеі і маразы. Апавядаў пра тое, што шмат разоў быў паміж жыццём і смерцю, калі нага яго слізгала па страшнай дарозе, пра тое, як блукаў, як галадаў па дватры дні, не ведаючы, калі зможа выбрацца з лабірынту.

— Але затое,— казаў,— не ведаеце, як бывае прыгожа ў гарах летам. Калі снег растане, зазелянеюць раўніны, закрасуюць кветкі, лес напоўніцца пахамі і спевамі, усё зачароўвае. Радасна тады хадзіць па лесе, хадзіць з ім на спатканне.

Два разы на тыдзень заходжу на Снежку. Калі бачу, як устае сонца і пад маімі нагамі ляжыць Божы свет, то думаю, што нікуды не хачу ісці, забываюся на ўсе цяжкасці.

Пан Бейер прыносіў дзецям горныя крышталі, апавядаў пра тое, як знайшоў іх, гаварыў пра скалы і пячоры. Прыносіў духмяны, як фіялкі, мох, любіў успамінаць пра цудоўны сад Рыбрцоўля, куды нібыта трапіў аднойчы, блукаючы ў страшэнную віхуру і снежную завіруху па гарах.

Хлопчыкі не адыходзілі ад лесніка цэлы дзень, хадзілі з ім усюды, глядзелі, як сплаўляюць лес, плавалі на плыце. Калі ж раніцай пан Бейер развітваўся з Прошкавымі, дзеці заліваліся слязьмі і разам з бабуляю праводзілі госця. Пані Тэрэза кожны раз давала яму на дарогу столькі ежы, што ён ледзьве нёс.

— Ну, дасць Божа, у наступным годзе ўбачымся. Бывайце здаровыя! — казаў пан Бейер, адмерваючы велізарныя крокі.

Доўга яшчэ потым дзеці апавядалі адно аднаму пра розныя цуды і жахі на Крканошскіх гарах, прыгадвалі пана Бейера і не маглі дачакацца, калі зноў прыйдзе вясна.

IV

Акрамя вялікіх святаў, нядзелю дзеці таксама чакалі з радасцю. У нядзелю бабуля іх не будзіла рана, таму што ўжо даўно была на ранняй службе ў мястэчковым касцёле: на імшу яна, старая гаспадыня, ужо звыклася хадзіць на світанні. Маці і бацька, калі ён быў дома, хадзілі на познюю службу, а ў добрае надвор'е ішлі разам з дзецьмі насустрач бабулі. Ужо здалёк тыя яе заўважалі, клікалі і беглі з радаснымі крыкамі да яе, нібы год не бачылі. У нядзелю бабуля здавалася ім маладзейшай: твар святлейшы, больш ласкавы, і вопратка прыгажэйшая: на нагах чорныя чаравікі, на галаве белы каптур з вялікім накрухмаленым бантам — здалёк здавалася, што на галаве яе сядзіць белакрылая галубка. Дзеці казалі, што бабуля ў нядзелю «страшэнна прыгожая».

Звычайна яны падбягалі да бабулі, і кожны з іх хацеў нешта несці. Аднаму яна давала пацеркі, другому — хустку.

Барунка як старэйшая несла сумку. Таму і ўзнікалі спрэчкі: цікаўныя хлопцы хацелі зазірнуць у сумку, а Барунка не дазваляла. Даходзіла да таго, што Барунцы прыходзілася прасіць бабулю насварыцца на хлопцаў. Але бабуля замест таго брала сумку і кожнаму з дзяцей давала яблык ці нешта іншае, пасля чаго ўсталёўваўся чаканы спакой.

Пані Прошкава кожную нядзелю казала: «Вельмі прашу вас, матуля, не насіце ім больш нічога!» Але бабуля кожную нядзелю ёй адказвала: «Як гэта так, каб з касцёла нічога не прынесці? І мы ў іх узросце былі такімі ж!» І ўсё заставалася па-ранейшаму.

Разам з бабуляй з касцёла вярталася пані мама, жонка млынара, а часам яшчэ нейкая кума з Жэрнава, вёскі, што была бліжэй да млына. Пані мама насіла доўгую спадніцу, кофту і каптур з серабрыстых нітак. Гэта была невысокая паўнаватая кабета з чорнымі вясёлымі вачыма, кароткім, крыху пляскатым носікам, двайным падбародкам; на яе вуснах заўсёды іграла прыветная ўсмешка. На шыю ў нядзелю яна вешала нітку дробнага жэмчугу, а штодня насіла гранат. У руцэ трымала кошык, у якім ляжалі зёлкі, патрэбныя ў гаспадарцы.

За жанчынамі ішоў пан бацька, звычайна з нейкім кумам. Калі было горача, то свой светла-шэры каптан млынар нёс на пальцы цераз плячо. У нядзелю ён абуваў наваксаваныя боты, у якія запраўляў вузкія штаны. На галаве ў яго была высокая чырвоная шапка з аўчыны, на якой з аднаго боку звісалі сінія стужачкі. Кум апранаўся падобна да пана бацькі, толькі на ім быў доўгі плашч з вялікімі алавянымі гузікамі і фалдамі ззаду; плашч — зялёнага колеру, а не шэрага, як у пана бацькі.

Людзі, што ішлі на познюю службу, віталі іх словам Божым і ў адказ чулі найлепшыя пажаданні. Часам яны спыняліся, распытвалі адзін аднаго пра жыццё, пра навіны ў Жэрнаве, пра справы на млыне. Зімою жыхара Жэрнава рэдка можна было сустрэць на дарозе да касцёла, бо тады сцежка была небяспечная, а летам спускацца з узгорка было лягчэй, асабліва для моладзі. У нядзелю да абеду па дарозе, што цягнулася праз луг, у бок мястэчка бясконца ішлі людзі.

Вось ідзе не спяшаючыся старая ў кажушку і хустцы, а каля яе, абапіраючыся на палку, крочыць муж, пра іх гады сведчыць грэбень у валасах кабеты, бо такой моды трымаюцца толькі пажылыя людзі.

Ідуць жанчыны ў белых каптурах з «галубкамі»; мужчыны ў заломленых шапках з аўчыны або выдры імкнуцца раней за жанчын перайсці доўгі масток праз рэчку. Прытанцоўваючы, збягаюць уніз, нібы лані, дзяўчаты, а за імі спяшаюцца хуткія, як алені, хлопцы. Сярод вецця мільгае белы рукаў, зачапілася за куст чырвоная стужка, што вілася па плячы, паказалася стракатая вышытая камізэлька хлопца, і нарэшце вясёлая кампанія выбегла на зялёны лужок.

Вярнуўшыся дахаты, бабуля здымала святочную сукенку, апранала даматканую, з грубай воўны, спадніцу і пачынала займацца гаспадаркай. Пасля абеду яна любіла сесці побач з Барункай, пакласці ёй на калені галаву, каб тая пашукала ёй у валасах. Звычайна пры гэтым засынала, але ненадоўга. Прачынаючыся, здзіўлялася, што заснула: «Я і не ведаю, як гэта вочы закрыліся!»

Пасля абеду бабуля хадзіла з дзецьмі да млына, такая ўжо была завядзёнка, і дзеці гэтаму надзвычай радаваліся. Млынар з жонкай мелі дачку, аднагодку Барункі, якую звалі Манчынкай. Гэта была добрая і вясёлая дзяўчынка.

Каля млына перад брамай, паміж дзвюх ліп, стаяла статуя Яна Непамуцкага[1], тут пасля абеду ў нядзелю сядзелі пані мама з Манчынкай, часам да іх далучалася якая-небудзь кума з Жэрнава, якая затрымалася тут. Пан бацька з табакеркай у руках стаяў каля іх і што-небудзь расказваў. Як толькі яны бачылі, што бабуля з унукамі ідуць уздоўж рэчкі, Манчынка падхоплівалася і бегла ім насустрач, а пан бацька ў сваім нязменным светла-шэрым каптане, чаравіках і падкасаных штанах, не спяшаючыся, разам з кумою ішоў следам за дачкой; пані мама вярталася на млын, бо «трэба было нешта прыгатаваць, каб пачаставаць дзяцей». І раней, чым падыходзілі дзеці, пад вокнамі дома ў садку або на востраве быў ужо накрыты стол; зімою дзяцей кармілі ў доме. На стале — здобныя булкі, хлеб, мёд, масла і смятана. Потым пан бацька прыносіў у кошыку садавіны або пані

---

[1] *Ян Непамуцкі* — праслаўлены чэшскі святы.

мама — пляцёнку сушаных яблыкаў, груш і сліў. Кава і падобныя панскія напоі былі тады не ў модзе.

«Як добра, бабуля, што зайшлі,— казала пані мама, прапануючы крэсла,— калі б вы не прыйшлі да нас у нядзелю, то і нядзеля не была б нядзеляю. А цяпер пачастуйцеся, што Пан Бог даў!»

Бабуля ела мала і прасіла, каб пані мама не давала таксама шмат дзецям, але на гэта паўнаватая пані мама толькі смяялася: «Вы ўжо старая, таму не дзіўлюся, што мала ясце, але дзеці, ох, Божа, маюць жалезныя страўнікі! Паглядзіце на панну Манчу, калі хочаце, яна вам скажа, што заўсёды галодная». Дзеці ўсміхаліся і былі цалкам згодныя з пані мамай.

Калі пані мама давала ім па булцы, яны беглі за стадолу. Цяпер у бабулі клопату не было. Дзеці гулялі з мячом у «каня», «на фарбы» і падобныя гульні. Чакала іх там заўсёды адна і тая ж кампанія: шасцёра дзяцей, адзін меншы за другога, як трубы ў аргане. [...]

Зімою дзеці амаль палову дня не злазілі з печы. Печ вялікая, так што знаходзілася там месца і для служкі, і для Манчынчыных цацак і лялек. Калі туды залазілі дзеці, то займалі ўсё месца, а на верхняй прыступцы сядзеў вялікі хатні сабака. Кожную нядзелю было на печы вяселле адной з лялек. Жаніхом выступаў трубачыст, а Мікулаш выконваў ролю святара. Пры гэтым елі, пілі, танцавалі, а нехта наступаў на лапу сабаку, які сваім віскатам парушаў спакойную размову дарослых. Пані мама крычала дзецям: «Калі ласка, дзеці, не разбурыце печ, бо не будзе дзе варыць!»

Але на печы была ўжо цішыня, дзеці гулялі ў «бацьку і маці». Маладой маці прынёс бусел дзіця; Адэльку, якая не ўмела рыхтаваць пачастунак, зрабілі хроснай маці, а хроснымі бацькамі — Вілема і Яна. Немаўля назвалі Гонзічкам. І пачыналася свята, дзе было шмат пачастункаў, запрашалі і сабаку, каб не крыўдаваў. Гонзічак хутка вырастаў, і бацька аддаваў яго ў школу. Ян ператвараўся ў настаўніка і прымушаў Гонзічка чытаць па складах. Але паколькі адзін вучань — нецікава, то павінны былі вучыцца ўсе, і дзеці вырашалі, што «будуць гуляць у школу». Хадзілі да Яна ў школу, але ніхто не жадаў рыхтаваць урокі. Пан настаўнік злаваўся і прызначаў пакаранне: два ўдары па руцэ. Нічога

не зробіш, трэба цярпець. Сабака таксама быў вучнем, але нічога не ўмеў рабіць, таму таксама атрымліваў два ўдары па лапе, а на шыю чорную таблічку. Узлаваны кудлач з грозным гырканнем саскочыў з печы і закружыўся па пакоі, зрываючы ганебны знак. З перапуду старэйшы работнік ускочыў з лавы, бабуля плюнула, а пан бацька памахаў табакеркай у бок печкі і крыкнуў: «Сачок на рыбу, пятля на ракаў, пайду і я на вас!» — і зноў закруціў у руках табакерку, усміхаючыся, але так, каб на печы не бачылі.

— То зрабіла, пэўна, наша чарцяня! — вырашыла бабуля.— Не, трэба збірацца дахаты, пакуль яны не перавярнулі млын дагары нагамі! [...]

V

Раз у два або тры тыдні, калі быў прыгожы дзень, бабуля казала: «Сёння пойдзем адведаць лесніка». Дзеці спадзяваліся на падарожжа і радаваліся з гэтай хвіліны аж да часу, калі бабуля, узяўшы верацяно, накіроўвалася ў дарогу.

Дарога ад гаці да моста праходзіла паўз схіл гары, а ад моста да Рызенбурга была з двух бакоў абсаджана таполямі. Бабуля выбірала дарогу ўздоўж крутога берага ракі, праз лесапільню, за ёю ўзвышаўся лысы пагорак, расквечаны жоўтымі краскамі дзіванны, якія Барунка ахвотна збірала. За лесапільняй даліна звужалася, і рака ў цесных берагах бегла праз вялікія камяні вельмі хутка. Схілы ўзгоркаў параслі хвоямі і піхтамі, што кідалі цень амаль на ўсю даліну. Па ёй ішлі дзеці з бабуляй, пакуль не дайшлі да парослых мохам руін Рызенбургскага замка, якія выглядалі з-за жывой агароджы.

Каля замка, над старым падзямеллем, дзе хады нібыта цягнуцца на тры мілі пад зямлёй і куды ні адзін чалавек не мог дайсці з-за надта вільготнага паветра, стаяла альтанка з трыма высокімі спічастымі вокнамі. Коннікі падчас палявання наладжвалі там другі сняданак. Да той альтанкі дзеці караскаліся па строме, як козачкі. Бедная бабуля ледзьве за імі паспявала, хапаючыся справа і злева за дрэвы. «Але ж вы мяне прымусілі пакутаваць, ледзьве дух пераводжу»,— сказала яна, апынуўшыся на гары.

Дзеці ўзялі бабулю за руку, павялі ў альтанку, дзе было прахалодна і адкрываўся прыгожы краявід, пасадзілі ў крэсла. Пад імі з правага боку альтанкі цягнуліся руіны замка, яшчэ ніжэй ляжала паўкругам невялікая даліна, узгоркі вакол яе параслі хвоямі. На адным з іх стаяла маленькая капліўка. Шум вады і спеў птушак ажыўлялі пануючую наўкол цішыню.

Ян успомніў паданне пра асілка Цыбора, пастуха рызенбургскага рыцара. Якраз унізе, у гэтай самай даліне, рыцар сустрэў пастуха, які нёс на плячы хвою, вырваную з каранем у панскім садзе. На пытанне рыцара, дзе Цыбор узяў дрэва, той прызнаў сваю віну. Пан дараваў яму ды яшчэ загадаў прыйсці да замка з мехам, бо абяцаў даць яму столькі ежы, колькі той зможа падняць. Цыбор не разгубіўся, узяў чахол з пярыны на дзевяць локцяў і пайшоў у замак. Там яму насыпалі гароху і паклалі вэнджаных кумпякоў поўны чахол. За сілу і праўдзівасць палюбіў рыцар Цыбора і, калі ў Празе кароль аб'явіў вялікі турнір, узяў яго з сабой. На тым турніры пастух перамог нямецкага асілка, якога ніхто не мог адолець, за што кароль і зрабіў яго рыцарам.

Дзецям гэтае паданне вельмі падабалася, і з таго часу, як стары пастух яго расказаў, і замак, і луг сталі для іх асабліва цікавымі.

— Бабуля, а як называецца тое мястэчка, дзе стаіць капліўка? — спытаў Вілем.

— Гэта на Боўшыне. Калі дасць нам Бог здароўя, то абавязкова туды пойдзем на імшу.

— А што там здарылася, бабуля? — спытала Адэлька, якая магла слухаць бабулю з раніцы да вечара.

— Цуд там здарыўся. Ці вы не памятаеце, як нам пра гэта Ворша апавядала?

— Мы ўжо не памятаем. Раскажыце нам, вельмі вас просім,— загаманілі дзеці, і бабуля не прымусіла доўга сябе ўпрошваць.

— Тады ўладкоўвайцеся добра на лавачцы і не выглядайце з акна, а то зваліцеся і заб'ецеся. За гэтай гарою і лесам ляжаць вёскі Турынь, Літаборж, Слаціна, Мечоў, Боўшын. У даўнія часы належалі яны аднаму рыцару, які зваўся Турынскім, таму што жыў у сваім замку на Турыні. У рыцара былі жонка і адзіная дачушка, прыгожая

дзяўчынка, але, на жаль, глуханямая, што было вялікім горам для бацькоў.

Аднойчы гуляла па замку тая дзяўчынка і раптам вырашыла пайсці ў Боўшын паглядзець, што робяць ягняткі і ці падраслі яны з таго часу, калі яна іх бачыла.

Трэба сказаць, што гэтай капліччкі там не было, не было і вёскі, толькі стаяў хутар, дзе жыла дворня турынскага рыцара і знаходзіліся яго статкі. Вакол глухі лес, а ў лесе шмат дзікіх звяроў.

Дачушка Турынскіх некалькі разоў была на хутары, але заўсёды з бацькам. Вось і вырашыла, дурненькая, што калі пабяжыць, дык адразу там і апынецца. Ішла яна, ішла куды вочы вялі, думала, што дарога як дарога, бо была малая і неразумная, як і вы. Доўга ішла, а белага хутара ўсё няма, і паступова станавілася ёй страшна. Падумала, што скажуць бацька і маці, калі не знойдуць яе ў замку. Узяў яе страх, і кінулася яна назад. Але калі чалавек баіцца, дык лёгка можа разгубіцца, а тым больш такое дзіця. Збілася дзяўчынка з дарогі і не трапіла ні дахаты, ні на хутар. Зайшла ў густы лес, дзе ні сцежкі не было, ні святла. Цяпер толькі зразумела, што заблукала. Можаце сабе ўявіць, што яна адчувала. Вам бы так дрэнна не было, бо можаце чуць і гаварыць, чаго дзяўчынка была пазбаўлена. Бегала яна ў адчаі па лесе і яшчэ больш блыталася. Нарэшце захацелася ёй есці і піць, балелі ногі, але мацнейшым за гэта быў страх, што ноччу яна застанецца ў лесе, дзе адны звяры. Яшчэ больш яна баялася, што бацькі гневацца будуць. Спалоханая, заплаканая, яна раптам апынулася ля крыніцы, нахілілася да вады і прагна напілася, а калі азірнулася, то ўбачыла дзве сцежкі, але не ведала, па якой ісці, бо ўжо дастаткова блукала і засвоіла, што не кожная сцежачка вядзе дадому. І тут успомніла, што яе маці, калі надыходзіць цяжкая хвіліна, заўсёды ідзе ў свой пакой і моліцца. Укленчыла дзяўчынка і стала маліцца, каб Бог вывеў яе з лесу.

Раптам пачула яна дзіўныя гукі, і ў яе вушах зазвінела і загуло. Гул рабіўся ўсё яснейшым і яснейшым. Дзяўчынка не разумела, што з ёю адбываецца, адкуль гукі. Яна закалацілася ад страху, пачала плакаць, хацела ўцякаць. І раптам бачыць: па сцежачцы да яе бяжыць белая авечка, потым другая, трэцяя, чацвёртая, пятая, шостая... Хутка

сабраўся каля яе цэлы статак. У кожнай авечкі на шыі быў званочак, менавіта гэты звон і пачула дзяўчынка. Гэта былі авечкі яе бацькі. За імі бег белы сабака. Нарэшце з'явіўся і сам пастух Барта. Дзяўчынка крыкнула: «Барта!» — і кінулася да яго. Узрадаваўся Барта, што яна і гаворыць, і чуе, узяў яе на рукі і заспяшаўся на хутар, што быў непадалёк. А там сядзела ў адчаі пані Турынская і думала, куды знікла яе дачка і што з ёю здарылася. Паслала па лесе людзей, сам рыцар таксама ўсюды шукаў дачку, а пані чакала на белым хутары. Уявіце сабе радасць маці, калі Барта прынёс ёй дачку, ды яшчэ зусім здаровую. Калі вярнуўся бацька, дачка ўсё расказала. Пакляліся бацькі, што аддзячаць Богу, пабудаваўшы каплічку. Так і зрабілі. Тая каплічка, якую вы бачыце, пабудавана на месцы крынічкі, дзе дзяўчынка піла ваду і малілася і ў тутэйшых лясах блукала. Дзяўчынкі той даўно ўжо няма на гэтым свеце, як і паноў Турынскіх, і Барта памёр, а ад замка засталіся толькі разваліны.

— Куды ж падзеліся авечкі і сабака? — спытаў Вілем.

— Сабака здох, старыя авечкі таксама, маленькія сталі вялікімі, і ў іх нарадзіліся ягняты... Так, дзеткі, заведзена на белым свеце: стары старыцца, а малады расце.

Дзеці скіравалі свае погляды на раўніну, у думках яны бачылі рыцара, бачылі, як блукала дзяўчынка. І раптам заўважылі, што з лесу выехала на прыгожым кані пані і панеслася па раўніне. За ёю ехаў берэйтар. На пані былі цёмны жакет і доўгая карычневая спадніца, якая закрывала страмёны, чорныя кудзеркі на яе галаве ўпрыгожваў чорны капялюшык з зялёнай вуаллю.

— Бабуля, бабуля, глядзі, рыцарша! — закрычалі дзеці.

— Ну, што ж вы прыдумалі. Няўжо ёсць сёння рыцаршы? Гэта пані княгіня,— сказала бабуля, азіраючы даліну з акна.

Дзеці крыху засмуціліся, што гэта не была рыцарша, як яны спачатку падумалі.

— Пані княгіня едзе да нас на гару! — крычалі ўсе.

— Няўжо вы думаеце, што гэта конь сам сюды ўздымаецца,— сказала бабуля.

— Сапраўды, Орланд лезе сюды, як кошка, толькі паглядзіце,— сцвярджаў Ян.

— Пакіньце мяне ў спакоі, я не хачу гэта нават бачыць. Чаго толькі заможныя людзі не прыдумаюць! — сама сабе казала бабуля, стрымліваючы дзяцей, каб не зваліліся з вокнаў.

У хуткім часе княгіня ўжо была на гары. Лёгка саскочыла з каня, перакінула шлейф цераз плячо і ўвайшла ў альтанку.

Бабуля ўстала і ветліва прывітала яе.

— Гэта сям'я Прошкавых? — спытала княгіня, угледаючыся ў твары дзяцей.

— Так, міласэрная пані! — адказала бабуля.

— А ты, значыць, іх бабуля?

— Так, міласэрная пані, маці іхняй матулі.

— Ты можаш усцешыцца, бо маеш здаровых унукаў. А вы, дзеці, ці слухаецеся сваю бабулю? — спытала княгіня ў дзяцей, што не зводзілі з яе вачэй.

На яе пытанне малыя, апусціўшы вочы, прамовілі:

— Слухаем.

— Ну, бывае па-рознаму, часам не слухаюць, але нічога не зробіш, і мы былі не лепшыя,— заўважыла бабуля.

Княгіня ўсміхнулася, а калі ўбачыла на лавачцы кошык з суніцамі, то спытала, дзе дзеці іх назбіралі.

Бабуля тут жа паклікала Барунку, гаворачы:

— Ідзі, дзяўчынка, пачастуй міласэрную княгіню. Яны свежыя. Дзеці па дарозе назбіралі. Можа, спадабаюцца ласкавай пані. Калі я была маладою, то з радасцю ягады ела, але калі ў мяне памерла дзіця, то ніводнай не ўзяла ў рот.

— А чаму? — спытала княгіня, беручы ў Барункі кошык з суніцамі.

— Ёсць такі звычай, васпані: калі ў маці памірае дзіця, то не есць яна да дня святога Яна Хрысціцеля ні чарэшняў, ні суніц. Кажуць, што ў гэты час Маці Божая ходзіць па небе і адорвае ягадамі памерлых дзяцей. Дзіцяці, чыя маці не вытрымае і паесць ягад, Дзева Марыя кажа: «Табе таму мала ягад дасталося, што твая маці іх з'ела». Вось і стрымліваюцца маці, баяцца есці ягады. Ну, а хто датрымаецца да Янавага дня, то і пазней лёгка не есці,— дадала бабуля.

Княгіня ўзяла ў руку ягаду, спелую, салодкую, чырвоную, як яе вусны, але пасля слоў бабулі паклала яе назад у кошык.

— Не хочацца, ды і вам, дзеткі, нічога не застанецца на дарогу.

— Нічога, пані княгіня, ешче на здароўе або забірайце ўсе з кошыкам дадому, мы назбіраем яшчэ,— хутка прагаварыла Барунка, адсоўваючы працягнуты ёй назад кошычак.

— У такім разе прымаю ваш падарунак,— сказала княгіня, усміхаючыся ў адказ на шчырасць дзяўчынкі.— Але, глядзіце, заўтра прыходзьце па кошык у замак і бабулю прыводзьце з сабою. Добра?

— Прыйдзем, прыйдзем! — паабяцалі дзеці менавіта так, як рабілі, калі пані мама клікала іх да млына.

Бабуля хацела нешта сказаць, але не паспела, княгіня злёгку пакланілася ёй, села на Орланда і знікла між дрэў, як цудоўны прывід.

— Бабуля, я так хачу ў замак! Бацька казаў, што ў княгіні шмат прыгожых карцін! — сказала Барунка.

— Ёсць там папугай, які размаўляе. Ой, бабуля, там ёсць на што падзівіцца! — крыкнуў Ян, пляскаючы ў далоні.

Малая Адэлька, агледзеўшы сябе, сказала бабулі:

— А ты пераменіш мне сукенку, ці не так, бабуля?

— Божа мой, і як я недагледзела за гэтай дзяўчынкай. Ну і прыгажуня! Што ты нарабіла? — пляснула рукамі бабуля, аглядаючы перапэцканую ягадамі дзяўчынку.

— Я тут ні пры чым, гэта Ян мяне падштурхнуў, і я павалілася ў ягады,— пралепятала малая.

— Заўсёды вы свавольнічаеце. Што цяпер княгіня будзе пра вас думаць, скажа, што вы дурасліўцы. А цяпер уставайце, пойдзем да лесніка. Я вам паўтараю, хлопцы, будзеце свавольнічаць, ніколі больш не вазьму з сабою,— гразілася бабуля.

— Мы будзем паслухмянымі, бабуля,— абяцалі хлопцы.

— Убачым,— адказала бабуля, ідучы за дзецьмі па лясной сцяжынцы да хаты лесніка. [...]

VII

На другі дзень апоўдні выйшла бабуля з дзецьмі з дзвярэй.

— Паводзьце сябе прыстойна,— загадала маці, выпраўджваючы цераз парог,— у замку нічога рукамі не хапайце, княгіні з павагай пацалуйце руку!

— Не хвалюйся, мы неяк справімся,— запэўніла яе бабуля.

Дзеці былі як кветачкі, і ў бабулі таксама святочны выгляд: яна апранула камлотавую гваздзіковага колеру спадніцу, белы як снег фартух, блузку з блакітнага дамаскага шоўку, каптур з бантам, на шыі ў яе былі караль з граната з талерам. Пад пахай яна несла хустку.

— Навошта вы ўзялі хустку, мама, дажджу не будзе, надвор'е добрае? — здзівілася пані Прошкава.

— Чалавеку няма куды падзець рукі, калі не трэба нічога трымаць, гэта звычка, патрэбна нешта несці,— адказала бабуля.

Звярнулі паўз садок на вузкую сцежку.

— Акуратна ідзіце адно за другім, а то замочыце ў траве штаны. Ты, Барунка, ідзі наперадзе, Адэльку павяду я, яна яшчэ не ўмее глядзець сабе пад ногі,— павучала бабуля, беручы Адэльку за руку, і малая азірала сябе з вялікім задавальненнем.

У садку скакала Чэрна, любімая курыца Адэлькі, адна з тых чатырох, што бабуля прывезла дзецям з горнай вёсачкі. Бабуля прывучыла яе браць корм у дзяцей з рукі, таму, знёсшы яйка, Чэрна бегла да Адэлькі па кавалак булкі, які дзяўчынка пакідала са свайго сняданка.

— Ідзі да матулі, Чэрна, я там пакінула для цябе булку, а я іду да княгіні,— крыкнула Адэлька курыцы. Але тая нічога не хацела разумець, бегла за ёю і хацела дзюбнуць дзяўчынку ў спадніцу.

— Ці ты не бачыш, дурная, што на мне белая суконка?! Кш-кш-кш! — адганяла Адэлька курыцу. Але Чэрна не адставала да таго часу, пакуль бабуля не ляпнула па яе крылах хусткай.

Прайшлі яшчэ некалькі крокаў. І раптам новая пагроза ўзнікла для белых суконак. З узгорка імчаліся сабакі! Перабраліся цераз ручай каля млына, злёгку абтрэсліся і адным скокам былі каля бабулі.

— І вы, нягоднікі, хто за вамі пасылаў? Ану супакойцеся і ідзіце прэч! — гневалася бабуля, пагразіўшы ім.

Сабакі, пачуўшы бабулін гнеўны голас і ўбачыўшы ўзнятую руку з хусткай, спыніліся ў нерашучасці: што рабіць? Дзеці таксама на іх крычалі, а Ян кінуў каменьчык, хацеў

трапіць у сабак, а трапіў у ваду. Сабакі, якія звыкліся цягаць розныя рэчы з вады, вырашылі, што дзеці з імі гуляюць, з радасцю кінуліся ў ваду і ў адзін момант апынуліся на беразе, пасля чаго пачалі весела скакаць вакол дзяцей. Дзеці крычалі, хаваліся за бабулю, а бабуля не ведала, што рабіць.

— Я злётаю дахаты, паклічу Бетку,— прапанавала Барунка.

— Не вяртайся, бо, кажуць, шляху не будзе,— спыніла бабуля.

На шчасце, праходзіў каля іх пан бацька і адагнаў сабак.

— Куды вы накіроўваецеся: на вяселле ці на танцы? — спытаў пан бацька, круцячы ў пальцах табакерку.

— Няма да каго, пан бацька, пакуль толькі ў замак,— адказала бабуля.

— А што там, у замку? — здзівіўся пан бацька.

— Нас пані княгіня запрасіла,— прызналіся дзеці.

І бабуля расказала, як сустрэліся з княгіняю ў альтанцы.

— Вось яно што,— сказаў пан бацька, нюхаючы табаку,— ну, ідзіце, ідзіце, а пазней Адэлька мне раскажа, што там бачыла. А што ты, Янік, што будзеш казаць, калі пані княгіня спытае, у які бок берасцянка дзюбу паварочвае, га?

— Яна пра гэта не будзе пытацца,— адказаў Ян і пабег наперад, каб пазбегнуць насмешак пана бацькі.

Пан бацька ўсміхнуўся, развітаўся з бабуляю і пайшоў да гаці.

Каля шынка гулялі Кудрнавы дзеці, рабілі млын, а Цылька нянчыла малое.

— Што вы робіце? — спытала ў іх Барунка.

— Нічога,— адказалі тыя, аглядаючы святочна апранутых дзяцей.

— А мы ў замак ідзём,— пачаў Ян.

— Ну і што з таго,— буркнуў Вавржынек.

— І ўбачым там папугая! — дадаў Вілем.

— Калі я выраcту, то таксама буду яго мець, так мне сказаў бацька,— тут жа яму адказаў бойкі Вавржынек, але другі хлопец, Вацлаў, і Цылька ўздыхнулі: «Калі б мы маглі там таксама пабываць!»

— Не сумуйце, я вам што-небудзь прынясу,— сказаў Ян,— і раскажу пра ўсё, што там было.

Нарэшце бабуля з дзецьмі дайшла да парку, дзе іх ужо чакаў пан Прошак.

Княскі парк кожнаму быў адкрыты, знаходзіўся ён непадалёк ад Старой бялільні, але бабуля з унукамі зрэдку там бывала, асабліва тады, калі ў замак з'язджаліся паны. Захаплялася яна ўсім, што там з густам было зроблена: цудоўныя кветкі, рэдкія дрэвы, фантаны, сажалкі з залатымі рыбкамі, а найбольш ахвотна яна гуляла з дзецьмі на лужку або ішла да лесу. Там яны маглі смела паляжаць на зялёным мяккім дыване, там маглі панюхаць кожную кветку, а таксама нарваць кветак для букетаў і вянкоў. У полі, праўда, не раслі ні апельсіны, ні лімоны, але траплялися густая чарэшня і дзікая грушка, усыпаныя пладамі, кожны мог іх нарваць, колькі захоча. У лесе шмат было суніц, чарніц, грыбоў і міндальных арэхаў. Фантанаў там, безумоўна, не было, але бабуля любіла спыніцца разам з унукамі каля гаці. Яны глядзелі, як хвалі вады хутка спадалі ўніз, потым уздымаліся ўгару, рассыпаліся мільёнамі кропель і зноў падалі ў пеністы вір, змешваліся з ім і, злітыя ў адзіную плынь, ужо спакойна плылі далей. Тут не было залатых рыбак, прывучаных да салодкіх крошак, але бабуля, калі ішла паўз сажалку, перакладала са сваёй кішэні ў Адэльчыну хлебныя крошкі, і калі дзеці іх кідалі ў ваду, з глыбіні выплывала мноства рыб. Бліжэй за ўсіх на паверхню ўздымаліся серабрыстыя плоткі, паміж імі плавалі хуткія, як стрэлы, акуні, з натапыранымі плаўнікамі, далей там і сям слізгалі тонкія вусачы з доўгімі вусішчамі, убаку можна было ўбачыць і пузатых карпаў, і плоскагаловых мянькоў.

На лужку бабуля сустрэлася з людзьмі, якія яе віталі: «Хвала Ісусу Хрысту!» або «Дай вам Бог добрага дня!». Некаторыя спыняліся, распытвалі: «Куды вы, бабуля?», «Як вашы пажываюць? Што робяць?». Ад іх яна даведвалася навіны.

А ў замку? Там не было ніякага парадку. То бяжыць слуга ў ліўрэі, то пакаёўка ўся ў шаўках, то ідзе пан, а за ім другі, і кожны высока нясе галаву, задзіраюць нос і выступаюць, як павы, якія адны толькі маюць права хадзіць па лужку. Калі нехта з іх і вітаўся з бабуляю, то кідаў няўважна

«Guten Morgen»[1] або «Bonjour»[2], а бабуля чырванела і не ведала, ці трэба ёй адказваць: «Аж ад веку» або «Дай Бог». Пазней казала дома: «Там, у замку, сапраўдны Вавілон!»

Каля замка па абодва бакі дзвярэй сядзелі два ліўрэйныя лёкаі; той, што быў з левага боку, склаў рукі на каленях і пазяхаў ад суму, той, што быў справа, склаў рукі на грудзях і пазіраў на вокны. Калі пан Прошак да іх падышоў, прывіталі яго па-нямецку, кожны са сваім вымаўленнем.

Падлога вестыбюля была выкладзена мармуровымі плітамі, а пасярэдзіне стаяў з густам зроблены більярд. Уздоўж сцен, на падстаўках з зялёнага мармуру, стаялі белыя статуі з гіпсу, якія ўяўлялі сабою міфалагічных герояў. Чацвёра дзвярэй вялі ў панскія пакоі. Каля адных сядзеў у фатэлі камердынер у чорным фраку і спаў. Да гэтых дзвярэй пан Прошак падвёў бабулю з дзецьмі. Камердынер уздыхнуў, пачуўшы шум, але ўбачыўшы пана Прошака, прывітаў і спытаў, якая справа прывяла яго ў замак.

— Пані княгіня пажадала, каб мая цешча з дзецьмі сёння яе наведала. Калі ласка, пане Леапольдзе, далажыце,— адказаў пан Прошак.

Пан Леапольд узняў бровы, паціснуў плячыма і заявіў:

— Не ведаю, ці пажадаюць вас прыняць, яны працуюць у сваім кабінеце. Але магу паведаміць.

Ён узняўся і павольна схаваўся за дзвярамі, каля якіх сядзеў. Праз хвілінку вярнуўся і, пакінуўшы дзверы адчыненымі, салодка ўсміхаючыся, кіўнуў, каб увайшлі.

Пан Прошак пайшоў, а бабуля з дзецьмі апынуліся ў шыкоўным салоне.

У дзяцей перахапіла дыханне, ножкі іх слізгалі па падлозе, гладкай, як лёд. Бабуля ішла як зачараваная, раздумваючы, ці можна ступаць па гэтых узорыстых дыванах. «Як шкада,— казала сама сабе.— Але што рабіць, яны ляжаць паўсюль, і пан камердынер таксама па іх ходзіць». Той вёў іх праз канцэртны салон і бібліятэку аж да кабінета княгіні, а вярнуўшыся да свайго фатэля, мармытаў сабе пад нос:

---

[1] Добрай раніцы *(ням.)*.

[2] Добры дзень *(фр.)*.

— І што за дзівакі гэтыя паны. Прымушаюць чалавека прыслугоўваць простай бабе і дзецям.

Сцены княжацкага кабінета былі абабіты светла-зялёнымі, з золатам шпалерамі, такога ж колеру былі парцьеры на дзвярах і адзіным акне. На сценах вісела шмат партрэтаў у вялікіх і малых рамах. Насупраць акна — камін з шэрага мармуру ■ чорнымі і белымі прожылкамі, на ім — дзве вазы з японскага фарфору, а ў іх цудоўныя кветкі, якія напаўнялі кабінет сваім водарам. Па абодвух баках каміна знаходзіліся з густам зробленыя з дарагога дрэва паліцы, на іх былі раскладзены разнастайныя рэчы, што былі вынікам працы мастакоў, каштоўнасці і цудоўныя дары прыроды, такія, як прыгожыя ракавіны, каралы, камяні. Была гэта памяць пра падарожжы і падарункі знатных асоб. У адным куце стаяла статуя Апалона ■ карарскага мармуру, у другім — просты, але з густам зроблены стол. Каля стала, на фатэлі, абцягнутым цёмна-зялёным аксамітам, сядзела княгіня ў белым пеньюары. Яна якраз адклала пяро, калі бабуля з унукамі ўвайшлі.

— Хвала Ісусу Хрысту! — прывітала ветліва, з паклонам бабуля.

— На векі вякоў! Вітаю цябе, матуля, і дзяцей! — адказала княгіня.

Дзеці спачатку паводзілі сябе нясмела, але бабуля ім міргнула, і яны хутка падышлі да княгіні і пацалавалі ёй руку. Яна пацалавала кожнага ў лоб і, паказаўшы бабулі на фатэль, абабіты аксамітам, з залатымі махрамі, запрасіла прысесці.

— Дзякую, міласэрная пані, я не стамілася,— засаромелася бабуля, і ўсё ад таго, што баялася зваліцца з незвычайнага сядзення або зламаць яго.

Але княгіня настойліва паўтарыла: «Сядай жа, матуля». І бабуля, заслаўшы на фатэлі белую хустку, асцярожна села, прыгаворваючы: «Няхай вашай міласці заўсёды добра спіцца».

Дзеці стаялі як скамянелыя, толькі пераводзілі позіркі з адной рэчы на другую. Княгіня гэта заўважыла і з усмешкаю спытала іх:

— Ці падабаецца вам тут?

— Так,— кіўнулі яны разам.

— Яшчэ б ім не падабалася! Такая прыгажосць! Пэўна, хацелі б тут застацца,— заўважыла бабуля.

— А табе тут ці падабаецца? — звярнулася княгіня да бабулі.

— Як на нябёсах, але жыць тут не хацелася б,— пакруціла галавою бабуля.

— Чаму? — спытала здзіўлена княгіня.

— А што б я тут рабіла? Гаспадаркі ў вас няма, пер'е скубці не трэба, калаўрота не раскладзеш.

— А ці не хацела б ты на старасці пажыць без клопату, адпачыць?

— Рана ці позна прыйдзецца адпачыць. Будзе над маёю галавой узыходзіць і заходзіць сонейка, а я буду бесклапотна спаць. Але пакуль жывая, дзякуй Богу, трэба працаваць. Толькі лайдакі дарэмна хлеб ядуць. А наогул без клопату не жыве ніводзін чалавек, аднаго турбуе адно, другога — другое, кожны нясе свой крыж, ды не кожнаму ён па плячы,— апавядала бабуля.

Раптам чыясьці белая рука адгарнула цяжкую парцьеру, і між складак з'явіўся прыгожы твар маладой дзяўчыны са светла-каштанавымі кучаравымі валасамі.

— Можна ўвайсці? — спытала яна пяшчотным голасам.

— Уваходзь, Гартэнзія, тут ты знойдзеш прыемную кампанію,— адказала княгіня.

У кабінет увайшла графіня Гартэнзія, як казалі, выхаванка княгіні. Фігурка ў яе была тоненькая, яшчэ не аформленая, апранутая ў простую белую сукенку, саламяны капялюшык вісеў на руцэ, у якой яна трымала букет ружаў.

— Ах, якія мілыя дзеткі! — выгукнула дзяўчына.— Гэта, пэўна, Прошкавы, тыя, ад каго ты прынесла такія смачныя суніцы?

Княгіня пацвердзіла.

Графіня нахілілася, дала кожнаму дзіцяці па ружы, па адной дала таксама бабулі і княгіні, апошнюю заткнула сабе за пояс.

— Такі ж свежы бутончык, як і вы, мілая паненка,— сказала старая, панюхаўшы ружу.— Ды хай захавае вам яе Бог, васпані,— дадала яна, звярнуўшыся да княгіні.

— Гэта і маё самае гарачае жаданне,— адказала княгіня, пацалаваўшы ў лоб сваю выхаванку.

— Ці магу я ненадоўга забраць дзяцей? — спытала графіня ў княгіні і бабулі; княгіня дазволіла, а бабуля выказала асцярогу, што дзеці могуць нарабіць клопату мілай паненцы, асабліва хлопцы, сярод якіх вызначаецца сваёй няўрымслівасцю Ян. Але Гартэнзія з усмешкай працягнула дзецям абедзве рукі, пытаючыся:

— Хочаце пайсці са мной?

— Хочам, хочам! — узрадаваліся дзеці, схапіўшы яе рукі.

Пакланіўшыся княгіні і бабулі, дзяўчына знікла ў дзвярах разам з дзецьмі. Княгіня ўзяла сярэбраны званочак са стала і пазваніла. У той жа момант у дзвярах паказаўся камердынер Леапольд. Княгіня яму загадала, каб распарадзіўся падрыхтаваць у салоне сняданак, і перадала пачак лістоў для адпраўкі.

Леапольд пакланіўся і выйшаў.

Пакуль княгіня аддавала загады камердынеру, бабуля разглядала партрэты на сценах кабінета.

— Божа мой! — сказала яна, калі камердынер пайшоў.— Якія дзіўныя касцюмы і твары! Вунь тая пані апранута як нябожчыца Галашкова, дай ёй, Божа, царства нябеснае. Тая таксама насіла высокія абцасы і ўздутыя спадніцы, талію перацягвала, а на галаве насіла парык. Яе муж быў суддзёй у Добрушцэ, і калі мы хадзілі туды на набажэнства, бачылі яе ў касцёле. Нашы хлопцы называлі яе макавая паненка, у гэтых спадніцах з напудранай галавой яна была падобная да галоўкі маку. У нас казалі, што гэта французскі крой.

— Гэтая пані — мая бабуля,— сказала княгіня.

— Прыгожая пані,— адазвалася бабуля.

— Направа — мой дзед, налева — бацька,— працягвала паказваць княгіня.

— Добрыя людзі, міласэрная пані ўся ў бацьку. А дзе матуля?

— Вось мае маці і сястра,— сказала княгіня, паказаўшы на два партрэты над пісьмовым сталом.

— Прыгожыя пані, радасна на іх глядзець,— заўважыла бабуля,— але сястрычка ваша ні да бацькі, ні да маці не

падобная. Часам бывае, што дзеці падобныя да каго-небудзь з далёкага калена. А гэты малады пан мне знаёмы, толькі не магу прыпомніць адкуль.

— Гэта рускі цар Аляксандр,— хутка адказала княгіня.— Ты яго, безумоўна, не ведаеш.

— Вось і не, усяго ў дваццаці кроках ад яго стаяла. Гэта быў прыгожы чалавек, тут ён маладзейшы, але я ўсё адно яго пазнала. Што ён, што імператар Іосіф — прыгожыя людзі.

Княгіня паказала на супрацьлеглую сцяну, дзе вісеў паясны партрэт у натуральную велічыню.

— Імператар Іосіф! — пляснула ў далоні бабуля.— Як жа я яго адразу не ўбачыла. Як добра, што маеце іх разам. Я нават не думала, што ўбачу сёння імператара Іосіфа. Дай Бог яму вечную славу, быў гэта добры пан, асабліва для простых людзей. Гэты талер даў уласнаручна,— дадала бабуля, выцягнуўшы з-за пазухі талер.

Княгіні спадабаліся бабуліна шчырасць і трапныя словы, і яна пажадала даведацца пра гісторыю талера. Бабуля не прымусіла сябе ўгаворваць і расказала княгіні тое, што мы ўжо чулі на млыне. Княгіня смяялася ад душы.

Абвёўшы позіркам пакой, бабуля ўбачыла партрэт караля Фрыдрыха.

— Гэта ж прускі кароль! — ускрыкнула яна.— Яго я добра ведала. Мой нябожчык Іржы служыў у прускім войску, і мне давялося пятнаццаць гадоў пражыць у Сілезіі. Кароль неаднойчы выклікаў Іржы паперад строю і ўзнагароджваў яго. Ён любіў высокіх мужчын, а мой Іржы ў палку быў вышэй за ўсіх, да таго ж зграбны, як дзяўчына. Не думала я, што перажыву яго, быў чалавек-скала, ды толькі даўно ўжо на тым свеце, а я тут,— уздыхнула старая, і сляза скацілася па яе зморшчанай шчацэ.

— Твой муж загінуў у баі? — спытала княгіня.

— Не, ён памёр ад раны. Калі выбухнула паўстанне ў Польшчы, а прускі кароль і рускі цар яго душылі, наш полк там быў таксама. Я паехала за палком з дзецьмі, двое ў мяне ўжо было, а трэцяе нарадзілася ў паходзе. Гэта была Іаганка, тая, што цяпер жыве ў Вене, магчыма, такая баявая, што ад нараджэння вымушана была звыкнуцца з салдацкім жыццём. Нешчаслівая гэта была вайна. Ужо з першага бою

прынеслі Іржы ў лагер на насілках. Гарматным ядром пакалечыла яму нагу, адрэзалі яе. Я даглядала яго, як магла. Калі ён троху ачуняў, адправілі яго зноў у Нісу. Узрадавалася я, думаю, калека ім не патрэбны і зможам мы, калі ён паздаравее, вярнуцца ў Чэхію. Але надзеі мае не спраўдзіліся. Пачаў ён марнець, і не маглі даць яму ніякай рады, памёр. Калі быў які грош, аддавала яго на лекі, але нічога не дапамагло. Думала я тады, што або розум страчу, або сэрца ў мяне разарвецца з гора. Але чалавек можа многае вытрываць, міласэрная пані. Засталася я з трыма сіроткамі на руках, грошай — ні талера, толькі троху тыхануч. У тым палку, дзе служыў Іржы, быў яго найлепшы сябар фельдфебель Лягоцкі. Даведаўшыся, што я ўмею ткаць коўдры, Лягоцкі купіў мне станок і ўсё, што патрэбна для ткацтва. Хай пашле Бог яму здароўя! Спатрэбілася рамяство, якому я ў нябожчыцы свекрыві у маладосці навучылася. Справа пайшла добра, і я, хутка выплаціўшы Лягоцкаму пазыку, магла ўтрымліваць сябе і сваіх дзяцей. Трэба сказаць, што ў тым горадзе жылі добрыя людзі, але я там вельмі сумавала; ад таго часу, як не стала Іржыка, адчувала я сябе пакінутай і забытай, як груша ў полі. Падумалася мне, што дома лепей, чым на чужыне, і сказала я пра гэта Лягоцкаму. А ён пачаў мяне адгаворваць, упэўніваць, што я атрымаю пенсію, што кароль паклапоціцца пра маіх дзяцей. Я яму падзякавала за параду, але вырашыла, што ўсё ж такі вярнуся на радзіму. Вельмі ж мяне даймала нямецкая гаворка. Пакуль мы жылі ў Кладску, было лягчэй, адчувала я сябе як дома, бо там больш гаварылі па-чэшску, чым па-нямецку, але ў Нісе — сапраўдная Нямеччына, а я ніяк нямецкай мове навучыцца не магла. Толькі я троху абжылася, як здарылася паводка. Злая сіла — вада, калі ж разальецца, то чалавек і на кані не ўцячэ. Такі быў патоп, што людзі ледзь выратаваліся. Я хутка сабрала ўсё, што было лепшага, завязала ў вузел за спіну, малодшую дачку ўзяла на рукі, старэйшых дваіх — за руку і пабегла, а вады ўжо па костачку. Лягоцкі і тут прыйшоў на дапамогу, вывеў нас у гарыстую частку горада, дзе прынялі нас пад страху добрыя людзі.

Разнеслася па горадзе чутка, што я амаль усё страціла, і добрыя людзі прыйшлі на дапамогу; пан генерал запрасіў

мяне да сябе і сказаў, што буду атрымліваць па міласці караля ў год некалькі талераў і дадуць мне сталую працу, а дзяцей змесцяць у закрытыя ўстановы: хлопца — у ваеннае, а дзяўчат — у жаночае вучылішча. Гэта мяне зусім не радавала, і прасіла я даць мне лепш пару залатых, калі хочуць мне аказаць міласць, каб я змагла вярнуцца ў Чэхію. Дзяцей я ўсё роўна не аддам і выхаваю іх у сваёй веры, навучу роднай мове. Але мне гэтага не дазволілі і сказалі: калі там не застануся, то не атрымаю нічога. «Ну, нічога дык нічога, Бог не дасць мне памерці з голаду»,— падумала я і падзякавала каралю за ўсё.

— Мне здаецца, што пра дзяцей яны добра паклапаціліся б,— выказалася княгіня.

— Можа быць, міласэрная пані, але я стала б для іх чужою. Хто іх вучыў бы там любіць сваю Айчыну і роднае слова? Ніхто. Засвоілі б чужую мову, навучыліся чужым норавам і звычаям і назаўсёды забыліся на сваю кроў. Як я спавядалася б перад Богам? Не, хто нарадзіўся чэхам, няхай пры чэшскай мове і застаецца. Паклапацілася я пра пашпарт, сабрала рэчы, што ў мяне засталіся, узяла дзяцей і пайшла з горада, дзе перажыла столькі цяжкіх і шчаслівых дзён.

Гаспадыні наклалі дзецям поўныя кішэні печыва, а мне далі некалькі талераў на дарогу. Няхай Бог аддзячыць гэтым людзям добрымі дзецьмі за ўсё тое дабро, якое яны мне прынеслі. Лягоцкі, бедны, праводзіў нас з мілю і нёс маю Іаганку. Бедаваў, што я сыходжу, у нас ён адчуваў сябе як дома. Плакалі мы абое на развітанні. Пакуль ён быў у Нісе, хадзіў маліцца на Іржыкаву магілу, яны ж любілі адзін аднаго, як родныя браты. Яго забілі падчас французскай вайны. Няхай зямля яму будзе пухам!

— Як жа ты дабралася з дзецьмі да Чэхіі? — спытала княгіня.

— Шмат я зведала гора, міласэрная пані, на шляху. Не ведала я добра дарогу і шмат часу змарнавала, блукаючы. Ногі ў дзяцей і мяне былі ў крывавых мазалях, шмат мы плакалі ад голаду, стомы і хвароб, доўга мы не маглі трапіць у родныя мясціны. Нарэшце пашчасціла нам дабрацца да Кладскіх гор, а там ужо я была як дома. Я родам з Алешніц, што на сілезскай мяжы, але васпані наўрад ці ведае,

дзе знаходзяцца Алешніцы. Калі я падыходзіла да дома, тут мне як камень прыціснуў сэрца. Падумала я, ці жывыя мае бацькі і як яны мяне прымуць. Далі яны мне добры пасаг, а я вяртаюся дадому з пустымі рукамі і прыводжу з сабою трох сіротак. Што мне скажуць? Гэтае пытанне ўсю дарогу звінела ў маіх вушах. Баялася я, ці не здарылася чаго-небудзь за тыя два гады, як я пра іх нічога не чула.

— А што, вы ім ніколі не пісалі, калі не ты, то твой муж? — дзівілася княгіня.

— У нас няма звычкі пісаць лісты адно аднаму. Успамінаем, молімся адно за аднаго і, калі здараецца выпадак, калі трапіцца знаёмы чалавек, на словах перададзім пра сваё жыццё. Невядома, куды і да каго трапіць ліст. Мой тата калісьці пісаў лісты салдатам, што нарадзіліся ў нашай вёсцы, [illegible] стаялі далёка за мяжой,— калі іх бацькі хацелі ведаць, ці жывыя іх дзеткі, або пасылалі ім некалькі залатых. А вярнуўшыся, салдаты казалі, што нічога не атрымлівалі. Так бывае, васпані, калі прыйдзе такі ліст ад простага чалавека, то дзе-небудзь і згубіцца.

— Дарэмна ты думаеш так, матуля,— не пагадзілася княгіня,— кожны ліст, не мае значэння, ад каго ён, павінен трапіць у рукі таго, каму ён адрасаваны. Ніхто не мае права яго затрымаць або адкрыць, за гэта ёсць строгае пакаранне.

— Слушна гаворыце, міласэрная пані, толькі нам гэта не падыходзіць, лепш даверыцца добраму чалавеку. На лісточку паперы немагчыма пра ўсё напісаць, чалавек яшчэ можа спытацца пра што іншае, а спытаць і няма ў каго. Калі ж прыйдзе гандляр або падарожны, то ён усё перадасць слова ў слова. Я пра сваіх больш бы ведала, але час быў неспакойны, мала прыходзіла народу.

Ужо змяркалася, калі я падышла з дзецьмі да вёскі; было лета, і ў гэты час, я ведала, вячэраюць. Каб нікога не спаткаць, я прайшла праз сады. З нашага двара выйшлі сабакі і забрахалі на нас. Я іх паклікала, а яны яшчэ мацней брэшуць. Паліліся ў мяне слёзы, так мне стала горка. Я, дурніца, забылася, што ўжо мінула пятнаццаць гадоў, як я пайшла з дому, і гэта не тыя сабакі, якіх я карміла. У садзе насаджана шмат маладых дрэўцаў, плот адрамантаваны, на стадоле новы дах, а ў грушкі, пад якой мы з Іржы некалі

сядзелі, маланкай зламала верх. У суседняй хаце ўсё заставалася па-старому, яна перайшла да бацькоў ад нябожчыцы Новатны. Новатна — тая самая кабета, што ткала коўдры з воўны, мой Іржы быў яе сынам. Каля хаты разбіты маленькі гародчык, нябожчыца заўсёды засявала яго пятрушкай, цыбуляю, разводзіла базілік, шалфей і ўсё, што патрэбна ў гаспадарцы, а яна любіла зёлкі, як і я. Іржы зрабіў плот вакол, плот яшчэ захаваўся, але гародчык ужо зарос травою, толькі дзе-нідзе была відаць цыбуля. З будкі выйшаў сабака, напалову сляпы. «Кудлач, ці пазнаеш ты мяне?» — паклікала я, і ён стаў церціся каля маіх ног. Я думала, што сэрца маё разарвецца ад шчасця, калі зразумела, што гэта нямое стварэнне пазнала мяне і прывітала. Дзеці на мяне, бедныя, глядзелі, дзівіліся, чаму плачу, я ж ім сказала, што вяду іх да бабулі. Думала, што калі дома на мяне будуць гневацца, каб дзеці гэта не ведалі. Кашпар, старэйшы, спытаў: «Чаму плачаш, мама, ці не знойдзем мы тут начлег? Сядзь і адпачні, мы пачакаем, а я панясу твой вузел. Мы не хочам есці». Іаганка з Тэрэзкай таксама пацвердзілі, што есці не хочуць, нягледзячы на тое, што некалькі гадзін ішлі праз лес і ніякага дома не сустрэлі. «Паслухайце, дзеці,— кажу я ім,— у тым доме нарадзіўся ваш бацька, а побач нарадзілася ваша маці, а тут засталіся вашыя баба і дзед. Памолімся Богу, што нас шчаслівa прывёў сюды, і папросім яго, каб нас добра прынялі». Прачыталі мы «Ойча наш» і падышлі да дзвярэй. Бацька з маці жылі ў доме Новатны, а наш дом застаўся брату, гэта я ведала. Над дзвярамі яшчэ вісеў абразок Дзевы Марыі і чатырнаццаці ўгоднікаў, якія Іржы прывёз маці з Вамбержыца. У мяне ад сэрца адлягло, калі я яго ўбачыла. «Вы мяне праводзілі, а цяпер вітаеце»,— падумала я і, супакоіўшыся, увайшла ў хату. Бацька, маці і старая Бетка сядзелі за сталом і елі суп з адной міскі — была гэта анчка[1], памятаю так, нібы ўчора было. «Хвала Ісусу Хрысту!» — прывітала я. «На векі вякоў»,— адказалі мне. «Ці дазволіце мне, гаспадары, пераначаваць у вас з дзецьмі? Ідзём здалёк, стаміліся і галодныя». Кажу, а ў самой голас дрыжыць. Не пазналі мяне. Было ў пакоі цёмна.

— Кладзіце вашыя рэчы і сядайце да стала,— сказаў бацька і адклаў лыжку.

---

[1] *Анчка* — поліўка з малака, запраўленая мукою і яйкамі; зацірка.

— Бетка,— сказала маці,— ідзі звары яшчэ троху поліўкі. Сядайце, маці, адрэжце хлеба сабе і дзецям. А потым пакладзём вас спаць на сене. Адкуль ідзяце?

— Аж з Сілезіі, [redacted] Нісы,— кажу.

— Там наша Мадлена,— ускрыкнуў тата.

— Калі ласка, кабета, можа, чулі што пра яе? — спытала мама і падышла бліжэй да мяне.— Мадлена Новатна. Яе муж салдат. Гэта наша дзяўчына, мы ўжо два гады не чулі, як яна там. І сны дрэнныя сняцца: не так даўно бачыла, што выпаў у мяне зуб, ды з болем. Баліць мне, і я пра дачку і яе дзяцей думаю, што з Іржы нешта здарылася, цяпер увесь час вайны. Бог ведае, чаму людзі не жывуць у міры.

Я плакала, [redacted] дзеці, якія пачулі словы бабулі, пацягнулі мяне за спадніцу і спыталі:

— Мама, гэта нашыя бабуля і дзядуля?

Толькі гэта яны сказалі, маці адразу ж мяне пазнала, кінулася на шыю, а бацька ўзяў дзяцей на рукі, і мы расказалі адно аднаму, што і як.

Бетка мігам збегала па брата, сястру, нявестку і зяця, а праз некаторы час сабралася ўся вёска. І не толькі радня і сяброўкі — усе віталі мяне як родную.

— Добра зрабіла, што вярнулася дахаты з дзецьмі,— сказаў тата.— Безумоўна, Бог адзін, але кожнаму айчына наймілейшая. Так і павінна быць. Пакуль Бог дае нам хлеб, ні ты, ні твае дзеці ні ў чым не будуць мець патрэбу, нават калі б ты не змагла працаваць. Тое, што табе прыйшлося перажыць,— цяжкая рана, але не трэба на гэтым засяроджвацца. Памятай, каго Бог любіць, таму і крыж дасылае.

Вось так прыняла мяне сям'я. Брат хацеў саступіць мне святліцу, але я вырашыла застацца з бацькамі ў хаце, дзе некалі жыў Іржы. Дзеці хутка прывыклі да новага месца, а бацькі мелі ад іх шмат радасці. Адпраўляла я іх у школу кожны дзень. У маёй маладосці дзяўчатак грамаце не вучылі, толькі трошачкі чытаць, і то, у асноўным, гарадскіх. Грэх, калі ёсць у чалавека Божая іскра, а развіваць талент няма магчымасці. А калі няма ні да чаго схільнасці, дык што тады можа чалавеку дапамагчы. Мой нябожчык Іржы шмат пабачыў на свеце, ведаў грамату, быў на ўсе рукі майстар. Добра, каб кожны быў такім!

Я зноў ткала коўдры з воўны і зарабляла добрыя грошы. Цяжкія гэта былі часы: вайна, хваробы, голад. Корац жыта каштаваў сто залатых асігнацыямі. Лёгка казаць! Але Бог нас мілаваў, і мы ўсё перажылі. Так было дрэнна, што хадзілі людзі з грашыма, а купіць нічога не маглі. Наш бацька ўсё сваё жыццё дапамагаў кожнаму ўсім, чым толькі мог. Да яго хадзілі людзі, што не маглі даць сабе рады. Калі прыходзілі бяднейшыя і прасілі: «Саступіце нам корац жыта. Няма ў нас ні зернейка»,— казаў: «Пакуль у мяне ёсць, з радасцю падзялюся, а не буду мець я — дасць хто іншы». І адразу мама адсыпала ў мех зерне.

Грошы ніколі не браў. «Мы ж суседзі,— казаў,— калі мы не дапаможам, то хто дапаможа? А дасць Бог добры ўраджай, вернеце мне зернем, і будзем мы ў разліку». Так у нас і вялося. За гэта тата заўсёды чуў ад людзей: «Хай узнагародзіць цябе Бог!» А маці, калі хоць дзень праходзіў без таго, каб не пастукаўся да нас жабрак, дык сама ахвотна пайшла б яго шукаць на дарогу, так любіла яна дапамагаць людзям. Чаму ж не дапамагчы: елі мы дасыта, у чым хадзіць было. Калі ёсць чым, чаму не падзяліцца? Не вялікая заслуга, хрысціянскі доўг, і толькі, але калі адрываеш ад сябе і даеш, то гэта вялікая справа. У далейшым так адбылося і з намі, мы дайшлі да таго, што елі адзін раз на дзень, абы не галадалі іншыя людзі. Але ўсё мінае, і сонца засвяціла. У краіне наступіў мір, жыць станавілася ўсё лягчэй і лягчэй.

Калі Кашпар скончыў школу і захацеў вучыцца ткацкай справе, я яму не забараняла. Рамёствы за спіной не носяць. Навучыўшыся, пайшоў ён у вялікі свет. Іржы заўсёды казаў, што нічога не варты той майстар, які на печы сядзіць. Праз некалькі гадоў сын вярнуўся, пасяліўся ў Добрушцэ і добра там жыве. Дзяўчат я навучыла рознай хатняй працы, каб яны маглі ўладкавацца на службу, але тут прыехала з Вены стрыечная сястра, Тэрэзка ёй спадабалася, і стала яна прасіць, каб я адпусціла з ёю дачку ў горад, што яна возьме яе на ўтрыманне. Было мне цяжка, але я падумала, што нельга перашкаджаць шчасцю дзяўчыны, калі яна сама хоча паехаць у свет. А Даротка — добрая жанчына, мае сваю справу з прыбыткам у Вене, а дзяцей у яе няма. Клапацілася яна пра Тэрэзку, як родная маці. Калі Тэрэзка

выходзіла замуж, то дала ёй добры пасаг. Мне было непрыемна, што дачка пайшла за немца, але цяпер я і не прыгадваю гэта. Ян — чалавек шчыры і сумленны, сёння добра з ім разумеем адно аднаго. Ну, а ўнукі, мне яны родныя. На месца Тэрэзкі да Вены паехала Іаганка. Падабаецца ёй там і жыве, кажа, добра. Цяпер моладзь пайшла іншая: мяне ніколі не цягнула з дому, асабліва на чужыну.

Праз некалькі гадоў памерлі мае бацькі, усяго шэсць тыдняў перажылі адно аднаго. Ціха адыходзілі ў іншы свет, згасалі, як свечкі. Не пажадаў Бог, каб доўга яны былі ў самоце, бо пражылі разам шэсцьдзесят гадоў і пакінулі па сабе добрую памяць. Дай Бог ім царства нябеснае!

— І не сумавала ты па дзецях, калі ўсе трое пайшлі з дому? — спытала княгіня.

— Ах, міласэрная пані, кроў не вада. Шмат я плакала, але не скардзілася дзецям, не замінала ім шчасце на зямлі шукаць. Адна я ніколі не была, дзеці не перастаюць нараджацца, і чалавек, калі захоча, дык знойдзе, пра каго клапаціцца. Гледзячы на дзяцей суседзяў, я думала, што гэта мае ўласныя дзеці. Калі чалавек ідзе да людзей з чыстым сэрцам, то яны яго любяць. Прасілі мяне шмат, каб пераехала ў Вену. Ну, я ведаю, што там, як і ўсюды, знайшла б добрых людзей, як і паўсюль, было б пра мяне каму падумаць, ды гэта не блізкі свет. Старому чалавеку нельга далёка ездзіць, лепш ад свайго кутка не адрывацца, як пары ад гаршка. Можа, Бог і пра мяне ўспомніць, а я хацела б пахаваць косці ў роднай зямлі. Ах, міласэрная пані, я разгаварылася, як на вячорках, не асуджайце мяне за шчырасць,— скончыла бабуля, устаючы з фатэля.

— Я з прыемнасцю слухала твой аповед, матуля. Ты нават не ўяўляеш, наколькі я табе ўдзячная,— сказала княгіня, паклаўшы бабулі на плячо руку,— а цяпер пойдзем снедаць, таму што і дзеці ўжо нагулялі апетыт.

З гэтымі словамі княгіня вывела бабулю з кабінета ў салон, дзе былі падрыхтаваны кава, шакалад і розныя прысмакі. Камердынер чакаў загаду, па знаку княгіні пабег па графіню і дзяцей. Тыя адразу ж з'явіліся з графіняй, якая, як дзіця, з імі бавілася.

— Паглядзі, бабуля, што нам Гартэнзія дала! — крычалі разам дзеці, паказваючы бабулі дарагія цацкі.

— І сапраўды, я такога ніколі не бачыла, а ці падзякавалі вы за гэта?

Дзеці пацвердзілі.

— А што скажуць Манчынка, Цылька і Вацлаў, калі гэта ўбачаць?

— А хто гэта: Манчынка, Цылька і Вацлаў? — спытала княгіня, жадаючы ўсё ведаць, ад пачатку да канца.

— Я магу вам расказаць, мілая княгіня, я ўжо ўсё пра іх ведаю,— хутка загаварыла графіня.— Манчынка — дачка млынара, а Цылька і Вацлаў — дзеці катрыншчыка, акрамя іх, у яго яшчэ чацвёра. Барунка мне расказала, што ядуць котак, вавёрак і варон, бо ў іх няма чаго есці, што ходзяць яны ў лахманах і што людзі іх абыходзяць.

— Таму, што яны бедныя, ці таму, што ядуць котак і вавёрак? — спытала княгіня.

— Таму,— пацвердзіла бабуля.

— Ну, вавёрка — зусім не дрэнная ежа, я сама каштавала,— заўважыла княгіня.

— Так, міласэрная пані, вы елі вавёрку ад раскошы, а яны ядуць з голаду. Бог узнагародзіў катрыншчыка здаровым страўнікам, дзеці, зразумела, таксама маюць добры апетыт, а што заробіш гэтай музыкай? Што ж рабіць, калі няма ні на сябе, ні ў сябе, а ў хаце — як вымецена!

Між тым княгіня села за стол, Гартэнзія пасадзіла дзяцей побач з сабою, бабуля таксама мусіла сесці. Графіня хацела наліць ёй кавы або шакаладу, але тая замахала рукамі, што не п'е ні таго, ні другога.

— А чым жа ты снедаеш? — спытала княгіня.

— З малых гадоў я навучылася снедаць поліўкаю, часцей гэта кісело[1], так у нас у гарах прынята. Кісело і бульба — да сняданка, да абеду — кісело і бульба, а без вячэры можна і абысціся. У нядзелю кавалак аўсянага хлеба. Вось такая страва ў беднага люду ў Крканошскіх гарах цэлы год. Людзі дзякуюць Богу, калі хоць у гэтым няма недахопу. А то бывае часта, што ядуць толькі вотруб'е, ды і то не дасыта. У тых, хто жыве бліжэй да даліны, знойдзецца трохі гароху, пшанічнай мукі, капусты, рознай зеляніны, а раз на год і

[1] *Кісело* — поліўка з квасу з грыбамі.

кавалак мяса зварыць, тады ўжо рай! Але з панскай ежай простаму чалавеку звыкацца не трэба, бо нядоўга і па свеце пайсці. Мне гэтыя прысмакі мала сілы далі б.

— Ты памыляешся, старая, такая ежа вельмі пажыўная, і калі б людзі маглі есці кожны дзень кавалак мяса і запіваць нечым карысным, думаю, што сталі б больш здаровымі, чым ад сваёй штодзённай стравы,— сказала княгіня.

— Ну вось, бачыце, чалавек заўсёды нечаму можа навучыцца, я думала, што паны таму такія бледныя і худыя, што ядуць адны прысмакі, якія не даюць ні здароўя, ні сіл.

Княгіня ўсміхнулася, але нічога не сказала і, наліўшы маленькі кілішак салодкага віна, падала яго бабулі і сказала:

— Выпі, матухна, гэта карысна для страўніка!

Бабуля ўзяла кілішак, прамовіла:

— За здароўе міласэрнай пані,— і крыху выпіла, а таксама ўзяла кавалак печыва, каб не пакрыўдзіць гаспадыню.

— Што там у тых шкарлупках, якія есць княгіня? — спытаўся шэптам у Гартэнзіі Ян.

— Гэта марскія жывёлы, называюцца вустрыцы,— успаўголас адказала графіня.

— Гэтага б Цылька не ела,— працягваў Ян.

— Розная ежа ёсць на свеце, розныя густы, мой мілы хлопчык,— адказала графіня.

Падчас размовы Барунка, якая сядзела каля бабулі, сунула ёй нешта ў кішэню і прашаптала:

— Схавайце, бабуля, гэта грошы, паненка мне дала іх для дзяцей Кудрнавых, але я баюся згубіць.

Княгіня пачула, што сказала Барунка, і з невыказнай пяшчотаю паглядзела на мілы твар графіні. Сэрца бабулі напоўнілася радасцю, і яна сказала ўсхвалявана:

— Бог аддзячыць вам, мілая паненка.

Паненка зачырванелася і пагразіла пальцам Барунцы, якая таксама пачырванела.

— Вось узрадуюцца! — працягвала бабуля.— Хоць апрануцца!

— А я яшчэ дадам, няхай у іх будзе і на што-небудзь іншае,— абвясціла княгіня.

— Вы зрабілі б добрую справу, міласэрная пані, калі б дапамаглі тым людзям, але не міласцінай,— сказала бабуля.

— А чым жа?

— Добра было б Кудрне знайсці сталую працу, думаю, што ён выказаў бы стаpанне, таму што гэта чалавек сумленны і пачцівы. Бог вам аддзячыць за ўсё, але міласціна, міласэрная пані, гэтым людзям дапаможа часова. Купяць сабе што-небудзь, часам і непатрэбныя рэчы, калі грошы ў руках, а як усё з'ядуць і зносяць, зноў застануцца ні з чым, у другі раз прасіць не асмеляцца. А калі б меў дзённы заробак, была б яго сям'і сапраўдная дапамога, а літасцівая пані атрымала б працавітага работніка і вернага слугу, ды яшчэ да таго ж зрабіла б добрую справу.

— Праўду гаворыш, матухна, але якую ж работу я магу прапанаваць музыканту?

— Міласэрная пані яе знойдзе. Я ведаю, ён з радасцю пайшоў бы вартаўнікам або наглядчыкам. Хадзіў бы па палях, мог бы насіць катрынку з сабою. Ён і без таго, ідучы полем, грае па дарозе, каб сябе павесяліць. Вясёлы чалавек,— дадала бабуля з усмешкай.

— Тады трэба пра яго паклапаціцца,— сказала княгіня.

— Ах, мая дарагая, мілая княгіня! — усклікнула графіня і ўстала, каб пацалаваць яе прыгожую руку.

— Толькі каля добрых людзей ёсць анёлы,— сказала бабуля, паглядзеўшы на княгіню і яе выхаванку.

Княгіня памаўчала хвілінку, а потым ціха сказала:

— Гэта мне Бог яе даў, за што яму ніколі не перастану дзякаваць.— І потым гучна дадала: — Хацелася б мне мець такога сябра, які заўсёды шчыра казаў бы мне праўду, як ты, матухна.

— Калі захочаце, васпані, то заўсёды знойдзеце. Сябра лягчэй знайсці, чым утрыманца.

— Ты думаеш, што я не змагла б яго ацаніць?

— Чаму ж я так павінна думаць пра вас, міласэрная пані? Толькі часта так здараецца, што часам шчырасць па сэрцы прыйдзецца, а часам і не, тады і сяброўству канец.

— Зноў праўду кажаш. Дазваляю табе прыходзіць, калі хочаш, і гаварыць мне тое, што хочаш, я заўсёды з радасцю выслухаю, а калі прыйдзеш з просьбаю, то выканаю з прыемнасцю ўсё, што змагу,— так казала княгіня, устаючы з-за стала.

Бабуля хацела пацалаваць ёй руку, але тая не дазволіла, а сама расцалавала старую ў шчокі. Дзеці ўзялі свае падарункі, але развітвацца [redacted] мілай графіняй ім не хацелася.

— Прыходзьце цяпер да нас, мілая паненка,— запрасіла яе бабуля, беручы Адэльку за руку.

— Прыходзьце, прыходзьце, Гартэнзія! — прасілі дзеці.— Мы зноў назбіраем суніц.

— Прыйду абавязкова,— усміхнулася дзяўчына.

— Дзякуем вам за ўсё, міласэрная пані. Заставайцеся з Богам,— сказала бабуля на развітанне.

— Ідзіце з Богам! — кіўнула княгіня, а Гартэнзія правяла гасцей да дзвярэй.

Камердынер, прыбіраючы са стала, зморшчыў нос і падумаў: «Дзіўныя фантазіі ў нашай пані, размаўляць з простай бабай».

Між тым княгіня стаяла каля акна і сачыла поглядам за адыходзячымі, пакуль яшчэ можна было бачыць белыя сукенкі дзяўчат і бант на бабуліным каптуры. Вяртаючыся ў свой кабінет, прашаптала: «Шчаслівая кабета!» [...]

1853—1855

ЗМЕСТ

Літаратура братоў і суседзяў. *Таццяна Кабржыцкая, Вячаслаў Рагойша* 5

УКРАІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА 9

Тарас Шаўчэнка 18

Думка. *Пераклад Янкі Купалы* 21
*** Садок вішнёвы каля хаты... *Пераклад Ніла Гілевіча* . . . 22
*** Не грэе сонца на чужыне... *Пераклад Рыгора Барадуліна* 23
*** І на чужыне я узрос... *Пераклад Аркадзя Куляшова* . . . 23
Цары (раздзелы IV і V). *Пераклад Вячаслава Рагойшы* . . 25
І мёртвым, і жывым, і ненароджаным... *Пераклад Кандрата Крапівы* 28
Сон. *Камедыя. Пераклад Янкі Купалы* 35
Ерэтык. *Паэма. Пераклад Якуба Коласа* 51
Каўказ. *Паэма. Пераклад Янкі Купалы* 62
Запавет. *Арыгінал. Пераклады Макара Краўцова, Янкі Купалы, Змітрака Бядулі, Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Васіля Жуковіча, Вячаслава Рагойшы, Яўгена Міклашэўскага, Валерыя Стралко* 67

Іван Катлярэўскі 75

Энеіда. *Паэма (адаптацыя). Пераклад Аркадзя Куляшова* . . . 77

Іван Франко 97

Каменяры. *Пераклад Уладзіміра Караткевіча* 100
Гімн. *Пераклад Ніла Гілевіча* 102
Майсей. *Паэма. Пралог. Пераклад Вячаслава Рагойшы* . . . 103
Украдзенае шчасце. *Драма. Пераклад Вячаслава Рагойшы* 105

Міхайла Кацюбінскі 166

Цені забытых продкаў. *Аповесць (скарочана). Пераклад Вячаслава Рагойшы* 169

Леся Украінка 208

Світальныя агні. *Пераклад Сяргея Дзяргая* 212
*** Слова, чаму ты не сталь баявая... *Пераклад Канстанціна Цітова* 213

*** Гавораць вусны: «Ён навек загінуў!..» *Пераклад Міколы Аўрамчыка* ... 214
Мара, будзь вернай! *Пераклад Юркі Гаўрука* ... 215
Надпіс на руіне. *Пераклад Канстанціна Цітова* ... 216
Песні пра волю. *Пераклад Алеся Астапенкі* ... 217
Лясная песня. *Драма-феерыя (скарочана). Пераклад Вячаслава Рагойшы* ... 219

Васіль Стафанік ... 284

Каменны крыж. *Пераклад Янкі Саламевіча* ... 286
Дарога. *Пераклад Вячаслава Рагойшы* ... 296
Кляновае лісцейка. *Пераклад Кузьмы Чорнага* ... 299

Паўло Тычына ... 307

Арфамі, арфамі... *Пераклад Вячаслава Рагойшы* ... 309
О панна Інна... *Пераклад Вячаслава Рагойшы* ... 310
На плошчы. *Пераклад Юркі Гаўрука* ... 310
Вецер з Украіны. *Пераклад Максіма Танка* ... 311
Я ўзмацняюся. *Пераклад Максіма Лужаніна* ... 312

Максім Рыльскі ... 314

*** Яблыкі даспелі, чырванню наліты!.. *Пераклад Уладзіміра Шахаўца* ... 317
*** Ластаўкі лятаюць, бо лятаецца... *Пераклад Максіма Лужаніна* ... 317
Слова пра родную маці. *Пераклад Рыгора Няхая* ... 318
Янка Купала. *Пераклад Уладзіміра Шахаўца* ... 321
Ружы і вінаград. *Пераклад Максіма Танка* ... 321
Туга па маладосці. *Пераклад Максіма Танка* ... 322

ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА ... 324

Адам Міцкевіч ... 332

Пан Тадэвуш. *Паэма (зачын). Арыгінал. Пераклады Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Аляксандра Ельскага, Браніслава Тарашкевіча, Пятра Бітэля, Язэпа Семяжона* ... 335
Гражына. *Літоўская аповесць (скарочана). Пераклад Пятра Бітэля* ... 336
Свіцязь. *Балада. Пераклад Антона Бялевіча* ... 362
Свіцязянка. *Балада. Пераклад Аляксея Зарыцкага* ... 369
Рыбка. *Балада. Пераклад Рыгора Барадуліна* ... 374
Люблю я. *Балада. Пераклад Аляксея Зарыцкага* ... 378
Лілеі. *Балада. Пераклад Максіма Танка* ... 383
Да Нёмана. *Арыгінал. Пераклады Альбіна Стаповіча, Юркі Гаўрука, Алеся Салаўя, Міхася Дуброўскага, Хведара*

Жычкі, Кастуся Цвіркі, Рыгора Барадуліна, Пятра Бітэля, Васіля Жуковіча, Уладзіміра Мархеля, Яўгена Міклашэўскага . . . 393

Юльюш Славацкі . . . 401

Гімн. *Пераклад Язэпа Семяжона* . . . 403
Песня дзяўчыны-казачкі. *Пераклад Піліпа Пестрака* . . . 404
Мой тастамант. *Пераклад Уладзіміра Дубоўкі* . . . 405
У Швейцарыі. *Паэма. Пераклад Максіма Танка* . . . 407

Юзаф Крашэўскі . . . 420

Паперы Глінкі. *Аповесць (скарочана). Пераклад Міхася Кенькі* . . . 422

Эліза Ажэшка . . . 476

Хам. *Аповесць (скарочана). Пераклад Ядвігі Бяганскай* . . . 478
Зімовым вечарам *(скарочана). Пераклад Янкі Брыля* . . . 528
Раманіха *(скарочана). Пераклад Янкі Брыля* . . . 562

ЛАТЫШСКАЯ ЛІТАРАТУРА . . . 583

Яніс Райніс . . . 587

Зламаныя сосны. *Пераклад Рыгора Барадуліна* . . . 589
Радзіме. *Пераклад Міколы Арочкі* . . . 589
Табе, асноўны клас! *Пераклад Хведара Жычкі* . . . 591
*** Цягнік усё далей... *Пераклад Хведара Жычкі* . . . 591
Ave sol! *Паэма. Пераклад Рыгора Барадуліна* . . . 593
Агонь і ноч. *Драма (адаптацыя). Пераклад Васіля Сёмухі* . . . 619

ЛІТОЎСКАЯ ЛІТАРАТУРА . . . 654

Крысціёнас Данелайціс . . . 659

Чатыры пары года. *Паэма (скарочана). Пераклад Хведара Жычкі* . . . 661

ЧЭШСКАЯ ЛІТАРАТУРА . . . 695

Бажэна Немцава . . . 699

Бабуля. *Аповесць (скарочана). Пераклад Ніны Рашэтнікавай* 702

Мае браты, мае суседзі : творы пісьменнікаў блізкага
М94 замежжа : для сярэд. і ст. шк. узросту / уклад., уступ. арт. Т. Кабржыцкай і В. Рагойшы. — Мінск : Маст. літ., 2008. — 751с. — (Бібліятэка школьніка).

ISBN 978-985-02-1019-7.

У зборнік «Мае браты, мае суседзі» ў лепшых беларускіх перакладах увайшлі творы ўкраінскіх (Тарас Шаўчэнка, Іван Катлярэўскі, Іван Франко, Міхайла Кацюбінскі, Леся Украінка, Васіль Стафанік, Паўло Тычына, Максім Рыльскі), польскіх (Адам Міцкевіч, Юльюш Славацкі, Юзаф Крашэўскі, Эліза Ажэшка), латышскіх (Яніс Райніс), літоўскіх (Крысціёнас Данелайціс) і чэшскіх (Бажэна Немцава) пісьменнікаў, прапанаваныя для абавязковага вывучэння сучаснай праграмай па беларускай літаратуры (Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2007). Кніга можа зацікавіць і шырокага чытача. Большасць тэкстаў сёння маладаступныя нават для спецыялістаў, асобныя з іх у беларускім перакладзе друкуюцца ўпершыню.

УДК 821(1-87)-93
ББК 84(0)

Літаратурна-мастацкае выданне

БІБЛІЯТЭКА ШКОЛЬНІКА

МАЕ БРАТЫ, МАЕ СУСЕДЗІ

Творы пісьменнікаў блізкага замежжа

У афармленні кнігі выкарыстаны работы мастака
М. Чурлёніса

Рэдактары *Л. Т. Калюжная, І. М. Паланейчык*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Барай*
Тэхнічны рэдактар *В. Ю. Серчанка*
Стылістычныя рэдактары *Я. А. Бебель, Л. А. Дзядзюля, М. А. Паддубская, А. М. Анцытовіч*

Падпісана да друку 30.06.08. Фармат 60×90$^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 47,0. Улік.-выд. арк. 35,18. Тыраж 3000 экз. Заказ 1946.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004. 220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа». ЛП № 02330/0056617 ад 27.03.04. 220600, Мінск, вул. Чырвоная, 23.